соотносить результат своей деятельности с эталоном, образцом;

оценивать результаты своей деятельности в соответствии с поставленной задачей и выбранным критерием.

Использовать приобретенные знания и умения в практической деятельности и повседневной жизни:

использовать учебные принадлежности в соответствии с их назначением;

соблюдать правила безопасной работы с учебными принадлежностями;

готовить рабочее место, поддерживать порядок на рабочем месте;

кратко рассказывать о себе, своей семье, друге, школе;

составлять небольшие рассказы с элементами описания предмета (по алгоритму);

составлять рассказы по картинке, серии сюжетных картинок;

участвовать в диалоге в условиях повседневного общения: задавать простые вопросы (кто, что, где, когда) и отвечать на вопросы собеседника;

использовать нормы речевого этикета в ситуациях повседневного и учебного общения (обращение, приветствие, прощание, знакомство, благодарность, извинение, поздравление);

работать в паре и группе (договариваться, распределять работу, получать общий результат, оценивать свой вклад);

планировать свою деятельность и осуществлять контроль ее хода;

находить ошибки в своей и чужой учебной работе и устранять их.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Цірынава, В.І. Уводзіны ў школьнае жыццё / Введение в школьную жизнь: вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.І. Цірынава. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.

Тиринова, О.И. Введение в школьную жизнь: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / О.И. Тиринова. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011; Аверсэв, 2012.

Тиринова, О.И. Введение в школьную жизнь: учеб. нагляд. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / О.И. Тиринова. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011; Аверсэв, 2012.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Уводзіны ў школьнае жыццё» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

УВОДЗІНЫ Ў ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Тлумачальная запіска

Пачатак навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца найважнейшым этапам у развіцці дзіцяці. Вучню трэба прывыкнуць да зменаў у рэжыме дня і распарадку вучэбных заняткаў, навучыцца мець зносіны і ўзаемадзейнічаць з настаўнікамі і аднакласнікамі, асвоіць новую для яго дзейнасць – вучэбную.

Найбольш складанымі для ўсіх вучняў з’яўляюцца першыя тыдні навучання, таму ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі ствараюцца асаблівыя ўмовы для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў першапачатковы перыяд навучання.

Інтэграваны вучэбны курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» праводзіцца ў верасні ў рамках агульнай колькасці вучэбных гадзін, прадугледжаных Тыпавым вучэбным планам для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў I класе.

На вывучэнне курса вылучаецца 60 вучэбных гадзін, якія размяркоўваюцца раўнамерна – па 3 гадзіны ў дзень на працягу першых 20 вучэбных дзён.

У гэты перыяд у вучэбны расклад уключаюцца ўрокі курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» (па 3 урокі кожны дзень) і ўрокі па вучэбных прадметах «Фізічная культура і здароўе», «Музыка». Урокі па іншых вучэбных прадметах не праводзяцца.

Пасля заканчэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» пачынаецца сістэматычнае навучанне па вучэбных праграмах «Навучанне грамаце», «Русский язык», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Выяўленчае мастацтва». Працягваецца вывучэнне вучэбных прадметаў «Фізічная культура і здароўе», «Музыка».

Роля інтэграванага вучэбнага курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» абумоўлена яго функцыянальным прызначэннем – адаптацыяй, развіццём і дыягностыкай. Паступовае ўключэнне вучняў у адукацыйны працэс забяспечвае паспяховасць прыстасавання арганізма дзіцяці да новых умоў жыццядзейнасці. Курс закладвае аснову для развіцця вучняў – актывізуе адвольнасць псіхічных працэсаў (мыслення, памяці, увагі, успрымання, уяўлення), самарэгуляцыю паводзін, спрыяе фарміраванню элементарных агульнавучэбных уменняў і навыкаў, засваенню спосабаў вучэбнага ўзаемадзеяння. Змест вучэбных заданняў дазваляе педагогу ў гульнявой форме правесці дыягностыку асаблівасцей індывідуальнага развіцця вучняў, вызначыць іх гатоўнасць да засваення зместу вучэбных прадметаў, якія будуць вывучацца пасля заканчэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё».

Асноўная мэта курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» – стварэнне аптымальных умоў для паспяховай адаптацыі вучняў I класа да навучання ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

Дасягненне мэты ажыццяўляецца за кошт рашэння наступных **задач**:

развіццё вучэбнай матывацыі, фарміраванне станоўчых эмацыянальна-каштоўнасных адносін да школы, навучання і новай сацыяльнай ролі «вучня»;

дыягностыка, падтрымка і развіццё індывідуальнасці вучня, актывізацыя адвольнасці псіхічных працэсаў успрымання, увагі, уяўлення, памяці, мыслення, развіццё сенсаматорных навыкаў;

засваенне асноўных форм узаемадзеяння з настаўнікам і аднакласнікамі ў працэсе ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці, развіццё навыкаў зносін і навучальнага супрацоўніцтва;

фарміраванне элементарных агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеяння, засваенне найпрасцейшых прыёмаў самакантролю і самаацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Рашэнне пастаўленых задач забяспечвае дасягненне вучнямі асобасных і метапрадметных вынікаў.

Асобасныя вынікі ўключаюць адаптацыю вучняў да новых умоў навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, прыняцце і засваенне сацыяльнай ролі вучня, праяўленне цікавасці да атрымання новых ведаў і засваення новых спосабаў дзеяння, жаданне вучыцца, прыняцце правілаў школьнага жыцця і іх выкананне, гатоўнасць да засваення вучэбных прадметаў і пераадоленне цяжкасцей у працэсе навучання.

Метапрадметныя вынікі ўключаюць засваенне вучнямі элементарных агульнавучэбных уменняў і навыкаў (вучэбна-дзейнасных, вучэбна-арганізацыйных, вучэбна-інтэлектуальных, вучэбна-інфармацыйных, вучэбна-камунікатыўных) як састаўной часткі ўніверсальных вучэбных дзеянняў.

Вучні набываюць першапачатковы вопыт ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці: прымаюць ад настаўніка вучэбна-практычную задачу; назіраюць і аналізуюць прадметы навакольнага свету з мэтай выдзялення іх істотных прыкмет; вылучаюць сістэму арыенціраў – вучацца арыентавацца ў прасторы, на старонцы вучэбнага дапаможніка і лісце (без разліноўкі і з разліноўкай у клетку і лінейку); засвойваюць рацыянальныя

прыёмы запамінання вучэбнага матэрыялу; прытрымліваюцца пакрокавай інструкцыі пры выкананні вучэбнага задання; кантралююць сваю дзейнасць і ацэньваюць яе вынік па зададзеных крытэрыях.

Пры арганізацыі вучэбнага дня і вучэбных заняткаў курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» варта ўлічваць узроставыя асаблівасці вучняў. Дзіця шасцігадовага ўзросту хутка стамляецца, працэсы ўзбуджэння ў яго пераважаюць над працэсамі тармажэння. Вучань стамляецца ад статычнай паставы, яму цяжка сядзець за партай нерухома.

Узроставыя асаблівасці вучняў I класа патрабуюць стварэння для іх асаблівых умоў навучання. Уважлівае, клапатлівае і цярплівае стаўленне да дзіцяці з боку значымых для яго дарослых (педагогаў і бацькоў), разуменне ўнутраных прычын змен, якія адбываюцца з ім, дапамогуць пераадолець усе цяжкасці адаптацыйнага перыяду.

Асноўныя педагагічныя ўмовы, якія забяспечваюць паспяховасць адаптацыі вучняў да навучання ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

1. Рэалізацыя індывідуальнага падыходу да вучняў.

У першы месяц навучання педагог вывучае асаблівасці індывідуальнага развіцця кожнага вучня. Вучні па-рознаму ўспрымаюць інфармацыю, аналізуюць яе, у іх розная працаздольнасць, памяць, увага, узровень падрыхтаванасці да школы. Усе гэтыя адрозненні неабходна не толькі ведаць, але і ўлічваць пры арганізацыі навучання. Настаўніку неабходна мець поўнае ўяўленне аб стане здароўя вучня, уключаючы не толькі фізічнае, але і псіхічнае здароўе, сацыяльны дабрабыт і сацыяльную адаптаванасць.

Ступень здольнасці да навучання, стан здароўя і функцыянальны стан арганізма вучня вызначаюць у комплексе тую меру высілкаў і намаганняў, якія патрабуюцца ад яго для выканання вучэбных заданняў. Калі нагрузка празмерная, перавышае мяжу функцыянальных магчымасцей арганізма, непазбежна надыходзіць парушэнне стану здароўя. Менавіта гэтага і не павінен дапусціць настаўнік.

2. Арганізаваны пачатак вучэбнага дня.

Вучэбны дзень рэкамендуецца пачынаць з **ранішняй сустрэчы**, якая праводзіцца *да пачатку вучэбных заняткаў*.

Ранішняя сустрэча задавальняе патрэбу вучняў у зносінах, забяспечвае спакойны пераход ад пазавучэбнага часу да вучэбнага, стварае ўстаноўку на засваенне вучэбнай інфармацыі і спрыяе матывацыі наступнай дзейнасці.

Настаўнік загадзя вызначае месца для правядзення ранішніх сустрэч. Гэта можа быць вольнае месца ў вучэбным кабінеце або гульнявым пакоі. Пажадана, каб выбранае месца дазваляла арганізаваць розныя формы зносін педагога і вучняў: стоячы па крузе, стоячы побач з пераноснай дошкай, седзячы на дыване, седзячы на састаўленых у круг крэслах і інш. Асноўная ўмова – правядзенне ранішняй сустрэчы ў максімальна камфортных абставінах.

Складальнымі элементамі ранішняй сустрэчы з'яўляюцца:

прывітанне;

навіны класа (паведамленне настаўніка аб вучэбным дні, расказы вучняў аб важных падзеях у іх жыцці, праект «Герой дня»);

дыдактычная, развіваючая або рухавая гульня.

Настаўнік і ўсе вучні ўтвараюць круг, бяруцца за рукі. Размяшчэнне вучняў змяняецца ў залежнасці ад ўстаноўкі настаўніка, звязанай з запланаванай гульнёй, тэмай ранішняй сустрэчы або будучага ўрока. Форма прывітання таксама мяняецца, вучні называюць адзін аднаго па імёнах, жадаюць адзін аднаму добрага дня і добрага настрою, вучацца з павагай звяртацца да сваіх аднакласнікаў. У якасці прывітання можна выкарыстоўваць чатырохрадкоўе або рыфмаванку, якая наладжвае вучняў на сумесную дзейнасць.

Настаўнік коратка распавядае аб вучэбным дні. Напрыклад: «Сёння наш дзень будзе прысвечаны вывучэнню асноўных школьных правілаў. Мы даведаемся, як школьнікі вітаюцца адзін з адным і з настаўнікам, як вітаюць уваходзячых у клас дарослых, будзем вучыцца быць уважлівымі і стараннымі вучнямі».

Падчас ранішняй сустрэчы педагог можа прапанаваць вучням падзяліцца радаснымі навінамі ці сумнымі перажываннямі, расказаць пра свае праблемы або трывогі. Настаўнік тлумачыць, што чалавек дзеліцца сваімі пачуццямі з людзьмі, якія акружаюць яго, каб разам радавацца поспехам або супольна знайсці спосабы справіцца з цяжкасцямі. Вельмі важна стварыць даверныя адносіны паміж вучнямі і настаўнікам.

Знаёмства вучняў адзін з адным забяспечвае праект «Герой дня». Кожны дзень адзін з вучняў класа выступае ў ролі «героя дня». Чарга ўсталёўваецца ў гульнявой форме (лічылкай, фантамі, латарэяй або іншымі спосабамі). «Герой дня» рыхтуе расказ пра сябе для ранішняй сустрэчы (як мяне завуць; колькі мне гадоў; мая сям'я; мая любімая цацка; мой любімы занятак у вольны час і інш.). Настаўнік тлумачыць, што званне «герой дня» да многага абавязвае: дзіця павінна стаць на адзін дзень самым лепшым вучнем класа – старанным і руплівым у вучобе, выхаваным, уважлівым, добрым і спагадлівым. Усе вучні класа павінны знайсці магчымасць на працягу вучэбнага дня сказаць добрыя словы «герою дня», падтрымаць яго і аказаць дапамогу, калі яна неабходная. У класе можа быць афармлены плакат «Герой дня» з месцам для фатаграфіі вучня.

Гульні павінны вырашаць розныя дыдактычныя і развіваючыя задачы, па магчымасці быць блізкімі да матэрыялу заняткаў вучэбнага дня.

3. Выкананне асноўных рэжымных момантаў у структуры вучэбнага дня.

У рэжыме вучэбнага дня вучняў першага класа прадугледжваецца правядзенне **дынамічных перамен** з арганізацыяй рухавых гульняў.

На кожным уроку праводзяцца дзве *фізкультхвілінкі*, якія ўключаюць практыкаванні для захавання правільнай паставы, прафілактыкі стомы вачэй і рэлаксацыі.

Самы эфектыўны спосаб папярэджання і своечасовага зняцця стомы дзіцяці – *рухавая актыўнасць*, якая павінна складаць не менш за 60 % ад агульнага часу знаходжання вучняў ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі і ахопліваць усе віды фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці. Правільнае ўключэнне і размеркаванне ў рэжыме дня рухавых гульняў, правядзенне паўнавартасных фізкультхвілінак на ўроках аказвае дабратворны ўплыў на функцыянаванне ўсіх сістэм арганізма вучня.

4. Чаргаванне формаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці.

Адукацыйны працэс варта будаваць такім чынам, каб вучань меў магчымасць рухацца, перамяшчацца па класе, адпачываць ад статычнай паставы. На ўроках разумна чаргуюцца розныя віды дзейнасці, выкарыстоўваюцца разнастайныя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў. Працэс навучання павінен гнутка спалучаць калектыўную (франтальную) працу, вучэбную працу ў парах або групах і індывідуальную дзейнасць вучняў. Змяняючы формы вучэбнага ўзаемадзеяння, вучням дазваляецца свабодна перамяшчацца па класе.

Франтальная работа можа быць арганізавана на дыване.

Не варта патрабаваць ад вучняў бездакорнай пасадкі на працягу ўсяго ўрока. Правільная пасадка вучня за партай неабходна толькі падчас выканання пісьмовых заданняў.

5. Аптымальны рэжым вучэбнай нагрузкі на ўроку.

Вучэбная нагрузка павінна быць пасільнай для вучняў першага класа. Педагогу неабходна разумна дазаваць вучэбныя заданні, чаргаваць іх з хвілінкамі адпачынку. Змест вучэбнага курса прадугледжвае **дыферэнцыраваны падыход** настаўніка да адбору вучэбнага матэрыялу, зыходзячы з узроўню падрыхтоўкі вучняў. Заданні, не выкананыя на ўроку, на дом не задаюцца.

Урок будуецца ў наступнай лагічнай паслядоўнасці.

1. Арганізацыйны этап. Паведамленне тэмы ўрока.

2. Матывацыя дзейнасці вучняў. Пастаноўка праблемы або вучэбна-практычнай задачы (прыкладныя пытанні настаўніка: «Адказ на якое пытанне будзем шукаць?», «Чаму будзем вучыцца?», «Што неабходна зрабіць?»).

3. Выкананне *першага задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

4. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока (прыкладныя пытанні настаўніка: «Знайшлі адказ на пытанне?», «Чаму навучыліся, выконваючы гэта практыкаванне?»).

5. Фізкультхвілінка.

6. Пастаноўка новай вучэбна-практычнай задачы.

7. Выкананне *другога задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

8. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока.

9. Фізкультхвілінка.

10. Пастаноўка новай вучэбна-практычнай задачы.

11. Выкананне *трэцяга задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

12. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока.

13. Вынік урока. Рэфлексіўны аналіз вучнямі сваёй дзейнасці і яе вынікаў.

Кожны этап урока павінен мець лагічную завершанасць і сувязь з наступнай работай. Пераход ад аднаго этапа ўрока да другога ажыццяўляецца плаўна, але вельмі выразна – з пастаноўкай дыдактычнай мэты выканання таго ці іншага практыкавання. Настаўнік прапануе наступнае заданне, калі ўпэўнены, што ўсе вучні **гатовыя да яго ўспрымання**:

прыбраны дыдактычны матэрыял пасля папярэдняга задання;

вучні праяўляюць цікавасць да далейшай работы;

адсутнічаюць відавочныя прыкметы стамлення (зніжэнне ўвагі, тэмпу работы; агульная «рухавая турбота»; павелічэнне колькасці памылак у адказах вучняў).

6. Спалучэнне гульнявых і вучэбных матываў дзейнасці.

Пераход ад гульнявой дзейнасці да вучэбнай павінен быць паступовым. Курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» дапускае шырокае выкарыстанне нагляднасці, гульнявых метадаў навучання, дыдактычных гульняў і практыкаванняў гульнявога характару. Гульнявая сітуацыя павінна быць непасрэдна звязана з вучэбным матэрыялам урока. Пры выбары гульні ў першую чаргу неабходна ацаніць яе пазнавальны патэнцыял і дыдактычную накіраванасць, а не займальнасць сюжэта.

На ўроках арганізуецца практычная дзейнасць вучняў: маляванне і размалёўванне, абвядзенне контураў і штрыхоўка, пісьмо элементаў літар, графічныя дыктоўкі і маляванне па клетках, злучэнне прадметаў стрэлкамі, выкананне задання з выбарам наклейкі з дадатка, работа з геаметрычным наборам і лічыльнымі палачкамі, лепка і інш.

Метады і прыёмы навучання павінны спрыяць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, самастойнасці вучняў, падтрымліваць іх адвольную ўвагу.

7. Асваенне спосабаў ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці.

Вучань становіцца суб’ектам вучэбнай дзейнасці толькі на аснове такіх асобасных утварэнняў, як актыўнасць, самастойнасць і зносіны.

Важна навучыць кожнага вучня слухаць і ўспрымаць канкрэтнае вучэбнае заданне, звернутае да ўсяго класа. Першыя вучэбныя патрабаванні павінны быць вельмі простымі, яснымі і кароткімі. Кожнае новае для вучняў вучэбнае дзеянне ўводзіцца *пакрокава*. Для асваення правільнай паслядоўнасці выканання вучэбных дзеянняў выкарыстоўваюцца *апорныя схемы і алгарытмы*.

Перад выкананнем кожнага задання настаўнік інструктуе ўвесь клас, індывідуальную дапамогу аказвае павольна працуючым вучням. Педагог прывучае вучняў абмяркоўваць будучую работу, планаваць свае дзеянні ў адпаведнасці з умовамі вучэбнай задачы, арганізуе ўзаемадапамогу пры выкананні практычных заданняў. Паступова выпрацоўваецца ўменне вучняў працаваць прыкладна ў адным тэмпе.

Выкананне кожнага практычнага задання павінна заканчвацца *праверкай і ацэнкай*. Гэтыя вучэбныя дзеянні адрозніваюць вучэбнае заданне ад гульнявога. Настаўнік дапамагае вучню асэнсаваць зробленыя аперацыі, вучыць ажыццяўляць паэтапны кантроль сваіх дзеянняў, ацэньваць працу па зададзеных крытэрыях.

На ўроку неабходна ствараць сітуацыі, у якіх вучні змогуць весці паміж сабой *вучэбны дыялог*: задаваць адзін аднаму пытанні, каменціраваць адказы аднакласнікаў.

Такім чынам ажыццяўляецца паступовае ўключэнне вучня ў вучэбную дзейнасць – ён не толькі праяўляе актыўнасць і імкнецца вучыцца, але і свядома авалодвае спосабамі вучэбных дзеянняў.

8. Навучанне на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак.

Курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» прадугледжвае знаёмства вучняў з рознымі *формамі кантрольна-ацэначнай дзейнасці*: самакантролем і самаацэнкай, узаемакантролем і ўзаемаацэнкай, кантролем і ацэнкай з боку настаўніка. Прадметам аналізу становяцца індывідуальныя вучэбныя дасягненні кожнага вучня. Не дапускаецца параўнанне вучняў паміж сабой.

Для фіксацыі вынікаў кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца знакі «+», «–», «?» і *лінеечкі самаацэнкі*. Ацэньванне любога дзеяння першапачаткова ажыццяўляецца вучнем, а толькі потым – педагогам (прыярытэт самаацэнкі). Разам з вучнямі вызначаецца *крытэрый*, па якім будзе праводзіцца ацэньванне. Крытэрыяў не павінна быць многа, паколькі для кожнага з іх неабходна асобная шкала для фіксацыі вынікаў. Пачынаць навучанне варта з выкарыстання толькі аднаго *крытэрыю*, выразна сфармуляванага і зразумелага вучням (напрыклад, адпаведнасць выкананай работы ўзору).

Недапушчальна ўвядзенне ў якасці знакаў ацэнкі сонейка, смайлікаў, казачных герояў ці людзей, якія выказваюць «радасць» (сонейка ўсміхаецца), «сум» (сонейка сумуе) ці інш. Такія знакі ўспрымаюцца вучнямі вельмі эмацыянальна. Многія вучні хвалююцца, калі «сонейка» («смайлік» або «герой») у іх сшытку ім не ўсміхаецца. Сонейка павінна свяціць і ўсміхацца ўсім, нават калі ў вучня нешта не атрымалася пры выкананні задання. Ён прыйшоў у школу вучыцца і мае права на памылку.

Для вучня першага класа асабліва важна адчуць, перажыць радасць поспеху ад самастойна выкананага задання, гонар за пераадоленне першых школьных цяжкасцей. Настаўнік павінен зрабіць усё магчымае, каб вучань паверыў у свае сілы. Таленавіты педагог здольны арганізаваць сітуацыю поспеха для ўсіх, знайсці магчымасць пахваліць і падтрымаць кожнага.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

Змест урокаў інтэграванага вучэбнага курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» складае комплекс гульняў і практыкаванняў развіваючага характару, накіраваных на актывізацыю працэсаў успрымання, уяўлення, памяці, адвольнай увагі, разумовых аперацый, выпрацоўку сэнсаматорных навыкаў, знаёмства з правіламі школьнага жыцця, засваенне агульнавучэбных уменняў і навыкаў, спосабаў пазнавальнай дзейнасці.

Рэалізацыя названых мэт дасягаецца ў выніку засваення наступнага абагульненага зместу адукацыі.

Раздзел «Правілы школьнага жыцця»

Знаёмства з установай агульнай сярэдняй адукацыі (экскурсія). Школьныя памяшканні, іх прызначэнне. Праца дарослых ва ўстанове адукацыі. Знаёмства з прафесіяй настаўніка.

Вучэбны клас. Абавязкі дзяжурных па класе. Выкананне найпрасцейшых даручэнняў настаўніка па падтрыманні парадку ў вучэбным памяшканні.

Правілы паводзін у школьнай сталовай, бібліятэцы, спартыўнай зале, актавай зале. Абавязкі дзяжурных у сталовай.

Правілы паводзін вучня на ўроку і перапынку. Правілы школьнага прывітання. Знаёмства з правіламі: «Калі адказвае адзін вучань, усе слухаюць», «Гатовы да адказу – падымі руку», «Вучань для адказу ўстае», «У адказ на словы прывітання вучні моўчкі ўстаюць», «У пачатку і канцы кожнага ўрока вучні стоячы вітаюць настаўніка».

Увядзенне знакаў «Паднятая рука», «Забарона паднятай рукі», «Адказ хорам», «Работа ў пары», «Праблема», «Пастка».

Знаёмства з вучэбнымі прадметамі, якія трэба будзе вывучаць пасля завяршэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё».

Сімвалічнае прысвячэнне дзяцей у вучні.

Раздзел «Спосабы арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Агульнавучэбныя ўменні і навыкі»

Практычнае знаёмства з прызначэннем асноўных вучэбных прыналежнасцей і правіламі іх выкарыстання. Падрыхтоўка неабходных вучэбных прыналежнасцей і рабочага месца да ўрока (пад кіраўніцтвам настаўніка). Падтрыманне парадку на рабочым месцы. Засваенне рацыянальных спосабаў размяшчэння на парце вучэбных прыналежнасцей, іх збору пасля выканання вучэбнага задання і пасля ўрока.

Засваенне ўменняў збіраць партфель (ранец) і падтрымліваць у ім парадак (калі вучэбныя прыналежнасці захоўваюцца ў партфелі або ранцы).

Арыенціроўка ў вучэбным дапаможніку на аснове выкарыстання нумарацыі старонак або ўмоўных абазначэнняў новага вучэбнага дня (сонейка) і новага ўрока (званок). Арыенціроўка на старонцы вучэбнага дапаможніка. Пошук вучэбнага задання на старонцы вучэбнага дапаможніка.

Планаванне дзейнасці: прыняцце мэты, адбор сродкаў для выканання вучэбнага задання; вызначэнне паслядоўнасці дзеянняў.

Спосабы кантролю і ацэнкі дзейнасці. Знаёмства з найпрасцейшымі формамі самакантролю і самаацэнкі. Крытэрыі для ацэнкі выкананай работы: правільнасць (без памылак), адпаведнасць узору.

Выкарыстанне знакаў «+», «–», «?» для фіксацыі вынікаў кантрольна-ацэначнай дзейнасці. Лінеечкі самаацэнкі.

Узаемаправерка і ўзаемаацэнка вучнямі выкананай работы.

Суаднясенне вынікаў самаацэнкі, узаемаацэнка з ацэнкай настаўніка.

Удзел у падвядзенні вынікаў кожнага этапу ўрока. Рэфлексіўны аналіз вучэбных дзеянняў па пытаннях настаўніка: «Чаму навучыліся, выконваючы гэта практыкаванне (гэтыя заданні)?», «Пра што даведаліся?», «Што паўтарылі?», «Што зацікавіла?», «Ці дасягнулі пастаўленай мэты (адказалі на пытанне)?», «Які вынік атрымалі?» і інш.

Асэнсаванне вынікаў дзейнасці ў канцы ўрока. Калектыўны вучэбны дыялог з працягам выказванняў: «Сёння на ўроку я навучыўся...», «На ўроку я даведаўся (зразумеў), што...», «У мяне атрымалася...», «Я змог...», «Мне вельмі спадабалася заданне...», «На ўроку мне было лёгка (цяжка)...» і інш.

Раздзел «Спосабы арганізацыі вучэбнага супрацоўніцтва»

Правілы вучэбнага супрацоўніцтва: дагавор аб размеркаванні работы, добрасумленнае выкананне работы для атрымання агульнага выніку, ацэнка ўкладу кожнага члена групы, справаздача аб праведзенай рабоце.

Работа ў пары. Размеркаванне роляў для работы ў пары «настаўнік – вучань». Уменне дамовіцца аб выкананні агульнага задання. Узгадненне крытэрыяў для ацэнкі. Узаемакантроль і ўзаемаацэнка выкананай работы.

Работа ў групе. Размеркаванне роляў і абавязкаў у групе. Адказнасць кожнага за агульны вынік дзейнасці. Ацэнка свайго ўкладу ў агульны вынік. Правілы справаздачы групы.

Удзел у вучэбным дыялогу: уменне ставіць пытанне, будаваць адказ, абменьвацца рэплікамі, шукаць доказы (тлумачыць). Уменне элементарна абгрунтоўваць выказванне.

Арганізацыя міжгрупавога ўзаемадзеяння. Вучэбны дыялог паміж парамі і групамі.

Культура ўзаемадзеяння. Правілы вырашэння канфліктаў.

Раздзел «Спосабы пазнання навакольнага свету. Актывізацыя псіхічных працэсаў»

Арыенціроўка ў прасторы.

Паняцці «права», «лева», «верх», «ніз».

Арыенціроўка на лісце без разліноўкі: цэнтр ліста, правы верхні вугал, правы ніжні вугал, левы верхні вугал, левы ніжні вугал. Размяшчэнне прадметаў на лісце ў адпаведнасці з названымі арыенцірамі.

Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у клетку. Маляванне фігур па клетках. Графічная дыктоўка.

Арыенціроўка ў клетцы: цэнтр клеткі, правы верхні вугал, правы ніжні вугал, левы верхні вугал, левы ніжні вугал.

Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у лінейку. Рабочы радок. Верхняя і ніжняя лініі рабочага радка. Нерабочы радок (міжрадковая прастора). Размяшчэнне элементаў літар у рабочым радку.

Узаемаразмяшчэнне прадметаў у прасторы. Паняцці «за», «перад», «на», «пад». Размяшчэнне прадметаў па вызначаным парадку (правілу).

Злучэнне кропак па правілу з выкарыстаннем лінейкі і без лінейкі.

Развіццё ўспрымання, уяўлення, увагі.

Развіццё зрокава-прасторавага ўспрымання і зрокава-маторнай каардынацыі.

Развіццё навыкаў успрымання формы, велічыні і колеру. Фарміраванне зрокавых уяўленняў аб прадметах і з'явах рэчаіснасці.

Засваенне спосабаў абследавання прадметаў: успрыманне прадмета ў цэлым; вылучэнне асноўных частак, дробных дэталей і суадносін паміж імі; знаходжанне адметных прыкмет.

Засваенне прыёму назірання. Разглядванне прадметаў навакольнага свету ў адпаведнасці з прапанаванай мэтай. Вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) прадметаў.

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці вадкасці. Назіранне за эфектам зрокавага «памяншэння» і «павелічэння» вады пры яе пераліванні ў шырокую і вузкую пасудзіны.

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці рэчыва (на прыкладзе пластыліну).

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці прадметаў лічэння.

Развіццё творчага ўяўлення. Маляванне на зададзеную тэму і па ўласнай задуме. Прарысоўванне дэталей у сітуацыі выбару аднаго з прапанаваных варыянтаў. Лепка па задуме і ўзоры. Канструяванне з геаметрычных фігур па задуме і ўзоры. Фантазіраванне (складанне расказаў).

Развіццё адвольнай увагі. Трэніроўка пераключэння і размеркавання ўвагі.

Засваенне прыёмаў лагічнага мыслення.

Засваенне прыёму параўнання: вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) аб'екта на аснове супастаўлення яго з іншым аб'ектам; вызначэнне агульных і адметных, істотных (галоўных) і неістотных (другарадных) прыкмет параўноўваемых аб'ектаў. Пошук адказаў на пытанні: «Чым падобныя?», «Чым адрозніваюцца?», «Хто такі ж, як...?» і інш. Параўнанне сюжэтных малюнкаў, пошук адрозненняў. Выказванне меркавання на аснове параўнання.

Засваенне прыёму абагульнення: аб'яднанне прадметаў (з'яў) па іх агульных і істотных прыкметах. Пошук адказаў на пытанні: «Як назваць адным словам?», «Па якой прыкмеце прадметы аб'яднаны ў адну групу?» і інш.

Засваенне прыёму класіфікацыі: аднясенне канкрэтнага аб'екта да зададзенага класа (напрыклад, кубак – да класа «посуд»); канкрэтызацыя агульнага паняцця праз адзінкавыя (напрыклад, «мэбля» – гэта шафа, канапа, стол); групоўка аб'ектаў на аснове агульных прыкмет; размеркаванне аб'ектаў па класах на аснове вылучанай прыкметы. Пошук адказаў на пытанні: «На якія групы можна падзяліць...?», «Якія яшчэ прадметы адносяцца да дадзенай групы?», «Што лішняе, хто лішні?» і інш.

Засваенне прыёму сістэматызацыі: вылучэнне розных прыкмет (уласцівасцей) прадметаў; супастаўленне прадметаў па вылучанай прыкмеце; вызначэнне заканамернасці ў пабудове шэрага прадметаў (па адной прыкмеце; па дзвюх і больш прыкметах); парадкаванне аб'ектаў па ступені інтэнсіўнасці (змяншэнні або ўзрастанні) аднаго або

некалькіх прыкмет. Пошук адказаў на пытанні: «Якая прыкмета паўтараецца?», «Што змяняецца?», «Як працягнуць рад?», «У якім парадку трэба размясціць карцінкі?» і інш.

Засваенне прыёму сэнсавага суаднясення: вылучэнне сувязі прадметаў на аснове адносіны «частка – цэлае» (*дах – дом*), падабенства ці супрацьлегласці ўласцівасцей, функцый (*ручка – аловак*; *дзень – ноч*), прыналежнасці да аднаго роду або віду (*яблык – груша*), зададзенай залежнасці (*малпа – банан*) і інш. Пошук адказаў на пытанні: «Якая сувязь існуе паміж прадметамі?», «Чаму прадметы ўтвараюць пару?», «Па якой прыкмеце прадметы аб'яднаны ў пару (тройку)?» і інш.

Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення ў працэсе работы з загадкамі. Адгадванне загадак і доказ правільнасці адгадкі: вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) невядомага аб'екта; супастаўленне ўсіх вылучаных прыкмет; суаднясенне прыкмет з пэўным прадметам (з'явай); доказ правільнасці адказу на аснове пералічэння прыкмет, уласцівых адгаданаму прадмету (з'яве). Прыдумванне загадак па алгарытме.

Засваенне рацыянальных прыёмаў запамінання.

Трэніроўка вобразнай памяці на аснове зрокавага запамінання прадметаў.

Трэніроўка славесна-лагічнай памяці на аснове запамінання групы слоў, невялікіх вершаў, паведамленняў.

Развіццё адвольнасці працэсаў запамінання і ўзнаўлення.

Засваенне прыёму паўтарэння: выкананне дзеяння ў знешнім плане (паўтарэнне з прагаворваннем услых, шэптам ці бязгучна, толькі варушачы вуснамі) і ўнутраным (разумовае паўтарэнне, пералік аб'ектаў запамінання).

Засваенне прыёмаў лагічнага запамінання: групоўка; сэнсавае суаднясенне.

Засваенне прыёмаў завучвання на памяць вершаў: на аснове рухальнай памяці (суправаджэнне дэкламацыі вершаў рухамі); вылучэнне апорных слоў; «пераказ» верша сваімі словамі (устанаўленне паслядоўнасці падзей, узнаўленне сюжэта).

Раздзел «Развіццё маўлення»

Развіццё гукавой культуры мовы.

Развіццё слыхавай памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку чутнай гаворкі (сваёй і чужой).

Удасканаленне маўленчых навыкаў: навучанне няспешнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму маўленчаму дыханню, умеранай гучнасці і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Развіццё фанематычнага слыху. Распазнаванне і вылучэнне першага і апошняга гукаў у слове.

Слоўнікава-лексічная работа, словаўтварэнне.

Правільнае разуменне і ўжыванне слоў – назваў прадметаў, прыкмет, дзеянняў. Выкарыстанне абагульняючых слоў, адпаведных узроўню ведаў і жыццёвых уяўленняў вучняў: цацкі, школьныя прыналежнасці, адзенне, абутак, посуд, мэбля, інструменты, прадукты, садавіна, агародніна, ягады, кветкі і інш.

Тэматычная групоўка слоў, іх родавідавая суаднесенасць.

Практычнае знаёмства з прыёмамі словаўтварэння (у гульнявой форме). Канструяванне слоў па прапанаваным узоры.

Падбор блізкіх і супрацьлеглых па сэнсе слоў (па ўзоры).

Развіццё граматычнага ладу маўлення.

Складанне сказаў на пэўную тэму (па пытаннях настаўніка).

Абдумванне адказу на пытанне настаўніка, дакладнае яго фармуляванне, выкарыстанне пры адказе поўных і няпоўных сказаў.

Пабудова вуснага выказвання па плане-алгарытме.

Развіццё звязнага маўлення.

Складанне невялікага расказа па малюнку, серыі сюжэтных малюнкаў, асабістых назіраннях вучняў, зададзенай тэме (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Складанне расказа-апісання па плане-алгарытме.

Раздзел «Падрыхтоўка вучняў да пісьма»

Знаёмства з гігіенічнымі правіламі пісьма: правільная пасадка, размяшчэнне сшытка на парце, уменне правільна трымаць у руцэ ручку і аловак.

Падрыхтоўка рукі да пісьма: пальчыкавая гімнастыка, свабодны рух рукі ў зададзеным кірунку. Развіццё дробнай маторыкі пальцаў, каардынацыі кісці рукі. Практыкаванні для адпачынку і зняцця мышачнага напружання рук.

Штрыхоўка ў зададзеным кірунку. Размалёўванне. Абвядзенне па контуры. Дамалёўванне фігур. Маляванне па ўзоры.

Развіццё графічных навыкаў пісьма: прамыя лініі (вертыкальныя, гарызантальныя, нахільныя), паралельныя лініі, лініі з закругленнем унізе, лініі з пятлёй, круг і паўкруг, авал і паўавал, элементы друкаваных і пісьмовых літар. Практыкаванні ў узнаўленні элементаў пісьмовых літар на рабочым радку.

Раздзел «Выхаванне і развіццё асобасных якасцей вучняў. Спосабы ўзаемадзеяння з акружаючымі»

Беларусь – наша Радзіма. Павага да дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь. Павага да гісторыі і традыцый Рэспублікі Беларусь.

Удакладненне ўяўленняў вучняў аб прафесіях і працы дарослых.

Засваенне этычных норм паводзін. Уважлівае стаўленне да акружаючых людзей. Правілы ветлівасці ў розных жыццёвых сітуацыях (у школе, сям'і, транспарце, магазіне). Словы падзякі. Правілы ветлівасці падчас ежы.

Дабро і зло ў жыцці чалавека. Усведамленне маральнага боку ўчынкаў людзей («добрыя» і «дрэнныя» ўчынкі, справы).

Беражлівыя адносіны да прыроды. Клопат і догляд хатніх жывёл.

Беражлівыя адносіны да рэчаў, вучэбных прыналежнасцей. Захаванне парадку і чысціні ў школе і дома.

Пашырэнне ўяўленняў пра абавязкі дзіцяці ў сям'і, пасільную дапамогу дарослым.

Пашырэнне ўяўленняў пра паняцці «сябар», «сяброўства». Фарміраванне ўмення мірыцца, прасіць прабачэння ў сябра.

Пашырэнне ўяўленняў пра здаровы лад жыцця, пра карысць зарадкі і заняткаў спортам для здароўя дзяцей, дарослых.

Бяспечныя паводзіны па дарозе ў школу і дадому. Сігналы святлафора. Дарожныя знакі «Пешаходны пераход», «Падземны пераход». Асноўныя правілы пераходу праезджай часткі.

Правы і абавязкі вучняў. Знаёмства з асноўнымі правамі дзіцяці (на прыкладзе казачных сюжэтаў). Права на жыццё. Права на адукацыю. Права на ахову і ўмацаванне здароўя. Права на адпачынак. Права на пражыванне ў сям'і. Права на абарону гонару і годнасці. Неабходнасць захавання правоў і выканання абавязкаў вучняў.

Раздзел «Дыягностыка індывідуальных якасцей вучняў»

Першаснае вывучэнне матываў і памкненняў дзяцей пры паступленні ў школу: даўно марылі аб школе і вельмі хацелі пайсці вучыцца як мага хутчэй; хацелі ў школу, але было вельмі сумна развітвацца з дзіцячым садам, яшчэ на адзін год пагадзіліся б застацца дашкольнікамі; прыйшлі ў школу таму, што бацькі сказалі, што яны ўжо дарослыя і ім трэба вучыцца.

Дыягностыка асаблівасцей асобаснага развіцця вучня: стаўленне да акружаючых дарослых; узаемаадносіны з аднакласнікамі; стаўленне да самога сябе (самаацэнка).

Дыягностыка развіцця зрокава-прасторавага ўспрымання і зрокава-маторнай каардынацыі.

Дыягностыка развіцця адвольнай рэгуляцыі дзеянняў. Графічная дыктоўка (дыягнастычная методыка Д.Б.Эльконіна).

Дыягностыка развіцця пераключэння і размеркавання ўвагі вучняў.

Дыягностыка індывідуальнай гатоўнасці вучняў да засваення зместу вучэбных прадметаў «Навучанне грамаце», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Выяўленчае мастацтва»: развіццё дробнай маторыкі і графічных уменняў; вызначэнне круга ведаў і ўяўленняў аб прадметах і з'явах навакольнай рэчаіснасці.

Вывучэнне вучэбных пераваг вучняў у працэсе знаёмства з вучэбнымі прадметамі «Навучанне грамаце», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Музыка», «Выяўленчае мастацтва», «Фізічная культура і здароўе».

ПРЫКЛАДНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПА ВУЧЭБНЫХ ДНЯХ[1]

(20 дзён па 3 урокі, усяго 60 гадзін)

[1] Настаўнік мае права ўносіць змены ў прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу.

Першы вучэбны дзень

Урок 1. Беларусь – наша Радзіма.

Урок 2. Знаёмства з настаўнікам і аднакласнікамі.

Урок 3. Экскурсія па ўстанове адукацыі.

Другі вучэбны дзень

Урок 1. Правілы паводзін вучня на ўроку і перапынку.

Урок 2. Знаёмства з правіламі пісьма: вучымся правільна сядзець, трымаць ручку і аловак. Прасторавая арыентацыя.

Урок 3. Рэжым дня вучня.

Трэці вучэбны дзень

Урок 1. Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у клетку.

Урок 2. Арганізацыя рабочага месца. Дзяжурства вучняў.

Урок 3. Выкананне дзеянняў па алгарытме.

Чацвёрты вучэбны дзень

Урок 1. Асваенне прыёму параўнання: вылучэнне прыкмет прадметаў на аснове іх супастаўлення.

Урок 2. Арыенціроўка па лінейках рабочага радка. Развіццё графічных навыкаў: прамыя лініі, круг і паўкруг.

Урок 3. Правілы ветлівасці.

Пяты вучэбны дзень

Урок 1. Выкананне дзеянняў на аснове сістэмы арыенціраў.

Урок 2. Засваенне прыёмаў абагульнення і класіфікацыі.

Урок 3. Добрыя ўчынкі ў жыцці чалавека.

Шосты вучэбны дзень

Урок 1. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.

Урок 2. Складанне апавядання па апорных словах.

Урок 3. Абагульненне і класіфікацыя прадметаў па розных прыкметах.

Сёмы вучэбны дзень

Урок 1. Засваенне прыёму сэнсавага суаднясення.

Урок 2. Рацыянальныя прыёмы завучвання на памяць.

Урок 3. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: лініі з закругленнем унізе, паўавал.

Восьмы вучэбны дзень

Урок 1. Засваенне прыёму сістэматызацыі.
Урок 2. Выкананне дзеянняў па правілу, інструкцыі.
Урок 3. Правілы зносін у сітуацыі супрацоўніцтва.

Дзявяты вучэбны дзень

Урок 1. Развіццё адвольнай увагі.
Урок 2. Алгарытм складання загадак.
Урок 3. Замацаванне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення.

Дзясяты вучэбны дзень

Урок 1. Вылучэнне агульных і адметных прыкмет прадметаў.
Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: паралельныя лініі, лініі з пятлёй, паўавал.
Урок 3. Абагульненне ведаў аб правілах дарожнага руху.

Адзінаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Узаемаразмяшчэнне прадметаў у прасторы.
Урок 2. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.
Урок 3. Часавыя прадстаўленні: суткі, дні тыдня.

Дванаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў параўнання, класіфікацыі і сістэматызацыі.
Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё каардынацыі руху, графічных навыкаў.
Урок 3. Развіццё ўспрымання, увагі і ўяўлення.

Трынаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Развіццё гукавой культуры мовы, знаёмства з прыёмамі словаўтварэння.
Урок 2. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.
Урок 3. Успрыманне часавай працягласці.

Чатырнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Канструяванне з геаметрычных фігур па задуме і ўзоры.
Урок 2. Маляванне на тэму «Школа».
Урок 3. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: лініі з закругленнем унізе, паўавал, круг.

Пятнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Вылучэнне частак цэлага на аснове зрокавага ўспрымання і ўяўлення.
Урок 2. Засваенне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення на аснове зрокавай памяці.
Урок 3. Развіццё зрокава-прасторавага ўспрымання і каардынацыі рухаў.

Шаснаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення: класіфікацыя, сэнсавае суаднясенне.

Урок 2. Развіццё творчага ўяўлення: фантазіраванне.
Урок 3. Маляванне на тэму «Мая сям'я».

Сямнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: авал, паўавал.
Урок 2. Умацаванне здароўя: зарадка, заняткі спортам.
Урок 3. Маляванне на тэму «Мой сябар, мае сябры».

Васямнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Часавыя ўяўленні: год, месяц, пара года.
Урок 2. Выкананне дзеянняў па славеснай інструкцыі.
Урок 3. Засваенне прыёму паслядоўнага аналізу.

Дзевятнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення: параўнанне, абагульненне, сэнсавае суаднясенне.

Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё каардынацыі руху, графічных навыкаў.

Урок 3. Мадэліраванне колькасных адносін.

Дваццаты вучэбны дзень

Урок 1. Правы і абавязкі вучняў.
Урок 2. Знаёмства з вучэбнымі прадметамі.
Урок 3. Свята «Пасвячэнне ў вучні».

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць/разумець:
значэнне вучобы ў жыцці чалавека;
правілы школьнага прывітання настаўніка, аднакласнікаў, работнікаў школы;
правілы зносін з настаўнікам, аднакласнікамі, работнікамі школы;
правілы паводзін на ўроку і перапынку;
правілы вучэбнага супрацоўніцтва ў пары, групе.
Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):
выкарыстоўваць параўнанне для ўстанаўлення агульных і адметных уласцівасцей аб'ектаў;
размяркоўваць аб'екты ў групы па агульнай прыкмеце (такія ж, як...);
усталёўваць і называць характэрныя (якія лёгка адрозніваюцца) прыкметы назіраемага аб'екта;
вусна апісваць аб'ект назірання па прапанаваным алгарытме;
выконваць дзеянні ў пэўнай паслядоўнасці (па інструкцыі, алгарытме);
суадносіць вынік сваёй дзейнасці з эталонам, узорам;
ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і абраным крытэрыем.
Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:
выкарыстоўваць вучэбныя прыналежнасці ў адпаведнасці з іх прызначэннем;
выконваць правілы бяспекі работы з вучэбнымі прыналежнасцямі;
рыхтаваць рабочае месца, падтрымліваць парадак на рабочым месцы;
коратка расказваць пра сябе, сябра, аб сваёй сям'і, школе;
састаўляць невялікія расказы з элементамі апісання прадмета (па алгарытму);

састаўляць расказы па малюнку, серыі сюжэтных малюнкаў;

удзельнічаць у дыялогу ва ўмовах штодзённых зносін: задаваць простыя пытанні (хто, што, дзе, калі) і адказваць на пытанні суразмоўцы;

выкарыстоўваць нормы маўленчага этыкету ў сітуацыях штодзённых і вучэбных зносін (зварот, прывітанне, развітанне, знаёмства, удзячнасць, прабачэнне, віншаванне);

працаваць у пары і групе (дамаўляцца, размяркоўваць работу, атрымліваць вынік, ацэньваць свой уклад);

планаваць сваю дзейнасць і ажыццяўляць кантроль яе хода;

знаходзіць памылкі ў сваёй і чужой вучэбнай рабоце і здымаць іх.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Цірынава, В.І. Уводзіны ў школьнае жыццё / Введение в школьную жизнь: вучэб. дапам. для 1-га класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.І. Цірынава. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.

Цірынава, В.І. Уводзіны ў школьнае жыццё: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.І. Цірынава. – Мінск: Аверсэв, 2012.

Тиринова, О.И. Введение в школьную жизнь. 1 класс. Дидактический материал: учеб. нагляд. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011; Аверсэв, 2012.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Русский язык (Обучение грамоте)» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания

РУССКИЙ ЯЗЫК (ОБУЧЕНИЕ ГРАМОТЕ)

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Обучение грамоте является начальным этапом систематического изучения русского языка, обеспечивает лингвистическое и умственное развитие учащихся, предоставляет большие возможности для решения задач эстетического и нравственного воспитания.

В процессе обучения грамоте учащиеся не только овладевают языковыми навыками – фонетическими, грамматическими, лексическими, но и осваивают коммуникативные умения в сфере общения друг с другом и со взрослыми. Значимым является формирование культуры речи и речевого общения.

Чтение и письмо как важные виды речевой деятельности сначала выступают только в качестве предмета обучения, а затем становятся средством обучения и развития учащихся.

Цели обучения грамоте – формирование базовых знаний, умений и навыков чтения и письма, общеучебных умений, навыков и способов действий; развитие основных видов устной и письменной речи, познавательного интереса; воспитание нравственно-этических качеств, эмоционально-ценностного отношения к окружающей действительности, культуры общения. При этом знания, умения и навыки рассматриваются не как цель, а как средство полноценного развития личности учащегося.

Основными **задачами** обучения грамоте выступают:

развитие фонематического слуха (умение различать и выделять отдельные звуки в слове и слоге, устанавливать их последовательность);

формирование правильного произношения звуков русского языка, усвоение букв русского алфавита и развитие умения соотносить их с соответствующими звуками;

обучение первоначальному чтению и письму;

развитие интереса к чтению как средству познания, формирование читательского кругозора, умений работы с различными источниками информации;

обогащение словарного запаса;

развитие связной устной речи;

формирование умений учебной деятельности.

Ведущими подходами к построению образовательного процесса выступают личностно ориентированный, культурологический и компетентностный.

Личностно ориентированный подход предполагает учет интересов и определение перспектив развития каждого учащегося с учетом его возможностей и способностей.

В качестве главного ориентира *культурологического подхода* выступает формирование творческой личности учащегося, развитие его как человека культуры, способного к культурному саморазвитию.

Компетентностный подход предполагает получение в процессе обучения грамоте личностных, метапредметных и предметных результатов.

К *личностным результатам* относятся:

интерес к изучению русского языка, сформированность личностного смысла его изучения и ценностного отношения к языку;

позитивное отношение к чтению, желание самостоятельно читать детские книги;

стремление овладеть письмом как средством общения, которое позволяет выражать свои мысли в письменной форме.

Метапредметные результаты включают следующие составляющие:

деятельностную (способность к активной творческой деятельности в познании языковых явлений);

интеллектуальную (владение элементарными действиями анализа, синтеза, сравнения, обобщения, классификации языковых единиц);

коммуникативную (умение устанавливать контакты; понимать высказывания другого человека и выражать свои чувства, эмоции, желания, задавать вопросы, аргументировать свои суждения);

информационную (способность ориентироваться в таких источниках информации, как книга, рассказ взрослого и сверстника, схема; применять полученную информацию в своей деятельности).

Предметные результаты включают:

владение элементарной техникой чтения и письма;

владение начальными представлениями о лексических, орфоэпических, грамматических нормах русского языка, правилах речевого этикета;

способность строить несложные связные высказывания для решения коммуникативных задач;

владение умением списывать небольшой текст, писать под диктовку отдельные слова и предложения;

владение начальными навыками смыслового чтения текста, читательской самостоятельности, наличие читательского кругозора – представлений о произведениях, их авторах, жанрах.

Курс обучения грамоте закономерно подчиняется ***общим принципам*** построения содержания образования: культуросообразности, продуктивности, гуманизации, оптимизации, дифференциации, сознательности и активности учащихся, преемственности образования и др.

Важным принципом обучения грамоте является принцип *мультикультурности*, ориентирующий на освоение национальной культуры в единстве с общечеловеческими ценностями. В процессе обучения грамоте осуществляется национально-культурная социализация учащегося, формирование национального самосознания на основе лучших образцов народного словесного творчества и классической литературы для детей.

Обучение чтению и письму организуется в соответствии с принципами *природосообразности* и *индивидуализации*, которые подразумевают учет возрастных и индивидуальных особенностей учащихся.

Обучение первоначальному чтению и письму осуществляется на основе ***звукового аналитико-синтетического метода*** с широким использованием игровых методов и приемов.

В обучении грамоте основополагающим является слоговой (позиционный) принцип русской графики, который находит свое воплощение в обозначении мягкости согласных и звука [й'] на письме. Только в контексте слога, ориентируясь на букву, которая обозначает гласный звук, учащийся способен определить твердость или мягкость предшествующего согласного звука и правильно прочитать слог.

В процессе обучения учащиеся знакомятся со звуковой системой русского языка, овладевают действиями звукового анализа слова, умением различать гласные и согласные звуки; знакомятся с буквами как знаками для обозначения звуков на письме.

На уроках обучения грамоте осуществляется развитие фонематического слуха учащихся, их ознакомление с основными лингвистическими понятиями – словом, предложением. Учащиеся получают представление о слоговой структуре слова, ударении.

Содержание обучения грамоте по учебно-методическому комплексу автора А.К.Клышки построено таким образом, что большинство согласных звуков и букв изучается учащимися раньше гласных. На основе усвоенных согласных звуков и соответствующих им букв у учащихся формируется осознание роли гласного в слоге. Обучение чтению прямых слогов осуществляется по подобию – ***ма, на, ра, са, та*** и т.д. Предварительное изучение согласных позволяет учащимся быстро овладеть чтением прямых слогов и слов с каждой новой изучаемой буквой, обозначающей гласный звук.

По учебно-методическому комплексу автора Н.А.Сторожевой обучение грамоте начинается с изучения гласных звуков и букв (кроме йотированных). Введение согласных осуществляется по принципу частотности. Обучение чтению прямых слогов осуществляется с ориентацией на ранее изученные гласные – *на*, *но*, *ну*, *ны*, *ни*. У учащихся формируется осознание прямого слога как неразрывного единства («слияния») согласных и гласных (СГ).

После освоения чтения слога и слов по слогам учащиеся овладевают приемами целостного чтения слова. Начиная с этапа овладения чтением целыми словами и словосочетаниями (предложениями) чтение может выступать в качестве средства обучения различным учебным предметам.

Параллельно с обучением чтению осуществляется ***подготовка руки учащегося к письму и обучение собственно письму***. Учащиеся учатся обозначать на письме звуки буквами, составлять слова из букв и слогов, правильно списывать буквы, слоги, слова и короткие предложения с письменного и печатного шрифтов, писать под диктовку слова, написание которых не расходится с произношением, и короткие предложения из таких слов.

На уроках письма развиваются мелкие мышцы руки, отрабатываются правильное начертание букв и их рациональное соединение в словах, ритмичность и плавность письма.

Одна из задач обучения письму – формирование четкого, разборчивого, достаточно красивого письма, которое является неотъемлемым признаком культуры письменного общения. Небрежное письмо затрудняет целостное восприятие информации.

С целью сохранения здоровья учащихся исключается требование обязательного безотрывного написания букв, слогов и слов. Во время письма учащемуся необходимы чередования усилий и расслаблений. Ученик имеет право делать небольшие паузы после прописывания отдельных элементов, букв или слогов. Этим обеспечивается своевременное снятие мышечного напряжения руки и тела.

На занятиях по ***внеклассному чтению*** у учащихся формируется интерес к детской книге и самостоятельному чтению.

Содержание курса обучения грамоте структурируется по разделам: *обучение грамоте*; *внеклассное чтение*; *развитие речи*.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(180 ч)[1]

[1] Учитель самостоятельно определяет необходимое количество часов на каждую тему, опираясь на собственный опыт, принимая во внимание подготовленность учащихся, условия их работы.

Уроки обучения грамоте могут быть комбинированными: на одном и том же уроке учитель может учить как чтению, так и письму.

ОБУЧЕНИЕ ГРАМОТЕ
(*по учебно-методическому комплексу автора А.К.Клышки*)

В обучении грамоте (чтению и письму) выделяют периоды: подготовительный (добукварный), основной (букварный) и заключительный (послебукварный).

Подготовительный (добукварный) период
(14 ч)[2]

[2] Количество часов на изучение отдельных тем, указанное в программах, является примерным.

Общее представление об устной и письменной речи.

Членение связной речи на предложения, формирование элементарного осознания функции предложения (предложение выражает мысль, в нем о ком-то или о чем-то говорится). Определение последовательности и количества слов в предложении. Составление предложений по картинкам с заданным количеством слов. Изображение с помощью схемы словесного состава предложения, его линейности (слова следуют одно за другим). Работа над интонацией предложения.

Знакомство с номинативной ролью слова, с тем, что слово имеет значение (смысл), – словами называют предметы, их признаки и действия. Называние одного и того же объекта разными словами (*заяц*, *зайка*, *заинька*, *беляк*, *трусишка*).

Развитие фонематического слуха, формирование умения вычленять звуки в слове. Выделение согласного звука в начале слова. Различение на слух и при произношении твердых и мягких согласных звуков. Подбор слов с заданным звуком.

***Подготовка руки ребенка к письму*:** раскрашивание, рисование узоров, обведение по контуру, штриховка в разных направлениях, написание элементов букв, их соединение.

Выработка правильной осанки учащегося, освоение правил размещения тетради на парте, умения держать ручку при письме.

Основной (букварный) период
(130 ч)

Обучение чтению

Изучение 10 букв (***С*, *П*, *М*, *Т*, *Л*, *Н*, *Ш*, *Р*, *К*, *Д***), обозначающих согласные звуки. Соотнесение согласных звуков и соответствующих букв. Узнавание букв по их характерным признакам (изолированно и в слове).

Деление слов на слоги, определение количества и последовательности слогов в слове, обозначение слогового состава слова на схеме.

Знакомство с ударным слогом. Вычленение из слова и называние ударного слога. Знакомство со смыслоразличительной ролью ударения (путем сравнения слов типа *за́мок – замо́к*).

Изучение гласных звуков и соответствующих им букв ***Аа*, *Яя*, *Уу*, *Ии*, *Оо*, *Ээ*, *ы***. Правильное соотнесение звуков и букв.

Узнавание гласного звука в слогах СГ (твердый согласный + гласный). Чтение таких слогов поочередно с изученными буквами (***а, о, у, ы***).

Различение на слух и при произношении гласных и согласных звуков, твердых и мягких согласных. Выделение в словах отдельных звуков. Звуковой анализ слова (определение последовательности звуков в слове, их характеристика – гласный или согласный, гласный ударный или безударный, согласный твердый или мягкий). Подбор слов с заданным звуком. Знакомство на практическом уровне со звонкими и глухими согласными.

Целостное чтение трех- и четырехбуквенных слов.

Формирование навыка чтения на текстах, состоящих из слов со слогами СГ на каждую изученную букву, обозначающую гласный звук.

Изучение остальных букв, обозначающих согласные и гласные звуки. Знакомство с мягким и твердым знаками.

Привлечение внимания к буквам ***Яя, Юю, Ее, Ёё***, указывающим на мягкость предшествующего согласного.

Чтение слов и текстов с изученными буквами.

Постепенное обучение осознанному, правильному и плавному чтению вслух и про себя отдельных слов, коротких предложений и небольших текстов, доступных учащимся по содержанию, на основе правильного быстрого узнавания букв, ориентировки на гласную букву.

Практическое знакомство со знаками препинания при чтении предложения («.», «!», «?», «,»).

Чтение предложения с паузами и интонациями, соответствующими знакам препинания.

Знакомство с правилами гигиены чтения.

Обучение письму

Обозначение звуков соответствующими буквами печатного (на уроках чтения) и письменного шрифта. Знакомство с начертанием всех заглавных и строчных букв, основными типами их соединений. Выработка связного и ритмичного написания букв и их соединений в словах, правильного соотношения букв по величине, наклону. Равномерное расположение букв и слов на строке.

Запись слов и предложений с проговариванием по слогам после предварительного их слого-звукового разбора с учителем, а затем и самостоятельно.

Алгоритм списывания. Списывание слов и предложений с образцов (письменного и печатного текста) с орфографическим проговариванием. Проверка написанного путем установления соответствия образцу.

Алгоритм записи слов под диктовку. Письмо под диктовку букв, слогов и слов, написание которых не расходится с произношением.

Прописная буква в начале предложения, точка в конце. Ознакомление с правилом написания большой буквы в именах и фамилиях людей, кличках животных, названиях стран, городов, деревень, рек и озер.

Правописание ***жи-ши, ча-ща, чу-щу***.

Привлечение внимания учащихся к словам, написание которых расходится с произношением (слова с безударными гласными, парными звонкими и глухими согласными).

Формирование умения переводить печатный текст в письменный.

Закрепление и совершенствование продуктивных способов чтения слов и предложений. Чтение письменного текста.

Совершенствование работы речевого аппарата учащихся, навыков слого-звукового анализа слов, развитие устной речи.

Заключительный (послебукварный) период
(36 ч)

Обучение чтению

Обобщение, закрепление знаний и умений, приобретенных в процессе подготовительного и основного периодов обучения.

Совершенствование навыка чтения. Обучение приемам чтения целого слова, плавному, сознательному чтению предложения. Развитие навыков осознанного чтения небольших произведений.

Формирование умения отличать связный текст от набора предложений.

Чтение небольших по объему художественных произведений (или отрывков из них) различных жанров: стихов, рассказов, сказок, потешек, загадок, пословиц и др. Развитие умения читать текст выразительно, передавать свое отношение к прочитанному.

Обучение письму

Совершенствование навыка письма. Соблюдение учащимися основных гигиенических требований к письму. Закрепление графически правильных начертаний букв и способов соединения их в слове.

Совершенствование умения правильно (без пропусков и перестановок букв и слогов) списывать небольшие тексты с доски и учебника; писать под диктовку отдельные слова, написание которых не расходится с произношением.

Деление слов на слоги, перенос слов по слогам.

Практическое применение правил о прописной букве в именах и фамилиях людей, кличках животных, названиях стран, городов, деревень, рек и озер; о написании предложений (прописная буква в начале, точка в конце предложения); о правописании ***жи-ши*, *ча-ща*, *чу-щу***.

ОБУЧЕНИЕ ГРАМОТЕ
(*по учебно-методическому комплексу автора Н.А.Сторожевой*)

В обучении грамоте (чтению и письму) выделяют периоды: подготовительный (добукварный), основной (букварный) и заключительный (послебукварный).

Подготовительный (добукварный) период
(40 ч)[1]

[1] Количество часов на изучение отдельных тем, указанное в программах, является примерным.

Обучение чтению

Речь (устная и письменная) – общее представление.

Предложение и слово. Членение отрывка связной речи на предложения, предложений – на слова, слов – на слоги с использованием графических схем. Составление предложений с заданным количеством слов с опорой на схемы.

Слог. Ударение. Деление слов на слоги, определение количества слогов в слове. Ударный слог (длительное и более сильное произнесение одного из слогов в слове). Подбор слов к предъявленным схемам.

Звуки и буквы. Понятие о звуках речи. Узнавание названного звука в словах, предложениях, связных текстах. Гласные и согласные звуки. Твердые и мягкие, звонкие и глухие согласные. Определение на слух артикуляционных особенностей звука (отсутствие или наличие преграды в полости рта, наличие или отсутствие голоса). Слогообразующая роль гласных.

Слияние согласного звука с гласным. Различие слогов СГ и ГС. Слого-звуковой анализ слов, выделение ударных слогов, соотнесение слышимого и произносимого слова со схемой-моделью, отражающей его слого-звуковую структуру.

Самостоятельный подбор слов с заданным звуком, нахождение соответствия между произносимыми (а впоследствии и читаемыми) словами и предъявленными слого-звуковыми схемами-моделями.

Знакомство с буквами ***Аа*, *Оо*, *Ии*, *Уу*, *ы*.** Узнавание букв по их характерным признакам (изолированно и в составе слова, в различных позициях). Соотнесение звуков и букв. Смыслоразличительная функция гласных: сравнение схем-моделей слов (*стол – стул*, *бак – бок – бук – бык*) с подставленными к ним буквами.

Обучение письму

Выработка правильной осанки. Расположение тетради на парте и умение держать карандаш и ручку при письме и рисовании.

Подготовительные упражнения для развития глазомера, кисти руки и мелких мышц пальцев: обводка и штриховка контуров, преобразование фигур, рисование и раскрашивание узоров и бордюров.

Знакомство с основными элементами букв, их названиями.

ОСНОВНОЙ (БУКВАРНЫЙ) ПЕРИОД
(112 ч)

Обучение чтению

Согласные и гласные звуки и буквы, ознакомление со способом обозначения твердости и мягкости согласных с помощью гласных букв и ь (мягкого знака).

Чтение слогов СГ с ориентацией на гласную букву (с изученными согласными). Чтение слогов иной структуры (ГС, СГС, СГСС, ССГС и др.).

Составление из букв и слогов разрезной азбуки слов (после предварительного слого-звукового анализа, а затем и без него), их чтение.

Постепенное обучение осознанному, правильному и плавному слоговому чтению вслух отдельных слов, коротких предложений и небольших текстов, доступных учащимся по содержанию, на основе правильного и быстрого узнавания букв и буквосочетаний СГ в словах (сначала разделенных на произносительные единицы с помощью специальных вспомогательных помет, а затем и без них), места ударения в словах (по знаку ударения).

Практическое знакомство со знаками препинания при чтении предложения («.», «!», «?», «,»).

Чтение предложения с паузами и интонациями, соответствующими знакам препинания.

Знакомство с правилами гигиены чтения.

Обучение письму

Знакомство с начертанием всех заглавных и строчных букв, основными типами их соединения в буквосочетаниях СГ и вне их.

Обозначение звуков соответствующими буквами, написанными от руки. Выработка связного и ритмичного написания букв и их соединений в слогах и словах. Правильное расположение букв, слогов и слов на строке.

Запись слов и предложений с проговариванием по слогам после предварительного слого-звукового разбора с учителем, а впоследствии и самостоятельно.

Формирование умения переводить печатный текст в письменный.

Алгоритм списывания. Списывание слогов, слов и предложений с образцов (сначала с письменного, а затем с печатного) с проговариванием. Проверка написанного путем

установления соответствия написанного с образцом и слогового орфографического прочтения написанных букв.

Алгоритм записи слова под диктовку. Письмо под диктовку букв, слогов и слов, написание которых не расходится с произношением.

Прописная буква в начале предложения, точка в конце. Ознакомление с правилом написания большой буквы в именах и фамилиях людей, кличках животных, названиях стран, городов, деревень, рек и озер.

Правописание **жи-ши, ча-ща, чу-щу**.

Привлечение внимания учащихся к словам, написание которых расходится с произношением (безударные гласные, парные звонкие и глухие согласные).

Закрепление и совершенствование продуктивных способов чтения слов и предложений. Чтение письменного текста.

Совершенствование речевого аппарата учащихся, навыков слого-звукового анализа слов, развитие устной речи.

ЗАКЛЮЧИТЕЛЬНЫЙ (ПОСЛЕБУКВАРНЫЙ) ПЕРИОД
(28 ч)

Обучение чтению

Навыки чтения. Правильное, плавное, слоговое чтение небольших текстов со всеми буквами алфавита. Приближение темпа чтения к скорости разговорной речи ученика. Соблюдение пауз.

Восприятие произведения. Эмоциональное восприятие содержания текста, эмоциональная оценка произведения.

Формирование умения отличать связный текст от набора предложений.

Воспроизведение содержания прочитанного: ответы на вопросы учителя, нахождение в тексте предложения для ответа на вопрос. Пересказ небольшого рассказа, сказки.

Высказывание своего отношения к прочитанному.

Объяснение заглавия прочитанного произведения, озаглавливание текстов без названия.

Развитие навыков осознанного чтения небольших произведений.

Культура речи. Отработка литературного произношения слов, предложений.

Использование в устной речи и при чтении пауз, интонаций, соответствующих знакам препинания.

Развитие эмоциональной, точной, образной речи учащихся.

Литературное творчество и импровизация. Дополнение сюжета прочитанного произведения. Подбор слов в рифму в неоконченных двустишиях и четверостишиях. Игра «Подскажи словечко».

Составление по картинке или серии картинок небольшого рассказа, сказки, небылицы.

Высказывание своих впечатлений от просмотренных мультфильмов, телепередач, театральных представлений. Высказывание своих впечатлений от экскурсий, наблюдений.

Чтение диалогов по ролям. Игры – драматизации сказок.

Инсценировка небольшого знакомого произведения.

Обучение письму

Обобщение, систематизация, закрепление знаний и умений, приобретенных в процессе обучения грамоте. Деление слов на слоги, перенос слов по слогам.

Совершенствование навыка письма. Соблюдение учащимися основных гигиенических требований к письму. Закрепление графически правильных начертаний букв и способов соединения их в слове. Упражнение учащихся в ритмичном письме букв, слогов, слов в небольших предложениях.

Совершенствование умения правильно (без пропусков, перестановок и искажений букв и слогов) списывать небольшие тексты с доски и учебника; писать под диктовку слова, написание которых не расходится с произношением.

Практическое применение правил правописания **жи-ши, ча-ща, чу-щу**; большой буквы в именах и фамилиях людей, кличках животных, названиях стран, городов, деревень, рек и озер; написания предложений (большая буква в начале, точка в конце предложения).

ВНЕКЛАССНОЕ ЧТЕНИЕ*

* Внеклассное чтение проводится один раз в две недели, занимая вторую часть урока чтения.

На занятиях по внеклассному чтению у учащихся формируется интерес к детской книге и самостоятельному чтению. Ведущий метод обучения – чтение – рассматривание детских книг.

Круг чтения. Небольшие художественные произведения (1–2 страницы) из детской книги объемом 10–20 страниц, заглавие которой, иллюстрации на обложке и в тексте точно соответствуют ее содержанию.

Тематика чтения. Произведения для чтения учителем вслух: авторские и народные произведения (рассказы, сказки, стихи, загадки). Основные темы детского чтения: о Родине, детях, дружбе, труде, животных, растениях, приключениях и волшебстве.

Работа с детской книгой. Формирование читательского кругозора (одна книга на каждом занятии); развитие интереса к книге и чтению; умение различать книги по содержанию, правильно называть их, прочитывая заглавие и фамилию автора; простейшие литературные игры по прочитанным в классе книгам; соблюдение правил гигиены чтения и сохранности книг.

В *послебукварный период* продолжается работа по формированию умения правильно называть книгу (заглавие, фамилия автора), узнавать знакомые эпизоды и ситуации на иллюстрациях детских книг, называть героев, воспроизводить содержание эпизодов с опорой на иллюстрацию, рассказывать о прочитанном.

Знакомство со школьной библиотекой. Выбор книги в библиотеке (книжные выставки, плакаты).

Правила обращения с книгой.

РАЗВИТИЕ РЕЧИ*

* Работа по развитию речи проводится на каждом уроке в течение учебного года.

Звуковая культура речи. Развитие слуховой памяти и речевого аппарата, внимания к звуковой стороне слышимой речи (своей и чужой). Совершенствование речевых навыков: обучение неторопливому темпу и ритму речи, правильному речевому дыханию, умеренной громкости и правильному интонированию (умение понижать и повышать голос).

Обучение произношению слов в соответствии с нормами орфоэпии, с соблюдением ударения.

Правильное произнесение звуков русского языка, верное употребление сходных звуков, наиболее часто смешиваемых учащимися: [л] – [р], [с] – [з], [с] – [ш], [з] – [ж], [ш] – [ж], [п] – [б] и т.д. (изолированное произнесение, а также в словах, фразах и скороговорках).

Работа над словом. Уточнение, обогащение и активизация словаря учащихся. Правильное понимание и употребление слов – названий предметов, признаков, действий, объяснение их значения. Тематическая группировка слов, их родовидовая соотнесенность.

Воспитание умения чувствовать и различать смысловые различия и оттенки значений слов (*слон*, *слоненок*, *слоник*), понимать простейшие случаи многозначности слов (*иголка ежа*, *елки*, *швейная*, *медицинская*), разграничивать омонимы (*лисички*, *коса*).

Выработка умений пользоваться словом в правильной грамматической форме.

Работа над предложением и связной устной речью. Составление предложений на определенную тему (по вопросам учителя).

Составление небольшого рассказа по картинке или серии картинок, по личным наблюдениям учащихся (под руководством учителя).

Обдумывание ответа на вопрос учителя, точное его формулирование, использование при ответе полных и неполных предложений.

Ответы на вопросы по содержанию прочитанных предложений и текстов.

Пересказ знакомой сказки или небольшого повествовательного рассказа (по вопросам учителя).

Рисование с помощью учителя словесной картинки по прочитанному произведению. Дополнение сюжета прочитанного произведения, самостоятельное придумывание событий, предшествующих изображенным или последующих.

Отгадывание загадок, объяснение смысла поговорок и пословиц, близких жизненному опыту учащегося.

Заучивание наизусть стихотворений, потешек, песенок, считалок и их воспроизведение с нужной интонацией.

Речевая этика. Культура общения. Слова, используемые при приветствии и прощании. Воспитание внимательного, доброжелательного отношения к ответам и рассказам других учащихся.

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Знать и понимать:

что язык является основным средством человеческого общения, что белорусский и русский языки – государственные языки Республики Беларусь;

важность умения правильно, грамотно говорить на русском языке, соблюдать правила речевого этикета;

все буквы русского алфавита, основные характеристики звуков речи (гласные и согласные, согласные мягкие – твердые, звонкие – глухие);

основное отличие звуков от букв (звуки произносим, буквы пишем);

способы обозначения мягкости согласных звуков на письме буквами ***е***, ***ё***, ***и***, ***ю***, ***я*** и мягким знаком.

Уметь:

вычленять слова в предложении, звуки в слове, определять их последовательность;

различать гласные и согласные звуки;

правильно произносить мягкие и твердые согласные звуки в слове и изолированно;

подбирать слова с заданным звуком;

определять место ударения в слове;

правильно, без искажений писать заглавные и строчные буквы, их соединения в словах;

правильно списывать слова и предложения, написанные от руки и напечатанные;

грамотно (без пропусков, искажений букв) писать под диктовку слова, написание которых не расходится с произношением;

употреблять заглавную букву в начале, точку в конце предложения;

употреблять заглавную букву в начале имен собственных (имен и фамилий людей, кличек животных, названий стран, городов, деревень, рек и озер);

слитно читать односложные и двухсложные слова и плавно по слогам – многосложные;

читать небольшие тексты и устно рассказывать о прочитанном;

правильно называть знакомые книги, персонажей любимых сказок, рассказов;

инсценировать известные литературные произведения, сценки из них;

знать наизусть 4–6 стихотворений, выразительно их декламировать.

Использовать приобретенные знания и умения в повседневном общении и в практической деятельности:

поддерживать разговор на знакомую тему, отбирая необходимые языковые средства для решения познавательных, практических и коммуникативных задач;

самостоятельно или по вопросам учителя пересказывать хорошо знакомое прослушанное или прочитанное художественное произведение;

составлять рассказ по картинке, по серии картинок, на заданную тему, рассказывать о событиях из личной жизни;

выразительно оформлять свое выказывание;

правильно произносить звуки русского языка;

самостоятельно подписать работу (рисунок, поделку и др.), употребляя заглавную букву для записи своего имени;

самостоятельно составить и записать небольшое письменное сообщение (1–2 предложения), адресованное родителям или другу;

самостоятельно читать печатный и письменный текст, адресованный ребенку (записки, небольшие письма, информационные сообщения);

самостоятельно или с помощью взрослого (педагога, библиотекаря, родителя) выбирать книгу по интересующей тематике;

самостоятельно читать небольшие по объему произведения из книг и журналов для детей, рассказывать о прочитанном.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Клышка, А.К. Букварь / А.К. Клышка. – Минск: Народная асвета, 2014.

Клышка, А.К. Пропись 1 / А.К. Клышка. – Минск: Нац. ин-т образования, 2015.

Клышка, А.К. Пропись 2 / А.К. Клышка. – Минск: Нац. ин-т образования, 2015.

Клышка, А.К. Письмо / А.К. Клышка. – Минск: Нац. ин-т образования, 2015.

Клышка, А.К. Букварь: страницы и уроки / А.К. Клышка. – Минск: Народная асвета, 2014.

Сторожева, Н.А. Букварь / Н.А. Сторожева. – Минск: Народная асвета, 2014.

Сторожева, Н.А. Пропись 1 / Н.А. Сторожева. – Минск: Нац. ин-т образования; Аверсэв, 2015.

Сторожева, Н.А. Пропись 2 / Н.А. Сторожева. – Минск: Нац. ин-т образования; Аверсэв, 2015.

Сторожева, Н.А. Письмо / Н.А. Сторожева. – Минск: Нац. ин-т образования; Аверсэв, 2015.

Сторожева, Н.А. Обучение грамоте в 1 классе / Н.А. Сторожева. – Минск: Народная асвета, 2014.

Тиринова, О.И. Внеклассное чтение в 1 классе / О.И. Тиринова. – Минск: Нац. ин-т образования, 2014.

Тиринова, О.И. Контрольно-измерительные материалы. Обучение грамоте. Тематический контроль. Контрольное списывание. Проверка навыка чтения. 1 класс / О.И. Тиринова. – Минск: Аверсэв, 2013.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова (Навучанне грамаце)» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне грамаце з’яўляецца пачатковым этапам сістэматычнага вывучэння беларускай мовы, забяспечвае лінгвістычнае і разумовае развіццё вучняў, дае вялікія магчымасці для вырашэння задач эстэтычнага і маральнага выхавання.

У працэсе навучання грамаце вучні не толькі авалодваюць моўнымі навыкамі – фанетычнымі, граматычнымі, лексічнымі, але і засвойваюць камунікатыўныя ўменні ў сферы зносін паміж сабой і з дарослымі. Важным з’яўляецца фарміраванне культуры маўлення і маўленчых зносін.

Чытанне і пісьмо як важныя віды маўленчай дзейнасці спачатку выступаюць толькі ў якасці прадмета навучання, а пасля становяцца сродкам навучання і развіцця вучняў.

Мэты навучання грамаце – фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеянняў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін. Пры гэтым веды, уменні і навыкі разглядваюцца не як мэта, а як сродак паўнацэннага развіцця асобы вучня.

Асноўнымі **задачамі** навучання грамаце выступаюць:

развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);

фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;

навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;

развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

узбагачэнне слоўнікавага запасу;

развіццё звязнага вуснага маўлення;

фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці.

Вядучымі падыходамі да пабудовы вучэбнага працэсу выступаюць асобасна арыентаваны, культуралагічны і кампетэнтнасны.

Асобасна арыентаваны падыход прадугледжвае ўлік інтарэсаў навучэнцаў і вызначэнне перспектыў развіцця кожнага вучня з улікам яго магчымасцей і здольнасцей.

У якасці галоўнага арыенціра *культуралагічнага падыходу* выступае фарміраванне творчай асобы вучня, развіццё яго як чалавека культуры, здольнага да культурнага самаразвіцця.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае атрыманне ў працэсе навучання грамаце асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў.

Да *асобасных вынікаў* належаць:

цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да мовы;

пазітыўныя адносіны да чытання, жаданне самастойна чытаць дзіцячыя кнігі;

імкненне авалодаць пісьмом як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў пісьмовай форме.

Метапрадметныя вынікі ўключаюць наступныя кампаненты:

дзейсны (здольнасць да актыўнай творчай дзейнасці ў пазнанні моўных з'яў);

інтэлектуальны (валоданне элементарнымі дзеяннямі аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення, класіфікацыі моўных адзінак);

камунікатыўны (уменне ўстанаўліваць кантакты, разумець выказванні іншага чалавека і выражаць свае пачуцці, эмоцыі, жаданні, задаваць пытанні, аргументаваць свае суджэнні);

інфармацыйны (здольнасць арыентавацца ў такіх крыніцах інфармацыі, як кніга, расказ дарослага або аднакласнікаў, схема; прымяняць атрыманую інфармацыю ў сваёй дзейнасці).

Прадметныя вынікі ўключаюць:

валоданне элементарнай тэхнікай чытання і пісьма;

валоданне першапачатковымі ўяўленнямі пра лексічныя, арфаэпічныя, граматычныя нормы беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету;

здольнасць будаваць нескладаныя звязныя выказванні для вырашэння камунікатыўных задач;

валоданне ўменнем спісваць невялікі тэкст, пісаць пад дыктоўку асобныя словы і сказы;

валоданне пачатковымі навыкамі сэнсавага чытання тэксту, чытацкай самастойнасці, наяўнасць чытацкага кругагляду – уяўленняў пра творы, іх аўтараў, жанры.

Курс навучання грамаце заканамерна падпарадкоўваецца ***агульным прынцыпам*** пабудовы зместу адукацыі: культураадпаведнасці, прадуктыўнасці, гуманізацыі, аптымізацыі, дыферэнцыяцыі, свядомасці і актыўнасці вучняў, пераемнасці адукацыі і інш.

Важным прынцыпам навучання грамаце з'яўляецца прынцып *мульцікультурнасці* – арыентацыі на асваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі. У працэсе навучання грамаце ажыццяўляецца нацыянальна-культурная сацыялізацыя вучня, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці на аснове лепшых узораў вуснай народнай творчасці і класічнай літаратуры для дзяцей.

Навучанне чытанню і пісьму арганізуецца ў адпаведнасці з прынцыпамі *прыродаадпаведнасці і індывідуалізацыі*, што мае на ўвазе ўлік узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў.

Навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму ажыццяўляецца на аснове ***гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду*** з шырокім выкарыстаннем гульнявых метадаў і прыёмаў.

У навучанні грамаце вызначальным з'яўляецца складовы (пазіцыйны) прынцып беларускай графікі. Ён знаходзіць сваё ўвасабленне ў абазначэнні мяккасці зычных і гука [й'] на пісьме. Толькі ў кантэксце склада, арыентуючыся на наступную галосную, вучань здольны вызначыць цвёрдасць і мяккасць зычнага і правільна прачытаць склад.

У працэсе навучання вучні знаёмяцца з гукавой сістэмай беларускай мовы, авалодваюць дзеяннямі гукавога аналізу слова, уменнем адрозніваць зычныя і галосныя гукі, знаёмяцца з літарамі як знакамі для абазначэння гукаў на пісьме.

На ўроках навучання грамаце ажыццяўляецца развіццё фанематычнага слыху вучняў, іх азнаямленне з асноўнымі лінгвістычнымі паняццямі – гукам, словам, сказам. Вучні атрымліваюць уяўленне пра складовую структуру слова, націск.

Змест навучання грамаце пабудаваны такім чынам, каб большасць зычных гукаў і іх літар вывучалася вучнямі раней за галосныя гукі і літары. На фоне засвоеных зычных гукаў і адпаведных літар у вучняў фарміруецца асэнсаванне галоснага ў складзе. Навучанне чытанню прамых складоў ажыццяўляецца «па падабенству» – **ма, на, ра, та, са** і г.д. Папярэдняе вывучэнне літар зычных гукаў дазваляе вучням хутка авалодаць чытаннем прамых складоў з кожным галосным гукам, што вывучаецца, і перайсці да чытання слоў.

Пасля асваення чытання складу і слова па складах вучні авалодваюць прыёмамі цэласнага чытання слова. Пачынаючы з этапа авалодання чытаннем цэлымі словамі і словазлучэннямі (сказамі), чытанне можа выступаць у якасці сродку навучання розным вучэбным прадметам.

Паралельна з навучаннем чытанню ажыццяўляецца ***падрыхтоўка рукі вучня да пісьма і навучанне ўласна пісьму***. Вучні авалодваюць уменнямі абазначаць на пісьме гукі літарамі, складаць словы з літар і складоў, правільна спісваць літары, склады, словы і кароткія сказы з пісьмовага і рукапіснага шрыфтоў, пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем, і кароткія сказы з такіх слоў.

На ўроках пісьма развіваюцца мелкія мышцы рукі, адпрацоўваюцца правільныя напісанні літар і іх рацыянальныя злучэнні ў словах, рытмічнасць і плаўнасць пісьма.

Адна з задач навучання пісьму – фарміраванне выразнага, разборлівага, дастаткова прыгожага пісьма, якое з'яўляецца неад'емнай прыметай культуры пісьмовых зносін. Нядбайнае пісьмо ўскладняе цэласнае ўспрыманне інфармацыі.

З мэтай захавання здароўя вучняў выключаецца патрабаванне абавязковага безадрыўнага напісання літар, складоў і слоў. У час пісьма вучню неабходны чаргаванні напружанняў і расслабленняў. Вучань мае права рабіць невялікія паўзы пасля прапісвання асобных элементаў, літар і складоў. Гэта дае магчымасць своечасова зняць мускульнае напружанне рукі і цела.

На занятках па ***пазакласным чытанні*** ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

Змест навучання грамаце структураваны па раздзелах: *навучанне грамаце; пазакласнае чытанне; развіццё маўлення.*

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(Агульная колькасць гадзін – 180[1])

[1] Настаўнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць вучняў, умовы іх работы.

Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаванымі: на адным і тым жа ўроку настаўнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

У навучанні грамаце вылучаюць перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны).

ПАДРЫХТОЎЧЫ (ДАБУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД
(12 гадзін)[2]

[2] На вывучэнне асобных тэм у вучэбнай праграме даецца прыкладная колькасць гадзін.

Агульнае ўяўленне аб вусным і пісьмовым маўленні

Падзел вуснага маўлення на сказы, фарміраванне элементарнага асэнсавання функцыі сказа (сказ выражае думку, у ім пра кагосьці або пра штосьці гаворыцца). Вызначэнне паслядоўнасці і колькасці слоў у сказе. Прыдумванне сказаў па малюнках з зададзенай колькасцю слоў, з апорай на схемы. Адлюстраванне з дапамогай схемы слоўнага склада сказа, яго лінейнасці (словы ідуць адно за адным). Работа над інтанацыяй сказа.

Знаёмства з намінатыўнай роляй слова, з тым, што слова мае значэнне (сэнс) – словамі называюць прадметы, іх прыкметы і дзеянні. Называнне аднаго і таго ж аб'екта рознымі словамі *(заяц*, *зайка*, *зайчык*, *бяляк...)*. Знаёмства з разнастайнасцю слоў (этыкетныя словы і выразы, формы слоў са значэннем ацэнкі *(мамачка*, *сынок*, *дачушка*, *добранькі…)*, словы розных тэматычных груп *(«Радзіма»*, *«сваякі»*, *«школьныя прыналежнасці»…)* і інш.).

Развіццё фанематычнага слыху, фарміраванне ўмення выдзяляць гукі ў слове.

Выдзяленне зычнага гука ў пачатку слова. Адрозніванне на слых і пры вымаўленні цвёрдых і мяккіх зычных. Падбор слоў з зададзеным гукам.

Падрыхтоўка рукі вучня да пісьма: расфарбоўка, маляванне ўзораў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках, напісанне элементаў літар, іх злучэнне.

Выпрацоўка правільнай паставы вучня, засваенне правіл размяшчэння сшытка на парце, умення трымаць ручку пры пісьме.

АСНОЎНЫ (БУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД

(140 гадзін)

Навучанне чытанню

Вывучэнне 10 літар, якія абазначаюць зычныя гукі ***(С, П, М, Т, Л, Н, Ш, Р, К, Д)***. Суаднясенне цвёрдых і мяккіх зычных гукаў і адпаведных літар. Распазнаванне літар па іх характэрных прыкметах (ізалявана і ў слове).

Падзел слоў на склады, вызначэнне колькасці і паслядоўнасці складоў у слове, абазначэнне складовага саставу слова на схеме.

Знаёмства з націскным складам. Вычляненне са слова і называнне націскнога складу. Знаёмства з сэнсаадрознівальнай роляй націску (праз параўнанне слоў тыпу *ка́ра – кара́*).

Вывучэнне галосных гукаў і адпаведных ім літар ***Аа, Яя, Уу, Іі, Оо, ы.*** Правільнае суаднясенне гукаў і літар.

Распазнаванне галоснага гука ў складах тыпу ЗГ («цвёрды зычны + галосны»). Чытанне такіх складоў пачаргова з вывучанымі літарамі галоснага гука (а, у, о, ы).

Адрозніванне на слых і пры вымаўленні зычных і галосных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных. Выдзяленне ў словах асобных гукаў. Гукавы аналіз слова (вызначэнне паслядоўнасці гукаў у слове, іх характарыстыка – галосны ці зычны, галосны націскны ці ненаціскны, зычны цвёрды ці мяккі). Падбор слоў з зададзеным гукам. Знаёмства на практычным узроўні са звонкімі і глухімі зычнымі.

Цэласнае чытанне трох- і чатырохлітарных слоў. Фарміраванне навыку чытання на тэкстах, якія складаюцца са слоў са складамі ЗГ на кожную вывучаную літару галоснага гука.

Вывучэнне астатніх літар, якія абазначаюць зычныя і галосныя гукі. Знаёмства з мяккім знакам і апострафам. Зварот асаблівай увагі на літары ***Яя, Юю, Ее, Ёё***, якія ўказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага. Чытанне слоў і тэкстаў з вывучанымі літарамі.

Паступовае навучанне свядомаму, правільнаму і плаўнаму чытанню ўголас і моўчкі асобных слоў, кароткіх сказаў і невялікіх тэкстаў, зразумелых вучням па змесце, на аснове правільнага і хуткага пазнавання літар, арыенціроўкі на літару галоснага гука.

Практычнае знаёмства са знакамі прыпынку пры чытанні сказаў («.», «!», «?», «,»).

Чытанне сказа з паўзамі і інтанацыямі, адпаведнымі знакамі прыпынку.

Знаёмства з правіламі гігіены чытання.

Навучанне пісьму

Абазначэнне гукаў адпаведнымі літарамі друкаванага (на ўроках чытання) і пісьмовага шрыфтоў. Знаёмства з напісаннем усіх вялікіх і малых літар, асноўнымі тыпамі іх злучэнняў. Выпрацоўка звязнага і рытмічнага напісання літар і іх злучэнняў у словах, правільнае суаднясенне літар па велічыні, нахілу, раўнамернае размяшчэнне літар і слоў у радку.

Запіс слоў і сказаў з прагаворваннем па складах пасля папярэдняга іх склада-гукавога разбору з настаўнікам, а затым і самастойна.

Алгарытм спісвання. Спісванне слоў і сказаў з узораў (пісьмовых і друкаваных) з арфаграфічным прагаворваннем. Праверка напісанага праз параўнанне з узорам.

Алгарытм пісьма пад дыктоўку. Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў і слоў, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка ў канцы яго. Вялікая літара ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр.

Прыцягванне ўвагі вучняў да слоў, напісанне якіх разыходзіцца з вымаўленнем (словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі).

Фарміраванне ўмення пераводзіць друкаваны тэкст у пісьмовы. Замацаванне і ўдасканаленне прадуктыўных спосабаў чытання слоў і сказаў. Чытанне пісьмовага тэксту.

Удасканальванне работы маўленчага апарату навучэнцаў, навыкаў склада-гукавога аналізу слоў, развіццё вуснага маўлення.

ЗАКЛЮЧНЫ (ПАСЛЯБУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД

(28 гадзін)

Навучанне чытанню

Абагульненне, замацаванне ведаў і ўменняў, набытых у працэсе падрыхтоўчага і асноўнага перыядаў навучання грамаце.

Удасканаленне навыку чытання. Навучанне прыёмам цэласнага чытання слова, плаўнаму, свядомаму чытанню сказа. Развіццё навыкаў асэнсаванага чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і інш.).

Развіццё ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць свае адносіны да прачытанага.

Чытанне дыялогаў па асобах. Інсцэніраванне невялікага знаёмага твора.

Навучанне пісьму

Удасканальванне навыку пісьма. Захаванне вучнямі асноўных гігіенічных патрабаванняў да пісьма. Замацаванне графічна правільных напісанняў літар і спосабаў злучэння іх у слове. Практыкаванні ў рытмічным напісанні літар, складоў, слоў, невялікіх сказаў (з 2–3 слоў).

Удасканальванне ўмення правільна (без пропускаў і перастановак літар і складоў) спісваць невялікія тэксты з дошкі і падручніка, пісаць словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Падзел слоў на склады, перанос слоў па складах.

Практычнае прымяненне правіл аб вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр; аб напісанні сказаў (вялікая літара ў пачатку, кропка ў канцы сказа).

ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ[3]

[3] Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

На занятках па пазакласным чытанні ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання. Вядучы метад навучання – чытанне-разгляд дзіцячых кніг.

Кола чытання. Невялікія мастацкія творы беларускіх і рускіх (у перакладзе на беларускую мову) пісьменнікаў (1–2 старонкі) з дзіцячай кнігі аб'ёмам 10–20 старонак, назва якой, ілюстрацыі на вокладцы і ў тэксце поўнасцю адпавядаюць яе зместу. Дзіцячыя кнігі ў адпаведным афармленні (багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам).

Тэматыка чытання. Творы для чытання настаўнікам услых: аўтарскія, народныя творы (вершы, дзіцячыя песні, казкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, апавяданні). Асноўныя тэмы дзіцячага чытання: пра Радзіму, дзяцей, сяброўства, працу, жывёл, расліны, прыгоды і чарадзейства.

Работа з дзіцячай кнігай. Фарміраванне чытацкага кругагляду (адна кніга на кожным занятку); выхаванне цікавасці да дзіцячых кніг, выпрацоўка ўмення адрозніваць

кнігі па змесце, правільна называць іх, прачытваючы прозвішча аўтара і загаловак; удзел у самых простых літаратурных гульнях па прачытаных у класе кнігах; выкарыстанне ўзораў літаратурнай мовы (загадкі, песенькі і г.д.); выкананне правіл гігіены чытання і захавання кніг.

У *паслябукварны перыяд* працягваецца работа па фарміраванні ўменняў правільна называць кнігу (загаловак, прозвішча аўтара), чытаць услых назву дзіцячай кнігі на вокладцы, тлумачыць назву і суадносіць са зместам твора, пазнаваць знаёмыя эпізоды і сітуацыі на ілюстрацыях дзіцячых кніг, называць герояў, узнаўляць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю, расказваць аб прачытаным.

Знаёмства са школьнай бібліятэкай. Выбар кнігі ў бібліятэцы (кніжная выстава, ілюстраваны рэкамендацыйны спіс, плакат).

РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ[4]

[4] Работа па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку на працягу вучэбнага года.

Гукавая культура маўлення. Развіццё слыхавой памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку мовы (сваёй і чужой). Удасканальванне моўных навыкаў: навучанне нармальнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму маўленчаму дыханню, патрэбнай гучнасці (уменне гаварыць без напружання) і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Навучанне вымаўленню слоў у адпаведнасці з нормамі арфаэпіі, з захаваннем націску.

Правільнае вымаўленне гукаў беларускай мовы, дакладнае ўжыванне падобных гукаў, якія найбольш часта блытаюць вучні: [л]–[р], [с]–[з], [ш]–[ж], [п]–[б], [с]–[ш] і г.д. (ізаляванае вымаўленне, а таксама ў словах, фразах і скорагаворках).

Работа над словам. Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў. Правільнае разуменне і ўжыванне слоў – назваў прадметаў, прымет, дзеянняў і тлумачэнне іх значэння. Тэматычная групоўка слоў, іх рода-відавое суаднясенне.

Выхаванне чуйнасці да сэнсавых адценняў слоў (*слон*, *слонік*, *сланяня*), адрозніванне і разуменне самых простых выпадкаў мнагазначнасці слоў (*іголка швейная*, *медыцынская і інш.*), аманіміі (*лісічкі*, *каса*).

Выпрацоўка ўмення карыстацца словам у правільнай граматычнай форме.

Выкарыстанне слоў ветлівасці.

Работа над сказам і звязным маўленнем. Абдумванне адказаў на пытанні настаўніка, дакладнае іх фармуляванне, ужыванне ў адказе сказаў рознага тыпу.

Пераказ знаёмай казкі ці невялікага апавядання (па пытаннях настаўніка).

Складанне па малюнку ці серыі малюнкаў невялікага апавядання (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Адказы на пытанні па прачытаных сказах і тэкстах.

Слоўнае маляванне з дапамогай настаўніка па прачытаным творы. Дапаўненне сюжэта, самастойнае прыдумванне падзей, як папярэдніх, так і наступных.

Выказванне сваіх уражанняў ад прагледжаных мультфільмаў, тэлеперадач, тэатральных спектакляў, экскурсій, назіранняў.

Адгадванне загадак, тлумачэнне сэнсу прыказак і прымавак, блізкіх да жыццёвага вопыту вучняў.

Завучванне на памяць вершаў, пацешак, песень, лічылак і ўзнаўленне іх з захаваннем інтанацыі, якая дыктуецца зместам.

Выхаванне ўважлівых і добразычлівых адносін да адказаў і паведамленняў іншых вучняў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць/разумець:

што мова з’яўляецца асноўным сродкам зносін паміж людзьмі, што беларуская і руская мовы – дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь;

важнасць умення правільна гаварыць на беларускай мове, захоўваць правілы маўленчага этыкету;

усе літары беларускага алфавіта, асноўныя характарыстыкі гукаў мовы (галосныя і зычныя гукі, зычныя мяккія – цвёрдыя, звонкія – глухія);

асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі вымаўляем, літары пішам);

спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я*** і мяккім знакам.

Умець:

вычляняць словы ў сказе, гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;

адрозніваць галосныя і зычныя гукі;

правільна вымаўляць мяккія і цвёрдыя зычныя гукі ў слове і ізалявана;

падбіраць словы з зададзеным гукам;

вызначаць месца націску ў слове;

правільна, без скажэнняў пісаць малыя і вялікія літары, іх злучэнні ў словах;

правільна спісваць словы і сказы, напісаныя ад рукі і надрукаваныя;

граматна (без пропускаў, скажэнняў літар) пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем;

ужываць вялікую літару ў пачатку, кропку ў канцы сказа;

ужываць вялікую літару на пачатку ўласных імёнаў (імёнаў і прозвішчаў людзей, мянушак жывёл, назваў гарадоў і вёсак, краін, рэк і азёр);

злітна чытаць аднаскладовыя і двухскладовыя словы і плаўна па складах – шматскладовыя;

чытаць невялікія тэксты і вусна расказваць аб прачытаным;

правільна называць знаёмыя кнігі, персанажаў любімых казак, апавяданняў;

інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, сцэнкі з іх;

ведаць на памяць 4–6 вершаў, выразна іх чытаць.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў штодзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

падтрымліваць размову на знаёмую тэму, адбіраючы неабходныя моўныя сродкі для вырашэння пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач;

самастойна або па пытаннях настаўніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;

складаць апавяданне па малюнку, па серыі малюнкаў, на зададзеную тэму, расказваць пра падзеі з асабістага жыцця;

інтанацыйна афармляць сваё выказванне;

правільна вымаўляць гукі беларускай мовы;

самастойна падпісваць работу (малюнак, выраб і інш.), выкарыстоўваючы вялікую літару для запісу свайго імя;

самастойна скласці і запісаць невялікае пісьмовае паведамленне (1–2 сказы), адрасаванае бацькам або сябру;

самастойна чытаць друкаваны і пісьмовы тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія лісты, інфармацыйныя паведамленні);

самастойна або пры дапамозе дарослых (выкладчыка, бібліятэкара, бацькоў) выбіраць кнігу па тэме, якая зацікавіла;

самастойна чытаць невялікія па аб’ёму творы з кніг, часопісаў для дзяцей, расказваць аб прачытаным.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Клышка, А.К. Буквар / А.К. Клышка. – Мінск: Народная асвета, 2014.

Клышка, А.К. Пропісь 1 / А.К. Клышка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.

Клышка, А.К. Пропісь 2 / А.К. Клышка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.

Клышка, А.К. Пісьмо / А.К. Клышка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.

Клышка, А.К. Буквар: старонкі і ўрокі / А.К. Клышка. – Мінск: Народная асвета, 2014.

Буторына, І.А. Пазакласнае чытанне ў 1 класе / І.А. Буторына. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2013.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца ў рэчышчы стратэгічнай мэты моўнай адукацыі і рэалізуе паступовае фарміраванне ў вучняў у працэсе асобасна арыентаванай вучэбнай дзейнасці першапачатковых прадметных кампетэнцый: лінгвакультуралагічнай, моўнай, камунікатыўнай. Вучэбнай праграмай прадугледжваецца паступовае комплекснае асваенне вызначаных прадметных кампетэнцый.

Выкладанне беларускай мовы ў I класе пачынаецца вусным курсам. Яго змест прадугледжвае развіццё ў вучняў уменняў, якія адносяцца да вядучых у агульнай сістэме чалавечых здольнасцей: асэнсавана, крытычна слухаць, эмацыянальна ўспрымаць пачутае і рэагаваць на яго. На ўроках ствараецца беларускамоўнае асяроддзе, у якое паступова і ашчадна ўключаецца вучань. Дамінантай зместу вуснага курса з'яўляецца асэнсаванае ўспрыманне на слых, чым забяспечваецца пераемнасць паміж дзіцячым садам і школай па фарміраванні маўленчых уменняў вучняў.

Мэта вуснага курса – стварэнне маўленчай базы для асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы, паведамленне элементарных лінгвакультуралагічных звестак, забеспячэнне станоўчага эмацыянальнага фону і матывацыі вывучэння беларускай мовы. **Асноўнымі задачамі** навучання беларускай мове ў I класе з'яўляюцца:

у межах лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі: пазнаёміць вучняў з этыкетнымі словамі і выразамі, асэнсоўваць вылучаную настаўнікам лінгвакультуралагічную інфармацыю праслуханых тэкстаў;

у межах моўнай кампетэнцыі: вучыць правільна артыкуляваць гукі [ў], [г], [ч], [дз'], [дж], [р], [ц'], спалучэнне гукаў [шч], вызначаць іх наяўнасць і месца ў словах, словы з гэтымі гукамі ў маўленчай плыні;

у межах камунікатыўнай кампетэнцыі: фарміраваць комплекс уменняў асэнсаванага ўспрымання беларускага маўлення на слых, знаёміць з актуальнай лексікай са зместу праслуханых твораў, ствараць умовы для яе выкарыстання вучнямі ў гутарцы па праслуханым, паступова фарміраваць першапачатковы навык чытання па-беларуску.

Дзейнасны змест працы па фарміраванні ўменняў і навыкаў ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці, выхаванні камунікатыўнай культуры вучняў, якая прадугледжвае правільнае словаўжыванне, захаванне вымаўленчых нормаў, валоданне этыкетам суразмоўніцтва падаецца ў раздзеле «Развіццё маўлення вучняў».

На кожным уроку вуснага курса прапануюцца заданні на развіццё здольнасцей асэнсавана ўспрымаць беларускае маўленне пры слуханні і чытанні, адказваць на пытанні. На ўроку арганізуецца і праводзіцца работа па асэнсаванні вучнямі зместу і лексікі тэкстаў. У адукацыйным працэсе ствараюцца ўмовы, каб вучань мог успрыняць і адчуць прыгажосць, мілагучнасць, выразнасць беларускай мовы, спасцігнуць культурныя

традыцыі, маральныя каштоўнасці беларускага народа, пазнаёміцца са звычаямі і светапоглядам беларусаў.

Навучанне беларускай мове заснавана на паступовым мэтанакіраваным авалоданні ёю як сродкам зносін у працэсе суразмоўніцтва. Практычнае авалоданне лексічным багаццем мовы ажыццяўляецца ў час суразмоўніцтва па змесце пачутага ці прачытанага, у працэсе вядзення дыялогаў. У час суразмоўніцтва адбываецца практычнае асваенне вучнямі маўленчага этыкету.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(30 гадзін)

ВУСНЫ КУРС

Вучымся слухаць і вымаўляць (10 гадзін)

Адрозніванне беларускага маўлення ад рускага на слых.

Артыкуліраванне гукаў беларускай мовы [ў], [г], [ч], [дз’], [дж], [р], [ц’], спалучэння [шч], распазнаванне іх у словах, вымаўленне слоў з гэтымі гукамі.

Слуханне і разуменне агульнага зместу твора з апорай на малюнкавы рад.

Знаёмства з беларускай лексікай на матэрыяле праслуханых твораў па тэмах:

«Наша мова» – уводная тэма *(1 гадзіна)*;

«Я і мая школа»: «Настаўніца і вучні», «Вучэбныя рэчы», «Школьныя памяшканні», «Вучэбныя заняткі» *(4 гадзіны)*;

«Я і мая сям’я»: «Мае сваякі», «Мая кватэра», «Рэжым дня», «Асабістая гігіена», «Адзенне і абутак» *(5 гадзін)*.

Вучымся слухаць і адказваць (11 гадзін)

Удасканаленне вымаўленчых навыкаў: трэніроўка ў вымаўленні гукаў [ў], [г], [ч], [дз’], [дж], [р], [ц’], спалучэння [шч] і вызначэнне месца гука ў слове, слоў з гэтымі гукамі, іх арфаэпічна правільнае вымаўленне.

Слуханне і разуменне агульнага зместу твора. Суаднясенне зместу твора з дэфармаваным малюнкавым радам.

Прапедэўтычнае навучанне чытанню на беларускай мове: правільнае асэнсаванае чытанне слоў, якія звязаны з праслуханым творам і не маюць гукаў [ў], [г], [ч], [дз’], [дж], [р], [ц’], спалучэння [шч].

Знаёмства з беларускай лексікай на матэрыяле праслуханых твораў па тэмах:

«Я і мае сябры»: «Знаёмімся з сябрамі», «Гуляем разам», «Запрашаем на дзень нараджэння» *(3 гадзіны)*;

«Я і мае справы»: «У доме (хаце)», «На вуліцы (у двары)», «У краме», «На пошце» *(4 гадзіны)*;

«Я і навакольны свет»: «Надвор’е, з’явы прыроды», «Поры года і занятак людзей», «Я і жывёльны свет», «Я і раслінны свет» *(4 гадзіны)*.

Вучымся слухаць, чытаць і адказваць (9 гадзін)

Удасканаленне вымаўленчых навыкаў: правільнае вымаўленне гукаў [ў], [г], [ч], [дз’], [дж], [р], [ц’], спалучэння [шч] падчас гаварэння і чытання, вызначэнне слоў з гэтымі гукамі і месца гукаў у словах.

Слуханне і разуменне зместу твора. Гутарка па праслуханым на аснове малюнкавага раду.

Практическая деятельность. Анализ изменения свойств материала при засушивании. Анализ готовых изделий. Составление плана работы. Моделирование на бумаге. Изготовление изделий по образцу, по представлению: выбор основы, подбор листьев, составление композиции, *разметка расположения листьев на основе**, наклеивание засушенных листьев на основу, анализ выполненных работ.

Примерные учебные задания:

Декоративные элементы интерьера: панно «Ковер из осенних листьев», «Узоры осени», «Осенняя сказка», узор из листьев в полосе, квадрате.

ТЕХНОЛОГИЯ ХОЗЯЙСТВОВАНИЯ

(3 ч)

Обеспечение быта семьи

(3 ч)

Теоретические сведения. Виды деятельности по самообслуживанию в домашних условиях. Слова «хочу» и «надо» в наших семьях. Электрические помощники. Экономия электроэнергии и воды.

Оформление интерьера комнаты к празднику. Оформление подарков.

Сервировка праздничного стола к чаю. Необходимая посуда. Складывание бумажных салфеток. Культура поведения за столом.

Профессиональная ориентация. Профессии типа «человек–человек» (по Е.А.Климову). Беседа «Дружно не грузно, а врозь – хоть брось».

Межпредметные связи.

Человек и мир: я и моя семья. Обязанности ребенка в семье. Опасные ситуации дома. Правила личной гигиены. Как ухаживать за одеждой и обувью.

Русский язык и литературное чтение: восприятие и анализ произведений (загадок, пословиц, сказок и т.д.). Литературное творчество и импровизация (составление рассказов, сказок). Культура речи.

Практическая деятельность. Организационно-деятельностная игра «Мамины (папины) помощники». Оформление подарков, классного кабинета к празднику (коллективная работа). Сервировка стола к чаю.

ТЕХНОЛОГИЯ РАСТЕНИЕВОДСТВА

(1 ч)

Уход за комнатными растениями

(1 ч)

Теоретические сведения. Красота и польза комнатных растений. Правила ухода за комнатными растениями.

Профессиональная ориентация. Профессии типа «человек–природа» (по Е.А.Климову).

Межпредметные связи.

Человек и мир: растения – часть живой природы. Разнообразие и красота растений.

Литературное чтение и русский язык: обогащение словарного запаса (названия растений).

Практическая деятельность. Полив и опрыскивание растений, рыхление почвы, удаление пыли с листьев, мытье поддонов.

Я И МИР ТЕХНОЛОГИЙ
(1 ч)

Подведение итогов года. Выставка изделий, изготовленных в текущем году. Презентация и анализ лучших изделий.

Рекомендации по заготовке летом природного материала, необходимого для работы во II классе: шишки, желуди, каштаны, веточки, скорлупа лесных и грецких орехов, корни деревьев, перья и др.; цветы, листья, веточки растений, засушенные в плоскости, соломка.

Практическая деятельность. Выполнение коллективной работы с использованием изученных материалов и освоенных технологических операций.

Примерное итоговое задание: коллективная работа «Танец бабочек».

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Владеть способами деятельности

следовать правилам:

безопасности труда, рациональной организации рабочего места и личной гигиены;

бережного отношения к природе, инструментам, предметам быта;

экономного расходования материалов;

трудовой дисциплины;

иметь представление:

о профессиях людей из ближайшего окружения;

о видах народных ремесел (вытинанка, флористика);

распознавать:

виды бумаги, природные материалы, хлопчатобумажные ткани (ситец, фланель), изученные нетрадиционные материалы;

линии сгиба и разреза;

соединение деталей склеиванием, связыванием, скрепление пластилином;

характеризовать:

основные инструменты при работе с бумагой, текстильными и природными материалами, их назначение и правила работы с ними;

читать и понимать:

простейшие схемы складывания оригами;

осуществлять (выполнять):

организацию своего рабочего места;

разметку бумаги по шаблону, трафарету, сгибанием, разметку ткани по лекалу;

обрывание бумаги, резание бумаги, ткани, ниток, шпагата и др.;

соединение деталей из бумаги, текстильных, природных и нетрадиционных материалов (склеивание, скрепление пластилином, связывание, нанизывание и др.);

изготовление изделий под руководством учителя по образцу, эскизу, рисунку;

отделку и украшение готовых изделий;

простейшие работы по уходу за комнатными растениями;

сервировку стола к чаю.

Использовать приобретенные навыки в практической деятельности и повседневной жизни

планировать свою деятельность и контролировать ее ход;

осуществлять организацию своего рабочего места;

осуществлять технологический процесс изготовления изделий под руководством учителя или взрослого по образцу, эскизу, рисунку;

осуществлять отделку и украшение готовых изделий;

осуществлять простейшие работы по уходу за комнатными растениями;

осуществлять сервировку стола к чаю;

соблюдать правила личной гигиены и безопасной работы с материалами, инструментами, электроприборами.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Журба, А.Ф. Працоўнае навучанне. 1 клас / А.Ф. Журба, Н.А. Юрчанка. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2010.

Журба, А.Ф. Трудовое обучение в 1 классе / А.Ф. Журба, Н.А. Юрченко. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010.

Юрченко, Н.А. Контрольно-измерительные материалы. Трудовое обучение. Задания для тематического контроля. 1 класс / Н.А.Юрченко. – Минск: Аверсэв, 2013.

Материально-техническое оснащение:

инструменты и приспособления: ножницы школьные, линейка, карандаш, кисточка для клея, толстая игла (штопальная), стеки, подкладная доска, пульверизатор, лейка;

основные материалы: бумага (писчая (белая и цветная), чертежная, оберточная, бархатная, крепированная), тонкий картон; хлопчатобумажная ткань (ситец, фланель); нитки; природные материалы (шишки, желуди, каштаны, веточки, плоды рябины, боярышника, барбариса и др.), засушенные листья; шпагат, тонкий шнур, тесьма, веревка; соломинки для коктейля, трубочки от фломастеров, стержней, конфет; бумажные салфетки.

вспомогательные материалы: клей ПВА, клеящий карандаш, пластилин.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Працоўнае навучанне на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – арганічная састаўная частка адзінай сістэмы навучання, выхавання і развіцця вучняў. На занятках па працоўным навучанні адбываецца фарміраванне ведаў, уменняў, вопыту практычнай дзейнасці, якія маюць інтэгратыўны характар з прыродазнаўча-навуковымі і гуманітарнымі прадметамі, а таксама фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да працэсу і выніку вучэбна-працоўнай дзейнасці. Менавіта на занятках па працоўным навучанні магчыма рэалізацыя міжпрадметных сувязей і фарміраванне ўяўленняў аб разнастайных тэхналогіях, іх узаемасувязі з прыродай, грамадствам, а таксама ўплыў на жыццядзейнасць кожнага чалавека.

Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» з'яўляецца фарміраванне асноў тэхналагічнай культуры вучняў. Дасягненне гэтай мэты забяспечваецца пры дапамозе фарміравання ў вучняў асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый.

Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» мяркуюць стварэнне ўмоў для фарміравання ў вучняў асноў кампетэнцый:

мэтаматывацыйнай – здольнасці да каштоўнаснага і эмацыянальна-валявога ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, да рэалізацыі творчых задум у працэсе вучэбна-пазнавальнай, пераўтваральнай і стваральнай дзейнасці;

рэфлексійна-ацэначнай – здольнасці да самакантролю і самааналізу;

інфармацыйна-камунікацыйнай – здольнасці пошуку інфармацыі, стварэння ўласнага інфармацыйнага прадукту (малюнак, эскіз і інш.);

камунікатыўнай – здольнасці да прадуктыўнага супрацоўніцтва ў калектыўнай дзейнасці;

прафарыентацыйнай – здольнасці арыентавацца ў свеце прафесій, сферах працоўнай дзейнасці чалавека;

праектна-канструктарскай – здольнасці чытання графічнага відарыса вырабу, які мадэлюецца (канструіруецца), дзякуючы фарміраванню элементарных тэхніка-тэхналагічных ведаў;

праектна-тэхналагічнай – здольнасці чытання тэхналагічнай дакументацыі (графічнага відарыса паслядоўнасці выканання тэхналагічных аперацый, схем складання), па якой выконваецца выраб;

выканальніцкай – здольнасці да стваральнай і пераўтваральнай дзейнасці ў адпаведнасці з канструктарскай і тэхналагічнай дакументацыяй дзякуючы авалоданню культурай працы і спосабамі дзейнасці па выкананні асноўных тэхналагічных аперацый ручной працы.

Асноўнымі падыходамі, што рэалізуюцца на занятках па працоўным навучанні, з'яўляюцца: асобасна арыентаваны, дзейнасны і кампетэнтнасны.

Асобасна арыентаваны падыход на вучэбных занятках па працоўным навучанні патрабуе ўліку індывідуальных асаблівасцей вучняў, іх інтарэсаў, здольнасцей, каштоўнасных арыентацый, суб'ектыўнага вопыту, што дазваляе стварыць умовы кожнаму вучню для паспяховай рэалізацыі сябе ў спазнанні і дзейнасці.

Згодна з дзейнасным падыходам засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца ў працэсе ўласнай актыўнай дзейнасці. Дзейнасць пры гэтым разглядаецца як крыніца фарміравання асобы і галоўны фактар яе развіцця. У працэсе навучання важна актыўнае выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці (пазнавальнай, праектнай, камунікатыўнай, гульнявой, прыродаахоўнай).

Згодна з кампетэнтнасным падыходам галоўнае ў працэсе навучання – не фарміраванне асобных ведаў і ўменняў, а стварэнне ўмоў для развіцця здольнасці ажыццяўляць прадугледжаныя праграмай віды і спосабы дзейнасці. У змесце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» выдзелены кампетэнцыі, якія ўяўляюць сабой сукупнасць інфармацыйных адзінак, якія ўключаюць тэарэтычныя звесткі, спосабы дзейнасці, тэхналагічныя аперацыі і працэсы, якія адлюстроўваюць змест і характар пэўнага віду дзейнасці.

Праграма прадугледжвае пераемнасць навучання ва ўстановах дашкольнай адукацыі, на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Апора на вопыт вучняў, улік іх здольнасцей і магчымасцей садзейнічаюць дасягненню неабходнага ўзроўню засваення зместу навучання.

Змест працоўнага навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўключае вывучэнне наступных асноўных раздзелаў:

«Тэхналогія і грамадства»;

«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»;

«Тэхналогія народных рамёстваў»;

«Тэхналогія гаспадарання»;

«Тэхналогія раслінаводства»;

«Я і свет тэхналогій».

Раздзел ***«Тэхналогія і грамадства»*** дазваляе вучням усвядоміць узаемаўплыў тэхналогіі і грамадства (вытворчасці); актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дашкольнай адукацыі, стварыць арыенціровачную аснову для паспяховага навучання, пазнаёміць з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспекі працы.

У межах раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжана выкарыстанне вялікай разнастайнасці матэрыялаў як традыцыйных (папера, кардон, тканіна, ніткі, прыродныя матэрыялы), так і нетрадыцыйных (шпагат, тонкі шнур, саломінкі для кактэйлю і інш.), што забяспечвае магчымасць не толькі азнаямлення з шырокім пералікам матэрыялаў, але і спрыяе развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі вучняў.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць з найбольш даступнымі для вучняў I класа рамёствамі: выцінанка, фларыстыка. Арганізуючы заняткі ў рамках дадзенага раздзела, неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляценне, інкрустацыя саломкай, ткацтва, вышыўка, роспіс, фларыстыка, кераміка і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** спрыяе фарміраванню вопыту па самаабслугоўванні, культуры паводзін у побыце, выхаванню самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць вучняў з прыёмамі вырошчвання пакаёвых раслін і догляду іх.

Раздзел ***«Я і свет тэхналогій»*** прызначаны для падвядзення вынікаў навучання за год, аналізу вучэбна-працоўных дасягненняў кожнага вучня, вызначэння ўзроўню засваення вывучаных тэхналогій. У дадзеным раздзеле прадугледжана выкананне калектыўнага выніковага задання, у рамках якога кожны вучань стварае выраб на зададзеную тэму. Матэрыялы і тэхналогію вырабу вучні выбіраюць па ўласным жаданні.

Асноўнымі метадамі працоўнага навучання з'яўляюцца: дэманстрацыя, практыкаванні, доследы і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, якія рэалізуюцца ў працэсе выканання вучнямі канкрэтных вырабаў, якія адпавядаюць патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка вучэбнага часу (не менш за 80 %) адводзіцца практычнай дзейнасці вучняў. На выкананне вырабу можа адводзіцца 1 ці 2 вучэбныя заняткі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму работы. Настаўнік можа выбраць любы з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні») ці падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія вырабу якіх адпавядае зместу раздзела, які вывучаецца. Настаўніку даецца магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % вучэбнага часу па ўласным меркаванні пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, якія прыведзены ў адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на вучэбных занятках, сустрэчы з людзьмі розных прафесій, прагулкі, экскурсіі.

У праграме выдзелены міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэграцыйны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

Курсівам з зорачкай пазначаны тэмы, якія з'яўляюцца неабавязковымі для вывучэння і могуць вывучацца па меркаванні настаўніка.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(30 гадзін)

ТЭХНАЛОГІЯ І ГРАМАДСТВА
(2 гадзіны)

Уводзіны ў прадмет «Працоўнае навучанне»

Тэарэтычныя звесткі. Чалавек, прырода, грамадства і свет тэхналогій. Праца ў нашым жыцці. Ручная праца. Прыгажосць і карысць рэчаў, якія вырабляюцца.

Крыніцы інфармацыі: падручнік, альбом «Цуда-майстэрня», сшытак самаацэнкі і інш.

Разнастайнасць канструкцыйных і прыродных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў. Беражлівыя адносіны да прыроды і навакольных прадметаў. Правілы арганізацыі рабочага месца. Правілы бяспекі працы. Рабочае адзенне.

Што мы ўмеем рабіць сваімі рукамі? (Гутарка пра вырабы, якія вучні стваралі ва ўстановах дашкольнай адукацыі і ў хатніх умовах.)

Пераемныя сувязі (з дашкольнай адукацыяй). Ручная праца. Самаабслугоўванне. Гаспадарча-бытавая праца. Праца ў прыродзе. Канструяванне. Дзіцячы дызайн. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Прафесійная арыентацыя. Людзі розных прафесій. Прафесіі бацькоў.

Практычная дзейнасць. Вызначэнне канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў на аснове дэманстрацыі вырабаў настаўнікам. Арганізацыя рабочага месца.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Прыстасаванні для работы: падстаўка для памазкоў для клею.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: складванне сурвэтак (з вопыту дашкольнай адукацыі).

ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ

(18 гадзін)

Выкананне вырабаў з паперы і кардону

(9 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі. Віды паперы: паліграфічная, чарцёжная, абгортачная, газетная. Уласцівасці паперы: трываласць; шурпатасць; тэхналагічныя ўласцівасці (здольнасць да згінання, скручвання, разрыву, разразання, склейвання); колер. Сыравіна для вытворчасці паперы – драўніна і макулатура. Прымяненне паперы.

Асноўныя геаметрычныя фігуры: квадрат, прамавугольнік, трохвугольнік, многавугольнік, круг. Арнамент з геаметрычных фігур у паласе. Рытм у арнаменце. Правілы пабудовы кампазіцыі.

Элементы графічнай граматы: лінія разрэзу, лінія згібу, месцы нанясення клею. Схемы складання арыгамі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблону, трафарэта, згінаннем; абрыванне, згінанне, рэзанне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя віды паперы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, гладзілка, памазок для клею і інш.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Прафесійная дзейнасць людзей па вырабу паперы. Гутарка «Як зрабілі сшытак?»

Міжпрадметныя сувязі.

Матэматыка: узаемнае размяшчэнне прадметаў. Прамая і крывая лініі. Адрэзак. Даўжыня адрэзка. Вымярэнне даўжыні адрэзка. Сантыметр.

Выяўленчае мастацтва: кампазіцыя – запаўненне ўсёй паверхні плоскасці аркуша паперы. Гарманічнае размяшчэнне малюнка на аркушы паперы. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру малюнка памерам аркуша паперы. Узаемасувязь фігур кампазіцыі. Развіццё навыкаў самастойнага пошуку кампазіцыі. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні. Фарміраванне паняцця пра форму, яе прапорцыі. Элементарнае ўяўленне пра выразнасць колеру: колер радасны і сумны. Арнамент.

Чалавек і свет: уплыў людзей на жыццё раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (драўніна, макулатура, трываласць, шурпатасць).

Практычная дзейнасць. Вывучэнне ўласцівасцей паперы. Параўнанне ўласцівасцей розных відаў паперы. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх выяў. Чытанне схем складання арыгамі і графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, з элементамі творчасці: выбар матэрыялу, разметка дэталей квадратнай формы згінаннем, разметка дэталей па шаблоне, трафарэце, згінанне, абрыванне, выразанне па знешніх контурах, кампаноўка дэталей на аснове, наклейванне, склейванне, ацэнка гатовага вырабу і працэсу яго стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Прыстасаванні для працы: каробачка для абрэзкаў паперы, закладка для кніг.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Караблік у моры», «Пунсовы ветразь», «Семіколеравая кветачка», «Ураджай» – абрыўная аплікацыя. «Матылькі», «Замак», «Машына», «Пунсовая кветачка» – аплікацыя з геаметрычных фігур. «Квітнеючы луг», «Рыбкі ў акварыуме», «На паляне», «Падарожжа на машыне», «У цырку» – сюжэтная аплікацыя. Упрыгожанні да свята (ланцужкі, зорачкі, сняжынкі) – канструяванне з палосак паперы.

Цацкі: фігуркі жывёл, рыб, птушак і інш. – арыгамі, канструяванне з палосак паперы.

Дыдактычны матэрыял: геаметрычны лічыльны матэрыял (прадметная аплікацыя), танграм.

Выкананне вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў
(4 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Разнастайнасць тэкстыльных матэрыялаў. Першапачатковыя звесткі аб будове тканіны. Баваўняная тканіна (паркаль, фланель). Ніткі. Уласцівасці тэкстыльных матэрыялаў: трываласць, мяккасць, колер. Выкарыстанне тэкстыльных матэрыялаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, склейванне, выцягванне нітак тканіны, разразанне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: фланель, аднатонны паркаль, ніткі.

Інструменты і прыстасаванні: лякалы, кравецкая крэйда, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Прафесія ткача. Гутарка «Як кашуля ў полі вырасла?»

Міжпрадметныя сувязі.

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра форму, яе прапорцыі. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Выразнасць колеру.

Матэматыка: вымярэнне даўжыні прадметаў.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (тэкстыльныя матэрыялы, баваўняная тканіна, фланель).

Практычная дзейнасць. Распазнаванне паркалю і фланелі па знешнім выглядзе, навобмацак. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры з унясеннем творчых дапаўненняў: выбар матэрыялу, разметка дэталей па лякале, выкройванне дэталей, апрацоўка краю вырабу махрамі, выраб кутасіка, завязванне вузельчыка, падразанне канцоў, ацэнка гатовага вырабу і працэсу яго стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Прыстасаванні для працы: ігольнік-кніжка.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: сурвэтка з махрамі, «Чароўны ўзор», «Цуда-кветка» (аплікацыя з нітак).

Дэкаратыўныя элементы адзення: кутасікі.

Выкананне вырабаў з прыродных матэрыялаў
(3 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Беражлівыя адносіны да прыроды. Уласцівасці матэрыялаў: форма, колер, памеры. Варыятыўнасць выкарыстання. Узаемасувязь, прапарцыянальнасць і суразмернасць частак вырабу.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, барбарысу, засушанае лісце і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера, ніткі.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек–прырода» (па Е.А.Клімаву).

Міжпрадметныя сувязі.

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Чалавек і свет: асеннія з'явы ў прыродзе. Выспяванне пладоў і насення раслін. Разнастайнасць і прыгажосць раслін. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

Практычная дзейнасць. Дызайн-аналіз гатовых вырабаў. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні. Ажыццяўленне працэсу вырабу: падбор матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, злучэнне дэталей, афармленне вырабу, аналіз-разважанне пра прыгажосць гатовага вырабу.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: фігуркі жывёл «Госці лесу», героі казак, мадэлі транспартных сродкаў.

Цацкі: «Пінгвіняты», «Кракадзіл Гена», «Залатая рыбка», «Матылёк», «Лесавічок», «Вожык» і інш.

Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў
(2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Нетрадыцыйнае выкарыстанне матэрыялаў. Другое жыццё рэчаў. Уласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюць пры стварэнні вырабаў. Асноўная форма, галоўныя і другарадныя дэталі, іх прапарцыянальныя суадносіны.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, разразанне, нанізванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка, саломінкі для кактэйлю, трубачкі ад фламастараў, стрыжняў.

Інструменты і прыстасаванні: памазок для клею, нажніцы, аловак, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: клей, папера, тонкі кардон, ніткі.

Міжпрадметныя сувязі.

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (шпагат, лінейныя матэрыялы).

Практычная дзейнасць. Вывучэнне ўласцівасцей матэрыялаў. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўласнай задуме: падбор матэрыялу, злучэнне шчыльнай паперы і лінейных матэрыялаў пры дапамозе клею, уцягванне ніткі ў іголку, разразанне і нанізванне трубачак, аналіз вырабу і працэсу яго стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Семіколеравая кветачка», «Вясёлыя звераняты» – пано са шпагата (калектыўная праца), «Церамок», упрыгажэнні да свята – падвескі з трубачак.

Цацкі: «Парсючок», «Кацяня», «Шчанюк» з шпагата.

Дыдактычны матэрыял: канструктар «Дзівосныя трубачкі».

ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ

(5 гадзін)

Выцінанка

(2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. «Беларуская выцінанка». Папера для выцінанак. Залежнасць формы вырабу ад спосабу складання і формы элементаў, якія выразаюцца. Сіметрычныя, рапортныя, разеткавыя ўзоры.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складанне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: тонкая белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі.

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра лінію і яе разнавіднасці. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні.

Літаратурнае чытанне: узбагачэнне слоўніка (выцінанка, сіметрыя і інш.).

Практычная дзейнасць. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс стварэння вырабу. Выкананне вырабаў па гатовай разметцы, па ўяўленні: выбар, складанне паперы ў 2, 4 згібы, выразанне элементаў, аналіз выніку і працэсу выканання работы.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Цуда-сняжынкі», гірлянды.

Запрашэнні, *віншавальныя паштоўкі:* «З Новым годам», «Усе ў госці да нас».

Дыдактычны матэрыял: лічыльны матэрыял (грушы, ялінкі, цюльпаны, домікі і інш.).

Фларыстыка

(3 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Правілы збору і засушвання лістоў. Беражлівыя адносіны да прыроды. Уласцівасці матэрыялаў: форма, колер, трываласць. Узор у паласе, квадраце. Рытмічная арганізацыя ўзора.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: лісце дрэў і кустоў, засушаныя ў плоскасці.

Інструменты: памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх майстроў фларыстыкі.

Міжпрадметныя сувязі.

Выяўленчае мастацтва: колеры восеньскай прыроды. Паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру выявы памерам аркуша паперы. Кампаноўка буйной выявы на аркушы паперы. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Чалавек і свет: залатая восень. Разнастайнасць восеньскай афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (фларыстыка, рытм і інш.).

Практычная дзейнасць. Аналіз змянення ўласцівасцей матэрыялу пры засушванні. Аналіз гатовых вырабаў. Састаўленне плана работы. Мадэліраванне на паперы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні: выбар асновы, падбор лістоў, складанне кампазіцыі, разметка размяшчэння лістоў на аснове*, наклейванне засушаных лістоў на аснову, аналіз выкананых вырабаў.

Прыкладныя вучэбныя заданні:

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: пано «Дыван з восеньскіх лістоў», «Узоры восені», «Восеньская казка», узор з лістоў у паласе, квадраце.

ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ

(3 гадзіны)

Забеспячэнне побыту сям'і

(3 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Віды дзейнасці па самаабслугоўванні ў хатніх умовах. Словы «хачу» і «трэба» ў нашых сем'ях. Электрычныя памочнікі. Эканомія электраэнергіі і вады.

Афармленне інтэр'ера пакоя да свята. Афармленне падарункаў.

Сервіроўка святочнага стала да чаю. Неабходны посуд. Складванне папяровых сурвэтак. Культура паводзін за сталом.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек–чалавек» (па Е.А.Клімаву). Гутарка «Добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца».

Міжпрадметныя сувязі.

Чалавек і свет: я і мая сям'я. Абавязкі дзіцяці ў сям'і. Небяспечныя сітуацыі дома. Правілы асабістай гігіены. Як даглядаць адзенне і абутак.

Беларуская мова і літаратурнае чытанне: успрыняцце і аналіз твораў (загадак, прыказак, казак і г.д.). Літаратурная творчасць і імправізацыя (складанне апавяданняў, казак). Культура гаворкі.

Практычная дзейнасць. Арганізацыйна-дзейнасная гульня «Маміны (татавы) памочнікі». Афармленне падарункаў, класнага кабінета да свята (калектыўная работа). Сервіроўка стала да чаю.

ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА

(1 гадзіна)

Догляд пакаёвых раслін

(1 гадзіна)

Тэарэтычныя звесткі. Прыгажосць і карысць пакаёвых раслін. Правілы догляду пакаёвых раслін.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек–прырода» (па Е.А.Клімаву).

Міжпрадметныя сувязі.

Чалавек і свет. Расліны – частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (назвы раслін).

Практычная дзейнасць. Паліў і апырскванне раслін, рыхленне глебы, выдаленне пылу з лістоў, мыццё паддонаў.

Я І СВЕТ ТЭХНАЛОГІЙ

(1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Выстаўка вырабаў, падрыхтаваных у бягучым годзе. Прэзентацыя і аналіз найлепшых вырабаў.

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для працы ў II класе: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупіны лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, пер'е і інш.; кветкі, лісце, галінкі раслін, засушаныя ў плоскасці; саломка.

Практычная дзейнасць. Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем неабходных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

Прыкладнае выніковае заданне: калектыўная работа «Танец матылькоў».

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Валодаць спосабамі дзейнасці:

кіравацца правіламі:

бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі рабочага месца і асабістай гігіены;

беражлівых адносін да прыроды, інструментаў, прадметаў побыту;

эканомнага расходавання матэрыялаў;

працоўнай дысцыпліны;

мець уяўленне аб:

прафесіях людзей з бліжэйшага акружэння;

відах народных рамёстваў (выцінанка, фларыстыка);

распазнаваць:

віды паперы, прыродныя матэрыялы, баваўняныя тканіны (паркаль, фланель), вывучаныя нетрадыцыйныя матэрыялы;

лініі згібу і разрэзу;

злучэнне дэталей склейваннем, звязваннем, з дапамогай пластыліну;

характарызаваць:

асноўныя інструменты пры рабоце з паперай, тэкстыльнымі і прыроднымі матэрыяламі, іх прызначэнне і правілы работы з імі;

чытаць і разумець:

найпрасцейшыя схемы складання арыгамі;

ажыццяўляць (выконваць):

арганізацыю свайго рабочага месца;

разметку паперы па шаблоне, трафарэце, згінаннем, разметку тканіны па лекале;

абрыванне паперы, разразанне паперы, тканіны, нітак, шпагату і інш.;

злучэнне дэталей з паперы, тэкстыльных, прыродных і нетрадыцыйных матэрыялаў (склейванне, злучэнне з дапамогай пластыліну, звязванне, нанізванне і інш.);

выкананне вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, эскізе, малюнку;

аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;

найпрасцейшыя работы па доглядзе пакаёвых раслін;

сервіроўку стала да чаю.

Выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

планаваць сваю дзейнасць і кантраляваць яе ход;

ажыццяўляць арганізацыю свайго рабочага месца;

ажыццяўляць тэхналагічны працэс выканання вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка ці дарослага па ўзоры, эскізе, малюнку;

ажыццяўляць аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;

ажыццяўляць найпрасцейшыя работы па доглядзе пакаёвых раслін;

ажыццяўляць сервіроўку стала да чаю;

выконваць правілы асабістай гігіены і бяспекі працы з матэрыяламі, інструментамі, электрапрыборамі.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:

Журба, А.Ф. Працоўнае навучанне. 1 клас / А.Ф. Журба, Н.А. Юрчанка. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2010.

Журба, А.Ф. Трудовое обучение в 1 классе / А.Ф. Журба, Н.А. Юрченко. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010.

Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:

інструменты і прыстасаванні: нажніцы школьныя, лінейка, аловак, памазок для клею, тоўстая іголка (цыравальная), стэкі, падкладная дошка, пульверызатар, лейка;

асноўныя матэрыялы: папера (пісчая (белая і каляровая), чарцёжная, абгортачная, аксамітная, крэпіраваная), тонкі кардон; баваўняная тканіна (паркаль, фланель); ніткі; прыродныя матэрыялы (шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, барбарыса і інш.), засушанае лісце; шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка; саломінкі для кактэйлю, трубачкі ад фламастараў, стрыжняў, цукерак; папяровыя сурвэткі.

дапаможныя матэрыялы: клей ПВА, клеючы аловак, пластылін.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Изобразительное искусство» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания

ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОЕ ИСКУССТВО

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Учебный предмет «Изобразительное искусство» играет значимую роль в системе общего среднего образования. Он призван решать задачи, связанные с передачей художественных ценностей культуры, выработанных человечеством, с целью эмоционально-чувственного и духовно-нравственного развития личности, формированием ее эстетического опыта и творческого потенциала.

Исходя из специфики учебного предмета основной **целью** обучения учебному предмету является формирование основ художественно-эстетической, духовно-нравственной культуры учащихся, ознакомление с национальным и мировым искусством, развитие потребности в художественно-творческой деятельности.

Для реализации данной цели ставятся следующие **задачи**:

формирование представлений о нравственно-эстетических ценностях национального культурного наследия, воспитание чувства уважения к культурному наследию других народов;

воспитание эстетического отношения к действительности, искусству, явлениям художественной культуры, развитие эстетических чувств и основ эстетического вкуса;

развитие способностей эстетического восприятия и оценки произведений искусства разных видов и жанров;

обучение основам изобразительной грамоты; совершенствование практических умений и навыков изобразительной, декоративно-прикладной и конструкторско-дизайнерской деятельности, лепки;

развитие зрительного восприятия, композиционной и колористической культуры, пространственного мышления, воображения;

развитие художественно-творческих способностей и творческой активности учащихся.

У учащихся при ведущей роли познавательной деятельности формируются элементы представлений, знаний об эстетических и художественных явлениях. Опыт накопленных эмоционально-чувственных впечатлений и эстетических переживаний находит отражение в художественно-творческой деятельности, способствует развитию творческого потенциала, художественно-творческих способностей. Основой для художественного творчества учащихся является система изобразительно-выразительных средств пластических (пространственных) искусств.

В результате художественного творчества учащимися создаются посильные художественные образы, которые совершенствуются по мере того, как обучающиеся овладевают знаниями, умениями и навыками в области того или иного вида искусства (графики, живописи, скульптуры, архитектуры, декоративно-прикладного искусства, дизайна).

В преподавании изобразительного искусства реализуется компетентностный подход, который предусматривает интеграцию знаний и творческую самореализацию личности, формирование у учащихся начальных ключевых компетенций – личностных, метапредметных и предметных.

К *личностным компетенциям* относятся: ценностное отношение к национальному искусству своего народа и народов мира; художественно-образное мышление, наблюдательность и воображение; наличие эстетических интересов и потребностей, эмоционально-ценностных критериев жизнедеятельности.

Метапредметными компетенциями, формируемыми при изучении изобразительного искусства, являются: владение умением «творческого видения»; умение рационально организовать процесс художественно-творческой деятельности; стремление общаться по поводу искусства, владение культурой сотворчества.

Предметными (художественно-эстетическими) компетенциями (по Б.М.Неменскому) выступают: знание видов и жанров пластических искусств, особенностей видов художественной деятельности (изображение, конструирование, декорирование (украшение)); понимание художественно-образной природы искусства; способность эстетически воспринимать, эмоционально оценивать и анализировать (с посильным применением искусствоведческой терминологии) произведения искусства, объекты и явления природы; применение специальных знаний, умений и навыков в процессе изображения объектов, конструирования изделий из бумаги, лепки из пластилина, глины, соленого теста, создания образов в разных художественных техниках: аппликация, мозаика, коллаж, вытинанка и др.

Основные разделы учебной программы:

«Эстетическое восприятие действительности»;

«Восприятие произведений искусства»;

«Практическая художественно-творческая деятельность».

«Эстетическое восприятие действительности» как составная часть художественной деятельности имеет в программе относительно самостоятельную систему учебных задач по формированию эстетического сознания и эстетических чувств учащихся.

Особое внимание уделяется сфере эстетических и этических ценностей национальной культуры, духовно-эстетического совершенствования человека, эстетического освоения природного мира и мира «второй природы» – архитектурной и предметной среды обитания человека.

Задачей данного содержательного компонента программы является целенаправленное развитие у учащихся наблюдательности, визуального восприятия формы и цвета предметов, умения определять оттенки цвета объектов природы.

Содержательный компонент ***«Восприятие произведений искусства»*** способствует освоению учебного предмета на искусствоведческом уровне. Его задачей является формирование ключевых ориентиров восприятия произведений изобразительного искусства, расширение художественного кругозора учащихся, изучение теоретических основ изобразительного искусства, освоение его языка, системы выразительных средств.

В результате освоения содержания данного раздела программы учащиеся получают представление о роли искусства в жизни человека и общества, об основах национального и мирового искусства, особенностях различных видов и жанров изобразительного искусства, их взаимосвязи.

При освоении учащимися произведений отечественного художественного наследия воспитывается любовь к родной культуре, ощущение ее национального своеобразия, стремление продолжать художественные традиции. Особое внимание уделяется знакомству с творчеством профессиональных и народных мастеров, местными художественными достопримечательностями. Изучение памятников архитектуры и изобразительного искусства, художественных промыслов и ремесел своего региона, города, села, деревни, не только способствует вовлечению учащихся в творчество на основе местных традиций, но и прививает любовь к родному краю, уважение к людям, живущим рядом, формирует желание беречь и приумножать художественное достояние своего региона.

При ознакомлении учащихся с разделом программы «Восприятие произведений искусства» очень важным является развитие навыков восприятия и анализа произведений отечественного и мирового искусства, формирование знаний и представлений о творчестве художников. Развиваются способности учащихся сопереживать и эмоционально откликаться на произведение изобразительного искусства, его содержание, умение выразить к нему свое отношение. Учащиеся получают навыки восприятия произведений изобразительного и декоративно-прикладного искусства, раскрывают его содержание на основе усвоенных понятий и терминов, отмечают доступные их пониманию художественные средства и раскрывают их роль в создании художественного образа.

Перечень рекомендованных в программе произведений является примерным. Учитель может использовать другие равноценные в художественном отношении произведения. В этом случае подбор иллюстративного материала по восприятию произведений искусства должен осуществляться в соответствии с тематикой раздела, возрастными особенностями детей. Приоритетное значение имеет ознакомление учащихся с произведениями белорусского художественного наследия.

Эстетическое восприятие действительности и произведений искусства (через демонстрацию мультимедийных презентаций) должно осуществляться на каждом уроке. Восприятие объектов, явлений действительности и произведений искусства, их многоаспектный анализ предшествуют выполнению практической работы: в начале занятия предполагается беседа (мультимедийная презентация), следующая его часть – практическая реализация темы (создание творческой композиции, лепка, декорирование изделий (эскиз росписи, украшения одежды и т.п.)).

Количество часов, отведенных на изучение учебного содержания раздела ***«Эстетическое восприятие действительности и искусства»***, распределяется в течение учебного года, суммарно составляет 8 учебных часов.

В основу содержательного компонента ***«Практическая художественно-творческая деятельность»*** положен принцип систематического развития у учащихся

умений художественного моделирования мира. В процессе освоения содержания данного раздела, осуществляемого на художественно-творческом уровне, приобретается опыт творческой деятельности, развиваются художественные способности учащихся в области цвето- и формообразования, осваиваются пространственные явления, формируются навыки лепки, декоративно-прикладной деятельности, художественного конструирования (дизайна).

На занятиях изобразительным искусством учащиеся рисуют и лепят с натуры, по памяти, по представлению, конструируют, выполняют работы в различных художественных техниках.

Процесс практической художественно-творческой деятельности требует создания условий для проявления у учащихся чувства радости художественного труда, уверенности в своих силах, активности в выборе художественных средств, техники и материала при выполнении учебных и творческих заданий (композиций), формирования умений самостоятельно выбирать сюжет и воплощать творческий замысел на практике.

Раздел «Практическая художественно-творческая деятельность» включает следующие содержательные компоненты:

изображение на плоскости;

лепка;

декоративно-прикладная деятельность и дизайн.

Изображение на плоскости включает рисование с натуры, по памяти, по представлению после непосредственных наблюдений или по воображению, выполнение сюжетно-тематических композиций, а также выполнение набросков.

Лепка предусматривает ознакомление учащихся с приемами и способами лепки, лепку рельефа и объемных форм.

Лепка как вид художественной деятельности имеет особое значение, поскольку двигательно-осязательный компонент играет доминирующую роль в развитии изобразительной деятельности учащихся I класса.

Декоративно-прикладная деятельность и дизайн предусматривает ознакомление с приемами декоративного обобщения форм и цвета предметов (объектов), видами орнамента, основными композиционными схемами, которые используются при создании произведений декоративно-прикладного характера, выполнение композиций из природного материала (листья, цветы, травы и т.п.) в технике «аппликация», «монотипия», «трафарет» и др.

Сочетание изобразительной деятельности с объемно-пространственными видами работ (лепкой, конструированием, моделированием), комбинирование теоретического изучения основ изобразительной грамоты с анализом формы, пропорций и конструкции предмета, применение и чередование материалов и художественных техник (гуашь, акварель, цветные мелки, тушь, пластилин, глина, аппликация, вытинанка, монотипия и др.) позволят учащимся получить представление о многообразии средств для создания художественного образа и будет способствовать осознанному выбору материала в зависимости от содержания и замысла работы.

Учителю предоставляется возможность выбора изобразительных материалов для выполнения учащимися творческого задания с учетом их пожеланий, предпочтений и возрастных особенностей.

Основной принцип выбора заданий для практической деятельности учащихся – вариативный, позволяющий индивидуализировать художественно-творческий процесс, максимально приближая его к личности учащегося. С этой целью в программе предлагается несколько тем (заданий) по каждой учебной задаче. Они являются примерными, позволяя учащимся самостоятельно выбрать тему или технику выполнения композиции, если это не противоречит поставленной учебной задаче.

Содержание практической деятельности предполагает решение четырех основных групп учебных задач: 1) композиция; 2) форма, пропорции, конструкция; 3) цвет и освещение; 4) пространство и объем. Освоение данных групп учебных задач, лежащих в основе изобразительной грамотности, должно быть подчинено сознательному решению художественного образа в соответствии с возрастными возможностями учащихся.

Практическая художественно-творческая деятельность взаимосвязана с восприятием и анализом произведений искусства, наблюдениями учащихся за объектами и явлениями природы (через экскурсии и демонстрацию мультимедийных презентаций, репродукций художественных произведений и фотоснимков). Наброски и зарисовки, выполненные во время экскурсий на природу и просмотра мультимедийных презентаций, могут служить основой для решения художественного образа при создании учащимися творческих композиций.

Количество часов, отведенных на изучение учебного содержания раздела ***«Практическая художественно-творческая деятельность»***, распределяется в течение учебного года, суммарно составляет 52 учебных часа.

При реализации учебного содержания программы учащиеся знакомятся с особенностями различных художественных техник. Большое значение имеет наглядный показ (демонстрация) учителем приемов работы с материалами и инструментами.

Программой рекомендуется следующее распределение времени по разделам, содержательным компонентам (видам деятельности) и основным учебным проблемам (задачам).

Распределение времени по разделам программы

Разделы программы	Кол-во часов
Эстетическое восприятие действительности и искусства	8
Практическая художественно-творческая деятельность	52
ВСЕГО:	**60**

Распределение времени по разделу «Эстетическое восприятие действительности и искусства»

Виды деятельности	Кол-во часов
Эстетическое восприятие действительности и искусства	**8**
Эстетическое восприятие действительности	3
Восприятие произведений искусства	5

Распределение времени по разделу «Практическая художественно-творческая деятельность»

Виды деятельности	Кол-во часов
Практическая художественно-творческая деятельность	**52**
Изображение на плоскости	30
Лепка	8
Декоративно-прикладная деятельность и дизайн	14

Распределение времени по основным учебным задачам (раздел «Изображение на плоскости»)

Учебные задачи	Кол-во часов
Изображение на плоскости	**30**
Композиция	11
Пространство	2
Форма, пропорции, конструкция	8
Цвет	9

Основные требования к содержанию и методам обучения изобразительному искусству в учреждении общего среднего образования основаны на следующих ***принципах***:

культуросообразность – опора на культуру как совокупность всех форм духовного бытия человека и общества;

преемственность – методологическая основа взаимосвязи содержания всех звеньев системы художественного образования;

единство духовно-нравственного, художественно-эстетического воспитания с усвоением учащимися художественных знаний, освоением практических навыков художественной деятельности;

создание художественного образа – *цель* обучения; приобретение знаний, освоение учащимися изобразительных навыков и технических приемов – *средства* для ее достижения;

учет возрастных и индивидуальных психофизиологических особенностей учащихся, рациональное сочетание индивидуальных и коллективных форм работы;

диалогический характер общения и атмосфера сотворчества учителя и учащихся;

реализация принципа наглядности для формирования представлений учащихся о видах и жанрах, понятиях и терминах изобразительного искусства, овладения техниками и материалами, образной системой изобразительного искусства;

принцип систематического развития у учащихся умений художественного моделирования мира;

принцип интеграции и взаимосвязи разных видов искусств (полихудожественность) – изобразительного искусства, музыки, литературы и др., – с помощью которых создается ассоциативно-образная атмосфера, необходимая для оптимального развития художественного мышления учащихся;

принцип креативности – реализация творческого потенциала личности в художественно-эстетическом образовании;

принцип эстетизации жизнедеятельности – внесение элементов прекрасного во внутренний мир и внешний облик учащихся и окружающую среду.

Методы работы с учащимися на занятии разнообразны: беседа, рассказ, дискуссия, просмотр мультимедийной презентации, самостоятельная работа с книгой и др. Очень эффективными являются такие формы организации обучения, как экскурсии в музеи, по городу, посещение выставок, встречи и беседы с художниками; занятия, построенные по законам художественной драматургии; занимательные и игровые формы работы.

Содержание программы усваивается учащимися без домашнего задания. В качестве домашней работы учащиеся могут заготовить подсобный материал, понаблюдать за определенными объектами или явлениями природы, подобрать репродукционный материал, подготовить сообщение о творчестве художника или отдельном произведении искусства, выполнить зарисовки и наброски с архитектурного или скульптурного памятника, посетить художественный музей или художественную выставку и т.д. Данные виды работ выполняются по желанию учащихся и поощряются учителем. Их основной целью является ориентация учащихся на эстетическое освоение действительности: природного окружения, памятников культуры, архитектурных достопримечательностей своего города или села и т.п.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(30 ч)

ВОСПРИЯТИЕ ДЕЙСТВИТЕЛЬНОСТИ И ИСКУССТВА
(8 ч)

Эстетическое восприятие действительности
(3 ч)

Эстетическое восприятие объектов природы: разнообразие форм и цвета в природе (цветы, листья, деревья). «Прогулка по городскому (сельскому) парку» (желательно использование мультимедийной презентации); сравнительный анализ формы, определение оттенков цвета садовых и луговых цветов, нахождение сходства и различий между ними. «Цветы родной земли» (желательно использование мультимедийной презентации).

Эстетическое восприятие объектов и явлений природы: «Экскурсия по осеннему парку (саду)», «Экскурсия по весеннему парку (лесу)»; «Зима-художница», «Снежные скульптуры» (наблюдение за состоянием природы в разные времена года, желательно использование мультимедийных презентаций).

Эстетическое восприятие архитектуры Беларуси: «Красота современных архитектурных сооружений Беларуси» (желательно использование мультимедийной презентации).

Эстетическое восприятие предметного мира: «Красота и польза мира вещей» (желательно использование мультимедийной презентации).

Восприятие произведений искусства
(5 ч)

Роль изобразительного искусства в жизни человека. Виды изобразительного искусства: живопись (картина), графика (рисунок, иллюстрация). Произведения художников: *И.Шишкин*. «Утро в сосновом лесу»; *В.Васнецов*. «Аленушка»; иллюстрации к сказкам А.С.Пушкина «Сказка о царе Салтане…», «Сказка о мертвой царевне и семи богатырях» и др.

Виды и жанры изобразительного искусства (живопись, графика, скульптура; натюрморт, пейзаж, портрет и др.) – художественные произведения по выбору учителя.

Художественный образ в различных видах изобразительного искусства. Образ осени в произведениях художников: *С.Катков*. «Логойский мотив»; *Г.Ващенко*. «Перед отлетом», «Картошка»; *Л.Шакинко*. «Бабье лето»; *И.Левитан*. «Золотая осень»; *И.Бродский*. «Опавшие листья»; *В.Поленов*. «Золотая осень» и др. (художественные произведения по выбору учителя).

Настроение и состояние природы в пейзажах художников (композиционное и колористическое решение, эмоциональное значение цвета). Времена года в произведениях художников: *А.Астапович.* «Зимний день»; *С.Герус*. «Зима в Минске»; *Л.Дударенко*. «Зимний день»; *В.Сумарев*. «Иней»; *Н.Ромадин.* «Незамерзающая речка»; *Ли Ди.* «Человек, ведущий буйвола по снежной равнине»; *П.Масленников.* «Мартовский вечер»; *А.Гугель.* «Бегут ручьи»; *В.Цвирко.* «Припять. Весна»; *В.Белыницкий-Бируля.* «Зеленый май»; *П.Крохалев.* «Весна. Вяча»; *И.Левитан.* «Весна – большая вода», «Снова весна»; *С.Герасимов.* «Ива цветет» (по выбору учителя).

Реалистические, декоративные и фантазийные образы животных в изобразительном и декоративно-прикладном искусстве (изразцах, предметах народного быта и их декоре; произведениях художников: *Е.Чарушин* – иллюстрации к книгам «Разные звери», «Детки в клетке»; *В.Ватагин* – рисунки животных; *В.Васнецов.* «Гамаюн – птица вещая» и др.).

Единство формы предмета и его украшения (оговские сундуки, хохломская посуда, жостовские подносы, дымковская игрушка и др.).

Белорусские рушники, покрывала, пояса; народная соломенная, глиняная посуда и игрушка. Функция, форма (конструкция) и декор изделий.

ПРАКТИЧЕСКАЯ ХУДОЖЕСТВЕННОТВОРЧЕСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ
(52 ч)

ИЗОБРАЖЕНИЕ НА ПЛОСКОСТИ
(30 ч)

Композиция
(11 ч)

Выбор положения листа бумаги в зависимости от формы и расположения изображаемых предметов. Соответствие размера изображения размеру листа бумаги.

«Жираф», «Бегемот», «Крокодил», «Слон», «Ракета», «Автобус», «Дом», «Богатырь», «Красавица» и т.п. (художественные материалы по выбору учителя).

Компоновка изображения на листе бумаги. Взаимосвязь изображаемых объектов (фигур) в композиции. «Веселые клоуны», «Акробаты», «Дрессировщица и голуби» и т.п. (гуашь, восковые мелки).

Гармоничное заполнение листа бумаги изображениями, выделение композиционного центра. Рисование пейзажа по памяти и по представлению: «Ясный осенний день», «Грустная осень», «Осенняя непогода» (гуашь или акварель).

Понятие о композиционной взаимосвязи изображаемых объектов, расположение предметов относительно друг друга. «Снегурочка и Дед Мороз», «Два Мороза», «На стройке», «Убираем яблоки» (гуашь или акварель).

Передача характера и нрава животных (добрый, злой, хитрый, доверчивый, любопытный и т.д.). Рисование по воображению образов белорусских и русских народных сказок («Храбры певень», «Змей Горыныч», «Кот Максим»), произведений К.Чуковского, С.Маршака и др. – по выбору учащихся (гуашь или акварель).

Передача характерных особенностей внешнего облика и настроения человека. «Моя мамочка», «Мы с папой играем в шахматы», «Бабушка вяжет шарфик», «Мой любимый дедушка», «Моя сестричка (мой братик) с игрушкой» и т.п. (гуашь или акварель).

Пространство

(2 ч)

Передача глубины пространства в рисунке: «на первом плане», «на втором плане». Выполнение композиции «Летний отдых», «На берегу озера», «на даче», «На пришкольном участке», «Зимняя прогулка» (цветные карандаши, гуашь).

Форма, пропорции, конструкция

(8 ч)

Передача в композиции формы, пропорций и конструкции изображаемых объектов: «Осенний натюрморт», «Дары леса», «Овощи и фрукты» (гуашь или акварель), «Натюрморт из простых предметов быта» (материалы по выбору учителя).

Передача в рисунке характерных особенностей строения деревьев (форма, конструкция). Рисование на основе наблюдений: «Зимний лес», «Волшебные деревья», «Могучий дуб», «Стройная березка» (гелевая ручка с черными чернилами, фломастер).

Передача в композиции характерных особенностей строения фигуры человека и животных (конструкция, пропорции). «Артисты цирка на арене» (акробат, клоун, жонглер, дрессировщик и др.) (гуашь или акварель).

Цвет

(9 ч)

Цвет и краски. Понятие об основных (желтый, красный, синий), составных (оранжевый, фиолетовый, зеленый) цветах, светлых и темных оттенках цвета. Выполнение композиций: «Разноцветные воздушные шары», «Разноцветные флаги», «Цветик-разноцветик», «Папараць-кветка», «Аленький цветочек», «Вишня (яблоня) цветет» (гуашь или акварель).

Эмоционально-образное содержание цвета: радостный и мрачный, резкий и нежный, спокойный и напряженный: «Добрые и злые персонажи сказок» (гуашь или акварель).

Композиционные возможности цвета. Теплый, холодный и смешанный колорит. Выполнение многоплановых композиций: «Ясный осенний (зимний) день», «Грустная осень», «Осенняя непогода», «Выглянуло солнышко» (гуашь или акварель).

Лепка
(8 ч)

Приемы лепки. Лепка плодов и фруктов: «Осенний натюрморт» (яблоко, груша, слива, огурец, перец, помидор и др.) (глина, пластилин или соленое тесто).

Способы лепки. Составление целого из отдельных частей: лепка персонажей сказок и мультфильмов «Чудо-юдо – трехглавый змей», «Лиса», «Винни-Пух» (разноцветный пластилин), «Животные на арене цирка» и др. (глина, одноцветный пластилин или соленое тесто; коллективная работа), «Я катаюсь на лыжах (санках)» (глина или пластилин).

Передача формы тела и пластики животных: «Щенок», «Кошка с котятами», «Медведь», «Козлик» (глина, пластилин или соленое тесто).

Декоративное решение образа при лепке игрушек. Лепка игрушки в подарок близким людям (глина, пластилин или соленое тесто).

Лепка рельефа: «Рыбка», «Натюрморт», «Декоративный букет» (разноцветный пластилин).

ДЕКОРАТИВНО-ПРИКЛАДНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ И ДИЗАЙН
(14 ч)

Декоративное обобщение форм и цвета предметов (стилизация). Панно для школьной столовой (кухни) «Декоративный натюрморт» (гуашь).

Декоративное обобщение форм растительного и животного мира (стилизация). Фриз: «Цветы, бабочки и птицы», «Моя Беларусь» (гуашь).

Приемы выполнения композиции «Цветочные мотивы», «Забавные животные» в технике «флористика».

Приемы выполнения композиции «Осенний букет» в технике «монотипия».

Виды вытинанки. Приемы выполнения композиции «Древо жизни» в технике «вытинанка».

Виды орнамента. Эскиз орнамента для украшения «шубки», «рукавичек» и «шапочки» Снегурочки; панно для спальни (гостиной), подноса, платка для госпожи Метелицы (гуашь).

Приемы создания композиций декоративно-прикладного характера (основные композиционные схемы). Выполнение эскиза: «Платок для мамы», «Ковер для куклы», «Посуда для Василисы Прекрасной, Бабы Яги» (гуашь).

Виды аппликации (предметная, сюжетная, декоративная). Приемы вырезания элементов аппликации: «Запасливый еж», «Дрессированный лев», «Пудель Арто», «Веселая обезьянка», «Зимний пейзаж» (сближенные и контрастные оттенки бумаги).

Ритм в декоративной композиции. Фриз: «Весенние цветы», «Снежинки» (аппликация, коллективная работа).

Приемы выполнения рельефной композиции из бумаги «Новый год в лесу», «В тридевятом царстве»(коллективная работа).

Приемы выполнения композиций, изделий в технике «бумажная пластика»: «Пригласительный билет», «Поздравительная открытка», елочные игрушки, новогодние сувениры.

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

К концу первого года обучения учащиеся должны:

Знать/понимать:

отличительные особенности основных видов искусства (графика, живопись, скульптура, архитектура, декоративно-прикладное искусство);

средства художественной выразительности произведений графики, живописи, скульптуры, декоративно-прикладного искусства;

названия основных и составных цветов, эмоционально-образные возможности цвета;

названия художественных материалов, инструментов, приспособлений и правила работы с ними;

отличительные особенности гуашевых и акварельных красок, приемы работы с данными художественными материалами;

приемы лепки, трансформации бумаги, выполнения аппликации, вытинанки, монотипии;

особенности композиционного размещения изображаемых объектов;

последовательность выполнения живописной, графической и скульптурной (рельефной, объемной) композиций, аппликации, монотипии, вытинанки;

основные композиционные схемы, используемые при создании произведений декоративно-прикладного характера.

Уметь:

выбирать формат листа и его положение в зависимости от содержания композиции;

полностью использовать плоскость листа бумаги, изображать предметы соразмерно формату;

передавать характерные особенности формы изображаемых предметов;

составлять цвета, необходимые для реализации творческого замысла;

заполнять рисунок цветом, не оставляя пробелов между фигурами и фоном;

работать с художественными материалами, инструментами и приспособлениями (гуашь, пластилин, восковые мелки, тушь, цветная бумага, клей, кисти, палочки);

выбирать декор в соответствии с формой и назначением предмета;

украшать плоские и объемные предметы орнаментом;

соблюдать элементарные правила культуры труда (организация и уборка рабочего места, аккуратное и бережное отношение к художественным материалам, инструментам и приспособлениям);

активно участвовать в обсуждении и оценке работ одноклассников.

Использовать (применять) в практической деятельности и повседневной жизни:

специальную (искусствоведческую) терминологию (лексику);

рациональные приемы резания бумаги;

оптимальные приемы трансформации бумаги при конструировании объемных игрушек;

оптимальные способы лепки;

различные художественные техники для решения творческого замысла.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Шкуратава, М.А. Выяўленчае мастацтва. 1 клас / М.А. Шкуратава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Шкуратова, М.А. Изобразительное искусство в 1 классе / М.А. Шкуратова. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Ткач, Е.В. Изобразительное искусство: художественно-творческие задания: 1 класс / Е.В. Ткач. – Минск: Аверсэв, 2013.

Ткач, Е.В. Изобразительное искусство: тестовые задания. 1–4 классы / Е.В. Ткач. – Минск: Аверсэв, 2013.

Трусова, А.С. Изобразительное искусство. 1 класс. Альбом заданий / А.С. Трусова. – Минск: Аверсэв, 2012.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Выяўленчае мастацтва» адыгрывае значную ролю ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Ён закліканы вырашаць задачы, звязаныя з перадачай мастацкіх каштоўнасцей культуры, выпрацаваных чалавецтвам, з мэтай эмацыянальна-пачуццёвага і духоўна-маральнага развіцця асобы, фарміраваннем яе эстэтычнага вопыту і творчага патэнцыялу.

Зыходзячы са спецыфікі вучэбнага прадмета асноўнай ***мэтай*** навучання вучэбнаму прадмету з'яўляецца фарміраванне асноў мастацка-эстэтычнай, духоўна-маральнай культуры вучняў, азнаямленне з нацыянальным і сусветным мастацтвам, развіццё патрэбнасці ў мастацка-творчай дзейнасці.

Для рэалізацыі дадзенай мэты ставяцца наступныя ***задачы***:

фарміраванне ўяўленняў аб маральна-эстэтычных каштоўнасцях нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне пачуцця павагі да культурнай спадчыны іншых народаў;

выхаванне эстэтычнага стаўлення да рэчаіснасці, мастацтва, з'яў мастацкай культуры, развіццё эстэтычных пачуццяў і асноў эстэтычнага густу;

развіццё здольнасцей эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі твораў мастацтва розных відаў і жанраў;

навучанне асновам выяўленчай граматы; удасканаленне практычных уменняў і навыкаў выяўленчай, дэкаратыўна-прыкладной і канструктарска-дызайнерскай дзейнасці, лепкі;

развіццё зрокавага ўспрымання, кампазіцыйнай і каларыстычнай культуры, прасторавага мыслення, уяўлення;

развіццё мастацка-творчых здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў.

У вучняў пры вядучай ролі пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца элементы ўяўленняў, ведаў пра эстэтычныя і мастацкія з'явы. Вопыт назапашаных эмацыянальна-пачуццёвых уражанняў і эстэтычных перажыванняў знаходзіць адлюстраванне ў мастацка-творчай дзейнасці, спрыяе развіццю творчага патэнцыялу, мастацка-творчых здольнасцей. Асновай для мастацкай творчасці вучняў з'яўляецца сістэма выяўленча-выразных сродкаў пластычных (прасторавых) мастацтваў.

У выніку мастацкай творчасці вучнямі ствараюцца пасільныя мастацкія вобразы, якія ўдасканальваюцца па меры таго, як вучні авалодваюць ведамі, уменнямі і навыкамі ў галіне таго ці іншага віду мастацтва (графікі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну).

У выкладанні выяўленчага мастацтва рэалізуецца кампетэнтнасны падыход, які прадугледжвае інтэграцыю ведаў і творчую самарэалізацыю асобы, фарміраванне ў вучняў пачатковых ключавых кампетэнцый – асобасных, метапрадметных і прадметных.

Да асобасных кампетэнцый адносяцца: каштоўнаснае стаўленне да нацыянальнага мастацтва свайго народа і народаў свету; мастацка-вобразнае мысленне, назіральнасць і ўяўленне; наяўнасць эстэтычных інтарэсаў і патрэб, эмацыянальна-каштоўнасных крытэрыяў жыццядзейнасці.

Метапрадметнымі кампетэнцыямі, якія фарміруюцца пры вывучэнні выяўленчага мастацтва, з'яўляюцца: валоданне ўменнем «творчага бачання»; уменне рацыянальна

арганізаваць працэс мастацка-творчай дзейнасці; імкненне мець зносіны з нагоды мастацтва, валоданне культурай сатворчасці.

Прадметнымі (мастацка-эстэтычнымі) кампетэнцыямі (па Б.М.Няменскаму) выступаюць: веданне відаў і жанраў пластычных мастацтваў, асаблівасцей відаў мастацкай дзейнасці (адлюстраванне, канструяванне, дэкарыраванне (упрыгожванне)); разуменне мастацка-вобразнай прыроды мастацтва; здольнасць эстэтычна ўспрымаць, эмацыянальна ацэньваць і аналізаваць (з пасільным ужываннем мастацтвазнаўчай тэрміналогіі) творы мастацтва, аб'екты і з'явы прыроды; прымяненне спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў у працэсе адлюстравання аб'ектаў, канструявання вырабаў з паперы, лепкі з пластыліну, гліны, салёнага цеста, стварэння вобразаў у розных мастацкіх тэхніках: аплікацыя, мазаіка, калаж, выцінанка і інш.

Асноўныя раздзелы вучэбнай праграмы:

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці»;

«Успрыманне твораў мастацтва»;

«Практычная мастацка-творчая дзейнасць».

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці» як састаўная частка мастацкай дзейнасці мае ў праграме адносна самастойную сістэму вучэбных задач па фарміраванні эстэтычнай свядомасці і эстэтычных пачуццяў вучняў.

Асаблівая ўвага надаецца сферы эстэтычных і этычных каштоўнасцей нацыянальнай культуры, духоўна-эстэтычнага ўдасканалення чалавека, эстэтычнага асваення прыроднага свету і свету «другаснай прыроды» – архітэктурнага і прадметнага асяроддзя чалавека.

Задачай дадзенага змястоўнага кампанента праграмы з'яўляецца мэтанакіраванае развіццё ў вучняў назіральнасці, візуальнага ўспрымання формы і колеру прадметаў, уменні вызначаць адценні колеру аб'ектаў прыроды.

Змястоўны кампанент ***«Успрыманне твораў мастацтва»*** спрыяе засваенню вучэбнага прадмета на мастацтвазнаўчым узроўні. Яго задачай з'яўляецца фарміраванне ключавых арыенціраў успрымання твораў выяўленчага мастацтва, пашырэнне мастацкага кругагляду вучняў, вывучэнне тэарэтычных асноў выяўленчага мастацтва, засваенне яго мовы, сістэмы выразных сродкаў.

У выніку засваення зместу дадзенага раздзела праграмы вучні атрымліваюць уяўленне аб ролі мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, аб асновах нацыянальнага і сусветнага мастацтва, асаблівасцях розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва, іх узаемасувязі.

Пры засваенні вучнямі твораў айчыннай мастацкай спадчыны выхоўваецца любоў да роднай культуры, адчуванне яе нацыянальнай адметнасці, імкненне працягваць мастацкія традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца знаёмству з творчасцю прафесійных і народных майстроў, мясцовымі мастацкімі славутасцямі. Вывучэнне помнікаў архітэктуры і выяўленчага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў свайго рэгіёна, горада, сяла, вёскі не толькі спрыяе далучэнню вучняў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, але і выхоўвае любоў да роднага краю, павагу да людзей, якія жывуць побач, фарміруе жаданне берагчы і множыць мастацкі набытак свайго рэгіёна.

Пры азнаямленні вучняў з раздзелам праграмы «Успрыманне твораў мастацтва» вельмі важным з'яўляецца развіццё навыкаў успрымання і аналізу твораў айчыннага і сусветнага мастацтва, фарміраванне ведаў і ўяўленняў аб творчасці мастакоў. Развіваюцца здольнасці вучняў суперажываць і эмацыянальна адгукацца на твор выяўленчага мастацтва, яго змест, уменне выказваць да яго свае адносіны. Вучні атрымліваюць навыкі ўспрымання твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, раскрываюць яго змест на аснове засвоеных паняццяў і тэрмінаў, адзначаюць даступныя іх разуменню мастацкія сродкі і раскрываюць іх ролю ў стварэнні мастацкага вобраза.

Пералік рэкамендаваных у праграме твораў з'яўляецца прыкладным. Настаўнік можа прапанаваць іншыя, раўнацэнныя ў мастацкіх адносінах творы. У гэтым выпадку падбор ілюстрацыйнага матэрыялу па ўспрыманні твораў мастацтва павінен ажыццяўляцца ў

адпаведнасці з тэматыкай раздзела, узроставымі асаблівасцямі дзяцей. Прыярытэтнае значэнне мае азнаямленне вучняў з творамі беларускай мастацкай спадчыны.

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва праз дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый павінна ажыццяўляцца на кожным уроку. Успрыманне аб'ектаў, з'яў рэчаіснасці і твораў мастацтва, іх шматаспектны аналіз папярэднічаюць выкананню практычнай работы: у пачатку занятка мяркуецца гутарка (мультымедыйная прэзентацыя), наступная яго частка – практычная рэалізацыя тэмы (стварэнне творчай кампазіцыі, лепка, дэкарыраванне вырабаў (эскіз роспісу, упрыгожвання адзення і да т.п.).

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела ***«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва»***, размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае 8 вучэбных гадзін.

У аснову змястоўнага кампанента ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»*** пакладзены прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэліравання свету. У працэсе засваення зместу дадзенага раздзела, які ажыццяўляецца на мастацка-творчым узроўні, набываецца вопыт творчай дзейнасці, развіваюцца мастацкія здольнасці вучняў у галіне колера- і формаўтварэння, засвойваюцца прасторавыя з'явы, фарміруюцца навыкі лепкі, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці, мастацкага канструявання (дызайну).

На занятках выяўленчага мастацтва вучні малююць, лепяць з натуры, па памяці, па ўяўленні, канструіруюць, выконваюць работы ў розных мастацкіх тэхніках.

Працэс практычнай мастацка-творчай дзейнасці патрабуе стварэння ўмоў для праяўлення ў вучняў пачуцця радасці ад мастацкай працы, упэўненасці ў сваіх сілах, актыўнасці ў выбары мастацкіх сродкаў, тэхнікі і матэрыялу пры выкананні вучэбных і творчых заданняў (кампазіцый), фарміравання ўменняў самастойна выбіраць сюжэт і ўвасабляць творчую задуму на практыцы.

Раздзел «Практычная мастацка-творчая дзейнасць» уключае наступныя змястоўныя кампаненты:

Адлюстраванне на плоскасці;

Лепка;

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн.

Адлюстраванне на плоскасці ўключае маляванне з натуры, па памяці пасля непасрэдных назіранняў або па ўяўленні, выкананне сюжэтна-тэматычных кампазіцый, а таксама выкананне накідаў.

Лепка прадугледжвае азнаямленне вучняў з прыёмамі і спосабамі лепкі, лепку рэльефу і аб'ёмных форм.

Лепка як від мастацкай дзейнасці мае асаблівае значэнне, паколькі рухальна-тактыльны кампанент выконвае дамінуючую ролю ў развіцці выяўленчай дзейнасці вучняў I класа.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн прадугледжвае азнаямленне з прыёмамі дэкаратыўнага абагульнення форм і колеру прадметаў (аб'ектаў), відамі арнаменту, асноўнымі кампазіцыйнымі схемамі, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару, выкананне кампазіцый з прыроднага матэрыялу (лісце, кветкі, травы і т.п.), у тэхніцы «аплікацыя», «манатыпія», «трафарэт» і інш.

Спалучэнне выяўленчай дзейнасці з аб'ёмна-прасторавымі відамі работ (лепкай, канструяваннем, мадэліраваннем), камбінаванне тэарэтычнага вывучэння асноў выяўленчай граматы з аналізам формы, прапорцый і канструкцыі прадмета, прымяненне і чаргаванне матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (гуаш, акварэль, каляровыя крэйды, туш, пластылін, гліна, аплікацыя, выцінанка, манатыпія і інш.) дазволяць вучням атрымаць уяўленне аб разнастайнасці сродкаў для стварэння мастацкага вобраза і ўменні свядома выбіраць матэрыял у залежнасці ад зместу і задумы работы.

Настаўніку даецца магчымасць выбару выяўленчых матэрыялаў для выканання вучнямі творчага задання з улікам іх пажаданняў, пераваг і ўзроставых асаблівасцей.

Асноўны прынцып выбару заданняў для практычнай дзейнасці вучняў – варыятыўны, які дазваляе індывідуалізаваць мастацка-творчы працэс, максімальна набліжаючы яго да асобы вучня. З гэтай мэтай у праграме прапануецца некалькі тэм (заданняў) па кожнай вучэбнай задачы. Але і яны з'яўляюцца прыкладнымі, дазваляючы вучням самастойна выбраць тэму, а таксама тэхніку выканання кампазіцыі, калі гэта не супярэчыць пастаўленай вучэбнай задачы.

Змест практычнай дзейнасці прадугледжвае вырашэнне чатырох асноўных груп вучэбных задач:

1) кампазіцыя;

2) форма, прапорцыі, канструкцыя;

3) колер і асвятленне;

4) прастора і аб'ём.

Засваенне гэтых груп задач, якія ляжаць у аснове выяўленчай граматнасці, павінна быць падпарадкавана свядомаму вырашэнню мастацкага вобраза ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучняў.

Практычную мастацка-творчую дзейнасць неабходна спалучаць з успрыманнем і аналізам твораў мастацтва, назіраннямі вучняў за аб'ектамі і з'явамі прыроды (праз экскурсіі і дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, рэпрадукцый мастацкіх твораў і фотаздымкаў). Накіды і замалёўкі, выкананыя падчас экскурсій на прыроду, і прагляд мультымедыйных прэзентацый могуць служыць асновай для стварэння мастацкага вобраза пры выкананні вучнямі творчых кампазіцый.

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»***, размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае 52 вучэбныя гадзіны.

Пры рэалізацыі вучэбнага зместу праграмы вучні знаёмяцца з асаблівасцямі розных мастацкіх тэхнік. Вялікае значэнне мае наглядны паказ (дэманстрацыя) настаўнікам прыёмаў работы з матэрыяламі і інструментамі.

Праграмай рэкамендуецца наступнае размеркаванне часу па раздзелах, змястоўных кампанентах (відах дзейнасці) і асноўных вучэбных праблемах (задачах).

Размеркаванне часу па раздзелах праграмы

Раздзелы праграмы	Колькасць гадзін
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва	8
Практычная мастацка-творчая дзейнасць	52
УСЯГО	**60**

Размеркаванне часу па раздзелу «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва»

Віды дзейнасці	Колькасць гадзін
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва	**8**
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці	3
Успрыманне твораў мастацтва	5

Размеркаванне часу па раздзелу «Практычная мастацка-творчая дзейнасць»

Віды дзейнасці	Колькасць гадзін
Практычная мастацка-творчая дзейнасць	**52**
Адлюстраванне на плоскасці	30
Лепка	8
Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн	14

Размеркаванне часу па асноўных вучэбных задачах
(раздзел «Адлюстраванне на плоскасці»)

Вучэбныя задачы	Колькасць гадзін
Адлюстраванне на плоскасці	**30**
Кампазіцыя	11
Прастора	2
Форма, прапорцыі, канструкцыя	8
Колер	9

Асноўныя патрабаванні да зместу і метадаў выкладання выяўленчага мастацтва ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі заснаваны на наступных ***прынцыпах***:

культуралагічная адпаведнасць – апора на культуру як сукупнасць усіх форм духоўнага быцця чалавека і грамадства;

пераемнасць – метадалагічная аснова ўзаемасувязі зместу ўсіх звёнаў сістэмы мастацкай адукацыі;

адзінства духоўна-маральнага, мастацка-эстэтычнага выхавання з засваеннем вучнямі мастацкіх ведаў, практычных навыкаў мастацкай дзейнасці;

стварэнне мастацкага вобраза – мэта навучання; набыццё ведаў, засваенне вучнямі выяўленчых навыкаў і тэхнічных прыёмаў – сродкі для яе дасягнення;

улік узроставых і індывідуальных псіхафізіялагічных асаблівасцей вучняў, рацыянальнае спалучэнне індывідуальных і калектыўных форм работы;

дыялагічны характар зносін і атмасфера сатворчасці настаўніка і вучняў;

рэалізацыя прынцыпу наглядnасці для фарміравання ўяўленняў вучняў аб відах і жанрах, паняццях і тэрмінах выяўленчага мастацтва, авалодання тэхнікамі і матэрыяламі, вобразнай сістэмай выяўленчага мастацтва;

прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэліравання свету;

прынцып інтэграцыі і ўзаемасувязі розных відаў мастацтваў (полімастацкасць) – выяўленчага мастацтва, музыкі, літаратуры і інш. з дапамогай якіх ствараецца асацыятыўна-вобразная атмасфера, неабходная для аптымальнага развіцця мастацкага мыслення вучняў;

прынцып крэатыўнасці – рэалізацыя творчага патэнцыялу асобы ў мастацка-эстэтычнай адукацыі;

прынцып эстэтызацыі жыццядзейнасці – унясенне элементаў прыгожага ва ўнутраны свет і вонкавае аблічча вучняў і навакольнае асяроддзе.

Метады работы з вучнямі на занятках разнастайныя: гутарка, аповед, дыскусія, прагляд мультымедыйнай прэзентацыі, самастойная работа з кнігай і інш. Вельмі эфектыўнымі з’яўляюцца такія формы арганізацыі навучання, як экскурсіі ў музеі, па горадзе, наведванне выстаў, сустрэчы і гутаркі з мастакамі; заняткі, пабудаваныя па законах мастацкай драматургіі; займальныя і гульнявыя формы работы.

Змест вучэбнага прадмета засвойваецца вучнямі без дамашніх заданняў.

У якасці дамашняй работы вучні могуць нарыхтаваць дапаможны матэрыял, паназіраць за пэўнымі аб’ектамі або з’явамі прыроды, падабраць рэпрадукцыйны матэрыял, падрыхтаваць паведамленне пра творчасць мастака або асобныя творы мастацтва, выканаць замалёўкі і накіды з архітэктурнага ці скульптурнага помніка, наведаць мастацкі музей або мастацкую выстаўку і г.д. Дадзеныя віды работ выконваюцца па жаданні вучняў і заахвочваюцца настаўнікам. Іх асноўнай мэтай з’яўляецца арыентацыя вучняў на эстэтычнае асваенне рэчаіснасці: прыроднага асяроддзя, помнікаў культуры, архітэктурных славутасцей свайго горада або вёскі і г.д.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(60 гадзін)

УСПРЫМАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ І МАСТАЦТВА
(8 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці
(3 гадзіны)

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў прыроды: разнастайнасць форм і колераў у прыродзе (кветкі, лісце, дрэвы). «Прагулка па гарадскім (сельскім) парку» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі); параўнальны аналіз формы, вызначэнне адценняў колеру садовых і лугавых кветак, знаходжанне падабенства і адрознення паміж імі. «Кветкі роднай зямлі» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў і з'яў прыроды: «Экскурсія па восеньскім парку (садзе)», «Экскурсія па веснавым парку (лесу)»; «Зіма-мастачка», «Снежныя скульптуры» (назіранне за станам прыроды ў розныя поры года, пажадана выкарыстанне мультымедыйных прэзентацый).

Эстэтычнае ўспрыманне архітэктуры Беларусі: «Прыгажосць сучасных архітэктурных збудаванняў Беларусі» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

Эстэтычнае ўспрыманне прадметнага свету: «Прыгажосць і карысць свету рэчаў» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

Успрыманне твораў мастацтва
(5 гадзін)

Роля выяўленчага мастацтва ў жыцці чалавека. Віды выяўленчага мастацтва: жывапіс (карціна), графіка (малюнак, ілюстрацыя). Творы мастакоў: І.Шышкін. «Раніца ў сасновым лесе», В.Васняцоў. «Алёнушка», ілюстрацыі да казак А.С.Пушкіна «Казка пра цара Салтана...», «Казка аб мёртвай царэўне і сямі волатах» і інш.

Віды і жанры выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура; нацюрморт, пейзаж, партрэт і інш.) – мастацкія творы на выбар настаўніка.

Мастацкі вобраз у розных відах выяўленчага мастацтва. Вобраз восені ў творах мастакоў: С.Каткоў. «Лагойскі матыў»; Г.Вашчанка. «Перад адлётам», «Бульба»; Л.Шакінка. «Бабіна лета»; І.Левітан. «Залатая восень»; І.Бродскі. «Апалае лісце»; В.Паленаў. «Залатая восень» і інш. (мастацкія творы на выбар настаўніка).

Настрой і стан прыроды ў пейзажах мастакоў (кампазіцыйнае і каларыстычнае рашэнне, эмацыянальнае значэнне колеру). Поры года ў творах мастакоў: А.Астаповіч. «Зімовы дзень»; С.Герус. «Зіма ў Менску»; Л.Дударэнка. «Зімовы дзень»; В.Сумараў. «Іней»; М.Рамадзін. «Незамярзаючая рэчка»; Лі Дзі. «Чалавек, які вядзе буйвала па снежнай раўніне»; П.Масленікаў. «Сакавіцкі вечар»; А.Гугель. «Бягуць раўчукі»; В.Цвірка. «Прыпяць. Вясна»; В.Бялыніцкі-Біруля. «Зялёны май», П.Крохалеў. «Вясна. Вяча», І.Левітан. «Вясна – вялікая вада», «Зноў вясна»; С.Герасімаў. «Вярба цвіце» (на выбар настаўніка).

Рэалістычныя, дэкаратыўныя і фантазійныя вобразы жывёл у выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (кафлі, прадметы народнага побыту і іх дэкор; творах мастакоў: Я.Чарушын – ілюстрацыі да кніг «Розныя звяры», «Дзеткі ў клетцы»; В.Ватагін – малюнкі жывёл; В.Васняцоў. «Гамаюн – птушка вешчая» і інш.).

Адзінства формы прадмета і яго аздабленне (агоўскія куфры, хахламскі посуд, жостаўскія падносы, дымкаўская цацка і інш.).

Беларускія ручнікі, посцілкі, паясы; народны саламяны, гліняны посуд і цацка. Функцыя, форма (канструкцыя) і дэкор вырабаў.

ПРАКТЫЧНАЯ МАСТАЦКА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
(52 гадзіны)

АДЛЮСТРАВАННЕ НА ПЛОСКАСЦІ
(30 гадзін)

Кампазіцыя
(11 гадзін)

Выбар палажэння ліста паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў. Адпаведнасць памеру выявы памеру ліста паперы. «Жырафа», «Бегемот», «Кракадзіл», «Слон», «Ракета», «Аўтобус», «Дом», «Волат», «Прыгажуня» і да т.п. (мастацкія матэрыялы на выбар настаўніка).

Кампаноўка выявы на лісце паперы. Узаемасувязь створаных аб'ектаў (фігур) у кампазіцыі. «Вясёлыя клоўны», «Паветраныя гімнасты», «Дрэсіроўшчыца і галубы» і да т.п. (гуаш, васковыя крэйды).

Гарманічнае запаўненне ліста паперы выявамі, выдзяленне кампазіцыйнага цэнтра. Маляванне пейзажа па памяці і ўяўленню: «Ясны восеньскі дзень», «Сумная восень», «Восеньская непагадзь» (гуаш або акварэль).

Паняцце пра кампазіцыйную ўзаемасувязь аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца (размяшчэнне прадметаў адносна адзін аднаго). «Снягурка і Дзед Мароз», «Два Мароза», «На будоўлі», «Убіраем яблыкі» (гуаш або акварэль).

Перадача характару і нораву жывёл (добры, злы, хітры, даверлівы, цікаўны і г.д.). Маляванне па ўяўленні вобразаў беларускіх і рускіх народных казак («Храбры певень», «Змей Гарыныч», «Кот Максім»), твораў К.Чукоўскага, С.Маршака і інш. На выбар вучняў (гуаш або акварэль).

Перадача характэрных асаблівасцей знешняга аблічча і настрою чалавека. «Мая матуля», «Мы з татам гуляем у шахматы», «Бабуля вяжа шалік», «Мой любы дзядуля», «Мая сястрычка (мой брацік) з цацкай» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Прастора
(2 гадзіны)

Перадача глыбіні прасторы ў малюнку: «на першым плане», «на другім плане». Выкананне кампазіцыі «Летні адпачынак», «На беразе возера», «На дачы», «На прышкольным участку», «Зімовая прагулка» (каляровыя алоўкі, гуаш).

Форма, прапорцыі, канструкцыя
(8 гадзін)

Перадача ў кампазіцыі формы, прапорцый і канструкцыі аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца: «Восеньскі нацюрморт», «Дары лесу», «Агародніна і садавіна» і да т.п. (гуаш або акварэль), «Нацюрморт з простых прадметаў побыту» (матэрыялы на выбар настаўніка).

Перадача ў малюнку характэрных асаблівасцей будовы дрэў (форма, канструкцыя). Маляванне на аснове назіранняў: «Зімовы лес», «Чароўныя дрэвы», «Магутны дуб», «Стройная бярозка» (гелевая ручка з чорным чарнілам, фламастар).

Перадача ў кампазіцыі характэрных асаблівасцей будовы фігуры чалавека і жывёлы (канструкцыя, прапорцыі). «Артысты цырка на арэне» (акрабат, клоўн, жанглёр, дрэсіроўшчык і інш.) (гуаш або акварэль).

Колер
(9 гадзін)

Колер і фарбы. Паняцце пра асноўныя (жоўты, чырвоны, сіні), састаўныя (аранжавы, фіялетавы, зялёны) колеры, светлыя і цёмныя адценні колеру. Выкананне кампазіцый: «Рознакаляровыя паветраныя шары», «Рознакаляровыя флагі», «Цвецік-рознацвецік», «Папараць-кветка», «Пунсовая кветачка», «Вішня (яблыня) цвіце» (гуаш або акварэль).

Эмацыянальна-вобразны змест колеру: радасны і сумны, рэзкі і пяшчотны, спакойны і напружаны: «Добрыя і злыя персанажы казак», «Русалачка», «Кентаўр», «Птушка Сірын» і інш. (гуаш або акварэль).

Кампазіцыйныя магчымасці колеру. Цёплы, халодны і змешаны каларыт. Выкананне шматпланавых кампазіцый: «Ясны восеньскі (зімовы) дзень», «Сумная восень», «Восеньская непагадзь», «Выглянула сонейка» (гуаш або акварэль).

Лепка
(8 гадзін)

Прыёмы лепкі. Лепка садавіны і агародніны: «Восеньскі нацюрморт» (яблык, груша, сліва, агурок, перац, памідор і інш.) (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Спосабы лепкі. Складанне цэлага з асобных частак: лепка персанажаў казак і мультфільмаў «Цуда-Юда – трохгаловы змей», «Ліса», «Віні-Пух» (рознакаляровы пластылін), «Жывёлы на арэне цырка» і інш. (гліна, аднакаляровы пластылін або салёнае цеста; калектыўная работа), «Я катаюся на лыжах (санках)» (гліна ці пластылін).

Перадача формы цела і пластыкі жывёл: «Шчаня», «Кошка з кацянятамі», «Мядзведзь», «Казляня» (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Дэкаратыўнае вырашэнне вобраза пры лепцы цацак. Лепка цацкі ў падарунак родным (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Лепка рэльефу: «Рыбка», «Нацюрморт», «Дэкаратыўны букет» (рознакаляровы пластылін).

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ДЫЗАЙН
(14 гадзін)

Дэкаратыўнае абагульненне формаў і колеру прадметаў (стылізацыя). Пано для школьнай сталовай (кухні) «Дэкаратыўны нацюрморт» (гуаш).

Дэкаратыўнае абагульненне формаў раслiннага і жывёльнага свету (стылізацыя). Фрыз: «Кветкі, матылькі і птушкі», «Мая Беларусь» (гуаш).

Прыёмы выканання кампазіцыі «Кветкавыя матывы», «Пацешныя жывёлы» ў тэхніцы «фларыстыка».

Прыёмы выканання кампазіцыі «Восеньскі букет» у тэхніцы «манатыпія».

Віды выцінанкі. Прыёмы выканання кампазіцыі «Дрэва жыцця» ў тэхніцы «выцінанка».

Віды арнаменту. Эскіз арнаменту для ўпрыгожвання кажушка, рукавічак і шапачкі для Снягуркі; пано для спальні, гасцінага пакоя, падноса, хусткі для спадарыні Мяцеліцы (гуаш).

Прыёмы стварэння кампазіцый дэкаратыўна-прыкладнога характару (асноўныя кампазіцыйныя схемы). Выкананне эскіза: «Хустка для мамы», «Дыван для лялькі», «Посуд для Васілісы Прыгожай, Бабы Ягі» (гуаш).

Віды аплікацыі (прадметная, сюжэтная, дэкаратыўная). Прыёмы вырэзвання элементаў аплікацыі: «Запаслівы вожык», «Дрэсіраваны леў», «Пудзель Арто», «Вясёлая малпачка», «Зімовы пейзаж» (збліжаныя і кантрасныя адценні паперы).

Рытм у дэкаратыўнай кампазіцыі. Фрыз: «Вясновыя кветкі», «Сняжынкі» (аплікацыя; калектыўная работа).

Прыёмы выканання рэльефнай кампазіцыі з паперы «Новы год у лесе», «У трыдзявятым царстве» (калектыўная работа).

Прыёмы выканання кампазіцый, вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка»: «Запрашальны білет», «Віншавальная паштоўка», ёлачныя цацкі, навагоднія сувеніры.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць/разумець:

адметныя асаблівасці асноўных відаў мастацтва (графіка, жывапіс, скульптура, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);

сродкі мастацкай выразнасці твораў графікі, жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

назвы асноўных і састаўных колераў; эмацыянальна-вобразныя магчымасці колеру;

назвы мастацкіх матэрыялаў, інструментаў, прыстасаванняў і правілы работы з імі;

адметныя асаблівасці гуашавых і акварэльных фарбаў, прыёмы работы з дадзенымі мастацкімі матэрыяламі;

прыёмы лепкі, трансфармацыі паперы, выканання аплікацыі, выцінанкі, манатыпіі і інш.;

асаблівасці кампазіцыйнага размяшчэння аб’ектаў, якія адлюстроўваюцца;

паслядоўнасць выканання жывапіснай, графічнай і скульптурнай (рэльефнай, аб’ёмнай) кампазіцый, аплікацыі, манатыпіі, выцінанкі і інш;

асноўныя кампазіцыйныя схемы, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару.

Умець:

выбіраць фармат ліста і яго палажэнне ў залежнасці ад зместу кампазіцыі;

поўнасцю выкарыстоўваць плоскасць ліста паперы, маляваць прадметы суразмерна фармату;

перадаваць характэрныя асаблівасці формы прадметаў;

састаўляць колеры, неабходныя для рэалізацыі творчай задумы;

запаўняць малюнак колерам, не пакідаючы прабелаў паміж фігурамі і фонам;

працаваць з мастацкімі матэрыяламі, інструментамі і прыстасаваннямі (гуаш, пластылін, васковая крэйда, туш, каляровая папера, клей, пэндзлі, палачкі);

выбіраць дэкор у адпаведнасці з формай і прызначэннем прадмета;

упрыгожваць плоскія і аб’ёмныя прадметы арнаментам;

выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і ўборка працоўнага месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прыстасаванняў);

актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні і ацэнцы работ аднакласнікаў.

Выкарыстоўваць (прымяняць) у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

спецыяльную (мастацтвазнаўчую) тэрміналогію (лексіку);

рацыянальныя прыёмы рэзання паперы;

аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб’ёмных цацак;

аптымальныя спосабы лепкі;

розныя мастацкія тэхнікі для вырашэння творчай задумы.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Шкуратава, М.А. Выяўленчае мастацтва / М.А. Шкуратава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Шкуратова, М.А. Изобразительное искусство в I классе / М.А. Шкуратова. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Ткач, Е.В. Изобразительное искусство: художественно-творческие задания: 1 класс / Е.В. Ткач. – Минск: Аверсэв, 2013.

Ткач, Е.В. Изобразительное искусство: тестовые задания. 1–4 классы / Е.В. Ткач. – Минск: Аверсэв, 2013.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Музыка» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания

МУЗЫКА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

В системе общего среднего образования учебному предмету «Музыка» принадлежит особая роль. Он целостно воздействует на личность, формирует мироощущение, мировосприятие и мировоззрение растущего человека; обеспечивает введение учащихся в мир музыкального искусства, содействует раскрытию художественно-творческого потенциала; создает условия для творческого самовыражения, оказывает помощь в обретении художественного видения мира.

Программа учебного предмета «Музыка» базируется на основополагающем принципе концепции Д.Б.Кабалевского, в соответствии с которым музыка определяется как «живое образное искусство, жизнью рожденное и к жизни обращенное».

В основе тематического построения программы лежит разработанная Д.Б.Кабалевским система обобщенных представлений о музыке как о важной части культуры общества и самоценном виде искусства. Логика построения программы отражает диалектику взаимодействия музыки и жизни. Решению сверхзадачи «Музыка – Жизнь» содействует пристальное внимание к социальным функциям музыкального искусства, его воздействию на духовный мир растущего человека.

Подобная обращенность к жизни позволяет выделить в программе метапредметное, жизненное содержание, способствующее формированию у учащихся целостной картины мира («Звучащий мир вокруг нас», «Природные и механические звуки», «Интонация» и др.). Формированию целостного художественного сознания содействует обращение к явлениям и понятиям, выходящим за пределы музыкального искусства (композиция, форма, ритм, «пульс» (метр) и др.).

Цель изучения учебного предмета «Музыка» – воспитание у учащихся музыкальной культуры как части их духовной культуры.

Задачи:

формирование эстетического отношения к действительности;

воспитание любви к музыке, художественного вкуса;

освоение музыкального искусства (овладение музыкальными знаниями, слушательскими, исполнительскими и композиторскими умениями);

накопление опыта самостоятельной художественно-творческой деятельности;

развитие музыкальных и творческих способностей.

Согласно программе освоение музыкального искусства происходит в формах самого искусства. Учебная деятельность осуществляется как художественная по содержанию и учебная по форме.

Реализация программы предусматривает использование универсальных методов проблематизации содержания и моделирования художественно-творческого процесса. Для решения конкретных задач используются методы художественного, нравственно-эстетического познания музыки, перспективных и ретроспективных связей, эмоционально-смысловой драматургии и др.

Основной формой организации образовательного процесса является урок. Урок музыки трактуется как урок искусства, для которого характерны гибкая структура и наличие эмоционально-смысловой драматургии.

Усилению связи процесса обучения с жизнью содействует широкое применение интерактивных технологий, фасилитационных дискуссий и художественно-творческих проектов. Последние позволяют индивидуализировать образовательный процесс, организовать его с учетом потребностей и возможностей учащихся, предоставляют возможность выбора позиции композитора, исполнителя, слушателя при освоении художественного материала. Художественно-творческие проекты могут включать такие виды деятельности, как слушание, пение, игра на музыкальных инструментах, пластическое интонирование, театрализация, сочинение, импровизация, ритмодекламация и др.

Программа предусматривает взаимодействие и интеграцию различных видов искусства (музыка, литература, хореография, изобразительное искусство, театр) при решении конкретной художественной задачи. Осуществляемый при этом выход за пределы выразительной системы музыкального искусства обеспечивает рассмотрение музыкальных явлений в широком художественном контексте, дает возможность выявить общие основы художественного творчества, освоить в практической форме закономерности взаимодействия искусств.

Программа призвана выстроить систему устойчивых связей между музыкальным искусством и «повседневной» культурой, жизненным и художественным опытом учащихся. В этой связи изучение традиционной музыкальной культуры (фольклора) осуществляется с учетом локальных традиций. Для изучения культуры народов, населяющих Республику Беларусь, предусмотрено «рамочное содержание» в соответствующих разделах программы.

В целях формирования гражданской культуры учащихся рекомендуется ежегодное обращение к Государственному гимну Республики Беларусь для слушания и исполнения.

Программа предоставляет учителю пространство для творчества, которое может проявляться в выборе и распределении художественного материала, художественно-драматургическом планировании урока, осуществлении образовательного процесса в целом.

Предлагаемое в программе планирование является примерным и предоставляет учителю возможность самостоятельно конструировать содержание каждого урока. Однако «… творчески подходя к программе, учитель ни в коем случае не должен разрушать ее тематическое построение, потому что последовательное развитие определенных тем – основа основ данной программы» (Д.Б.Кабалевский).

Художественный репертуар, представленный в программе, является примерным. Его применение осуществляется с учетом особенностей класса и уровня музыкальной подготовки учащихся. Допускается самостоятельный выбор произведений для слушания и исполнения в соответствии с критериями художественности и доступности музыкального материала.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА

I четверть

Мир звуков
(8 ч)

Образовательный процесс в I четверти предполагает формирование у учащихся:
знаний (на уровне представлений) о:
многообразии звуков окружающего мира;
выразительных и изобразительных возможностях музыки;
разнообразии музыкальных инструментов;
умений*:*
воспринимать музыку как искусство, неразрывно связанное с жизнью;
эмоционально откликаться на музыкальное произведение;

передавать художественно-образное содержание произведений в исполнительской деятельности (пении, инструментальном музицировании, ритмодекламации и др.);

участвовать в коллективной творческой деятельности при воплощении художественных образов;

давать оценку результатам коллективной музыкальной деятельности на уровне личностного эмоционального отношения;

вслушиваться в звуки окружающего мира и ориентироваться в их многообразии;

различать и использовать в собственной художественной деятельности природные, механические и музыкальные звуки;

передавать с помощью музыкальных звуков определенное настроение;

создавать звуковые картины.

Примерное планирование темы

1. Звучащий мир вокруг нас (1 ч).
2. Природные и механические звуки (1 ч).
3. Музыка – страна звуков (1 ч).
4. Картины, созданные при помощи звуков (2 ч).
5. Настроение, переданное при помощи звуков (2 ч).
6. Обобщающий урок по теме «Мир звуков» (1 ч).

Звуковое разнообразие окружающего мира (мира природы и человека). Возможность воспроизведения звуков «звучащими» жестами.

Характерные особенности природных и механических звуков. Многообразие звуков природы. Источники механических звуков.

Особенности музыкальных звуков. Отличие музыкальных звуков от звуков природных и механических.

Выразительные возможности звуков. Создание звуковых картин.

Примерный музыкальный материал

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н.Соколовского*, сл. *М.Климковича* и *В.Коризны*.

Белорусские народные песни «Ладу-ладу-ладкі», «Белабока сарока», «Дожджык», «Іграў я на дудцы».

«Где живет музыка». Муз. и сл. *В.Ковалива*.

«Слово на ладошках». Муз. *Е.Попляновой*, сл. *Н.Пикулевой*.

«Солнышко», «Дождик». Муз. *Е.Тиличеевой*, сл. *Л.Дымовой*.

«Осень». Муз. *М.Красева*, сл. *М.Ивенсен*.

«По грибы». Муз. *В.Оловникова*, сл. *Л.Алтухова.*

С.Прокофьев. «Дождь и радуга», «Сказочка» (из сб. фортепианных пьес «Детская музыка»).

Г.Вагнер. «Зязюлька», «Песенка».

Р.Шуман. «Песенка жнецов», «Охотничья песенка» (из сб. фортепианных пьес «Альбом для юношества»).

Э.Григ. «Птичка».

А.Хачатурян. «Вечерняя сказка».

П.Подковыров. «Ку-ку».

Д.Шостакович. «Шарманка».

Ж.-Ф.Рамо. «Курица».

Н.Римский-Корсаков. «Океан – море синее» (оркестровое вступление к опере «Садко»).

II четверть

КАК РАССКАЗЫВАЕТ МУЗЫКА
(8 ч)

Образовательный процесс во II четверти предполагает формирование у учащихся:
знаний (на уровне представлений) о:
музыкальном языке и его выразительных возможностях;
звукоподражании;
умений*:*
видеть связь выразительных средств музыкального произведения с его жизненным содержанием;
эмоционально и осознанно воспринимать музыку;
передавать музыкально-смысловое содержание произведений в исполнительской деятельности (пении, инструментальном музицировании, ритмодекламации и др.);
участвовать в коллективной и индивидуальной творческой деятельности при воплощении художественных образов;
давать эмоциональную и содержательную оценку результатам коллективной и индивидуальной музыкальной деятельности;
дифференцировать изобразительные и выразительные возможности музыки;
использовать приемы звукоподражания в процессе художественной деятельности;
распознавать и использовать в собственной художественной деятельности различные способы отражения большого и маленького, высокого и низкого, быстрого и медленного, светлого и темного, близкого и далекого.

Примерное планирование темы

1. Что и как можно рассказать при помощи звуков (1 ч).
2. Звукоподражание (1 ч).
3. Свет и тень в музыке (лад) (1 ч).
4. Быстрое и медленное в музыке (темп) (1 ч).
5. Близкое и далекое в музыке (динамика) (1 ч).
6. Холодное и теплое в музыке (тембр) (1 ч).
7. Высокие и низкие звуки (регистр) (1 ч).
8. Обобщающий урок по теме «Как рассказывает музыка» (1 ч).

Роль звуков в создании музыкальных картин. «Изобразительность» и «выразительность» в музыке.

Звукоподражание. Приемы звукоподражания.

Способы передачи света и тени в музыке. Выразительные возможности лада.

Способы передачи быстрого и медленного в музыке. Выразительные возможности темпа.

Способы передачи громкого и тихого в музыке. Выразительные возможности динамики.

Способы передачи холодного и теплого в музыке. Разнообразие музыкальных тембров.

Высокие и низкие звуки в музыке. Выразительные возможности регистров.

Примерный музыкальный материал

Белорусские народные песни «Чубаценькі верабей», «Гэй ты, воўчанька».
«Пайшоў коўзацца каток». Муз. народная, сл. *С.Шушкевича*.
«Зімовая калыханка». Муз. *Л.Сверделя*, сл. *В.Вербы*.
«Добрый жук». Муз. *А.Спадавеккиа*, сл. *Е.Шварца*.
«Догадайся, кто поет». Муз. *Е.Тиличеевой*, сл. *А.Гангова*.

«Здравствуй, зимушка-зима». Муз. *А.Филиппенко*, сл. *Т.Волгиной*.

«Новогодняя хороводная». Муз. *А.Островского*, сл. *Ю.Леднева*.

«Бубенчики». Муз. *Е.Тиличеевой*, сл. *Л.Дымовой*.

«Песенка друзей». Муз. *В.Герчик*, сл. *Я.Акима*.

«Новогодняя». Муз. *В.Ковалива*, сл. *А.Науменко*.

И.Брамс. «Петрушка».

Р.Шуман. «Смелый наездник», «Веселый крестьянин, который возвращается с работы», «Дед Мороз» (из сб. фортепианных пьес «Альбом для юношества»).

Г.Сурус. «Галоп», «Калыханка», «Жарты».

К.Сен-Санс. «Куры и петухи», «Антилопы», «Черепаха» (из зоологической фантазии «Карнавал животных»).

К.Тесаков. «Гульня ў снежкі», «Снежны вальс».

С.Кортес. «В некотором царстве» (из Маленькой сюиты для фортепиано «Сказка»).

Ж.-Ф.Рамо. «Тамбурин».

Д.Кабалевский. «Клоуны».

В.Агафонников. «Сани с колокольчиками».

П.Чайковский. «Вальс снежных хлопьев», «Танец Феи Драже» (из балета «Щелкунчик»).

III четверть

ИЗ ЧЕГО ВЫРОСЛА МУЗЫКА
(9 ч)

Образовательный процесс в III четверти предполагает формирование у учащихся:

знаний (на уровне представлений) о:

песне, танце, марше как первооснове музыкального искусства;

разнообразии песен, танцев, маршей;

метре (пульсации) и его роли в музыке;

умений:

воспринимать музыку как живое, образное искусство, рожденное жизнью и неразрывно с жизнью связанное;

эмоционально и осознанно воспринимать и исполнять музыку;

передавать музыкально-смысловое содержание произведений в исполнительской деятельности (пении, инструментальном музицировании, ритмодекламации и др.);

участвовать в коллективной и индивидуальной творческой деятельности при воплощении художественных образов;

оценивать результаты музыкальной деятельности, выражать личностное отношение к содержанию музыки;

определять настроение в музыке;

распознавать песню, танец, марш;

исполнять равномерный «пульс» в музыке разного характера, выделять сильные и слабые доли «пульса»;

выразительно исполнять песни и инструментальные композиции;

моделировать мелодический и ритмический рисунок песен-танцев, песен-маршей.

Примерное планирование темы

1. С чего начинается музыка (1 ч).
2. Песня, танец, марш (1 ч).
3. Живой пульс музыки (1 ч).
4. Какие бывают марши (1 ч).
5. Какие бывают танцы (2 ч).

6. Песня в жизни человека (1 ч).

Простая мова, інтанаванне і афармленне на пісьме. Дыялог. Афармленне дыялогу.

Кантрольны дыктант і яго аналіз.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Дзяліць тэксты на сказы, называць граматычную аснову і словазлучэнні.

Карыстацца інтанацыяй для абазначэння меж сказаў, выяўляць іх тыпы (па мэце выказвання і інтанацыі).

Складаць і ўжываць розныя тыпы словазлучэнняў і сказаў (у тым ліку сказы з аднароднымі членамі і звароткамі); выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў і сказаў; ставіць знакі прыпынку ў адпаведнасці з вывучанымі правіламі.

Чытаць тэксты, вызначаць іх адрасата, стыль, мэтанакіраванасць; выдзяляць апорныя словы і словазлучэнні. Падрабязна пераказваць прачытаныя і праслуханыя тэксты.

Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія

(28 гадзін, з іх 4 гадзіны – на пісьмовыя работы і іх аналіз)

Гукі беларускай мовы. Літара як знак гука. Прызначэнне літар ***е, ё, ю, я, і***.

Беларускі алфавіт. Назвы літар. Склад. Націск. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне).

Чытанне тэкстаў у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення, *з захаваннем інтанацыі.*

Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту.

Галосныя гукі. Вымаўленне і правапіс галосных ***о, э, а; е, ё, я.*** Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Глухія, звонкія і санорныя, свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс.

Цвёрдыя і мяккія зычныя, іх вымаўленне і правапіс. Зацвярдзелыя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Чытанне і запіс пад дыктоўку слоў, *словазлучэнняў*, *сказаў і тэкстаў з захаваннем арфаэпічных і арфаграфічных нормаў.*

Мяккі знак і апостраф. Зычныя [***д***]–[***дз'***], [***т***]–[***ц'***], іх вымаўленне і правапіс. Правапіс ***у***, ***ў***.

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс.

Правапіс некаторых спалучэнняў зычных.

Кантрольны дыктант і яго аналіз.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Адрозніваць гукі і літары; правільна вымаўляць гукі і перадаваць іх на пісьме; тлумачыць напісанні, карыстацца арфаграфічным слоўнікам; рабіць фанетычны разбор слоў.

Захоўваць інтанацыю пры чытанні; вызначаць сродкі, з дапамогай якіх дасягаецца мілагучнасць маўлення.

Вусна і пісьмова падрабязна пераказваць мастацкія тэксты.

Лексіка. Фразеалогія

(20 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Словы як назвы рэчаў, з'яў, паняццяў. Лексічнае значэнне слова.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. Амонімы (знаёмства).

Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку. Устарэлыя словы і неалагізмы.

Запазычаныя словы, іх ужыванне і правапіс.

Пераклад з рускай мовы на беларускую вучэбнага тэксту.

Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні.

Складанне спісаў мясцовых назваў, *запіс фразеалагізмаў*, *прыказак*, *прымавак.*

Кантрольны пераказ апавядальнага тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць лексічнае значэнне слова па слоўніку і ў тэксце; выяўляць у тэксце агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку; распазнаваць і правільна пісаць запазычаныя словы, устарэлыя словы і неалагізмы, выкарыстоўваць іх у маўленні; падбіраць да слоў сінонімы і антонімы, карыстацца сінонімамі як сродкам сувязі сказаў у тэксце; выяўляць фразеалагізмы ў тэксце, тлумачыць іх значэнне, вызначаць сінтаксічную ролю, ужываць у маўленні; карыстацца тлумачальным, перакладнымі слоўнікамі.

Перакладаць з рускай мовы на беларускую вучэбныя тэксты; складаць спісы мясцовых назваў, фразеалагізмаў, прыказак і прымавак. Пераказваць апавядальныя тэксты.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год
(4 гадзіны)

Рэзервовыя гадзіны
(2 гадзіны)

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Вучэбна-метадычная літаратура

Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты: 5–9 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2013, 2014.

Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя пераказы: 5–9 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2012, 2014.

Валочка, Г.М. Беларуская мова. 5–9 класы. Вывучаем беларускі правапіс: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі; Аверсэв, 2010, 2012.

Валочка, Г.М. Вывучаем беларускі правапіс. 5–9 кл.: вучэб.-метад. комплекс / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Васюковіч, Л.С. Беларуская мова ў 5 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Л.С. Васюковіч, В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Гамеза, Л.М. Беларуская мова. 5 клас. Грані слова: ад гука да сказа: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Л.М. Гамеза. – Мінск: Аверсэв, 2012.

Гамеза, Л.М. Грані слова: ад гука да сказа: 5 клас: вучэб.-метад. комплекс / Л.М. Гамеза. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Жуковіч, М.В. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.В. Жуковіч. – Мінск: Аверсэв, 2015.

Красней, В.П. Беларуская мова. Тэставыя заданні для 5 класа: у 2 ч.: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль. – Мазыр: Белы Вецер, 2012.

Красней, В.П. Дыдактычны матэрыял па беларускай мове. 5 клас: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль. – Мазыр: Белы Вецер, 2015.

Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5–6 класы): вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С.В. Мартынкевіч. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010.

Новікава, Г.Д. Беларуская мова. 5 клас. Апорныя канспекты: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.Д. Новікава. – Мінск: Аверсэв, 2013, 2014.

Тумаш, Г.В. Беларуская мова: 5 клас: Рабочы сшытак: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.В. Тумаш. – Мінск: Аверсэв, 2012, 2013.

Хмялеўская, А.У. Тэматычны кантроль па беларускай мове: 5 кл.: Рабочы сшытак: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А.У. Хмялеўская. – Мінск: Сэр-Віт, 2012, 2013.

Цыбульская, С.І. Беларуская мова: 5–11 класы: Кантрольныя работы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С.І. Цыбульская. – Мінск: Сэр-Віт, 2012.

Слоўнікі і даведнікі

Анисим, Е.Н. Русско-белорусский словарь для школьников / Е.Н. Анисим, О.В. Мицкевич. – Минск: Сучасная школа, 2010.

Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад.: І.У. Кандраценя, Л.П. Кунцэвіч; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Капылоў, І.Л. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў. Новыя правілы правапісу / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Беларуска-рускі слоўнік для школьнікаў / І.Л. Капылоў, І.У. Ялынцава. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Малажай, Г.М. Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Малажай, Л.І. Яўдошына. – Мінск: Аверсэв, 2013.

Николаева, О.М. Современный русско-белорусский словарь для школьников / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: Літаратура і Мастацтва, 2009, 2013.

Николаева, О.М. Современный русско-белорусский словарь / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: ТетраСистемс, 2011.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Разам, асобна, праз злучок: Даведнік: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад.: Н.Д. Бандарэнка, І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Уласевіч, В.І. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў / В.І. Уласевіч, Н.М. Даўгулевіч. – Мінск: Аверсэв, 2013.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з агульнымі задачамі ўдасканалення як сістэмы адукацыі ўвогуле, так і літаратурнага навучання ў прыватнасці. Вывучэнне беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі арыентавана на дасягненне мэт, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».

Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да багацця беларускай і сусветнай мастацкай літаратуры, эстэтычнае спасціжэнне вучнямі свету, складанасці чалавечых узаемаадносін і на гэтай аснове выхаванне асобы з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, адданасцю агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здатнай ператварыць успрыманне прыгажосці (эстэтычнае ўспрыманне) у стымул маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Аснову зместу беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета складаюць чытанне і тэкстуальнае вывучэнне высокамастацкіх твораў нацыянальнай класікі і вядомых майстроў слова. Гэтыя творы вызначаюцца багатым пазнавальным і выхаваўчым патэнцыялам, з'яўляюцца даступнымі для вучняў пэўнага ўзросту. Цэласнае ўспрыманне і разуменне літаратурных твораў, фарміраванне ўменняў аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі тэкст магчыма толькі пры адпаведнай эмацыянальна-эстэтычнай рэакцыі чытача.

Вучэбная праграма для V класа заснавана на ідэях кампетэнтнаснага падыходу, паводле якога засваенне зместу навучання накіравана на фарміраванне прадметных, метапрадметных і асобасных кампетэнцый вучняў. Рэалізацыя такога падыходу прадугледжвае ўзмацненне дзейнасна-практычнага кампанента літаратурнай адукацыі. У сувязі з чым у праграме акрэсліваюцца асноўныя віды вучэбнай дзейнасці вучняў і патрабаванні да яе вынікаў.

Курс V класа ў сістэме літаратурнай адукацыі займае асобае месца як пераходны ад пачатковага этапа навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне).

Прапедэўтычны курс літаратуры мае на мэце сфарміраваць у вучняў уяўленне пра літаратуру як чалавеказнаўства і як мастацтва слова, якому ўласцівыя адметныя спосабы вобразнага адлюстравання жыцця. Усведамленне вучнямі чалавеказнаўчага аспекту літаратуры – пазнання свету і чалавека праз мастацкае, эстэтычнае іх адлюстраванне і ўспрыманне, праз маральна-эстэтычную ацэнку рэчаіснасці, жыццёвых з'яў і падзей – асноўнае ў курсе літаратуры V класа. Галоўным аб'ектам на ўроку літаратуры з'яўляецца мастацкі твор, яго жыццёва-пазнавальныя, мастацка-эстэтычныя, каштоўнасна-ацэначныя якасці.

Асноўная задача настаўніка на ўроках літаратуры ў V класе заключаецца ў тым, каб зацікавіць вучняў чытаннем, скіраваць іх увагу на пазнанне мастацкай прыроды фальклорных і літаратурных твораў, навучыць успрымаць літаратуру як мастацтва слова.

Напрамак вывучэння літаратуры ў V класе і прынцыпы структуравання зместу вызначаны ў адпаведнасці з логікай чытацкага ўспрымання мастацкага твора, калі асваенне жыццёвага матэрыялу (зместу) у яго вобразным увасабленні натуральна спалучаецца з пазнаннем і ўсведамленнем галоўных асаблівасцей літаратуры як мастацтва. Матэрыял пададзены сістэмна, згрупаваны ў адпаведныя тэматычныя блокі, для таго каб вучні авалодвалі параўнальным падыходам у працэсе аналізу мастацкіх твораў і іх кампанентаў. У выніку такога структуравання зместу кожны асобны твор выступае як адметная мастацкая з'ява, а ўсе тэксты разам узятыя дазваляюць убачыць ідэйна-тэматычную разнастайнасць літаратуры, яе эстэтычнае багацце. Пры гэтым настаўнік у працэсе асэнсавання твора дапамагае вучням назапашваць неабходныя літаратурныя веды на аснове засваення сутнасці канкрэтных тэарэтычных паняццяў. Па тэорыі літаратуры адабраны асобныя, даступныя вучням пэўнага ўзросту паняцці, звязаныя з мастацкім творам і яго кампанентамі (тэма, сюжэт, літаратурны герой у мастацкім творы; моўныя вобразныя сродкі – эпітэт, параўнанне), а таксама звесткі пра фальклор і некаторыя яго жанры.

У адпаведнасці з узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцямі вучняў, іх жыццёвым і чытацкім вопытам быў вызначаны змест курса літаратуры – фальклорныя і літаратурныя творы, больш складаныя (у параўнанні з IV класам) і разнастайныя па тэматыцы і жанрах, мастацкіх асаблівасцях, якія даюць магчымасць шырокага «агляду» жыцця. Паколькі ў падлеткавым узросце фарміруецца сістэма каштоўнасных адносін да жыцця, адбываецца працэс самаўсведамлення асобы, яе духоўнага станаўлення, вялікая ўвага надаецца творам, якія выяўляюць найважнейшыя грамадзянскія, маральна-этычныя якасці ў характары і паводзінах чалавека, яго адносінах да Радзімы, яе мінулага і сучаснага, да сваёй культуры і мовы, да захавання прыроды і г.д.

Такім чынам, у курсе літаратуры V класа дамінуе жанрава-тэматычны падыход, а ў цэнтры знаходзіцца мастацкі твор і яго будова.

Дзеля развіцця пазнавальных інтарэсаў, выхавання мастацка-эстэтычнага густу і фарміравання цэласнага светапогляду вучняў мэтазгодна прадугледжваць пры навучанні беларускай літаратуры рэалізацыю міжпрадметных сувязей перш за ўсё з такімі вучэбнымі прадметамі, як «Беларуская мова», «Русская литература», «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)».

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з падручнікам – усе гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейсны характар, дыялагічнасць.

На вывучэнне літаратуры ў V класе адведзена 70 гадзін (з іх адпаведна 62 гадзіны – на вывучэнне і абмеркаванне твораў, 4 гадзіны – на творчыя работы, 4 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання).

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(70 гадзін)

Уводзіны
(1 гадзіна)

Падарожжа па Краіне літаратуры. Тэматычная, змястоўная разнастайнасць фальклорных і літаратурных твораў. Пазнавальнае, выхаваўчае і эстэтычнае значэнне літаратуры.

I. РОДНАЕ СЛОВА
(4 гадзіны)

Пятрусь Броўка. «Калі ласка». Родная мова – крыніца натхнення пісьменніка. Эмацыянальнасць выказвання. Мастацкая дасканаласць паэтычных вобразаў, інтанацыйнае багацце верша. Раскрыццё характару беларуса. Заклапочанасць паэта лёсам роднай мовы.

Яўгенія Янішчыц. «Мова». Замілаванне аўтара выразнасцю і прыгажосцю беларускага слова. Роздум пра няпросты лёс беларускай мовы на працягу шматгадовай гісторыі народа. Спавядальны характар верша. Эмацыянальная выразнасць паэтычных радкоў. Дасканаласць сродкаў мастацкага выяўлення, адметная роля эпітэтаў у стварэнні мастацкіх вобразаў верша.

Анатоль Грачанікаў. «Дрымотна ціснуцца кусты...». Паэтызацыя роднай прыроды ў творы. Выяўленне трывогі, душэўнага ўзрушэння паэта на фоне гарманічнага быцця прыроды. Роля аўтарскага звароту да роднага краю. Асаблівасці будовы мовы.

Уладзімір Караткевіч. «Бацькаўшчына» або **Яўген Крупенька. «Ёсць у кожнага з нас…»**. Гонар паэта за сваю Радзіму, захапленне яе краявідамі. Мастацкае адлюстраванне прыроднага наваколля ў вершы. Глыбокі лірызм, шчырасць і непасрэднасць у перадачы пачуццяў паэта. Вобразнасць, эмацыянальная насычанасць мовы.

Мастацтва*. Жывапіс: *В.Цвірка*. «Мая Радзіма», «Заслаўе»; *М.Ісаёнак*. «Песня аб маёй зямлі»; *І.Пушкоў*. «Вясна на Нёмане»; *А.Казлоўскі*. «Зялёны май»; *М.Рагалевіч*. «Сімфонія вясны»; *В.Бялыніцкі-Біруля*. «Лотаць зацвіла»; *В.Бяляўскі*. «Беларускі краявід» і інш.

* Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва» адбываецца на выбар настаўніка і ў першую чаргу з апорай на вядомае. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, дадатковыя гадзіны на авалоданне імі не патрабуюцца.

II. ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ
(13 гадзін)

Народныя казкі

«Разумная дачка». Займальнасць казачнага сюжэта. Выяўленне народнай кемлівасці, дасціпнасці, спрыту і розуму ў вобразе дачкі бедняка. Вобразы мужыка, пана, багацея і яго жонкі. Індывідуалізацыя мовы персанажаў. Дыялог як сродак характарыстыкі пана і дзяўчынкі-сямігодкі. Роля фантазіі і выдумкі, характар канфлікту, адметнасці вобразнай сістэмы і стылю бытавой казкі. Гумар у творы.

«Залаты птах». Сцвярджэнне высокіх маральных каштоўнасцей: працавітасці, смеласці, дабрыні і спагадлівасці. Супрацьстаянне дабра і зла як пастаянны матыў народнай казкі. Вобраз галоўнага героя. Мастацкая гіпербала як сродак характарыстыкі персанажа.

«Музыкі». Характарыстыка казачных герояў – асла, сабакі, ката і пеўня. Сіла адданага, вернага сяброўства ў пераадоленні жыццёвых нягод. Займальнасць казачнага сюжэта. Адметнасць казкі пра жывёл.

Легенды

«Нарач». Гісторыя паходжання возера. Еднасць чалавека і прыроды. Фантастычнае і чароўнае ў легендзе аб Найрыце. Паэтызацыя прыгажосці, душэўнай чысціні, вернасці ў каханні. Маральная перавага Найрыты над панам. Лаканічнасць і мастацкая выразнасць мовы.

«Пестунь». Мастацкая выразнасць легенды, багацце бытавых і сацыяльных рэалій, даступнасць зместу і лаканізм формы. Спосабы абмалёўкі вобразаў. Павучальны змест твора.

Мастацтва. Беларускія легенды, казкі ў творах мастакоў *А.Александровіча*, *А.Навіцкага*, *Ю.Зайцава*, *В.Валынца*, *У.Глакевіча* і інш.; мультфільмы, тэатральныя, тэле- і радыёспектаклі па легендах, казках.

Загадкі

Паэтычнае асэнсаванне свету ў загадках.

Дасціпнасць і мудрасць беларускіх загадак, іх тэматычнае багацце. Роля загадкі ў выхаванні кемлівасці, знаходлівасці. Будова, іншасказальны характар, лаканізм загадак.

Прыказкі

Увасабленне ў прыказках вопыту і мудрасці народа. Разнастайнасць тэматыкі, сцісласць і выразнасць, пераносны сэнс прыказак. Лаканізм, трапнасць і дакладнасць мовы. Прыказкі як своеасаблівыя мастацкія творы.

Прыкметы і павер’і

Спасціжэнне чалавекам навакольнага свету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Функцыі прыкмет і павер’яў, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека. Афарыстычнасць, трапнасць народных прыкмет. Блізкасць прыкмет і павер’яў да іншых фальклорных жанраў (загадак, казак, легенд, прыказак).

Тэорыя літаратуры. Народная казка. Віды казак (пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя). Легенды, іх асаблівасці. Загадкі. Прыказкі. Прыкметы і павер’і.

ІІІ. ЛІТАРАТУРНЫЯ КАЗКІ І ЛЕГЕНДЫ
(10 гадзін)

Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы **«Нарач»**). Мастацкае пераасэнсаванне легенды пра ўтварэнне возера Нарач. Выкарыстанне ў творы фальклорных матываў і сюжэтаў. Паэтызацыя вернасці і кахання. Вобразы Галі і Васіля. Драматызм і напружанасць сюжэта. Сродкі мастацкай выразнасці ў творы.

Якуб Колас. «Крыніца». Алегарычны змест і патрыятычны пафас казкі. Характарыстыка крыніцы праз яе адносіны да родных мясцін. Усведамленне гарой сваёй адказнасці перад будучыняй. Аўтар-апавядальнік у творы. Сувязь паэтыкі казкі з вуснай народнай творчасцю.

Уладзімір Караткевіч. **«Нямоглы бацька».** Фальклорная аснова твора. Гуманістычны пафас казкі. Шанаванне мудрасці і вопыту бацькоў, выхаванне ўдзячнасці, павагі, уважлівасці і міласэрнасці да іх. Адносіны аўтара да герояў і падзей.

Георгій Марчук. «Чужое багацце». Сюжэт казкі, яго займальнасць. Маральна-этычныя праблемы твора. Сродкі мастацкага выяўлення.

Андрэй Федарэнка. «Падслуханая казка». Аўтарская інтэрпрэтацыя гісторыі паходжання кветак маргарытак у розных краінах Еўропы. Індывідуалізацыя казачных персанажаў. Своеасаблівасць будовы і адметнасць мовы літаратурнай казкі.

Тэорыя літаратуры. Літаратурная казка, яе блізкасць да народнай казкі. Легенда ў літаратуры, падабенства да народных легенды і падання і іх адрозненне.

IV. ВЫРАЗНАСЦЬ МАСТАЦКАГА СЛОВА
(8 гадзін)

Максім Багдановіч. «Зімой». Паэтычны малюнак зімовага вечара. Непасрэднасць, вастрыня паэтычнага светаўспрымання. Фальклорна-рамантычны каларыт карцін прыроды, іх эмацыянальная выразнасць. Вобразна-выяўленчыя сродкі. Гукавая інструментоўка верша.

Анатоль Грачанікаў. «Зоры спяваюць». Паэтызацыя зорнага неба, зачараванасць яго прыгажосцю і гармоніяй. Філасофскі роздум пра бясконцасць сусвету, шчасце яго сузірання і пазнання. Сцісласць і эмацыянальнасць выказванняў, выразнасць і пластычнасць мовы.

Якуб Колас. «Песня ляснога жаваранка» (урывак з трылогіі **«На ростанях»**). Майстэрства пісьменніка ў перадачы колераваў і гукавой гамы навакольнага свету. Замілаванасць хараством прыроды, захапленне цудоўнай песняй ляснога жаваранка, перададзеныя праз арыгінальныя эпітэты, метафары, параўнанні. Вобразнасць, выразнасць і пластычнасць мовы.

Якуб Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы **«Новая зямля»**). Паэтызацыя зімовага пейзажу. Выяўленне паўнаты і радасці жыцця праз вобразны і інтанацыйны лад верша. Адухоўленасць карціны прыроды. Мастацкая выразнасць мовы.

Уладзімір Караткевіч. «Лісце» або **Анатоль Грачанікаў. «Як ападае ліст...».** Суладнасць пачуццяў паэта і прыроды, адчуванне духоўнага адзінства з зямлёй. Паэтычная адухоўленасць з'яў прыроды. Майстэрства аўтара ў стварэнні вобраза восені, тонкасць паэтычнага светаадчування. Эмацыянальная пранікнёнасць, цеплыня, задушэўнасць выказванняў, даверлівасць інтанацый. Захапленне хараством восені, перададзенае праз шматлікія тропы, напеўны рытм верша.

Анатоль Грачанікаў. «Верасень». Паэтычнае адухаўленне прыроды ў вершы. Майстэрства паэта ў стварэнні вобраза восені, арыгінальнасць паэтычнага светаадчування, шчырасць пачуццяў. Эмацыянальная пранікнёнасць, цеплыня, задушэўнасць выказванняў, даверлівасць інтанацый.

Пятрусь Броўка. «Кропля». Адлюстраванне зменлівасці прыроды падчас навальніцы. Багацце зрокавых малюнкаў. Паэтычны сэнс вобразна-выяўленчых сродкаў і рытмічнай арганізацыі верша.

Тэорыя літаратуры. Сродкі мастацкай выразнасці ў літаратурным творы. Эпітэт, параўнанне.

Мастацтва. Жывапіс: *В.Бялыніцкі-Біруля*. «Восень», «Лес задрамаў», «Аголеныя бярозкі»; *В.Ціханаў*. «Восеньскі матыў»; *У.Сулкоўскі*. «Бервянец. Восень»; *А.Бараноўскі*. «Восень на Прыпяці»; *Ф.Рушчыц*. «Зімовая казка»; *В.Цвірка*. «Беларускі пейзаж» і інш.

V. ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР – СКЛАДАНАЕ І НЕПАДЗЕЛЬНАЕ МАСТАЦКАЕ АДЗІНСТВА
(21 гадзіна)

Якуб Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы **«Новая зямля»**). Паэтычнае асэнсаванне штодзённага жыцця сялянскіх дзяцей. Прырода і дзеці, іх дапытлівасць, назіральнасць. Аўтарскі гумар у паказе паводзін хлопчыкаў. Рытмічны малюнак, вобразна-выяўленчыя сродкі (адмоўныя паралелізмы, эпітэты, параўнанні).

Якуб Колас. «У старых дубах». Сяброўства Грышкі і Базыля. Неабдуманы ўчынак Грышкі. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету дзяцей. Роля малюнкаў прыроды ў творы.

Міхась Лынькоў. «Васількі». Трагедыя Міколкі і яго родных. Аўтарскі боль па загубленым маленстве. Кантраснасць і эмацыянальная сугучнасць карцін прыроды і настрою хлопчыка. Прыёмы абмалёўкі характараў Міколкі і дзеда Нупрэя. Драматызм, напружанасць сюжэта. Роля заключнага эпізоду ў раскрыцці тэмы. Пейзаж у творы. Лірычнасць апавядання.

Рыгор Барадулін. «Бацьку» або **Васіль Зуёнак. «Прыйдзі аднойчы...».** Роздум паэтаў пра лёс бацькі, трагедыю дзяцей – ахвяр вайны. Спалучэнне ў вершах глыбокага лірызму з патрыятычным пафасам.

Анатоль Кудравец. «Цітаўкі». Маральна-этычныя праблемы ў творы. Узаемаадносіны дзяцей з вартаўніком Агеем. Прыёмы псіхалагічнай абмалёўкі характараў. Уплыў дзеда Агея на маральнае сталенне Кастуся. Сюжэт апавядання.

Генрых Далідовіч. «Страта». Рэальная аснова апавядання. Трагічны лёс Міці Бокуця. Чуласць, міласэрнасць, спачуванне Стасіка ў адносінах да хворага сябра. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы характараў хлопчыкаў, псіхалагізм у раскрыцці перажыванняў Стасіка. Адметнасці будовы апавядання. Аўтар-апавядальнік у творы.

Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік». Рэальная жыццёвая аснова твора. Гісторыя Дзіка. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні вобраза сабакі, узаемаадносіны Дзіка з Гаспадаром, іншымі персанажамі аповесці. Сродкі раскрыцця характараў герояў твора. Асоба аўтара-апавядальніка. Адметнасць будовы аповесці.

Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі». Выяўленне духоўнай шчодрасці чалавека ў клопатах аб прыродзе. Гісторыя Бурыка, яе значэнне ў раскрыцці ідэі апавядання. Паяднанасць жыцця людзей з жыццём прыроды. Пластычнасць вобразаў. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

Тэорыя літаратуры. Тэма, сюжэт мастацкага твора. Эпізод у творы. Літаратурны герой, сродкі яго паказу – перажыванні, учынкі, партрэт, мова, мастацкія дэталі, пейзаж, аўтарская характарыстыка (пачатковыя паняцці).

Мастацтва. Жывапіс: *У.Зінкевіч*. «Шчасце мірнага дня»; *С.Гарачаў*. «Дзяцінства»; *М.Селяшчук*. «А раптам гэта ўзнікне перад табой?»; *М.Савіцкі*. «Дзеці вайны», «Партызаны. Блакада» і інш.

VI. ПРЫГОДЫ І ПАДАРОЖЖЫ
(4 гадзіны)

Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Прыгодніцкі характар аповесці. Займальнасць сюжэта. Роля гумарыстычных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да байцоў і іх любімцаў: Мішкі, Жука, Барадатага. Кампазіцыя аповесці.

Паўтарэнне і абагульненне вывучанага за год
(1 гадзіна)

РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

М.Багдановіч. «Зімой».

Якуб Колас. «Дарэктар» (з паэмы «Новая зямля») – пачатак (апісанне восені).

Р.Барадулін. «Бацьку» або *В.Зуёнак*. «Прыйдзі аднойчы...».

М.Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (пачатак раздзела «Як Мішка трапіў на вайсковую службу» да слоў: «І Мішка стараўся»).

ПРЫКЛАДНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ*

В.Адамчык. «Сонечны зайчык», «Маці».

Х.К.Андэрсен. «Казкі».

Беларускія народныя казкі.

«Бяздоннае багацце»: легенды, паданні, сказы (уклад. А.І. Гурскі).
Я.Брыль. «Цюцік».
Э.Валасевіч. «Дняпроўскі чарадзей».
Браты Грым. «Казкі».
А.Гарун. «Датрымаў характар».
А.Грачанікаў. «Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара».
У.Дубоўка. «Як сінячок да сонца лётаў».
Д.Зальтэн. «Бэмбі».
М.Зарэмба. «Паддаўкі», «Арэхавы Спас».
К.Каганец. «Скрыпач і ваўкі».
У.Караткевіч. «Чортаў скарб», «Кацёл з каменьчыкамі».
Р.Кіплінг. «Маўглі».
Якуб Колас. «Што яны страцілі», «Стары лес».
А.Ліндгрэн. «Браты Львінае Сэрца».
М.Лынькоў. «Міколка-паравоз».
А.Масла. «Таямніцы закінутай хаты».
«Прыстань ваўкалакаў»: чарадзейныя казкі (уклад. А.І. Гурскі).
Э.Распэ. «Прыгоды барона Мюнхаўзена».
П.Сіняўскі. «Зачараваная гаспадарка».
А.Якімовіч. «Рыжык», «Залатая дзіда».

* Творы, прапанаваныя да пазакласнага чытання, даюцца на выбар.

АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне.

Беглае чытанне ўголас знаёмага тэксту. Выразнае чытанне мастацкіх твораў, прадугледжаных праграмай.

Складанне плана (у тым ліку цытатнага) апавядальнага твора ці ўрыўка з яго.

Вусны пераказ (сціслы, выбарачны, падрабязны) невялікага апавядальнага твора або ўрыўка з яго.

Назіранне за мовай і асаблівасцямі будовы мастацкага твора.

Вуснае слоўнае маляванне.

Мастацкае расказванне.

Каментаванне мастацкага тэксту.

Супастаўленне мастацкіх твораў.

Устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурнага твора з творамі жывапісу і музыкі.

Стварэнне ілюстрацый да літаратурнага твора і іх прэзентацыя.

Вуснае сачыненне з элементамі апісання і разважання па вывучаным творы: разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя.

Вуснае сачыненне-апавяданне на аснове асабістых назіранняў і ўражанняў аб падзеях і з'явах жыцця.

Складанне вусных замалёвак, уласных казак, загадак.

Вусны водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор, на твор выяўленчага мастацтва, кінафільм або тэлеперадачу.

Чытанне па асобах, інсцэніраванне і мізансцэніраванне эпізодаў з літаратурных твораў.

Выкананне творчых заданняў, абумоўленых жанравай прыродай мастацкага тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны ведаць:

аўтараў, назвы і змест вывучаных твораў;

адметныя жанравыя ўласцівасці народных і літаратурных легенд, казак, загадак, прыказак, прыкмет, павер'яў;

выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;

творы для завучвання на памяць.

Вучні павінны ўмець:

выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурныя творы, выяўляючы аўтарскую пазіцыю і свае адносіны да адлюстраванага;

узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;

самастойна дзяліць твор на часткі;

складаць план невялікага апавядальнага твора ці ўрыўка з яго;

сцісла, выбарачна або падрабязна вусна пераказваць невялікі апавядальны твор ці ўрывак з яго;

вылучаць эпізоды ці дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб; знаходзіць сувязь паміж падзеямі ў вывучаным творы;

знаходзіць выяўленчыя сродкі мовы і з дапамогай настаўніка вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, раскрыцці тэмы твора;

характарызаваць героя мастацкага твора па яго ўчынках, паводзінах, перажываннях;

рыхтаваць вусныя сачыненні з элементамі апісання і разважання (разгорнуты адказ, адказ на пытанне і паведамленне пра героя), апісваць свае ўражанні і назіранні аб падзеях і з'явах жыцця;

даваць вусны водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

карыстацца даведачным апаратам падручніка.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Русский язык» для V класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания

РУССКИЙ ЯЗЫК

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Цель обучения русскому языку – сформировать у учащихся систему знаний о языке и речи; научить их пользоваться языком во всех видах речевой деятельности (чтение, слушание, письмо, говорение), в избранных сферах применения языка; развивать интеллектуальную, духовно-нравственную, коммуникативную, гражданскую культуру учащихся.

Задачи обучения русскому языку:

языковое и речевое развитие учащихся на основе усвоения знаний о системе русского языка на всех его уровнях (фонетика, лексика, состав слова и словообразование, морфология, синтаксис), правил функционирования языковых средств в речи, норм русского литературного языка (произносительных, речевых, морфологических, синтаксических, орфографических и пунктуационных); обогащение словарного запаса и грамматического строя речи учащихся; формирование правописных умений и навыков, умений пользоваться языком в различных видах речевой деятельности (языковая и речевая компетенция);

формирование коммуникативных умений на основе овладения учащимися речеведческими понятиями (культура устной и письменной речи, текст, типы, стили,

жанры речи, правила речевого общения), способами выражения мысли в устной и письменной форме, умений создавать самостоятельные связные высказывания различных стилей, типов и жанров речи (коммуникативная компетенция);

формирование речевой культуры учащихся на основе освоения языка как системы сохранения и передачи культурных ценностей, как средства постижения русской, национальной культуры в контексте общемировой; развитие способности пользоваться культурологическими сведениями для обеспечения полноценной коммуникации (лингвокультурологическая компетенция);

развитие средствами языка интеллектуальной, духовно-нравственной, коммуникативной, гражданской культуры учащихся (социокультурная компетенция).

Курс русского языка в V классе направлен прежде всего на применение полученных знаний и умений в речевой практике.

Оптимальными и эффективными подходами, определяющими теоретическую и методическую базу обучения языку и речи, являются системно-функциональный, коммуникативно-деятельностный, социокультурный и лингвокультурологический подходы.

Системно-функциональный подход предполагает усвоение системы русского языка, единиц разного уровня с точки зрения значения, строения и назначения в речи; отбор и организацию языкового материала для создания различных видов речевой деятельности, *формирования языковой и речевой компетенции учащихся*.

Коммуникативно-деятельностный подход определяет такую организацию и направленность занятий по русскому языку, при которой цель обучения связана с обеспечением максимального приближения учебного процесса к реальному процессу общения. Объектом обучения с позиции этого подхода является речевая деятельность во всех ее видах. В основе коммуникативно-деятельностного подхода заложена не столько реальность самих ситуаций, сколько реальность деятельности учащихся в предлагаемых ситуациях, что способствует *формированию коммуникативной компетенции*.

Социокультурный подход к обучению русскому языку также относится к деятельностному типу, реализация которого предполагает не только ознакомление с материальными и духовными ценностями, способами выражения которых являются язык, литература, искусство, история и др., но и овладение умениями пользоваться полученными знаниями о наследии страны, обычаях, правилах, нормах, ритуалах, социальных стереотипах и т.д. в процессе общения.

Лингвокультурологический подход к обучению русскому языку позволяет сориентировать все уровни владения языком на *формирование лингвокультурологической компетенции*, воспитания речевой культуры учащихся на основе освоения языка как средства постижения русской, национальной культуры в контексте общемировой.

Лингвокультурологический подход к обучению языку относится также к деятельностному типу. Его реализация предполагает овладение умениями пользоваться полученными знаниями в процессе общения.

Системно-функциональный подход к обучению учащихся предопределил выбор *линейно-опережающего* и *концентрического принципов построения содержания* обучения русскому языку в V–IX классах как наиболее соответствующих современным требованиям к организации процесса обучения, развитию и воспитанию языковой и речевой личности. Линейность структуры содержания обучения обеспечивает последовательное изучение многоуровневой системы языка, опережение – параллельное формирование языковых, речевых и коммуникативных умений.

Опережение осуществляется благодаря изучению в V классе пропедевтического раздела «Синтаксис», разделов «Лексика», в VI–VII классах – разделов «Состав слова. Словообразование», «Морфология» на синтаксической основе.

Речевые разделы «Культура речи», «Текст», «Стили речи», «Жанры речи» изучаются концентрически с V по IX классы, что позволяет учитывать возрастные возможности учащихся, обеспечивать сравнительно раннее ознакомление с необходимым теоретическим материалом для формирования речевых умений, а также прочность

усвоения в результате возвращения к теме в каждом последующем классе на новом уровне и в расширенном объеме.

Линейно-опережающий и концентрический принципы дают возможность осознавать языковые и речевые явления во взаимосвязи и одновременно формировать и совершенствовать языковую, речевую и коммуникативную компетенцию учащихся.

Учебный материал для изучения в V–IX классах группируется по блокам с учетом основных содержательных линий и представлен как перечисление учебных разделов, составляющих основу данного учебного предмета и предъявляемых учащемуся как объект усвоения:

1. Язык и речь. Культура речи. Стили речи. Жанры речи. Текст.
2. Фонетика. Орфоэпия. Графика.
3. Орфография.
4. Лексика и фразеология.
5. Грамматика.

5.1. Состав слова и словообразование.

5.2. Морфология и правописание частей речи.

5.3. Синтаксис и пунктуация.

Принципами отбора содержания обучения являются:

учет функционально-семантических особенностей фактов языковой системы;

минимизация теоретических сведений на основе их значимости для речевой деятельности;

учет общих и специфических особенностей белорусского и русского языков;

опора на этнокультуру (при отборе дидактического материала);

опора на текст как на предмет обучения и продукт речевой деятельности.

Языковой курс каждого класса открывается разделом «Текст», содержание которого вооружает учащихся необходимыми знаниями по теории текстообразования и развивает умение свободно создавать тексты с учетом речевой ситуации.

В содержании программы для V класса выделена специально рубрика «Виды речевой деятельности». **Обучающие** виды работ по развитию связной письменной речи учащихся соотносятся с основными разделами курса русского языка. Проведение учебных занятий по развитию устной и письменной речи учащихся является обязательным.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(105 ч)

Повторение изученного в начальных классах (4 ч)
Культура устной и письменной речи (7 ч)

Нормы литературного языка: произносительная, словообразовательная, морфологическая, синтаксическая, орфографическая, пунктуационная. Качества речи: правильность, точность, логичность, богатство, чистота, уместность, выразительность (ознакомление).

Диалог. Монолог.

Виды речевой деятельности: подробное изложение.

Учебно-языковые умения и навыки: осмысление понятий «язык» и «речь»; обнаружение нарушений языковой нормы в речи; анализ качеств речи; овладение элементарными умениями построения диалога и монолога.

Коммуникативные умения и навыки: осознанный выбор темпа и громкости устной речи; создание связных высказываний с учетом требований точности, богатства, чистоты, уместности, логичности и выразительности речи; корректировка речи; умение вести диалоги в ситуациях официального и неофициального общения.

Речевая ситуация. Стили речи (3 ч)

Понятие о речевой ситуации. Признаки речевой ситуации. Стили речи: художественный, научный, публицистический, официально-деловой, разговорный (ознакомление). Речевая норма.

Учебно-языковые умения и навыки: осмысление признаков речевой ситуации; характеристика речевой ситуации; осмысление признаков функциональных стилей речи.

Коммуникативные умения и навыки: создание устных и письменных связных высказываний, различных по стилю.

Жанры речи (7 ч)

Загадка. Рассказ. Сказка. Содержание, композиция, языковые средства.

Виды речевой деятельности: сочинение-повествование о случае из жизни.

Учебно-языковые умения и навыки: выявление особенностей композиции и употребления языковых средств загадки, рассказа и сказки.

Коммуникативные умения и навыки: создание в устной или письменной форме загадки, рассказа и сказки.

СИНТАКСИС И ПУНКТУАЦИЯ (17 ч)

Словосочетание (3 ч)

Строение и грамматическое значение словосочетаний: главное и зависимое слово в словосочетании; смысловой вопрос к зависимому слову.

Орфографическая норма. Правописание падежных окончаний имен существительных и прилагательных.

Грамматическая норма. Согласование имен прилагательных с именами существительными. Правильный выбор падежной формы имени существительного при управлении. Правильное употребление глаголов *одеть*, *надеть*.

Произносительная норма. Ударение в формах винительного падежа имен существительных женского рода (*вуду*, *ругку*, *нугу*, *гулову*, *стурону*, *стйну*, *дуску*).

Учебно-языковые умения и навыки: обнаружение главного и зависимого слова в словосочетании, анализ главного слова и формы зависимого слова, постановка смыслового вопроса к зависимому слову; выделение словосочетаний из предложений.

Коммуникативные умения и навыки: распространение имени существительного формами изученных частей речи для обозначения признака предмета; распространение глагола для обозначения объекта и признака действия; использование синонимичных словосочетаний в целях точности и выразительности речи.

Предложение (14 ч)

Виды предложений по цели высказывания и интонации.

Строение простого предложения. Главные члены предложения: подлежащее и сказуемое (грамматическая основа предложения).

Нераспространенные и распространенные предложения. Второстепенные члены предложения: дополнение, определение, обстоятельство (ознакомление).

Однородные члены предложения с обобщающим словом и без него. Обращение. Знаки препинания в простом предложении с однородными членами и обращением.

Строение сложного предложения: сложные предложения (с двумя главными членами в каждом предложении) с союзами и без союзов.

Предложения с прямой речью. Знаки препинания при прямой речи перед словами автора и после них.

Грамматическая норма. Согласование сказуемого, выраженного глаголом прошедшего времени, с подлежащим-существительным.

Орфографическая норма. Правописание безударных гласных в личных окончаниях глаголов. Правописание ***-тся*** и ***-ться*** в глаголах.

Пунктуационная норма. Запятая между однородными членами при отсутствии союза; запятая между однородными членами, соединенными союзами; двоеточие после обобщающего слова. Запятая между частями сложного предложения перед ***и***, ***а***, ***но***, ***что***, ***чтобы***, ***когда***, ***как***, ***потому что***, ***если***, ***который***. Выделение кавычками прямой речи; тире перед словами автора и двоеточие после них.

Виды речевой деятельности: сочинение-описание природы по картине.

Учебно-языковые умения и навыки: обнаружение главных членов предложения; постановка смыслового вопроса к главным членам предложения; различение второстепенных членов предложения; определение синтаксической роли однородных членов предложения; различение подлежащего и обращения; разграничение слов автора и прямой речи; составление предложений с однородными членами, обращением, прямой речью, сложных предложений.

Коммуникативные умения и навыки: использование в устной и письменной речи разнообразных синтаксических конструкций: простых и сложных предложений, предложений с прямой речью; употребление логически сопоставимых слов в однородном ряду; использование обращения в диалоге и монологе для называния адресата речи, выражения оценки, установления контакта; использование речевых форм обращения в различных ситуациях; использование обращения-олицетворения как средства художественной выразительности; интонирования предложений с однородными членами, обращением, прямой речью, сложных предложений.

ТЕКСТ (8 ч)
(*ознакомление*)

Понятие о тексте. Тема текста, основная мысль. Признаки текста: тематическое единство, последовательность, связность (виды связи, средства связи), завершенность (законченность).

Типы речи (описание, повествование, рассуждение) и их композиционные схемы.

Виды речевой деятельности: подробное изложение повествовательного характера; сочинение-описание по картине.

Учебно-языковые умения и навыки: осмысление понятия «текст»; выявление признаков текста; определение типов текста; выявление композиционных особенностей типов речи.

Коммуникативные умения и навыки: определение темы и основной мысли текста, умение озаглавить текст, выделить его части и озаглавить их; определение средств связи между предложениями и абзацами в тексте; умение определить тип речи и создать композиционную схему повествования, описания, рассуждения; определение стиля текста; точное, уместное использование выразительных средств в устных и письменных изложениях текстов художественного стиля разных типов речи (описание, повествование, рассуждение), в устных и письменных сочинениях на темы, связанные с жизненным опытом учащихся, в сочинениях по жанровой картине, иллюстрациям, в жанрах художественного стиля (сказка, загадка, рассказ о событии).

ФОНЕТИКА (4 ч)

Гласные и согласные звуки (углубленное повторение). Гласные звуки в ударном и безударном положении. Парные и непарные звонкие и глухие согласные. Оглушение звонких и озвончение глухих согласных.

Парные и непарные твердые и мягкие согласные. Обозначение на письме мягкости согласных. Двойная роль букв ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я.***

Слог. Перенос слов.

Ударение.

Произносительная норма. Произношение безударных гласных после твердых и мягких согласных; произношение мягких согласных; правильная постановка ударения.

Орфографическая норма. Правила переноса слов.

Учебно-языковые умения и навыки: различение звука и буквы; выделение ударных и безударных слогов; различение звонких и глухих, твердых и мягких согласных; деление слова на слоги; умение производить фонетический разбор.

ОРФОГРАФИЯ (34 ч)

Проверяемые безударные гласные в корне слова. Правописание безударных гласных в падежных окончаниях имен существительных 1, 2, 3-го склонения. Правописание падежных окончаний имен прилагательных (дано в теме «Словосочетание»). Правописание безударных гласных в личных окончаниях глаголов (дано в теме «Предложение»).

Правописание безударных гласных в приставках. Правописание ***о, ё*** после шипящих в корне слова. Правописание ***о, е*** после шипящих и ***ц*** в окончаниях и суффиксах имен существительных и прилагательных.

Правописание проверяемых (глухих и звонких), непроизносимых согласных в корне слова. Правописание согласных в приставках. Правописание букв ***з, с*** на конце приставок. Правописание ***ы, и*** после приставок на согласный.

Непроверяемые безударные гласные и согласные корня. Правописание корней с чередующимися гласными ***о–а*** (-гар-/гор-, -зар-/-зор-, -клан-/-клон-, -лаг-/-лож-, -рос-/-раст- (-ращ-), -кас-/-кос-). Правописание корней с чередующимися гласными ***е–и*** (-бер-/-бир-, -пер-/-пир-, -мер-/-мир-, -дер-/-дир-, -тер-/-тир-, -стел-/-стил-, -блест-/-блист-).

Правописание ***и, ы*** после ***ц***. Правописание ***ь*** после шипящих. Правописание ***-тся*** и ***-ться*** в глаголах (дано в теме «Предложение»). Правописание разделительных ***ь*** и ***ъ*** (повторение).

Орфографическая норма. Правописание проверяемых безударных гласных в корне слова, приставке, окончании; проверяемых согласных в приставке, корне слова; непроизносимых согласных в корне слова; букв ***о, ё (е)*** после шипящих в корне слова, суффиксе, окончании; букв ***ы, и*** после приставок, оканчивающихся на согласный; букв ***з, с*** на конце приставок; непроверяемых гласных и согласных в корне слова; двойных согласных; буквы ***ы*** после ***ц*** в суффиксе ***-ын-*** и в окончаниях ***-ы, -ый***; буквы ***и*** после ***ц*** в корне слова и в словах на ***-ция***; мягкого знака после шипящих на конце существительных, в глаголах 2-го лица единственного числа; в неопределенной форме глагола; букв ***о–а*** в корнях: -гар-/-гор-, -зар-/-зор-, -клан-/-клон-, -лаг-/ -лож-, -рос-/-раст- (-ращ-), -кас-/-кос-; букв ***е–и*** в корнях -бер-/-бир-, -пер-/ -пир-, -мер-/-мир-, -дер-/-дир-, -тер-/-тир-, -стел-/-стил-, -блест-/-блист-.

Виды речевой деятельности: сочинение-описание животного в художественном стиле; сочинение-описание по картине.

Учебно-языковые умения и навыки: умение видеть орфограмму и ее опознавательные признаки; определение морфемы, в которой находится орфограмма; усвоение способов проверки написания: подбор однокоренных слов, изменение формы слова, сопоставление слов, имеющих одинаковые морфемы; умение пользоваться орфографическим словарем.

ЛЕКСИКА (11 ч)

Слово, его лексическое значение. Прямое и переносное значение слова. Толковые словари.

Многозначные и однозначные слова. Синонимы. Антонимы.

Исконно русские и заимствованные слова.

Общеупотребительные слова. Профессиональные слова и термины.

Устаревшие слова. Неологизмы.

Фразеологические обороты, их отличие от свободных словосочетаний.

Речевая норма. Точное употребление слова: многозначного, заимствованного, профессионализма, термина. Целесообразный, мотивированный выбор лексических средств, обеспечивающих правильность, точность, логичность, богатство, чистоту, уместность и выразительность речи.

Учебно-языковые умения и навыки: осмысленное восприятие значения слова в тексте; разграничение значений многозначного слова; разграничение оттенков значений синонимов; обнаружение антонимических отношений между словами; выявление роли устаревших слов в художественном тексте; умение пользоваться словарями (толковым, иностранных слов, синонимов, антонимов, фразеологическим).

Коммуникативные умения и навыки: точное употребление слов в соответствии с их значением, темой и стилем текста; составление тематических групп слов; создание образности, выразительности текста средствами лексики; использование синонимов как средства выразительности и точности речи, как средства связи предложений в тексте; правильное использование фразеологизмов в речи.

Повторение изученного в V классе (3 ч)

Контрольные письменные работы – 5 (7 ч):
диктанты – 3 (3 ч), подробные изложения – 2 (4 ч).

Для диагностики теоретических сведений, сформированности учебно-языковых и коммуникативных умений и навыков рекомендуются следующие *формы контроля*:

диктант (словарно-орфографический, словарный, предупредительный, комментированный, объяснительный, комбинированный, «Проверяю себя», самодиктант, графический, творческий);

осложненное списывание;

изложение (подробное изложение повествовательного характера);

сочинение (сочинение-повествование о случае из жизни, сочинение-описание природы по картине, сочинение-описание животного в художественном стиле);

устное сообщение учащегося;

различные виды разборов в пределах изученного материала;

тестовая работа.

Требования к практическому владению видами речевой деятельности – длительность звучания текста, количество реплик на каждого собеседника в диалогической речи, объем высказывания в монологической речи, объем текста для чтения, объем текста для письменной речи – задают основные параметры для всех видов речевой деятельности. Данные параметры, а также объем продуктивного и рецептивного лексического минимума обозначаются следующим образом: первая цифра – требования для школ, вторая – для гимназий. Например: длительность звучания текста: 1–1,5 минуты; продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц; рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц; общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц; общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Грамматический материал, подлежащий изучению, одинаков для всех видов учреждений общего среднего образования. Требования к владению грамматическим материалом отличаются объемом его продуктивного усвоения. Грамматические явления для рецептивного усвоения, отмеченные звездочкой (*), предназначены для продуктивного усвоения в гимназиях.

Более высокие требования к владению языковым и речевым материалом в гимназиях обеспечат более высокий уровень формирования у учащихся языковых навыков и речевых умений, что будет выражаться в их способности качественно решать учебные коммуникативные задачи.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА

105 (175) ч

Предметно-тематическое содержание общения

Сфера общения	Предметно-тематическое содержание	Коммуникативные задачи
		К концу года учащийся должен *уметь*:
Социально-бытовая	Здоровый образ жизни	Рассказать и расспросить о завтраке, обеде и ужине в семье; рассказать и расспросить о здоровом питании; рассказать и расспросить об основных недомоганиях; *дать совет о здоровом образе жизни (гигиена, питание, зарядка)*
	Город и деревня	Расспросить и объяснить, как пройти куда-либо; запросить и дать информацию о месте проживания (адрес, телефон); назвать правила безопасного поведения на улицах города, деревни; описать родной город/деревню; *рассказать и расспросить о жизни в городе/сельской местности*
Социально-культурная	Каникулы	Рассказать и расспросить о занятиях на каникулах; рассказать о летнем отдыхе; *рассказать о самом ярком впечатлении во время каникул*

	Праздники	Рассказать и расспросить об основных праздниках Республики Беларусь и страны изучаемого языка; поздравить с праздником и ответить на поздравление; назвать традиционные праздничные блюда в своей стране и стране изучаемого языка; *сравнить празднование Нового года/Рождества в своей стране и стране изучаемого языка*
	Телепередачи	Назвать любимые телепередачи; расспросить о любимых телепередачах; высказать мнение о телепередаче; *порекомендовать посмотреть телепередачу и аргументировать свое мнение*
	Путешествия	Рассказать и расспросить о путешествии (место, время, транспорт, впечатления); принять либо отклонить предложение о путешествии; *рассказать о путешествии, запомнившемся по книге/фильму*
Социально-познавательная	Страны и континенты	Назвать континенты и описать их природные особенности; назвать страны, в которых говорят на изучаемом иностранном языке; *расспросить и рассказать об интересных национальных праздниках стран мира*

ТРЕБОВАНИЯ К ПРАКТИЧЕСКОМУ ВЛАДЕНИЮ ВИДАМИ РЕЧЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Восприятие и понимание речи на слух

Учащиеся должны понимать на слух указания учителя, связанные с ведением урока; иноязычные тексты монологического и диалогического характера, построенные на изученном языковом материале, в предъявлении учителя и в звукозаписи, в темпе, приближенном к естественному, с визуальной или вербальной опорой.

Виды текстов: сказка, рассказ, рифмовка, детская песня.

Длительность звучания текста: 1–1,5 минуты.

Говорение

Диалогическая речь

Учащиеся должны уметь:

запросить и сообщить информацию, определяемую предметно-тематическим содержанием общения;

принять либо отклонить предложения.

Виды диалога: диалог-расспрос, диалог-поздравление, диалог-побуждение к действию.

Количество реплик на каждого собеседника: 4–5.

Монологическая речь

Учащиеся должны уметь:

сообщить информацию;

описать предметы и явления;

кратко пересказать содержание прослушанного/прочитанного текста с использованием визуальных опор.

Виды монологического высказывания: сообщение, повествование, описание.

Объем высказывания: не менее 6–8 фраз.

Чтение

Учащиеся должны уметь читать про себя и полностью понимать тексты, содержащие 1–2 % незнакомых слов, не влияющих на понимание.

Виды текстов: сказка, рассказ, рифмовка, песня.

Объем текста: 1300–2000 печатных знаков с пробелами.

Письмо и письменная речь

Учащиеся должны уметь продуцировать несложные виды текстов в соответствии с нормами, принятыми в стране изучаемого языка:

подписывать поздравительную открытку, приглашение;

писать личное письмо в пределах изученной тематики.

Объем текста: не менее 30–40 слов.

ЯЗЫКОВОЙ МАТЕРИАЛ

АНГЛИЙСКИЙ ЯЗЫК

Фонетика

Ритм английской речи. Интонация перечисления. Интонация повелительных и восклицательных предложений. Интонация формул речевого этикета.

Лексика

Продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц.

Рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц.

Общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц.

Общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Словообразование: суффиксы имен прилагательных *-(i)an*, наречий *-ly*, глаголов *-ate.*

Указатели времени: this (week), *last (year)*, *next (summer)*.

Грамматика

Грамматический материал для продуктивного усвоения

М о р ф о л о г и я

Имя существительное: особые случаи образования множественного числа *(man – men*, *woman – women*, *child – children*, *tooth – teeth*, *foot – feet*, *goose – geese*, *sheep – sheep*, *mouse – mice).* Исчисляемые и неисчисляемые существительные.

Артикль: a/an, *the* (основные значения), значимое отсутствие артикля. Артикль с географическими названиями (улицы, города, страны, континенты).

Имя прилагательное: особые случаи образования степеней сравнения имен прилагательных *(good*, *bad).*

Местоимение: неопределенные местоимения *some*, *any*, *no*, *much*, *many*. Объектный падеж личных местоимений.

Глагол: утвердительная, отрицательная и вопросительная формы глаголов в *Past Simple*, *Future Simple*.

М о д а л ь н ы й г л а г о л: should/shouldn't для выражения совета, рекомендации; *must/mustn't* для выражения долженствования и запрещения.

Наречие: yesterday, *ago*, *next*, *tomorrow*, *today*, *always*, *often*, *sometimes*, *rarely*, *never*, *well*, *fast*.

Предлог: предлоги направления движения *to*, *along*, *past*, *over*; предлоги места *at (home)*, *behind*, *in front of*, *between*, *opposite*, *next to*; предлоги времени *in (November)*, *to (quarter to two)*, *past (half past two)*, *at (Easter)*, *on (New Year's Day); by (plane)*.

Союз: because.

С и н т а к с и с

Порядок слов в предложении. Сложносочиненное предложение с союзами *and*, *but*.

НЕМЕЦКИЙ ЯЗЫК

Фонетика

Ударение в сложных прилагательных. Логическое ударение во фразе. Интонация побудительных предложений. Интонация предложений с составным глагольным сказуемым, выраженным глаголами во временной форме *Perfekt Aktiv* (рамочная конструкция).

Лексика

Продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц.

Рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц.

Общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц.

Общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Словообразование: суффиксы имен существительных *-er*, *-in* для обозначения национальностей, жителей городов, населенных пунктов; словосложение: основа или корень глагола + имя существительное.

Грамматика

Грамматический материал для продуктивного усвоения

М о р ф о л о г и я

Имя существительное: склонение имен существительных в дательном падеже множественного числа. Исчисляемые и неисчисляемые имена существительные.

Артикль: артикль перед географическими названиями (континенты, страны, города, улицы). Определенный артикль перед именем собственным, если перед ним стоит определение. Неопределенный артикль перед именем существительным после глаголов *suchen*, *sich wünschen* и безличного оборота *es gibt*.

Местоимение: возвратное местоимение *sich*. Вопросительное местоимение *welcher*/*welches*/*welche*.

Глагол: возвратные глаголы. Глагол *sein* в простом прошедшем времени *Präteritum Aktiv*. Составное глагольное сказуемое, выраженное формой прошедшего времени *Perfekt Aktiv*. Повелительное наклонение.

Предлог: предлоги *durch*, *für*, *um*, *bis*, *entlang*, требующие винительного падежа. Предлоги *zu*, *mit*, требующие дательного падежа.

С и н т а к с и с

Повествовательное предложение (простое и распространенное). Порядок слов в распространенном предложении с дополнением в винительном и дательном падежах; с составным глагольным сказуемым, выраженным глаголами во временной форме *Perfekt Aktiv* (рамочная конструкция); с простым глагольным сказуемым, выраженным возвратными глаголами.

Грамматический материал для рецептивного усвоения

М о р ф о л о г и я

Артикль: неопределенный артикль, если перед именем собственным стоит определение.

Имя прилагательное: склонение имен прилагательных после неопределенного артикля, притяжательных местоимений и местоимения *kein/keine.*

С и н т а к с и с

Сложносочиненные предложения с союзом *denn*. Сложноподчиненные предложения с союзом *weil*.

ФРАНЦУЗСКИЙ ЯЗЫК

Фонетика

Различение на слух и четкое произношение всех звуков французского языка. Логическое ударение. Интонационная модель повествовательного и вопросительного предложений (с простой и сложной инверсией).

Лексика

Продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц.

Рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц.

Общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц.

Общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Словообразование: суффиксы имен существительных *-ien*, *-ienne; -ais*, *-aise; -ain*, *-aine; -ois*, *-oise*; имен прилагательных *-ais*, *-aise*; глагольная приставка *re-*.

Грамматика

Грамматический материал для продуктивного усвоения

М о р ф о л о г и я

Имя существительное: мужской и женский род имен существительных, обозначающих национальность.

Артикль: употребление неопределенного и определенного артиклей (повторение); частичный артикль *du*, *de l'*, *de la*; артикль перед географическими названиями (страны, континенты); отсутствие артикля в названиях городов; отсутствие артикля при отрицании. Употребление предлога *de* после слов, обозначающих количество. Слитный артикль в выражении *avoir mal à ...*

Имя прилагательное: степени сравнения качественных имен прилагательных.

Местоимение: неопределенно-личное местоимение *on*; вопросительное местоимение *qui*.

Имя числительное: количественные числительные до 1000; порядковые числительные до 100.

Глагол: le présent глаголов I, II, III группы; прошедшее сложное время *le passé composé* с глаголом ê*tre* (кроме возвратных глаголов)*;* прошедшее незаконченное время *l'imparfait.* Повелительное наклонение (кроме исключений ê*tre*, *avoir*, *savoir*).

Наречие: наречия *toujours*, *jamais*, *souvent*, *parfois; d'abord*, *ensuite*, *puis*, *enfin.* Вопросительные наречия *où*, *d'où*, *quand*, *pourquoi*, *comment*, *combien.*

Предлог: предлоги места и направления движения; предлоги *en/à* для обозначения способа передвижения.

С и н т а к с и с

Порядок слов в вопросительном предложении с простой и сложной инверсией (общий вопрос; вопрос к одушевленному подлежащему; вопрос к обстоятельству).

Грамматический материал для рецептивного усвоения

Будущее простое время *le futur simple* глаголов I и II группы. Ближайшее будущее время *le futur proche* и ближайшее прошедшее время *le passé récent.*

ИСПАНСКИЙ ЯЗЫК

Фонетика

Интонация повелительных и восклицательных предложений.

Л е к с и к а

Продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц.

Рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц.

Общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц.

Общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Словообразование: приставки *re-*, *in-*(*im-*), *des-*.

Грамматика

М о р ф о л о г и я

Глагол: структуры со знаменательными глаголами в *Presente de Indicativo*, *Pretérito Perfecto*, *Pretérito Imperfecto*, *Pretérito Indefinido*, *Modo Imperativo* (утвердительная форма на *tú*, *vosotros*).

Наречие: наречия *ya*, *todavía*, *jamás*, *nunca*, *siempre*, *a veces*.

С и н т а к с и с

Восклицательные и побудительные предложения.

КИТАЙСКИЙ ЯЗЫК

ТРЕБОВАНИЯ К ПРАКТИЧЕСКОМУ ВЛАДЕНИЮ ВИДАМИ РЕЧЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Восприятие и понимание речи на слух

Учащиеся должны понимать на слух указания учителя, связанные с ведением урока; иноязычные тексты монологического и диалогического характера, построенные на изученном языковом материале, в предъявлении учителя и в звукозаписи, в темпе, приближенном к естественному, с визуальной или вербальной опорой.

Виды текстов: рассказ, рифмовка, детская песня, стихотворение, скороговорка.

Длительность звучания текста: 1 минута.

Говорение

Диалогическая речь

Учащиеся должны уметь запросить и сообщить информацию, определяемую предметно-тематическим содержанием общения.

Виды диалога: диалог-расспрос, диалог-поздравление, диалог-побуждение к действию.

Количество реплик на каждого собеседника: 4–5.

Монологическая речь

Учащиеся должны уметь:

сообщать информацию;

описывать предметы и явления;

кратко пересказывать содержание прослушанного/прочитанного текста с использованием визуальной опоры.

Виды монологического высказывания: сообщение, повествование, описание.

Объем высказывания: 6–8 фраз.

Чтение

Учащиеся должны уметь читать про себя тексты, написанные с помощью иероглифов, понимать основное содержание и выделять отдельные детали прочитанного.

Объем текста: 0,3 страницы.

Учащиеся должны уметь читать иероглифы (100–200) и простые предложения, написанные иероглифами.

Виды текстов: рассказ, скороговорка, рифмовка, детская песня, комиксы, стихотворение, песня, школьное расписание.

Письмо и письменная речь

Учащиеся должны уметь продуцировать несложные виды текстов, написанные с помощью транскрипционных знаков, в соответствии с нормами, принятыми в стране изучаемого языка:

подписывать поздравительную открытку, приглашение;

писать личное письмо в пределах изученной тематики.

Объем текста: 30–40 слов.

Учащиеся должны уметь писать иероглифы (80–160) и простые предложения, написанные иероглифами.

ЯЗЫКОВОЙ МАТЕРИАЛ

Фонетика

Произнесение следующих подряд слогов третьего тона. Изменение тона числительного. Интонация перечисления. Интонация повелительных и восклицательных предложений. Интонация формул речевого этикета.

Лексика

Продуктивный минимум: 210–250 лексических единиц.

Рецептивный минимум: 120–180 лексических единиц.

Общий объем продуктивной лексики: 610–650 лексических единиц.

Общий объем рецептивной лексики: 240–300 лексических единиц.

Грамматика

Грамматический материал для продуктивного усвоения

М о р ф о л о г и я

Счетное слово: 个、把、节、张、件、条、双.

Имя числительное: количественные числительные 50–100; особенности употребления числительных 两 и 二.

Имя прилагательное: 多、少; сравнительная степень имен прилагательных 快一点儿.

Местоимение: указательные местоимения 这 и 那 в сочетании со счетными словами.

Глагол: показатель настоящего времени 在.

Наречие: 太、很、不、真、很多、很少、不多、不少、附近、只.

Послелог 外边.

Предлоги: 在, 给, 除了…以外.

С и н т а к с и с

Предложения, обозначающие расположение предметов в пространстве (在)…上有/是…, …在…上.

Предложения наличия с глаголом 有.

Выражение последовательности действий с помощью наречий 先…然后…

Глагольное дополнение состояния (…得…) (1).

Специальные вопросы с вопросительными словами 为什么? 怎么?

Альтернативный вопрос с союзом 还是.

Вопросительные предложения с уточняющими выражениями: ...好吗?...怎么样?

Побудительные предложения с частицей …吧! или 让…吧!

Учащиеся д о л ж н ы в л а д е т ь **социокультурными знаниями и умениями**:

знать названия континентов и основных стран изучаемого языка;

знать отдельные произведения детского фольклора, поэзии и др.;

знать популярные праздники Республики Беларусь и страны изучаемого языка;

уметь вежливо обратиться за помощью к кому-либо в стране изучаемого языка (расспросить, как пройти куда-либо);

уметь описать зарубежному сверстнику свой родной город/деревню.

Учащиеся должны владеть **компенсаторными умениями** во всех видах речевой деятельности:

восприятие и понимание речи на слух:

прогнозировать содержание аудиотекста по заголовку;

опираться на ситуацию, представленную учителем перед прослушиванием аудиотекста;

использовать языковую догадку (по схожести со словами родного языка);

опираться на средства зрительной наглядности (рисунки, фотографии, таблицы);

чтение:

прогнозировать содержание текста по заголовку;

опираться на средства зрительной наглядности (рисунки, фотографии, таблицы);

использовать языковую догадку (по схожести со словами родного языка);

использовать двуязычные словари;

говорение:

обращаться за помощью к собеседнику, используя переспрос;

уточнять содержание высказывания с помощью мимики и жестов;

письмо и письменная речь:

использовать текст-образец в качестве опоры.

Учащиеся должны владеть **учебно-познавательными умениями**:

составлять план прочитанного/прослушанного текста;

выполнять самостоятельные задания репродуктивного характера с использованием печатных материалов (раздаточный материал, наглядность);

использовать двуязычные словари.

Учащиеся должны использовать приобретенный **языковой**, **речевой** и **социокультурный опыт** для:

преодоления психологических барьеров в процессе устного общения на иностранном языке;

ознакомления с детским зарубежным фольклором;

развития доброжелательного отношения к представителям других стран.

ПРОГРАММНО-МЕТОДИЧЕСКИЕ МАТЕРИАЛЫ

Концепция обучения иностранным языкам в системе непрерывного образования Республики Беларусь // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. – 2002. – № 3. – С. 21–28.

Концепция учебного предмета «Иностранный язык» // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. – 2007. – № 4. – С. 3–11.

Учебная программа для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения «Иностранные языки: английский, немецкий, французский, испанский, китайский» III–XI классы. – Минск: Нац. ин-т образования, 2012.

Биболетова, М.З. Авторская программа к курсу для 2–9 классов общеобразовательных учреждений. Основная школа (5–9) классы / М.З. Биболетова, Н.Н. Трубанаева // Английский язык в школе, № 2, 2003. – Ч. 2. – С. 31–44.

Бим, И.Л. Концепция обучения второму иностранному языку (немецкому на базе английского): учеб. пособие / И.Л. Бим. – Обнинск: Титул, 2001. – 48 с.

Бим, И.Л. Немецкий язык. Базовый курс. Концепция, программа / И.Л. Бим. – М.: Новая школа, 1995. – 128 с.

Единый государственный экзамен 2002: Контрол. измерит. материалы: Английский язык / Е.Ф. Прохорова [и др.]; М-во образования РФ. – М.: Просвещение, 2003. – 93 с.

Образовательный стандарт по английскому языку / под ред. Е.Ф. Прохоровой; Комитет по образованию Администрации Санкт-Петербурга, The British Council St. Petersburg, Санкт-Петербургский государственный университет педагогического мастерства. – СПб., 2001. – Ч. I. – 47 с.

Программно-методические материалы. Иностранные языки для школ и классов с углубленным изучением английского, немецкого, французского, испанского языков. Начальная школа. – 3-е изд., стереотип. – М.: Дрофа, 2000. – 128 с.

Программно-методические материалы. Иностранные языки для общеобразовательных учебных заведений. Начальная школа. – 4-е изд., стереотип. – М.: Дрофа, 2001. – 160 с.

Сафонова, В.В. Английский язык. 5–9 классы школ с углубленным изучением иностранных языков. Программы для общеобразовательных учреждений / В.В. Сафонова, Е.Н. Соловова. – М.: Просвещение, 1997. – 62 с.

Сафонова, В.В. Английский язык. 10–11 классы. Школа с углубленным изучением иностранных языков. Программы общеобразовательных учреждений. – М.: Просвещение, 2000. – 144 с.

Федеральный компонент государственного стандарта общего образования / проект М-ва образования РФ. – Учительская газета, № 3 (9980), 27 января 2004 г. – С. 17, 23.

Федеральный компонент государственного стандарта общего образования / проект М-ва образования РФ. – Учительская газета, № 4 (9981), 3 февраля 2004 г. – С. 16–18.

Цели обучения иностранным языкам: учеб. пособие / под ред. Е.И. Пассова, Е.С. Кузнецовой. – Воронеж: НОУ «Интерлингва», 2002. – 40 с.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)» для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Замежная мова» выконвае важную ролю ў фарміраванні полікультурнай асобы, здольнай выкарыстоўваць вывучаемую мову ў разнастайных сітуацыях міжкультурнай камунікацыі. Яго змест спрыяе павышэнню ўзроўню гуманітарнай адукацыі вучняў пры дапамозе далучэння да духоўнага багацця іншых народаў, фарміраванню гатоўнасці да ўзаемаразумення, выхаванню ў духу талерантнасці, развіццю здольнасці перадаваць падчас іншамоўных зносін уласныя думкі і пачуцці.

Вывучэнне замежнай мовы як сродку зносін у кантэксце дыялогу нацыянальных культур у спалучэнні з авалоданнем навыкамі і ўменнямі самаадукацыйнай і пазнавальнай дзейнасці на ёй абумоўлівае высокую акадэмічную, агульнаінтэлектуальную, культуралагічную і практычную значнасць прадмета.

Мэты і змест навучання замежным мовам арыентаваны на сумеснае вывучэнне моў і культур. Замежная мова выступае як сродак фарміравання і выхавання маральна адказнай асобы, як сродак зносін, пазнання, асэнсавання і інтэрпрэтацыі фактаў іншай культуры, усведамлення сваёй уласнай культуры і азнаямлення з ёй прадстаўнікоў іншамоўных згуртаванняў.

Мэты навучання замежнай мове

Стратэгічны мэтавы арыенцір навучання замежным мовам – фарміраванне полікультурнай асобы вучняў шляхам выкарыстання патэнцыялу вучэбнага прадмета для сацыялізацыі падрастаючага пакалення, з'яўлення ў яго гуманістычных каштоўнасных арыентацый, узбагачэння духоўнага свету падчас авалодання іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыяй.

Адукацыйныя мэты – авалоданне асноўнымі відамі маўленчай дзейнасці (успрыманне і разуменне іншамоўнага маўлення на слых, гаварэнне, чытанне, пісьмо і пісьмовае маўленне) і фарміраванне адпаведных моўных ведаў, маўленчых навыкаў і ўменняў; узбагачэнне моўнага, маўленчага і асобаснага вопыту вучняў пры дапамозе пашырэння іх кругагляду і на аснове засваення культуразнаўчых і лінгвакраіназнаўчых рэалій.

Рэалізацыя адукацыйных мэт заключаецца ў практычным авалоданні вучнямі замежнай мовай як сродкам зносін у адзінстве яе кагнітыўнай, камунікатыўнай і экспрэсіўнай функцый; у фарміраванні ўменняў самастойнай работы з іншамоўным матэрыялам.

Развіццёвыя мэты – кагнітыўнае, камунікатыўнае і эмацыянальнае развіццё вучняў пры дапамозе авалодання спосабамі фарміравання і фармулявання думкі на замежнай мове, умацавання лінгвістычнага кампанента гуманітарнага мыслення, узбагачэння эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы, фарміравання моўнай здольнасці ў адзінстве стварэння і ўспрымання маўлення.

Развіццёвыя мэты рэалізуюцца пры дапамозе развіцця і ўдасканалення ў вучняў маўленчых механізмаў і здольнасцей, што забяспечваюць успрыманне і перадачу інфармацыі з дапамогай моўных сродкаў вывучаемай замежнай мовы на аснове атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў.

Выхаваўчыя мэты – сацыялізацыя асобы пры дапамозе забеспячэння гатоўнасці да міжкультурнай камунікацыі, узбагачэння духоўнага свету вучняў, выхавання ў іх культуры мыслення і маўленчых паводзін; фарміраванне гуманістычных каштоўнасных арыентацый.

Рэалізацыя выхаваўчых мэт спрыяе эфектыўнай адаптацыі асобы да іншага сацыяльнага асяроддзя, забяспечваючы самакантроль і адэкватную самаацэнку.

Мэты навучання замежным мовам дасягаюцца падчас фарміравання ў вучняў іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі ў адзінстве яе складальнікаў (маўленчай, моўнай, сацыякультурнай, кампенсаторнай, вучэбна-пазнавальнай).

Камунікатыўная кампетэнцыя – валоданне сукупнасцю маўленчых, моўных, сацыякультурных норм вывучаемай мовы, а таксама кампенсаторнымі і вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі, якія дазваляюць выпускніку ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю і вырашаць камунікатыўныя, адукацыйныя, пазнавальныя і іншыя задачы.

Маўленчая кампетэнцыя – сукупнасць навыкаў і ўменняў маўленчай дзейнасці (гаварэнне, успрыманне маўлення на слых, чытанне і пісьмо), веданне нормаў маўленчых паводзін; набыццё на гэтай аснове вопыту іх ужывання для пабудовы лагічнага і звязнага па форме і змесце ўласнага выказвання; а таксама для разумення і інтэрпрэтацыі выказванняў іншых людзей.

Моўная кампетэнцыя – сукупнасць ведаў аб правілах функцыянавання моўных (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і граматычных) сродкаў у маўленні і навыкаў іх выкарыстання ў камунікатыўных мэтах.

Сацыякультурная кампетэнцыя – сукупнасць ведаў аб нацыянальна-культурнай спецыфіцы краін вывучаемай мовы, уменняў наладжваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з гэтай спецыфікай, прадстаўляць на гэтай аснове сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

Кампенсаторная кампетэнцыя – сукупнасць уменняў выкарыстоўваць дадатковыя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы вырашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту наяўных моўных сродкаў.

Вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя – сукупнасць агульных і спецыяльных вучэбных уменняў, неабходных для ажыццяўлення самастойнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай, вопыт іх выкарыстання.

Дасягненню мэт навучання павінны садзейнічаць усе формы адукацыйнага працэсу.

Агульныя патрабаванні да зместу навучання

Змест моўнай адукацыі ўяўляе сабой адзінства прадметнага і эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў. Авалоданне імі прадугледжвае набыццё вопыту, неабходнага ў міжкультурнай камунікацыі.

Эмацыянальна-каштоўнасны кампанент зместу моўнай адукацыі замежным мовам уключае сукупнасць адносін асобы да сусветнай моўнай і культурнай спадчыны, а таксама да працэсу авалодання ёй у мэтах асобаснага росту. Названы кампанент забяспечвае набыццё вопыту іншамоўных зносін шляхам рэфлексіі, самапазнання, самавызначэння. Працэс авалодання замежнай мовай набывае для вучня асобасны сэнс.

Прадметны змест моўнай адукацыі ўключае наступныя кампаненты:

сферы зносін і прадметна-тэматычны змест маўлення;

віды маўленчай дзейнасці і моўны матэрыял;

сацыякультурныя веды: культуразнаўчыя, краіназнаўчыя і лінгвакраіназнаўчыя;

кампенсаторныя і вучэбна-пазнавальныя ўменні і навыкі самастойнай работы з іншамоўным матэрыялам;

авалоданне замежнай мовай як сродкам зносін, адукацыі і самаадукацыі.

Прадметны кампанент зместу забяспечвае валоданне замежнай мовай як сродкам міжкультурных зносін.

Змест моўнай адукацыі ў адзінстве яе лінгвістычнага і экстралінгвістычнага кампанентаў фарміруецца з улікам псіхалагічных і псіхалінгвістычных асаблівасцей працэсу авалодання замежнай мовай.

Адбор зместу вучэбнага матэрыялу, які падлягае засваенню, ажыццяўляецца на аснове наступных метадалагічных арыенціраў:

накіраванасць педагагічнага працэсу на падрыхтоўку да міжкультурных зносін;

усебаковы ўлік узаемасувязей: мова – мысленне – культура;

прад'яўленне каштоўнасцей пазнавальнай культуры ў дыялогу з роднай;

інтэграцыя моўнага, сацыякультурнага, аксіялагічнага кампанентаў зместу навучання;

аўтэнтычнасць і каштоўнасная значнасць іншамоўных матэрыялаў;

адпаведнасць вучэбнага матэрыялу сучасным гутарковым нормам вывучаемай мовы.

Структураванне вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца на аснове наступных патрабаванняў:

бесперапыннае канцэнтрычнае прад'яўленне і назапашванне ведаў;

паэтапнае фарміраванне навыкаў і ўменняў;

пераемнасць этапаў працэсу авалодання замежнай мовай;

пастаянная апора на моўны, маўленчы і асобасны суб'ектны вопыт вучняў;

спалучанасць у авалоданні маўленнем і сістэмай мовы;

улік магчымасцей для фарміравання ўменняў самастойнай работы з іншамоўнымі інфармацыйнымі крыніцамі ў самаадукацыйных мэтах.

Рэалізацыя зместу моўнай адукацыі прадугледжвае паслядоўны ўлік наступных асноўных палажэнняў камунікатыўна-арыентаванага навучання:

мадэляванне сітуацый зносін, якія стымулююць вучняў да вырашэння камунікатыўных задач падчас вывучэння замежнай мовы;

сітуатыўна абумоўленае авалоданне лексікай і граматыкай вывучаемай мовы;

выкарыстанне камунікатыўна-арыентаваных заданняў на аснове імітацыйных, гульнявых і свабодных зносін;

актыўнае ўцягванне вучняў у працэс зносін у якасці маўленчых партнёраў;

ажыццяўленне адукацыйнага працэсу ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін;

стварэнне матывацыйнай гатоўнасці і патрэбнасці вучняў ва ўспрыманні і засваенні вучэбнага матэрыялу ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін.

Сферы зносін і іх прадметна-тэматычны змест

Сацыяльна-бытавая сфера. Здаровы лад жыцця. Горад і вёска.
Сацыяльна-культурная сфера. Святы. Канікулы. Тэлеперадачы. Падарожжы.
Сацыяльна-пазнавальная сфера. Краіны і кантыненты.

Маўленчыя ўменні

Успрыманне і разуменне маўлення на слых – уменне разумець іншамоўнае маўленне ў працэсе непасрэдных зносін з субяседнікам, аўдыя- і відэатэксты розных жанраў з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест.

Гаварэнне – уменне ажыццяўляць дыялагічныя, маналагічныя і полілагічныя зносіны ў адпаведнасці з мэтамі, задачамі і ўмовамі камунікацыі, з захаваннем нормаў маўленчага і немаўленчага этыкету.

Чытанне – уменне чытаць і разумець тэксты розных жанраў з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання і далейшага выкарыстання інфармацыі.

Пісьмовае маўленне – уменне прадуцыраваць розныя віды пісьмовых тэкстаў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краінах вывучаемай мовы, з улікам камунікатыўных задач і адрасата.

Моўныя веды і навыкі

Веды аб сістэме вывучаемай мовы, правілах функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, лексічных, граматычных) у маўленні і навыкі іх выкарыстання ў камунікатыўных мэтах.

Сацыякультурныя веды і ўменні

Веды сацыякультурнага кантэксту сваёй краіны і краін вывучаемай мовы, уменні наладжваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з іх спецыфікай, прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

Кампенсаторныя ўменні

Уменні выкарыстоўваць розныя вербальныя і невербальныя сродкі для кампенсацыі прабелаў у камунікацыі ва ўмовах дэфіцыту моўных сродкаў, недахопу маўленчага і сацыяльнага вопыту.

Вучэбна-пазнавальныя ўменні

Агульныя і спецыяльныя вучэбныя ўменні, неабходныя для ажыццяўлення самастойнай пазнавальнай дзейнасці па авалоданні іншамоўным маўленнем і культурай краін вывучаемай мовы.

Змест навучання пададзены ў вучэбнай праграме праз прадметна-тэматычны змест зносін, патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці, моўны матэрыял (фанетыка, лексіка, граматыка).

У прадметна-тэматычным змесце абазначаны асноўныя камунікатыўныя задачы. Курсівам адзначаны камунікатыўныя задачы для гімназій.

Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці – працягласць гучання тэксту, колькасць рэплік на кожнага субяседніка ў дыялагічным маўленні, аб'ём выказвання ў маналагічным маўленні, аб'ём тэксту для чытання, аб'ём тэксту для пісьмовага маўлення – задаюць асноўныя параметры для ўсіх відаў маўленчай дзейнасці. Дадзеныя параметры, а таксама аб'ём прадуктыўнага і рэцэптыўнага лексічнага мінімуму пазначаны наступным чынам: першая лічба – патрабаванні для школ, другая – для гімназій. Напрыклад, працягласць гучання тэксту: 1–1,5 мін; прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак; рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак; агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак; агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.

Граматычны матэрыял, які падлягае вывучэнню, аднолькавы для ўсіх відаў установ агульнай сярэдняй адукацыі. Патрабаванні да валодання граматычным матэрыялам адрозніваюцца аб'ёмам яго прадуктыўнага засваення. Граматычныя з'явы для рэцэптыўнага засваення, адзначаныя зорачкай (*), прызначаны для прадуктыўнага засваення ў гімназіях.

Больш высокія патрабаванні да валодання моўным і маўленчым матэрыялам у гімназіях забяспечаць больш высокі ўзровень фарміравання ў вучняў моўных навыкаў і маўленчых уменняў, што будзе праяўляцца ў іх здольнасці якасна вырашаць вучэбныя камунікатыўныя задачы.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
105 (175) гадзін

Прадметна-тэматычны змест зносін

Сфера зносін	Прадметна-тэматычны змест	Камунікатыўныя задачы
		У канцы года вучань павінен у м е ц ь
Сацыяльна-бытавая	Здаровы лад жыцця	Расказаць і распытаць аб сняданку, абедзе, вячэры ў сям'і; расказаць і распытаць аб здаровым харчаванні; расказаць і распытаць аб асноўных недамаганнях; *даць параду аб здаровым ладзе жыцця (гігіена, харчаванне, зарадка)*
	Горад і вёска	Распытаць і растлумачыць, як прайсці куды-небудзь; запытаць і даць інфармацыю аб месцы пражывання (адрас, тэлефон); назваць правілы бяспечных паводзін на вуліцах горада, вёскі; апісаць родны горад/вёску; *расказаць і распытаць аб жыцці ў горадзе/сельскай мясцовасці*
Сацыяльна-культурная	Канікулы	Расказаць і распытаць аб занятках на канікулах; расказаць аб летнім адпачынку; *расказаць аб самым яркім уражанні ў час канікулаў*
	Святы	Расказаць і распытаць аб асноўных святах Рэспублікі Беларусь і краіны вывучаемай мовы; павіншаваць са святам і адказаць на віншаванне; назваць традыцыйныя святочныя стравы ў сваёй краіне і краіне вывучаемай мовы; *параўнаць святкаванне Новага года/Каляд у сваёй краіне і краіне вывучаемай мовы*
	Тэлеперадачы	Назваць любімыя тэлеперадачы; распытаць аб любімых тэлеперадачах; выказаць меркаванне аб тэлеперадачы; *параіць паглядзець тэлеперадачу і аргументаваць сваё меркаванне*

	Падарожжы	Расказаць і распытаць аб падарожжы (месца, час, транспарт, уражанні); прыняць або адхіліць прапанову аб падарожжы; *расказаць аб падарожжы, якое запомнілася па кнізе/фільму*
Сацыяльна-пазнавальная	Краіны і кантыненты	Назваць кантыненты і апісаць іх прыродныя асаблівасці; назваць краіны, у якіх гавораць на вывучаемай замежнай мове; *распытаць і расказаць аб цікавых нацыянальных святах краін свету*

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні настаўніка, якія звязаны з вядзеннем урока; іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, якія пабудаваны на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні настаўніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай або вербальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, дзіцячая песня.

Працягласць гучання тэксту: 1–1,5 мін.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

запытаць і паведаміць інфармацыю, якая вызначана прадметна-тэматычным зместам зносін;

прыняць або адмовіцца ад прапановы.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог-віншаванне, дыялог-пабуджэнне да дзеяння.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 4–5.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведаміць інфармацыю;

апісаць прадметы і з'явы;

коратка пераказаць змест праслуханага/прачытанага тэксту з выкарыстаннем візуальных апор.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апавяданне, апісанне.

Аб'ём выказвання: не менш за 6–8 фраз.

Чытанне

Вучні павінны ўмець чытаць самі сабе і поўна разумець тэксты, якія змяшчаюць 1–2 % незнаёмых слоў і не ўплываюць на разуменне.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, песня.

Аб'ём тэксту: 1300–2000 друкаваных знакаў з прабеламі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець прадуцыраваць нескладаныя віды тэкстаў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

падпісваць віншавальную паштоўку, запрашэнне;

пісаць асабістае пісьмо ў межах вывучанай тэматыкі.

Аб'ём тэксту: не менш за 30–40 слоў.

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

АНГЛІЙСКАЯ МОВА

Фанетыка

Рытм англійскага маўлення. Інтанацыя пералічэння. Інтанацыя пабуджальных і клічных сказаў. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы прыметнікаў *–(i)an*, прыслоўяў *-ly*, дзеясловаў *–ate.*

Паказальнікі часу: this (week), *last (year)*, *next (summer)*.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: асобыя выпадкі ўтварэння множнага ліку *(man – men*, *woman – women*, *child – children*, *tooth – teeth*, *foot – feet*, *goose – geese*, *sheep – sheep*, *mouse – mice).* Назоўнікі для абазначэння прадметаў, якія можна або нельга палічыць.

Артыкль: a/an, *the* (асноўныя значэнні), значная адсутнасць артыкля. Артыкль перад геаграфічнымі назвамі (вуліцы, гарады, краіны, кантыненты).

Прыметнік: асобыя выпадкі ўтварэння ступеней параўнання прыметнікаў *(good*, *bad)*.

Займеннік: неазначальныя займеннікі *some*, *any*, *no*, *much*, *many*. Аб'ектны склон асабовых займеннікаў.

Дзеяслоў: сцвярджальная, адмоўная і пытальная формы дзеясловаў у *Past Simple*, *Future Simple*.

М а д а л ь н ы д з е я с л о ў: should/shouldn't для выказвання парады, рэкамендацыі; *must/mustn't* для выражэння неабходнасці і забароны.

Прыслоўе: yesterday, *ago*, *next*, *tomorrow*, *today*, *always*, *often*, *sometimes*, *rarely*, *never*, *well*, *fast*.

Прыназоўнік: прыназоўнікі напрамку руху *to*, *along*, *past*, *over*; прыназоўнікі месца *at (home)*, *behind*, *in front of*, *between*, *opposite*, *next to*; прыназоўнікі часу *in (November)*, *to (quarter to two)*, *past (half past two)*, *at (Easter)*, *on (New Year's Day)*; *by (plane)*.

Злучнік: because.

С і н т а к с і с

Парадак слоў у сказе. Складаназлучаны сказ са злучнікамі *and*, *but*.

НЯМЕЦКАЯ МОВА

Фанетыка

Націск у складаных прыметніках. Лагічны націск у фразе. Інтанацыя пабуджальных сказаў. Інтанацыя сказаў з састаўным дзеяслоўным выказнікам, які выражаны дзеясловамі ў часавай форме *Perfekt Aktiv* (рамачная канструкцыя).

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы назоўнікаў *-er*, *-in* для абазначэння нацыянальнасцей, жыхароў гарадоў, населеных пунктаў; словаскладанне: аснова або корань дзеяслова + назоўнік.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: скланенне назоўнікаў множнага ліку ў давальным склоне множнага ліку. Назоўнікі для абазначэння прадметаў, якія можна або нельга палічыць.

Артыкль: артыкль перад геаграфічнымі назвамі (кантыненты, краіны, гарады, вуліцы). Азначальны артыкль перад уласным імем, калі перад ім стаіць азначэнне. Неазначальны артыкль перад назоўнікам пасля дзеясловаў *suchen*, *sich wünschen* і безасабовага звароту *es gibt.*

Займеннік: зваротны займеннік *sich*. Пытальны займеннік *welcher/welches/welche.*

Дзеяслоў: зваротныя дзеясловы. Дзеяслоў *sein* у простым прошлым часе *Präteritum Aktiv.* Састаўны дзеяслоўны выказнік, які выражаны формай прошлага часу *Perfekt Aktiv*. Загадны лад.

Прыназоўнік: прыназоўнікі *durch*, *für*, *um*, *bis*, *entlang*, якія патрабуюць вінавальнага склону. Прыназоўнікі *zu*, *mit*, якія патрабуюць давальнага склону.

С і н т а к с і с

Апавядальны сказ (просты і развіты). Парадак слоў у развітым сказе з дапаўненнем у вінавальным і давальным склонах; з састаўным дзеяслоўным выказнікам, які выражаны дзеясловамі ў часавай форме *Perfekt Aktiv* (рамачная канструкцыя); з простым дзеяслоўным выказнікам, які выражаны зваротнымі дзеясловамі.

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Артыкль: неазначальны артыкль, калі перад уласным імем стаіць азначэнне.

Прыметнік: скланенне прыметнікаў пасля неазначальнага артыкля, прыналежных займеннікаў і займенніка *kein/keine*.

С і н т а к с і с

Складаназлучаныя сказы са злучнікам *denn*. Складаназалежныя сказы са злучнікам *weil*.

ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА

Фанетыка

Адрозненне на слых і дакладнае вымаўленне ўсіх гукаў французскай мовы. Лагічны націск. Інтанацыйная мадэль апавядальнага і пытальнага сказаў (з простай і складанай інверсіяй).

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфіксы назоўнікаў *-ien*, *-ienne; -ais*, *-aise; -ain*, *-aine; -ois*, *-oise*; прыметнікаў *-ais*, *-aise*; прыстаўка дзеясловаў *re-*.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: мужчынскі і жаночы род назоўнікаў, якія абазначаюць нацыянальнасць.

Артыкль: ужыванне адназначнага і неадназначнага артыклей (паўтарэнне); частковыя артыклі *du*, *de l'*, *de la*; артыкль перад геаграфічнымі назвамі (краіны, кантыненты); адсутнасць артыкля ў назвах гарадоў; адсутнасць артыкля пры адмаўленні.

Ужыванне прыназоўніка *de* пасля слоў, якія абазначаюць колькасць. Злітны артыкль у выразе *avoir mal à ...*

Прыметнік: ступені параўнання якасных прыметнікаў.

Займеннік: неазначальна-асабовы займеннік *on*; пытальны займеннік *qui.*

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі да 1000; парадкавыя лічэбнікі да 100.

Дзеяслоў: le présent дзеясловаў I, II і III групы; прошлы складаны час *le passé composé* з дзеясловам *être* (акрамя зваротных дзеясловаў); прошлы незавершаны час *l'imparfait.* Загадны лад (акрамя выключэнняў ê*tre*, *avoir*, *savoir*).

Прыслоўе: прыслоўі *toujours*, *jamais*, *souvent*, *parfois; d'abord*, *ensuite*, *puis*, *enfin.* Пытальныя прыслоўі *où*, *d'où*, *quand*, *pourquoi*, *comment*, *combien.*

Прыназоўнік: прыназоўнікі месца і кірунку руху; прыназоўнікі *en/à* для абазначэння спосабу перамяшчэння.

С і н т а к с і с

Парадак слоў у пытальным сказе з простай і складанай інверсіяй (агульнае пытанне; пытанне да адушаўлёнага дзейніка; пытанне да акалічнасці).

Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення

Будучы просты час *le futur simple* дзеясловаў I і II групы. Бліжэйшы будучы час *le futur proche* і бліжэйшы прошлы час *le passé récent*.

ІСПАНСКАЯ МОВА

Фанетыка

Інтанацыя пабуджальных і клічных сказаў.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак.
Рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак.
Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак.
Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.
Словаўтварэнне: прыстаўкі *re-*, *in-(im-)*, *des-*.

Граматыка

М а р ф а л о г і я

Дзеяслоў: структуры са знамянальнымі дзеясловамі ў *Presente de Indicativo*, *Pretérito Perfecto*, *Pretérito Imperfecto*, *Pretérito Indefinido*, *Modo Imperativo* (сцвярджальная форма на *tú*, *vosotros*).

Прыслоўе: прыслоўі *ya*, *todavía*, *jamás*, *nunca*, *siempre*, *a veces*.

С і н т а к с і с

Клічныя і пабуджальныя сказы.

КІТАЙСКАЯ МОВА

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні настаўніка, якія звязаны з вядзеннем урока; іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, якія пабудаваны на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні настаўніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай або вербальнай апорай.

Віды тэкстаў: апавяданне, рыфмоўка, дзіцячая песня, верш, скорагаворка.

Працягласць гучання тэксту: 1 мін.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытаць і паведаміць інфармацыю, якая вызначана прадметна-тэматычным зместам зносін.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог-віншаванне, дыялог-пабуджэнне да дзеяння.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 4–5.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю;

апісваць прадметы і з'явы;

коратка пераказваць змест праслуханага/прачытанага тэксту з выкарыстаннем візуальнай апоры.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апавяданне, апісанне.

Аб'ём выказвання: 6–8 фраз.

Чытанне

Вучні павінны ўмець чытаць самі сабе тэксты, якія напісаны з дапамогай іерогліфаў, разумець асноўны змест і вызначаць асобныя дэталі прачытанага.

Аб'ём тэксту: 0,3 старонкі.

Вучні павінны ўмець чытаць іерогліфы (100–200) і простыя сказы, якія напісаны іерогліфамі.

Віды тэкстаў: апавяданне, скорагаворка, рыфмоўка, дзіцячая песня, коміксы, верш, песня, школьны расклад.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець прадуцыраваць нескладаныя віды тэкстаў, якія напісаны з дапамогай транскрыпцыйных знакаў, у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

падпісваць віншавальную паштоўку, запрашэнне;

пісаць асабістае пісьмо ў межах вывучанай тэматыкі.

Аб'ём тэксту: 30–40 слоў.

Вучні павінны ўмець пісаць іерогліфы (80–160) і простыя сказы, якія напісаны іерогліфамі.

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

Фанетыка

Вымаўленне запар наступных складоў трэцяга тону. Змяненне тону лічэбніка. Інтанацыя пералічэння. Інтанацыя пабуджальных і клічных сказаў. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 210–250 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 120–180 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі: 610–650 лексічных адзінак.

Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі: 240–300 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Лічыльнае слова: 个、把、节、张、件、条、双.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 50–100; асаблівасці ўжывання лічэбнікаў 两 і 二.

Прыметнік: 多、少; параўнальная ступень прыметнікаў 快一点儿.

Займеннік: указальныя займеннікі 这 і 那 у спалучэнні з лічыльнымі словамі.

Дзеяслоў: паказальнік цяперашняга часу 在.

Прыслоўе: 太、很、不、真、很多、很少、不多、不少、附近、只.

Паслялог: 外边.

Прыназоўнік: 在, 给, 除了…以外.

Сінтаксіс

Сказы, якія абазначаюць размяшчэнне прадметаў у прасторы (在)…上有/是…, …在…上.

Сказы наяўнасці з дзеясловам 有.

Выразы паслядоўнасці дзеянняў з дапамогай прыслоўяў 先…然后…

Дзеяслоўнае дапаўненне стану: (…得…) (1).

Спецыяльныя пытанні з пытальнымі словамі 为什么? 怎么?

Альтэрнатыўнае пытанне са злучнікам 还是.

Пытальныя сказы з удакладняльнымі выразамі ...好吗?...怎么样?

Пабуджальныя сказы з часціцай ….…吧!або 让…吧!

Вучні павінны валодаць **сацыякультурнымі ведамі і ўменнямі**:

ведаць назвы кантынентаў і асноўных краін вывучаемай мовы;

ведаць асобныя творы дзіцячага фальклору, паэзіі і інш.;

ведаць папулярныя святы Рэспублікі Беларусь і краіны вывучаемай мовы;

умець ветліва звярнуцца па дапамогу да каго-небудзь у краіне вывучаемай мовы (распытаць, як прайсці куды-небудзь);

умець апісаць замежнаму аднагодку свой родны горад/вёску.

Вучні павінны валодаць **кампенсаторнымі ўменнямі** ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці:

успрыманне і разуменне маўлення на слых:

прагназаваць змест аўдыятэксту па загалоўку;

абапірацца на сітуацыю, прыведзеную настаўнікам перад праслухоўваннем тэксту;

выкарыстоўваць моўную здагадку (па падабенстве са словамі роднай мовы);

абапірацца на сродкі зрокавай нагляднасці (малюнкі, фотаздымкі, табліцы);

чытанне:

прагназаваць змест тэксту па загалоўку;

абапірацца на сродкі зрокавай нагляднасці (малюнкі, фотаздымкі, табліцы);

выкарыстоўваць моўную здагадку (па падабенстве са словамі роднай мовы);

выкарыстоўваць двухмоўныя слоўнікі;

гаварэнне:

звяртацца па дапамогу да субяседніка, ужываючы перапытванне;

удакладняць змест выказвання з дапамогай мімікі і жэстаў;

пісьмо і пісьмовае маўленне:

выкарыстоўваць тэкст-узор у якасці апоры.

Вучні павінны валодаць **вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі:**

складаць план прачытанага/праслуханага тэксту;

выконваць самастойныя заданні рэпрадуктыўнага характару з выкарыстаннем друкаваных матэрыялаў (раздатачны матэрыял, нагляднасць);

выкарыстоўваць двухмоўныя слоўнікі.

Вучні павінны выкарыстоўваць набыты **моўны, маўленчы і сацыякультурны вопыт** для:

пераадолення псіхалагічных бар'ераў у працэсе вусных зносін на замежнай мове;

азнаямлення з дзіцячым замежным фальклорам;

развіцця добразычлівых адносін да прадстаўнікоў іншых краін.

ПРАГРАМНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Концепция обучения иностранным языкам в системе непрерывного образования Республики Беларусь // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. – 2002. – № 3. – С. 21–28.

Концепция учебного предмета «Иностранный язык» // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. – 2007. – № 4. – С. 3–11.

Вучэбная праграма для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. «Замежныя мовы: англійская, нямецкая, французская, іспанская. III–XI класы». – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.

Биболетова, М.З. Авторская программа к курсу для 2–9 классов общеобразовательных учреждений. Основная школа (5–9) классы / М.З. Биболетова, Н.Н. Трубанаева // Английский язык в школе, № 2, 2003. – Ч. 2. – С. 31–44.

Бим, И.Л. Концепция обучения второму иностранному языку (немецкому на базе английского): учеб. пособие. – Обнинск: Титул, 2001. – 48 с.

Бим, И.Л. Немецкий язык. Базовый курс. Концепция, программа. – М.: Новая школа, 1995. – 128 с.

Единый государственный экзамен 2002: Контрол. измерит. материалы: Английский язык / Е.Ф. Прохорова [и др.]; М-во образования РФ. – М.: Просвещение, 2003. – 93 с.

Образовательный стандарт по английскому языку / под ред. Е.Ф. Прохоровой; Комитет по образованию Администрации Санкт-Петербурга, The British Council St. Petersburg, Санкт-Петербургский государственный университет педагогического мастерства. – СПб., 2001. – Ч. I. – 47 с.

Программно-методические материалы. Иностранные языки для школ и классов с углубленным изучением английского, немецкого, французского, испанского языков. Начальная школа. – 3-е изд., стереотип. – М.: Дрофа, 2000. – 128 с.

Программно-методические материалы. Иностранные языки для общеобразовательных учебных заведений. Начальная школа. – 4-е изд., стереотип. – М.: Дрофа, 2001. – 160 с.

Сафонова, В.В. Английский язык. 5–9 классы школ с углубленным изучением иностранных языков. Программы для общеобразовательных учреждений / В.В. Сафонова, Е.Н. Соловова. – М.: Просвещение, 1997. – 62 с.

графическую и технологическую документацию на изготовление простых изделий из соломки;

порядок организации учебного места для аппликации из соломки;

технологию аппликации из соломки: выбор и подготовку фона; перевод рисунка на фон, на бумагу; подготовку соломенных лент; наклеивание соломенных лент на бумагу; сушку соломенных лент; вырезание деталей рисунка из соломенных лент; наклеивание деталей рисунка на фон; сушку; отделку;

требования, предъявляемые к качеству изделий;

инструменты, приспособления и учебное оборудование для аппликации из соломки; правила безопасной работы;

профессии, связанные с художественной обработкой материалов.

Учащиеся должны у м е т ь:

различать виды природных материалов;

заготавливать солому культурных и дикорастущих растений;

раскрывать понятие «аппликация из соломки»; распознавать виды аппликации из соломки;

осуществлять подготовку соломенных лент;

читать простые эскизы и маршрутные карты на изготовление изделий с элементами аппликации из соломки;

организовывать учебное место для аппликации из соломки;

выбирать заготовки из соломы с припуском на обработку; экономно использовать материал;

выполнять аппликацию из соломки: выбирать и подготавливать фон; переводить рисунки на фон, на бумагу; подготавливать соломенные ленты; наклеивать соломенные ленты на бумагу; сушить соломенные ленты; вырезать детали рисунка из соломенных лент; наклеивать детали рисунка на фон; сушить; отделывать; проверять качество изделий;

пользоваться инструментами, приспособлениями и учебным оборудованием для аппликации из соломки; соблюдать правила безопасной работы;

осуществлять творческое проектирование изделий с элементами аппликации из соломки.

Учащиеся должны в л а д е т ь:

навыками организации учебного места для аппликации из соломки;

способами аппликации из соломки;

приемами аппликации из соломки: выбирать и подготавливать фон; переводить рисунки на фон, на бумагу, подготавливать соломенные ленты; наклеивать соломенные ленты на бумагу; сушить соломенные ленты; вырезать детали рисунка из соломенных лент; наклеивать детали рисунка на фон; сушить; отделывать;

правилами безопасной работы при использовании инструментов, приспособлений и учебного оборудования для аппликации из соломки;

приемами чтения и оформления графической и технологической документации для аппликации из соломки.

РЕКОМЕНДУЕМАЯ ЛИТЕРАТУРА

Литература для учителя

Астрейко, С.Я. Ручная отделка изделий из древесины (с основами материаловедения) / С.Я. Астрейко. – Мозырь: МГПИ, 1996. – Вып. 1. – 34 с.; 2000. – Вып. 2. – 36 с.

Астрейко, С.Я. Задания для тематического контроля по техническому труду: 5–9 кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / С.Я. Астрейко [и др.]. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 104 с.

Астрейко, С.Я. Педагогика технического труда и творчества (культурологический аспект): монография / С.Я. Астрейко. – Мозырь: УО МГПУ им. И.П.Шамякина, 2010. – 152 с.

Барадулин, В.А. Художественная обработка дерева / В.А. Барадулин. – М.: Легпромбытиздат, 1986. – 264 с.

Барташевич, А.А. Художественная обработка дерева / А.А. Барташевич, А.М. Романовский. – Минск: Вышэйшая школа, 2000. – 230 с.

Беляев, М.В. Основы композиции / М.В.Беляев. – Минск: БГПУ им. М.Танка, 2002. – 79 с.

Бронников, Н.А. Методика обучения учащихся 5 класса технологии / Н.А. Бронников, Н.В. Матяш, В.Д. Симоненко. – Брянск: БрГПУ, 1999. – 147 с.

Буйвидович, Ф.В. Технология столярно-плотничных и паркетных работ: учеб. пособие / Ф.В. Буйвидович. – Минск: Вышэйшая школа, 2000. – 470 с.

Виноградов, В.Н. Черчение: учеб. пособие для 9-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / В.Н. Виноградов. – Минск: Нац. ин-т образования, 2008. – 224 с.

Карабанаў, І.А. Методыка працоўнага навучання і тэхналагічнай адукацыі / І.А. Карабанаў, В.А. Юдзіцкі; пад рэд. І.А. Карабанава. – Мазыр: МДПІ, 2002. – 171 с.

Касабуцкий, Н.И. Композиция: учеб.-метод. пособие / Н.И. Касабуцкий. – Могилев: МГУ, 2000. – 56 с.

Луканский, Э.П. Сотвори радость / Э.П. Луканский. – Минск: Полымя, 1997. – 368 с.

Макиенко, Н.И. Общий курс слесарного дела / Н.И. Макиенко. – М.: Высшая школа, 2001. – 334 с.

Муравьев, Е.М. Общие основы методики преподавания технологии / Е.М. Муравьев, В.Д. Симоненко. – Брянск: БрГПУ им. И.Г.Петровского, 2000. – 235 с.

Нормы оценки результатов учебной деятельности учащихся общеобразовательных учреждений по учебным предметам / С.Я. Астрейко [и др.] // Тэхналагічная адукацыя. – 2009. – Вып. 3. – С. 17–20.

О преподавании учебных предметов «Трудовое обучение», «Черчение» / С.Я. Астрейко [и др.] // Тэхналагічная адукацыя. – 2009. – Вып. 3. – С. 24–30.

Оценка результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам «Трудовое обучение», «Черчение» / С.Я. Астрейко [и др.] // Тэхналагічная адукацыя. – 2009. – Вып. 3. – С. 20–24.

Пархоменко, В.П. Основы технического творчества / В.П. Пархоменко. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2000. – 148 с.

Покровский, Б.С. Слесарное дело / Б.С. Покровский, В.А. Скакун. – М.: ИРПО; Издательский центр «Академия», 2003. – 320 с.

Примерное календарно-тематическое планирование / С.Я. Астрейко // Тэхналагічная адукацыя. – 2010. – Вып. 3. – С. 10–17.

Развитие технического творчества младших школьников: кн. для учителей / П.Н. Андрианов [и др.]. – М.: Просвещение, 1990. – 110 с.

Райт, Д. Искусство выжигания по дереву / Д. Райт; пер. с англ. К. Молькова. – М.: Издательская группа «Контэнт», 2005. – 96 с.

Ревуцкий, В.И. Дидактический материал по техническому труду, 5–6 кл. / В.И. Ревуцкий, А.А. Улога. – Минск: Народная асвета, 1986. – 128 с.

Репина, Т.А. Художественные изделия из соломки / Т.А.Репина. – Минск: Беларусь, 2008. – 287 с.

Рихвк, Э.В. Мастерим из древесины: кн. для учащихся 5–8 кл. сред. шк. / Э.В. Рихвк. – М.: Просвещение, 1988. – 128 с.

Симоненко, В.Д. Технологическое образование школьников. Теоретико-методологические аспекты / В.Д. Симоненко, М.В. Ретивых, Н.В. Матяш; под ред. В.Д. Симоненко. – Брянск: БГПУ им. И.Г.Петровского; НМЦ «Технология», 1999. – 230 с.

Техническое творчество учащихся / Ю.С.Столяров [и др.]; под ред. Ю.С. Столярова, Д.М. Комского. – М.: Просвещение, 1989. – 223 с.

Трудовое обучение. Технический труд. Факультативные занятия (пропильная резьба и выжигание по древесине, художественное точение древесины, основы художественного конструирования): пособие для учителей общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / С.Я. Астрейко. – Минск: Сэр-Вит, 2010. – 80 с.

Шнип, И.А. Первые шаги в техническое творчество / И.А. Шнип. – Минск: НМЦ, 1997. – 128 с.

Юдицкий, В.А. Методика трудового обучения в вопросах и ответах: учеб.-метод. пособие / В.А. Юдицкий; под ред. И.А. Карабанова. – Мозырь: МГПИ, 1999. – 40 с.

Юдицкий, В.А. Технические загадки: учеб.-метод. пособие / В.А. Юдицкий. – Мозырь: МГПИ, 1998. – 96 с.

Литература для учащихся

Бронников, Н.Л. Страницы истории техники и технологии: учеб.-метод. пособие: в 2 ч. / Н.Л. Бронников, И.А. Карабанов; под ред. В.Д. Симоненко, И.А. Карабанова. – Мозырь: МГПИ, 2000. – Ч. 1. – 126 с. – Ч. 2. – 115 с.

Карабанов, И.А. Технология обработки древесины, 5–9: учебник для учащихся 5–9 классов общеобразоват. учреждений / И.А. Карабанов. – М.: Просвещение, 2002. – 192 с.

Маленькие хитрости домашнего умельца / сост. М. Мамин. – Вильнюс, 1991. – 62 с.

Мастерских, А.А. Большие хитрости / А.А. Мастерских. – М.: Изд-во «Лукоморье»; Темп МБ, 1997. – 352 с.

Муравьев, Е.М. Технология обработки металла, 5–9: учебник для учащихся 5–9 кл. общеобразоват. учреждений / Е.М. Муравьев. – М.: Просвещение, 2002. – 224 с.

Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца: вучэб. дапам. для 5 кл. агульнаадук. устаноў з беларус. мовай навучання / С.Я. Астрэйка [і інш.]; пад. рэд. С.Я. Астрэйкі. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 152 с.

Работы по дереву / сост. В.И. Рыженко. – М.: ООО «Гамма Пресс-2000», 2001. – 512 с.

Сокольникова, Н.М. Изобразительное искусство: учебник для учащихся 5–8 кл.: основы композиции: в 4 ч. / Н.М. Сокольникова. – Обнинск: Титул, 2001. – Ч. 3. – 80 с.

Справочник по трудовому обучению: обработка древесины и металла, электротехнические и ремонтные работы, 5–7 кл. / И.А. Карабанов [и др.]. – М.: Просвещение, 1992. – 239 с.

Трудовое обучение. Технический труд. Факультативные занятия (пропильная резьба и выжигание по древесине, художественное точение древесины, основы художественного конструирования): пособие для учащихся общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / С.Я. Астрейко. – Минск: Сэр-Вит, 2010. – 88 с.

Трудовое обучение. Технический труд: учеб. пособие для 5 кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / С.Я. Астрейко [и др.]; под ред. С.Я. Астрейко. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010. – 152 с.

Энциклопедия для детей: Я познаю мир: изобретения. – М.: АСТ; Минск: Харвест, 2002. – 480 с.

Энциклопедия техники: электроника, информатика: в 3 т. / пер. с исп. С.А. Яковлева. – М.: Мир книги, 2004. – Т. 3. – 160 с.

Энциклопедия техники: энергетика, транспорт, строительство: в 3 т. / пер. с исп. А.С. Воропаева. – М.: Мир книги, 2004. – Т. 1. – 160 с.

Юдицкий, В.А. Технические кроссворды / В.А. Юдицкий. – Мозырь: МГПИ, 2000. – 32 с.

Юдицкий, В.А. Технические чайнворды / В.А. Юдицкий. – Мозырь: МГПИ, 2001. – 24 с.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ ТЭХНІЧНАЯ ПРАЦА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» вывучаецца вучнямі V класа па дзвюх зместавых лініях:

1. Апрацоўка канструкцыйных матэрыялаў.

1.1. Апрацоўка драўніны.

1.2. Апрацоўка металаў.

2. Тэхнічная і мастацкая творчасць.

2.1. Тэхнічная творчасць.

2.2. Мастацкая апрацоўка матэрыялаў.

Працэс працоўнага навучання па зместавай лініі ***«Апрацоўка канструкцыйных матэрыялаў»*** накіраваны на паслядоўнае авалоданне вучнямі гімназій і ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі асобнымі тэхналагічнымі аперацыямі па ручной апрацоўцы драўніны і металаў (табл. 1).

Табліца 1

Тэхналагічныя аперацыі па ручной і механічнай апрацоўцы драўніны і металаў

Апрацоўка канструкцыйных матэрыялаў	
Апрацоўка драўніны	**Апрацоўка металаў**
Вымярэнне загатовак з драўніны	Вымярэнне загатовак з металаў
Разметка загатовак з драўніны	Праўка металаў (дроту)
Пілаванне драўніны	Разметка загатовак з металаў (дроту)
Зборка дэталей з драўніны на цвіках	Рэзка металаў (дроту) кусачкамі
Аддзелка драўніны	Гібка металаў (дроту)

Працэс працоўнага навучання па зместавай лініі ***«Тэхнічная і мастацкая творчасць»*** накіраваны на паслядоўнае авалоданне вучнямі комплексам тэхналагічных аперацый па апрацоўцы канструкцыйных і прыродных матэрыялаў у працэсе творчай тэхнічнай і мастацкай дзейнасці (табл. 2).

Вывучэнне раздзелаў ***«Тэхнічная творчасць»*** і ***«Мастацкая апрацоўка металаў»*** праводзіцца па інварыянтнай і варыятыўнай частках з улікам узроўню прафесіянальна-педагагічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі настаўніка тэхнічнай працы, стану матэрыяльна-тэхнічнай базы вучэбных майстэрняў, мясцовых умоў і традыцый рэгіёна, а таксама пажаданняў вучняў.

Да *інварыянтнай часткі* адносіцца абавязковае вывучэнне вучнямі тэарэтычных звестак зместавай лініі «Тэхнічная і мастацкая творчасць».

Разам з тым фарміраванне практычных уменняў і навыкаў вучняў можа ажыццяўляцца падчас выканання імі практычных заданняў па выбранай *варыятыўнай частцы* ў рамках асобнага раздзела дадзенай зместавай лініі.

Табліца 2

Віды творчай тэхнічнай і мастацкай дзейнасці вучняў

Інварыянтная частка			
Тэхнічная творчасць		Мастацкая апрацоўка матэрыялаў	
Варыятыўная частка			
Пачатковае мадэліраванне	Пачатковае канструяванне	Выпальванне па драўніне	Аплікацыя з саломкі

У вучэбнай праграме раскрываюцца асноўныя звесткі пра вучэбныя майстэрні і арганізацыю вучэбных месцаў для апрацоўкі канструкцыйных і (або) прыродных матэрыялаў; вывучаюцца віды і асноўныя ўласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца, іх эканомнае выкарыстанне; вызначаюцца магчымасці прымяняемых інструментаў, прылад і вучэбнага абсталявання; раскрываюцца змест, паслядоўнасць і прыёмы выканання тэхналагічных аперацый; вывучаюцца графічная і тэхналагічная дакументацыя; аналізуюцца тэхналагічныя працэсы для вырабу прадметаў; раскрываюцца асноўныя правілы бяспекі працы; правяраецца якасць выканання тэхналагічных аперацый і вырабаў (адпаведнасць чарцяжам, дакладнасць зборкі, якасць аддзелкі, магчымасць выкарыстання па прызначэнні, надзейнасць у эксплуатацыі і інш.); пералічваюцца асноўныя прафесіі, якія звязаны з лясной, дрэваапрацоўчай і металаапрацоўчай прамысловасцю, а таксама з творчай дзейнасцю тэхнічнага і мастацкага накірунка.

Пасля кожнага раздзела вучэбнай праграмы прыведзены *патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў*, дзе даецца пералік асноўных ведаў, уменняў і навыкаў, якія падлягаюць кантролю ў працэсе навучання на вучэбных занятках па тэхнічнай працы.

У залежнасці ад характару і відаў дзейнасці вучняў настаўнік можа выкарыстоўваць наступныя сістэмы навучання тэхнічнай працы: *аперацыйную*, *аперацыйна-прадметную*, *канструктарска-тэхналагічную*. Пры вывучэнні раздзелаў ***«Апрацоўка драўніны»*** і ***«Апрацоўка металаў»*** рэкамендуецца выкарыстоўваць аперацыйную сістэму навучання. У працэсе паслядоўнага авалодання вучнямі тэхналагічнымі аперацыямі настаўнік можа рыхтаваць загатоўкі для вырабу дэталей скразных вырабаў, якія будуць стварацца пазней пры вывучэнні зместавай лініі «Тэхнічная і мастацкая творчасць».

Пры вывучэнні раздзелаў ***«Тэхнічная творчасць»*** і ***«Мастацкая апрацоўка матэрыялаў»*** спачатку выкарыстоўваецца аперацыйна-прадметная сістэма навучання. Далейшае прымяненне канструктарска-тэхналагічнай сістэмы навучання аб'ядноўвае рэпрадуктыўную і творчую дзейнасць вучняў, якія перад выкананнем вырабу павінны прапанаваць некалькі варыянтаў яго выканання і выбраць пад кіраўніцтвам настаўніка аптымальную канструкцыю і арыгінальную кампазіцыю, матэрыял, форму, колер, спосабы апрацоўкі, інструменты, прыстасаванні, абсталяванне і інш.

У сувязі з гэтым у канцы раздзелаў зместавай лініі «Тэхнічная і мастацкая творчасць» прапануецца *прыкладны пералік вырабаў*, у тым ліку і сувенірных, які арыентаваны на стварэнне існуючых вырабаў, а таксама на распрацоўку, выраб, апрабацыю і ўкараненне ў адукацыйны працэс новых скразных вырабаў і творчых праектаў.

Малюнкі і фотаздымкі сувенірных вырабаў рознага прызначэння ёсць у спецыяльнай літаратуры і ў сетцы інтэрнэт. З аднаго боку, творчая тэхнічная і мастацкая дзейнасць вучняў, якая накіравана на распрацоўку і выкананне сувенірных вырабаў, павысіць іх цікавасць да заняткаў тэхнічнай працы. З другога боку, гэта дазволіць настаўніку і вучням удасканальваць распрацоўкі, якія ёсць, і набываць новыя ідэі для стварэння скразных вырабаў (у межах некалькіх раздзелаў), якія будуць арыгінальнымі выставачнымі

экспанатамі, дэкаратыўнымі і нестандартнымі аздабленнямі розных па прызначэнні памяшканняў, а таксама добрымі падарункамі.

Неабходныя тэарэтыка-практычныя звесткі па *асновах тэхнічнай графікі* ўключаны ў змест усіх раздзелаў праграмы ў адпаведнасці са спецыфікай і логікай вывучаемага тэарэтычнага матэрыялу і выканання графічных і практычных работ.

Асноўнай мэтай вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» з'яўляецца фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый; развіццё агульнапрацоўных і канструктарска-тэхналагічных ведаў, уменняў і навыкаў; засваенне спосабаў апрацоўкі матэрыялаў; авалоданне відамі тэхнічнай і мастацкай творчасці; творчае развіццё і прафесійнае самавызначэнне вучняў.

Рэалізацыя гэтай мэты прадугледжвае вырашэнне **навучальных, развіццёвых** і **выхаваўчых задач**:

фарміраванне тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў работы ў розных сферах працоўнай дзейнасці; асноў графічнай і тэхналагічнай граматнасці; навыкаў бяспечных прыёмаў працы;

фарміраванне каштоўнасна-сэнсавых, агульнакультурных, вучэбна-пазнавальных, інфармацыйных, камунікатыўных, сацыяльна-працоўных кампетэнцый і кампетэнцый асобаснага самаўдасканалення ў рэпрадуктыўнай і творчай працоўнай дзейнасці;

развіццё творчых, канструктарскіх здольнасцей і пазнавальных інтарэсаў, тэхнічнага і мастацкага мыслення, камунікатыўных уменняў, эстэтычнага густу ў працэсе выканання розных відаў дзейнасці;

выхаванне працавітасці, культуры працы, калектывізму, ініцыятыўнасці і самастойнасці, культуры паводзін і адносін, павагі да майстэрства; фарміраванне каштоўнасных адносін да народнай творчасці.

Паведамленне тэарэтычных звестак праводзіцца ў працэсе тлумачэння новага матэрыялу і ў парадку інструктавання вучняў да выканання практычных работ. На ўсё гэта павінна адводзіцца не больш за 20–30 % вучэбнага часу на працягу ўсяго навучальнага года (табл. 3). Суадносіны тэорыі і практыкі на вучэбных занятках могуць рэгулявацца настаўнікам у працэсе адбору зместу, а таксама педагагічна граматнага і дыдактычна апраўданага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання вучняў тэхнічнай працы.

Усе віды вучэбных заняткаў па тэхнічнай працы носяць у асноўным практыка-арыентаваны характар. Праграмай прадугледжаны практычныя заданні ў выглядзе графічных, лабараторных і практычных работ, а таксама прыкладны пералік вырабаў, як для індывідуальных, так і для групавых практычных работ. Пералік вырабаў удакладняецца ў кожнай установе агульнай сярэдняй адукацыі з улікам мясцовых магчымасцей і патрэбнасцей.

Пры вывучэнні зместавай лініі «Тэхнічная і мастацкая творчасць» з мэтай аптымізацыі выкарыстання вучэбнага часу прадугледжаны групавыя практычныя работы, якія накіраваны на павышэнне эфектыўнасці выканання складаных вучэбных заданняў, узаемадапамогу, ацэнку ўкладу кожнага вучня і ўсёй групы ў цэлым.

З улікам працэсуальнага і выніковага аспектаў дзейнасці вучняў адзнака за практычныя работы павінна выстаўляцца па наступных крытэрыях: арганізацыя вучэбнага месца; выкананне правілаў бяспекі працы; рацыянальнасць прымянення інструментаў, прыстасаванняў і абсталявання; правільнасць выканання тэхналагічных аперацый; узровень самастойнасці і творчы падыход у працэсе выканання практычнай работы; час, затрачаны на выкананне практычнай работы; адпаведнасць вырабу (загатоўкі) чарцяжу.

З мэтай павышэння эфектыўнасці правядзення як тэарэтычных, так і практычных заняткаў па тэхнічнай працы настаўнік можа вылучыць да 15 % вучэбнага часу ў якасці рэзервовага за кошт частковага змянення колькасці гадзін і паслядоўнасці падачы матэрыялу па вызначаных тэмах (у межах асобнага раздзела вучэбнай праграмы) з улікам мясцовых умоў і стану матэрыяльна-тэхнічнай базы вучэбных майстэрняў.

Пры вывучэнні зместавай лініі «Тэхнічная і мастацкая творчасць» лепшыя вучні ўключаюцца ў творчае праектаванне. Дадзеная дзейнасць накіравана на актыўнае ўзаемадзеянне настаўніка тэхнічнай працы з найбольш падрыхтаванымі вучнямі з мэтай

стварэння творчых праектаў. Работа над выкананнем творчых праектаў можа праводзіцца на ўроках і ў пазаўрочны час пры ўмове абавязковага засваення вучнямі ўсёй вучэбнай праграмы.

Галоўную ўвагу ў працэсе працоўнага навучання трэба звярнуць на выкананне вучнямі правілаў бяспекі працы, проціпажарнай бяспекі і санітарна-гігіенічных умоў працы ў вучэбных майстэрнях. Практычныя работы, якія патрабуюць выкарыстання вучэбнага станочнага абсталявання, прадугледжваюцца толькі пры ўмове абавязковага кантролю настаўнікам тэхнічнай працы. Яму дастаткова мець працоўны разрад па механічнай апрацоўцы драўніны і металаў, які дае права працаваць на вучэбным станочным абсталяванні, а таксама вучыць вучняў прыёмам работы на вучэбных станках.

Спраўнасць інструментаў, прыстасаванняў і вучэбнага абсталявання ў вучэбных майстэрнях вызначаецца адпаведнымі нарматыўнымі патрабаваннямі па ахове працы, якія вызначаюць бяспечныя ўмовы працоўнага навучання вучняў і працы настаўніка.

Табліца 3

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
(1 гадзіна на тыдзень)

Назва зместавых ліній, раздзелаў і тэм										Гімназія	Установа агульнай сярэдняй адукацыі
Апрацоўка канструкцыйных матэрыялаў		**Тэхнічная і мастацкая творчасць**									
		тэхнічная творчасць				мастацкая апрацоўка матэрыялаў					
		пачатковае мадэліраванне		пачатковае канструяванне		выпальванне па драўніне		аплікацыя з саломкі			
апрацоўка драўніны	апрацоўка металаў	інварыянтная частка	варыятыўная частка	інварыянтная частка	варыятыўная частка	інварыянтная частка	варыятыўная частка	інварыянтная частка	варыятыўная частка		
10	4	**2**	6	**2**	6	**2**	7	**2**	7		
УСЯГО											
10	**4**	**10**				**11**				**35**	**35**

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(35 гадзін, 1 гадзіна на тыдзень)

АПРАЦОЎКА КАНСТРУКЦЫЙНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ
(14 гадзін)

Апрацоўка драўніны (10 гадзін)

Вымярэнне. Разметка (лінейка, вугольнік, шаблон). Пілаванне. Зборка дэталей з драўніны на цвіках. Аддзелка драўніны

Майстэрня для апрацоўкі драўніны. Вучэбнае месца для ручной апрацоўкі піламатэрыялаў і фанеры. Правілы бяспекі працы.

Паняцце пра дрэва і драўніну. Будова дрэва.

Агульныя звесткі пра дрэваапрацоўчую прамысловасць, піламатэрыялы (дошка, брусок, рэйка), ліставыя драўняныя матэрыялы (шпон, фанера). Элементы піламатэрыялаў: пласць, кант, тарэц, руб. Паняцце пра матэрыял, загатоўку і выраб. Паняцце пра прыпуск. Віды вырабаў: дэталь і зборачная адзінка. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Графічная дакументацыя на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры. Паняцце пра эскіз, чарцёж і тэхнічны рысунак. Паняцце пра маштаб. Лініі чарцяжа. Памерны лік. Габарытныя памеры. Чытанне чарцяжоў. Агульныя звесткі пра афармленне чарцяжа. Інструменты, прылады і матэрыялы.

Тэхналагічная дакументацыя на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры. Агульнае паняцце пра тэхналагічны працэс. Паняцце пра тэхналагічную аперацыю і тэхналагічную карту. Паняцце пра інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для апрацоўкі драўніны. Чытанне тэхналагічных карт на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры.

Тэхналогія выканання тэхналагічных аперацый з выкарыстаннем піламатэрыялаў таўшчынёй да 30 мм і фанеры таўшчынёй да 5 мм. Віды тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з драўніны, разметка загатовак з драўніны (пры дапамозе лінейкі, вугольніка, шаблону), пілаванне драўніны, зборка дэталей з драўніны на цвіках, аддзелка драўніны. Віды цвікоў. Агульныя звесткі пра аддзелку драўніны. Інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для ручной апрацоўкі драўніны. Якасць выканання тэхналагічных аперацый. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі ў дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Графічная работа. Чытанне графічнай дакументацыі на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры.

Лабараторныя работы. Азнаямленне з піламатэрыяламі і фанерай. Вызначэнне прыпуску на апрацоўку.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для ручной апрацоўкі піламатэрыялаў і фанеры. Чытанне тэхналагічных карт на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры. Выбар загатовак з піламатэрыялаў і фанеры з прыпускам на апрацоўку. Выкананне тэхналагічных аперацый з выкарыстаннем піламатэрыялаў таўшчынёй да 30 мм і фанеры таўшчынёй да 5 мм: вымярэнне загатовак з драўніны; разметка загатовак з драўніны з дапамогай лінейкі, вугольніка і шаблону; пілаванне драўніны; зборка дэталей з драўніны на цвіках; аддзелка драўніны. Праверка якасці выканання тэхналагічных аперацый з піламатэрыялаў і фанеры.

Апрацоўка металаў (4 гадзіны)

Вымярэнне. Праўка. Разметка. Рэзка металаў (дроту) кусачкамі. Гібка. Зборка дэталей з дроту

Майстэрня для апрацоўкі металаў. Вучэбнае месца для ручной апрацоўкі дроту. Правілы бяспекі працы.

Агульныя звесткі пра металаапрацоўчую прамысловасць. Паняцце пра металы, іх атрыманне і прымяненне. Дрот. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Графічная і тэхналагічная дакументацыя на выкананне простых вырабаў з дроту. Чытанне чарцяжоў, тэхналагічных карт.

Тэхналогія выканання тэхналагічных аперацый з выкарыстаннем мяккага дроту. Віды тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з металаў, праўка металаў, разметка загатовак з металаў, рэзка металаў (дроту) кусачкамі, гібка металаў, зборка дэталей з дроту. Інструменты і прыстасаванні для ручной апрацоўкі металаў. Якасць выканання тэхналагічных аперацый. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі ў металаапрацоўчай прамысловасці.

Графічная работа. Чытанне графічнай дакументацыі на выкананне простых вырабаў з дроту.

Лабараторная работа. Вывучэнне ўласцівасцей дроту.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для ручной апрацоўкі дроту. Чытанне тэхналагічных карт на выкананне простых вырабаў з дроту. Выбар загатовак з дроту з прыпускам на апрацоўку. Выкананне тэхналагічных аперацый з выкарыстаннем мяккага дроту: вымярэнне загатовак з металаў, праўка металаў, разметка загатовак з металаў, рэзка металаў (дроту) кусачкамі, гібка металаў, зборка дэталей з дроту. Праверка якасці выканання тэхналагічных аперацый з дроту.

ТЭХНІЧНАЯ І МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ (21 гадзіна)

Тэхнічная творчасць (10 гадзін)

Пачатковае мадэліраванне (8 гадзін)

Мадэліраванне. Мадэль. Віды мадэлей.

Графічная і тэхналагічная дакументацыя на выраб простых мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Паняцце пра маршрутную карту. Чытанне чарцяжоў і тэхнічных рысункаў простых мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Чытанне простых маршрутных карт на выраб мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Вучэбнае месца для пачатковага мадэліравання. Тэхналогія пачатковага мадэліравання з плоскіх дэталей (папера, кардон, піламатэрыялы таўшчынёй да 30 мм, фанера таўшчынёй да 5 мм, мяккі дрот), дэталей канструктараў. Зборка мадэлей па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме. Інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для пачатковага мадэліравання. Якасць вырабаў. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі, якія звязаны з мадэліраваннем.

Творчае праектаванне. Творчы праект.

Графічныя работы. Чытанне чарцяжоў і тэхнічных рысункаў простых мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для пачатковага мадэліравання. Чытанне простых маршрутных і тэхналагічных карт для вырабу мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Выбар загатовак з паперы, кардону, піламатэрыялаў таўшчынёй да 30 мм, фанеры таўшчынёй да 5 мм, мяккага дроту з прыпускам на апрацоўку, дэталей канструктараў. Пачатковае мадэліраванне з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Зборка мадэлей па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме. Праверка якасці мадэлей.

Творчае праектаванне вырабаў па пачатковаму мадэліраванню.

Прыкладны пералік вырабаў. Простыя вырабы з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў; мадэлі-цацкі; мадэлі-сувеніры; мадэлі парашутаў, планёраў, самалётаў; плоскія паветраныя змеі; контурныя макеты і мадэлі аўтамабіляў і інш.

Пачатковае канструяванне (8 гадзін)

Канструяванне. Тэхнічнае канструяванне. Канструкцыя вырабу (устройства вырабу, віды злучэнняў дэталей вырабу і г.д.). Канструкцыйныя матэрыялы і іх віды.

Паняцце пра тыпавыя дэталі. Віды тыпавых дэталей. Злучэнні дэталей.

Мастацкае канструяванне. Кампазіцыя вырабу (форма вырабу, віды аздаблення дэталей вырабу і г.д.). Уласцівасці кампазіцыі вырабу: сіметрычнасць і асіметрычнасць (сіметрыя і асіметрыя), статычнасць і дынамічнасць (статыка і дынаміка).

Графічная і тэхналагічная дакументацыя на выкананне простых вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Вучэбнае месца для пачатковага канструявання. Тэхналогія пачатковага канструявання з плоскіх дэталей (папера, кардон, піламатэрыялы таўшчынёй да 30 мм, фанера таўшчынёй да 5 мм, мяккі дрот), дэталей канструктараў. Зборка вырабаў па ўзору, тэхнічным рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме. Інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для пачатковага канструявання. Якасць вырабаў. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі, якія звязаны з канструяваннем.

Графічныя работы. Чытанне эскізаў канструкцый і кампазіцый простых вырабаў; чарцяжоў і тэхнічных рысункаў простых вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў.

Лабараторныя работы. Азнаямленне з відамі тыпавых дэталей. Азнаямленне з відамі злучэнняў дэталей.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для пачатковага канструявання. Чытанне простых маршрутных і тэхналагічных карт на выкананне вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Выбар загатовак з паперы, кардона, піламатэрыялаў таўшчынёй да 30 мм, фанеры таўшчынёй да 5 мм, мяккага дроту з прыпускам на апрацоўку, дэталей канструктараў. Пачатковае тэхнічнае і мастацкае канструяванне з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў. Зборка вырабаў па ўзору, тэхнічным рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме. Праверка якасці вырабаў.

Творчае праектаванне вырабаў па пачатковаму канструяванню.

Прыкладны пералік вырабаў. Простыя вырабы з плоскіх дэталей (матэрыял: папера, кардон, драўніна, метал), дэталей канструктараў; сувенірныя вырабы і інш.

Мастацкая апрацоўка матэрыялаў (11 гадзін)

Выпальванне па драўніне (9 гадзін)

Агульныя звесткі пра мастацкую апрацоўку матэрыялаў. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Паняцце пра выпальванне па драўніне. Віды відарысаў: контурнае, святлоценявое, сілуэтнае. Паняцці: «фон», «контур», «сілуэт». Спосабы выпальвання: плоскае, глыбокае. Віды штрыхоўкі пры выпальванні: паралельныя, перасякальныя лініі, неперасякальныя адрэзкі, кропкі.

Графічная і тэхналагічная дакументацыя на выкананне вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры з элементамі выпальвання. Чытанне простых эскізаў і маршрутных карт на выпальванне па драўніне.

Вучэбнае месца для выпальвання па драўніне. Тэхналогія выпальвання па драўніне: падрыхтоўка паверхні загатоўкі да нанясення малюнка, перавод малюнка на загатоўку, выпальванне па драўніне, шліфаванне і аздабленне паверхні загатоўкі. Інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для выпальвання па драўніне. Прыбор для выпальвання, устройства і прынцып дзеяння. Якасць вырабаў. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі, якія звязаны з мастацкай апрацоўкай матэрыялаў.

Графічная работа. Чытанне простых эскізаў для выпальвання па драўніне.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для выпальвання па драўніне. Чытанне простых маршрутных карт на выкананне вырабаў з элементамі выпальвання па драўніне. Выбар загатовак з піламатэрыялаў таўшчынёй да 30 мм, фанеры таўшчынёй да 5 мм з прыпускам на апрацоўку. Выкананне выпальвання па драўніне: падрыхтоўка паверхні загатоўкі да нанясення малюнка, перавод малюнка на загатоўку, выпальванне па драўніне, шліфаванне і аздабленне паверхні загатоўкі. Праверка якасці вырабаў з фанеры.

Творчае праектаванне вырабаў з элементамі выпальвання па драўніне.

Прыкладны пералік вырабаў. Дэкаратыўныя вырабы, якія выкананы з элементамі выпальвання па драўніне з відарысам кветак, птушак, жывёл, паруснікаў; мастацка афармленыя наборы апрацоўчых дошак для кухні; сувеніры і інш.

Аплікацыя з саломкі (9 гадзін)

Агульныя звесткі пра мастацкую апрацоўку прыродных матэрыялаў. Прыродныя матэрыялы і іх віды. Саломка як прыродны матэрыял. Нарыхтоўка саломы культурных і дзікарослых раслін.

Паняцце пра аплікацыю з саломкі. Віды аплікацыі з саломкі. Падрыхтоўка саламяных стужак. Эканомнае выкарыстанне матэрыялаў.

Графічная і тэхналагічная дакументацыя на выкананне простых вырабаў з саломкі. Чытанне простых эскізаў і маршрутных карт для аплікацыі з саломкі.

Вучэбнае месца для аплікацыі з саломкі. Тэхналогія аплікацыі з саломкі: выбар і падрыхтоўка фону; перавод малюнка на фон, на паперу; падрыхтоўка саламяных стужак; наклейванне саламяных стужак на паперу; сушка саламяных стужак; вырэзванне дэталей малюнка з саламяных стужак; наклейванне дэталей малюнка на фон; сушка; аздабленне. Інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для аплікацыі з саломкі. Якасць вырабаў. Правілы бяспекі працы.

Прафесіі, якія звязаны з мастацкай апрацоўкай матэрыялаў.

Графічная работа. Чытанне простых эскізаў для аплікацыі з саломкі.

Практычныя работы. Арганізацыя вучэбнага месца для аплікацыі з саломкі. Чытанне простых маршрутных карт на выкананне вырабаў з элементамі аплікацыі з саломкі. Выбар загатовак з саломы з прыпускам на апрацоўку. Выкананне аплікацыі з саломкі: выбар і падрыхтоўка фону; перавод малюнка на фон, на паперу; падрыхтоўка саламяных стужак; наклейванне саламяных стужак на паперу; сушка саламяных стужак; вырэзванне дэталей малюнка з саламяных стужак; наклейванне дэталей малюнка на фон; сушка; аздабленне. Праверка якасці вырабаў з саломкі.

Творчае праектаванне вырабаў з элементамі аплікацыі з саломкі.

Прыкладны пералік вырабаў. Вырабы з элементамі аплікацыі з саломкі і з відарысам раслін, жывёл, птушак; дэкаратыўныя пано, мастацка аформленыя шкатулкі, сувенірныя вырабы і інш.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Патрабаванні да асобасных кампетэнцый:

адказныя адносіны вучняў да навучання, гатоўнасць і здольнасць да самарэалізацыі і самаадукацыі, самааналізу і самаацэнкі на аснове развітай матывацыі вучэбнай дзейнасці;

камунікатыўнасць у зносінах, вучэбна-тэхналагічнай і творчай дзейнасці, якая выражаецца ва ўменні ясна, дакладна, граматна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме; разумець і паважаць пазіцыю суразмоўцы, дасягаць узаемаразумення, супрацоўнічаць для дасягнення практычных вынікаў у вучэбных майстэрнях.

Патрабаванні да метапрадметных кампетэнцый:

здольнасць самастойна ставіць мэты ў вучэбна-тэхналагічнай і творчай дзейнасці; планіраваць, здзяйсняць, кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленымі графічнымі, тэхналагічнымі і канструктарскімі задачамі і ўмовамі іх выканання;

уменні знаходзіць неабходную інфармацыю ў розных крыніцах (даведачная і спецыяльная літаратура, інтэрнэт); прадстаўляць інфармацыю ў разнастайнай форме (таблічная, графічная і інш.).

Патрабаванні да прадметных кампетэнцый:

раздзел «Апрацоўка драўніны»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя правілы бяспекі працы ў майстэрні для апрацоўкі драўніны;

паняцці: «дрэва» і «драўніна»; будову дрэва;

агульныя звесткі пра дрэваапрацоўчую прамысловасць;

паняцці: «піламатэрыял» (дошка, брусок, рэйка) і «ліставы драўняны матэрыял» (шпон, фанера);

элементы піламатэрыялаў: пласць, кант, тарэц, руб;

паняцці: «матэрыял», «загатоўка», «выраб», «прыпуск»;

віды вырабаў: дэталь і зборачная адзінка;

графічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры;

паняцці: «эскіз», «чарцёж», «тэхнічны рысунак», «маштаб»;

лініі чарцяжа, памерны лік, габарытныя памеры;

агульныя звесткі пра афармленне чарцяжа;

інструменты, прылады і матэрыялы;

тэхналагічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры;

агульнае паняцце пра тэхналагічны працэс;

паняцці: «тэхналагічная аперацыя», «тэхналагічная карта», «інструмент», «прыстасаванне», «вучэбнае абсталяванне»;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для ручной апрацоўкі піламатэрыялаў і фанеры;

азначэнні і тэхналогіі выканання тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з драўніны, разметка загатовак з драўніны (пры дапамозе лінейкі, вугольніка, шаблону), пілаванне драўніны, зборка дэталей з драўніны на цвіках, аддзелка драўніны;

патрабаванні да якасці выканання тэхналагічных аперацый;

віды цвікоў;

агульныя звесткі пра аддзелку драўніны;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для ручной апрацоўкі драўніны; правілы бяспекі працы;

прафесіі ў дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Вучні павінны ў м е ц ь:

выконваць правілы бяспекі працы ў майстэрні для апрацоўкі драўніны;

адрозніваць паняцці «дрэва» і «драўніна»;

вызначаць часткі дрэва;

распазнаваць піламатэрыялы (дошка, брусок, рэйка) і ліставыя драўняныя матэрыялы (шпон, фанера);

выдзяляць асноўныя элементы піламатэрыялаў: пласць, кант, тарэц, руб;

адрозніваць паняцці: «матэрыял», «загатоўка», «выраб», «прыпуск»;

вызначаць віды вырабаў: дэталь і зборачная адзінка;

чытаць і афармляць графічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры;

чытаць тэхналагічныя карты на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры;

арганізоўваць вучэбнае месца для ручной апрацоўкі піламатэрыялаў і фанеры;

вызначаць прыпуск на апрацоўку;

выбіраць загатоўкі з піламатэрыялаў і фанеры з прыпускам на апрацоўку, эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

вызначаць і выконваць тэхналагічныя аперацыі: вымярэнне загатовак з драўніны, разметку загатовак з драўніны (пры дапамозе лінейкі, вугольніка, шаблону), пілаванне драўніны, зборку дэталей з драўніны на цвіках, аддзелку драўніны; правяраць якасць выканання тэхналагічных аперацый;

вызначаць віды цвікоў;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для ручной апрацоўкі драўніны; выконваць правілы бяспекі працы.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для ручной апрацоўкі піламатэрыялаў і фанеры;

прыёмамі выканання тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з драўніны, разметка загатовак з драўніны (пры дапамозе лінейкі, вугольніка, шаблону), пілаванне драўніны, зборка дэталей з драўніны на цвіках, аддзелка драўніны;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для ручной апрацоўкі драўніны;

навыкамі распазнавання піламатэрыялаў (дошка, брусок, рэйка), ліставых драўняных матэрыялаў (шпон, фанера) і выбара загатоўкі з драўніны з прыпускам на апрацоўку;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай дакументацыі на выкананне простых вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры.

Раздзел «Апрацоўка металаў»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя правілы бяспекі працы ў майстэрні для апрацоўкі металаў;

агульныя звесткі пра металаапрацоўчую прамысловасць;

паняцці: «метал» і «дрот»;

працэсы атрымання і прымянення металу;

графічную і тэхналагічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з дроту;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для ручной апрацоўкі дроту;

азначэнні і тэхналогіі выканання тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з металаў, праўка металаў, разметка загатовак з металаў, рэзка металаў (дроту) кусачкамі, гібка металаў, зборка дэталей з дроту; патрабаванні да якасці выканання тэхналагічных аперацый;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для ручной апрацоўкі дроту; правілы бяспекі працы;

прафесіі ў металаапрацоўчай прамысловасці.

Вучні павінны ў м е ц ь:

выконваць агульныя правілы бяспекі працы ў майстэрні для апрацоўкі металаў;

адрозніваць паняцці «метал» і «дрот»;

чытаць і афармляць графічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з дроту;

чытаць тэхналагічныя карты на выкананне простых вырабаў з дроту;

арганізоўваць вучэбнае месца для ручной апрацоўкі дроту;

выбіраць загатоўкі з дроту з прыпускам на апрацоўку, эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

вызначаць і выконваць тэхналагічныя аперацыі: вымярэнне загатовак з металаў, праўку металаў, разметку загатовак з металаў, рэзку металаў (дроту) кусачкамі, гібку металаў, зборку дэталей з дроту;

правяраць якасць выканання тэхналагічных аперацый;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для ручной апрацоўкі дроту; выконваць правілы бяспекі працы.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для ручной апрацоўкі металаў;

прыёмамі выканання тэхналагічных аперацый: вымярэнне загатовак з металаў, праўкі металаў, разметкі загатовак з металаў, рэзкі металаў (дроту) кусачкамі, гібкі металаў, зборкі дэталей з дроту;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для ручной апрацоўкі дроту;

навыкамі выбару загатоўкі з дроту з прыпускам на апрацоўку;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай і тэхналагічнай дакументацыі на выкананне простых вырабаў з дроту.

Тэма «Пачатковае мадэліраванне»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя звесткі пра мадэліраванне, паняцце «мадэль», віды мадэлей;

графічную і тэхналагічную дакументацыю на выраб мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

паняцце «маршрутная карта»;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для пачатковага мадэліравання;

тэхналогію пачатковага мадэліравання з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў; зборку мадэлей па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

патрабаванні да якасці мадэлей;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для пачатковага мадэліравання; правілы бяспекі працы;

прафесіі, якія звязаны з мадэліраваннем.

Вучні павінны ў м е ц ь:

адрозніваць паняцці: «мадэль», «выраб», распазнаваць віды мадэлей;

чытаць чарцяжы і тэхнічныя рысункі мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

адрозніваць паняцці: «маршрутная карта», «тэхналагічная карта»;

чытаць простыя маршрутныя і тэхналагічныя карты на выраб мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

арганізоўваць вучэбнае месца для пачатковага мадэліравання;

выбіраць загатоўкі з прыпускам на апрацоўку, дэталі канструктараў; эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

вырабляць мадэлі з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў; збіраць мадэлі па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

правяраць якасць мадэлей;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для пачатковага мадэліравання; выконваць правілы бяспекі працы;

ажыццяўляць творчае праектаванне вырабаў па пачатковым мадэліраванні.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для пачатковага мадэліравання;

спосабамі вырабу мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

прыёмамі збору мадэлей па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для пачатковага мадэліравання;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай і тэхналагічнай дакументацыі на выкананне мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў.

Тэма «Пачатковае канструяванне»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя звесткі пра канструяванне (тэхнічнае і мастацкае); паняцце «канструкцыя вырабу», віды канструкцыйных матэрыялаў;

паняцце «тыпавая дэталь», віды тыпавых дэталей, злучэнні дэталей;

агульныя звесткі пра мастацкае канструяванне;

паняцце «кампазіцыя вырабу»; уласцівасці кампазіцыі вырабу: сіметрычнасць і асіметрычнасць, статычнасць і дынамічнасць;

графічную і тэхналагічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для пачатковага канструявання;

тэхналогію выканання простых вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў; зборку вырабаў па ўзору, тэхнічным рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

патрабаванні да якасці вырабаў;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для пачатковага канструявання; правілы бяспекі працы;

прафесіі, якія звязаны з канструяваннем.

Вучні павінны ў м е ц ь:

адрозніваць паняцці: «канструкцыя вырабу», «тыпавая дэталь»;

вызначаць віды канструкцыйных матэрыялаў, тыпавых дэталей, злучэнні дэталей;

вызначаць паняцце «кампазіцыя вырабу»;

адрозніваць і выкарыстоўваць уласцівасці кампазіцыі вырабу: сіметрычнасць і асіметрычнасць, статычнасць і дынамічнасць;

чытаць эскізы канструкцый і кампазіцый простых вырабаў; чарцяжы і тэхнічныя рысункі простых вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

чытаць простыя маршрутныя і тэхналагічныя карты на выкананне вырабаў з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

арганізоўваць вучэбнае месца для пачатковага тэхнічнага і мастацкага канструявання з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

выбіраць загатоўкі з прыпускам на апрацоўку, дэталі канструктараў; эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

выконваць простыя вырабы з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў; збіраць вырабы па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

правяраць якасць вырабаў;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для пачатковага канструявання; выконваць правілы бяспекі працы;

ажыццяўляць творчае праектаванне вырабаў па пачатковым канструяванні.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для пачатковага канструявання;

спосабамі вырабу мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў;

прыёмамі збору мадэлей па ўзору, тэхнічнаму рысунку, чарцяжы, слоўнаму апісанню і па ўласнай задуме;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для пачатковага тэхнічнага і мастацкага канструявання;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай і тэхналагічнай дакументацыі на выкананне мадэлей з плоскіх дэталей, дэталей канструктараў.

Тэма «Выпальванне па драўніне»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя звесткі пра мастацкую апрацоўку матэрыялаў;

паняцце «выпальванне па драўніне»; віды відарысаў: контурнае, святлоценявое, сілуэтнае; паняцці: «фон», «контур», «сілуэт»; спосабы выпальвання: плоскае, глыбокае; віды штрыхоўкі пры выпальванні: паралельныя, перасякальныя лініі, неперасякальныя адрэзкі, кропкі;

графічную і тэхналагічную дакументацыю на выкананне вырабаў з піламатэрыялаў і фанеры з элементамі выпальвання;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для выпальвання па драўніне;

тэхналогію выпальвання па драўніне: падрыхтоўку паверхні загатоўкі да нанясення малюнка, перавод малюнка на загатоўку, выпальванне па драўніне, шліфаванне і аздабленне паверхні загатоўкі;

патрабаванні да якасці вырабаў;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для выпальвання па драўніне; прыбор для выпальвання, устройства і прынцып дзеяння; правілы бяспекі працы;

прафесіі, якія звязаны з мастацкай апрацоўкай матэрыялаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

раскрываць паняцце «выпальванне па драўніне»;

распазнаваць віды відарысаў: контурнае, святлоценявое, сілуэтнае; вызначаць спосабы выпальвання: плоскае, глыбокае; выбіраць віды штрыхоўкі пры выпальванні: паралельнымі, перасякальнымі лініямі, неперасякальнымі адрэзкамі, кропкамі;

чытаць простыя эскізы і маршрутныя карты для выпальвання па драўніне;

арганізоўваць вучэбнае месца для выпальвання па драўніне;

выбіраць загатоўкі з піламатэрыялаў і фанеры з прыпускам на апрацоўку; эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

выконваць выпальванне па драўніне: падрыхтоўваць паверхню загатоўкі да нанясення малюнка, пераводзіць малюнак на загатоўку, выпальваць па драўніне, шліфаваць і аздабляць паверхню загатоўкі; правяраць якасць вырабаў;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для выпальвання па драўніне; выконваць правілы бяспекі працы;

ажыццяўляць творчае праектаванне вырабаў з элементамі выпальвання па драўніне.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для выпальвання па драўніне;

спосабамі выпальвання па драўніне;

прыёмамі выпальвання па драўніне: падрыхтоўваць паверхню загатоўкі да нанясення малюнка, пераводзіць малюнак на загатоўку, выпальваць па драўніне, шліфаваць і аздабляць паверхню загатоўкі; правяраць якасць вырабаў;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для выпальвання па драўніне;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай і тэхналагічнай дакументацыі для выпальвання па драўніне.

Тэма «Аплікацыя з саломкі»

Вучні павінны в е д а ц ь:

агульныя звесткі пра мастацкую апрацоўку прыродных матэрыялаў; віды прыродных матэрыялаў;

саломку як прыродны матэрыял; паняцце «аплікацыя з саломкі»; віды аплікацыі з саломкі; тэхналогію падрыхтоўкі саламяных стужак;

графічную і тэхналагічную дакументацыю на выкананне простых вырабаў з саломкі;

парадак арганізацыі вучэбнага месца для аплікацыі з саломкі;

тэхналогію аплікацыі з саломкі: выбар і падрыхтоўка фону; перавод малюнка на фон, на паперу; падрыхтоўка саламяных стужак; наклейванне саламяных стужак на паперу; сушка саламяных стужак; вырэзванне дэталей малюнка з саламяных стужак; наклейванне дэталей малюнка на фон; сушка; аздабленне;

патрабаванні да якасці вырабаў;

інструменты, прыстасаванні і вучэбнае абсталяванне для аплікацыі з саломкі; правілы бяспекі працы;

прафесіі, якія звязаны з мастацкай апрацоўкай матэрыялаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

адрозніваць віды прыродных матэрыялаў;

нарыхтоўваць салому культурных і дзікарослых раслін;

раскрываць паняцце «аплікацыя з саломкі»;

распазнаваць віды аплікацыі з саломкі; выконваць падрыхтоўку саламяных стужак;

чытаць простыя эскізы і маршрутныя карты на вырабы з элементамі аплікацыі з саломкі;

арганізоўваць вучэбнае месца для аплікацыі з саломкі;

выбіраць загатоўкі з саломы з прыпускам на апрацоўку; эканомна выкарыстоўваць матэрыял;

выконваць аплікацыю з саломкі: выбіраць і падрыхтоўваць фон; пераводзіць малюнак на фон, на паперу; падрыхтоўваць саламяныя стужкі; наклейваць саламяныя

стужкі на паперу; сушыць саламяныя стужкі; вырэзваць дэталі малюнка з саламяных стужак; наклейваць дэталі малюнка на фон; сушыць; аздабляць; правяраць якасць вырабаў;

карыстацца інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для аплікацыі з саломкі; выконваць правілы бяспекі працы;

ажыццяўляць творчае праектаванне вырабаў з элементамі аплікацыі з саломкі.

Вучні павінны в а л о д а ц ь:

навыкамі арганізацыі вучэбнага месца для аплікацыі з саломкі;

спосабамі аплікацыі з саломкі;

прыёмамі аплікацыі з саломкі: выбіраць і падрыхтоўваць фон; пераводзіць малюнак на фон, на паперу; падрыхтоўваць саламяныя стужкі; наклейваць саламяныя стужкі на паперу; сушыць саламяныя стужкі; вырэзваць дэталі малюнка з саламяных стужак, наклейваць дэталі малюнка на фон; сушыць; аздабляць;

правіламі бяспечнай работы пры карыстанні інструментамі, прыстасаваннямі і вучэбным абсталяваннем для аплікацыі з саломкі;

прыёмамі чытання і афармлення графічнай і тэхналагічнай дакументацыі для аплікацыі з саломкі.

РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

Літаратура для настаўніка

Астрейко, С.Я. Ручная отделка изделий из древесины (с основами материаловедения) / С.Я. Астрейко. – Мозырь: МГПИ, 1996. – Вып. 1. – 34 с.; 2000. – Вып. 2. – 36 с.

Астрейко, С.Я. Задания для тематического контроля по техническому труду: 5–9 кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / С.Я. Астрейко [и др.]. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 104 с.

Акрабатычныя практыкаванні: групоўка са становішча лежачы на спіне; перакат назад з упору прысеўшы і перакат наперад у групоўцы; кулёк наперад, два кулькі наперад злітна; стойка на лапатках з сагнутымі і прамымі нагамі; паўшпагат і шпагат з апорай на рукі; мост нахілам назад з дапамогай (дзяўчынкі). Камбінацыя з вывучаных практыкаванняў*: два кулькі наперад у групоўцы, стойка на лапатках з прамымі нагамі, перакат наперад у групоўцы ва ўпор прысеўшы, скачок прагнуўшыся ў даскок.

Комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі з 5–6 практыкаванняў (па адным комплексе ў кожнай чвэрці).

Развіццё хуткасна-сілавых і каардынацыйных здольнасцей, сілы, гібкасці, вынослівасці, з акцэнтам на развіццё статычнай сілавой вынослівасці мышцаў-згібальнікаў рук, рухавасці ў тазабедраных суставах, дынамічнай сілы мышцаў-згібальнікаў рук; здольнасці захоўваць статычную раўнавагу на вузкай апоры.

Лыжныя гонкі

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках па лыжным гонкам. Падрыхтоўка лыжнага інвентару да заняткаў. Правілы пераходу да месца заняткаў і назад. Правілы папярэджання адмаражэнняў і траўмаў пры перамяшчэнні на лыжах.

Практычны матэрыял

Перамяшчэнне на лыжах адначасовым бяскрокавым ходам*, папераменным двухкрокавым ходам*, адначасовым двухкрокавым ходам*; пад'ём наўскос «паўелачкай»*; тармажэнне «плугам»*; павароты пераступаннем; бег на лыжах 1 км*.

Развіццё каардынацыйных здольнасцей, агульнай (аэробнай) вынослівасці.

Спартыўныя гульні

(вывучаюцца элементы дзвюх з чатырох спартыўных гульняў)

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках спартыўных гульняў. Падрыхтоўка інвентару, адзення і абутку да заняткаў спартыўнымі гульнямі. Правілы пераходу да месца заняткаў спартыўнымі гульнямі і назад. Правілы спаборніцтваў па спартыўных гульнях.

Практычны матэрыял

Баскетбол: стойка іграка, перамяшчэнне, спыненне скачком; лоўля і перадача мяча дзвюма рукамі ад грудзей з месца і ў руху*; вядзенне мяча правай і левай рукой*; кідок мяча па кальцу адной рукой з месца*. Прымяненне вывучаных прыёмаў ва ўмовах спартыўнай гульні.

Футбол: перамяшчэнне скрыжаваным і прыстаўным крокамі; удары па нерухомым мячы і мячы, які коціцца, унутраным бокам ступні і пярэдняй часткай пад'ёму ступні*; спыненне мяча, які коціцца. Прымяненне вывучаных прыёмаў ва ўмовах спартыўнай гульні.

Гандбол: стойка іграка, перамяшчэнне, спыненне двума крокамі; лоўля мяча дзвюма рукамі і перадача адной і дзвюма рукамі на месцы*; вядзенне мяча*; кідок па варотах адной рукой зверху*. Прымяненне вывучаных прыёмаў ва ўмовах спартыўнай гульні.

Валейбол: стойка іграка, перамяшчэнні; прыём і перадача мяча знізу дзвюма рукамі*; ніжняя прамая падача*. Прымяненне вывучаных прыёмаў ва ўмовах спартыўнай гульні.

Развіццё частаты рухаў нагамі і здольнасці за кароткі час набіраць хуткасць; здольнасці праяўляць хуткасна-сілавыя якасці ва ўмовах змянення напрамку руху пры дэфіцыце часу і прасторы; аэробнай вынослівасці.

Тэсціраванне ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў

Выкананне тэставых практыкаванняў плануецца настаўнікам на пачатак і заканчэнне навучальнага года. На працягу аднаго ўрока не рэкамендуецца выкарыстоўваць больш за два тэставыя практыкаванні.

Вынікі тэставых практыкаванняў (табл. 2, 3) выкарыстоўваюцца для вызначэння ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў, планавання і карэкціроўкі зместу паўрочнага каляндарна-тэматычнага плана, распрацоўкі планаў-канспектаў урокаў.

Умовы выканання тэставых практыкаванняў прадстаўлены ў дадатку 2.

Пералік тэставых практыкаванняў:

1) нахіл уперад са становішча седзячы на падлозе **або** нахіл уперад са становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы;

2) падцягванне на перакладзіне **або** згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (хлопчыкі); падыманне тулава са становішча лежачы на спіне за 1 мін **або** падыманне і апусканне прамых ног за 1 мін (дзяўчынкі);

3) бег 30 м;

4) чаўночны бег 4 х 9 м **або** скокі праз кароткую скакалку за 1 мін;

5) скачок у даўжыню з месца **або** трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі (хлопчыкі); кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку (дзяўчынкі);

6) бег 1000 м, **або** хадзьба 2000 м (хлопчыкі), 1500 м (дзяўчынкі), **або** 6-мінутны бег.

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ

Плаванне

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспечных паводзін вучняў у басейне. Падрыхтоўка купальных прыналежнасцей да заняткаў плаваннем. Правілы асабістай і грамадскай гігіены пры наведванні басейна. Правілы бяспечнага купання ў адкрытых вадаёмах.

Спосабы спартыўнага плавання. Уплыў заняткаў плаваннем на здароўе вучняў. Загартоўваючы эфект плавання. Паняцце каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей. Самакантроль падчас заняткаў плаваннем.

Лепшыя плыўцы свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Практыкаванні на сушы: актыўныя і пасіўныя практыкаванні для развіцця рухомасці ступні, плечавых, тазабедраных і галёнкаступнёвых суставаў, сілавой вынослівасці мышцаў рук, ног, брушнога прэса, спіны. Імітацыйныя практыкаванні для развіцця каардынацыі рухаў рук і ног пры плаванні абраным стылем. Спецыяльныя практыкаванні для адпрацоўкі павароту.

Практыкаванні ў вадзе: практыкаванні для фарміравання тэхнікі рухаў ног, рук і дыхання пры плаванні абраным стылем; плаванне ў поўнай каардынацыі абраным стылем; практыкаванні для адпрацоўкі паваротаў пры плаванні абраным стылем; практыкаванні для адпрацоўкі тэхнікі старту; праплыванне да 100 м любым спартыўным спосабам.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на грудзях»: імітацыя грабка рукамі на сушы; плаванне з дошкай на нагах; плаванне на руках; узгадненне рухаў рук, ног і дыхання; з зыходнага становішча лежачы на грудзях, рукі ўверсе – праплыванне адрэзкаў 5–6 м з выкананнем грабка толькі левай рукой, толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі з выкарыстаннем для падтрымкі ног дошкі, надзіманага круга і да т.п.; тое ж, але з актыўным рухам ног і поўным цыклам дыхання. Плаванне спосабам «кроль на грудзях» у поўнай каардынацыі дыхання з работай рук і ног. Плаванне на дыстанцыі 25 м без уліку часу.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на спіне»: імітацыя грабка рукамі на сушы; з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверсе – праплыванне адрэзкаў 5–6 м з выкананнем грабка толькі левай рукой, затым толькі правай рукой, папераменна дзвюма рукамі з выкарыстаннем для падтрымкі ног дошкі, надзіманага круга і да т.п.; тое ж, але з актыўнай работай ног і поўным цыклам дыхання. Плаванне спосабам «кроль на спіне» ў поўнай каардынацыі дыхання з работай рук і ног. Плаванне на дыстанцыі 25 м без уліку часу.

Скачкі ў ваду: скачкі ў ваду з борціка нагамі ўніз; спад галавой уніз са становішча седзячы на борціку і седзячы на тумбачцы; стартавы скачок у ваду з тумбачкі.

Развіццё хуткасных, хуткасна-сілавых, сілавых, каардынацыйных здольнасцей, гібкасці, вынослівасці з акцэнтам на развіццё аэробнай вынослівасці.

Аэробіка спартыўная

Тэарэтычныя звесткі

Аэробіка спартыўная – выкананне практыкаванняў у аэробным рэжыме пад музычнае суправаджэнне. Аздараўленчая і прафілактычная накіраванасць аэробікі. Аэробіка высокай і нізкай інтэнсіўнасці. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да месцаў заняткаў, да адзення вучняў, якія займаюцца. Збалансаванае харчаванне пры занятках

аэробікай. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, спартыўнага абсталявання і інвентару.

Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Практычны матэрыял

Разнавіднасці прыстаўнога кроку ў бок, асноўнага кроку, скрыжаванага кроку, крокаў ногі паасобку – ногі разам. Камбінацыя з засвоеных крокаў у спалучэнні з рухамі рукамі (рукі ў бакі, уверх, уперад, управа, улева, кругі рукамі, прадплеччамі, плячыма, згінанні і разгінанні рук).

Падскокі: ногу ўперад, у бок, назад; ногі паасобку – ногі разам; на месцы на дзвюх нагах у спалучэнні з рознымі рухамі рукамі; папераменна на левай, правай і на дзвюх нагах у спалучэнні з рознымі рухамі рукамі. Злучэнне падскокаў ногі паасобку – ногі разам з розным становішчам рук.

Пачарговае шматразовае падыманне каленяў. Пачарговае падыманне каленяў з падскокам.

Выпады ўперад, у бакі, з падскокамі.

Махі нагамі ўперад, у бакі, уперад і ў бакі з падскокамі.

Паўшпагат на правую нагу, на левую нагу. «Хвалі» з зыходнага становішча стоячы, седзячы на пятках на падлозе.

Павароты на 180° і 360° стоячы на адной назе, другая прыціснута да галенастопу.

Раўнавага: стоячы на насках, рукі ўгару; стоячы на адной назе, другую нагу ў бок, рукі ўверх або ў бакі. Трыманне раўнавагі пасля прызямлення, скокаў або падскокаў.

Комплекс не менш чым з шасці вывучаных практыкаванняў*.

Баскетбол

Тэарэтычныя звесткі

Баскетбол – алімпійскі від спорту. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку баскетбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні ігракоў у нападзенні і абароне. Абавязкі і правы ігракоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па баскетболе.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках баскетболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя баскетбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Высокая, сярэдняя і нізкая стойка баскетбаліста. Скачкі штуршком адной і дзвюма нагамі. Спыненне крокам і скачком. Павароты на месцы, развароты.

Перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей, дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча, на месцы і ў руху.

Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей, дзвюма рукамі пры паралельным і сустрэчным руху, у скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнем і паваротамі.

Спалучэнне прыёмаў «лоўля–перадача–паварот».

Вядзенне мяча са змяненнем вышыні адскоку і напрамку, з абвядзенне перашкод, па крузе; са спыненнем, паваротамі, перадачамі па сігнале.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей, адной рукой ад пляча, з адскокам і без адскоку ад шчыта, пад вуглом да шчыта ў руху, штрафныя кідкі.

Спалучэнне прыёмаў «перадача–лоўля–вядзенне–кідок».

Захоп мяча – вырыванне. Вырыванне і выбіванне мяча ў іграка, які спыніўся пасля вядзення. Накрыванне мяча. Перахоп мяча ў становішчы стоячы збоку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля. Перахоп перадачы, выкананай уздоўж пляцоўкі.

Тактычныя дзеянні іграка без мяча: выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, у бок ад партнёра з мячом.

Вызначэнне гульнявой сітуацыі, мэтазгоднай для прымянення вядзення, перадачы, кідка па кальцы. Выбар спосабу вядзення мяча і кідка па кальцы.

Прымяненне спалучэнняў вывучаных прыёмаў у гульнявых сітуацыях.

Гандбол

Тэарэтычныя звесткі

Гандбол – алімпійскі від спорту. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку гандбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні іракоў у нападзенні і абароне. Тактыка-тэхнічныя дзеянні варатара. Абавязкі і правы іракоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па гандболу.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках гандболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя гандбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Перамяшчэнне скрыжаваным, прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад. Спыненне адной і дзвюма нагамі. Бег з паскарэннем на кароткіх адрэзках, з выскокваннем і прызямленнем на адну і абедзве нагі. Скачок убок штуршком адной нагі. Падзенне на рукі, на бядро і тулава з месца і з разгону.

Лоўля мяча дзвюма рукамі збоку (без павароту тулава), стоячы на месцы, у руху, у скачку. Лоўля мяча адной рукой з захопам і без захопу. Лоўля мяча на вялікай хуткасці перамяшчэння, у скачку пры непасрэднай блізкасці абаронцы.

Перадачы мяча адной рукой (хлёстам, штуршком, кісцевая) на блізкую адлегласць ва ўсіх напрамках з месца, з разгону ў адзін, два і тры крокі, у скачку, пасля спынення, пасля лоўлі мяча з паўадскоку, пасля лоўлі ў непасрэднай блізкасці абаронцы. Перадача мяча адной і дзвюма рукамі ў адно дакрананне. Дальняя перадача адной рукой хлёстам партнёру ў руху.

Вядзенне мяча аднаўдарнае без зрокавага кантролю, шматударнае на высокай хуткасці перамяшчэння з праследаваннем. Вядзенне на вялікай хуткасці з рэзкім спыненнем і змяненнем напрамку руху, з паваротам кругом.

Кідкі мяча па варотах адной рукой хлёстам зверху і збоку, з нахілам тулава ўлева і ўправа, у апорным становішчы, у скачку, з рознымі спосабамі бегу, з рознай траекторыяй (гарызантальнай, сыходзячай, узыходзячай, навеснай) палёту мяча, з далёкай і блізкай адлегласці.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку кідка; узаемадзеянне іракоў другой лініі для завяршэння атакі, узаемадзеянне з лінейным іраком, з крайнім іраком, узаемадзеянне крайняга іграка з лінейным. Камандныя дзеянні: пазіцыйнае нападзенне па сістэме расстаноўкі 4:2, нападзенне 6:0 з выхадам.

Тактыка абароны: зонная абарона па сістэме расстаноўкі 3:3, абарона ў меншасці 5:6 і 4:6.

Тактыка гульні варатара: выбар пазіцыі ў варотах і ў зоне варатара, стойкі варатара, узаемадзеянне варатара з абаронцамі і нападаючымі.

Выкарыстанне вывучаных прыёмаў у вучэбнай гульні.

Валейбол

Тэарэтычныя звесткі

Валейбол – алімпійскі від спорту, яго разнавіднасці: валейбол, валейбол пляжны. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку валейбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні ігракоў у абароне і нападзенні. Расстаноўка ігракоў, гульня «лібера». Абавязкі і правы ігракоў і суддзяў. Судзейства гульні ў валейбол. Правілы спаборніцтваў па валейболу.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках валейболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя валейбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Перамяшчэнне прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад, з выскокваннямі і прызямленнем на абедзве нагі. Скачок уверх штуршком адной і дзвюма нагамі.

Шматразовыя перадачы мяча зверху і знізу дзвюма рукамі над сабой, з адскокам ад сценкі, у парах і тройках, з пераменай месцаў, цераз сетку ў становішчы стоячы на месцы.

Прыём мяча знізу дзвюма рукамі пасля падачы. Прыём мяча, які адскочыў ад сеткі. Гульня нагой і іншымі часткамі цела.

Атакуючы ўдар у скачку штуршком дзвюма нагамі з зоны 2, 3 і 4.

Ніжняя прамая падача з пападаннем у зоны 1, 5 і 6.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, падманныя перадачы, выбар напрамку перадачы; узаемадзеянні ігракоў першай і другой лініі для заканчэння атакі.

Тактыка абароны: узаемастрахоўка свабодных зон, выкарыстанне ў гульні «лібера».

Выкарыстанне вывучаных прыёмаў у вучэбнай гульні.

Футбол

Тэарэтычныя звесткі

Футбол – алімпійскі від спорту, яго разнавіднасці: футбол, міні-футбол, футбол у залах. Гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку футбаліста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Тактыка-тэхнічныя дзеянні ігракоў у нападзенні, паўабароне, абароне. Тактыка-тэхнічныя дзеянні варатара. Абавязкі і правы ігракоў і суддзяў. Правілы спаборніцтваў па футболу.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках футболам. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя футбалісты свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Агульнаразвіццёвыя і спецыяльныя гульнявыя практыкаванні і эстафеты з футбольным мячом, рухавыя гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гібкасці, хуткасці з вядзеннем мяча, з абвядзеннем стоек, з прыёмам і прыпыненнем мяча, з ударамі па варотах, у «лабірынт» (з мячом і без мяча), на збліжэнне з сапернікам, з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, з абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), шматпланавыя гульні. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы, удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом; гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гульнявой

вынослівасці, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча; фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні; спрошчаныя гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 ігракоў, гульні для каманд з 7 чалавек; тэсты на гульнявыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалавек з улікам падзелу поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагой па нерухомым мячы і мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском. Практыкаванні ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак: «вядзенне–перадача», «прыём–перадача», «прыём–вядзенне–перадача».

Удары на далёкасць і дакладнасць; абвядзенне–адбор мяча, абвядзенне–адбор–удар у вароты; перахоп мяча; гульня галавой; камбінацыі ў тройках з мячом; дзеянні без мяча (адкрыванне, адцягненне, стварэнне колькаснай перавагі); узаемадзеянне двух нападаючых супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападаючага; гульнявыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т.п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцей, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў. Гульні з бегам, скачкамі, перадачамі мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнявой вынослівасці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннямі, рыўкамі, скачкамі), хуткасна-сілавых якасцей, сілы.

Тэніс настольны

Тэарэтычныя звесткі

Тэніс настольны – алімпійскі від спорту. Тэніс настольны ў адзінай спартыўнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь. Патрабаванні бяспекі да месцаў заняткаў, абсталявання і інвентару. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку тэнісіста. Трэніровачны рэжым. Харчаванне спартсмена. Відазмяненне тэхнікі гульні ў настольны тэніс. Удасканаленне абсталявання і інвентару. Правілы гульні. Абавязкі і правы ігракоў і суддзяў.

Урачэбны кантроль і самакантроль на занятках тэнісам настольным. Прафілактыка траўматызму. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Лепшыя спартсмены свету, Еўропы, Рэспублікі Беларусь і іх дасягненні.

Практычны матэрыял

Бег: 10, 30, 60 м, з паскарэннем; чаўночны бег 4 х 9 м, 6 х 20 м, 10 х 5 м; вар'іраванне звычайнага бегу з бегам спінай уперад; з максімальнай хуткасцю 5 х 30 м, 10 х 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 мін.

Скачкі трайныя і пяцярныя з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180° у розныя бакі. Паскарэнні пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок са спружыністымі прысяданнямі. Пераскокванне праз гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем бёдраў («кенгуру»).

Прысяданні па чарзе на правай і левай назе.

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні захопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока–нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, аб сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, з перакладваннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя ўдараў: з ракеткай і без ракеткі з абцяжарвальнікам у руцэ; адзіночных, серыйных удараў з перамяшчэннем управа і ўлева, наперад і назад; падачы мяча з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай; у розным тэмпе перад люстэркам; у

зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальнага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сценку і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня: дзвюма ракеткамі, «негульнявой» рукой, двума мячамі, аднаго чалавека супраць двух.

Падача з элементамі вывучаемага ўдару. Удар на стале па дыяганалі. Змяненне напрамку палёту мяча па шырыні стала. Змяненне траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змяненне даўжыні палёту мяча. Удар па мячы са зменным прыходзячым кручэннем.

Змяненне тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаемым ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з палавіны стала, з дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаемым ударам па кароткім і доўгім прыходзячых мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць пападання ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні ўправа–улева, наперад–назад. Гульня штуршком злева доўга–коратка. Гульня па ўзыходзячым, сыходзячым мячы, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Зрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай управа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Тактыка гульні ў сучасны настольны тэніс (дэманстрацыя запісу гульні з паказам і разборам асноўных варыянтаў тактычных дзеянняў).

Прымяненне вывучаных элементаў у вучэбнай гульні.

Канькабежны спорт

Тэарэтычныя звесткі

Правілы бяспекі на ўроках па канькабежнаму спорту. Падрыхтоўка канькоў і адзення да заняткаў на лёдзе. Надзяванне, здыманне і пераноска канькоў. Правілы пераходу да месца заняткаў і назад, паводзін на занятках. Правілы папярэджання траўмаў і адмаражэнняў.

Практычны матэрыял

Спосабы перамяшчэння: хадзьба ў каньках па снезе; стаянне на каньках на лёдзе; адштурхоўванне па чарзе правай і левай нагой; слізганне на двух каньках па краі лядовай пляцоўкі, на адным каньку з прыстаўленнем другога канька, на двух каньках «змейкай»; адштурхоўванне і слізганне на двух каньках па прамой, па павароце ўправа і ўлева; павароты на двух каньках дугой і прыстаўным крокам. Тармажэнне «паўплугам» і «плугам». Старт. Бег па прамой і павароце, з махавымі рухамі рук. Фінішыраванне. Бег на каньках 100–200–300–500 м без уліку часу. Рухавыя гульні на лёдзе.

Прыкладныя дамашнія заданні

Комплекс ранішняй гімнастыкі з 8–10 практыкаванняў. Віс на сагнутых руках, падцягванне ў вісе са становішча стоячы на нізкай перакладзіне. Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне рукі за галавой. Падыманне і апусканне прамых ног са становішча лежачы на спіне з дакрананнем наскамі ног да падлогі за галавой. З зыходнага становішча стоячы ўпор прысеўшы, упор лежачы, упор прысеўшы, устаць у зыходнае становішча. Раўнавага на адной назе «фламінга». Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы.

Падыманне і апусканне, развядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1–2 кг. Прысяданні з гантэлямі ў руках. Прысяданні з выскокваннем уверх. Скачкі праз кароткую скакалку.

Раўнамерны бег 1–2 км (дзяўчынкі) і 2–3 км (хлопчыкі). Паўторны бег з высокім падыманнем бядра і максімальнай частатой рухаў.

Язда на веласіпедзе 5–10 км.

Хадзьба на лыжах 3–5 км.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь і р а з у м е ц ь:

азначэнне здаровага ладу жыцця;

адмоўнае ўздзеянне шкодных звычак на развіццё арганізма;

станоўчае ўздзеянне рухальнай актыўнасці на арганізм чалавека;

прыкладныя нормы рухальнай актыўнасці, неабходныя для аптымальнага развіцця арганізма, умацавання здароўя, падтрымання разумовай і фізічнай працаздольнасці ў сваім узросце;

крытэрыі фізічнага развіцця і ўзроўні фізічнай падрыхтаванасці;

правілы самакантролю ў час вучэбных і самастойных заняткаў;

тэрмін «Алімпійскія гульні старажытнасці»;

асноўныя каштоўнасці алімпізму, абвешчаныя ў Алімпійскай хартыі, іх уплыў на фарміраванне ўяўленняў аб гарманічна развітай асобе;

значэнне алімпійскіх ідэалаў для фізічнага і духоўнага самаўдасканалення.

Вучні павінны в е д а ц ь і з а х о ў в а ц ь:

правілы бяспечных паводзін у працэсе вучэбных і самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

правілы асабістай і грамадскай гігіены падчас заняткаў фізічнай культурай;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні да адзення, абутку, спартыўнага абсталявання і інвентару;

крытэрыі ацэнкі велічыні фізічнай нагрузкі;

індывідуальны рухальны рэжым вучэбнага і выхаднога дня;

правілы вывучаных спартыўных і рухавых гульняў.

Вучні павінны ў м е ц ь в ы к а р ы с т о ў в а ц ь набытыя кампетэнцыі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

захоўвання здаровага ладу жыцця;

аказання даўрачэбнай дапамогі пры розных траўмах;

заняткаў плаваннем (праплываць не менш за 25 м любым спартыўным спосабам);

прымання ўдзелу ў вывучаных спартыўных і рухавых гульнях;

лыжных прагулак з выкарыстаннем вывучаных лыжных хадоў;

веласіпедных прагулак;

выканання агульнаразвіццёвых гімнастычных практыкаванняў з прадметамі і без іх;

дасягнення індывідуальнага максімальнага выніку ў тэставых і кантрольных практыкаваннях.

Табліца 2

10 -бальная шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных якасцей вучняў

Тэставыя практыкаванні	Балы									
	10	**9**	**8**	**7**	**6**	**5**	**4**	**3**	**2**	**1**
Хлопчыкі										
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см) *або*	8	6	5	3	1	–3	–7	–11	–14	–18 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	10	8	5	3	2	–3	–6	–9	–11	–12 і менш
Падцягванне на перакладзіне (разоў) *або*	5	4	3	2	1	–	–	–	–	–
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (разоў)	22	19	15	13	12	9	7	6	4	2 і менш
Бег 30 м (с)	5,3	5,5	5,6	5,7	5,9	6,1	6,4	6,7	7,0	7,2 і больш
Чаўночны бег 4 х 9 м (с) *або*	10,1	10,3	10,5	10,7	10,9	11,3	11,7	12,1	12,5	12,9 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мін (разоў)	92	86	79	70	60	48	40	32	20	14 і менш
Скачкі ў даўжыню з месца (см) *або*	179	174	170	165	160	151	143	133	123	114 і менш
Трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі (см)	530	510	500	470	445	415	400	390	380	360 і менш
Бег 1000 м (мін, с) *або*	4.16	4.28	4.41	4.53	5.06	5.31	5.56	6.21	6.46	7.11 і менш
Хадзьба 2000 м (мін, с) *або*	14.20	14.35	15.05	15.50	16.30	17.10	17.45	18.30	19.40	21.00 і больш
6-мінутны бег (м)	1255	1220	1180	1150	1125	1100	1030	1000	950	930 і менш

Тэставыя практыкаванні	Балы									
	10	**9**	**8**	**7**	**6**	**5**	**4**	**3**	**2**	**1**
Дзяўчынкі										
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см) *або*	12	11	9	8	6	3	0	–4	–7	–10 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	14	12	10	9	7	4	1	–1	–3	–4 і менш
Падыманне тулава за 1 мін (разоў) *або*	47	45	43	41	39	35	31	27	23	19 і менш
Падыманне і апусканне прамых ног за 1 мін (разоў)	33	30	26	22	20	16	12	9	5	1
Бег 30 м (с)	5,6	5,7	5,8	5,9	6,0	6,2	6,4	6,7	6,9	7,1 і больш
Чаўночны бег 4 х 9 м (с) *або*	10,4	10,7	10,9	11,1	11,3	11,8	12,3	12,7	13,2	13,6 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мін (разоў)	124	115	104	95	83	75	68	60	57	52 і больш
Скачкі ў даўжыню з месца (см) *або*	167	162	157	153	148	138	129	120	110	100 і менш
Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку (см)	370	350	315	300	290	260	240	205	190	175 і меньш
Бег 1000 м (мін, с) *або*	4.55	5.10	5.20	5.33	5.46	6.12	6.39	7.05	7.31	7.58 і больш
Хадзьба 1500 м (мін, с) *або*	11.45	12.00	12.30	12.50	13.10	13.25	13.55	14.40	15.00	15.45 і больш
6-мінутны бег (м)	1250	1210	1140	1080	1025	990	950	910	880	845 і менш

Табліца 3

10-бальная шкала ацэнкі вучэбных нарматываў па засваенні вучнямі ўменняў, навыкаў, развіццю рухальных якасцей

Кантрольныя практыкаванні	Балы									
	10	**9**	**8**	**7**	**6**	**5**	**4**	**3**	**2**	**1**
Хлопчыкі										
Бег 60 м (с)	9,8	10,0	10,2	10,4	10,6	10,8	11,0	11,2	11,4	11,5 і больш
Скачок у даўжыню з разбегу (см)	353	340	326	313	300	286	273	260	247	246 і менш
Скачок у вышыню з разбегу (см)	110	105	–	–	100	95	90	85	80	75 і менш

Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	37	34	31	29	27	24	22	20	18	17 і менш
Лажанне па канаце з дапамогай ног (м)	5	–	4,5	–	4	3,5	–	3	2	1,5 і менш
Бег на лыжах 1 км (мін, с)	6.20	6.30	6.40	6.50	7.00	7.14	7.27	7.40	7.53	7.54 і больш
Плаванне без уліку часу (м)	50	–	–	–	25	–	–	12	–	10 і менш
Крос 1500 м (мін, с)	8.37	8.50	9.04	9.17	9.30	9.40	9.50	10.00	10.10	10.11 і больш
Дзяўчынкі										
Бег 60 м (с)	10,2	10,4	10,5	10,6	10,8	11,0	11,2	11,4	11,6	11,7 і болей
Скачок у даўжыню з разбегу (см)	314	300	286	273	260	246	233	220	207	206 і меней
Скачок у вышыню з разбегу (см)	100	95	–	–	90	85	–	80	75	70 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	22	21	19	18	17	16	15	14	13	12 і менш
Падцягванне на нізкай перакладзіне (разоў)	17	15	13	11	10	9	–	8	7	6 і менш
Лажанне па канаце з дапамогай ног (м)	5	4,5	4	–	3	–	–	2	–	1 і менш
Бег на лыжах 1 км (мін, с)	6.50	7.00	7.10	7.20	7.30	7.43	7.57	8.10	8.23	8.24 і больш
Плаванне без уліку часу (м)	50	–	–	–	25	–	–	12	–	10 и менш
Крос 1500 м (мін, с)	8.46	9.00	9.14	9.27	9.40	9.57	10.14	10.30	10.46	10.47 і больш

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ»

ПЕРЕЧЕНЬ И НОРМЫ
обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[1]

Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики							
№ п/п	**Наименование**	**Единица измерения**	**Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.):**				**Примечания**
			до 220	**до 440**	**до 880**	**свыше 880**	
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–
2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг
7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазанья диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–

11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							
28	Брусок деревянный 5x5x10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–
30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1	1	1	2	от 1 до 100
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						–
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–
33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						–
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–
Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–

44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–
46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	для настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						
58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–
58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–
60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–
61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–

62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–
74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемые за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей							
Технические средства обучения							
87	Видеокамера	штука	1	1	1	1	–
88	Компьютер	штука	1	1	1	1	–
89	Мегафон	штука	1	1	2	3	–
90	Микрофон	штука	1	1	1	2	–
91	Музыкальный центр	штука	1	1	1	1	–
92	Проектор мультимедийный	штука	1	1	1	1	–
93	Телевизор	штука	1	1	1	1	–
94	Усилитель с колонками	штука	1	1	1	1	–
95	Шнур (удлинитель) электрический	штука	1	1	1	1	до 50 м
96	Экран переносной	штука	1	1	1	1	–
Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование							
97	Веревочка с грузом	штука	2	3	4	6	до 5 м
98	Тренажер (операционный или многофункциональный)	штука	2	4	4	6	–
99	Штанга	штука	1	2	2	3	–
100	Эспандер	штука	6	8	10	15	–

101	Гантели разборные	пара	4	8	10	12	до 10 кг
Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования							
102	Костюм спортивный	штука	10	18	20	20	–
103	Майка, полурукавка, футболка спортивная	штука	10	18	20	20	–
104	Трусы спортивные	штука	10	18	20	20	–
105	Кроссовки спортивные	пара	10	18	20	30	–

[1] Дадатак 2 да пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2014 г. № 105 (друкуецца на мове арыгінала).

Дадатак 2

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 1000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Старт – групавы. Вучням, якія парушылі правілы спаборніцтваў па бегу, а таксама тым, якія не фінішыравалі, у пратакол выканання кантрольных практыкаванняў выстаўляецца 0 балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

6 -мінутны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне размячаецца кожныя 10 або 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па сканчэнні 6 мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе іх застаў сігнал. Затым настаўнік кожнаму вучню індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе ён перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, якія не фінішыравалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца 0 балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

Хадзьба 1500, 2000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна. Рэкамендуецца выконваць тэставае практыкаванне асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Пры невялікай напаўняльнасці класа дапускаецца выкананне практыкавання адначасова ўсімі вучнямі. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на бег, чаргаваць бег з хадзьбой, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, якія не фінішыравалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца 0 балаў. Час пераадолення дыстанцыі вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Падцягванне ў вісе на высокай перакладзіне выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хватам зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца згінанні тулава і ног, развядзенне, скрыжаванне і іншыя рухі нагамі, рыўкі, махі і разгойдванне, перахопліванні рук. Падцягванне залічваецца, калі падбародак вучня знаходзіцца вышэй за ўзровень перакладзіны, а рукі пры апусканні поўнасцю выпрамляюцца.

Падыманне тулава за 1 мінуту выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваны перад грудзямі, далоні на локцевых суставах, стопы зафіксаваны. Вугал у каленным суставе павінен складаць 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дакрананні локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дакрананнем лапаткамі да гімнастычнага мата.

Падыманне і апусканне прамых ног за 1 мінуту выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі за галавой, прамыя ногі разам. Настаўнік ці другі вучань размяшчаецца з боку галавы тэсціруемага і ўтрымлівае яго за локцевыя суставы. Па сігнале настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань падымае прамыя ногі да вугла 90° да моманту дакранання галёнкай да гімнастычнай палкі, загадзя замацаванай у нерухомым становішчы або ўтрымліваемай настаўнікам. Затым падыспытны апускае ногі да дакранання пяткамі да гімнастычнага мата. Залічваецца колькасць поўных цыклаў (падыманне і апусканне) на працягу 1 мінуты.

Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы. Вучань прымае зыходнае становішча ўпор лежачы, кісці рук на шырыне плеч, ногі разам. Захоўваючы прамое становішча тулава і ног, вучань згінае рукі ў локцевых суставах да вугла не меншага за 90° і, выпрамляючы рукі, вяртаецца ў зыходнае становішча. Не дапускаецца згінаць ногі і тулава, дакранацца да падлогі каленямі і грудзямі. Залічваецца колькасць згінанняў і разгінанняў рук без парушэння ўказаных патрабаванняў.

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага або нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Чаўночны бег 4 х 9 метраў выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу – не больш за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца дзве спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту ў напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць 2 брускі 50 х 50 х 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго (мал. 1).



Мал. 1

Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па адным бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (ці за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся на лініі. Падбегшы да лініі, бяруць другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы хуткасць, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з дзвюх спроб.

Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мінуту выконваюцца на цвёрдым пакрыцці (у спартыўнай зале, на гульнявой пляцоўцы або бегавой дарожцы стадыёна). Кручэнне скакалкі выконваецца толькі наперад. Скачкі выконваюцца з абавязковай апорай на абедзьве нагі адначасова. Дапускаецца выкарыстоўваць любыя скакалкі прамысловай вытворчасці або самаробныя (напрыклад, з турысцкага фала). Забараняецца выкарыстоўваць на скакалцы ўстаўкі-ўцяжарвальнікі. Пры памылцы ў час скачкоў

секундамер не спыняецца, а вучань працягвае выконваць скачкі. Залічваецца сумарная колькасць скачкоў на працягу 30 секунд або 1 мінуты.

Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Трайны скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы або на дарожцы стадыёна з прызямленнем пасля трэцяга скачка ў скачковую яму. Скачкі выконваюцца штуршком дзвюма нагамі злітна без затрымак і спыненняў. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі выконваецца ў спартыўнай зале з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку, пяткі на кантрольнай лініі. Выкарыстоўваецца мяч вагой 1 кг. Вучань утрымлівае мяч дзвюма рукамі над галавой, затым згінае рукі, апускае мяч за галаву і рэзкім рухам кідае яго ўперад–уверх. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе. Вучань садзіцца на падлогу з боку знака «–» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі ОВ упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна (мал. 2). Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі.



Мал. 2

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы. Для ацэнкі выніку выкарыстоўваецца вымяральная лінейка, прымацаваная вертыкальна да гімнастычнай лаўкі. Вучань прымае зыходнае становішча, пяткі і наскі ног разам. Наскі не выходзяць за край гімнастычнай лаўкі. Падыспытны кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Не дапускаецца згінанне ног. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Дадатак 3

ГАДЗІНА ЗДАРОЎЯ І СПОРТУ
(35 гадзін)

Баскетбол

Вучэбны матэрыял

Папярэджванне траўматызму. Значэнне размінкі для прафілактыкі траўматызму. Патрабаванні да захавання дысцыпліны. Правілы абыходжання з мячом. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Правіла гульні. Пачатак гульні і спрэчны мяч. Гульнявы час. Укідванне мяча з-за бакавой і пярэдняй ліній. Парушэнне правіл: прабежка, двайное вядзенне.

Перамяшчэнне іграка: хадзьба, бег, скачкі, павароты.

Стойка гатоўнасці (трайной пагрозы) пасля дробнага бегу, выкананне скачкоў, паскарэнняў, лоўлі мяча і да т.п.

Стойкі іграка абароны: ногі паралельныя на адной лініі; адна нага выстаўлена наперад.

Перамяшчэнні ў абароннай стойцы іграка.

Трыманне мяча: дэманстрацыя трымання мяча ў стойцы гатоўнасці.

Лоўля мяча: пасля падкідвання мяча перад сабой стоячы на месцы; пасля выканання хлапкоў, прысяду, нахілу, павароту на 360°; лоўля ў скачку пасля нізкага прысяду.

Перадача мяча дзвюма рукамі ад грудзей на месцы: з ударам аб сцяну па паветры і з адскокам ад падлогі; па крузе адным, двума і трыма мячамі.

Перадача мяча ў руху: выкананне перадач мяча адзін аднаму ў руху, у парах па паветры і з адскокам ад падлогі.

Вядзенне мяча правай і левай рукой: на месцы з высокім, сярэднім і нізкім адскокам; седзячы; стоячы на каленях.

Вядзенне мяча ў руху крокам; пры павольным бегу; з пераводам з правай на левую руку перад сабой; з абвядзеннем партнёра, фішак.

Спыненне скачком: пасля бегу, па арыенцірах, па гукавым сігнале; спыненне скачком пасля вядзення.

Кідок мяча адной рукой ад пляча з месца: кідок з месца справа, злева і па цэнтры кальца (дыстанцыя не больш за 3 метры).

Валейбол

Вучэбны матэрыял

Папярэджанне траўматызму. Значэнне размінкі для прафілактыкі траўматызму. Патрабаванні да захавання дысцыпліны. Правілы абыходжання з мячом. Аказанне даўрачэбнай дапамогі пры траўмах.

Правілы гульні. Пачатак гульні. Колькасць партый. Правіла трох дотыкаў. Лік гульні. Пераможца і той, хто прайграў.

Стойкі гатоўнасці: высокая, сярэдняя, нізкая.

Перамяшчэнні іграка: хадзьба, прыстаўны крок, двайны крок, скачок, бег, скачкі, спыненні пасля перамяшчэнняў; перамяшчэнні па арыенцірах, па гукавым сігнале, спалучэнне перамяшчэнняў са спыненнем; перамяшчэнні ў стойцы валейбаліста.

Папярэдняя падрыхтоўка, накіраваная на выхаванне «пачуцця мяча»: практыкаванні, рухомыя гульні і эстафеты з кідкамі, перадачамі, лоўляй, катаннем, жангліраваннем мяча з розных зыходных становішчаў, на месцы і ў руху.

Перадача мяча дзвюма рукамі зверху на месцы: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі; у пары з адскокам ад падлогі, у пары, над сабой.

Перадача мяча дзвюма рукамі знізу на месцы: з ударам аб сцяну, з адскокам ад падлогі; у пары (з адскокам ад падлогі і без), над сабой (з адскокам ад падлогі і без).

Падача ніжняя прамая: у сцяну, у пары, цераз сетку ў 3–6 м ад яе, паступова павялічваючы адлегласць, цераз сетку ў 8 м ад яе, з месца падачы.

Прыём мяча дзвюма рукамі знізу: у парах на бакавых лініях, прыём падачы ў парах на адным баку пляцоўкі.

Гандбол

Вучэбны матэрыял

Гісторыя ўзнікнення гандбола. Зараджэнне гандбола як спартыўнай гульні. Першыя правілы па гандболе. Уключэнне гандбола ў праграму Алімпійскіх гульняў. Гісторыя міжнародных спаборніцтваў па гандболе.

Правілы бяспечных паводзін падчас вучэбных заняткаў, пры перамяшчэнні да месца заняткаў і назад. Прычыны, якія прыводзяць да траўматызму. Найбольш тыповыя траўмы гандбалістаў. Прафілактыка траўматызму: размінка, выкананне патрабаванняў да месцаў правядзення заняткаў, інвентару, адзення і абутку.

Вядзенне мяча адной рукой па прамой, «змейкай», «васьмёркай», «чаўнаком»; вядзенне мяча папераменна правай і левай рукой па прамой, «змейкай», «васьмёркай», «чаўнаком»; вядзенне адначасова двух мячоў.

Перадачы мяча правай і левай рукой; жангліраванне двума мячамі; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай рукой; лоўля дзвюма рукамі мяча, які ляціць; лоўля адной рукой мяча, які ляціць; кідкі мяча левай і правай рукой з апорнага становішча па варотах; увядзенне мяча ў гульню перадачай адной рукой з-за бакавой лініі.

Футбол

Вучэбны матэрыял

Гісторыя ўзнікнення футбола. Футбол – адна з самых папулярных камандных гульняў у свеце. Геаграфія гульні з мячом: краіны Старажытнага Усходу (Егіпет, Кітай), Грэцыя, Францыя, Італія, Англія.

Паходжанне назвы «футбол». Першыя правілы гульні ў футбол. Стварэнне першых футбольных клубаў.

Афіцыйныя міжнародныя правілы гульні ў футбол (памер ігравога поля, варот, памер і вага мяча і інш.). Судзейства гульні, судзейскія брыгады (суддзя на полі, памочнікі суддзі).

Гісторыя міжнародных сустрэч па футболе. Першыя афіцыйныя міжнародныя турніры з удзелам футбалістаў з Англіі, Шатландыі, Уэльса і Ірландыі. Папулярнасць футбола ў Еўропе і Лацінскай Амерыцы. Стварэнне Міжнароднай федэрацыі футбольных асацыяцый (ФІФА).

Правілы бяспечных паводзін падчас вучэбных заняткаў, пры перамяшчэнні да месца заняткаў і назад. Прычыны, якія прыводзяць да траўматызму. Найбольш тыповыя траўмы футбалістаў. Прафілактыка траўматызму: размінка, выкананне патрабаванняў да месцаў правядзення заняткаў, інвентару, адзенню і абутку. Дзеянні настаўніка ў забеспячэнні бяспекі заняткаў футболам.

Правілы гульні ў футбол. Гульнявое поле (памеры, паверхня, лініі на полі, зоны і месцы). Вароты (памеры). Мяч (памеры, вага, стандарты). Удзельнікі гульні (састаў каманды, аснаўны састаў, запасныя ігракі, капітан каманды, суддзі). Гульнявая форма. Замена ігракоў. Гульнявы час. Перапынкі і затрымкі. Паводзіны ігракоў (сумленная гульня, парушэнні і санкцыі). Пераможца і той, хто прайграў у гульні, нічыйны вынік.

Вядзенне мяча адной нагой па прамой, «змейкай», «васьмёркай», «чаўнаком»; папераменна правай і левай нагой па прамой, «змейкай», «васьмёркай», «чаўнаком»; вядзенне адначасова двух мячоў.

Перадачы мяча правай і левай нагой.

Жангліраванне мячом адной нагой, папераменна правай і левай нагой.

Прыпынак мяча, які коціцца, правай і левай нагой; мяча, які ляціць, нагой, грудзьмі.

Удары па нерухомым мячы сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, наском з пападаннем у вароты.

Ігра варатара: лоўля і адбіванне мяча рукамі стоячы на месцы і ў руху, лоўля мяча рукамі ў падзенні; увядзенне мяча ў гульню кідком адной рукой, ударам нагой па нерухомым мячы і пасля накідвання; кідком дзвюма рукамі з-за бакавой лініі.

Эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча.

Конкурсы: з ударамі па варотах «Хто дакладней»; з ударамі па нерухомым мячы і пасля накідвання «Хто далей».

Гульні ў «Лабірынт».

Увядзенне мяча ў гульню кідком дзвюма рукамі з-за бакавой лініі.

Гульня ў футбол па спрошчаных правілах 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 ігракоў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адукацыйнае значэнне прадмета «Беларуская мова» на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі акрэсліваецца функцыямі мовы ў грамадстве. Мова выступае асноўным сродкам чалавечых зносін і пазнання рэчаіснасці. Карыстаючыся мовай, асоба засвойвае формы чалавечых узаемаадносін, спазнае маральныя і культурныя каштоўнасці свайго народа. Забяспечваючы моўную адукацыю вучняў, установа адукацыі павінна ствараць умовы для іх інтэлектуальнага, эмацыянальнага і духоўнага развіцця, рыхтаваць да прафесійнай дзейнасці і актыўнага грамадскага жыцця.

Любы вучань – незалежна ад яго гуманітарнай або негуманітарнай схільнасці – у ідэале ўсведамляе мову як нацыянальна-культурную з'яву ў адзінстве яе пазнавальнай, камунікатыўнай і эстэтычнай функцый.

Выкладанне беларускай мовы на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань асэнсоўвае мову як уласную, нацыянальную і агульначалавечую каштоўнасць і мае такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечвае паўнацэннае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

Задачы навучання мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі наступныя:

паглыбляць лінгвістычныя звесткі, цэласнае ўяўленне пра мову як культурна-грамадскую з'яву, як гістарычна зменлівую, шматфункцыянальную сістэму, у значнай ступені залежную ад грамадскай практыкі;

замацоўваць і паглыбляць веды вучняў пра тэкст, выпрацоўваць уменні аналізаваць, узнаўляць, ствараць і ўдасканальваць тэксты;

удасканальваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць вучняў, асноўныя агульнавучэбныя ўменні;

замацоўваць і паглыбляць веды і ўменні вучняў па фанетыцы і графіцы, лексіцы і фразеалогіі, марфалогіі і сінтаксісе, стылістыцы беларускай мовы;

фарміраваць навык рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай маўленчай дзейнасці:

асэнсаванага і свядомага чытання, адэкватнага ўспрымання маўлення на слых, стварэння выказванняў у вуснай і пісьмовай формах;

выпрацоўваць навык адэкватных камунікатыўных паводзін, адпаведных канкрэтным маўленчым сітуацыям;

развіваць інтэлектуальныя і творчыя здольнасці вучняў, фарміраваць навыкі самастойнай вучэбнай дзейнасці;

выхоўваць пачуццё адказнасці за слова, адчуванне яго прыгажосці і выразнасці.

Змест навучання беларускай мове ў X класе ўключае наступныя раздзелы: «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства», «Маўленне», «Тэкст», «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення».

Спецыфіка выкладання беларускай мовы на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі заключаецца ў тым, што вывучанае на працягу V–IX класаў будзе выступаць асновай для

авалодання мовай на больш высокім узроўні – на ўзроўні тэксту, што дазваляе паказаць асаблівасці функцыянавання моўных адзінак у тэксце і навучыць карыстацца мовай у практычнай маўленчай дзейнасці.

Прыёмы, метады і формы работы вызначаюцца названымі вышэй задачамі курса і яго зместам. Узрастае роля разнастайных відаў самастойнай працы, такіх як складанне плана, тэзісаў, канспекта, падрыхтоўка рэферата, даклада, самастойны аналіз тэксту, творчыя працы ў жанры эсэ, нарыса, апавядання і г.д. Арганізуюцца назіранні над чужым і ўласным маўленнем, збор адпаведнага моўнага матэрыялу з наступным яго выкарыстаннем ва ўласнай практычнай маўленчай дзейнасці.

Перавага аддаецца такім відам працы, якія звязаны з аналізам тэксту, яго перапрацоўкай, а таксама складанне свайго ўласнага тэксту: на аснове прапанаванага (пераказ), на аснове прапанаванага сродкамі іншай мовы (пераклад), на аснове ўласнага вопыту, назіранняў (сачыненне).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(35/53* гадзіны на год, 1/1/2* гадзіны на тыдзень, з іх 8/9* гадзін – на пісьмовыя работы)

Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства
(1/1* гадзіна)

Маўленне
(1/4* гадзіны, з іх 1* гадзіна – на пісьмовую работу)

* Пісьмовая творчая работа.

Маўленне як працэс маўленчых зносін. Умовы маўленчых зносін.

Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне і пісьмо. Формы маўленчай камунікацыі: вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі.

Адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне; валодаць навыкамі чытання тэкстаў розных стыляў услых і самому сабе; весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і неафіцыйных маўленчых зносін.

Тэкст
(3/3* гадзіны, з іх 1/1* гадзіна – на пісьмовую работу)

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту. Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення.

Кантрольны дыктант.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі (падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць віды і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы. Аналізаваць, рэдагаваць і ствараць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх кампазіцыйныя схемы.

Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія і культура маўлення
(11/16* гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Гукавая абалонка слова. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў. Вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных. Націск у беларускай мове.

Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення. Акцэнталагічныя нормы.

Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе; напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе; правапіс мяккага знака і апострафа, вялікай і малой літар; правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна.

Арфаграфічныя нормы: правапіс галосных ***о, э, а; е, ё, я;*** *спалучэнняў галосных у запазычаных словах; прыстаўных галосных; прыстаўных і ўстаўных зычных;* ***у*** *і* ***ў, д*** *і* ***дз, т*** *і* ***ц;*** *падоўжаных зычных; некаторых спалучэнняў зычных, мяккага знака і апострафа; вялікай і малой літар; правапіс слоў разам, праз злучок і асобна.*

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць і захоўваць арфаэпічныя, акцэнталагічныя і арфаграфічныя нормы.

Знаходзіць і выпраўляць вымаўленчыя і правапісныя парушэнні нормаў беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння нормаў.

Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі фанетыкі.

Валодаць арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі і арфаграфічнымі нормамі. Карыстацца арфаграфічнымі слоўнікамі.

Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення
(3/5* гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Амонімы. Сінонімы. Антонімы. Паронімы.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні.

Лексічныя і фразеалагічныя нормы: ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем; адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў; правільнае выкарыстанне сінонімаў, антонімаў, паронімаў; правільнае ўжыванне фразеалагізмаў.

Пісьмовая творчая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць і захоўваць лексічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнні слоў; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы. Выяўляць у сказах, тэкстах фразеалагізмы, разумець іх значэнні, вызначаць сінтаксічную і сэнсава-стылістычную ролю.

Знаходзіць і выпраўляць лексічныя недахопы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння нормаў. Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі лексікі і фразеалогіі, правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце.

Валодаць лексічнымі і фразеалагічнымі нормамі. Карыстацца тлумачальнымі слоўнікамі, слоўнікамі амонімаў, сінонімаў, антонімаў, паронімаў, фразеалагічнымі слоўнікамі.

Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення
(3/5* гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Склад слова. Марфема як мінімальная значымая адзінка мовы.

Правапіс прыставак. Правапіс ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак.

Спосабы ўтварэння слоў. Утварэнне і правапіс складаных і складанаскарочаных слоў.

Словаўтваральныя нормы: утварэнне слоў і іх ужыванне ў адпаведнасці з правіламі словаўтварэння.

Арфаграфічныя нормы: правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны; ***і***, ***ы***, ***й*** *пасля прыставак; складаных і складанаскарочаных слоў.*

Кантрольны дыктант.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць віды асноў, спосабы ўтварэння слоў.

Вызначаць у словах марфемы, размяжоўваць вытворныя і невытворныя асновы, адрозніваць спосабы ўтварэння слоў.

Валодаць словаўтваральнымі нормамі. Карыстацца марфемнымі і словаўтваральнымі слоўнікамі.

Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення

(12/16* гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Сістэма часцін мовы беларускай мовы.

Назоўнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Лік і род назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў, правапіс склонавых канчаткаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне назоўнікаў, лік і род якіх не супадае ў беларускай і рускай мовах; назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку; назоўнікаў агульнага роду; нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур.

Прыметнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыметнікаў паводле значэння. Поўныя і кароткія прыметнікі. Утварэнне ступеней параўнання якасных прыметнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў; формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў; ужыванне прыналежных прыметнікаў.

Лічэбнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Скланенне і правапіс лічэбнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне колькасных, парадкавых, зборных і дробавых лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў.

Займеннік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых займеннікаў, зваротнага займенніка ***сябе***, *прыназоўніка пры адмоўным займенніку; акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў* ***сам***, ***сама***, ***самы***, ***ніхто***, ***нішто***.

Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Формы дзеяслова. Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў.

Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як асобыя формы дзеяслова. Утварэнне, ужыванне і правапіс дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў; адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу; акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных формаў дзеясловаў; ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў.

Прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні. Утварэнне формаў ступеней параўнання якасных прыслоўяў. Утварэнне і правапіс прыслоўяў.

Марфалагічныя нормы: адрозненне вышэйшай ступені параўнання прыслоўя ад вышэйшай ступені параўнання прыметніка.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Прыназоўнік, злучнік, часціца як службовыя часціны мовы. Разрады прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Выклічнік. Правапіс прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў.

Ужыванне часціц ***не*** і ***ні***. Правапіс ***не (ня)***, ***ні*** з рознымі часцінамі мовы.

Марфалагічныя нормы: ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія адлюстроўваюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Кантрольная тэставая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць марфалагічныя прыметы часцін мовы, іх сінтаксічную ролю, вызначаць ролю розных часцін мовы ў арганізацыі маўлення, разгортванні і стварэнні тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Распазнаваць часціны мовы і іх формы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсавых, марфалагічных і сінтаксічных прымет; рабіць марфалагічны разбор часцін мовы. Вызначаць асаблівасці ўжывання часцін мовы ў тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Мэтанакіравана і свядома ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам пэўнай камунікатыўнай задачы; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з улікам сэнсава-стылістычнай ролі і тэкстаўтваральных магчымасцей слоў розных часцін мовы.

Валодаць марфалагічнымі нормамі.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
(1 гадзіна)

Рэзервовыя гадзіны (2* гадзіны)

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Беларуская мова: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы: 10–11 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2012, 2014.

Беларуская мова ў 10 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Валочка, Г.М. Беларуская мова: тэставыя работы: 8–11 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск: Аверсэв, 2013, 2014.

Валочка, Г.М. Беларуская мова. 10–11 класы. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, І.Л. Бурак. – Мінск: Аверсэв, 2012.

Валочка, Г.М. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. 10–11 класы: вучэб.-метад. комплекс / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, І.Л. Бурак. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агул. сярэд. адукацыі: тэксты для пераказаў / склад. Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі; Аверсэв, 2013, 2014.

Зелянко, В.У. Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10–11 класы: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Калечыц, А.І. Дыктанты па беларускай мове. 9–11 класы: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А.І. Калечыц, А.К. Пекач, Т.Я. Старасценка. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Цыбульская, С.І. Беларуская мова: 5–11 класы: кантрольныя работы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С.І. Цыбульская. – Мінск: Сэр-Віт, 2012.

Беларуская мова. X клас: электронны адукацыйны рэсурс (adu.by).

Слоўнікі і даведнікі

Анисим, Е.Н. Русско-белорусский словарь для школьников / Е.Н. Анисим, О.В. Мицкевич. – Минск: Сучасная школа, 2010.

Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад.: І.У. Кандраценя, Л.П. Кунцэвіч; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Капылоў, І.Л. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў. Новыя правілы правапісу / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Беларуска-рускі слоўнік для школьнікаў / І.Л. Капылоў, І.У. Ялынцава. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Малажай, Г.М. Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Малажай, Л.І. Яўдошына. – Мінск: Аверсэв, 2013.

Николаева, О.М. Современный русско-белорусский словарь для школьников / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: Літаратура і мастацтва, 2009, 2013.

Николаева, О.М. Современный русско-белорусский словарь / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: ТетраСистемс, 2011.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Разам, асобна, праз злучок: даведнік: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / склад.: Н.Д. Бандарэнка, І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Уласевіч, В.І. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў / В.І. Уласевіч, Н.М. Даўгулевіч. – Мінск: Аверсэв, 2013. – 253 с.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з агульнымі задачамі ўдасканалення як сістэмы адукацыі ўвогуле, так і літаратурнага навучання ў прыватнасці. Вывучэнне беларускай

літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі арыентавана на дасягненне мэт, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».

Вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, якія арыентуюць на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, на эстэтычны і творчы характар засваення прадмета, улічваюць узростава-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных нормаў і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццепазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да багацця беларускай мастацкай літаратуры, эстэтычнае спасціжэнне імі свету, складанасці чалавечых узаемаадносін і на гэтай аснове – выхаванне асобы з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, адданасцю агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здатнай успрыманне прыгажосці (эстэтычнае ўспрыманне) ператварыць у стымул маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця. Яе рэалізацыя прадугледжвае рашэнне шэрага задач навучання:

фарміраванне ў вучняў ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць самастойнае засваенне мастацка-эстэтычных, духоўна-маральных каштоўнасцей;

фарміраванне літаратурнай кампетэнцыі – сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці;

фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі, развіццё ўяўленняў пра літаратуру як сацыякультурны феномен;

фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, якая раскрывае камунікатыўную прыроду тэксту, дзе наладжаны дыялог паміж героямі, аўтарам і чытачом, адзінкавым тэкстам і мноствам кантэкстаў;

фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі – сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, г.зн. навучанне дзейнасці праз уключэнне ў гэтую дзейнасць.

Змест літаратурнай адукацыі ў X класе пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і паспрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і

станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

У X класе вядзецца работа па актуалізацыі, паглыбленні і сістэматызацыі ведаў і ўменняў, атрыманых у папярэдніх класах. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных формаў урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г.д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання з'яўляецца зарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў.

Веданне параметраў развіцця асобы дазваляе рэалізаваць дыферэнцыраваны падыход да навучання літаратуры. Каб развіць здольнасці вучняў з аналітычным тыпам мыслення, мэтазгодна часцей даваць ім заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей прапаноўваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэкціраваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

Навучанне літаратуры ў X класе можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях.

Базавы ўзровень прадугледжвае знаёмства вучняў з агульнымі тэарэтычнымі асновамі курса, асноўнымі заканамернасцямі і асаблівасцямі развіцця беларускай літаратуры ў пэўны гістарычны перыяд, асэнсаванне знакавых твораў найбольш яркіх прадстаўнікоў мастацтва слова.

На вывучэнне літаратуры ў X класе на базавым узроўні адводзіцца 53 гадзіны, з іх 49 гадзін – на вывучэнне і абмеркаванне твораў, 4 гадзіны – на творчыя работы. Праграмай не прадугледжаны час на ўрокі па творах для дадатковага чытання, але настаўнік рэгулярна цікавіцца самастойным чытаннем вучняў і можа, па-свойму пераразмеркаваўшы вучэбную нагрузку, правесці на працягу навучальнага года некалькі ўрокаў па абраных творах для дадатковага чытання.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарным планам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(53 гадзіны)

Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя
(16 гадзін)

Беларуская літаратура першай трэці XX ст. *(1 гадзіна).*

Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады, пераемнасць у развіцці літаратуры з «нашаніўскім» перыядам.

Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчыя здабыткі і пошукі 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады. Утварэнне Саюза пісьменнікаў СССР (1934).

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай.

Тэорыя літаратуры. Літаратурны працэс.

Мастацтва

М у з ы к а: *М.Равенскі*. Песня «Моладзь» (сл. М.Чарота); *А.Туранкоў*. Опера «Кветка шчасця» (п'еса М.Чарота «На Купалле»); *М.Равенскі*. Песня «Месячыку-Месяц» (сл. У.Жылкі).

Ж ы в а п і с: *А.Лісіцкі*. Плакат «Клінам чырвоным бі белых»; *В.Волкаў*. «Маладняковец»; *М.Гусеў*. «Партрэт М.Чарота»; *Я.Драздовіч*. Афармленне часопіса «Рунь»; *М.Станюта*. «Смутак», «Будаўніцтва Універсітэцкага гарадка»; *М.Філіповіч*. «Супрэматычнае кола», «Супрэматызм»; *Т.Ціхаў*. «Вогненны анёл»; *М.Шагал*. «Мір хацінам, вайна палацам».

Літаратура

Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе: 20–50-я гг. / пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – 2-е выд. – Мінск: Выш. шк., 2000. – 510, [1] с.

Максімовіч, В.А. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя: вучэб. дапам. / В.А.Максімовіч. – Мінск: Беларус. навука, 2006.

М а к с і м Г а р э ц к і. Апавяданні **«Роднае карэнне»**, **«Літоўскі хутарок»** (3 гадзіны).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Роднае карэнне». Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа Лінкевіча – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці «першапрычыну ўсякае істоты». Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

«Літоўскі хутарок». Суровая праўда пра Першую сусветную вайну, выкрыццё яе антынароднай, антычалавечай сутнасці. Аўтабіяграфічнасць апавядання. Рэалістычная праўдзівасць адлюстравання трагедыйнасці народнага жыцця. Гуманістычная канцэпцыя пісьменніка. Вобраз Яна Шымкунаса – бескарыслівага, высакароднага, гуманнага чалавека.

Тэорыя літаратуры. Вобраз апавядальніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва

С к у л ь п т у р а: *Э.Астаф'еў*. Рэльефны партрэт М.Гарэцкага для мемарыяльнай дошкі.

Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Атрута» (рэж. М.Стрыжоў).

Літаратура

Мушынскі, М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / Міхась Мушынскі. – Мінск: Беларус. навука, 2013.

Бугаёў, Д. Максім Гарэцкі / Д.Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2004.

З м і т р о к Б я д у л я. Апавяданне **«Бондар»** (*2 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сцісласць, драматызм, псіхалагізм, народная вобразнасць мовы.

Літаратура

Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

У л а д з і м і р Д у б о ў к а. Вершы **«Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына...», «Пальцы жоўтых кляновых лістоў», «Родная мова, цудоўная мова...»** *(2 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Асноўныя матывы лірыкі. Услаўленне сілы народа, духоўнасці, вольналюбства чалавека, паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, шчыры лірызм, асацыятыўная вобразнасць, багацце жанравых формаў. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа, М.Багдановіча.

Мастацтва

М у з ы к а: *М.Равенскі*. Опера «Браніслава» (лібр. У.Дубоўкі, 1930); песні: «На прасторах сініх», «Нас спавівалі», «Ліпнёвы гімн» (сл. У.Дубоўкі); *М.Шчаглоў (Куліковіч)*. Рамансы: «О Беларусь, мая шыпшына», «А вясна ідзе на Беларусі» (сл. У.Дубоўкі).

Ж ы в а п і с: жывапіс імпрэсіяністаў; *П.Драчоў*. Ілюстрацыі да кнігі «Выбраныя творы» У.Дубоўкі (Т.1–2, 1965); *Н.Шчасная*. «Пісьменнік У.М.Дубоўка».

Літаратура

Багдановіч, І. Авангард і традыцыя: беларус. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

Бугаёў, Д. Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта / Д.Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

К а н д р а т К р а п і в а. Байкі **«Дыпламаваны Баран», «Махальнік Іваноў»**; камедыя **«Хто смяецца апошнім»** *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Байкі. Выкрыццё бескультур'я, амаральнасці, некампетэнтнасці, бяздушнага стаўлення да сумленных працаўнікоў, высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, тупасці, падхалімства і іншых чалавечых заган.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Сюжэтная аснова камедыі. Канфлікт у п'есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

Тэорыя літаратуры. Жанрава-тэматычная разнастайнасць байкі. Камічнае ў мастацкай літаратуры. Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы (паглыбленне паняцця).

Мастацтва

Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Хто смяецца апошнім» (рэж. *А.Кірэеў*).

К і н а м а с т а ц т в а: тэлефільм «Хто смяецца апошнім» (рэж. *У.Корж-Саблін*).

Літаратура

Бугаёў, Д. Зброяй сатыры, зброяй праўды / Д.Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2004.

Лаўшук, С.С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С.С.Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск, 2002.

Ляшук, В.Я. Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе: дапам. для настаўнікаў / В.Я.Ляшук, М.І. Яніцкі. – Мінск: Аверсэв, 2007. – 190, [2] с. – (Бібліятэка настаўніка).

М і х а с ь З а р э ц к і. Апавяданне **«Ворагі»** (*2 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Апавяданне **«Ворагі».** Лёс Паўла Гуторскага – змагара за рэвалюцыйныя ідэалы, і Ніны Купрыянавай – дачкі памешчыка. Грамадскае і асабістае ў апавяданні. Тэма кахання.

М. Зарэцкі – майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

Тэорыя літаратуры. Мастацкая дэталь.

Мастацтва. Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектаклі «Сымон Карызна» (рэж. У.Кумельскі, паводле рамана М.Зарэцкага «Вязьмо»), «Ная» (рэж. М.Кавязін).

Літаратура

Мушынскі, М. Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М.Мушынскі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

К у з ь м а Ч о р н ы. Апавяданне **«Макаркавых Волька»** *(2 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Макаркавых Волька». Канкрэтна-гістарычны змест твора. Адлюстраванне характэрнай для 30-х гадоў XX ст. атмасферы падазронасці, недаверу да чалавека.

Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне ў апавяданні праяў шальмоўства і прыніжэння чалавечай годнасці. Агульначалавечае значэнне праблем, узнятых у творы.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у літаратуры.

Мастацтва

С к у л ь п т у р а: *З.Азгур.* «Пісьменнік Кузьма Чорны»; *Э.Астаф'еў.* Рэльефны партрэт К.Чорнага для мемарыяльнай дошкі.

Ж ы в а п і с: *І.Ахрэмчык.* «Партрэт К.Чорнага»; *М.Гуцееў.* Ілюстрацыі да кнігі К.Чорнага «Люба Лук'янская»; *Х.Ліўшыц.* «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах у 1942 годзе».

Літаратура

Тычына, М. Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення / М.Тычына. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Беларуская літаратура сярэдзіны XX стагоддзя (1940-я – сярэдзіна 1960-х гадоў)

(32 гадзіны)

Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.) *(1 гадзіна).*

Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры.

Мастацтва

М у з ы к а. *І.Лучанок*. Раманс-песня «Ёсць у горада слава гордая» (сл. А.Вярцінскага); *К.Цесакоў.* Раманс-песня «Было ў салдата два полі» (сл. А.Вярцінскага).

С к у л ь п т у р а: *М.Кандрацьеў.* «Загінуўшых чакаюць вечна (удовы вайны)».

Ж ы в а п і с: *В.Грамыка.* «Балада пра ваенную маладосць», «Салдаты», «Балада пра апошнюю кулю», «Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца»; *І. Рэй.* «Дзякуй, мама!»,

«З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; *М.Савіцкі.* «Партызаны»; серыя карцін «Лічбы на сэрцы»; *М.Тарасікаў.* «Брацкія магілы».

П я т р у с ь Б р о ў к а. Вершы **«Будзем сеяць, беларусы!», «Надзя-Надзейка», «Родныя словы», «Александрына», «А ты ідзі»** *(2 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Патрыятычны, вызваленчы пафас твораў паэта перыяду Вялікай Айчыннай вайны, сцвярджэнне няскоранасці беларускага народа, выяўленне палымянай веры ў перамогу.

Пашырэнне ідэйна-тэматычнага і жанравага дыяпазону паэзіі П.Броўкі ў 1960–1970-я гады, узмацненне яе гуманістычнага пафасу, увагі да маральна-этычных і агульначалавечых праблем. Народна-песенная аснова вершаў П.Броўкі, іх мілагучнасць.

Мастацтва

М у з ы к а: *У.Мулявін.* Песня «Александрына» (сл. П.Броўкі).

Ж ы в а п і с: *У.Гардзеенка.* «Думы пра былое (П.Броўка)»; *С.Геўрус.* «Партрэт Петруся Броўкі»; *І. Пратасеня.* «Партрэт П.Броўкі».

Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965 гг.) *(1 гадзіна).*

Умовы развіцця беларускай літаратуры ў пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ваенная тэма як цэнтральная ў літаратуры.

Змены ў грамадскай атмасферы сярэдзіны 50-х гадоў XX ст. і іх дабратворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Актыўнае і шматграннае развіццё мастацтва слова. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці, гуманізму. Узмацненне крытычнага пачатку ў літаратурнай творчасці, адмаўленне ад схематызму.

А р к а д з ь К у л я ш о ў. Вершы **«Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «Я хаце абавязаны прапіскаю...», «На паўмільярдным кіламетры...»** *(3 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Глыбіня лірычнага пачуцця паэта ў лепшых творах даваеннага часу. Адметнасць вобразнасці і кампазіцыі верша «Мая Бесядзь».

Ваенная лірыка А.Куляшова. Суровая праўда і гуманізм у паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай».

Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы. Зварот да тэм жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей. Развіццё і ўзбагачэнне паэтам класічных традыцый лірыкі.

Паэтычнае майстэрства А.Куляшова.

Тэорыя літаратуры. Лірычны герой (паглыбленне паняцця).

Мастацтва

Ж ы в а п і с: *М.Савіцкі.* «Партызанская Мадонна (Мінская)»; *П.Гаўрыленка.* «Вясна», «Сяўба»; *М.Сяўрук.* «Жніво»; *У.Кожух.* «Новая дарога»; *М.Рагалевіч.* «Беларуская калыханка»; *А.Бараноўскі.* «Пара залатых бяроз»; *Г.Вашчанка.* «Крылы»; *Я.Драздовіч.* «Космас», «Артаполіс», «Трывеж», «Панарама месячнага горада».

В ы я ў л е н ч а е м а с т а ц т в а: *Л.Талбузін.* Медаль «Аркадзь Куляшоў».

М у з ы к а: *Э.Наско.* Вакальная музыка «Рамансы на вершы А. Куляшова».

Літаратура

Голуб, Т. Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова / Тэрэза Голуб; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2014. – 346, [1] с., [10] л. іл.

Куляшова, В.А. Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...: аповесць-эсэ / Валянціна Куляшова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – 260, [2] с., [8] л. іл. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі: ЖЗЛБ).

М а к с і м Т а н к. Вершы **«Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ave Maria», «Працягласць дня і ночы»; паэма «Люцыян Таполя»** (*4 гадзіны*).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Лірыка. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы народа. Матыў адзінства пакаленняў. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Свабодны верш у паэзіі Максіма Танка.

«Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме.

Тэорыя літаратуры. Верлібр.

Мастацтва

М у з ы к а: *У.Алоўнікаў*. Рамансы «Дуб», «Партызанскія акопы»; *А.Багатыроў*. Рамансы «Вяселле», «Калісьці бура на Карпатах», «Клубамі чорнымі дым віўся», «Нарач»; *Г.Вагнер*. Рамансы «Два арлы», «Плача хмара без жалю»; *Я.Глебаў*. Раманс «Нарач»; *І.Лучанок*. Раманс «Два арлы»; *У.Мулявін*. Раманс «Завушніцы»; *П.Падкавыраў*. Раманс «Не шкадуйце, хлопцы, пораху»; *Ю.Семяняка*. Рамансы «Нарач», «Ганна», «Ну і вечар вясновы!»; *Д.Смольскі*. Рамансы «Быць чалавекам я рад», «Ля гэтых сосен», «Плача хмара без жалю»; *Ю.Талеснік*. Раманс «Завушніцы»; *А.Туранкоў*. Рамансы «Вясновая навальніца», «Грай жа, музыка», «У навальніцу»; *Э.Тырманд*. Рамансы «А што гэта за даліна», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Сасна», «Ва ўсім, вядома, вінават», «Тост за дружбу», «Памяць».

С к у л ь п т у р а: *А.Бембель*. «Уз'яднанне Заходняй Беларусі».

Ж ы в а п і с: *С.Вярсоцкі*. «Возера Нарач»; *С.Герус*. «Партрэт М.Танка»; *Я.Зайцаў*. «Партрэт М.Танка»; *Н.Шчасная*. «Партрэт М.Танка».

Літаратура

Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д.Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск, 2003.

Мікуліч, М.У. Максім Танк. Талент, заручаны з небам / Мікола Мікуліч. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2012. – 332, [2] с., [24] л. іл.

Я н к а Б р ы л ь. Апавяданне **«Memento mori»** *(1 гадзіна).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Memento mori». Паказ вайны ў творы. Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара ўбачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Глыбокае разуменне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага маўлення.

Мастацтва

С к у л ь п т у р а: *С.Вакар*. «Пісьменнік Я.Брыль».

Ж ы в а п і с: *М.Будавей.* «Партрэт Я.Брыля»; *В.Грамыка.* «Партрэт Я.Брыля».

Літаратура

Ляшук, В.Я. Вывучэнне творчасці Янкі Брыля ў школе: дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.Я.Ляшук. – Мінск: Аверсэв, 2004. – 220 с.

П і м е н П а н ч а н к а. Вершы **«Краіна мая», «Герой», «Родная мова», «Толькі лісцем рабін шалахні...», «Крык сойкі», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы»** *(2 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Патрыятычны пафас ваеннай паэзіі П.Панчанкі. Гераічнае і трагічнае ў вершах аб Радзіме і яе абаронцах.

Роздум пра сэнс жыцця, гуманныя адносіны паміж людзьмі ў творах 1960-х гадоў. Пашырэнне тэматычнай, жанрава-стылёвай разнастайнасці лірыкі 1970–1980-х гадоў. Духоўная эвалюцыя лірычнага героя. Вернасць праўдзе жыцця. Спавядальны характар, адкрытасць, шчырасць лірычнага пачуцця. Бескампраміснасць паэтычнага слова. Публіцыстычная завостранасць верша, разнастайнасць рытміка-інтанацыйнага малюнка, багацце сродкаў мастацкага выяўлення.

Тэорыя літаратуры. Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы. Публіцыстычнасць у паэзіі. Лірычны герой і аўтар.

Мастацтва

М у з ы к а: *П.Падкавыраў*. Фрагменты з вакальнага цыкла «Партызаны» (сл. Янкі Купалы, Максіма Танка, П.Панчанкі); *В. Іваноў*. «Тапаліны звон» (сл. П.Панчанкі).

Ж ы в а п і с: *Я.Батальёнак*. «Далягляды»; *М.Будавей*. «Партрэт Пімена Панчанкі»; *С.Каткоў*. «На Бярэзіне»; *В.Шкаруба*. «Світанак».

І в а н М е л е ж. Раман **«Людзі на балоце»** (*6 гадзін*).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Людзі на балоце». Творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка «Палескай хронікі». Шматгранныя нацыянальныя характары ў рамане. Майстэрства раскрыцця ўнутранага свету галоўных герояў Васіля Дзятла і Ганны Чарнушкі. Настойлівае імкненне Васіля да самасцвярджэння і незалежнасці, яго сціпласць, цярплівасць, працавітасць, разгубленасць у складаных жыццёвых абставінах. Драматычны лёс Ганны.

Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян. Розныя адносіны да людзей, да працы, да будучыні ў старога Глушака і яго сыноў. Драматызм становішча Глушака ў час калектывізацыі. Вастрыня драматычнай калізіі.

Чалавек і прырода ў творы. Псіхалагічнае майстэрства Мележа-празаіка. Нацыянальная самабытнасць творчасці І. Мележа і яе агульначалавечая значнасць.

Тэорыя літаратуры. Стыль пісьменніка (паглыбленне паняцця). Традыцыі і наватарства.

Мастацтва

Ж ы в а п і с: *Г.Вашчанка*. «Маё Палессе»; *А.Гараўскі*. «Пінскія балоты»; *Ю.Зайцаў*. «Людзі Палесся»; *Н.Шчасная*. «Партрэт Івана Мележа».

В ы я ў л е н ч а е м а с т а ц т в а: *Л.Талбузін*. Медаль «Іван Мележ».

Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Людзі на балоце» (рэж. *А.Гарцуеў*).

К і н а м а с т а ц т в а: кінафільм «Людзі на балоце» (рэж. *В.Тураў*); тэлеспектакль «Завеі, снежань...» (рэж. *У.Забэла*).

Літаратура

Ляшук, В.Я. Іван Мележ у школе: дапам. для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў / В.Я.Ляшук. – Мінск: Аверсэв, 2005. – 191 с. – (Вывучэнне творчасці пісьменніка).

У л а д з і м і р К а р а т к е в і ч. Аповесць **«Дзікае паляванне караля Стаха»;** раман **«Каласы пад сярпом тваім»** (кніга першая «Выйсце крыніц»; з другой кнігі «Сякера пры дрэве» – раздзелы I, II, VII, XII, XVII) *(9 гадзін)*.

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Дзікае паляванне караля Стаха». Канкрэтна-гістарычная аснова твора. Каларыт, атмасфера мінулай эпохі (80-я гады XIX ст.). Зварот пісьменніка да легенды пра караля Стаха Горскага (пач. XVII ст.), рамантычнае яе асэнсаванне. Асуджэнне сацыяльнага прыгнёту і ўціску. Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох. Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

«Каласы пад сярпом тваім». Гістарычная аснова рамана. Паказ станаўлення характару будучага кіраўніка сялянскага паўстання Кастуся Каліноўскага. Духоўны воблік

галоўнага героя рамана Алеся Загорскага. Прадстаўнікі дваранства ў рамане (Даніла Вежа-Загорскі, Хаданскія, Кроер). Дзеячы шляхецкага руху Яраслаў Раўбіч і Багдан Война. Стыхійны характар антыпрыгонніцкай барацьбы сялян. Праўдзівасць адлюстравання чалавечых характараў. Харство кахання Алеся Загорскага і Майкі Раўбіч. Своеасаблівасць мастацкага стылю рамана. Дынамічнасць сюжэта. Сумяшчэнне рэалістычных і рамантычных мастацкіх абагульненняў, гістарычнага і гісторыка-легендарнага ў творы. Месца і роля лірычных адступленняў і пейзажных малюнкаў. Вобразная сімволіка. Сувязь рамана з паэтыкай народных балад і легенд.

Тэорыя літаратуры. Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва

М у з ы к а: *Я.Глебаў.* Раманс «Любы мой»; *Л.Мурашка.* Раманс «Дагарэў за брамай неба край»; *Д.Смольскі.* Опера «Сівая легенда»; *У.Солтан*. Опера «Дзікае паляванне караля Стаха».

С к у л ь п т у р а: *С.Вакар.* «Пісьменнік У.Караткевіч».

Ж ы в а п і с: *У.Зінкевіч.* «Партрэт У.Караткевіча»; *М.Будавей.* «Партрэт У.Караткевіча»; *Л.Дударанка.* «Партрэт Васіля Быкава», «Беларускія пісьменнікі Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Ніл Гілевіч».

К і н а- і т э л е м а с т а ц т в а: тэлеспектакль «Лісце каштанаў»; фільмы: «Будзь шчаслівa, рака» (сцэн. *У.Караткевіч*), «Быў, ёсць, буду» (сцэн. і рэж. *Ю.Цвяткоў*), «Дзікае паляванне караля Стаха» (рэж. *В.Рубінчык*), «Кніганошы» (рэж. *У.Траццянкоў*), «Ладдзя роспачы» (рэж. *Л.Тарасаў*), «Лісце каштанаў» (рэж. *У.Забэла*), «Маці ўрагану» (рэж. *Ю.Марухін*), «Памяць каменя» (сцэн. *У.Караткевіч*), «Сведкі вечнасці» (сцэн. *У.Караткевіч*), «Сівая легенда» (рэж. *Б.Парэмта*), «Сіняя-сіняя» (рэж. *Н.Арцімовіч*), «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (сцэн. *У.Караткевіч*), «Чорны замак Альшанскі» (рэж. *М.Пташук*).

Літаратура

Верабей, А. Уладзімір Караткевіч: нарыс жыцця і творчасці / А.Верабей. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Ішчанка, Г.М. Вывучэнне творчасці У.Караткевіча ў школе / Г.М. Ішчанка. – Мінск: Аверсэв, 2003.

Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы: зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў / [уклад.: А.Верабей, М.Мінзер, С.Панізнік]. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – 364, [1] с.

Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека: [літаратуразнаўчае эсэ] / Адам Мальдзіс. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – 206, [1] с.

Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць / А.Русецкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000.

А н д р э й М а к а ё н а к. «Зацюканы апостал» (*3 гадзіны*).

Жыццёвы і творчы шлях драматурга.

«Зацюканы апостал». Жанравая адметнасць п’есы. Спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам духоўных агульначалавечых каштоўнасцей. Майстэрства А.Макаёнка ў абмалёўцы характараў.

Тэорыя літаратуры. Сатырычная камедыя. Трагікамедыя. Моўная характарыстыка персанажаў (паглыбленне паняцця).

Мастацтва

Ж ы в а п і с: М.Будавей. «А.Макаёнак».

Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектаклі «Зацюканы апостал» (рэж. Б.Луцэнка, па творы А.Макаёнка).

Паўтарэнне і абагульненне вывучанага за год
(1 гадзіна)

У с я г о: на вывучэнне твораў – 49 гадзін;
на творчыя работы – 4 гадзіны.

РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

Кандрат Крапіва. Байка (на выбар вучняў).
Максім Танк. Верш «Родная мова».
А.Куляшоў. Верш (на выбар настаўніка).
П.Панчанка. Верш (на выбар настаўніка).
І.Мележ. Урывак з рамана «Людзі на балоце» (на выбар настаўніка).

ПРЫКЛАДНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ

Г.Апалінэр. Зб. «Зямны акіян».
Зб. «Беларуская байка» (уклад. Э.Валасевіч).
Я.Брыль. «Галя», «Муштук і папка».
Г.Бураўкін. Зб. «Чытаю тайнапіс вачэй».
З.Бядуля. «Плач пралескаў», «Нібы рупны араты...»
А.Вялюгін. Вершы.
М.Гарэцкі. «Літоўскі хутарок».
А.Грачанікаў. Зб. «Палессе».
Г.Далідовіч. «Гаспадар-камень».
Зб. «Душа мая тужлівая» (уклад. В.Шніп).
А.Дзялендзік. «Чатыры крыжы на сонцы».
А.Жук. «Халодная птушка».
У.Жылка. Вершы.
М.Зарэцкі. «Кветка пажоўклая».
В.Зуёнак. «Маўчанне травы».
Зб. «Іскры вечнага агню» (уклад. А.А.Васілевіч і інш.).
У.Караткевіч. «Чазенія», зб. «Быў. Ёсць. Буду».
А.Кулакоўскі. «Нявестка».
А.Куляшоў. «Маналог».
Е.Лось. Зб. «І каласуе даўгалецце...»
М.Лынькоў. Апавяданні.
А.Макаёнак. «Пагарэльцы».
З.Марозаў. Зб. «Вяртанне да цішыні».
А.Маруа. «Пакаранне золатам».
І.Мележ. «Подых навальніцы».
А.Мрый. «Запіскі Самсона Самасуя».
І.Навуменка. «Сасна пры дарозе».
А.Пісьмянкоў. «Думаць вершы...»
Я.Пушча. Вершы.
А.Пысін. Зб. «Твае далоні», «Ёсць на свеце мой алень».
А.Разанаў. Зб. «Вастрыё стралы».
Р.М.Рыльке. «Санеты Арфею».
Э.М.Рэмарк. «Тры таварышы».
Б.Сачанка. «Вечны кругазварот».
Я.Сіпакоў. Зб. «Веча славянскіх балад».
М.Стральцоў. «Смаленне вепрука».
С.Цвэйг. «Нябачная калекцыя».
М.Чарот. Вершы.

К.Чорны. «Пошукі будучыні».
А. дэ Сент-Экзюперы. «Планета людзей».
Содержание образования учебного предмета «Химия» ориентировано на освоение учащимися компетенций, необходимых для рациональной деятельности в мире веществ и химических превращений на основе знаний о свойствах важнейших веществ, окружающих человека в повседневной жизни, природе, промышленности, и понимание сути химических превращений. Содержание образования также ориентировано на формирование у учащихся понимания роли химии в решении наиболее актуальных проблем, стоящих перед человечеством в XXI веке. От грамотного решения этих проблем зависит здоровье людей, уровень их жизни и состояние окружающей среды.

Цель изучения химии на III ступени общего среднего образования – формирование системы химических знаний и опыта их применения, обеспечивающей понимание естественнонаучной картины мира, активную адаптацию в социуме и безопасное поведение, готовность к продолжению образования на последующих уровнях и ступенях профессионального образования.

Задачи изучения химии на III ступени общего среднего образования:

формирование системных химических знаний, создающих основу для непрерывного образования и самообразования на всех этапах обучения и предстоящей профессиональной деятельности;

формирование и развитие ключевых, общепредметных и предметно-специальных компетенций – знаний, умений, способов и опыта деятельности с учетом специфики химии как фундаментальной естественной науки;

формирование и развитие социально значимых ценностных ориентаций, включающих общекультурное и личностное развитие учащихся, осознание ценности получаемого химического образования, чувства ответственности и патриотизма, социальную мобильность и способность адаптироваться в разных жизненных ситуациях.

Учебная программа составлена в соответствии с учебным планом, который предусматривает для изучения химии на базовом уровне 2 часа в неделю (всего 70 часов).

Структура учебной программы предполагает изучение органической химии в X классе. Изучение учебного материала начинается с темы «Введение в органическую химию», рассчитанной на формирование необходимых компетенций, направленных на понимание основ теории строения вещества. Дальнейшее рассмотрение учебного материала базируется на сведениях об электронном строении атомов и электронной природе химической связи в молекулах органических соединений. Рассматриваются строение и свойства органических веществ основных классов. Предлагаемая последовательность учебных тем в программе позволяет раскрыть принцип усложнения строения и генетического развития от углеводородов к более сложным органическим соединениям. При изучении курса учащиеся будут знакомиться с зависимостью свойств органических веществ от строения молекул, применением органических соединений в различных сферах жизнедеятельности человека.

В учебной программе представлены учебные темы и примерное время на их изучение.

Для каждой темы в программе определены вопросы, подлежащие изучению, типы расчетных задач, указаны перечни демонстраций, лабораторных опытов, темы практических работ. Учителю дается право замены демонстрационных и лабораторных опытов на другие (равноценные), более доступные в условиях данного учреждения образования. По своему усмотрению учитель может увеличить число демонстрационных опытов. Предусмотрено время для проведения контрольных работ.

Указанное в программе количество часов, отведенных на изучение учебных тем, является примерным. Оно может быть перераспределено между темами в разумных пределах (2–4 часа). Резервное время учитель использует по своему усмотрению. Кроме того, возможно изменение последовательности изучения вопросов в рамках отдельной учебной темы при соответствующем обосновании таких изменений.

В программе имеется раздел «Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся». На основе этих требований осуществляется контроль и оценка результатов учебной деятельности учащихся, качества усвоения знаний и уровня сформированности компетенций.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(2 ч в неделю; всего 70 ч, из них 2 ч – резервное время)

Т е м а 1. Введение в органическую химию (8 ч)

Строение атома. Состояние электрона в атоме. Атомная орбиталь. Энергетический уровень и энергетический подуровень, *s*-, *p*-орбитали в атоме. Электронные конфигурации атомов элементов первых трех периодов (распределение электронов по орбиталям). Особенности электронного строения атома углерода.

Ковалентная связь. Полярная и неполярная ковалентная связь. Одинарные и кратные связи (σ- и π-связи).

Предмет органической химии.

Основные положения теории химического строения органических веществ.

Классификация органических веществ.

Демонстрации

1. Качественное определение углерода, водорода и галогенов в органических соединениях.

Т е м а 2. Углеводороды (16 ч)

Алканы. Определение класса, гомологический ряд и общая формула алканов. Гомологи, гомологическая разность.

Метан – простейший представитель насыщенных углеводородов – алканов. Валентные углы в молекуле метана. Электронное и пространственное строение молекул алканов. Длина связи С–С в молекулах алканов.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алканов. Структурная изомерия алканов – изомерия углеродного скелета. Физические свойства.

Химические свойства: галогенирование (реакция замещения), окисление, термические превращения (крекинг), изомеризация. Получение (гидрирование соединений с кратными связями) и применение алканов.

Алкены. Определение класса и общая формула алкенов. Этилен – простейший представитель ненасыщенных углеводородов – алкенов. Длина связи С=С, валентные углы в молекуле этилена. Электронное и пространственное строение молекул алкенов.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алкенов. Изомерия: структурная (углеродного скелета и положения двойной связи), пространственная *(цис-*, *транс-)*. Физические свойства.

Химические свойства: окисление; присоединение водорода, галогенов к алкенам. Присоединение воды и галогеноводородов к этилену. Качественные реакции на двойную связь с растворами брома и перманганата калия. Полимеризация алкенов. Получение алкенов (дегидрирование алканов, дегидрогалогенирование галогеналканов, дегидратация спиртов, гидрирование алкинов). Применение алкенов.

Диены. Углеводороды с сопряженными двойными связями. Строение молекул бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3 (изопрена), их молекулярные и структурные формулы. Физические свойства бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3.

Химические свойства бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3: присоединение водорода, галогенов, реакция полимеризации.

Получение бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3 дегидрированием алканов. Применение диеновых углеводородов. Природный и синтетические каучуки.

Алкины. Определение класса и общая формула алкинов. Ацетилен – простейший представитель ненасыщенных углеводородов – алкинов. Длина связи C≡C, валентные углы в молекуле ацетилена. Электронное и пространственное строение молекул алкинов.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алкинов. Структурная изомерия углеродного скелета и положения тройной связи. Физические свойства.

Химические свойства: присоединение водорода, галогенов к алкинам; галогеноводородов, воды к ацетилену; полное окисление. Качественные реакции на тройную связь с растворами брома и перманганата калия. Получение ацетилена из метана и карбида кальция. Применение алкинов.

Арены. Определение класса и общая формула аренов ряда бензола. Бензол – простейший представитель ароматических углеводородов. Номенклатура и изомерия аренов ряда бензола. Электронное и пространственное строение молекулы бензола. Длина связи углерод–углерод и валентные углы в молекуле бензола. Физические свойства бензола.

Химические свойства бензола: реакции замещения в ароматическом ядре (галогенирование, нитрование), каталитическое гидрирование.

Получение бензола тримеризацией ацетилена, дегидрированием гексана и циклогексана. Применение ароматических соединений.

Взаимосвязь между насыщенными и ненасыщенными углеводородами.

Углеводороды в природе. Нефть и природный газ как источники углеводородов. Состав и физические свойства. Способы переработки нефти: перегонка, термический и каталитический крекинг. Продукты переработки нефти. Охрана окружающей среды от загрязнений при переработке углеводородного сырья и использовании продуктов переработки нефти.

Расчетные задачи

1. Вывод формул органических веществ по общей формуле, отражающей их состав.
2. Установление молекулярных формул органических веществ на основании продуктов их сгорания.

Демонстрации

1. Модели молекул насыщенных и ненасыщенных углеводородов.
2. Образцы пластмасс.
3. Образцы натурального и синтетических каучуков, резины.
4. Получение ацетилена карбидным способом.
5. Отношение ацетилена к растворам брома и перманганата калия.
6. Коллекция «Продукты переработки нефти».

Лабораторные опыты

1. Изготовление шаростержневых моделей молекул углеводородов.

Практические работы

1. Получение этилена и изучение его свойств (1 ч).

Т е м а 3. Спирты и фенолы (8 ч)

Спирты. Функциональная группа спиртов, ее электронное строение. Классификация спиртов: одноатомные и многоатомные; первичные, вторичные, третичные.

Насыщенные одноатомные спирты. Определение класса, общая формула, состав, строение, молекулярные и структурные формулы насыщенных одноатомных спиртов. Метанол и этанол как представители насыщенных одноатомных спиртов. Структурная изомерия углеродного скелета и положения функциональной группы насыщенных одноатомных спиртов. Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия спиртов.

Физические свойства. Водородная связь и ее влияние на температуры кипения и растворимость спиртов.

Химические свойства: взаимодействие со щелочными металлами, карбоновыми кислотами, галогеноводородами, дегидратация; окисление: полное и частичное (до альдегидов).

Получение спиртов в лаборатории гидролизом галогеналканов, получение этанола гидратацией этилена. Применение спиртов. Токсичность спиртов, их действие на организм человека.

Многоатомные спирты. Этиленгликоль (этандиол-1,2) и глицерин (пропантриол-1,2,3) как представители многоатомных спиртов, их состав, строение и структурные формулы.

Химические свойства: взаимодействие со щелочными металлами, органическими и минеральными кислотами, галогеноводородами, гидроксидом меди(II) (качественная реакция на многоатомные спирты). Применение этиленгликоля и глицерина.

Взаимосвязь между насыщенными, ненасыщенными углеводородами и спиртами.

Фенолы. Понятие о фенолах, определение класса. Состав и строение фенола; молекулярная и структурная формулы. Физические свойства фенола.

Химические свойства фенола: взаимодействие со щелочными металлами, растворами щелочей, бромирование и нитрование по ароматическому ядру. Качественные реакции на фенол с бромной водой и растворами солей железа(III). Взаимное влияние групп атомов в молекуле фенола.

Применение фенола.

Расчетные задачи

3. Расчеты по химическим уравнениям, если одно из реагирующих веществ взято в избытке.

Демонстрации

1. Модели молекул метанола, этанола, этиленгликоля, глицерина.
2. Сравнение растворимости в воде насыщенных одноатомных спиртов.
3. Взаимодействие этанола с натрием.
4. Горение этанола.

Лабораторные опыты

2. Окисление этанола оксидом меди(II).
3. Взаимодействие глицерина с гидроксидом меди(II).

Т е м а 4. Альдегиды (5 ч)

Альдегиды. Функциональная альдегидная группа. Определение класса альдегидов. Метаналь и этаналь как представители альдегидов, их состав, строение, молекулярные и структурные формулы.

Насыщенные альдегиды: общая формула; структурная изомерия углеродного скелета.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия альдегидов. Физические свойства.

Химические свойства: реакции восстановления, окисления до карбоновых кислот. Качественные реакции на альдегидную группу: «серебряного зеркала» и с гидроксидом меди(II).

Получение альдегидов окислением первичных спиртов. Получение этаналя гидратацией ацетилена. Применение метаналя и этаналя.

Демонстрации

1. Модели молекул альдегидов.
2. Окисление альдегида (реакция «серебряного зеркала»).

Лабораторные опыты

4. Окисление альдегида гидроксидом меди(II).

Т е м а 5. Карбоновые кислоты (7 ч)

Карбоновые кислоты. Функциональная карбоксильная группа. Определение класса карбоновых кислот. Классификация карбоновых кислот: насыщенные, ненасыщенные, ароматические; одноосновные, двухосновные.

Одноосновные насыщенные карбоновые кислоты: состав, строение; общая, молекулярные и структурные формулы. Структурная изомерия углеродного скелета.

Муравьиная и уксусная кислоты как представители насыщенных одноосновных карбоновых кислот. Пальмитиновая и стеариновая кислоты как представители высших насыщенных карбоновых кислот.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия карбоновых кислот. Физические свойства карбоновых кислот, влияние водородной связи на температуру кипения и растворимость.

Химические свойства: изменение окраски индикаторов, взаимодействие с металлами, основными и амфотерными оксидами и гидроксидами, солями более слабых кислот. Реакция этерификации. Реакция замещения атома водорода метильной группы уксусной кислоты на атом галогена. Получение карбоновых кислот окислением алканов, первичных спиртов и альдегидов.

Олеиновая кислота как представитель одноосновных ненасыщенных карбоновых кислот: состав, строение. Химические свойства: присоединение водорода и галогенов по двойной связи углеводородной группы.

Применение карбоновых кислот.

Взаимосвязь между углеводородами, спиртами, альдегидами, карбоновыми кислотами.

Расчетные задачи

4. Вычисления по уравнениям реакций, протекающих в растворах.

Демонстрации

1. Модели молекул карбоновых кислот.
2. Растворимость карбоновых кислот в воде, действие на индикаторы.
3. Отношение олеиновой кислоты к растворам перманганата калия и брома; взаимодействие со щелочью.

Практические работы

2. Сравнение свойств карбоновых и неорганических кислот.

Т е м а 6. Сложные эфиры. Жиры (4 ч)

Сложные эфиры. Определение класса. Состав, строение, молекулярная и структурная формулы. Сложные эфиры – производные карбоновых кислот и спиртов, общая формула. Этиловый эфир уксусной кислоты как представитель сложных эфиров.

Изомерия сложных эфиров: структурная и межклассовая (с карбоновыми кислотами). Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия сложных эфиров. Физические свойства. Получение сложных эфиров: реакция этерификации.

Химические свойства: гидролиз (кислотный и щелочной).

Сложные эфиры в природе. Применение. Полиэфирные волокна (лавсан).

Жиры. Состав и строение триглицеридов. Физические свойства. Химические свойства: гидролиз, гидрирование, окисление. Биологическая роль жиров.

Мыла. Понятие о синтетических моющих средствах (СМС).

Выход продукта реакции.

Расчетные задачи

5. Определение выхода продукта химической реакции.

Демонстрации

1. Получение сложного эфира уксусной кислоты.
2. Образцы сложных эфиров, полиэфирных волокон и полимеров.

Лабораторные опыты

5. Исследование свойств жиров (растворимость, доказательство ненасыщенного характера остатков карбоновых кислот).

Т е м а 7. Углеводы (10 ч)

Углеводы. Определение класса. Общая формула, состав, строение, классификация углеводов.

Моносахариды. Глюкоза: состав, функциональные группы, строение молекулы. Линейная и циклические α- и β-формы молекулы глюкозы. Фруктоза – изомер глюкозы. Физические свойства глюкозы и фруктозы.

Химические свойства глюкозы: окисление до глюконовой кислоты, восстановление до шестиатомного спирта сорбита; брожение (спиртовое и молочнокислое). Качественные реакции на глюкозу: «серебряного зеркала» и с гидроксидом меди(II). Нахождение в природе, получение и применение глюкозы.

Дисахариды. Сахароза как представитель дисахаридов, ее состав. Молекулярная формула. Физические свойства. Химические свойства: гидролиз. Получение и применение сахарозы.

Полисахариды. Крахмал – природный полисахарид. Состав и строение макромолекул крахмала (остатки α-глюкозы). Физические свойства.

Химические свойства: гидролиз (ферментативный, кислотный); реакция с иодом (качественная реакция на крахмал).

Значение углеводов как питательных веществ.

Целлюлоза – природный полисахарид. Состав и строение макромолекул целлюлозы (остатки β-глюкозы). Физические свойства.

Химические свойства: горение, гидролиз, взаимодействие с неорганическими и органическими кислотами с образованием сложных эфиров. Натуральные и искусственные волокна. Применение целлюлозы и ее производных.

Демонстрации

1. Реакция «серебряного зеркала» с глюкозой.
2. Гидролиз сахарозы.
3. Образцы искусственных волокон и тканей.

Лабораторные опыты

6. Взаимодействие глюкозы с гидроксидом меди(II).
7. Изучение физических свойств крахмала. Взаимодействие крахмала с иодом.

Практические работы

3. Решение экспериментальных задач (1 ч).

Т е м а 8. Азотсодержащие органические соединения (8 ч)

Амины. Определение класса. Классификация аминов. Структурная изомерия и номенклатура аминов.

Первичные насыщенные амины, общая формула. Функциональная группа первичных аминов, ее строение. Молекулярные и структурные формулы. Химические свойства: основные свойства аминов (реакции с водой и неорганическими кислотами), полное окисление.

Анилин как представитель ароматических аминов, его состав и строение. Молекулярная и структурная формулы. Физические свойства. Химические свойства: реакции анилина по аминогруппе (с неорганическими кислотами) и ароматическому ядру (с бромной водой).

Получение анилина из нитробензола. Применение анилина и его производных.

Аминокислоты. Определение класса. Функциональные группы аминокислот. Классификация. Изомерия и номенклатура: тривиальная и ИЮПАК.

α-Аминокислоты. Аминоуксусная кислота как представитель аминокислот, ее состав, строение молекулы.

Физические свойства α-аминокислот. Химические свойства α-аминокислот: взаимодействие с основаниями и кислотами (амфотерные свойства); взаимодействие с аминокислотами (образование пептидов). Пептидная связь. Получение α-аминокислот из α-галогензамещенных карбоновых кислот.

Применение и биологическая роль аминокислот. Аминокислоты заменимые и незаменимые.

Синтетические полиамидные волокна: капрон.

Белки. Белки – природные высокомолекулярные соединения. Состав и строение белковых макромолекул. Первичная, вторичная, третичная и четвертичная структуры белков.

Химические свойства: гидролиз, денатурация, цветные реакции.

Применение и биологическая роль белков.

Демонстрации

1. Модели молекул метиламина и этиламина.
2. Денатурация белков.

Лабораторные опыты

8. Свойства белков: денатурация, цветные реакции.

Практические работы

4. Решение экспериментальных задач (1 ч).

Т е м а 9. Обобщение и систематизация знаний по органической химии (2 ч)

Взаимосвязь между органическими соединениями различных классов.

Влияние синтетических органических веществ на окружающую среду.

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Учащиеся д о л ж н ы:

давать определения понятиям: атом, молекула, атомная орбиталь, энергетический уровень и энергетический подуровень, *s*-, *p*-орбитали, электронная конфигурация атома;

ковалентная связь: полярная и неполярная, одинарная и кратная (двойная, тройная), σ-связь, π-связь, сопряженная; пептидная, водородная; длина связи, валентный угол; химическая формула (общая класса, молекулярная, структурная, эмпирическая); изомер, изомерия (пространственная *цис-транс*, структурная); органическая химия; органические соединения (азотсодержащие: амины, аминокислоты, белки; высокомолекулярные: натуральные и синтетические; кислородсодержащие: альдегиды, жиры, карбоновые кислоты, сложные эфиры, спирты, углеводы, фенолы; углеводороды: насыщенные, ненасыщенные, циклические, ароматические); гомология, гомолог, гомологическая разность; группа (альдегидная, алкильная, аминогруппа, гидроксильная, карбоксильная, нитрогруппа, пептидная, углеводородная); классификация органических соединений; молекула (состав, строение химическое и пространственное); номенклатура ИЮПАК, тривиальные названия органических соединений; пептид; полимер, мономер, степень полимеризации, структурное звено; химические реакции органических соединений (брожения, галогенирования, гидрогалогенирования, гидратации, гидрирования, гидролиза, дегидратации, дегидрирования, дегидрогалогенирования, замещения, изомеризации, каталитические, качественные, нитрования, окисления, отщепления, полимеризации, присоединения, этерификации).

Учащиеся д о л ж н ы у м е т ь:

называть: основные положения теории химического строения органических веществ; алкильные группы; качественные реакции на изученные органические вещества; общие формулы органических соединений различных классов; определения классов органических соединений; органические соединения по номенклатуре ИЮПАК и тривиальными названиями; области практического использования органических веществ и изделий из них; состав и строение органических соединений различных классов, способы получения органических веществ различных классов, волокон, пластмасс, каучуков; тип химической реакции; условия протекания реакций; функциональные группы; характер изменения физических свойств веществ в гомологическом ряду и причину их изменения; химические свойства индивидуального вещества определенного класса;

определять: принадлежность органического соединения к определенному классу по структурной формуле; пространственное строение молекул; типы химических реакций органических соединений по уравнениям; органические соединения (экспериментально по качественным реакциям);

различать: гомологи; изомеры; молекулярные, структурные и скелетные формулы органических соединений; типы химических реакций органических соединений по уравнениям и схемам.

Учащиеся д о л ж н ы о с у щ е с т в л я т ь следующие способы деятельности:

составлять: формулы электронных конфигураций и схемы заполнения электронами атомных орбиталей атомов элементов первых трех периодов; формулу органического соединения (молекулярную, структурную, скелетную – для углеводородов, сокращенную структурную); модели молекул; структурные формулы органических соединений по их названиям; схемы, отражающие взаимосвязь между органическими веществами различных классов; уравнения реакций, отражающие химические свойства изученных веществ и способы их получения;

характеризовать: способы получения органических веществ; строение веществ; тип химической связи; физические свойства органических соединений определенного класса; химические свойства органических соединений определенного класса; образование одинарной, двойной, тройной химической связи;

объяснять: взаимосвязь между составом, строением и свойствами органических веществ; взаимосвязь органических соединений различных классов; причины взаимного влияния атомов в молекулах органических соединений; причины многообразия органических веществ; причины проявления органическими соединениями амфотерных

свойств; причины сходства химических свойств органических соединений одного класса; пространственное строение молекул органических соединений; химические свойства органических соединений с позиции теории химического строения;

анализировать: результаты лабораторных опытов, практических работ; учебную информацию;

применять: изученные понятия и законы при характеристике состава и свойств веществ, химических реакций, способов получения веществ; правила безопасного поведения при обращении с веществами, химической посудой, лабораторным оборудованием и приборами;

обращаться: с органическими веществами, химической посудой, лабораторным оборудованием, приборами;

проводить: математические вычисления при решении расчетных задач; химический эксперимент; моделирование молекул органических соединений;

пользоваться: учебником; инструкцией по правилам безопасного поведения в химическом кабинете; инструкцией при выполнении химического эксперимента.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС ПО ХИМИИ

Основные компоненты УМК

Химия: учеб. пособие для 10-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / И.Е. Шиманович [и др.]; под ред. И.Е. Шимановича. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Ельницкий, А.П. Химия: учеб. для 11-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / А.П. Ельницкий, Е.И. Шарапа. – 3-е изд., пересмотр. и доп. – Минск: Народная асвета, 2013.

Хвалюк, В.Н. Сборник задач по химии: учеб. пособие для 10-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В.Н. Хвалюк, В.И. Резяпкин; под ред. В.Н. Хвалюка. – 2-е изд., перераб. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Шарапа, Е.И. Сборник задач по химии: учеб. пособие для 11-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – 2-е изд., испр. – Минск: Народная асвета, 2010.

Дополнительные компоненты УМК

Борушко, И.И. Химический эксперимент: тетр. для практ. работ и лаборатор. опытов: 11-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / И.И. Борушко. – 6-е изд. – Сэр-Вит, 2015.

Лахвич, Ф.Ф. Химия в таблицах и схемах: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2013.

Мякинник, Т.Н. Химия. 10 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 3-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Мякинник, Т.Н. Химия. 11 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 2-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Уроки химии в 7–11 классах: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского, Т.А. Колевич. – Минск: Аверсэв, 2014.

Химия. 10–11 классы. Химический практикум / Ф.Ф. Лахвич [и др.]. – Минск: «ИНИС-СОФТ», 2010.

Химия: Контрольные и проверочные работы. Тестовые задания: 7–11 классы: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2015.

Химия в 10 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / И.Е. Шиманович [и др.]; под ред. И.Е. Шимановича. – Минск: Народная асвета, 2014.

Шарапа, Е.И. Химия. 11 класс: рабочая тетрадь / Е.И. Шарапа. – 2-е изд., испр. – Минск: Народная асвета, 2010.

Шарапа, Е.И. Тетрадь для лабораторных опытов и практических работ по химии для 10 класса: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – Минск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, Е.И. Тетрадь для лабораторных опытов и практических работ по химии для 11 класса: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – 6-е изд., доп. – Минск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, Е.И. Химия в 11 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий, Т.Н. Мякинник. – Минск: Народная асвета, 2014.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Хімія» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (базавы ўзровень)

ХІМІЯ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Змест адукацыі вучэбнага прадмета «Хімія» арыентаваны на асваенне вучнямі кампетэнцый, неабходных для рацыянальнай дзейнасці ў свеце рэчываў і хімічных ператварэнняў на аснове ведаў аб уласцівасцях найважнейшых рэчываў, якія датычацца чалавека ў штодзённым жыцці, прыродзе, прамысловасці, і разуменне сутнасці хімічных ператварэнняў. Змест адукацыі таксама арыентаваны на фарміраванне ў вучняў разумення ролі хіміі ў вырашэнні найбольш актуальных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам у XXI стагоддзі. Ад правільнага вырашэння гэтых праблем залежыць здароўе людзей, узровень іх жыцця і стан навакольнага асяроддзя.

Мэта вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне сістэмы хімічных ведаў і вопыту іх прымянення, якая забяспечвае разуменне прыродазнаўчанавуковай карціны свету, актыўную адаптацыю ў соцыуме і бяспечныя паводзіны, гатоўнасць да працягу адукацыі на наступных узроўнях і ступенях прафесійнай адукацыі.

Задачы вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

фарміраванне сістэмных хімічных ведаў, якія ствараюць аснову для бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі на ўсіх этапах навучання і будучай прафесійнай дзейнасці;

фарміраванне і развіццё ключавых, агульнапрадметных і прадметна-спецыяльных кампетэнцый – ведаў, уменняў, спосабаў і вопыту дзейнасці з улікам спецыфікі хіміі як фундаментальнай прыродазнаўчай навукі;

фарміраванне і развіццё сацыяльна значных каштоўнасных арыентацый, якія ўключаюць агульнакультурнае і асобаснае развіццё вучняў, усведамленне каштоўнасці атрыманай хімічнай адукацыі, пачуццё адказнасці і патрыятызму, сацыяльную мабільнасць і здольнасць адаптавацца ў розных жыццёвых сітуацыях.

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з вучэбным планам, які прадугледжвае для вывучэння хіміі на базавым узроўні 2 гадзіны на тыдзень (усяго 70 гадзін).

Структура вучэбнай праграмы прадугледжвае вывучэнне арганічнай хіміі ў X класе. Вывучэнне вучэбнага матэрыялу пачынаецца з тэмы «Уводзіны ў арганічную хімію», разлічанай на фарміраванне неабходных кампетэнцый, накіраваных на разуменне асноў тэорыі будовы рэчыва. Далейшы разгляд вучэбнага матэрыялу грунтуецца на звестках аб электроннай будове атамаў і электроннай прыродзе хімічнай сувязі ў малекулах арганічных злучэнняў. Разглядаюцца будова і ўласцівасці арганічных рэчываў асноўных класаў. Прапанаваная паслядоўнасць вучэбных тэм у праграме дазваляе раскрыць прынцып ускладнення будовы і генетычнага развіцця ад вуглевадародаў да больш складаных арганічных злучэнняў. Пры вывучэнні курса вучні будуць знаёміцца з залежнасцю ўласцівасцей арганічных рэчываў ад будовы малекул, прымяненнем арганічных злучэнняў у розных сферах жыццядзейнасці чалавека.

У вучэбнай праграме пададзены вучэбныя тэмы і прыкладны час на іх вывучэнне.

Для кожнай тэмы ў праграме вызначаны пытанні, якія павінны быць вывучаны, тыпы разліковых задач, пералічаны дэманстрацыі, лабараторныя доследы, тэмы практычных работ. Настаўніку даецца права замены дэманстрацыйных і лабараторных доследаў на іншыя (раўнацэнныя), больш даступныя ва ўмовах дадзенай установы адукацыі. Па сваім меркаванні настаўнік можа павялічыць колькасць дэманстрацыйных доследаў. Прадугледжаны час для правядзення кантрольных работ.

Названая ў праграме колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбных тэм, з'яўляецца прыкладнай. Яна можа быць пераразмеркавана паміж тэмамі ў разумных межах (2–4 гадзіны). Рэзервовы час настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні. Акрамя таго, магчыма змяненне паслядоўнасці вывучэння пытанняў у рамках асобнай вучэбнай тэмы пры адпаведным абгрунтаванні такіх змяненняў.

У праграме ёсць раздзел «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». На аснове гэтых патрабаванняў ажыццяўляецца кантроль і ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якасці засваення ведаў і ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцый.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(2 гадзіны на тыдзень; усяго 70 гадзін, з іх 2 гадзіны – рэзервовы час)

Т э м а 1. Уводзіны ў арганічную хімію (8 гадзін)

Будова атама. Стан электрона ў атаме. Атамная арбіталь. Энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень, *s*-, *p*-арбіталі ў атаме. Электронныя канфігурацыі атамаў элементаў першых трох перыядаў (размеркаванне электронаў па арбіталях). Асаблівасці электроннай будовы атама вугляроду.

Кавалентная сувязь. Палярная і непалярная кавалентная сувязь. Адзінарныя і кратныя сувязі (σ- і π-сувязі).

Прадмет арганічнай хіміі.

Асноўныя палажэнні тэорыі хімічнай будовы арганічных рэчываў.

Класіфікацыя арганічных рэчываў.

Дэманстрацыі

1. Якаснае вызначэнне вугляроду, вадароду і галагенаў у арганічных злучэннях.

Т э м а 2. Вуглевадароды (16 гадзін)

Алканы. Азначэнне класа, гамалагічны рад і агульная формула алкана. Гамолагі, гамалагічная рознасць.

Метан – найпрасцейшы прадстаўнік насычаных вуглевадародаў – алканаў. Валентныя вуглы ў малекуле метана. Электронная і прасторавая будова малекул алканаў. Даўжыня сувязі С–С у малекулах алканаў.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алканаў. Структурная ізамерыя алканаў – ізамерыя вугляроднага шкілета. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: галагенаванне (рэакцыя замяшчэння), акісленне, тэрмічныя ператварэнні (крэкінг), ізамерызацыя. Атрыманне (гідрыраванне злучэнняў з кратнымі сувязямі) і прымяненне алканаў.

Алкены. Азначэнне класа і агульная формула алкенаў. Этылен – найпрасцейшы прадстаўнік ненасычаных вуглевадародаў – алкенаў. Даўжыня сувязі C=C, валентныя вуглы ў малекуле этылену. Электронная і прасторавая будова алкенаў.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алкенаў. Ізамерыя: структурная (вугляроднага шкілета і становішча двайной сувязі), прасторавая (*цыс-*, *транс-)*. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: акісленне, далучэнне вадароду, галагенаў да алкенаў. Далучэнне вады і галагенавадародаў да этылену. Якасныя рэакцыі на двайную сувязь з растворамі брому і перманганату калію. Полімерызацыя этылену. Атрыманне алкенаў (дэгідрыраванне алканаў, дэгідрагалагенаванне галагеналканаў, дэгідратацыя спіртоў, гідрыраванне алкінаў). Прымяненне алкенаў.

Дыены. Вуглевадароды са спалучанымі двайнымі сувязямі. Будова малекул бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3 (ізапрэну), іх малекулярныя і структурныя формулы. Фізічныя ўласцівасці бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3.

Хімічныя ўласцівасці бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3: далучэнне вадароду, галагенаў, рэакцыя полімерызацыі.

Атрыманне бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3 дэгідрыраваннем алканаў. Прымяненне дыенавых вуглевадародаў. Прыродны і сінтэтычны каўчукі.

Алкіны. Азначэнне класа і агульная формула алкінаў. Ацэтылен – найпрасцейшы прадстаўнік ненасычаных вуглевадародаў – алкінаў. Даўжыня сувязі C≡C, валентныя вуглы ў малекуле ацэтылену. Электронная і прасторавая будова малекул алкінаў.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алкінаў. Структурная ізамерыя вугляроднага шкілета і становішча трайной сувязі. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: далучэнне вадароду, галагенаў да алкінаў, галагенавадародаў, вады да ацэтылену; поўнае акісленне. Якасныя рэакцыі на трайную сувязь з растворамі брому і перманганату калію. Атрыманне ацэтылену з метану і карбіду кальцыю. Прымяненне алкінаў.

Арэны. Азначэнне класа і агульная формула арэнаў рада бензолу. Бензол – найпрасцейшы прадстаўнік араматычных вуглевадародаў. Наменклатура і ізамерыя арэнаў рада бензолу. Электронная і прасторавая будова малекулы бензолу. Даўжыня сувязі вугляро–вугляро і валентныя вуглы ў малекуле бензолу. Фізічныя ўласцівасці бензолу.

Хімічныя ўласцівасці бензолу: рэакцыі замяшчэння ў араматычным ядры (галагенаванне, нітраванне), каталітычнае гідрыраванне.

Атрыманне бензолу трымерызацыяй ацэтылену, дегідрыраваннем гексану і цыклагексану. Прымяненне араматычных злучэнняў.

Узаемасувязь паміж насычанымі і ненасычанымі вуглевадародамі.

Вуглевадароды ў прыродзе. Нафта і прыродны газ як крыніцы вуглевадародаў. Састаў і фізічныя ўласцівасці. Спосабы перапрацоўкі нафты: перагонка, тэрмічны і каталітычны крэкінг. Прадукты перапрацоўкі нафты. Ахова навакольнага асяроддзя ад забруджванняў пры перапрацоўцы вуглевадароднай сыравіны і выкарыстанні прадуктаў перапрацоўкі нафты.

Разліковыя задачы

1. Вывад формул арганічных рэчываў па агульнай формуле, якая адлюстроўвае іх састаў.
2. Вызначэнне малекулярных формул арганічных рэчываў на аснове прадуктаў іх згарання.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул насычаных і ненасычаных вуглевадародаў.
2. Узоры пластмас.

3. Узоры натуральнага і сінтэтычных каўчукоў, рызіны.
4. Атрыманне ацэтылену карбідным спосабам.
5. Адносіны ацэтылену да раствору брому і перманганату калію.
6. Калекцыя «Прадукты перапрацоўкі нафты».

Лабараторныя доследы

1. Выраб шарастрыжнёвых мадэлей малекул вуглевадародаў.

Практычныя работы

1. Атрыманне этылену і вывучэнне яго ўласцівасцей (1 гадзіна).

Т э м а 3. Спірты і фенолы (8 гадзін)

Спірты. Функцыянальная група спіртоў, яе электронная будова. Класіфікацыя спіртоў: аднаатамныя і мнагаатамныя; першасныя, другасныя, трацічныя.

Насычаныя аднаатамныя спірты. Азначэнне класа, агульная формула, састаў, будова, малекулярныя і структурныя формулы насычаных аднаатамных спіртоў. Метанол і этанол як прадстаўнікі насычаных аднаатамных спіртоў. Структурная ізамерыя вугляроднага шкілета і становішча функцыянальнай групы насычаных аднаатамных спіртоў. Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы спіртоў.

Фізічныя ўласцівасці. Вадародная сувязь і яе ўплыў на тэмпературу кіпення і растваральнасць спіртоў.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, карбонавымі кіслотамі, галагенавадародамі, дэгідратацыя; акісленне: поўнае і частковае (да альдэгідаў).

Атрыманне спіртоў у лабараторыі гідролізам галагеналканаў, атрыманне этанолу гідратацыяй этылену. Прымяненне спіртоў. Таксічнасць спіртоў, іх уздзеянне на арганізм чалавека.

Мнагаатамныя спірты. Этыленгліколь (этандыол-1,2) і гліцэрына (прапантрыол-1,2,3) як прадстаўнікі мнагаатамных спіртоў, іх састаў, будова і структурныя формулы.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, арганічнымі і мінеральнымі кіслотамі, галагенавадародамі, гідраксідам медзі(II) (якасная рэакцыя на мнагаатамныя спірты). Прымяненне этыленгліколю і гліцэрыны.

Узаемасувязь паміж насычанымі, ненасычанымі вуглевадародамі і спіртамі.

Фенолы. Паняцце аб фенолах, азначэнне класа. Састаў і будова фенолу; малекулярная і структурная формулы. Фізічныя ўласцівасці фенолу.

Хімічныя ўласцівасці фенолу: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, растворамі шчолачаў, браміраванне і нітраванне па араматычным ядры. Якасныя рэакцыі на фенол з бромнай вадой і растворамі солей жалеза(III). Узаемны ўплыў груп атамаў у малекуле фенолу.

Прымяненне фенолу.

Разліковыя задачы

3. Разлікі па хімічных ураўненнях, калі адно з рэагуючых рэчываў узята з лішкам.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метанолу, этанолу, этыленгліколю, гліцэрыны.
2. Параўнанне растваральнасці ў вадзе насычаных аднаатамных спіртоў.
3. Узаемадзеянне этанолу з натрыем.
4. Гарэнне этанолу.

Лабараторныя доследы

2. Акісленне этанолу аксідам медзі(II).
3. Узаемадзеянне гліцэрыны з гідраксідам медзі(II).

Т э м а 4. Альдэгіды (5 гадзін)

Альдэгіды. Функцыянальная альдэгідная група. Азначэнне класа альдэгідаў. Метаналь і этаналь як прадстаўнікі альдэгідаў, іх састаў, будова, малекулярныя і структурныя формулы.

Насычаныя альдэгіды: агульная формула, структурная ізамерыя вугляроднага шкілета.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы альдэгідаў. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: рэакцыі аднаўлення, акіслення да карбонавых кіслот. Якасныя рэакцыі на альдэгідную групу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі(II).

Атрыманне альдэгідаў акісленнем першасных спіртоў. Атрыманне этаналю гідратацыяй ацэтылену. Прымяненне метаналю і этаналю.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул альдэгідаў.
2. Акісленне альдэгіду (реакцыя «сярэбранага люстэрка»).

Лабараторныя доследы

4. Акісленне альдэгіду гідраксідам медзі(II).

Т э м а 5. Карбонавыя кіслоты (7 гадзін)

Карбонавыя кіслоты. Функцыянальная карбаксільная група. Азначэнне класа карбонавых кіслот. Класіфікацыя карбонавых кіслот: насычаныя, ненасычаныя, араматычныя; аднаасноўныя, двухасноўныя.

Аднаасноўныя насычаныя карбонавыя кіслоты: састаў, будова; агульная, малекулярныя і структурныя формулы. Структурная ізамерыя вугляроднага шкілета.

Мурашыная і воцатная кіслоты як прадстаўнікі насычаных аднаасноўных карбонавых кіслот. Пальміцінавая і стэарынавая кіслоты як прадстаўнікі найвышэйшых насычаных карбонавых кіслот.

Намеклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы карбонавых кіслот. Фізічныя ўласцівасці карбонавых кіслот, уплыў на тэмпературу кіпення і растваральнасць.

Хімічныя ўласцівасці: змена афарбоўкі індыкатараў, узаемадзеянне з металамі, асноўнымі і амфатэрнымі аксідамі і гідраксідамі, солямі больш слабых кіслот. Рэакцыя этэрыфікацыі. Рэакцыя замяшчэння атама вадароду метыльнай групы воцатнай кіслаты на атам галагену. Атрыманне карбонавых кіслот акісленнем алканаў, першасных спіртоў і альдэгідаў.

Алеінавая кіслата як прадстаўнік аднаасноўных ненасычаных карбонавых кіслот: састаў, будова. Хімічныя ўласцівасці: далучэнне вадароду і галагенаў па двайной сувязі вуглевадароднай групы.

Прымяненне карбонавых кіслот.

Узаемасувязь паміж вуглевадародамі, спіртамі, альдэгідамі, карбонавымі кіслотамі.

Разліковыя задачы

4. Разлікі па ўраўненнях рэакцый, якія адбываюцца ў растворах.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул карбонавых кіслот.
2. Растваральнасць карбонавых кіслот у вадзе, дзеянне на індыкатары.
3. Адносіны алеінавай кіслаты да растворaў перманганату калію і брому; узаемадзеянне са шчолаччу.

Практычныя работы

2. Параўнанне ўласцівасцей карбонавых і неарганічных кіслот.

Т э м а 6. Складаныя эфіры. Тлушчы (4 гадзіны)

Складаныя эфіры. Азначэнне класа. Састаў, будова, малекулярная і структурная формулы. Складаныя эфіры – вытворныя карбонавых кіслот і спіртоў, агульная формула. Этылавы эфір воцатнай кіслаты як прадстаўнік складаных эфіраў.

Ізамерыя складаных эфіраў: структурная і міжкласавая (з карбонавымі кіслотамі). Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы складаных эфіраў. Фізічныя ўласцівасці. Атрыманне складаных эфіраў: рэакцыя этэрыфікацыі.

Хімічныя ўласцівасці: гідроліз (кіслотны і шчолачны).

Складаныя эфіры ў прыродзе. Прымяненне. Поліэфірныя валокны (лаўсан).

Тлушчы. Састаў і будова трыгліцэрыдаў. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз, гідрыраванне, акісленне. Біялагічная роля тлушчаў.

Мыла. Паняцце аб сінтэтычных мыйных сродках (СМС).

Выхад прадукту рэакцыі.

Разліковыя задачы

5. Вызначэнне выхаду прадукту хімічнай рэакцыі.

Дэманстрацыі

1. Атрыманне складанага эфіру воцатнай кіслаты.
2. Узоры складаных эфіраў, поліэфірных валокнаў і палімераў.

Лабараторныя доследы

5. Даследаванне ўласцівасцей тлушчаў (растваральнасць, доказ ненасычанага характару астаткаў карбонавых кіслот).

Т э м а 7. Вугляводы (10 гадзін)

Вугляводы. Азначэнне класа. Агульная формула, састаў, будова, класіфікацыя вугляводаў.

Монацукрыды. Глюкоза: састаў, функцыянальныя групы, будова малекулы. Лінейная і цыклічная α- і β-формы малекулы глюкозы. Фруктоза – ізамер глюкозы. Фізічныя ўласцівасці глюкозы і фруктозы.

Хімічныя ўласцівасці глюкозы: акісленне да глюконавай кіслаты, аднаўленне да шасціатамнага спірту сарбіту; браджэнне (спіртавое і малочнакіслае). Якасныя рэакцыі на глюкозу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі(II). Знаходжанне ў прыродзе, атрыманне і прымяненне глюкозы.

Дыцукрыды. Цукроза як прадстаўнік дыцукрыдаў, яе састаў. Малекулярная формула. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз. Атрыманне і прымяненне цукрозы.

Поліцукрыды. Крухмал – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул крухмалу (астаткі α-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: гідроліз (ферментатыўны, кіслотны); рэакцыя з ёдам (якасная рэакцыя на крухмал).

Значэнне вугляводаў як пажыўных рэчываў.

Цэлюлоза – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул цэлюлозы (астаткі β-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: гарэнне, гідроліз, узаемадзеянне з неарганічнымі і арганічнымі кіслотамі з утварэннем складаных эфіраў. Натуральныя і штучныя валокны. Прымяненне цэлюлозы і яе вытворных.

Дэманстрацыі

1. Рэакцыя «сярэбранага люстэрка» з глюкозай.
2. Гідроліз цукрозы.
3. Узоры штучных валокнаў і тканін.

Лабараторныя доследы

6. Узаемадзеянне глюкозы з гідраксідам медзі(II).

7. Вывучэнне фізічных уласцівасцей крухмалу. Узаемадзеянне крухмалу з ёдам.

Практычныя работы

3. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Т э м а 8. Азотзмяшчальныя арганічныя злучэнні (8 гадзін)

Аміны. Азначэнне класа. Класіфікацыя амінаў. Структурная ізамерыя і наменклатура амінаў.

Першасныя насычаныя аміны, агульная формула. Функцыянальная група першасных амінаў, яе будова. Малекулярныя і структурныя формулы. Хімічныя ўласцівасці: асноўныя ўласцівасці амінаў (рэакцыі з вадой і неарганічнымі кіслотамі), поўнае акісленне.

Анілін як прадстаўнік араматычных амінаў, яго састаў і будова. Малекулярная і структурная формулы. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: рэакцыі аніліну па амінагрупе (з неарганічнымі кіслотамі) і араматычным ядры (з бромнай вадой).

Атрыманне аніліну з нітрабензолу. Прымяненне аніліну і яго вытворных.

Амінакіслоты. Азначэнне класа. Функцыянальныя групы амінакіслот. Класіфікацыя. Ізамерыя і наменклатура: трывіяльная і ІЮПАК.

α-Амінакіслоты. Амінавоцатная кіслата як прадстаўнік амінакіслот, яе састаў, будова малекулы.

Фізічныя ўласцівасці α-амінакіслот. Хімічныя ўласцівасці α-амінакіслот: узаемадзеянне з асновамі і кіслотамі (амфатэрныя ўласцівасці); узаемадзеянне з амінакіслотамі (утварэнне пептыдаў). Пептыдная сувязь. Атрыманне α-амінакіслот з α-галагензамешчаных карбонавых кіслот.

Прымяненне і біялагічная роля амінакіслот. Амінакіслоты заменныя і незаменныя.

Сінтэтычныя поліамідныя валокны: капрон.

Бялкі. Бялкі – прыродныя высокамалекулярныя злучэнні. Састаў і будова бялковых макрамалекул. Першасная, другасная, трацічная і чацвярцічная структуры бялкоў.

Хімічныя ўласцівасці: гідроліз, дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Прымяненне і біялагічная роля бялкоў.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метыламіну і этыламіну.

2. Дэнатурацыя бялкоў.

Лабараторныя доследы

8. Уласцівасці бялкоў: дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Практычныя работы

4. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Т э м а 9. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў па арганічнай хіміі (2 гадзіны)

Узаемасувязь паміж арганічнымі злучэннямі розных класаў.

Уплыў сінтэтычных арганічных рэчываў на навакольнае асяроддзе.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні п а в і н н ы:

даваць азначэнні паняццям: атам, малекула, атамная арбіталь, энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень, *s*-, *p*-арбіталі, электронная канфігурацыя атама; кавалентная

сувязь: палярная і непалярная, адзінарная і кратная (двайная, трайная), σ-сувязь, π-сувязь, спалучаная; пептыдная, вадародная; даўжыня сувязі, валентны вугал; хімічная формула (агульная класа, малекулярная, структурная, эмпірычная); ізамер, ізамерыя (прасторавая *цыс-транс*, структурная); арганічная хімія; арганічныя злучэнні (азотзмяшчальныя: аміны, амінакіслоты, бялкі; высокамалекулярныя: натуральныя і сінтэтычныя; кіслародзмяшчальныя: альдэгіды, тлушчы, карбонавыя кіслоты, складаныя эфіры, спірты, вугляводы, фенолы; вуглевадароды: насычаныя, ненасычаныя, цыклічныя, араматычныя); гамалогія, гамолаг, гамалагічная рознасць; група (альдэгідная, алкільная, амінагрупа, гідраксільная, карбаксільная, нітрагрупа, пептыдная, вуглевадародная); класіфікацыя арганічных злучэнняў; малекула (састаў, будова хімічная і прасторавая); наменклатура ІЮПАК, трывіяльныя назвы арганічных злучэнняў; пептыд; палімер, манамер, ступень полімерызацыі, структурнае звяно; хімічныя рэакцыі арганічных злучэнняў (браджэння, галагенавання, гідрагалагенавання, гідратацыі, гідрыравання, гідролізу, дэгідратацыі, дэгідрыравання, дэгідрагалагенавання, замяшчэння, ізамерызацыі, каталітычныя, якасныя, нітравання, акіслення, адшчаплення, полімерызацыі, далучэння, этэрыфікацыі).

Вучні п а в і н н ы ў м е ц ь:

называць: асноўныя палажэнні тэорыі хімічнай будовы арганічных рэчываў; алкільныя групы; якасныя рэакцыі на вывучаныя арганічныя рэчывы; агульныя формулы арганічных злучэнняў розных класаў; азначэнні класаў арганічных злучэнняў; арганічныя злучэнні па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльнымі назвамі; вобласці практычнага выкарыстання арганічных рэчываў і вырабаў з іх; састаў і будову арганічных злучэнняў розных класаў, спосабы атрымання арганічных рэчываў розных класаў, валокнаў, пластмас, каўчукаў; тып хімічнай рэакцыі; умовы працякання рэакцый; функцыянальныя групы; характар змянення фізічных уласцівасцей рэчываў у гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; хімічныя ўласцівасці індывідуальнага рэчыва пэўнага класа;

вызначаць: прыналежнасць арганічнага злучэння да пэўнага класа па структурнай формуле; прасторавую будову малекул; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях; арганічныя рэчывы (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць: гамолагі; ізамеры; малекулярныя, структурныя і шкілетныя формулы арганічных злучэнняў; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях і схемах.

Вучні п а в і н н ы а ж ы ц ц я ў л я ц ь наступныя спосабы дзейнасці:

састаўляць: формулы электронных канфігурацый і схемы запаўнення электронамі атамных арбіталей атамаў элементаў першых трох перыядаў; формулу арганічнага злучэння (малекулярную, структурную, шкілетную – для вуглевадародаў, скарочаную структурную); мадэлі малекул; структурныя формулы арганічных злучэнняў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж арганічнымі рэчывамі розных класаў; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць хімічныя ўласцівасці вывучаных рэчываў і спосабы іх атрымання;

характарызаваць: спосабы атрымання арганічных рэчываў; будову рэчываў; тып хімічнай сувязі; фізічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; утварэнне адзінарнай, двайной, трайной хімічнай сувязі;

тлумачыць: узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі арганічных рэчываў; узаемасувязь арганічных злучэнняў розных класаў; прычыны ўзаемнага ўплыву атамаў у малекулах арганічных злучэнняў; прычыны разнастайнасці арганічных рэчываў; прычыны праяўлення арганічнымі злучэннямі амфатэрных уласцівасцей; прычыны падабенства хімічных уласцівасцей арганічных злучэнняў аднаго класа; прасторавую будову малекул арганічных злучэнняў; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

аналізаваць: вынікі лабараторных доследаў, практычных работ; вучэбную інфармацыю;

прымяняць: вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей рэчываў, хімічных рэакцый, спосабаў атрымання рэчываў; правілы бяспечных паводзін пры абыходжанні з рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем і прыборамі;

Гандбол. Перадачы мяча адной рукой на кароткую, сярэднюю і доўгую адлегласць ад пляча, збоку, знізу і над галавой*. Перадачы і лоўля мяча ў тройках, з адскокам ад падлогі, пры сустрэчным руху*. Лоўля мяча дзвюма рукамі стоячы на месцы і ў руху. Вядзенне мяча ў спалучэнні са змяненнем хуткасці перамяшчэння, абводкай праціўніка, перадачамі і кідкамі па варотах*. Індывідуальныя дзеянні ў нападзенні, якія адцягваюць увагу. Штрафны кідок*. Кідок з апорнага становішча*. Гульня варатара: адбіванне і лоўля мяча*. Двухбаковая гульня.

Футбол. Удары правай і левай нагой па мячы, які не рухаецца, і па мячы, які коціцца, сярэдзінай пад'ёму ступні*, унутраным бокам ступні*, знешняй часткай пад'ёму, наском, удары па мячы, які ляціць. Вядзенне мяча разнастайнымі спосабамі. Жанглiраванне мячом адной і дзвюма нагамі. Тэхніка-тактычныя звязкі: вядзенне – перадача, прыём – перадача, прыём – вядзенне – перадача*. Тактычныя дзеянні ў абароне і нападзенні пры гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 ігракоў.

Рухавыя гульні і эстафеты на развіццё каардынацыйных здольнасцей, гібкасці, хуткасці (з вядзеннем мяча, абвядзеннем стоек, прыёмам і спыненнем мяча, ударамі па варотах), гульні з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, з абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара).

Гульня ў міні-футбол і футбол па спрошчаных правілах.

Тэсціраванне ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучня

Выкананне тэставых практыкаванняў плануецца настаўнікам на пачатак і заканчэнне навучальнага года. На працягу аднаго ўрока не рэкамендуецца выкарыстоўваць больш за два тэставыя практыкаванні.

Вынікі тэставых практыкаванняў (табліца 2) выкарыстоўваюцца як для вызначэння ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці вучняў, так і для карэкціроўкі паўрочнага каляндарна-тэматычнага плана, зместу планаў-канспектаў урокаў.

Умовы выканання тэставых практыкаванняў прадстаўлены ў дадатку 2.

Пералік тэставых практыкаванняў:

нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе *або* нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы;

падцягванне на перакладзіне *або* згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (ю); падыманне тулава з зыходнага становішча лежачы на спіне за 1 мін *або* падыманне і апусканне прамых ног за 1 мін (дз);

бег 30 м;

чаўночны бег 4 х 9 м *або* скокі праз кароткую скакалку за 1 мін;

скачок у даўжыню з месца *або* трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі (ю), кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча седзячы ногі паасобку (дз);

бег 1500 м (ю), 1000 м (дз), *або* хадзьба 3000 м (ю), 2000 м (дз), *або* 6-мінутны бег.

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ

Плаванне

Практыкаванні на сушы. Актыўныя і пасіўныя практыкаванні для развіцця рухомасці ступні, плечавых, тазабедраных і галёнкаступнёвых суставаў. Практыкаванні сілавога характару для развіцця сілавой вынослівасці мышцаў рук, ног, брушнога прэса, спіны. Імітацыйныя практыкаванні для развіцця каардынацыі рухаў рук і ног. Спецыяльныя практыкаванні для адпрацоўкі павароту на сушы.

Практыкаванні ў вадзе. Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на грудзях»: плаванне з дошкай на нагах, плаванне на руках, узгадненне рухаў рук, ног і дыхання; з зыходнага становішча лежачы на грудзях, рукі ўверсе праплыванне адрэзкаў да 25 м з выкананнем грабка толькі левай рукой, затым толькі правай рукой, адначасова дзвюма рукамі з выкарыстаннем для падтрымкі ног дошкі, надзіманага круга і

да т.п.; тое ж самае, але ўключаючы работу ног, з увагай да дыхання; плаванне спосабам «кроль на грудзях» у поўнай каардынацыі. Пераадоленне дыстанцыі 25–30 м без уліку часу.

Каардынацыя рухаў рук і ног пры плаванні спосабам «кроль на спіне»: з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверсе праплыванне адрэзкаў да 25 м з выкананнем грабка толькі левай рукой, затым толькі правай рукой, адначасова двюма рукамі з выкарыстаннем для падтрымкі ног дошкі, надзіманага круга і да т.п.; плаванне спосабам «кроль на спіне» ў поўнай каардынацыі. Пераадоленне дыстанцыі 25–50 м без уліку часу.

Скачкі ў ваду. Скачкі ў ваду з борціка нагамі ўніз. Спад галавой уніз з зыходных становішчаў седзячы на борціку і седзячы на тумбачцы. Стартавы скачок у ваду з тумбачкі.

Аэробіка спартыўная (дзяўчаты)

Базавыя рухі, уменні і навыкі

Разнавіднасці бегу. Бег на месцы, з рухам наперад і назад. Выкананне базавых крокаў у форме бегу. Спалучэнні з розных форм бегу ў спалучэнні з воплескамі, згінаннямі і разгінаннямі рук, падыманнем і апусканнем рук і з кругамі.

Пад'ём калена. Пад'ём калена з кругам рукой. Спалучэнні бегу з падскокамі і пад'ёмамі калена.

Выпады. Спалучэнні з разнавіднасцей бегу, падскокаў, пад'ёмаў калена, падскокаў ногі паасобку – ногі разам з выпадамі.

Махі. Спалучэнні з махаў і пад'ёмаў калена з рухамі рук. Спалучэнні і звязкі з разнавіднасцей бегу, падскокаў, выпадаў, пад'ёмаў калена і махаў з рухамі рук.

Элементы цяжкасці

Элементы дынамічнай сілы. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы з апорай на калені, з апорай ногі паасобку.

Кругавыя рухі папераменнай правай і левай нагой з зыходнага становішча прысед на адной, другая – убок на насок.

Элементы статычнай сілы. З зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверх або за галаву пад'ём і апусканне тулава. Вугал з апорай (прыпадыманне ног над падлогай ва ўпоры седзячы або пад'ём таза над падлогай у тым жа зыходным становішчы). Вуглы (сілавое ўтрыманне ног ва ўпоры): вугал ногі паасобку з апорай на адну руку, упор вуглом ногі паасобку, упоры вуглом ногі паасобку на гімнастычнай лаўцы.

Скачкі. Скачкі прагнуўшыся, скачкі з падкіднога мосціка, скачкі ў глыбіню (з гімнастычнай лаўкі) з прызямленнем у паўпрысед, рукі ў бакі. Скачкі з паваротам на 180°, 360°. З апорай рукамі на гімнастычную сценку скачкі ўверх з развядзеннем ног у бакі на вугал, не меншы за 90°. Скачкі «нажніцы» (з пачарговым узмахам ног уперад).

Спецыяльная фізічная падрыхтоўка

Спецыяльная сілавая падрыхтоўка. Утрыманне: упору лежачы на сагнутых руках, ног пад прамым вуглом у вісе на гімнастычнай сценцы, тулава прагнуўшыся ва ўпоры лежачы на бёдрах, ног пад прамым вуглом ва ўпоры седзячы на гімнастычнай лаўцы.

Спецыяльная хуткасна-сілавая падрыхтоўка. Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы на каленях з воплескамі; з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі ўверсе пераход у сед у групоўцы і вяртанне ў зыходнае становішча, павароты кругом з упору лежачы ў правы і левы бок; скачковыя практыкаванні з выкарыстаннем падкіднога мосціка і гімнастычнай лаўкі.

Аэробіка спартыўная. Развучванне і ўдасканальванне звязак і кампазіцый аэробікі спартыўнай, якія змяшчаюць базавыя рухі, элементы цяжкасці, складзеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі правіл спаборніцтваў. Спаборніцтвы ў выкананні вывучаных звязак і кампазіцый.

Гімнастыка атлетычная (юнакі)

Фарміраванне правільнай паставы. Хадзьба з прадметам на галаве па лініі на падлозе, па гімнастычнай лаўцы; хадзьба з гімнастычнай палкай за спінай, за галавой, над галавой, прыстаўнымі крокамі па гімнастычнай лаўцы; па гімнастычнай лаўцы з паваротамі, прысяданнямі з захаваннем правільнай паставы.

Практыкаванні для разнастайных груп мышцаў:

для мышцаў галёнкі: пад'ёмы на наскі з абцяжарваннем;

для мышцаў спіны: нахілы ўперад са штангай за галавой, цяга штангі да грудзей у становішчы лежачы, цяга Т-падобнай штангі да грудзей у нахіле, падцягванні на перакладзіне;

для мышцаў грудзей: жым гантэлей на нахіленай лаўцы галавой уніз, жым штангі вузкім хватам, развядзенне рук з гантэлямі ў становішчы лежачы на нахіленай лаўцы галавой уніз;

для мышцаў плечавога пояса: жым гантэлей стоячы, цяга блочнага ўстройства адной рукой, у нахіле, развядзенне рук з гантэлямі на нахіленай лаўцы, пад'ём гантэлі адной рукой у становішчы лежачы на нахіленай лаўцы пад вуглом 45°;

для мышцаў рук: згінанне рук на лаўцы пад вуглом 45°, седзячы хватам зверху, разгінанне рук са штангай з-за галавы, з-за галавы стоячы; у становішчы лежачы на нахіленай лаўцы;

для мышцаў брушнога прэса: падцягванне каленяў да грудзей седзячы, нахілы тулава ў бакі;

для мышцаў бядра: частковыя прысяданні (практыкаванне выконваецца на чвэрць, палавіну або тры чвэрці амплітуды).

Практыкаванні, комплексы і гульні для развіцця каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей вучняў

Кросавы бег працягласцю ад 15–20 да 30–40 мін з частатой пульсу 120–140 уд./мін; пераменны, паўторны бег; гульня ў футбол, баскетбол, гандбол.

Агульнаразвіццёвыя практыкаванні з абцяжарваннем вагой уласнага цела, з пераадоленнем супраціўлення пругкіх уласцівасцей прадметаў (эспандар). Практыкаванні на гімнастычных снарадах, трэнажорах, з інвентаром, якія выконваюцца ў комплексах кругавой трэніроўкі і ўключаюць да 8–12 станцый.

Выпады ўперад са штангай на плячах у паўпрыседзе. Прысяданні са штангай на грудзях. Прысяданні з апорай на падстаўку за спінай, тулава адхілена назад, пад пяткі падкладзены брусок. Пад'ёмы на наскі ў становішчы седзячы са штангай на каленях. Цяга штангі да грудзей шырокім хватам у нахіле, у становішчы лежачы, падцягванне на перакладзіне шырокім хватам. Нахілы ўперад са штангай за галавой. Жым штангі на гарызантальнай і нахіленай лаўцы. Жым штангі вузкім хватам. Жым гантэлей у становішчы седзячы. Цяга блока адной рукой. Згінанне і разгінанне рук з гантэлямі, са штангай у локцевых суставах. Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі, са штангай з-за галавы. Пад'ёмы каленяў да грудзей у становішчы седзячы. Нахілы тулава ў бакі. Цяга блока ўніз у становішчы стоячы на каленях. Частковыя прысяданні ў становішчы стоячы са штангай на плячах, ногі на шырыні плячэй, пад пяткі падкладсці брусок вышынёй 3–5 см. Развядзенне рук з гантэлямі ў становішчы лежачы на лаўцы. Развядзенне прамых рук з гантэлямі ў становішчы лежачы тварам уніз на нахіленай лаўцы да 45°. Пад'ём гантэлі адной рукой у становішчы лежачы бокам на гарызантальнай лаўцы хватам зверху. Выпрастванне рук з гантэлямі ў становішчы нахілу ўперад. Разгінанне рук у локцевых суставах з гантэлямі ў становішчы лежачы на лаўцы.

Баскетбол

Скачкі штуршком адной і дзвюма нагамі. Спыненне крокам і скачком. Павароты ў становішчы стоячы на месцы, развароты.

Перадачы мяча дзвюма рукамі ад грудзей, дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча ў становішчы стоячы на месцы і ў руху.

Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей, адной і дзвюма рукамі пры паралельным і сустрэчным руху, у скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнямі і паваротамі.

Спалучэнне прыёмаў «лоўля – перадача – паварот».

Вядзенне мяча са змяненнем вышыні адскоку і напрамку, з абвядзеннем перашкод, па крузе; са спыненнем, паваротамі, перадачамі па сігнале.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей, адной ад пляча, з адскокам і без адскоку ад шчыта, пад вуглом да шчыта ў руху, пасля вядзення і двух крокаў, штрафныя кідкі.

Спалучэнне прыёмаў «перадача – лоўля – вядзенне – кідок».

Захоп мяча – вырыванне. Вырыванне і выбіванне мяча ў іграка, які спыніўся пасля вядзення. Накрыванне мяча. Перахоп мяча ў становішчы стоячы збоку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля. Перахоп перадачы, выкананай уздоўж пляцоўкі.

Тактычныя дзеянні іграка без мяча: выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, у бок ад партнёра з мячом.

Вызначэнне гульнявой сітуацыі, мэтазгоднай для прымянення вядзення, перадачы, кідка па кальцы. Выбар спосабу вядзення мяча і кідка па кальцы.

Індывідуальныя дзеянні пры нападзенні: кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку і спосабу перадачы з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці саперніка, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць абаронцы; узаемадзеянне ігракоў нападзення і абароны паміж сабой для завяршэння атакі. Камандныя дзеянні: нападзенне з выхадам у адрыў. Зонная абарона.

Прымяненне спалучэнняў вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульне ў баскетбол.

Валейбол

Перамяшчэнне прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад, з выскокваннем і прызямленнем на абедзве нагі. Скачок уверх штуршком адной і дзвюма нагамі. Падзенне ў правы і левы бок на бядро і тулава з месца і з кроку. Падзенне назад з перакатам на спіну.

Шматразовыя перадачы мяча зверху і знізу дзвюма рукамі над сабой, з адскокам ад сценкі, у парах і тройках, з пераменай месцаў, праз сетку ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем уздоўж сеткі. Перадача мяча дзвюма рукамі зверху ў скачку.

Прыём мяча знізу дзвюма рукамі пасля падачы, знізу ў падзенні ўправа і ўлева, знізу адной рукой у падзенні ўперад з апорай на другую руку. Прыём мяча, які адскочыў ад сеткі. Гульня нагой і іншымі часткамі цела.

Атакуючы ўдар у скачку штуршком адной і дзвюма нагамі з 2, 3 і 4 зоны, атакуючы ўдар з другой лініі. Падманны атакуючы ўдар. Блакіраванне атакуючага ўдару.

Ніжняя і верхняя прамая падача з пападаннем у 1, 5 і 6 зоны.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, падманныя перадачы і ўдары; выбар напрамку перадачы і атакуючага ўдару з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці саперніка, выбар і прымяненне падманных дзеянняў супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне ігракоў першай і другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі.

Тактыка абароны: блакіраванне атакуючага ўдару, узаемастрахоўка свабодных зон, атака «другім тэмпам», выкарыстанне ў гульні «лібера».

Выкарыстанне вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў валейбол.

Гандбол

Перамяшчэнне скрыжаваным, прыстаўным, шырокім і кароткім крокам, тварам, бокам і спінай уперад. Спыненне адной і дзвюма нагамі. Бег з паскарэннем на кароткіх

адрэзках, бег з выскокваннем і прызямленнем на адну і абедзве нагі. Скачок убок штуршком адной нагі. Падзенне на рукі, на бядро і тулава з месца і з разбегу.

Лоўля мяча дзвюма рукамі збоку (без павароту тулава) у становішчы стоячы на месцы, у руху, у скачку. Лоўля мяча адной рукой з захопам і без захопу. Лоўля мяча на вялікай хуткасці перамяшчэння, у скачку пры непасрэднай блізкасці абаронцы.

Перадачы мяча адной рукой (хлёстам, штуршком, кісцевая) на кароткую адлегласць ва ўсіх напрамках з месца, з разбегу ў адзін, два і тры крокі, у скачку, пасля спынення, пасля лоўлі мяча з паўадскоку, пасля лоўлі ў непасрэднай блізкасці абаронцы, у барацьбе з абаронцам. Перадача мяча адной і дзвюма рукамі «ў адно дакрананне». Перадача мяча на далёкасць адной рукой хлёстам партнёру ў руху.

Вядзенне мяча аднаўдарнае без зрокавага кантролю, шматударнае на высокай хуткасці перамяшчэння з праследаваннем. Вядзенне на вялікай хуткасці, з рэзкім спыненнем і змяненнем напрамку руху, з паваротам кругом.

Кідкі мяча па варотах адной рукой хлёстам зверху і збоку, з нахілам тулава ўлева і ўправа, у апорным становішчы, у скачку ў вышыню і даўжыню, з рознымі спосабамі бегу, рознай траекторыяй (гарызантальнай, зыходзячай, узыходзячай, навеснай) палёту мяча, з далёкай і блізкай адлегласці. Кідок мяча адной рукой у падзенні з прызямленнем на руку і бядро.

Тактыка нападзення: індывідуальныя дзеянні, кідкі з адкрытых і закрытых пазіцый, выбар напрамку кідка з улікам моцных і слабых бакоў у падрыхтаванасці варатара, выбар і прымяненне фінта супраць канкрэтнага абаронцы; узаемадзеянне ігракоў другой лініі паміж сабой для завяршэння атакі, узаемадзеянне з лінейным іграком, крайнім іграком, узаемадзеянне крайняга іграка з лінейным. Камандныя дзеянні: пазіцыйнае нападзенне па сістэме расстаноўкі 4:2, нападзенне 6:0 з выхадам.

Тактыка абароны: зонная абарона па сістэме расстаноўкі 3:3, абарона ў меншасці 5:6 і 4:6.

Тактыка гульні варатара: выбар пазіцыі ў варотах і ў зоне варатара, стойкі варатара, узаемадзеянне варатара з абаронцамі і нападаючымі.

Выкарыстанне вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у гульні ў гандбол.

Футбол

Гульні і эстафеты з футбольным мячом, рухавыя гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гібкасці, хуткасці. Гульні з вядзеннем мяча, абвядзеннем стоек, прыёмам і затрымкай мяча, ударамі па варотах, на збліжэнне з сапернікам, з двума і трыма нападаючымі на пляцоўцы для міні-футбола, абаронай варот (для падрыхтоўкі варатара), гульні ў лабірынт (з мячом і без мяча), шматпланавыя гульні. Гульня ў футбол па спрошчаных правілах.

Разнастайныя спосабы вядзення мяча, перадачы, удары і прыёмы мяча нагой і галавой, жангліраванне мячом, гульні і эстафеты на развіццё спрытнасці, гульнявой вынослівасці, дакладнасці ўдараў па варотах і перадач мяча, фарміраванне навыкаў тактычных дзеянняў у абароне і нападзенні, спрошчаныя гульні 3 на 3, 4 на 4, 5 на 5 ігракоў, гульні для каманд з 7 чалавек, тэсты на гульнявыя здольнасці, гульні ў футбол камандай з 8 чалавек з улікам раздзялення поля на ўчасткі.

Удары правай і левай нагой па мячы, які не рухаецца і коціцца, сярэдзінай пад'ёму, унутраным бокам ступні, знешняй часткай пад'ёму, наском, удары па мячы, які ляціць. Практыкаванні выконваюцца ў парах, тройках, чацвёрках з выкарыстаннем тэхніка-тактычных звязак: вядзенне – перадача, прыём – перадача, прыём – вядзенне – перадача і да т.п.

Удары на далёкасць і дакладнасць, абвядзенне – адбіранне мяча, абвядзенне – адбіранне – удар па варотах, перахоп мяча, гульня галавой, камбінацыі ў тройках з мячом, дзеянні без мяча (адкрыванне, адцягненне, стварэнне колькаснай перавагі), узаемадзеянне двух нападаючых супраць аднаго абаронцы, двух абаронцаў супраць аднаго нападаючага, гульнявыя практыкаванні ў крузе, квадраце, прамавугольніку і да т.п.

Практыкаванні з мячом і без мяча, накіраваныя на развіццё каардынацыйных здольнасцей, хуткасці, спрытнасці, дакладнасці рухаў, гульні з бегам, скачкамі, перадачамі і лоўляй мяча.

Практыкаванні пераменнай інтэнсіўнасці для развіцця гульнявой вынослівасці (бег з вядзеннем мяча на дыстанцыі да 1 км з паскарэннем, рыўкамі, скачкамі і іншымі практыкаваннямі, набліжанымі па сваім характары да гульні ў футбол), хуткасна-сілавых якасцей, сілы (практыкаванні з нязначнымі абцяжарваннямі).

Выкарыстанне вывучаных тэхнічных і тактычных прыёмаў у вучэбнай гульні.

Тэніс настольны

Бег 10, 30, 60 м, бег з паскарэннем, чаўночны бег 4 х 9 м, 6 х 20 м, 10 х 5 м. Чаўночны бег з вар'іраваннем звычайнага бегу з бегам спінай уперад. Бег з максімальнай хуткасцю 5 х 30 м, 10 х 30 м з інтэрваламі адпачынку да 1 мін.

Скачкі трайныя і пяцярныя з месца штуршком дзвюма нагамі. Выскокванне ўверх з нізкага прыседу. Прысяданні па чарзе на правай і левай назе. Скачкі на адной назе з паваротамі на 180°. Паскарэнне пасля скачкоў з паваротамі на 180° і 360°. Скачкі з боку ў бок са спружыністымі прысяданнямі. Пераскокванне праз гімнастычную лаўку правым і левым бокам. Выскокванне ўверх з высокім падыманнем бёдраў.

Выкруты рук назад з гімнастычнай палкай з паступовым памяншэннем шырыні захопу.

Набіванне тэніснага мяча на ракетцы ў гульнявой стойцы і ў перамяшчэнні высока – нізка, па чарзе тыльным і далоневым бокам, рабром ракеткі, ручкай ракеткі, аб сценку, сценку з паваротам на 360° (з прысяданнем, перакладваннем ракеткі ў другую руку) у момант адскоку мяча.

Імітацыя ўдараў з ракеткай і без ракеткі з абцяжарвальнікам у руцэ. Імітацыя адзіночных, серыйных удараў, удараў з перамяшчэннем управа і ўлева, наперад і назад. Імітацыя падач з падманным рухам корпуса і рукі з ракеткай. Імітацыя ўдараў у розным тэмпе перад люстэркам. Імітацыя ўдараў у зададзеным тэмпе з вар'іраваннем ад павольнага да максімальнага ў становішчы стоячы на месцы і з перамяшчэннем.

Кідкі мяча ў сценку і лоўля рознымі спосабамі (правай, левай рукой, з дадатковымі скачкамі, прысяданнямі, паваротамі).

Кіданне тэніснага мяча на далёкасць і ў цэль адной кісцю, кісцю і перадплеччам, усёй рукой і корпусам.

Гульня дзвюма ракеткамі, гульня «негульнявой» рукой. Гульня двума мячамі. Гульня аднаго супраць двух чалавек.

Падача з элементамі вывучаемага ўдару. Удар на стале па дыяганалі. Змяненне напрамку палёту па шырыні стала. Змяненне траекторыі і вышыні палёту мяча над сеткай. Змяненне даўжыні палёту мяча. Удар па зменным прыходзячым кручэнні.

Змяненне тэмпу гульні. Спаборніцтва ў працяглым утрыманні мяча ў гульні. Гульня «трохвугольнікам» з аднаго пункта ў два пункты процілеглага боку. Гульня вывучаемым ударам з двух пунктаў, трох пунктаў, з адной трэці стала, з паловы стала, дзвюх трацей стала.

Гульня вывучаемым ударам па кароткім і доўгім прыходзячых мячах. Гульня і спаборніцтвы на дакладнасць пападання ў абазначаныя на стале зоны. Гульня «васьмёркай» па чарзе па прамой і па дыяганалі.

Удар па мячы штуршком злева ў перамяшчэнні ўправа – ўлева, наперад – назад. Гульня штуршком злева доўга – коратка. Гульня па ўзыходзячым, сыходзячым мячы, у вышэйшым пункце адскоку мяча.

Падача штуршком злева ў абазначаныя на стале зоны.

Удар накатам справа. Перамяшчэнне пры ўдары накатам справа. Хуткая падача накатам справа ў абазначаныя на стале зоны.

Спалучэнне накату справа і штуршка злева. Перамяшчэнне ў левай стойцы пры накаце злева. Павароты пры ўдарах накатамі справа і злева.

Падрэзка злева. Падача зрэзкай злева. Спалучэнне зрэзкі злева і накату.

Зрэзка справа. Падача зрэзкай управа ў абазначаныя на стале зоны. Спалучэнне зрэзкі справа і зрэзкі злева, зрэзкі і накату.

Падача плоская і з нязначным кручэннем. Прыём падачы.

Прымяненне вывучаных тэхнічных і тактычных элементаў у вучэбнай гульні.

Прыкладныя дамашнія заданні

Комплексы ранішняй гімнастыкі з 12–14 практыкаванняў з гімнастычнай палкай, скакалкай, гантэлямі, эспандарамі. Падцягванні ў вісе са становішча стоячы на нізкай перакладзіне (дз). Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры седзячы ззаду і ва ўпоры лежачы. Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне, рукі за галавой. Падыманне і апусканне прамых ног са становішча лежачы на спіне з дакрананнем да падлогі за галавой. Падыманне і апусканне, развядзенне і звядзенне рук з гантэлямі 1–3 кг. З зыходнага становішча стоячы ўпор прысеўшы, упор лежачы, упор прысеўшы ўстаць у зыходнае становішча. Пачарговыя прысяданні на правай і левай назе з гантэлямі ў руках. Глыбокія прысяданні з выскокваннем уверх. Раўнавага на адной назе (стойка «Фламінга»).

Раўнамерны бег да 3 км (дз) і да 5 км (ю). Паўторны бег з высокім падыманнем бядра і максімальнай частатой рухаў. Скачкі праз кароткую скакалку.

Язда на веласіпедзе да 8–10 км.

Хадзьба на лыжах да 3–5 км.

Падрыхтоўка да ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Патрабаванні, што прад’яўляюцца да вучняў, якія заканчваюць X клас установы агульнай сярэдняй адукацыі, забяспечваюць да іх кампетэнтнасны падыход і з’яўляюцца крытэрыямі засваення вучэбнага матэрыялу вучэбнай праграмы.

Вучні п а в і н н ы в е д а ц ь і р а з у м е ц ь:

тэрміны «алімпізм», «алімпійскі рух», «спорт», «фізічная культура», «Алімпійскія» і «Паралімпійскія гульні»;

ролю і значэнне Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў развіцці алімпійскага руху ў Рэспубліцы Беларусь;

сацыяльную і асобасную значнасць фізічнай культуры ў сучасным грамадстве;

назвы зімовых і летніх алімпійскіх і неалімпійскіх відаў спорту;

змест здаровага ладу жыцця;

уплыў заняткаў фізічнай культурай на арганізм чалавека;

віды самакантролю ў працэсе заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

спосабы рэгулявання фізічных нагрузак у працэсе самастойных заняткаў;

прыкладное і аздараўленчае значэнне вывучаемых відаў спорту;

правілы спаборніцтваў вывучаемага гульнявога віду спорту.

Вучні п а в і н н ы в е д а ц ь і в ы к о н в а ц ь:

правілы бяспечных паводзін і папярэджання траўманебяспечных сітуацый падчас вучэбных заняткаў, наведвання спартыўных і іншых масавых мерапрыемстваў;

правілы падрыхтоўкі месцаў заняткаў, страхоўкі, самастрахоўкі, узаемадапамогі;

правілы асабістай і грамадскай гігіены пры занятках фізічнай культурай і спортам;

патрабаванні да рухальнага рэжыму ў вучэбныя і выхадныя дні ў розныя перыяды года;

патрабаванні да захавання і фарміравання правільнай паставы;

правілы вымярэння і ацэнкі ўзроўню свайго фізічнага развіцця;

правілы састаўлення і выканання комплексу практыкаванняў для падтрымкі разумовай працаздольнасці на працягу вучэбнага дня, тыдня, месяца, чвэрці;

правілы вывучаных спартыўных і рухомых гульняў.

Вучні п а в і н н ы в е д а ц ь і ў м е ц ь правільна выконваць:

комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі;

практыкаванні для захавання правільнай паставы;

тэставыя практыкаванні для вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцей;

кантрольныя практыкаванні для ацэнкі вучэбных нарматываў па засваенні ўменняў, навыкаў, развіццю рухальных якасцей.

Вучні п а в і н н ы ў м е ц ь в ы к а р ы с т о ў в а ц ь набытыя кампетэнцыі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

для захавання здаровага ладу жыцця;

для аказання першай даўрачэбнай дапамогі пры розных траўмах;

для пастаяннай падтрымкі правільнай паставы;

для захавання індывідуальнага рэжыму вучэбнага і выхаднога дня;

для ацэнкі ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці;

для вымярэння і ацэнкі ўзроўню фізічнага развіцця;

для заняткаў плаваннем (праплываць не менш за 25 м любым спартыўным спосабам плавання);

для ўдзелу ў спартыўных і рухавых гульнях;

для ўдзелу ў судзействе спартыўных спаборніцтваў;

для дасягнення індывідуальна максімальнага выніку ў тэставых і кантрольных практыкаваннях.

Табліца 2

10-бальныя шкалы ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных якасцей вучняў X класа

Тэставыя практыкаванні	Балы									
	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1
Юнакі										
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см) *або*	17	16	14	12	10	6	3	–1	–5	–8 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	14	12	10	9	7	4	2	0	–2	–4 і менш
Падцягванне на перакладзіне (разоў) *або*	13	12	11	10	9	7	4	2	1	–
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (разоў)	15	13	12	10	9	7	5	3	2	1
Бег 30 м (с)	4,3	4,4	4,5	4,6	4,7	4,9	5,1	5,3	5,5	5,7 і больш
Чаўночны бег 4 х 9 м (с) *або*	8,8	8,9	9,0	9,2	9,3	9,6	9,8	10,1	10,3	10,6 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мін (разоў)	135	125	118	110	104	96	90	83	75	60 і менш
Скачок у даўжыню з месца (см) *або*	247	242	236	231	225	215	204	193	182	171 і менш
Трайны скачок з месца штуршком дзвюма нагамі (см)	750	740	715	685	665	635	615	590	555	520 і менш
Бег 1500 м (мін, с) *або*	5,25	5,39	5,52	6,06	6,19	6,46	7,13	7,40	8,07	8,34 і больш
Хадзьба 3000 м (мін, с) *або*	21,50	22,30	23,10	24,00	24,40	25,30	26,10	27,00	27,50	28,40 і больш
6-мінутны бег (м)	1430	1400	1380	1350	1320	1300	1280	1250	1210	1170 і менш

Дзяўчаты										
Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе (см) *або*	21	20	18	16	15	12	8	5	2	–2 і менш
Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы (см)	22	20	18	16	14	11	9	6	3	2 і менш
Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне за 1 мін (разоў) *або*	58	56	54	52	50	46	42	38	34	30 і менш
Падыманне і апусканне прамых ног за 1 мін (разоў)	37	34	30	27	25	22	20	15	10	7 і менш
Бег 30 м (с)	4,9	5,0	5,1	5,2	5,3	5,5	5,7	6,0	6,2	6,4 і больш
Чаўночны бег 4 х 9 м (с) *або*	9,8	10,0	10,1	10,3	10,5	10,8	11,2	11,5	11,9	12,2 і больш
Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мін (разоў)	139	133	126	120	114	110	104	92	85	76 і менш
Скачок у даўжыню з месца (см) *або*	196	191	187	182	177	168	159	149	140	131 і менш
Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі з зыходнага становішча седзячы, ногі паасобку (см)	625	600	550	510	475	440	410	380	320	300 і менш
Бег 1000 м (мін, с) *або*	4,38	4,50	5,03	5,15	5,27	5,52	6,16	6,41	7,07	7,30 і больш
Хадзьба 2000 м (мін, с) *або*	16,0	16,35	17,05	17,40	18,0	18,25	18,50	19,10	19,20	20,0 і больш
6-мінутны бег (м)	1285	1250	1200	1170	1130	1110	1090	1040	980	910 і менш

10-бальныя шкалы ацэнкі вучэбных нарматываў па засваенні ўменняў, навыкаў, развіцці рухальных якасцей вучняў X класа

Кантрольныя практыкаванні	Балы									
	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1
Юнакі										
Бег 100 м (с)	13,9	14,2	14,5	14,7	14,9	15,1	15,3	15,5	15,7	15,8 і больш
Бег 3000 м (мін, с)	13,20	14,05	14,45	15,25	16,05	16,50	17,40	18,30	19,20	19,21 і больш
Крос 2000 м (мін, с)	8,35	9,10	9,45	10,20	10,35	10,50	11,15	11,40	12,10	12,11 і больш
Крос 3000 м (мін, с)	13,30	14,15	14,55	15,35	16,15	17,05	17,55	18,50	19,45	19,46 і больш
Скачок у даўжыню (см)	463	450	436	423	410	382	356	330	304	303 і менш
Скачок у вышыню (см)	130	125	120	–	115	110	105	100	95	90 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	47	45	43	41	40	37	34	31	28	27 і менш
Кіданне гранаты 700 г з разбегу (м)	34	32	30	28	26	24	23	22	21	20 і менш
Утрыманне ног у становішчы вугла ва ўпоры на брусах (с)	6	5	–	–	4	–	–	3	2	1 і менш
Пад'ём пераваротам на перакладзіне (разоў)	4	3	–	–	2	–	–	1	–	–
Пад'ём сілай на перакладзіне (разоў)	4	3	–	–	2	–	–	1	–	–
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на брусах (разоў)	12	11	10	9	8	7	6	5	4	3 і менш

Бег на лыжах 3 км (мін, с)	14,50	15,10	15,25	15,50	16,05	16,30	18,50	17,10	17,30	17,31 і больш
Бег на лыжах 5 км (мін, с)	26,10	27,00	27,50	28,40	29,30	30,00	30,30	31,00	31,30	31,31 і больш
Плаванне 50 м (мін, с); 50, 25 м – без уліку часу	1,05	1,10	1,13	1,17	1,20	1,25	1,30	50 м	–	25 м і менш
Дзяўчаты										
Бег 100 м (с)	15,7	16,0	16,3	16,5	16,7	17	17,2	17,4	17,6	17,7 і больш
Крос 2000 м (мін, с)	10,32	11,00	11,28	11,54	12,20	12,40	13,00	13,20	13,40	13,41 і больш
Скачок у даўжыню (см)	370	360	350	340	330	317	303	290	277	276 і менш
Скачок у вышыню (см)	115	110	105	–	100	95	–	90	85	80 і менш
Кіданне мяча 150 г з разбегу (м)	30	28	26	24	23	21	19	18	16	15 і менш
Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (разоў)	16	15	10	8	6	5	4	3	2	1
Падцягванне на нізкай перакладзіне (разоў)	24	21	19	18	17	15	12	11	10	9 і менш
Бег на лыжах 3 км (мін, с)	16,00	16,30	17,05	17,50	18,15	18,55	19,20	19,50	20,30	20,31 і больш
Плаванне 50 м (мін, с); 25, 10 м – без уліку часу	1,05	1,10	1,13	1,16	1,20	1,25	1,30	25 м	–	10 м і менш

Дадатак 1

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ»

Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[1]

№ п/п	Наименование	Единица измерения	Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.)				Примечания
			до 220	до 440	до 880	свыше 880	
1	2	3	4	5	6	7	8
Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики							
1	Аптечка	штука	1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом				–
2	Бревно гимнастическое	штука	–	1	1	1	–
3	Брусья гимнастические универсальные	штука	1	1	1	2	–
4	Гантели переменной массы (0,5–5 кг)	пара	10	20	40	40	–
5	Гриф для штанги	штука	1	1	2	2	масса до 10 кг
6	Гиря	штука	2	4	4	6	16 кг, 24 кг

7	Диски для штанги	пара	8	8	16	16	от 1 до 15 кг каждого веса
8	Жерди для гимнастических брусьев	штука	1	2	3	4	–
9	Канат для лазания диаметром 30 мм	штука	1	1	2	3	–
10	Канат для перетягивания	штука	1	1	1	1	–
11	Кегли	штука	6	8	10	12	–
12	Козел гимнастический	штука	1	1	1	2	–
13	Конь гимнастический	штука	1	1	1	2	–
14	Коврик туристский	штука	12	12	24	24	для занятий спецмедгрупп
15	Мат гимнастический	штука	10	20	30	40	–
16	Мостик гимнастический	штука	2	2	2	4	–
17	Мяч малый резиновый	штука	10	16	16	20	–
18	Обруч гимнастический	штука	15	20	30	40	–
19	Палка гимнастическая	штука	10	20	40	40	–
20	Перекладина гимнастическая	штука	1	1	1	2	–
21	Перекладина навесная	штука	5	10	10	10	–
22	Скакалка гимнастическая	штука	20	20	40	40	–
23	Скакалка гимнастическая	штука	2	2	3	3	длина 5 м
24	Скамейка гимнастическая	штука	6	8	10	15	–
25	Стенка гимнастическая	штука	6	10	10	16	–
26	Флажок	штука	10	15	20	20	–
27	Эспандер	штука	6	10	10	20	–
Легкоатлетический спортивный инвентарь							
28	Брусок деревянный 5 х 5 х 10 см	пара	4	8	10	16	–
29	Канат оградительный с флажками	метр	100	100	100	200	–
30	Колодки стартовые	пара	2	4	6	8	–
31	Комплект нагрудных номеров	комплект	1 100	1 100	1 100	2 200	от 1 до 100 –
32	Комплект указателей метража	комплект	1	1	1	2	от 10 до 60 м
33	Мяч:						
33.1	набивной медбол 1 кг	штука	5	10	15	20	–
33.2	набивной медбол 2 кг	штука	5	10	15	20	–
33.3	набивной медбол 3 кг	штука	5	8	10	15	–
33.4	набивной медбол 5 кг	штука	5	8	8	10	–
33.5	для метания (150 г)	штука	12	15	20	30	–
34	Планка:						
34.1	для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
34.2	измерительная для прыжков в высоту	штука	1	1	2	3	–
35	Рулетка измерительная	штука	1	1	2	4	–
36	Секундомер	штука	2	3	5	10	–
37	Стойки для прыжков в высоту	пара	1	1	2	3	–
38	Транспарант «Старт», «Финиш»	штука	1	1	2	2	–
39	Туфли беговые с шипами	пара	10	20	30	60	–
40	Эстафетная палочка	штука	8	10	16	20	–

Спортивный инвентарь для зимних видов спорта							
41	Ботинки лыжные	пара	30	60	100	150	–
42	Коньки	пара	10	20	30	50	разных размеров
43	Клюшка хоккейная	штука	12	20	30	50	–
44	Лыжи беговые	пара	30	60	100	150	–
45	Лыжные крепления	пара	30	60	100	150	–
46	Мазь лыжная	комплект	–	–	–	–	приобретается по мере необходимости
47	Палки лыжные	пара	30	60	100	150	–
48	Санки	штука	10	10	10	10	–
49	Шайба хоккейная	штука	8	12	12	18	–
Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр							
50	Бита для городков	штука	4	4	8	8	–
51	Волан	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
52	Ворота:						
52.1	гандбольные	пара	1	1	1	2	–
52.2	футбольные	пара	1	1	1	2	–
53	Городки	комплект	2	3	4	6	–
54	Кольцо баскетбольное	пара	4	6	8	14	–
55	Комплект для настольного тенниса	комплект	2	4	6	6	–
56	Мяч:						
56.1	баскетбольный	штука	10	20	30	60	–
56.2	волейбольный	штука	10	20	30	60	–
56.3	гандбольный	штука	4	6	10	20	–
56.4	малый резиновый	штука	10	20	30	60	–
56.5	настольного тенниса	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.6	теннисный	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
56.7	футбольный	штука	5	10	15	30	–
57	Насос	штука	1	2	2	4	–
58	Ракетка:						
58.1	бадминтонная	пара	10	15	20	30	–
58.2	настольного тенниса	пара	6	12	18	24	–
58.3	теннисная	пара	5	10	15	20	–
59	Свисток судейский	штука	2	3	4	6	–
60	Сетка:						
60.1	для бадминтона	штука	1	1	2	3	–
60.2	для баскетбольных колец	пара	6	10	15	30	–
60.3	волейбольная	пара	1	2	3	4	–
60.4	для гандбольных ворот	пара	1	1	1	2	–

60.5	теннисная	штука	2	2	3	4	–
60.6	футбольная	пара	1	1	1	2	–
61	Стойки:						
61.1	баскетбольные	пара	1	1	2	3	–
61.2	волейбольные	пара	1	1	2	3	–
61.3	для обводки	штука	8	10	15	20	–
62	Стол для настольного тенниса	штука	2	3	4	6	–
63	Флажок судейский	штука	6	6	8	8	–
64	Часы шахматные	штука	2	4	4	6	–
65	Шашки	комплект	6	8	12	20	–
66	Шахматы	комплект	6	8	12	20	–
67	Щит баскетбольный	пара	2	4	6	10	–
Спортивный туристский инвентарь							
68	Аптечка походная	штука	2	2	4	4	–
69	Карабин туристский	штука	10	15	20	30	–
70	Компас	штука	6	8	12	20	–
71	Коврик туристский	штука	20	30	40	60	–
72	Комплект:						
72.1	костровых принадлежностей	штука	2	4	6	10	–
72.2	посуды для приготовления пищи	штука	2	4	6	10	–
73	Мешок спальный	штука	20	30	40	60	–
74	Палатка туристская	штука	6	10	10	20	–
75	Рюкзак туристский	штука	20	30	40	60	–
76	Топорик туристский	штука	2	4	6	10	–
77	Фал капроновый:						
77.1	диаметром 8–10 мм	метр	40	80	100	150	–
77.2	диаметром 12–14 мм	метр	40	40	50	50	–
Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь							
85	Винтовка пневматическая	штука	2	4	6	10	–
86	Патроны для винтовки пневматической	штука	–	–	–	–	приобретаются по мере необходимости
Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемые за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей							
Технические средства обучения							
87	Видеокамера	штука	1	1	1	1	–
88	Компьютер	штука	1	1	1	1	–
89	Мегафон	штука	1	1	2	3	–
90	Микрофон	штука	1	1	1	2	–
91	Музыкальный центр	штука	1	1	1	1	–
92	Проектор мультимедийный	штука	1	1	1	1	–
93	Телевизор	штука	1	1	1	1	–
94	Усилитель с колонками	штука	1	1	1	1	–
95	Шнур (удлинитель) электрический	штука	1	1	1	1	до 50 м

96	Экран переносной	штука	1	1	1	1	–
Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование							
97	Веревочка с грузом	штука	2	3	4	6	до 5 м
98	Тренажер (операционный или многофункциональный)	штука	2	4	4	6	–
99	Штанга	штука	1	2	2	3	–
100	Эспандер	штука	6	8	10	15	–
101	Гантели разборные	пара	4	8	10	12	до 10 кг
Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования							
102	Костюм спортивный	штука	10	18	20	20	–
103	Майка, полурукавка, футболка спортивная	штука	10	18	20	20	–
104	Трусы спортивные	штука	10	18	20	20	–
105	Кроссовки спортивные	пара	10	18	20	30	–

[1] Дадатак 2 да пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2014 г. № 105 (друкуецца на мове арыгінала).

Дадатак 2

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 1000, 1500 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Старт – групавы. Вучням, якія парушылі правілы спаборніцтваў па бегу, а таксама тым, якія не фінішавалі, у пратакол выканання кантрольных практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

Хадзьба 2000, 3000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна. Рэкамендуецца выконваць тэставае практыкаванне асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Пры невялікай напаўняльнасці класа дапускаецца выкананне практыкавання адначасова ўсімі вучнямі. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на бег, чаргаваць бег з хадзьбой, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, якія не фінішавалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Час пераадолення дыстанцыі вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

6-мінутны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне размячаецца на кожныя 10 або 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод юнакоў і дзяўчат. Група юнакоў (дзяўчат) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па сканчэнні шасці мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе іх застаў сігнал. Затым настаўнік кожнаму вучню індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе ён перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі ўказаныя правілы, а таксама тым, якія не фінішавалі, у пратакол выканання тэставых практыкаванняў выстаўляецца «0» балаў. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

Падцягванне ў вісе на высокай перакладзіне выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хватам зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца згінанні тулава і ног у каленных суставах, развядзенне, скрыжаванне і іншыя рухі нагамі, рыўкі, махі і разгойдванне, перахопліванні рук. Падцягванне залічваецца, калі падбародак вучня

знаходзіцца вышэй за ўзровень перакладзіны, а пры апусканні рукі поўнасцю выпрамляюцца ў локцевых суставах.

Падыманне тулава за 1 мінуту выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзямі, далоні на локцевых суставах, стопы зафіксаваныя. Вугал у каленным суставе павінен складаць 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дакрананні локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дакрананнем лапаткамі да гімнастычнага мата.

Падыманне і апусканне прамых ног за 1 мінуту выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі за галавой, прамыя ногі разам. Настаўнік ці другі вучань размяшчаецца з боку галавы тэсціруемага і ўтрымлівае яго за локцевыя суставы. Па сігнале настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань падымае прамыя ногі да вугла 90° да моманту дакранання галёнкай да гімнастычнай палкі, загадзя замацаванай у нерухомым становішчы або ўтрымліваемай настаўнікам. Затым падыспытны апускае ногі да дакранання пяткамі да гімнастычнага мата. Залічваецца колькасць поўных цыклаў (падыманне і апусканне) на працягу 1 мінуты.

Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на паралельных брусах. Вучань скачком прымае зыходнае становішча ўпор на паралельных брусах, рукі выпрамленыя ў локцевых суставах, ногі паралельныя. Захоўваючы прамое становішча тулава і ног, вучань згінае рукі ў локцевых суставах да вугла, не меншага за 90°, і, выпрамляючы рукі, вяртаецца ў зыходнае становішча. Не дапускаецца згінаць ногі і тулава, скрыжоўваць ногі, а таксама выконваць рыўковыя рухі. Залічваецца колькасць згінанняў і разгінанняў рук без парушэння ўказаных патрабаванняў.

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага або нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Скачкі праз кароткую скакалку за 1 мінуту выконваюцца на цвёрдым пакрыцці (у спартыўнай зале, на гульнявой пляцоўцы або бегавой дарожцы стадыёна). Кручэнне скакалкі выконваецца толькі наперад. Скачкі выконваюцца з абавязковай апорай на абедзве нагі адначасова. Дапускаецца выкарыстоўваць любыя скакалкі прамысловай вытворчасці або самаробныя (напрыклад, з турысцкага фала). Забараняецца выкарыстоўваць на скакалцы ўстаўкі-абцяжарвальнікі. Пры памылцы ў час скачкоў секундамер не спыняецца, а вучань працягвае выконваць скачкі. Залічваецца сумарная колькасць скачкоў на працягу 30 секунд або 1 мінуты.

Чаўночны бег 4 х 9 метраў выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу – не больш за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца 2 спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту ў напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць два брускі 50 х 50 х 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.



Рыс. 1

Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па адным бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (ці за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся на лініі. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы скорасць, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з двух спроб.

Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца 3 спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Трайны скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі выконваецца на падлозе спартыўнай залы або на дарожцы стадыёна з прызямленнем пасля трэцяга скачка ў скачковую яму. Скачкі выконваюцца штуршком дзвюма нагамі злітна без затрымак і спыненняў. Кожнаму вучню даецца 3 спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Кідок набіўнога мяча з-за галавы дзвюма рукамі выконваецца ў спартыўнай зале з зыходнага становішча седзячы, ногі паасобку, пяткі на кантрольнай лініі. Выкарыстоўваецца мяч вагой 1 кг. Вучань утрымлівае мяч дзвюма рукамі над галавой, затым згінае рукі ў локцевых суставах, апускае мяч за галаву і рэзкім рухам кідае яго ўперад – уверх. Кожнаму вучню даецца 3 спробы запар. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе. Вучань садзіцца на падлогу з боку знака «–» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі ОВ упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі ў каленных суставах.

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.



Рыс. 2

Нахіл уперад з зыходнага становішча стоячы на гімнастычнай лаўцы. Для ацэнкі выніку выкарыстоўваецца вымяральная лінейка, прымацаваная вертыкальна да гімнастычнай лаўкі. Вучань прымае зыходнае становішча, пяткі і наскі ног разам. Наскі не выходзяць за край гімнастычнай лаўкі. Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Не дапускаецца згінанне ног у каленных суставах. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.

Дадатак 3

ГАДЗІНА ЗДАРОЎЯ І СПОРТУ
(35 вучэбных гадзін)

Баскетбол

Інвентар для гульні ў баскетбол, яго захоўванне і догляд за ім. Абсталяванне месцаў заняткаў баскетболам у спартыўнай зале і на адкрытай пляцоўцы.

Правілы гульні. Правы і абавязкі ігракоў. Памеры гульнявой пляцоўкі і баскетбольнага мяча. Гульнявы час. Пачатак гульні. Спрэчны мяч. Укідванне мяча з-за бакавой і пярэдняй ліній. Парушэнні правіл: прабежка, двайное вядзенне.

Стойка баскетбаліста – высокая, сярэдняя, нізкая. Хадзьба, бег, перамяшчаючыся тварам наперад. Перамяшчэнні прыстаўнымі крокамі тварам, правым, левым бокам наперад, спінай наперад. Бег па перыметры пляцоўкі з паскарэннямі і запавольваннямі, чаўночны бег. Скачкі з кароткага разбегу штуршком дзвюма нагамі, штуршком адной нагі. Спыненне скачком. Спыненне двума крокамі. Павароты стоячы на месцы наперад і назад. Павароты ў спалучэнні з рухамі і спыненнямі.

Стойка абаронцы з выстаўленай нагой наперад, з размяшчэннем ступняў ног на адной лініі. Рознае становішча рук падчас перамяшчэння тварам наперад, спінай наперад. Перамяшчэнні прыстаўнымі крокамі ў бакі, назад, наперад. Спалучэнне спосабаў рухаў са спыненнямі і паваротамі. Перамяшчэнні ў абароннай стойцы па сігналах.

Перадачы мяча дзвюма рукамі. Лоўля мяча дзвюма рукамі на ўзроўні грудзей. Лоўля мяча дзвюма рукамі і адной рукой пры сустрэчным руху. Лоўля мяча, які коціцца, дзвюма і адной рукой. Лоўля мяча, які ляціць нізка. Лоўля мяча ў скачку. Лоўля мяча ў спалучэнні са спыненнямі, паваротамі.

Перадачы мяча дзвюма рукамі зверху, адной рукой ад пляча з месца і ў руху. Спалучэнне прыёмаў «лоўля – перадача – паварот», «паварот – лоўля – перадача».

Вядзенне мяча з высокім адскокам на месцы, у руху са змяненнем напрамку і вышыні адскоку. Вядзенне мяча з абводкай перашкод. Вядзенне мяча ў спалучэнні са спыненнямі і паваротамі, кідком мяча ў кошык. Эстафеты з вядзеннем мяча.

Захоп мяча. Вырыванне і выбіванне мяча ў іграка, які стаяў на месцы, які зрабіў спыненне пасля вядзення. Супрацьдзеянне вядзенню. Накрыванне мяча. Перахоп мяча, стоячы з боку, з-за спіны пры перадачы, выкананай упоперак поля або ўздоўж пляцоўкі.

Кідкі мяча па кальцы дзвюма рукамі ад грудзей. Кідок мяча адной рукой ад пляча. Кідкі мяча па кальцы з блізкай адлегласці. Кідкі мяча пад вуглом да шчыта з адскокам ад шчыта, у руху. Кідкі мяча з наступным рухам за кідком. Штрафныя кідкі. Спалучэнне прыёмаў «перадача – вядзенне – кідок».

Тактыка нападзення – дзеянні ігракоў без мяча і з мячом.

Выбар спосабу, напрамку і хуткасці перамяшчэння. Спалучэнне вывучаных спосабаў перамяшчэння з мэтай вызвалення ад апекі абаронцы. Выхад на свабоднае месца для атрымання мяча насустрач партнёру з мячом, убок ад партнёра з мячом.

Прымяненне паваротаў з мэтай прыкрывання мяча ад праціўніка.

Выкарыстанне вывучаных спосабаў перадачы мяча ў залежнасці ад адлегласці і напрамку, становішча абаронцы. Мэтазгоднасць вядзення мяча, выбар напрамку вядзення мяча.

Выбар спосабу выканання кідка мяча па кальцы з ліку вывучаных кідкоў у залежнасці ад гульнявой сітуацыі.

Прымяненне вывучаных спосабаў абароннай стойкі ў залежнасці ад месца становішча нападаючага, які валодае мячом і без мяча.

Супрацьдзеянне выхаду на свабоднае месца для атрымання мяча.

Выбар моманту і прымяненне вырывання і выбівання мяча з рук іграка, для перахопаў мяча. Дзеянні аднаго абаронцы супраць двух нападаючых. Дзеянні абаронцаў пры абароне зоннай 2:1:2. Пераход ад асабістай аховы да зоннай.

Абарона пры вядзенні мяча з-за бакавой, пярэдняй ліній, пры спрэчным. Расстаноўка і групавыя дзеянні пры выкананні штрафнога кідка.

Шматразовае паўтарэнне вывучаных тактычных дзеянняў (індывідуальных, групавых, камандных) у абароне і нападзенні без супраціўлення і з супраціўленнем.

Эстафеты з выкананнем асобных тэхнічных баскетбольных прыёмаў у розных спалучэннях. Гульні, якія падводзяць да баскетбола, – «Мяч капітану», «Барацьба за мяч».

Выкарыстанне спалучэнняў вывучаных прыёмаў тэхнікі ў гульнявых сітуацыях. Вучэбныя гульні па правілах міні-баскетбола.

Валейбол

Агульная фізічная падрыхтаванасць – фундамент спартыўнага майстэрства. Узроставыя асаблівасці выхавання фізічных якасцей. Паказанні і проціпаказанні да заняткаў валейболам.

Значэнне фізічнай падрыхтоўкі валейбалістаў для развіцця спецыяльных фізічных якасцей. Агульныя паняцці аб рухальным уменні і рухальным навыку, ступені гатоўнасці да авалодання тэхнічным прыёмам. Паняцце аб спартыўнай трэніроўцы і спартыўнай форме. Паняцце аб стомленасці і ператамленні. Меры папярэджання ператрэніраванасці.

Правілы гульні. Правы і абавязкі гракоў і суддзяў. Пачатак гульні, колькасць партый, правіла трох дотыкаў, лік гульні. Пераможца і той, хто прайграў.

Папярэдняя падрыхтоўка, накіраваная на выхаванне «пачуцця мяча»: практыкаванні, рухомыя гульні і эстафеты з кідкамі, перадачамі, лоўляй, перакочваннем, жангліраваннем мяча з рознага зыходнага становішча, на месцы і ў руху.

Перамяшчэнні іграка ў высокай, сярэдняй, нізкай стойках: прыстаўныя крокі, двайны крок, скачок, бег, скачкі, спыненні пасля перамяшчэнняў. Перамяшчэнні па арыенцірах, па гукавым сігнале, спалучэнне перамяшчэнняў са спыненнямі.

Тэарэтычны матэрыял выкладаецца ў аб'ёме, неабходным для выканання практычных работ. Пры выкананні практычных работ настаўнік спачатку паказвае і тлумачыць тэхніку выканання прыёмаў або дзеянняў, а затым трэніруе вучняў. Практычныя заняткі нельга замяняць тэарэтычнымі.

Вынікі выканання вучнямі прыёмаў і нарматываў на практычных занятках (5 дзён) заносяцца ў асобную ведамасць, а выніковая адзнака (бал) ставіцца ў журнал з пазнакай «Практычныя заняткі».

Вучэбная дзейнасць вучняў ацэньваецца па дзесяцібальнай сістэме. Ацэнка праводзіцца па агульнапрынятых методыках. Адзнака за чвэрць выстаўляецца на аснове вынікаў тэматычнага кантролю з улікам вынікаў пазаняткавага кантролю. Гадавая адзнака за X клас выстаўляецца на аснове адзнак за чвэрці.

Тэматычны план

Назва раздзела	Колькасць гадзін	
	X клас	Практычныя работы
Мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі	1	
Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках	19	4

Лекавыя прэпараты і расліны	6	
Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхавання	8	
Рэзервовы час	**1**	
У с я г о	**35**	**4**

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(1 гадзіна на тыдзень; усяго 35 гадзін, у тым ліку 1 гадзіна – рэзервовы час)

Мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі (1 гадзіна)

Мэты і задачы, прадмет медыцынскай падрыхтоўкі. Асноўныя напрамкі медыцынскай падрыхтоўкі вучняў. Значэнне курса ў жыцці чалавека.

Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках (19 гадзін)

Агульныя прынцыпы аказання першай дапамогі. Непрытомнасць. Прычыны страты прытомнасці. Першая дапамога пры раптоўнай страце прытомнасці. Прыметы жыцця і смерці. Рэанімацыя. Паказанні да рэанімацыі. Іншароднае цела ў дыхальных шляхах: сімптомы, аказанне першай дапамогі. Транспарціроўка пацярпелых.

Адкрытыя пашкоджанні, крывацёкі. Паняцце пра рану, класіфікацыя ран. Магчымыя ўскладненні пасля раненняў. Першая дапамога пры раненнях.

Крывацёкі. Віды крывацёкаў. Насавы крывацёк. Спосабы часовага спынення крывацёку.

Перавязачны матэрыял. Агульныя правілы накладання мяккай бінтавой павязкі. Тэхніка накладання мяккіх бінтавых павязак на розныя часткі цела. Правілы выкарыстання падручнага матэрыялу для накладання павязак.

Пашкоджанні мяккіх тканак, суставаў і касцей. Віды і характарыстыка пашкоджанняў. Удары мяккіх тканак. Расцяжэнні і разрывы звязак, сухажылляў і мышцаў. Вывіхі. Першая дапамога.

Траўматычны таксікоз (сіндром працяглага сціскання), аказанне першай дапамогі на месцы здарэння. Правілы выцягвання пацярпелага з завалаў.

Пераломы. Віды, класіфікацыя. Характарыстыка. Пашкоджанне пазваночніка.

Асаблівасці пераломаў у дзяцей і дарослых. Прыметы пераломаў. Траўматычны шок. Першая дапамога пры пераломах і правілы яе аказання. Імабілізацыя.

Апёкі і адмарожванні. Апёкі. Тэрмічныя і хімічныя апёкі, іх характарыстыка. Прыметы апёкавага шоку. Апёкавая хвароба. Прафілактыка ўзнікнення апёкавага шоку.

Першая дапамога пры апёках і правілы транспарціроўкі пацярпелых. Правілы накладання павязак на абпаленую паверхню.

Адмарожванне. Фактары, спрыяльныя адмарожванню. Класіфікацыя адмарожвання. Замярзанне. Першая дапамога ў палявых і хатніх умовах.

Утапленне. Віды ўтаплення, сімптомы. Першая дапамога пры розных відах утаплення і правілы яе аказання. Прафілактыка ўтаплення.

Электратраўмы і паражэнне маланкай. Прыметы паражэння. Мясцовыя і агульныя з’явы пры паражэнні электрычным токам. Першая дапамога пры электратраўме і правілы яе аказання.

Сонечныя і цеплавыя ўдары. Прычыны сонечнага і цеплавога ўдараў. Асноўныя прыметы. Першая дапамога. Прафілактыка цеплавых і сонечных удараў.

Укусы жывёл (насякомых, ядавітых змей). Асноўныя прыметы і асаблівасці аказання першай дапамогі пры паражэннях ядамі жывёл. Асаблівасці ўскладненняў раны пры ўкусах.

Атручэнне. Атручэнне хімічнымі рэчывамі. Асноўныя прыметы атручэння. Першая дапамога пры вострым атручэнні ўгарным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі (МДАР) і іншымі хімічнымі рэчывамі. Прафілактыка.

Харчовае атручэнне. Асноўныя прыметы атручэння. Першая дапамога. Прафілактыка харчовага атручэння.

Атручэнне ядавітымі раслінамі і ядавітымі грыбамі. Асаблівасці паражэння, асноўныя прыметы. Першая дапамога пры атручванні ядавітымі раслінамі і ядавітымі грыбамі, правілы яе аказання. Прафілактыка.

Практычныя работы

1. Вывучэнне методыкі правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх і непрамога масажу сэрца.
2. Вывучэнне правіл накладання кроваспыняльнага жгута (закруткі) на бядро і плячо.
3. Раскрыццё пакета перавязачнага індывідуальнага. Накладанне першаснай асептычнай павязкі на розныя часткі цела.
4. Вывучэнне правіл імабілізацыі верхняй і ніжняй канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў пры пераломах, ударах, расцяжэннях, вывіхах.

Лекавыя прэпараты і расліны (6 гадзін)

Паняцці пра лекавыя прэпараты. Лекавыя формы. Асноўныя групы лекавых прэпаратаў.

Уплыў знешніх і ўнутраных фактараў на дзеянні лекаў на арганізм. Спосабы ўвядзення лекавых сродкаў у арганізм. Магчымыя рэакцыі арганізма на лекі, ускладненні. Першая дапамога ў выпадках алергічнай рэакцыі і атручэння.

Утрыманне хатняй аптэчкі і дарожнай аптэчкі вадзіцеля. Правілы захоўвання лекавых сродкаў у хатніх умовах.

Роля лекавых раслін у жыцці чалавека. Правілы і тэрміны збору лекавых раслін, правілы захоўвання, паказанні да ўжывання. Правілы падрыхтоўкі настояў і адвараў. Лекавыя расліны: маліна звычайная, чарніцы, шыпшына карычная, трыпутнік вялікі, рамонак аптэчны, валяр'ян лекавы, зверабой прадзіраўлены, адуванчык лекавы, крапіва двухдомная, дзівасіл высокі, мята перачная, каліна звычайная, бяроза адвіслая, ліпа драбналістая, сасна звычайная.

Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхавання (8 гадзін)

Праблемы ўзаемаадносін юнакоў і дзяўчат. Рэпрадуктыўнае здароўе.

Гігіена і культура палавых адносін. Кантрацэпцыя, яе віды і метады ўжывання.

Цяжарнасць. Найбольш спрыяльны ўзрост для шлюбу і цяжарнасці. Фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці працякання цяжарнасці. Гігіена цяжарнай жанчыны. Уплыў алкаголю, нікаціну і таксічных рэчываў на развіццё плода.

Аборт і яго вынікі для маладога арганізма. Магчымыя ўскладненні.

Венерычныя захворванні (ганарэя, сіфіліс, трыхаманоз). СНІД. Крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя прыметы. Прафілактыка.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні п а в і н н ы:

пералічваць:

мэты і задачы першай дапамогі;

мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі дзяўчат ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

змесціва хатняй аптэчкі і дарожнай аптэчкі вадзіцеля;

называць:

віды ран;

віды крывацёкаў і спосабы іх спынення;

віды і асаблівасці закрытых пашкоджванняў;

прыметы клінічнай смерці (спыненні дыхання і сардэчнай дзейнасці); правілы правядзення сардэчна-лёгачнай рэанімацыі;

віды апёкаў і адмарожвання;

асаблівасці паражэння электратокам і маланкай;

віды і сімптомы пераломаў;

асноўныя прыметы пры паражэнні чалавека ядамі жывёл;

асноўныя прыметы пры паражэнні чалавека ядавітымі раслінамі і грыбамі;

віды лекавых раслін, правілы збору і захоўвання, правілы падрыхтоўкі адвараў і настояў;

магчымыя ўскладненні медыкаментознай тэрапіі;

віды лекавых прэпаратаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

аказваць першую дапамогу:

пры траўмах, пераломах, крывацёках, ударах, расцяжэннях, вывіхах, раптоўнай страце прытомнасці;

пры апёках, адмарожванні, паражэнні электратокам і маланкай;

пры цеплавым і сонечным ударах;

пры ўтапленні;

пры ўкусах жывёл;

пры харчовым атручэнні;

пры атручэнні ядавітымі грыбамі і раслінамі;

у выпадку алергічнай рэакцыі на лекавы сродак;

тлумачыць:

негатыўны ўплыў курэння, алкаголю, наркатычных сродкаў на арганізм чалавека;

ролю лекавых прэпаратаў у лячэнні захворванняў;

асаблівасці асабістай гігіены юнакоў і дзяўчат;

фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці працякання цяжарнасці;

выконваць:

штучную вентыляцыю лёгкіх і непрамы масаж сэрца пацярпеламу;

транспарціроўку пацярпелых на насілках і з дапамогай падручных сродкаў;

накладанне мяккіх бінтавых павязак, жгута, закруткі;

мясцова халадовыя і цеплавыя працэдуры;

напаўненне шпрыца лекавым сродкам;

унутрымышачную і падскурную ін’екцыі;

абыходзіцца:

са сродкамі імабілізацыі;

з санітарнымі насілкамі;

адрозніваць:

лекавыя формы;

віды крывацёкаў;

карыстацца:

вучэбным дапаможнікам, дадатковай і даведачнай літаратурай, электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі.

Дадатак 1

УМОВЫ ПРАКТЫКАВАННЯЎ СТРЭЛЬБАЎ З ПНЕЎМАТЫЧНАЙ І МАЛАКАЛІБЕРНАЙ ВІНТОВАК І Ў КІДАННІ РУЧНЫХ ГРАНАТ

Практыкаванні стрэльбаў з пнеўматычнай вінтоўкі

1-е практыкаванне

Цэль – мішэнь з кругамі № 8, усталяваная на ўзроўні вачэй страляючага.

Далёкасць цэлі – 10 м.

Колькасць куль – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы (стоячы, седзячы) з упору.

Адзнака:

9–10 балаў – трапіць у цэль (чорны круг) пяццю кулямі;

7–8 балаў – трапіць у цэль чатырма кулямі;

5–6 балаў – трапіць у цэль трыма кулямі;

3–4 балы – трапіць у цэль дзвюма кулямі;

1–2 балы – трапіць у цэль адной куляй.

Найвышэйшы бал адзнакі характарызуе кучнасць стральбы (прабоіны змяшчаюцца ў круг дыяметрам 15 мм).

2-е практыкаванне

Цэль – мішэнь з кругамі № 8, усталяваная на ўзроўні вачэй страляючага.

Далёкасць цэлі – 10 м.

Колькасць куль – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы (стоячы, седзячы) з упору.

Адзнака:

Выбіта ачкоў	40	36	32	28	24	20	16	12	8	4
Адзнака (балы)	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1

Мішэнь для выканання практыкаванняў стрэльбаў з пнеўматычнай вінтоўкі



Мішэнь № 8.
Памеры дадзены ў мм

Практыкаванні стрэльбаў з малакаліберная вінтоўкі

1-е практыкаванне

Стральба з месца па нерухомай цэлі днём.

Цэль – грудная фігура з кругамі (мішэнь № 4, паменшаная ў 4 разы), усталяваная на вышыні вачэй страляючага, нерухомая.

Далёкасць цэлі – 25 м.

Колькасць патронаў – 3 шт.

Час на стральбу – не больш за 2 мін.

Становішча для стральбы – лежачы з упору.

Адзнака:

8–10 балаў – трапіць у цэль трыма стрэламі;

5–7 балаў – трапіць у цэль двума стрэламі;

2–4 балы – трапіць у цэль адным стрэлам;

0–1 бал – у цэль не патрапілі.

Найвышэйшы бал адзнакі характарызуе кучнасць стральбы (прабоіны змяшчаюцца ў круг дыяметрам 60 мм).

2-е практыкаванне

Стральба з месца па нерухомай цэлі днём.

Цэль – грудная фігура з кругамі (мішэнь № 4, паменшаная ў 4 разы), усталяваная на вышыні вачэй страляючага, нерухомая.

Далёкасць цэлі – 25 м.

Колькасць патронаў – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы з упору.

Адзнака:

Выбіта ачкоў	45	41	36	32	27	23	18	14	9	5
Адзнака (балы)	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1

Мішэнь для выканання практыкаванняў стрэльбаў з малакалібернай вінтоўкі



Мішэнь № 4, паменшаная ў 4 разы.
Памеры дадзены ў мм

Практыкаванні ў кіданні ручных гранат

1-е практыкаванне

Кіданне гранаты на далёкасць.

Выконваецца з месца або з разбегу.

Вага гранаты – 560 г (±20 г).

Кіданне выконваецца ад планкі (лініі) даўжынёй 4 м і шырынёй 7 см па калідоры шырынёй 10 м, які пазначаецца паралельнымі лініямі ў адпаведнасці з нарматывам.

Выконваецца 3 спробы запар, залік па лепшым выніку.

Вынік кідка не залічваецца, калі вучань:

у момант кідка або пасля яго кране якой-небудзь часткай цела або адзеннем грунт за планкай;

наступіць на планку;

выпусціць падчас разбегу (размахвання) гранату;

заступіць за планку наперад пасля кідка да дотыку гранатай зямлі;

кіне гранату за межы калідора.

Адзнака:

Далёкасць, м	37	36	35	34	33	32	31	30	29	28
Адзнака (балы)	10	9	8	7	6	5	4	3	2	1

2-е практыкаванне

Кіданне гранаты на дакладнасць.

Выконваецца з месца або з разбегу.

Вага гранаты – 560 г (±20 г).

Кіданне выконваецца ад планкі (лініі) даўжынёй 4 м і шырынёй 7 см трыма гранатамі ў круг дыяметрам 4 м (шырыня лініі (5 см), якая абмяжоўвае габарыт круга, уваходзіць у дыяметр круга).

Адлегласць ад планкі да цэнтра круга – 28 м.

Вынік кідка залічваецца пры прамым пападанні ў круг, калі пры гэтым не парушаны правілы кідання.

Адзнака:

10 балаў – за пападанне трыма гранатамі;

9 балаў – за пападанне дзвюма, першай і другой, гранатамі;

8 балаў – за пападанне дзвюма, першай і трэцяй, гранатамі;

7 балаў – за пападанне дзвюма, другой і трэцяй, гранатамі;

6–5 балаў – за пападанне першай гранатай;

4–3 балы – за пападанне другой гранатай;

3–2 балы – за пападанне трэцяй гранатай;

1 бал – у цэль не патрапілі.

Найвышэйшы бал адзнакі характарызуе дакладнасць (граната не закранула абмежаваны круг) пападанняў.

Дадатак 2

НАРМАТЫВЫ

Дапрызыўная падрыхтоўка

А. Асновы ваеннай справы

Нумар і назва нарматыву	Парадак (умовы) выканання нарматыву	Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака
Тактычная падрыхтоўка		
1. Выбар месца для вядзення агню, трасіроўка акопа	Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на выбар месца і трасіроўку акопа для вядзення агню. Акоп трасіруецца лежачы. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да адпрацоўкі нарматыву прыступіць» да даклада аб гатоўнасці	*Памылкі:* дапушчаны памылкі пры выбары месца для вядзення агню; не вытрыманы памеры акопа; не вялося назіранне за праціўнікам; адсутнічала пастаянная гатоўнасць да адкрыцця агню; дзеянні няўпэўненыя. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 2 мін. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры захаванні мер маскіроўкі пры выкананні нарматыву

2. Перамяшчэнне на полі бою перабежкамі і перапаўзаннем (скрытнае перамяшчэнне да аб'екта праціўніка)	Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на перамяшчэнне. Участак мясцовасці глыбінёй 100 м ён пераадольвае: перабежкай – 30 м, перапаўзаннем па-пластунску – 40 м, перабежкай – 30 м. Час (да 2 мін 30 с) адлічваецца ад каманды «Наперад» да дасягнення паказанай мяжы і падрыхтоўкі да стральбы лежачы	*Памылкі:* галава і цела пры перапаўзанні паднімаюцца ад зямлі; даўжыня перабежак паміж прыпынкамі большая за ўсталяваную; вучань падчас прыпынку пасля перабежкі не адпоўз убок і не падрыхтаваўся для вядзення агню; для прыпынкаў пры перабежцы не выкарыстоўваліся наяўныя прыкрытыя месцы (сховішчы); перамяшчэнне вядзецца без уліку асаблівасцей рэльефу мясцовасці; не вядзецца назіранне за мясцовасцю і праціўнікам. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 2 мін 30 с. Найніжэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры нядбайным абыходжанні са зброяй
3. Выяўленне цэляў, вызначэнне іх месцазнаходжання і даклад аб выніках назірання	У сектары назірання на адлегласці 300–1500 м ад назіральніка размешчаны 5 цэляў. Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на назіранне: выявіць цэлі, вызначыць іх месцазнаходжанне адносна арыенціраў і мясцовых прадметаў, вызначыць адлегласці да іх, далажыць вынікі назірання. Час (да 8 мін) адлічваецца ад каманды «Да разведкі цэляў прыступіць» да заканчэння даклада аб выніках назірання	*Адзнака:* 9–10 балаў – выяўлены 5 цэляў, памылкі ў вызначэнні адлегласцей не большыя за 5 %, даклад упэўнены і выразны; 7–8 балаў – выяўлены 4 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцей не большыя за 10 %, даклад няўпэўнены; 5–6 балаў – выяўлены 3 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцей не большыя за 15 %, пры дакладзе дапушчаны нязначныя недакладнасці; 3–4 балы – выяўлены 2 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцей не большыя за 20 %, пры дакладзе дапушчаны недакладнасці; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 7 мін); 1–2 балы – выяўлена 1 цэль; памылкі ў вызначэнні адлегласцей не большыя за 25 %; пры дакладзе дапушчаны значныя недакладнасці; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 8 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры захаванні мер маскіроўкі пры выкананні нарматыву
4. Перамяшчэнне на полі бою перабежкамі	Падраздзяленне пераадольвае ўчастак мясцовасці глыбінёй 300 м кароткімі перабежкамі (у аддзяленнях па аднаму)	*Памылкі і адзнака* аналагічныя нарматыву 2
Агнявая падрыхтоўка		
1. Няпоўная разборка аўтамата	Вучань стаіць каля стала. Зброя ў сабраным выглядзе ляжыць на стале. Час адлічваецца ад каманды «Да няпоўнай разборкі аўтамата прыступіць» да даклада аб гатоўнасці	*Памылкі:* не агледжаны патроннік на прадмет адсутнасці ў ім патрона; парушана паслядоўнасць разборкі; асобныя часткі раскладзены неакуратна; даставанне частак выконваецца з вялікім намаганнем. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры перакрыцці часу нарматыву на 10 с

2. Зборка аўтамата пасля няпоўнай разборкі	Вучань стаіць каля стала. Часткі аўтамата раскладзены на стале ва ўсталяваным парадку. Час адлічваецца ад каманды «Да зборкі аўтамата прыступіць» да даклада аб гатоўнасці	*Памылкі:* парушана паслядоўнасць зборкі; злучэнне частак праводзіцца з намаганнем; не праверана работа частак і механізмаў; не зроблены спуск курка пасля зборкі; аўтамат не пастаўлены на засцерагальнік. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры перакрыцці часу нарматыву на 10 с
3. Зараджанне магазіна патронамі	Вучань стаіць каля стала (перад падсцілкай), на падсцілцы размешчаны вучэбныя патроны (30 шт., россыпам) і магазін. Час адлічваецца ад каманды «Да падрыхтоўкі магазіна прыступіць» да даклада аб гатоўнасці	*Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы дакладна, упэўнена, хутка (да 1 мін); 7–8 балаў – нарматыў выкананы, прыёмы правільныя, але тэмп запаволены (да 1 мін 10 с); 5–6 балаў – нарматыў выкананы, але дзеянні няўпэўненыя, тэмп запаволены (да 1 мін 20 с); 3–4 балы – нарматыў выкананы, але дзеянні няўпэўненыя, патроны ўкладваюцца ў прыёмнік з вялікім намаганнем, тэмп павольны (да 1 мін 30 с); 1–2 балы – нарматыў выкананы, але дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя; тэмп павольны (да 1 мін 45 с). Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі становішча магазіна правільнае, са стала бярэцца адначасова некалькі патронаў
Радыяцыйная, хімічная і біялагічная ахова		
1. Надзяванне процівагаза	У вучня ёсць процівагаз у паходным стане. Па камандзе «Газы» надзяваецца процівагаз. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды да ўзнаўлення дыхання пасля надзявання процівагаза	*Памылкі:* пры надзяванні вучань не заплюшчыў вочы і не затрымаў дыханне; пасля надзявання процівагаза не зроблены выдых; шлем-маска надзета з перакосам. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 11 с; 1–2 балы – пашкоджаны процівагаз або нарматыў выкананы больш чым за 11 с. Кожная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
2. Карыстанне няспраўным процівагазам у заражанай атмасферы	У вучня ёсць процівагаз у баявым стане. Кіраўнік даводзіць да вучня характар пашкоджання процівагаза: пашкоджана фільтруючая каробка; пашкоджана шлем-маска. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды «Да ўстаранення няспраўнасці прыступіць» да ўзнаўлення дыхання	*Памылкі:* вучань не заплюшчыў вочы і не затрымаў дыханне; пасля ўстаранення няспраўнасці не зрабіў поўны выдых; не цалкам навінчана фільтруючая каробка на шлем-маску; дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя. *Адзнака:* 1. Пры замене фільтруючай каробкі: 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 15 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 16 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 17 с, 3–4 балы – нарматыў выкананы за 18 с; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 18 с. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная

		памылка зніжае адзнаку на 1 бал. 2. Пры здыманні шлема-маскі: 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 11 с; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 11 с. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
3. Надзяванне рэспіратара	У вучня ёсць рэспіратар у паходным стане. Па камандзе «Рэспіратар надзець» вучань надзявае рэспіратар. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды да надзявання рэспіратара і поўнага выдыху	*Памылкі:* пры надзяванні рэспіратара вучань не затрымаў дыханне; пасля надзявання не зроблены поўны выдых; канцы насавога заціску рэспіратара не прыціснуты да носа; дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 11 с; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 11 с, пашкоджаны рэспіратар. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
4. Надзяванне агульнавайсковага ахоўнага камплекта	У вучня ёсць сродкі аховы ў паходным стане. Час адлічваецца ад падачы каманды «Плашч у рукавы, панчохі, пальчаткі надзець. Газы» да поўнага надзявання сродкаў аховы і дакладу «Гатоў»	*Памылкі:* надзяванне ахоўных панчох праводзілася з зашпілены мі хлясцікамі; панчохі не падвязаны, няправільна зашпілены барты плашча або не цалкам надзеты панчохі; не замацаваны закрэпкамі трымальнікі шпянькоў або не зашпілены 2 шпянькі; дапушчаны памылкі пры надзяванні процівагаза. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 3 мін 30 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 4 мін; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 4 мін 30 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 5 мін; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 5 мін або пашкоджаны сродкі засцярогі. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
5. Дзеянні па сігнале «Хімічная трывога»	У вучня ёсць сродкі аховы ў паходным стане. Вучань надзявае процівагаз, плашч у выглядзе накідкі і вядзе назіранне за мясцовасцю. Час адлічваецца ад падачы каманды, сігналу «Хімічная трывога» да надзявання сродкаў аховы і дакладу «Гатоў»	*Памылкі:* не надзеты капялюш на галаву; не захінуты барты плашча; дапушчаны памылкі пры надзяванні процівагаза; не вядзецца назіранне за мясцовасцю. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 50 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 10 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 20 с; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін 20 с або пашкоджаны сродкі аховы. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні

		нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
6. Частковая спецыяльная апрацоўка пры заражэнні радыеактыўнымі рэчывамі	Вучань знаходзіцца на пляцоўцы для спецыяльнай апрацоўкі. Сродкі аховы ў баявым стане. У кожнага вучня – пляшка з вадой, тампоны (рыззё). Вучань выконвае праціранне ўсёй паверхні індывідуальнай зброі і рамяня зверху ўніз тампонамі (рыззём), змочанымі вадой, затым сухімі тампонамі (рыззём). Выкарыстаныя тампоны (рыззё) збіраюцца і закопваюцца, здымаюцца сродкі аховы скуры і процівагазы, выконваецца частковая санітарная апрацоўка. Час адлічваецца ад падачы каманды «Да частковай спецыяльнай апрацоўкі прыступіць» да даклада аб заканчэнні апрацоўкі	*Памылкі:* паверхні апрацаваны няякасна; не закапана выкарыстанае рыззё; не апрацаваны адкрытыя ўчасткі рук, шыі або тваравая частка процівагаза; не абмыты вадой твар або не прапаласканы рот і горла. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 13 мін; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 14 мін; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 15 мін; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 16 мін; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 16 мін. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
7. Частковая спецыяльная апрацоўка пры заражэнні атрутнымі рэчывамі або біялагічнымі (бактэрыялагічнымі) сродкамі	Вучань знаходзіцца на пляцоўцы для спецыяльнай апрацоўкі. Сродкі аховы ў баявым стане. У кожнага вучня ІСП-8 (флакон запоўнены вадой) і тампоны. Вучань выконвае дэгазацыю ўсёй паверхні асабістай зброі, сухімі тампонамі (рыззём) працірае, затым змазвае зброю, збірае і закопвае (пры дэзінфекцыі спальвае) выкарыстаныя тампоны (рыззё), затым здымае заражаныя сродкі аховы і ў процівагазе са зброяй адыходзіць на 10 м у наветраны бок, з дапамогай ІСП апрацоўвае шыю, кісці рук, каўнер, абшлагі рукавоў, пярэднюю частку процівагаза і здымае іх. Час адлічваецца ад падачы каманды «Да частковай спецыяльнай апрацоўкі прыступіць» да даклада аб заканчэнні апрацоўкі	*Памылкі:* не закапаны (не спалены) выкарыстаныя тампоны (рыззё); не апрацаваны бачныя кроплі атрутных рэчываў (нанесеныя меткі); дакрананне апрацаванымі або чыстымі часткамі цела або адзення заражаных сродкаў аховы; процівагаз зняты да каманды кіраўніка. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 16 мін 30 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 17 мін; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 17 мін 30 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 18 мін; 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 18 мін. Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
Страявая падрыхтоўка		
1. Страявая стойка	Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы па патрабаванні кіраўніка	*Памылкі:* наскі разгорнуты не па лініі фронту і не на шырыню ступні; абцасы не пастаўлены разам; кісці рук не па сярэдзіне бёдраў, трымаюцца далонямі назад; грудзі не прыўзняты; жывот не падабраны; цела не пададзена ўперад; галава апушчана; рукі сагнуты ў локцях. *Адзнака:* 10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа; 9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем; 8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка; 7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі;

		6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі; 5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі; 4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі; 3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі; 2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак; 1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак
2. Павароты на месцы	Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы па патрабаванні кіраўніка	*Памылкі:* пасля павароту не захоўваецца правільнае становішча рук і ног; ногі ў каленях згінаюцца; рукі адыходзяць ад бёдраў; нага прыстаўляецца не найкарацейшым шляхам; паварот выкананы не на 90° або 180°. *Адзнака:* 10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа; 9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем; 8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка; 7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі; 6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі; 5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі; 4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі; 3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі; 2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак; 1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак
3. Страявы крок	Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы па патрабаванні кіраўніка	*Памылкі:* корпус адведзены назад; адсутнічае каардынацыя ў руху рук і ног; галава апушчана ўніз; рух рукамі каля цела выконваецца не ад пляча, а за кошт згінання ў локцях; пад’ём ног ад зямлі ніжэйшы за 15 см; памер кроку меншы (большы) за 70–80 см; нага заносіцца за нагу; рух рук наперад выконваецца ніжэй (вышэй) за ўсталяваную вышыню, пры руху назад рука не выпраўлена.

		Адзнака: 10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа; 9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем; 8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка; 7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі; 6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі; 5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі; 4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі; 3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі; 2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак; 1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак
4. Павароты ў руху	Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы па патрабаванні кіраўніка	*Памылкі:* паварот выкананы несвоечасова; паварот направа, налева выконваецца не на насках абедзвюх ног; рух рукамі пры павароце выконваецца не ў такт кроку; пры руху галава апушчана ўніз; адсутнічае каардынацыя ў руху рук і ног; корпус цела пры павароце пададзены назад. *Адзнака:* 10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа; 9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем; 8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка; 7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі; 6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі; 5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі; 4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі; 3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі;

		2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак; 1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак
Ваенная тапаграфія		
1. Вызначэнне бакоў гарызонту па компасе	У вучня ёсць компас. З дапамогай компаса вызначае бакі гарызонту. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў бакоў гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах)	*Памылкі:* памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту (5–10°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; няўменне карыстацца компасам, няўпэўненыя дзеянні. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана больш за 3 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 3 мін; памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту перавышае 10°. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту не перавышае 3°
2. Вызначэнне бакоў гарызонту па сонцы і гадзінніку	У вучня ў руках знаходзіцца гадзіннік або макет цыферблата гадзінніка. На небе відаць сонца. Вучань вызначае бакі гарызонту па сонцы з выкарыстаннем гадзінніка. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў бакоў гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах)	*Памылкі:* памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту (10–15°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; няправільна размешчаны гадзіннік у адносінах да сонца; вучань не ведае, які вугал на цыферблаце палавіняць да поўдня і пасля поўдня. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 3 мін), памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту перавышае 15°. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту не перавышае 6°
3. Вызначэнне бакоў гарызонту па нябесных святілах і мясцовых прадметах	Вучань вызначае бакі гарызонту па нябесных святілах (Сонцы, Палярнай зорцы), мясцовых прадметах. Час (да 3 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў бакоў гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах)	*Памылкі:* памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту (15–20°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; не выкарыстаны ў поўным аб'ёме відавочныя ўласцівасці мясцовых прадметаў. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 3 мін), памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту перавышае 20°. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні бакоў гарызонту не перавышае 9°

4. Вызначэнне магнітнага азімута на ўказаны прадмет па компасе	Кіраўнік заняткаў паказвае мясцовы прадмет і ставіць задачу – вызначыць па компасе азімут кірунку на гэты прадмет. Час (да 3 мін) адлічваецца ад указання мясцовага прадмета да даклада вучня «Гатова»	*Памылкі:* памылка ў вызначэнні магнітнага азімута перавышае 10°; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 3 мін; няўменне карыстацца візірам компаса; няўменне выканаць адлік па компасе. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 4 мін, памылка ў вызначэнні магнітнага азімута перавышае 15°. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні магнітнага азімута не перавышае 5°
Ваенна-медыцынская падрыхтоўка		
1. Раскрыццё пакета перавязачнага індывідуальнага	Вучань ляжыць, у руцэ трымае пакет. Па камандзе «Да выканання нарматыву прыступіць» раскрывае пакет. Вымае шпільку і прышпільвае яе да свайго адзення не зашпільваючы. Падрыхтоўвае пакет да аказання першай медыцынскай дапамогі	*Памылкі:* не вынута і не прышпілена да адзення шпілька; не разгорнуты цалкам падушачкі; няправільнае палажэнне бінта ў руках; парушана стэрыльнасць пакета перавязачнага індывідуальнага. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 20 с, стэрыльнасць не парушана; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 22 с, стэрыльнасць не парушана; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 24 с, стэрыльнасць не парушана; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 26 с, стэрыльнасць не парушана; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 28 с, парушана стэрыльнасць. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал
2. Накладанне першаснай павязкі: павязка на правае (левае) вока; павязка на правае (левае) вуха; павязка на локцевы (каленны) сустаў;	Вучань ляжыць каля «параненага». Час, затрачаны на агаленне раны, не ўлічваецца (дапускаецца бінтаванне на абмундзіраванне). Перавязачны матэрыял знаходзіцца ў руках вучня або побач з ім. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» (ад пачатку разгортвання перавязачнага матэрыялу) да замацавання павязкі (шпількай або канцамі надарванай стужкі бінта)	*Памылкі*, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы: павязка накладзена слаба (спаўзае) або пры яе накладанні ўтвараюцца «кішэні», зморшчыны; павязка не замацавана або замацавана вузлом над ранай. *Адзнака па часе:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 40 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 50 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 2 мін 10 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін 20 с. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 20 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 30 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 40 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 50 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 20 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 30 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 40 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 50 с;

		1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання
павязка на плечавы сустаў;		9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 25 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 35 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 45 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 55 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін 05 с. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання
«васьміпадобная» павязка на грудзі (накладаецца адным пакетам і бінтам);		9–10 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін 40 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін 50 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 3 мін; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 3 мін 10 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 3 мін 20 с. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання
павязка на галёнкаступнёвы сустаў		9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 15 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 25 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 35 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 45 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання
3. Накладанне гумавага кроваспыняльнага жгута на бядро (плячо)	Вучань ляжыць каля «параненага» і трымае ў руках жгут. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» да замацавання жгута і пазначэння часу яго накладання	*Памылкі*, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы: накладанне жгута на вобласць ранення або ніжэй; накладанне жгута на аголены ўчастак цела без падкладкі, ушчамленне жгутом скуры; вучань не пазначыў час накладання жгута. *Адзнака па часе:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 25 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 27 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 30 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 32 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 35 с, няправільнае накладанне жгута (расслабленне або саслізганне), што можа выклікаць паўторны крывацёк. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі адсутнічае празмернае перацягванне жгутом канечнасці
4. Накладанне закруткі з дапамогай хусткі і іншых падручных сродкаў на бядро (плячо)	Вучань ляжыць каля «параненага». Побач размешчаны падручныя сродкі для спынення крывацёку. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» да замацавання закруткі і пазначэння часу яе накладання	*Памылкі*, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы: накладанне закруткі на вобласць ранення або ніжэй; накладанне закруткі на аголены ўчастак цела без падкладкі, ушчамленне скуры закруткай; вучань не пазначыў час накладання закруткі. *Адзнака па часе:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 40 с; 7–8 балаў – нарматыў выкананы за 43 с; 5–6 балаў – нарматыў выкананы за 45 с; 3–4 балы – нарматыў выкананы за 50 с; 1–2 балы – нарматыў выкананы за 55 с, няправільнае накладанне закруткі (расслабленне або саслізганне), што можа выклікаць паўторны крывацёк. Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі адсутнічае празмернае перацягванне хусткай канечнасці

Дадатак 3

МЕДЫЦЫНСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Нумар і назва нарматыву	**Парадак (умовы) выканання нарматыву**	**Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака**
1. Раскрыццё пакета перавязачнага	Вучань трымае пакет у левай руцэ і па камандзе настаўніка раскрывае яго. Вымае шпільку і прышпільвае яе да свайго адзення не зашпільваючы. Чахол пакета кладзе вонкавым бокам на стол	*Памылкі:* не вынята і не прышпілена да свайго адзення шпілька; не разгорнуты цалкам падушачкі; няправільнае палажэнне бінта ў руках; парушана стэрыльнасць пакета перавязачнага. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка, стэрыльнасць не парушана; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі, стэрыльнасць не парушана; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі
2. Накладанне першаснай павязкі на галаву «чапцом», на перадплечча, локцевы, каленны і галёнкаступнёвы суставы	Перавязачны матэрыял (бінты нестэрыльныя, загорнутыя ў паперу, лічацца ўмоўна стэрыльнымі) ляжыць на стале побач са статыстам, якому накладаецца павязка. Дапускаецца накладанне павязкі на адзенне. Статыст размяшчаецца ў зручным для накладання павязкі становішчы. Па заданні і камандзе настаўніка вучні накладаюць паказаную павязку. Выкананне нарматыву завяршаецца замацаваннем канца бінта	*Памылкі:* парушэнне стэрыльнасці перавязачнага матэрыялу; не выканана тэхналогія накладання павязкі; накладанне павязкі не на тую вобласць (бок); няправільнае трыманне бінта ў руках; ненадзейнае замацаванне павязкі. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка, стэрыльнасць не парушана; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі, стэрыльнасць не парушана; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі, парушана стэрыльнасць; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі
3. Накладанне кроваспыняльнага жгута (закруткі) на бядро і плячо	Статыст ляжыць у зручным становішчы. Вучань трымае разгорнуты жгут у руках, на стале побач ляжаць матэрыял для накладання закруткі, блакнот і аловак. Жгут (закрутку) накладаюць на адзенне. Па заданні і камандзе выкладчыка вучань накладае жгут (закрутку) на паказаную вобласць, паказвае час яго накладання (гадзіны, хвіліны), падкладвае запіску пад апошні ход жгута і кантралюе адсутнасць пульсу на перыферычным сасудзе	*Памылкі:* накладанне жгута (закруткі) не на тую вобласць (бок); празмернае перацягванне канечнасці або наяўнасць пульсу на перыферычным сасудзе; не запісаны час накладання жгута (закруткі); накладанне жгута (закруткі) на голае цела. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі
4. Імабілізацыя пляча, перадплечча, бядра, галёнкі падручнымі сродкамі пры пераломах	Статыст пры імабілізацыі верхняй канечнасці сядзіць, пры імабілізацыі ніжняй канечнасці – ляжыць. Падручныя сродкі імабілізацыі (палоскі фанеры, рэйкі і інш. даўжынёй 30–50 см, 70–150 см, а таксама бінты, хустка і вата) ляжаць на стале. Вучні падбіраюць і падганяюць сродкі імабілізацыі ў адпаведнасці з заданнем. Імабілізацыя пры пераломах праводзіцца без накладання павязкі і на адзенне	*Памылкі:* дрэнна падабраныя і падагнаныя падручныя сродкі імабілізацыі; канечнасці нададзена няправільнае становішча; назіраецца рухомасць у двух бліжэйшых да месца пералому суставах (пры пераломах бядра нерухомымі павінны быць тазабедраны, каленны і галёнкаступнёвы суставы); пры імабілізацыі пляча і перадплечча рука не падвешана на хустцы. *Адзнака:* 9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка; 5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Допризывная подготовка» для VIII–XI классов кадетских училищ, специализированных лицеев, учреждения образования «Минское суворовское военное училище»

ДОПРИЗЫВНАЯ ПОДГОТОВКА

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Учебный предмет «Допризывная подготовка» в кадетских училищах, специализированных лицеях и учреждении образования «Минское суворовское военное училище» изучается в целях создания условий для военно-профессионального самоопределения учащихся, формирования у них готовности к службе в Вооруженных Силах Республики Беларусь, в государственных органах системы обеспечения национальной безопасности Республики Беларусь.

Задачами обучения являются:

интеллектуальное, культурное, нравственное и физическое развитие обучающихся, их адаптация к дальнейшей жизни в обществе;

обеспечение качества образования, а также первичных знаний и навыков в военном деле, необходимых для профессиональной ориентации;

воспитание гражданственности и патриотизма, дисциплинированности и ответственности, товарищества, коллективизма, взаимовыручки, гуманности, нравственности, основ культуры общения и уставных взаимоотношений, формирование у учащихся чувства верности конституционному долгу по защите Республики Беларусь;

формирование у учащихся первичных знаний и навыков, необходимых для защиты Республики Беларусь;

ознакомление с Военной доктриной Республики Беларусь, историей и современным состоянием Вооруженных Сил Республики Беларусь, основными положениями общевоинских уставов Республики Беларусь, порядком прохождения службы, службы в резерве;

формирование знаний, умений, навыков по оказанию первой помощи пострадавшим;

обучение действиям в экстремальных условиях; выполнению нормативов и упражнений по основам военного дела.

Содержание обучения направлено на формирование у обучаемых умений и основ культуры службы, патриотического воспитания, интеллектуального, культурного, физического и нравственного развития, подготовку учащихся к выполнению долга по защите Республики Беларусь, развитие у них навыков поведения и действий в соответствии с требованиями общевоинских уставов.

На уроках по допризывной подготовке необходимо применять разнообразные формы и методы обучения, вызывающие интерес обучающихся к изучаемому материалу, прививающие им любовь к военному делу, обеспечивающие сознательное, прочное усвоение учебной программы, способствуя выработке навыков самостоятельной работы и умению применять на практике полученные знания.

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Учащиеся должны:

знать:

цель и задачи допризывной подготовки;

назначение общевоинских уставов, правила воинской вежливости, воинские звания;

историю создания белорусской армии; назначение, состав и структуру Вооруженных Сил Республики Беларусь, основные виды вооружения и боевой техники;

текст Военной присяги и порядок ее принятия;

характер и основное содержание военной политики Республики Беларусь;

перечислять:

основные вехи военной истории нашего Отечества;

подвиги соотечественников, проявивших мужество и героизм при защите Родины;

права, обязанности и ответственность призывника; порядок приписки к призывным участкам и призыва на военную службу, службу в резерве;

основные положения Конституции Республики Беларусь о защите Республики Беларусь, законов Республики Беларусь «Об обороне», «О Вооруженных Силах Республики Беларусь», «О воинской обязанности и воинской службе»;

называть:

определение войн и их классификацию;

особенности современных войн;

меры безопасности при обращении с оружием;

действия солдата в обороне и в наступлении;

организацию, вооружение и боевой порядок мотострелкового отделения;

краткую характеристику оружия массового поражения; средства индивидуальной защиты;

назначение и состав суточного наряда роты;

обязанности дневального по роте;

назначение, устройство и основные характеристики пневматической винтовки;

назначение, боевые свойства, общее устройство и принцип работы автомата АК-74;

основы, приемы и правила стрельбы;

назначение, тактико-технические характеристики и общее устройство ручных осколочных гранат; порядок боевого применения ручных осколочных гранат и меры безопасности при обращении с ними;

различать:

виды Вооруженных Сил и рода войск;

стрелковое оружие Сухопутных войск Республики Беларусь;

военную технику Сухопутных войск и войск ПВО;

военную технику стран НАТО;

объяснять:

сущность и значение воинской дисциплины; поощрения, применяемые к солдатам; дисциплинарные взыскания, налагаемые на солдат;

порядок ориентирования на местности без карты и движения по азимутам; топографическую карту и топографические знаки;

уметь:

стрелять из пневматической винтовки и выполнять установленные программой упражнения стрельб;

применять средства индивидуальной защиты – противогаз, респиратор и общевойсковой защитный комплект (далее – ОЗК);

На III ступені навучання на павышаным узроўні развіццё моўнай кампетэнцыі вучняў адбываецца ў напрамку пашырэння іх слоўнікавага запасу, у тым ліку за кошт лінгвістычнай і міжпрадметнай тэрміналогіі (лексіка такіх дысцыплін, як мова, маўленне, культура маўлення, стылістыка, рыторыка), знаёмства з літаратурнымі беларускімі творамі, засваенне актуальнай грамадска-палітычнай, эканамічнай, інфармацыйнай лексікі, а таксама развіццё граматычнага ладу маўлення.

Камунікатыўная кампетэнцыя звязана з авалоданнем відамі маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо) і асновамі культуры вуснага і пісьмовага маўлення, уменнямі і навыкамі выкарыстання мовы ў розных сферах і сітуацыях зносін.

На павышаным узроўні развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі адбываецца за кошт удакладнення і пашырэння відаў лінгвамаўленчай дзейнасці, якія рэалізуюць практыка-арыентаваны характар моўнай адукацыі: складанне плана, тэзісаў і тэксту, падрыхтоўка рэферата, даклада, напісанне анатацыі, рэцэнзіі, мэтанакіраваныя выпіскі, аналітычнае паведамленне на аснове самастойнага вывучэння тэксту (па плане, прапанаваным настаўнікам, а затым па ўласным плане), творчыя працы ў жанры эсэ, нарыса, апавядання і інш.

Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя звязана з усведамленнем вучнямі мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, узаемасувязі мовы і гісторыі народа,

нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы, валоданнем нормамі маўленчага этыкету, культурай міжнацыянальных зносін.

Вучэбны матэрыял, звязаны з фарміраваннем лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі, пададзены ў раздзелах «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства» (мова і нацыянальная культура, мова і гісторыя народа і г.д.), «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення» (безэквівалентная лексіка, фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі і інш.), а таксама праз культуразнаўчыя тэксты.

Прыярытэтнай задачай профільнага навучання становіцца фарміраванне культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, таму засваенне і асэнсаванне ўсіх моўных адзінак на III ступені навучання адбываецца ў аспекце культуры маўлення, што і перадае назва раздзелаў вучэбнай праграмы: «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення». З гэтай мэтай пашыраюцца веды вучняў пра нормы беларускай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, словаўтваральныя, граматычныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя), сродкі і прыёмы маўленчай выразнасці, стылістычную ролю і тэкстаўтваральныя магчымасці моўных сродкаў беларускай мовы, ацэнка чужых і рэдагаванне ўласных выказванняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 19 гадзін – на пісьмовыя работы)

Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства
(1 гадзіна)

Маўленне
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Маўленне як працэс маўленчых зносін. Маўленчая сітуацыя і яе кампаненты.

Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне і пісьмо. Формы маўленчай камунікацыі: вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная. Умовы паспяховых маўленчых зносін.

Пісьмовая творчая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі.

Адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, валодаць навыкамі чытання тэкстаў розных стыляў услых і самому сабе, весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і неафіцыйных маўленчых зносін.

Тэкст
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту. Апавяданне, апісанне, разважанне як тыпы маўлення.

Пісьмовая творчая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі

(падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы.

Аналізаваць і ствараць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх схемы.

Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення

(25 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Гукавая абалонка слова. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў.

Арфаэпічныя нормы: вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных. Акцэнталагічныя нормы.

Стылістычныя магчымасці фанетыкі беларускай мовы.

Кантрольны дыктант.

Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Арфаграфічныя нормы: напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе; напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе; правапіс мяккага знака і апострафа, вялікай і малой літар; правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна.

Кантрольная тэставая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць і захоўваць арфаэпічныя і арфаграфічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Знаходзіць і выпраўляць вымаўленчыя і правапісныя парушэнні норм літаратурнай беларускай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм.

Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі фанетыкі.

Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення

(12 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Лексічнае і граматычнае значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Амонімы. Паронімы. Сінонімы. Антонімы.

Кантрольнае сачыненне.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні.

Лексічныя і фразеалагічныя нормы: ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў, правільнае выкарыстанне сінонімаў, антонімаў, паронімаў, правільнае ўжыванне фразеалагізмаў.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Стылістычныя магчымасці лексікі і фразеалогіі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць прыметы адназначных і мнагазначных слоў, ужытых у прамым і пераносным значэнні; сінонімаў, амонімаў, антонімаў, паронімаў; фразеалагізмаў, іх значэнне.

Ведаць і захоўваць лексічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць прамое і пераноснае значэнне слова; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы, амонімы.

Выяўляць у сказах, тэкстах фразеалагізмы, разумець іх значэнні, вызначаць сэнсава-стылістычную і сінтаксічную ролю.

Знаходзіць і выпраўляць лексічныя недахопы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння нормаў.

Карыстацца стылістычнымі магчымасцямі лексікі і фразеалогіі; правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце.

Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення
(11 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)

Марфема як мінімальная значымая адзінка мовы. Вытворная і невытворная асновы. Утваральная аснова.

Правапіс ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Правапіс складаных і складанаскарочаных слоў.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Спосабы ўтварэння слоў. Словаўтваральныя нормы.

Стылістычныя магчымасці словаўтварэння.

Кантрольны дыктант.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Усведамляць ролю марфем як мінімальна значымых частак слова; ведаць віды асноў, спосабы ўтварэння слоў.

Вызначаць у словах марфемы; размяжоўваць вытворныя і невытворныя словы; адрозніваць спосабы ўтварэння слоў.

Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення
(39 гадзін, з іх 9 гадзін – на пісьмовыя работы)

Сістэма часцін мовы беларускай мовы.

Назоўнік, яго граматычныя прыметы. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Род і лік назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў, правапіс склонавых канчаткаў.

Марфалагічныя нормы: вызначэнне роду нескланяльных запазычаных назоўнікаў і абрэвіятур, неадушаўлёных складаных назоўнікаў; ужыванне нескланяльных назоўнікаў.

Кантрольны дыктант.

Прыметнік, яго граматычныя прыметы. Разрады прыметнікаў паводле значэння. Утварэнне ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Утварэнне і скланенне прыметнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў і суфіксаў прыметнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў і ўжыванне прыналежных прыметнікаў.

Кантрольнае сачыненне.

Лічэбнік, яго граматычныя прыметы.

Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Скланенне і правапіс лічэбнікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне колькасных, парадкавых, зборных і дробавых лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў.

Займеннік, яго граматычныя прыметы. Разрады займеннікаў. Утварэнне і правапіс займеннікаў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых займеннікаў, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займенніку, акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў сам, сама, самы, ніхто, нішто.

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Дзеяслоў, яго граматычныя прыметы. Формы дзеяслова. Правапіс дзеясловаў.

Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як асобыя формы дзеяслова. Граматычныя прыметы дзеепрыметніка. Утварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў. Граматычныя прыметы дзеепрыслоўя. Утварэнне і правапіс дзеепрыслоўяў.

Пісьмовая творчая работа.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу, ужыванне дзеясловаў з суфіксамі ***-ава-(-ява-) і -ірава- (-ырава-)***, акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных форм

дзеясловаў; ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў.

Прыслоўе, яго граматычныя прыметы. Разрады прыслоўяў па значэнні. Утварэнне форм ступеней параўнання якасных прыслоўяў. Утварэнне і правапіс прыслоўяў.

Марфалагічныя нормы: адрозненне вышэйшай ступені параўнання прыслоўя ад вышэйшай ступені параўнання прыметніка.

Кантрольны пераказ тэксту.

Прыназоўнік, злучнік, часціца як службовыя часціны мовы. Граматычныя прыметы прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Выклічнік і гукаперайманне. Правапіс прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў і гукаперайманняў.

Марфалагічныя нормы: ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія адлюстроўваюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Кантрольны дыктант.

Ужыванне часціц ***не*** і ***ні***. Правапіс ***не (ня)***, ***ні*** з рознымі часцінамі мовы.

Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці слоў і іх форм.

Кантрольная тэставая работа.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Ведаць марфалагічныя прыметы пэўнай часціны мовы і сінтаксічную ролю ў словазлучэннях і сказах, ролю розных часцін мовы ў арганізацыі маўлення, разгортванні і стварэнні тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Распазнаваць часціны мовы і іх формы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсавых, граматычных і сінтаксічных прымет; рабіць марфалагічны разбор часцін мовы. Выяўляць пэўныя моўныя адзінкі ў тэкстах, вызначаць асаблівасці іх ужывання ў тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Мэтанакіравана і свядома ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам пэўнай камунікатыўнай задачы; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з улікам сэнсава-стылістычнай ролі і тэкстаўтваральных магчымасцей слоў розных часцін мовы.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
(2 гадзіны)

Рэзервовыя гадзіны
(2 гадзіны)

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Беларуская мова: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М.Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009.

Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы: 10–11 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2012, 2014.

Беларуская мова ў 10 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Беларуская мова: тэставыя работы: 8–11 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко. – Мінск: Аверсэв, 2013, 2014.

Беларуская мова. 10–11 класы. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, І.Л. Бурак. – Мінск: Аверсэв, 2012.

Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. 10–11 класы: вучэб.-метад. комплекс / Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, І.Л. Бурак. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Жуковіч, М.В. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.В.Жуковіч. – Мінск: Аверсэв, 2015.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агул. сярэд. адукацыі: тэксты для пераказаў / склад. Г.М.Валочка [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі; Аверсэв, 2013, 2014.

Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10–11 класы: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Дыктанты па беларускай мове. 9–11 класы: дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А.І. Калечыц, А.К. Пекач, Т.Я. Старасценка. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Беларуская мова: 5–11 класы: кантрольныя работы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С.І. Цыбульская. – Мінск: Сэр-Віт, 2012.

Беларуская мова. X клас: электронны адукацыйны рэсурс (adu.by).

СЛОЎНІКІ І ДАВЕДНІКІ

Анисим, Е.Н. Русско-белорусский словарь для школьников / Е.Н. Анисим, О.В. Мицкевич. – Минск: Сучасная школа, 2010.

Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад.: І.У. Кандраценя, Л.П. Кунцэвіч; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў. Новыя правілы правапісу / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Беларуска-рускі слоўнік для школьнікаў / І.Л. Капылоў, І.У. Ялынцава. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Капылоў, І.Л. Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна. – Мінск: Сучасная школа, 2010.

Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г.М. Малажай, Л.І. Яўдошына. – Мінск: Аверсэв, 2013.

Современный русско-белорусский словарь для школьников / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: Літаратура і Мастацтва, 2009, 2013.

Николаева, О.М. Современный русско-белорусский словарь / О.М. Николаева, Т.Н. Трухан; под ред. А.А. Лукашанца. – Минск: ТетраСистемс, 2011.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Разам, асобна, праз злучок: даведнік: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / склад.: Н.Д. Бандарэнка, І.Л. Капылоў, Т.М. Маракуліна; пад рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Аверсэв, 2011, 2013.

Уласевіч, В.І. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў / В.І. Уласевіч, Н.М. Даўгулевіч. – Мінск: Аверсэв, 2013. – 253 с.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з актуальнымі задачамі ўдасканалення як сістэмы адукацыі ўвогуле, так і літаратурнага навучання ў прыватнасці. Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе арыентавана на дасягненне мэт, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».

Вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, якія арыентуюць на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, на эстэтычны і творчы характар засваення прадмета, улічваюць узроставa-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура – дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ў школе – сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных норм і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры – гэта найперш працэс жыццепазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Галоўная мэта навучання прадмету – далучэнне вучняў да багацця беларускай мастацкай літаратуры, эстэтычнае спасціжэнне імі свету, складанасці чалавечых узаемаадносін і на гэтай аснове – выхаванне асобы з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, адданасцю агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здатнай успрыманне прыгажосці (эстэтычнае ўспрыманне) ператварыць у стымул маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця. Яе рэалізацыя прадугледжвае рашэнне шэрага задач навучання:

фарміраванне ў вучняў ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць самастойнае засваенне мастацка-эстэтычных, духоўна-маральных каштоўнасцей;

фарміраванне літаратурнай кампетэнцыі – сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці;

фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі, развіццё ўяўленняў пра літаратуру як сацыякультурны феномен;

фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, якая раскрывае камунікатыўную прыроду тэксту, дзе наладжаны дыялог паміж героямі, аўтарам і чытачом, адзінкавым тэкстам і мноствам кантэкстаў;

фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі – сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, г. зн. навучанне дзейнасці праз уключэнне ў гэтую дзейнасць.

Змест літаратурнай адукацыі ў X класе пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

У X класе вядзецца работа па актуалізацыі, паглыбленні і сістэматызацыі ведаў і ўменняў, атрыманых у папярэдніх класах. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных форм урока шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г.д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання з'яўляецца сарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: удасканальваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховым пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў.

Веданне параметраў развіцця асобы дазваляе рэалізаваць дыферэнцыраваны падыход да навучання літаратуры. Каб развіць здольнасці вучняў з аналітычным тыпам мыслення, мэтазгодна часцей даваць ім заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей прапаноўваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэкціраваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

Навучанне літаратуры ў X класе можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях.

Павышаны ўзровень навучання літаратуры закліканы садзейнічаць паспяховай падрыхтоўцы вучняў да прафесійнай дзейнасці ў гуманітарнай галіне і накіраваны на авалоданне вучнямі даследчымі і творчымі спосабамі дзейнасці ў межах вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Пры гэтым акцэнт робіцца на фарміраванні агульнай літаратуразнаўчай культуры, уменні аналізаваць мастацкі тэкст з выкарыстаннем ведаў па гісторыі і тэорыі літаратуры, рабіць абагульненні на літаратурна-мастацкім матэрыяле, супастаўляць творы розных эпох, суадносіць асаблівасці развіцця роднай літаратуры з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам.

Вывучэнне літаратуры на павышаным узроўні дае больш шырокія магчымасці для рэалізацыі міжпрадметных сувязей, у першую чаргу з вучэбным прадметам «Беларуская мова». Еднасць гэтых дысцыплін грунтуецца на агульным прадмеце вывучэння – слове як адзінцы мовы і маўлення ў яго функцыянальным значэнні – і прадугледжвае спасціжэнне мовы і літаратуры як нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, музыка, жывапіс і інш.) будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў уяўленняў пра заканамернасці мастацкага асваення свету чалавекам, выпрацоўцы крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі твораў. Разам з гісторыяй і грамадазнаўствам літаратура звяртаецца да праблем, непасрэдна звязаных з грамадскай сутнасцю чалавека, фарміруе гістарызм мыслення, узбагачае культурна-гістарычную памяць вучняў, выхоўвае ў іх актыўныя адносіны да рэчаіснасці, прыроды, усяго навакольнага свету.

На вывучэнне літаратуры ў X класе на павышаным узроўні адводзіцца 105 гадзін, з іх 93 гадзіны – на вывучэнне і абмеркаванне твораў, 10 гадзін – на творчыя работы (з іх 4 кантрольныя сачыненні), 2 гадзіны – на ўрокі па творах для дадатковага чытання.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядных і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджвае ўвагу на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць больш мэтазгодным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным каляндарна-тэматычным планаваннем.

2 гадзіны рэзерву вучэбнага часу могуць быць выкарыстаны настаўнікам на вывучэнне літаратурных твораў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(105 гадзін)

Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя
(33 гадзіны)

Беларуская літаратура першай трэці XX ст. на фоне гістарычных падзей і развіцця сусветнай літаратуры *(1 гадзіна)*.

Актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гады, пераемнасць у развіцці літаратуры з нашаніўскім перыядам.

Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства. Творчасць пісьменнікаў старэйшага пакалення – Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі. Прыход у літаратуру творчай моладзі – Міхася Чарота, Уладзіміра Дубоўкі, Міхася Лынькова, Кандрата Крапівы, Міхася Зарэцкага, Кузьмы Чорнага, Язэпа Пушчы, Лукаша Калюгі, Петруся Броўкі і інш. Творчыя здабыткі і пошукі 1920-х гадоў і іх спад у 1930-я гады пад уплывам ідэалагізацыі літаратурнага жыцця. Ліквідацыя літаратурных аб'яднанняў, абвяшчэнне сацыялістычнага

рэалізму адзіным творчым метадам. Становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гады. Утварэнне Саюза пісьменнікаў СССР (1934).

Літаратура Заходняй Беларусі, яе сувязь з агульнанацыянальнай літаратурай (Уладзімір Жылка, Максім Танк, Міхась Машара, Валянцін Таўлай, Міхась Васілёк і інш.).

Тэорыя літаратуры. Літаратурны працэс. Рэалізм, мадэрнізм і яго плыні (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. М у з ы к а: *М.Равенскі*. Песня «Моладзь» (сл. М.Чарота); *А.Туранкоў*. Опера «Кветка шчасця» (п'еса М.Чарота «На Купалле»).

Ж ы в а п і с: *А.Лісіцкі*. Плакат «Клінам чырвоным бі белых»; *В.Волкаў*. «Маладняковец»; *М.Гусеў*. «Партрэт М.Чарота»; *Я.Драздовіч*. Афармленне часопіса «Рунь»; *М.Станюта*. «Смутак», «Будаўніцтва Універсітэцкага гарадка»; *М.Філіповіч*. «Супрэматычнае кола», «Супрэматызм»; *Т.Ціхаў*. «Вогненны анёл»; *М.Шагал*. «Мір хацінам, вайна палацам».

Літаратура

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1999–2003. – Т. 2–3*.

Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20–50-я гг.) / пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – 2-е выд. – Мінск: Выш. шк., 2000.

Лявонава, Е. Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX–XX стагоддзя / Е.Лявонава. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998.

Максімовіч, В.А. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя: вучэб. дапам. / В.А.Максімовіч. – Мінск: Беларус. навука, 2006.

* Пры вывучэнні тэм па беларускай літаратуры першай паловы XX ст. таксама рэкамендуецца звяртацца да гэтага выдання.

М а к с і м Г а р э ц к і. Апавяданні **«Роднае карэнне», «Літоўскі хутарок»**, аповесць **«Дзве душы»** (6 гадзін).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Роднае карэнне». Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа Лінкевіча – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці «першапрычыну ўсякае істоты». Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

«Літоўскі хутарок». Суровая праўда пра Першую сусветную вайну, выкрыццё яе антынароднай, антычалавечай сутнасці. Аўтабіяграфічнасць апавядання. Рэалістычная праўдзівасць адлюстравання трагедыйнасці народнага жыцця. Гуманістычная канцэпцыя пісьменніка. Вобраз Яна Шымкунаса – бескарыслівага, высакароднага, гуманнага чалавека.

«Дзве душы». Глыбокі аналіз рэчаіснасці ў спалучэнні з раскрыццём унутранага свету асобы. Станаўленне нацыянальнага характару на пераломным этапе існавання беларускай нацыі. Вобраз Ігната Абдзіраловіча. Ігнат Абдзіраловіч і Васіль. Героі-адраджэнцы Ірына Сакавічанка, Мікола Канцавы, Сухавей. Адсутнасць маральных арыенціраў у Гаршка і Гарэліка. Жанравыя адметнасці аповесці. Сінтэтычны вобраз часу ў аповесці.

Тэорыя літаратуры. Вобраз апавядальніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. С к у л ь п т у р а: *Э.Астаф'еў*. Рэльефны партрэт М.Гарэцкага для мемарыяльнай дошкі.

Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Атрута» (рэж. *М.Стрыжоў*).

Літаратура

Лявонава, Е.А. Беларускае мастацтва слова XX ст. у еўрапейскім літаратурным кантэксце: тыпалогія, рэцэпцыя, пераклад / Е.А.Лявонава. – Мінск: БДУ, 2014.

Мушынскі, М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М.Мушынскі. – Мінск: Беларус. навука, 2013.

Слова пра літаратуру і літаратараў: Літ. –крытыч. арт. па бел. літ.: Для ст. шк. узросту: у 2 кн. / уклад. В.В.Ашмян [і інш.]. – Мінск, Маст. літ., 2001. – Кн. 1. XIX – пач. XX ст.

В а ц л а ў Л а с т о ў с к і. Аповесць **«Лабірынты»** (*2 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Лабірынты». Адлюстраванне ў аповесці ідэі народнай самапавагі і гістарычнай свядомасці. Мастацкае ўвасабленне нацыянальнай канцэпцыі быцця. Жанрава-стылёвая адметнасць твора.

Тэорыя літаратуры. Прыгодніцка-фантастычная аповесць.

З м і т р о к Б я д у л я. Абразкі, лірычныя мініяцюры **«Плач пралескаў», «Нібы рупны араты…»**; апавяданне **«Бондар»** (*3 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Абразкі і лірычныя мініяцюры. Рамантычная настраёвасць твораў, захапленне прыгажосцю роднага краю, спалучаныя з рэалістычным адлюстраваннем жыцця. Лірычны герой-рамантык – асоба ўзвышаная, духоўна багатая. Пошукі сэнсу жыцця, прызначэння чалавека; паяднанасць чалавека з прыродай, роднай зямлёй. Адметнасці жанру: вобразная асацыятыўнасць, метафарычнасць, маналагічнасць формы, рытміка-інтанацыйны лад.

«Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка. Асуджэнне эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці. Мастацкія адметнасці твора: сцісласць, драматызм, псіхалагізм, народная вобразнасць мовы.

Тэорыя літаратуры. Абразок, лірычная мініяцюра як жанры малой прозы.

Літаратура

Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

У л а д з і м і р Д у б о ў к а. Вершы «**Залатая асенняя раніца», «О Беларусь, мая шыпшына…», «Пальцы жоўтых кляновых лістоў», «Родная мова, цудоўная мова...», «Кармазынам асмужаны», «Ты руку сваю забінтавала», «Ніколі праўда не ўмірае»** *(3 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Асноўныя матывы лірыкі. Услаўленне сілы народа, духоўнасці, вольналюбства чалавека, паэтызацыя красы прыроды, кахання. Высокая культура верша, шчыры лірызм, асацыятыўная вобразнасць, багацце жанравых форм. Сувязь лірыкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Янкі Купалы, Якуба Коласа, М.Багдановіча. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі.

Мастацтва. М у з ы к а: *М.Равенскі.* Опера «Браніслава» (лібр. У.Дубоўкі, 1930); песні «На прасторах сініх», «Нас спавівалі», «Ліпнёвы гімн» (сл. У.Дубоўкі), «Месячыку-Месяц» (сл. У.Жылкі); *М.Шчаглоў (Куліковіч).* Рамансы «О Беларусь, мая шыпшына», «А вясна ідзе на Беларусі» (сл. У.Дубоўкі).

Ж ы в а п і с: жывапіс імпрэсіяністаў; *П.Драчоў.* Ілюстрацыі да кнігі «Выбраныя творы» У.Дубоўкі (Т. 1, 2, 1965); *Н.Шчасная.* «Пісьменнік У.М.Дубоўка».

Літаратура

Багдановіч, І. Авангард і традыцыя: беларус. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

Бугаёў, Д. Уладзімір Дубоўка: кніга пра паэта / Д.Бугаёў. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

Р а й н е р М а р ы я Р ы л ь к е. Вершы **«Галетнік беспрытульны ты і ўбогі», «Што зробіш, Божа, як што я загіну?..», «Паэт», «Сёмая элегія»** (*1 гадзіна*).

Сутнасць мастацкага ўніверсалізму Рыльке (спалучэнне элементаў неарамантызму, імпрэсіянізму, сімвалізму, экспрэсіянізму). Філасофска-эстэтычная эвалюцыя паэта. Жанрава-стылёвая разнастайнасць паэзіі.

Літаратура

Лявонава, *Е.А.* Плыні і постаці: З гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст.: дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998. – 334, [1] с.

У л а д з і м і р Ж ы л к а. Вершы **«Меч», «Палімпсест», «Мы любім дзіўныя паданні», «Беларусь», «Праметэй»** *(2 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Адраджэнне традыцый еўрапейскага рамантызму ў паэзіі У.Жылкі. Грамадзянскія і патрыятычныя матывы лірыкі. Карціны гістарычнага мінулага і заклік да абуджэння народа. Вобраз лірычнага героя – рамантыка-максімаліста, змагара за свабоду Радзімы. Сімволіка твораў. Арыентацыя паэзіі У.Жылкі на традыцыі філасофскай лірыкі М.Багдановіча. Багацце і дасканаласць жанравых форм.

Літаратура

І. Багдановіч, І. Авангард і традыцыя: беларус. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Багдановіч. – Мінск: Беларус. навука, 2001.

Максімовіч, В. Шыпшынавы край: Старонкі бел. літ. 20–30-х гг. XX ст. : дапам. для настаўнікаў / В.Максімовіч. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2002. – 160 с.

Я з э п П у ш ч а. Вершы **«Я раніцы кланяўся ў пояс…», «Узвейся, вецер», «Лісты да сабакі», «Словы мае словы – песні агнявыя…», «Лета», «Мора»** (*2 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Агульная ідэйна-пафасная эвалюцыя лірыкі паэта: ад радаснага захаплення жыццём да адчування яго трагічнага надлому і вяртанне да ўраўнаважана-светлага адчування прыгажосці, гармоніі рэчаіснасці. Язэп Пушча – майстар пейзажнай лірыкі. Тэма паэта і паэзіі і яе трагедыйная інтэрпрэтацыя. Сімволіка і яе змест у творчасці паэта.

Тэорыя літаратуры. Мадэрнізм, сімвалізм, імажынізм (паглыбленне паняццяў).

Літаратура

Максімовіч, *В.* Шыпшынавы край: Старонкі бел. літ. 20–30-х гг. XX ст. : дапам. для настаўнікаў / В.Максімовіч. – Мінск: УП «ІВЦ Мінфіна», 2002. – 160 с.

К а н д р а т К р а п і в а. Байкі **«Дыпламаваны Баран», «Махальнік Іваноў», «Дзед і баба», «Саманадзейны конь»;** камедыя **«Хто смяецца апошнім»** *(5 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

Байкі. Выкрыццё бескультур’я, амаральнасці, некампетэнтнасці, бяздушнага стаўлення да сумленных працаўнікоў, высмейванне самаўпэўненасці, нахабства, тупасці, падхалімства і іншых чалавечых заган.

«Хто смяецца апошнім». Час напісання твора. Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Сюжэтная аснова камедыі. Канфлікт у п’есе. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі. Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Сцэнічнае жыццё камедыі. Значэнне творчасці Кандрата Крапівы ў развіцці беларускай драматургіі.

Тэорыя літаратуры. Жанрава-тэматычная разнастайнасць байкі. Камічнае ў мастацкай літаратуры. Сатырычная камедыя. Канфлікт у драматычным творы (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Хто смяецца апошнім» (рэж. *А.Кірэеў*).

К і н а м а с т а ц т в а: тэлефільм «Хто смяецца апошнім» (рэж. *У.Корж-Саблін*).

Літаратура

Бугаёў, Д. Зброяй сатыры, зброяй праўды / Д.Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2004.

Лаўшук, С.С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С.С.Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002.

Ляшук, В.Я. Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе: дапам. для настаўнікаў / В.Я.Ляшук, М. І. Яніцкі. – Мінск: Аверсэв, 2007. – 190, [2] с. – (Бібліятэка настаўніка).

Сабалеўскі, А. Кандрат Крапіва: постаць і творы / А.Сабалеўскі. – 2-е выд. – Мінск, 2003.

А н д р э й М р ы й. Раман **«Запіскі Самсона Самасуя»** (*4 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Запіскі Самсона Самасуя» – твор пра анамаліі грамадскага жыцця сярэдзіны 1920-х гадоў. Рэальная аснова рамана. Галоўны герой твора Самсон Самасуй. Увасабленне ў вобразе тыповых рыс кар'ерызму, эгаізму, бюракратызму, падхалімства, прыстасавальніцтва. Сатырыка-гумарыстычныя сродкі выкрыцця самасуеўшчыны. Выкарыстанне аўтарам прыёму самаацэнкі і самахарактарыстыкі героя (пераказы і каментарыі ўласных і чужых дзеянняў). Сатырычная характарыстыка і маральная ацэнка дзейнасці шапялёўскай інтэлігенцыі (філосаф Торба, Сом, Лін, Мамон, паэт Гарачы). Жанравая адметнасць твора.

Тэорыя літаратуры. Сатырычны раман.

Мастацтва. Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектакль «Брама неўміручасці» (рэж. В.Раеўскі).

К і н а м а с т а ц т в а: тэлефільм «Пратарачка жыцця, або Запіскі Самсона Самасуя».

М і х а с ь З а р э ц к і. Апавяданні **«Ворагі», «Кветка пажоўклая»** (*3 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

«Ворагі». Лёсы Паўла Гуторскага – змагара за рэвалюцыйныя ідэалы – і дачкі памешчыка Ніны Купрыянавай. Грамадскае і асабістае ў апавяданні. Тэма кахання.

«Кветка пажоўклая». Паказ маральнай дэградацыі Марыны Гарновай – чалавека складанай біяграфіі, бязлітаснай да родных і блізкіх. Трагічны фінал апавядання. Псіхалагізм, вастрыня канфлікту ў творы.

М. Зарэцкі – майстар вострага сюжэта, мастацкай дэталі, глыбокі псіхолаг.

Тэорыя літаратуры. Мастацкая дэталь. Стыль пісьменніка (развіццё паняцця).

Мастацтва. Т э а т р а л ь н а е м а с т а ц т в а: спектаклі «Сымон Карызна» (рэж. *У.Кумельскі*, паводле рамана М.Зарэцкага «Вязьмо»), «Ная» (рэж. *М.Кавязін*).

Літаратура

Мушынскі, *М.* Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М.Мушынскі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

С т э ф а н Ц в э й г. Навела **«Нябачная калекцыя»** *(1 гадзіна).*

Творчая спадчына сусветна вядомага аўстрыйскага пісьменніка.

Рэалістычныя традыцыі ў навеле «Нябачная калекцыя». Сутыкненне жорсткіх жыццёвых рэалій і высокага мастацтва. Праблема сапраўдных і ўяўных каштоўнасцей. «Выратавальны падман» героя-апавядальніка. Псіхалагізм у абмалёўцы герояў твора. Майстэрства Цвэйга-навеліста.

Літаратура

Лявонава, Е.А. Плыні і постаці: З гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст. : дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998. – 334, [1] с.

Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (24 гадзіны)

Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.) (*1 гадзіна*).

Антываенны пафас і вызваленчыя матывы беларускай паэзіі і публіцыстыкі. Тэма Радзімы, яе будучыні. Паказ суровай праўды вайны, услаўленне мужнасці і гераізму народа-змагара, асуджэнне здрады Радзіме. Выкрыццё ідэалогіі фашызму. Адлюстраванне трагедыі чалавека на вайне. Перавага лірыкі, публіцыстыкі, сатыры.

Пісьменнікі-франтавікі: А.Куляшоў, П.Панчанка, Максім Танк, М.Лынькоў, Я.Брыль, К.Кірэенка, А.Вялюгін, М.Аўрамчык, А.Бачыла, М.Лужанін, М.Калачынскі, М.Лобан і інш. Удзел беларускіх пісьменнікаў у падпольным і партызанскім руху: А.Астрэйка, А.Бялевіч, У.Карпаў, Р.Мурашка, В.Таўлай, Н.Тарас, А.Іверс і інш. Пісьменнікі, якія загінулі ў гады вайны: М.Сурначоў, Л.Гаўрылаў, А.Гейнэ, Алесь Дубровіч, Р.Жалязняк, Алесь Жаўрук, А.Коршак, С.Крывец, А.Мілюць, М.Нікановіч, А.Пруднікаў, Рыгор Суніца, А.Ушакоў, Х.Шынклер і інш.

Мастацтва. М у з ы к а: *І.Лучанок*. Раманс-песня «Ёсць у горада слава гордая» (сл. А.Вярцінскага); *К.Цесакоў*. Раманс-песня «Было ў салдата два полі» (сл. А.Вярцінскага).

С к у л ь п т у р а: *М.Кандрацьеў*. «Загінуўшых чакаюць вечна (удовы вайны)».

Ж ы в а п і с: *В.Грамыка*. «Балада пра ваенную маладосць», «Салдаты», «Балада пра апошнюю кулю», «Жанчынам Вялікай Айчыннай прысвячаецца»; *І.Рэй*. «Дзякуй, мама!», «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; *М.Савіцкі*. Серыя карцін «Лічбы на сэрцы»; *М.Тарасікаў*. «Брацкія магілы».

П я т р у с ь Б р о ў к а. Вершы **«Будзем сеяць, беларусы!», «Надзя-Надзейка», «Родныя словы», «Александрына», «Вось і лета сышло…», «А ты ідзі»; паэма «Голас сэрца»** (*3 гадзіны*).

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэта.

Агляд творчасці П.Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычны, вызваленчы пафас твораў паэта, сцвярджэнне няскоранасці беларускага народа, выяўленне палымянай веры ў перамогу.

Пашырэнне ідэйна-тэматычнага і жанравага дыяпазону паэзіі П.Броўкі ў 1960–1970-я гады, узмацненне яе гуманістычнага пафасу, увагі да маральна-этычных і агульначалавечых праблем. Роздум пра чалавека, яго прызначэнне і месца ў жыцці. Тэма паэта і паэзіі. Паэтызацыя красы прыроды. Народна-песенная аснова вершаў П.Броўкі, іх мілагучнасць.

«Голас сэрца». Матывы сыноўняга болю і бяды ў паэме. Спалучэнне лірычнага і публіцыстычнага пачаткаў. Вобраз маці-паланянкі. Антываенны і гуманістычны пафас твора.

Мастацтва. М у з ы к а: *У.Мулявін*. Песня «Александрына» (сл. П.Броўкі).

Ж ы в а п і с: *У.Гардзеенка*. «Думы пра былое (П.Броўка)»; *С.Геўрус*. «Партрэт Петруся Броўкі»; *І.Пратасеня*. «Партрэт П.Броўкі».

К у з ь м а Ч о р н ы. Апавяданне **«Макаркавых Волька»;** раман **«Пошукі будучыні»** (*7 гадзін*).

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

«Макаркавых Волька». Канкрэтна-гістарычны змест твора. Адлюстраванне характэрнай для 1930-х гадоў атмасферы падазронасці, недаверу да чалавека. Супрацьпастаўленне гуманістычнай жыццёвай пазіцыі Волькі і агіднай паклёпніцкай

дзейнасці Сафрона Дзядзюлі. Асуджэнне ў апавяданні праяў шальмоўства і прыніжэння чалавечай годнасці. Агульначалавечае значэнне праблем, узнятых у творы.

«Пошукі будучыні» – буйны эпічны твор часу вайны. Сацыяльна-філасофскі змест рамана.

Асаблівасць яго сюжэтна-кампазіцыйнай асновы. Драматызм канфлікту. Аўтарская канцэпцыя гістарычнай будучыні беларускага народа. Драматычны лёс ахвяр Першай і Другой сусветных войнаў. Няздзейсненыя мары старэйшага пакалення (Нявады, Сымона Ракуцькі) аб шчасці. Паказ трагізму вайны і цяжкіх жыццёвых выпрабаванняў у часы фашысцкай акупацыі. Глыбокі маральна-этычны сэнс тэмы «ўкрадзенага дзяцінства». Выкрыццё фашызму як вялікай пагрозы чалавецтву. Асуджэнне авантурысцкіх імкненняў новых прэтэндэнтаў на панаванне ва ўмовах акупацыі. Ганебная смерць графа Паліводскага і Густава Шрэдэра. Антываенны пафас рамана.

Кузьма Чорны – майстар мастацкай дэталі, партрэтнай і моўнай характарыстыкі, пейзажных і бытавых замалёвак, разгалінаванага сюжэта, адлюстравання плыні жыцця і плыні свядомасці.

Значэнне творчасці Кузьмы Чорнага ў развіцці беларускай псіхалагічнай прозы, яе буйных жанраў.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у літаратуры. Жанравыя разнавіднасці рамана.

Мастацтва. С к у л ь п т у р а: *З.Азгур*. «Пісьменнік Кузьма Чорны»; *Э.Астаф'еў*. Рэльефны партрэт К.Чорнага для мемарыяльнай дошкі.

Ж ы в а п і с: *І.Ахрэмчык*. «Партрэт К.Чорнага»; *М.Гуцееў*. Ілюстрацыі да кнігі К.Чорнага «Люба Лук'янская»; *Х.Ліўшыц*. «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах у 1942 годзе»; *М.Савіцкі*. «Партызаны».

Літаратура

Тычына, М. Кузьма Чорны: эвалюцыя мастацкага мыслення / М.Тычына. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005.

А н д р э М а р у а. Навела **«Пакаранне золатам»** (*1 гадзіна*).

Паказ згубнай улады золата ў навеле. Трагікамічнае становішча багатага ранцье Борака і яго жонкі, запалоханых магчымасцю страціць свой капітал. Псіхалагічная матывіроўка паводзін герояў навелы.

Літаратура

Лявонава, Е.А. Плыні і постаці: З гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX–XX ст. : дапам. для настаўнікаў. – Мінск: Часоп. «Крыніца», 1998. – 334, [1] с.

А р к а д з ь К у л я ш о ў. Вершы **«Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «Я хаце абавязаны прапіскаю...»;** вершаваны цыкл **«Маналог»;** паэма **«Сцяг брыгады»** (*6 гадзін*).

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Глыбіня лірычнага пачуцця паэта ў лепшых творах даваеннага часу. Адметнасць вобразнасці і кампазіцыі верша «Мая Бесядзь».

Ваенная лірыка А.Куляшова. Суровая праўда і гуманізм у паказе народнага подзвігу. Трагічнае і лірычнае, фальклорныя матывы ў баладзе «Над брацкай магілай».

Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы. Зварот да тэм жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей. Развіццё і ўзбагачэнне паэтам класічных традыцый лірыкі. Вершаваны цыкл «Маналог»: матывы памяці, вернасці сяброўству, ідэалам маладосці.

Паэтычнае майстэрства А.Куляшова.

«Сцяг брыгады». Адлюстраванне падзей пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў творы. Мастацкае ўвасабленне тэмы вернасці воінскаму сцягу. Вобразы Алеся Рыбкі, Мікіты Ворчака і камісара Заруднага. Патрыятычны пафас твора. Жанрава-стылёвая адметнасць паэмы.

Тэорыя літаратуры. Лірычны герой (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: *М.Савіцкі*. «Партызанская Мадонна (Мінская)»; *П.Гаўрыленка*. «Вясна», «Сяўба»; *М.Сяўрук*. «Жніво»; *У.Кожух*. «Новая дарога»; *М.Рагалевіч*. «Беларуская калыханка»; *А.Бараноўскі*. «Пара залатых бяроз»; *Г.Вашчанка*. «Крылы»; *Я.Драздовіч*. «Космас», «Артаполіс», «Трывеж», «Панарама месячнага горада».

Выяўленчае мастацтва: *Л.Талбузін*. Медаль «Аркадзь Куляшоў».

Музыка: *Э.Наско*. Вакальная музыка «Рамансы на вершы А. Куляшова».

Літаратура

Голуб, *Т.* Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова / Т.Голуб; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск: Беларус. навука, 2014.

Куляшова, *В.А.* Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...: аповесць-эсэ / В.А.Куляшова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014.

Максім Танк. Вершы **«Спатканне», «Родная мова», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ave Maria», «Працягласць дня і ночы», «Голас», «Перакройванне шыняля», «Гравюры Скарыны», «Чытаючы Багдановіча»;** паэма **«Люцыян Таполя»** *(6 гадзін)*.

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Лірыка. Тэмы і вобразы, наватарскі характар танкаўскай паэзіі. Сцвярджэнне нязломнай духоўнай сілы народа. Матыў адзінства пакаленняў. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Свабодны верш у паэзіі Максіма Танка. Інверсія, кантраст, метафара ў яго творах.

«Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. Спалучэнне эпічнага і лірычнага пачаткаў у творы. Выкарыстанне сродкаў паэтызацыі і гратэску ў паэме. Блізкасць героя паэмы Максіма Танка да купалаўскага Гусляра.

Тэорыя літаратуры. Сілаба-танічная сістэма вершаскладання. Верлібр, вобраз асацыятыўны (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Музыка: *У.Алоўнікаў.* Рамансы «Дуб», «Партызанскія акопы»; *А.Багатыроў.* Рамансы «Вяселле», «Калісьці бура на Карпатах», «Клубамі чорнымі дым віўся», «Нарач»; *Г.Вагнер.* Рамансы «Два арлы», «Плача хмара без жалю»; *Я.Глебаў.* Раманс «Нарач»; *І. Лучанок.* Раманс «Два арлы»; *У.Мулявін*. Раманс «Завушніцы»; *П.Падкавыраў.* Раманс «Не шкадуйце, хлопцы, пораху»; *Ю.Семяняка.* Рамансы «Нарач», «Ганна», «Ну і вечар вясновы!»; *Д.Смольскі.* Рамансы «Быць чалавекам я рад», «Ля гэтых сосен», «Плача хмара без жалю»; *Ю.Талеснік.* Раманс «Завушніцы»; *А.Туранкоў.* Рамансы «Вясновая навальніца», «Грай жа, музыка», «У навальніцу»; *Э.Тырманд.* Рамансы «А што гэта за даліна», «Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Сасна», «Ва ўсім, вядома, вінават», «Тост за дружбу», «Памяць».

Скульптура: *А.Бембель.* «Уз'яднанне Заходняй Беларусі».

Жывапіс: *С.Вярсоцкі.* «Возера Нарач»; *С.Герус.* «Партрэт М.Танка»; *Я.Зайцаў.* «Партрэт М.Танка»; *Н.Шчасная.* «Партрэт М.Танка».

Літаратура

Бугаёў, Д. Паэзія Максіма Танка / Д.Бугаёў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2003.

Мікуліч, М.У. Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М.У.Мікуліч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012.

Беларуская літаратура пасляваеннага часу (да сярэдзіны 1960-х гадоў) (33 гадзіны)

Беларуская літаратура пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955 гг.) (*1 гадзіна*).

Патрыятычны і жыццялюбны пафас творчасці, абумоўлены заканчэннем вайны, мірным будаўніцтвам. Ваенная тэма як цэнтральная ў літаратуры.

Вызначальныя творы пасляваеннага дзесяцігоддзя на маральна-этычныя тэмы: апавяданні І.Мележа, Я.Брыля, А.Кулакоўскага, раманы І.Шамякіна, паэмы А.Куляшова, П.Броўкі.

Беларуская літаратура ў гады абнаўлення грамадства (1956–1965 гг.) (*1 гадзіна*).

Змены ў грамадскай атмасферы сярэдзіны 1950-х гадоў і іх дабратворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры. Рэабілітацыя беларускіх пісьменнікаў: Цішкі Гартнага, М.Гарэцкага, У.Жылкі, Міхася Зарэцкага (пасмяротна) і інш. Актыўнае і шматграннае развіццё мастацтва слова. Узвышэнне ў літаратуры народных ідэалаў праўды, сумленнасці і справядлівасці, гуманізму. Узмацненне крытычнага пачатку ў літаратурнай творчасці, адмаўленне ад схематызму, тэорыі бесканфліктнасці.

Прыход у беларускую літаратуру В.Быкава, І.Пташнікава, І.Навуменкі. А.Адамовіча, І.Мележа, У.Караткевіча, В.Адамчыка, І.Чыгрынава, А.Пысіна, М.Стральцова, А.Вярцінскага, А.Кудраўца, В.Зуёнка і інш.

Рамантычная хваля ў мастацтве і яе праявы ў літаратуры, жывапісе, музыцы, тэатры (1956–1965 гг.). Вяртанне да класічных традыцый рэалістычнага мастацтва (проза І.Мележа, В.Быкава, Я.Брыля, А.Кулакоўскага, паэзія А.Вялюгіна, А.Пысіна, М.Аўрамчыка, А.Русецкага, К.Кірэенкі, А.Вярцінскага, драматургія К.Губарэвіча, А.Макаёнка).

Я н к а Б р ы л ь. Апавяданні **«Галя», «Memento mori»;** лірычныя мініяцюры **«Трохі пра вечнае», «Загадка»** (*4 гадзіны*).

Жыццё і творчасць пісьменніка.

«Галя». Праблема чалавечага шчасця і сэнсу жыцця. Спалучэнне лірычнай усхваляванасці з глыбокім пранікненнем у псіхалогію чалавека. Гісторыя кахання гераіні. Праблема маральнага выбару і адказнасці чалавека за свае ўчынкі. Духоўныя каштоўнасці і іх значэнне для чалавека. Пейзаж у творы. Мастацкая дэталь. Асаблівасці кампазіцыі апавядання.

Павялічаны патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, абумоўленыя пашырэннем зместу вучэбнага прадмета, спосабаў дзейнасці вучняў, абагульненнем і сістэматызацыяй тэарэтычных ведаў і іх прымяненнем пры выкананні розных заданняў.

АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Адукацыйны працэс ажыццяўляецца з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, спецыфікі вучэбнага прадмета, яго месца і ролі ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі.

Арганізацыя навучальнага працэсу павінна быць накіравана на дасягненне вучнямі вынікаў, вызначаных гэтай вучэбнай праграмай. Разам з тым адукацыйны працэс павінен быць пастаўлены так, каб у вучняў была магчымасць рэалізаваць свае адукацыйныя запатрабаванні. Пры гэтым неабходна, каб вучні не толькі засвоілі пэўныя тэарэтычныя веды, але і навучыліся выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбных задач і задач прыкладнога характару.

Навучанне матэматыцы павінна спрыяць далейшаму развіццю культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, уменняў працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, ставіць мэты, планаваць і шукаць шляхі іх дасягнення, аналізаваць і ацэньваць вынікі.

Арганізоўваючы адукацыйны працэс, настаўнік матэматыкі мае права самастойна выбіраць метады, прыёмы і тэхналогіі навучання, якія забяспечваюць дасягненне мэт навучання і выхавання. Лагічная строгасць выкладу вучэбнага матэрыялу павінна спалучацца з высокай ступенню нагляднасці і даступнасці.

Адукацыйны працэс пры навучанні матэматыцы павінен спрыяць развіццю інтарэсу да авалодвання ведамі, спосабамі пазнання навакольнага свету; стварэнню станоўчага эмацыянальнага стану; фарміраванню адэкватнай самаацэнкі; эстэтычнаму выхаванню вучняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

АЛГЕБРАІЧНЫ КАМПАНЕНТ – 140 гадзін

Функцыя (20 гадзін)

Функцыя лікавага аргумента. Уласцівасці функцыі (абсяг вызначэння, мноства значэнняў, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства, цотнасць і няцотнасць, перыядычнасць, нарастанне і спаданне, пункты максімуму і мінімуму; максімум і мінімум, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку). Складаная функцыя. Адваротная функцыя.

Пабудова графікаў функцый

$y = f(x \pm a)$, $y = f(x) \pm b$, $a, b \in R$
$y = kf(x)$, $y = f(mx)$, $k, m > 0$, $k, m \in R$
$y = -f(x)$, $y = f(-x)$, $y = |f(x)|$, $y = f(|x|)$

з дапамогай пераўтварэнняў графіка функцыі $y = f(x)$.

Бясконца спадальная геаметрычная прагрэсія як функцыя натуральнага аргумента. Сума членаў бясконца спадальнай геаметрычнай прагрэсіі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

ведаць тэрміны і правільна прымяняць паняцці:

функцыя лікавага аргумента, складаная функцыя, адваротная функцыя; абсяг вызначэння, мноства значэнняў, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства, цотнасць і няцотнасць, перыядычнасць і найменшы дадатны перыяд, нарастанне і спаданне, пункты максімуму і мінімуму, максімум і мінімум функцыі, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку;

бясконца спадальная геаметрычная прагрэсія як функцыя натуральнага аргумента;

умець:

знаходзіць абсяг вызначэння і мноства значэнняў функцыі, нулі функцыі, прамежкі знакапастаянства, найменшы дадатны перыяд, прамежкі нарастання і спадання, пункты максімуму і мінімуму, максімум і мінімум функцыі, найбольшае і найменшае значэнні функцыі на прамежку па аналітычным заданні функцыі і па графіку функцыі;

знаходзіць суму членаў бясконца спадальнай геаметрычнай прагрэсіі і пераводзіць бясконцы перыядычны дроб у звычайны (выкарыстоўваючы суму бясконца спадальнай геаметрычнай прагрэсіі);

даследаваць функцыю на цотнасць і няцотнасць па аналітычным заданні функцыі і па графіку функцыі;

будаваць графік функцыі, адваротнай зададзенай функцыі;

выканаць пабудову графікаў функцый

$y = f(x \pm a)$, $y = f(x) \pm b$, $a, b \in R$
$y = kf(x)$, $y = f(mx)$, $k, m > 0$, $k, m \in R$
$y = -f(x)$, $y = f(-x)$, $y = |f(x)|$, $y = f(|x|)$

з дапамогай пераўтварэння графіка функцыі $y = f(x)$.

Трыганаметрыя (65 гадзін)

Градусная і радыянная мера адвольнага вугла. Адзінкавая акружнасць. Азначэнне сінуса, косінуса, тангенса, катангенса адвольнага вугла.

Суадносіны паміж сінусам, косінусам, тангенсам і катангенсам аднаго і таго ж вугла (трыганаметрычныя тоеснасці).

Трыганаметрычныя функцыі лікавага аргумента. Іх ўласцівасці і графікі. Пераўтварэнне графікаў трыганаметрычных функцый.

Арксінус, арккосінус, арктангенс і арккатангенс ліку.

Адваротныя трыганаметрычныя функцыі, іх уласцівасці і графікі.

Найпрасцейшыя трыганаметрычныя ўраўненні $\sin x = a$, $\cos x = a$, $\operatorname{tg} x = a$, $\operatorname{ctg} x = a$.

Формулы прывядзення, сумы і рознасці аргументаў, двайнога і палавіннага аргументаў пераўтварэння сумы і рознасці трыганаметрычных функцый у здабытак і здабытку ў суму і рознасць. Прымяненне формул пры пераўтварэнні выразаў і рашэнні трыгаметрычных ураўненняў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

ведаць тэрміны і правільна ўжываць паняцці:

адзінкавая акружнасць, сінус, косінус, тангенс, катангенс адвольнага вугла; трыганаметрычныя функцыі лікавага аргумента; арксінус, арккосінус, арктангенс і арккатангенс ліку; адваротныя трыганаметрычныя функцыі;

ведаць:

уласцівасці трыганаметрычных функцый, доказы трыганаметрычных тоеснасцей; формулы прывядзення, складання (аднімання) аргументаў, двайнога і палавіннага аргументаў; пераўтварэння сумы (рознасці) трыганаметрычных функцый у здабытак і здабытку ў суму; правіла прывядзення;

лікавыя значэнні выразаў $\sin \alpha$, $\cos \alpha$ пры α, роўным 0, $\frac{\pi}{6}$, $\frac{\pi}{4}$, $\frac{\pi}{3}$, $\frac{\pi}{2}$, π, $\frac{3\pi}{2}$, 2π и $\operatorname{tg} \alpha$, $\operatorname{ctg} \alpha$ для гэтых вуглоў (у выпадку існавання гэтых значэнняў); значэнні выразаў $\arcsin a$ і $\arccos a$ пры a, роўным 0, $\pm\frac{1}{2}$, $\pm\frac{\sqrt{2}}{2}$, $\pm\frac{\sqrt{3}}{2}$, ± 1, і выразаў $\operatorname{arctg} a$ і $\operatorname{arcctg} a$ пры a, роўным 0, $\pm\frac{\sqrt{3}}{3}$, ± 1, $\pm\sqrt{3}$;

формулы рашэння найпрасцейшых трыганаметрычных ураўненняў;

умець:

пераўтвараць градусную меру вуглоў у радыянную і наадварот;

будаваць вуглы па зададзенай градуснай або радыяннай меры; выкарыстоўваць адзінкавую акружнасць для знаходжання значэнняў сінуса, косінуса, тангенса і катангенса зададзеных вуглоў; будаваць вуглы па зададзеным значэнні іх сінуса, косінуса, тангенса і катангенса;

знаходзіць лікавыя значэнні трыганаметрычных выразаў, выкарыстоўваючы значэнні трыганаметрычных функцый і адпаведныя формулы;

даказваць асноўныя трыганаметрычныя тоеснасці;

выконваць тоесныя пераўтварэнні трыганаметрычных выразаў з дапамогай трыганаметрычных формул;

знаходзіць лікавыя значэнні выразаў, якія змяшчаюць адваротныя трыганаметрычныя функцыі пры зададзеным значэнні аргумента;

будаваць графікі трыганаметрычных функцый і адваротных ім, выкарыстоўваць уласцівасці функцый;

рашаць розныя тыпы трыганаметрычных ураўненняў.

Ступень з рацыянальным паказчыкам. Ступеневая функцыя (40 гадзін)

Корань n-й ступені з ліку a ($n \geq 2$, $n \in N$). Арыфметычны корань. Асноўныя ўласцівасці кораня n-й ступені. Пераўтварэнне выразаў, якія змяшчаюць карані n-й ступені.

Пазбаўленне ад ірацыянальнасці ў назоўніку дробу.

Ступень з рацыянальным паказчыкам. Уласцівасці ступені з рацыянальным паказчыкам. Ступень з рэчаісным паказчыкам.

Ступеневая функцыя з рацыянальным паказчыкам $y = x^k$, $y = x^{\frac{1}{k}}$ для $k \in N$, уласцівасці і графік ступеневай функцыі.

Ірацыянальныя ўраўненні. Ірацыянальныя няроўнасці.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне пра ступень з рэчаісным паказчыкам;

ведаць тэрміны і правільна прымяняць паняцці:

корань *n*-й ступені з ліку *a*, паказчык ступені кораня, падкарэнны выраз, ступень з рацыянальным паказчыкам, ступеневая функцыя, ірацыянальнае ўраўненне, ірацыянальная няроўнасць;

ведаць:

асноўныя ўласцівасці кораня *n*-й ступені, уласцівасці ступеней з рацыянальным паказчыкам; уласцівасці і графік ступеневай функцыі; формулы, якія выражаюць уласцівасці ступеней і каранёў *n*-й ступені;

асноўныя метады рашэння ірацыянальных ураўненняў;

умець:

вылічваць корань *n*-й ступені з рэчаіснага ліку, які ўяўляе *n*-ю ступень; выносіць множнік з-пад кораня;

ацэньваць значэнне кораня;

паказваць корань *n*-й ступені ў выглядзе ступені з рацыянальным паказчыкам і наадварот; спрашчаць выразы, якія змяшчаюць карані і ступені з рацыянальным паказчыкам;

пазбаўляцца ад ірацыянальнасці ў назоўніку дробу;

будаваць графікі ступеневых $y = x^k$ для $k \in Z$, $k \neq 0$, $y = x^{\frac{1}{k}}$ для $k \in N$;

рашаць ураўненні віду $x^n = a$;

рашаць ірацыянальныя ўраўненні;

рашаць ірацыянальныя няроўнасці;

выконваць пераўтварэнні графікаў ступеневай функцыі.

Элементы камбінаторыкі (10 гадзін)

Правіла камбінаторнага складання і множання. Камбінацыі элементаў без паўтарэнняў: перастаноўкі, размяшчэнні і спалучэнні. Біном Ньютана. Рашэнне камбінаторных задач.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне аб камбінаторыцы як раздзеле матэматыкі;

ведаць тэрміны і правільна прымяняць паняцці: перастаноўка, размяшчэнне, спалучэнне без паўтарэнняў;

умець:

знаходзіць лік перастановак, размяшчэнняў, спалучэнняў без паўтарэнняў;

рашаць камбінаторныя задачы;

прымяняць формулу бінома Ньютана пры рашэнні задач.

Рэзерв – 5 гадзін.

ГЕАМЕТРЫЧНЫ КАМПАНЕНТ – 70 гадзін

Уводзіны ў стэрэаметрыю (15 гадзін)

Прадмет стэрэаметрыі. Прасторавыя целы. Мнагаграннікі: куб, паралелепіпед, прызма, прамая прызма, правільная прызма, піраміда, правільная піраміда.

Асноўныя паняцці стэрэаметрыі. Аксіёмы стэрэаметрыі. Вывады з аксіём. Пабудова сячэнняў мнагагранніка плоскасцю на падставе аксіём стэрэаметрыі і вывадаў з іх.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

мець уяўленне аб прасторавых целах стэрэаметрыі: куб, паралелепіпед, прызма, прамая прызма, правільная прызма, піраміда, правільная піраміда;

ведаць аксіёмы і вынікі з іх;

умець:

даказваць вынікі з аксіём;

прымяняць аксіёмы і вынікі з іх для рашэння задач;

будаваць сячэнні мнагагранікаў плоскасцю на падставе аксіём і вынікаў з іх.

Паралельнасць прамых і плоскасцей (22 гадзіны)

Паралельныя прамыя ў прасторы. Азначэнне паралельных прамых і прымета паралельнасці прамых. Уласцівасці паралельных прамых у прасторы.

Прамая, паралельная плоскасці. Азначэнне і прымета паралельнасці прамой і плоскасці. Уласцівасць прамых, паралельных плоскасці.

Скрыжаваныя прамыя. Азначэнне і прымета скрыжаваных прамых.

Вугал паміж прамымі.

Паралельныя плоскасці. Азначэнне і прымета паралельных плоскасцей.

Тэарэма аб існаванні адзінай плоскасці, паралельнай дадзенай плоскасці, якая праходзіць праз дадзены пункт.

Уласцівасці паралельных прамых і плоскасцей у прасторы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні: паралельныя прамыя, скрыжаваныя прамыя; паралельныя прамая і плоскасць; паралельныя плоскасці;

ведаць:

прыметы: паралельнасці прамых, скрыжаваных прамых, паралельнасці прамой і плоскасці, паралельнасці плоскасцей;

уласцівасці: паралельных прамых, паралельных прамой і плоскасці, паралельных плоскасцей;

умець:

будаваць сячэнні мнагагранікаў плоскасцю на падставе тэарэм аб паралельнасці прамой і плоскасці;

рашаць задачы, у тым ліку на доказ паралельнасці прамых і плоскасцей у прасторы;

даказваць: прымету паралельнасці прамых, прымету скрыжаваных прамых, прымету паралельнасці прамой і плоскасці, прымету паралельнасці плоскасцей; тэарэмы аб існаванні адзінай плоскасці (прамой), паралельнай дадзенай плоскасці (прамой), якая праходзіць праз дадзены пункт.

Перпендыкулярнасць прамых і плоскасцей (28 гадзін)

Азначэнне прамой, перпендыкулярнай плоскасці. Прымета перпендыкулярнасці прамой і плоскасці. Тэарэма аб дзвюх паралельных прамых, адна з якіх перпендыкулярная плоскасці. Тэарэма аб дзвюх прамых, перпендыкулярных плоскасці.

Перпендыкуляр і нахіленая. Тэарэмы аб даўжынях перпендыкуляра, нахіленых і праекцый гэтых нахіленых.

Тэарэма аб трох перпендыкулярах. Адлегласць паміж фігурамі. Адлегласць ад пункта да плоскасці. Адлегласць паміж паралельнымі прамой і плоскасцю. Адлегласць паміж паралельнымі плоскасцямі. Адлегласць паміж скрыжаванымі прамымі.

Азначэнне вугла паміж прамой і плоскасцю. Двухгранны вугал. Лінейны вугал двухграннага вугла. Мера двухграннага вугла. Вугал паміж плоскасцямі. Метады вылічэння вугла паміж плоскасцямі. Перпендыкулярныя плоскасці. Азначэнне перпендыкулярных плоскасцей. Прымета перпендыкулярнасці плоскасцей. Адваротная тэарэма. Тэарэмы пра сувязь паміж паралельнасцю і перпендыкулярнасцю прамых і плоскасцей.

Уласцівасці перпендыкулярных прамых і плоскасцей.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні: двухгранны вугал, лінейны вугал двухграннага вугла, вугал паміж плоскасцямі; перпендыкулярныя прамыя, перпендыкулярныя прамая і плоскасць, перпендыкулярныя плоскасці; перпендыкуляр да плоскасці, нахіленая да плоскасці, адлегласць паміж паралельнымі прамымі, адлегласць паміж паралельнымі прамой і плоскасцю, адлегласць паміж паралельнымі плоскасцямі, адлегласць паміж скрыжаванымі прамымі;

ведаць:

прыметы: перпендыкулярнасці прамой і плоскасці, перпендыкулярнасці плоскасцей;

уласцівасці: перпендыкулярных прамых, перпендыкулярных прамой і плоскасці, перпендыкулярных плоскасцей;

тэарэму аб трох перпендыкулярах;

умець:

знаходзіць адлегласць паміж: дзвюма паралельнымі прамымі, паралельнымі прамой і плоскасцю, паралельнымі плоскасцямі, скрыжаванымі прамымі;

знаходзіць вугал паміж: дзвюма прамымі, прамой і плоскасцю, дзвюма плоскасцямі;

рашаць задачы, у тым ліку на доказ;

даказваць прыметы: перпендыкулярнасці прамой і плоскасці, перпендыкулярнасці плоскасцей; тэарэму аб трох перпендыкулярах.

Рэзерв – 5 гадзін

ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

Алгебра: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.П. Кузняцова [і інш.]; пад рэд. Л.Б. Шнэпермана. – 3-е выд., перагледж. і выпр. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Алгебра: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. мовай навучання / А.П. Кузняцова [і інш.]; пад рэд. праф. Л.Б. Шнэпермана. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Латоцін, Л.А. Матэматыка: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Л.А. Латоцін, Б.Д. Чабатарэўскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Латоцін, Л.А. Матэматыка: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Л.А. Латоцін, Б.Д. Чабатарэўскі. – 2-е выд., перагледж. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Латоцін, Л.А. Зборнік задач па матэматыцы: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Л.А. Латоцін, Б.Д. Чабатарэўскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Зборнік задач па алгебры: вучэб. дапам. для 10-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.П. Кузняцова [і інш.]; пад рэд. Л.Б. Шнэпермана. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012.

Зборнік задач па алгебры: вучэб. дапам. для 11-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.П. Кузняцова [і інш.]; пад рэд. Л.Б. Шнэпермана. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Шлыкаў, У.У. Геаметрыя: вучэб. дапам. для 10-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.У. Шлыкаў. – 3-е выд., перагледж. і выпр. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Зборнік задач па геаметрыі: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. установ з беларус. мовай навучання / У.У. Шлыкаў, Т.У. Валахановіч. – 2-е выд. – Мінск: Народная асвета, 2010. – 183 с.: іл.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі (Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.)» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ, 1917–1945 гг.)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дадзеная вучэбная праграма мае пераходны характар і складзена з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі. Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні складае змястоўную аснову профільнай падрыхтоўкі вучняў, асноўнай мэтай якой з'яўляецца задавальненне іх пазнавальных патрэбнасцей і забеспячэнне выбару будучай прафесійнай дзейнасці. Навучанне на павышаным узроўні ажыццяўляецца як за кошт павелічэння аб'ёму вывучаемага тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу, так і за кошт далейшага ўдасканальвання метапрадметных і прадметных (спецыяльных гістарычных) спосабаў дзейнасці. *Кампетэнтнасны падыход* да падрыхтоўкі вучняў арыентаваны на развіццё ў вучняў сістэматычных ведаў і ўменняў, фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання, якія забяспечваюць выбраны напрамак далейшай адукацыі ў межах прафесійнага самавызначэння, а таксама асабістае развіццё і паспяховую сацыялізацыю. *Кампетэнцыі* разглядаюцца як асабістыя якасці і гатоўнасць старшакласнікаў выкарыстоўваць засвоеныя імі веды і ўменні для працягу адукацыі па гістарычных і сацыяльна-гуманітарных спецыяльнасцях, а таксама для ўласнай паспяховай інтэграцыі ў сучасным беларускім грамадстве.

Вывучэнне гісторыі Беларусі на павышаным узроўні арыентавана на фарміраванне ў вучняў наступных сацыяльна значных ведаў:

аб асноўных этапах афармлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці;

аб асаблівасцях пабудовы савецкага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу ў БССР;

аб асаблівасцях сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі;

аб асаблівасцях геапалітычнага становішча Беларусі і выніках уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР і СССР;

аб прыкладах гераізму і самаахвярнасці воінаў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, а таксамах сімвалах памяці беларускага народа аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

У адпаведнасці з асобаснымі вынікамі навучання на павышаным узроўні прадугледжваюцца фарміраванне светапогляду і ўсведамленне старшакласнікамі сваёй ідэнтычнасці як грамадзян Рэспублікі Беларусь; прыняцце імі ў якасці норм сацыяльных паводзін традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей, існуючай у беларускім грамадстве; далучэнне да культурнай разнастайнасці беларускага грамадства, выпрацоўка адказнасці за свой прафесійны выбар.

У адпаведнасці з метапрадметнымі вынікамі навучання на павышаным узроўні прадугледжваюцца ўменні самастойна вызначаць мэты свайго навучання, прадстаўляць, аналізаваць і карэкціраваць іх вынікі ва ўмовах індывідуальнай і калектыўна-размеркавальнай форм дзейнасці; сістэматызаваць і абагульняць змест вучэбнага матэрыялу, у тым ліку паняцці, і рабіць на гэтай падставе аргументаваныя вывады; авалоданне вучнямі спосабамі пошуку, збору, апрацоўкі, выкарыстання разнастайных крыніц сацыяльна-гістарычнай інфармацыі з магчымасцю яе пераводу з візуальнага ў вербальны від і наадварот.

Прадметнымі вынікамі навучання з’яўляюцца засваенне вучнямі змястоўнага і дзейснага кампанентаў, што ўвасоблена ў прадметных кампетэнцыях (спосабах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці), якія прадстаўлены ў праграме праз пералік фарміруемых уменняў у раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». Пры засваенні зместу гісторыі Беларусі 1917–1945 гг. асаблівае значэнне надаецца фарміраванню ўменняў характарызаваць і параўноўваць, рэканструяваць і інтэрпрэтаваць гістарычныя падзеі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага развіцця БССР у іх прычынна-выніковых сувязях, праз канкрэтызацыю з дапамогай паняццяў, з правядзеннем аналізу зместу гістарычных дакументаў.

Мэта вывучэння прадмета на павышаным узроўні:

авалоданне вучнямі сістэматызаванымі тэарэтычнымі і факталагічнымі ведамі і спецыяльнымі спосабамі дзейнасці аб вызначальных працэсах гісторыі Беларусі ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці з сусветнай і савецкай гісторыяй, неабходнымі для фарміравання грамадзянскага патрыятызму, паспяховай сацыялізацыі і прафесійнага самавызначэння асобы, інтэграцыі яе ў сучаснае сацыякультурнае асяроддзе.

Задачы вывучэння прадмета на павышаным узроўні:

засвоіць важнейшыя паняцці і факты, якія характарызуюць перыяд развіцця Беларусі ад выспявання перадумоў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. да завяршальнага этапу Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў з раскрыццём і тлумачэннем найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей;

выпрацоўваць каштоўнасныя арыентацыі і ацэначныя меркаванні асобы на падставе ўсведамлення старшакласнікамі калектыўнай гістарычнай памяці і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці, пачуцця гонару за культурна-гістарычную спадчыну Беларусі, адказнасці як за прагназаванне ўласнай жыццядзейнасці, так і за далейшы шлях развіцця Беларусі;

фарміраваць вопыт гістарычнага мыслення вучняў праз асэнсаванне імі вучэбных гістарычных ведаў аб важнейшых працэсах і падзеях у развіцці беларускага савецкага грамадства і ўменне ўжываць іх ва ўмовах сучаснай інфармацыйнай камунікатыўнай прасторы і ва ўласнай сацыяльнай практыцы.

Асаблівае значэнне ў працэсе навучання гісторыі на павышаным узроўні мае практыка-арыентаваная дзейнасць, на арганізацыю якой у кожным з раздзелаў ва ўроках-практыкумах прадугледжваецца па 2 вучэбныя гадзіны. На такіх уроках-практыкумах ажыццяўляецца замацаванне вучэбных тэарэтычных і факталагічных ведаў у іх сукупнасці, развіццё ўменняў выкарыстоўваць назапашаныя веды для рашэння пазнавальных задач, правядзення вучэбнага даследвання, для аналізу зместу хрэстаматыйных гістарычных дакументаў.

Адной з найбольш эфектыўных форм ажыццяўлення практыка-арыентаванай дзейнасці з'яўляецца арганізацыя праектаў. Праекты прадугледжваюць сукупнасць складаючых іх кампанентаў: вызначэнне тэматыкі (фармулёўка праблемы) вучэбнага даследвання; правядзенне збору, вывучэння і сістэматызацыі крыніц інфармацыі; практычная работа па стварэнні (напісанні) праекта; яго прадстаўленне (прэзентацыя) і абарона. У працэсе выканання праектаў вучні на аснове раней сфарміраваных ведаў і ўменняў удасканальваюць навыкі працы з крыніцамі гістарычнай інфармацыі, у тым ліку вуснай гісторыі, прадстаўляюць вынікі індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці праблемнага і творчага характару, у тым ліку на электронных носьбітах у выглядзе мультымедыяпрэзентацый. Парады па ажыццяўленні праектнай дзейнасці прадстаўлены ў метадычных рэкамендацыях па арганізацыі профільнага навучання гісторыі Беларусі.

Варта звярнуць увагу на магчымасці выкарыстання міжпрадметных сувязей з беларускай літаратурай пры вывучэнні тэм, прысвечаных развіццю культуры і мастацтва.

Праграмай прадугледжваецца правядзенне ўрокаў сістэматызацыі і абагульнення ведаў па кожным з раздзелаў, а таксама выніковага абагульнення.

Рэзервовы час прызначаны для правядзення урокаў кантролю сфарміраванасці ведаў і ўменняў па кожным з раздзелаў, а таксама арганізацыі праектнай дзейнасці.

Пры вывучэнні раздзела III прадугледжваецца выкарыстанне вучэбна-метадычнага комплексу па факультатыве «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)».

Па кожным з раздзелаў прадугледжваецца па 2 вучэбныя гадзіны на правядзенне ўрокаў «Наш край», што дазволіць улічыць асаблівасці гістарычнага развіцця канкрэтнага рэгіёна і магчымасці выкарыстання мясцовага матэрыялу, а таксама гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Вывучэнне краязнаўчага матэрыялу можа стаць тэматыкай (праблематыкай) пры выкананні вучнёўскіх даследаванняў (праектаў).

Парадак вывучэння гісторыі Беларусі з фармулёўкамі мэт урокаў і рэкамендаваных відаў і спосабаў дзейнасці прадстаўлены ў прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні. Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і з улікам асаблівасцей навучання, можа змяніць рэкамендуемую праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм, не парушаючы рэкамендуемыя прапорцыі вучэбных гадзін па раздзелах.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
87 гадзін (3 гадзіны на тыдзень у першым паўгоддзі, 2 гадзіны на тыдзень у другім паўгоддзі, у тым ліку 16 гадзін – рэзервовы час)

Р а з д з е л I
Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі і станаўленне беларускай дзяржаўнасці (16 гадзін)

Становішча ў Беларусі напярэдадні кастрычніка 1917 г. Палітычная і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі і на Заходнім фронце летам – восенню 1917 г. Палітычныя кірункі ў працэсе афармлення беларускай дзяржаўнасці.

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі. Пераход улады ў рукі Саветаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. Фарміраванне і дзейнасць Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзаха). Дзейнасць Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту. А.Мяснікоў, К.Ландэр. Першыя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. Палітыка «ваеннага камунізму» і асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.

Беларусь ва ўмовах германскай акупацыі. Наступленне войск кайзераўскай Германіі і захоп Мінска. Брэсцкі мір. Устанаўленне германскага акупацыйнага рэжыму. Супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам. Вызваленне Беларусі.

Спробы дзяржаўнага самавызначэння Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Беларускі нацыянальны рух і яго асноўныя палітычныя напрамкі. І Усебеларускі з'езд і яго рашэнні. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Дзейнасць Рады БНР і яе ўзаемаадносіны з германскай ваеннай адміністрацыяй.

Абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). І Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Канстытуцыя ССРБ 1919 г. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (Літбел).

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. Наступленне польскіх войскаў у Беларусі. Ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце. Разгортванне партызанскага руху. Беларуская камуністычная арганізацыя.

Другое абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі і заканчэнне польска-савецкай вайны. Спроба рэалізацыі ідэі сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Вызваленне войскамі Чырвонай Арміі тэрыторыі Беларусі. Абвяшчэнне Дэкларацыі аб незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г. Чарговае наступленне польскіх войскаў у Беларусі. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі.

Наш край

Урок-практыкум

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах), Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту, І Усебеларускі з'езд, Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі (ССРБ), Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі (Літбел), буферная дзяржава, лінія Керзана, Брэсцкі і Рыжскі мірныя дагаворы, палітыка «ваеннага камунізму», харчразвёрстка, «Рудабельская рэспубліка».*

Р а з д з е л II
Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (27 гадзін)

Становішча Беларусі ў міжваенны перыяд. Асаблівасці палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў міжваенны перыяд. Развіццё БССР у гады сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і культурнай рэвалюцыі.

БССР у гады новай эканамічнай палітыкі. Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі. Аднаўленне народнай гаспадаркі. Пераход да новай эканамічнай палітыкі. Погляды Д.Прышчэпава на шляхі пераўтварэнняў у вёсцы. Уплыў нэпа на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарту, гандлю.

Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920-я гг. Роля КП(б)Б і Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў у палітычнай сістэме. Камуністычны саюз моладзі Беларусі. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. А.Чарвякоў. Значэнне ўтварэння СССР для Беларусі. Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг. Канстытуцыя БССР 1927 г.

Палітыка беларусізацыі. Беларусізацыя як састаўная частка савецкай нацыянальнай палітыкі. Напрамкі нацыянальнай палітыкі КП(б)Б. Асноўныя мерапрыемствы, супярэчнасці і вынікі беларусізацыі. Карэнізацыя. Інстытут беларускай культуры. У. Ігнатоўскі. Вынікі і значэнне палітыкі беларусізацыі.

Правядзенне індустрыялізацыі ў БССР. Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Прычыны і асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Формы працоўнай актыўнасці рабочага класа і іх уплыў на развіццё эканомікі. Вынікі індустрыялізацыі ў рэспублікі.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР. Прычыны і асаблівасці правядзення калектывізацыі ў БССР. Пераход да суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і фарсіраванне яе тэмпаў. Вынікі калгаснага будаўніцтва.

Грамадска-палітычнае жыццё БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. Роля КП(б)Б і Саветаў у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Складванне савецкай грамадска-

палітычнай сістэмы. Дзейнасць М.Галадзеда, М.Гікалы. Палітычныя рэпрэсіі. Нацыянал-дэмакратызм. Канстытуцыя БССР 1937 г. Канфесійная палітыка савецкай улады.

Развіццё адукацыі, **навукі і культуры ў БССР у 1920-я гг.** Станаўленне сістэмы адукацыі ў БССР. Адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У.Пічэта. Даследаванні беларускага этнасу, яго гісторыі і культуры. Літаратурная творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, З.Жылуновіча, М.Гарэцкага, А.Куляшова. Станаўленне беларускага савецкага тэатра. Е.Міровіч, У.Галубок. Зараджэнне беларускага кіно. Ю.Тарыч. Выяўленчае мастацтва. М.Шагал, М.Філіповіч, В.Волкаў.

Адукацыя і навука ў канцы 1920-х – 1930-я гг. Змены ў сістэме адукацыі. Развіццё навукі. Беларуская акадэмія навук. Навукоўцы – ураджэнцы Беларусі: даследаванні О.Шміта, адкрыцці А.Чыжэўскага.

Развіццё літаратуры і мастацтва ў канцы 1920-х – 1930-я гг. Зацвярджэнне ў літаратуры і мастацтве сацыялістычнага рэалізму. Творчасць беларускіх пісьменнікаў: Я.Купалы, Я.Коласа, К.Крапівы, П.Броўкі, М.Зарэцкага, П.Глебкі, М.Лынькова, К.Чорнага. Беларускае тэатральнае і музычнае мастацтва (А.Багатыроў, А.Туранкоў), архітэктура і скульптура (І.Лангбард, Г.Лаўроў, З.Азгур), кінематограф (У.Корш-Саблін), выяўленчае мастацтва (І.Ахрэмчык, І.Давідовіч, У.Кудрэвіч).

Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва. Асноўныя напрамкі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. І.Лагіновіч. В.Харужая. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Б.Тарашкевіч. Канфесійнае становішча.

Беларуская культура ў Заходняй Беларусі. Адукацыя. Таварыства беларускай школы. Літаратура: П.Пестрак, М.Танк. Жывапіс: Я.Драздовіч, П.Сергіевіч. Музычнае мастацтва: Р.Шырма, М.Забэйда-Суміцкі.

Наш край

Урок-практыкум

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *новая эканамічная палітыка (нэп), харчпадатак, беларусізацыя, карэнізацыя, «прышчэпаўшчына», індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, раскулачванне, машынна-трактарныя станцыі (МТС), савецкая грамадска-палітычная сістэма, «план аўтанамізацыі», Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, Камуністычны саюз моладзі Беларусі, нацыянал-дэмакратызм, палітычныя рэпрэсіі, культурная рэвалюцыя, «усходнія крэсы», асаднікі, палітыка санацыі, парцэляцыя, камасацыя, пацыфікацыя, дэфензіва, адзіны народны антыфашысцкі фронт, Таварыства беларускай школы, Беларуская сялянска-рабочая грамада, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, неаўнія, аўтакефалія.*

Р а з д з е л III
БССР у гады Другой Сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў (27 гадзін)

Беларусь у гады ваенных выпрабаванняў. Пачатак Другой сусветнай вайны. Асноўныя этапы Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа супраць нацысцкай Германіі і характар вайны.

Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Стварэнне органаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Рашэнні Народнага сходу. С.Прытыцкі. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб'яднання з БССР. Гістарычнае значэнне ўз'яднання беларускага народа.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Мэты вайны нацысцкай Германіі супраць Савецкага Саюза. План «Барбароса». Суадносіны ўзброеных сіл Германіі і СССР. Нападзенне Германіі на СССР. Дзейнасць савецкага кіраўніцтва па арганізацыі абароны краіны. Эвакуацыя.

Абарончыя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці, Мінска, Магілёва. Гераізм, самаахвярнасць і трагедыя абаронцаў. Зрыў планаў «маланкавай вайны». Прычыны няўдач войск Чырвонай Арміі летам 1941 г.

Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Насаджэнне «новага парадку». Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел акупіраванай тэрыторыі БССР. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі. Беларускія остарбайтары. Калабарацыянізм.

Разгортванне барацьбы супраць акупантаў. Роля КП(б)Б у арганізацыі барацьбы народных мас з акупантамі. Стварэнне першых партызанскіх атрадаў. В.Корж, Ф.Паўлоўскі, Ц.Бумажкоў, М.Шмыроў. Падпольныя антыфашысцкія арганізацыі. Супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму. Інтэрнацыянальны характар барацьбы з захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Пашырэнне партызанскай барацьбы супраць акупантаў. Стварэнне ЦШПР і БШПР. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Партызанскія зоны. «Рэйкавая вайна». Дзейнасць Арміі Краёвай.

Пашырэнне падпольнай барацьбы супраць акупантаў. Дзейнасць партыйных і камсамольска-маладзёжных падпольных арганізацый. Дыверсійная барацьба на чыгуначных вузлах. К.Заслонаў, Ф.Крыловіч. Гераізм і мужнасць падпольшчыкаў.

Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Узаемадзеянне партызанскіх фарміраванняў і войск Чырвонай Арміі. Акружэнне і разгром германскіх груповак. Вызваленне Мінска. Выгнанне германскіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Подзвігі савецкіх воінаў. Значэнне разгрому германскіх войскаў у Беларусі.

Савецкі тыл у гады вайны. Перавод эканомікі на ваенныя рэйкі. Дзейнасць эвакуіраваных беларускіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый у савецкім тыле. Працоўны подзвіг ураджэнцаў Беларусі ў савецкім тыле.

Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Удзел у еўрапейскім руху Супраціўлення. Ураджэнцы Беларусі – Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы. Уклад прадстаўнікоў беларускай культуры і мастацтва ў барацьбу з ворагам.

БССР – удзельніца заснавання ААН. Заканчэнне Другой сусветнай вайны. Савецкая стратэгія ў адносінах да ААН. Уключэнне БССР у склад краін – заснавальніц ААН. Выхад Беларусі на міжнародную арэну.

Памяць пра вайну. Месцы памяці і сімвалы подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Ушанаванне памяці загінуўшых у Беларусі. Мемарыяльныя комплексы. Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны. Гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць».

Наш край

Урок-практыкум

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *Народны сход Заходняй Беларусі, «Суражскія (Віцебскія) вароты», план «Ост», генацыд, калабарыцыянізм, остарбайтары, партызанскі рух, партызанскія зоны, падпольная барацьба, «рэйкавая вайна», Армія Краёва, аперацыя «Баграціён».*

Выніковае абагульненне

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу на павышаным узроўні вучні б у д у ц ь:

ведаць:

азначэнні пададзеных у праграме паняццяў з канкрэтызацыяй іх зместу;

храналогію асноўных падзей гісторыі Беларусі 1917–1945 гг., іх вынікі і лакалізацыю на гістарычнай карце;

вынікі дзейнасці выдатных гістарычных асоб і прыклады творчасці дзеячаў культуры;

розныя ацэнкі, пункты гледжання па адной і той жа праблеме, характарыстыкі гістарычных асоб і дзеячаў культуры;

умець:

лакалізаваць падзеі гісторыі Беларусі 1917–1945 гг. у часе і геапалітычнай прасторы з апорай на храналагічныя і сінхраністычныя табліцы, гістарычную карту і атлас;

характарызаваць асноўныя перыяды і падзеі гісторыі Беларусі 1917–1945 гг.;

характарызаваць умовы і лад жыцця людзей;

суадносіць гістарычныя падзеі, якія тычацца грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі, з грамадска-гістарычным працэсам і савецкай гісторыяй;

рэканструяваць і інтэрпрэтаваць змест вучэбнага матэрыялу;

раскрываць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі і з'явамі, раскрываць узаемаабумоўленасць змен у розных галінах грамадскага жыцця;

параўноўваць па прапанаваных ці самастойна вызначаных прыметах, сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на падставе гэтага аргументаваныя вывады;

выкарыстоўваць веданне прымет і зместу прыведзеных у праграме паняццяў для канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў;

параўноўваць аргументацыю розных пунктаў гледжання на адну і тую ж праблему;

адрозніваць меркаванні і інтэрпрэтацыі ад гістарычных фактаў;

абгрунтоўваць уласнае меркаванне па праблемах грамадска-гістарычнага развіцця;

праводзіць пошук гістарычнай інфармацыі ў разнастайных крыніцах;

праводзіць аналіз гістарычных крыніц і рэканструяваць на іх аснове вобразы гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў;

вызначаць матывы і вынікі дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры з характарыстыкай гістарычнай тэматыкі ў творах беларускай літаратуры і мастацтва;

характарызаваць помнікі культуры Беларусі перыяду 1917–1945 гг.;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:

для напісання і прэзентацыі рэфератаў, гістарычных сачыненняў (эсэ); праектаў (вучнёўскіх даследаванняў) аб гістарычных працэсах (падзеях) і асобах з вызначэннем іх праблематыкі, мэтапалаганнем, зборам і апрацоўкай матэрыялаў, абаронай вынікаў;

вызначэння ўласнай пазіцыі пры абмеркаванні значнасці гістарычных падзей і вынікаў дзейнасці іх удзельнікаў;

тлумачэння ўзаемаабумоўленасці сучасных і гістарычных з'яў;

правядзення пошуку і аналізу зместу сацыяльна значнай інфармацыі;

ідэнтыфікацыі сваіх сацыяльных паводзін як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўлення камунікацыі ў шматканфесійным і полікультурным грамадстве;

пошуку і захавання помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг. Вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі / Я.К.Новік, метадычнае забеспячэнне В.В. Гінчук. – Мінск, 2012.

История Беларуси: учеб. пособие: в 2 ч. / Я.И. Трещенок [и др.]; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев, 2005. – Ч. 2.

Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 2002 г. Хрэстаматыя: 11 кл.: вучэб. дапам. для вучняў / аўт.-склад. Я.К. Новік і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка. – Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг.: 10 клас. Хрэстаматыя: дапаможнік для вучняў / аўт.-склад.: А.А. Каваленя [і інш.]; метад. забяспечэнне С.А. Кудраўцава; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск, 2009.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / А.А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А.А. Кавалені, М.С. Сташкевіча. – Мінск, 2009.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие для 11-го класса учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования / А.А. Коваленя [и др.]; под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича. – Минск, 2009.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): рабочая тетрадь для 11-го класса /А.А. Коваленя [и др.]; под ред. проф. А.А. Ковалени. – Минск: Аверсэв, 2005.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): материалы для учителя / А.А. Коваленя, М.А. Краснова, Г.Н. Ганущенко. – Минск, 2007.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): справочник / авт.-сост. : А.А. Коваленя, М.А. Краснова, В.И. Лемешонок; под ред. А.А. Ковалени. – Минск, 2007.

Гінчук, В.В. Гісторыя Беларусі ў 10 класе: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.В. Гінчук. – Мінск, 2014.

Краснова, М.А. История. 10 класс: рабочая тетрадь: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования / М.А. Краснова [и др.]. – Минск, 2014.

Атлас. Гісторыя Беларусі, 1917–1945 гг. 10 клас / У.В. Тугай, В.М. Фамін. – Мінск, 2009.

Атлас. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) / А.А. Каваленя, М.Г. Жылінскі. – Мінск, 2015.

Насценная гістарычная карта «Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі».

Насценная гістарычная карта «Барацьба супраць ваеннай інтэрвенцыі на тэрыторыі Беларусі (1918–1921 гг.)».

Насценная гістарычная карта «Беларусь у 1919–1939 гг. Фарміраванне тэрыторыі».

Насценная гістарычная карта «Беларусь у пачатку Другой сусветнай вайны (01.09.1939 – 21.06.1941 гг.)».

Насценная гістарычная карта «Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)».

Насценная гістарычная карта «Партызанскі рух і падпольная барацьба на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)».

Насценная гістарычная карта «Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (верасень 1943 г. – жнівень 1944 г.)».

Сусветная гісторыя.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «История Беларуси (История Беларуси, 1917–1945 гг.)» для X класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания (повышенный уровень)

ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ
(ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ, 1917–1945 гг.)

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Данная учебная программа имеет переходный характер и составлена с учетом возможности реализации компетентностного подхода к подготовке учащихся по истории.

Изучение истории на повышенном уровне составляет содержательную основу профильной подготовки учащихся, основной целью которой является удовлетворение их познавательных потребностей и обеспечение выбора будущей профессиональной деятельности. Обучение на повышенном уровне осуществляется как за счет увеличения объема изучаемого теоретического и фактического материала, так и за счет дальнейшего усовершенствования метапредметных и предметных (специальных исторических) способов деятельности. *Компетентностный подход* к подготовке учащихся ориентирован на развитие у учащихся систематических знаний и умений, формирование личностных, метапредметных и предметных результатов обучения, обеспечивающих избранное направление дальнейшего образования в рамках профессионального самоопределения, а также личностное развитие и успешную социализацию. *Компетенции* рассматриваются как личные качества и готовность учащихся использовать усвоенные ими знания и умения для продолжения образования по историческим и социально-гуманитарным специальностям, а также для успешной интеграции в современном белорусском обществе.

Изучение истории Беларуси на повышенном уровне ориентировано на формирование у учащихся следующих социально значимых знаний:

об основных этапах оформления белорусской национальной государственности;

особенностях построения советского общественно-политического и социально-экономического строя в БССР;

особенностях социально-экономической и духовной жизни населения Западной Беларуси;

особенности геополитического положения Беларуси и результатах воссоединения Западной Беларуси с БССР и СССР;

примерах героизма и самоотверженности воинов Красной Армии, партизан и подпольщиков, а также символах памяти белорусского народа о событиях Великой Отечественной войны.

В соответствии с личностными результатами обучения на повышенном уровне предусматриваются формирование мировоззрения и осознание учащимися своей идентичности как граждан Республики Беларусь; принятие ими в качестве норм социального поведения традиционной системы ценностей, существующей в белорусском обществе; присоединение к культурному разнообразию белорусского общества, выработка ответственности за свой профессиональный выбор.

В соответствии с метапредметными результатами обучения на повышенном уровне предусматриваются умения самостоятельно определять цели своего обучения, представлять, анализировать и корректировать их результаты в условиях индивидуальной и коллективно-распределительной форм деятельности; систематизировать и обобщать содержание учебного материала, в том числе понятия, и делать на этом основании аргументированные выводы; овладение учащимися способами поиска, сбора, обработки, использования разнообразных источников социально-исторической информации с возможностью ее перевода из визуального в вербальный вид и наоборот.

Предметными результатами обучения являются усвоение учащимися содержательного и деятельностного кампонентов, что отражено в предметных компетенциях (способах учебно-познавательной деятельности), которые представлены в программе через перечень формируемых умений в разделе «Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся». При усвоении содержания истории Беларуси 1917–1945 гг. особое значение уделяется формированию умений характеризовать и сравнивать, реконструировать и интерпретировать исторические события общественно-политического, социально-экономического, национально-культурного развития БССР в их причинно-следственных связях, через конкретизацию с помощью понятий, с проведением анализа содержания исторических документов.

Цель изучения предмета на повышенном уровне:

овладение учащимися систематизированными теоретическими и фактологическими знаниями о важнейших процессах истории Беларуси во взаимосвязи и взаимообусловленности с мировой и советской историей и специальными способами

деятельности, необходимыми для формирования гражданского патриотизма, успешной социализации и профессионального самоопределения личности и интеграции ее в современное социокультурное окружение.

Задачи изучения предмета на повышенном уровне:

усвоить важнейшие понятия и факты, характеризующие период развития Беларуси от вызревания предпосылок Октябрьской революции 1917 г. до завершающего этапа Великой Отечественной и Второй мировой войн с раскрытием и объяснением наиболее существенных причинно-следственных связей;

вырабатывать ценностные ориентации и оценочные суждения личности на основании осознания учащимися коллективной исторической памяти и формирования национальной идентичности, чувства гордости за культурно-историческое наследие Беларуси, ответственности как за прогнозирование собственной жизнедеятельности, так и за дальнейший путь развития Беларуси;

формировать опыт исторического мышления учащихся через осмысление ими учебных исторических знаний о важнейших процессах и событиях в развитии белорусского советского общества и умение осуществлять их в условиях современного информационного коммуникативного пространства и в личной социальной практике.

Особое значение в процессе изучения истории на повышенном уровне имеет практико-ориентированная деятельность, на организацию которой в каждом из разделов на уроках-практикумах предусматривается по 2 учебных часа. На таких уроках-практикумах осуществляется закрепление теоретических и фактологических знаний в их совокупности, развитие умений использовать накопленные знания для решения познавательных задач, проведения учебного исследования, анализа содержания хрестоматийных исторических документов.

Одной из наиболее эффективных форм осуществления практико-ориентированной деятельности является организация проектов. Проекты продусматривают совокупность составляющих их компонентов: определение тематики (формулировка проблемы) учебного исследования; проведение сбора, изучения и систематизации источников информации; практическая работа по созданию (написанию) проекта; его представление (презентация) и защита. В процессе выполнения проектов учащиеся на основании ранее сформированных знаний и умений совершенствуют навыки работы с источниками исторической информации, в том числе устной истории, представляют результаты индивидуальной и коллективной деятельности проблемного и творческого характера, в том числе на электронных носителях в виде мультимедиапрезентаций. Рекомендации по осуществлению проектной деятельности представлены в методических рекомендациях по организации профильного изучения истории Беларуси.

Следует обратить внимание на возможности использования межпредметных связей с белорусской литературой при изучении тем, посвященных развитию культуры и искусства.

Программа предусматривает проведение уроков систематизации и обобщения знаний по каждому разделу, а также итогового обобщения.

Резервное время отведено для проведения уроков контроля сформированности знаний и умений по каждому разделу, а также организации проектной деятельности.

При изучении раздела III предусматривается использование учебно-методического комплекса по факультативу «Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны)».

По каждому разделу предусматривается по 2 часа на проведение уроков «Наш край», что позволит учесть особенности исторического развития конкретного региона и возможности использования местного материала, а также историко-документальной хроники городов и районов Беларуси «Память». Изучение краеведческого материала может стать тематикой (проблематикой) при выполнении ученических исследований (проектов).

Порядок изучения истории Беларуси с формулировками целей уроков и рекомендуемых видов и способов деятельности представлен в примерном календарно-

тематическом планировании. Учитель, исходя из педагогической целесообразности и с учетом особенностей обучения, может изменять рекомендуемое программой количество учебных часов на изучение отдельных тем, не нарушая рекомендуемые пропорции учебных часов по разделам.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
87 ч (3 ч в неделю в первом полугодии, 2 ч в неделю во втором полугодии, из них 16 ч – резервное время)

Р а з д е л I
Октябрьская революция в России и становление белорусской государственности (16 ч)

Положение Беларуси накануне октября 1917 г. Политическая и социально-экономическая ситуация в Беларуси и на Западном фронте летом – осенью 1917 г. Политические направления в процессе оформления белорусской государственности.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие для 11-го класса учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования / А.А. Коваленя [и др.]; под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича. – Минск: Изд. центр БГУ, 2004, 2009. – 232 с.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): рабочая тетрадь для 11-го класса / А.А. Коваленя, М.А. Краснова, Н.Н. Ганущенко; под ред. проф. А.А. Ковалени. – Минск: Аверсэв, 2005. – 96 с.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): материалы для учителя / А.А. Коваленя, М.А. Краснова, Г.Н. Ганущенко. – Минск: Аверсэв, 2007. – 240 с.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): справочник / авт.-сост.: А.А. Коваленя, М.А. Краснова, В.И. Лемешонок; под ред. А.А. Ковалени. – Минск: ИЦ БГУ, 2007. – 235 с.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): хрестоматия: пособие для учащихся 11-го класса / сост. А.А. Коваленя, М.А. Краснова, В.И. Лемешонок [и др.]; науч. ред. А.А. Коваленя. – Минск: Белорус. наука, 2008. – 350 с.

Каваленя, А.А. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны). Атлас: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд адукацыі / А.А. Каваленя, М.Г. Жылінскі. – Мінск: Белкартаграфія, 2015.

Примерное календарно-тематическое планирование изучения учебного предмета «Всемирная история Новейшего времени: 1918–1945 гг.». X класс. Базовый уровень изучения учебного предмета. – Минск, 2015.

Для формирования картографических умений учащихся в образовательном процессе необходимо использование учебных настенных карт:

Россия в 1917 г. Февральская и Октябрьская революция.

Гражданская война и иностранная интервенция в Советской России (1917–1922 гг.).

СССР в 20–30-е годы XX в.

Страны Азии в 1918–1939 гг.

Страны Африки в новейшее время.

Западная Европа в межвоенный период (1918–1939 гг.).

Вторая мировая война.

Вторая мировая война. Военные действия с 1.IX 1939 г. по 22.VI 1941 г.

Вторая мировая война. Военные действия в Европе с 22.VI 1941 г. по 19.XI 1942 г.

Вторая мировая война. Военные действия в Европе и Северной Африке с 19.XI 1942 г. по 9.V 1945 г.

Интенсификации процесса обучения и повышению его эффективности будет содействовать использование компьютерной и мультимедийной техники, интерактивных досок и электронных средств обучения.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Сусветная гісторыя (Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг.)» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ (СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ, 1918–1945 гг.)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя Навейшага часу з'яўляецца важным этапам фарміравання ў вучняў цэласнай карціны гістарычнага развіцця свету, без якога цяжка арыентавацца ў сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці. Яна раскрывае карціну гістарычнага працэсу ў яго адзінстве і супярэчнасці ад заканчэння Першай сусветнай вайны да пачатку XXI стагоддзя. У навучанні гісторыі гэты курс займае асаблівае месца. Ён з'яўляецца лагічным завяршэннем вывучэння сістэматычнага курса гісторыі, таму ў ім знаходзяць адлюстраванне абагульняючыя вывады аб асноўных тэндэнцыях і грамадска-гістарычным вопыце папярэдняга развіцця. Курс Навейшай гісторыі мае ключавое значэнне з пункта гледжання фарміравання светапогляду і грамадзянскага выхавання вучняў, атрымання імі сацыяльна значных ведаў аб сучасных тэндэнцыях развіцця свету, іх інтэлектуальнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі да ўваходжання ў самастойнае жыццё.

Праграма грунтуецца на спалучэнні храналагічнага, краіназнаўчага, параўнальна-гістарычнага і праблемнага падыходаў. Храналагічны падыход выявіўся ў захаванні традыцыйнага падзелу курса на дзве часткі: 1918–1945 гг., які вывучаецца ў X класе, і з 1945 г. да цяперашняга часу, які вывучаецца ў XI класе, а таксама ў тым, што падзеі і з'явы гісторыі ў рамках тэмы вывучаюцца ў часавым (храналагічным) парадку. Краіназнаўчы падыход выявіўся ў выдзяленні асобных блокаў: краіны Еўропы і ЗША; Расія – СССР – Расійская Федэрацыя; краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Параўнальна-гістарычны падыход дапамагае знаходзіць агульнае і рознае ў развіцці працэсаў сусветнай гісторыі, паказваць узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць падзей. Праблемны падыход знайшоў сваё адлюстраванне ў разглядзе пытанняў, якія не маюць адназначнага адказу ў гістарычнай навуцы. Сярод іх можна адзначыць такія ключавыя праблемы, як пытанні вайны і міру, праблемы трансфармацыі і мадэрнізацыі палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм, прынцыпы пабудовы стабільнага светапарадку для ўстойліва бяспечнага развіцця чалавецтва.

Вучэбная праграма прызначана для арганізацыі навучання сусветнай гісторыі Навейшага часу (1918–1945 гг.) у X класе на павышаным узроўні, які прадугледжвае ўзровень засваення вучнямі ведавага і дзейнаснага кампанентаў зместу адукацыі, неабходнага для асобаснага самаразвіцця, далейшага навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі і работы ў выбранай прадметнай сферы, а таксама для ўсвядомленага і эфектыўнага вырашэння адукацыйных і жыццёвых (сацыякультурных) задач.

Мэта вывучэння гісторыі на павышаным узроўні:

авалоданне вучнямі сістэматызаванымі ведамі аб сусветным гістарычным працэсе з 1918 па 1945 г., неабходнымі для фарміравання грамадзянскага патрыятызму, паспяховага прафесійнага самавызначэння і сацыялізацыі ў сучасным сацыякультурным асяроддзі, і развіццё на гэтай аснове гістарычнага мыслення.

Асноўныя задачы:

засвоіць найважнейшыя факты, якія характарызуюць перыяд Навейшай гісторыі ад заканчэння Першай сусветнай вайны да заканчэння Другой сусветнай вайны, з раскрыццём найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей;

засвоіць асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі;

выпрацоўваць каштоўнасныя арыентацыі, фарміраваць ацэначны пункт погляду;

асвоіць асноўныя спосабы атрымання і аперыравання ведамі;

фарміраваць уменні, неабходныя для ажыццяўлення пераўтваральнай пазнавальнай дзейнасці і прымянення атрыманых ведаў у грамадскім і асабістым жыцці.

Павышаны ўзровень дазваляе рэалізаваць дыферэнцыяцыю навучання, пабудаваць індывідуальную адукацыйную траекторыю, забяспечыць пераемнасць агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі і падрыхтаваць да працягу навучання на ўзроўні вышэйшай адукацыі і ажыццяўлення працоўнай дзейнасці. Асаблівасцю курса гісторыі, які вывучаецца на ступені агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні, з'яўляецца яго непасрэдная сувязь з задачамі прафілізацыі адукацыі і арганізацыі давузаўскай падрыхтоўкі вучняў.

Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні ажыццяўляецца з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі выпускніка на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, які ўлічвае фарміраванне асобасных, метапрадметных, прадметных кампетэнцый. Кампетэнцыі разглядаюцца як асобасныя якасці, якія фарміруюцца ў адукацыйным працэсе ў ходзе засваення ведаў, набыцця ўменняў, навыкаў, вопыту дзейнасці, неабходных для працягу адукацыі, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве.

Асобасныя вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні адлюстроўваюць:

усведамленне ўласнай ідэнтычнасці як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

фарміраванне базавай сістэмы каштоўнасцей (сям'я, сябры і знаёмыя, вольны час, палітыка, праца, рэлігія);

далучэнне да культурнай разнастайнасці сучаснага грамадства;

развіццё светапогляду, самасвядомасці, адносін да рэчаіснасці, характару, здольнасцей, псіхічных працэсаў, назапашванне вопыту.

Метапрадметныя вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні адлюстроўваюць уменні:

самастойна вызначаць мэты свайго навучання і пазнавальнай дзейнасці, а таксама шляхі іх дасягнення;

аналізаваць сваю дзейнасць і карэкціраваць яе;

вызначаць паняцці і падводзіць пад паняцці;

абагульняць, сістэматызаваць, класіфікаваць факты, выяўляць асноўныя прычынна-выніковыя сувязі, рабіць вывады;

аперыраваць знакава-сімвальнай інфармацыяй;

працаваць з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі;

арганізоўваць і прадстаўляць вынікі сваёй вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, працаваць у групе, камандзе, калектыве.

Прадметныя вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні накіраваны на засваенне зместу гісторыі Навейшага часу з 1918 па 1945 г. і асваенне спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Прадметныя вынікі навучання павінны дапамагчы ў паспяховым навучанні на наступнай ступені адукацыі. Яны пададзены ў раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні ажыццяўляецца як за кошт павелічэння аб'ёму тэарэтычнага і факталагічнага матэрыялу, так і за кошт удасканалення спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Засваенне ўменняў і навыкаў даследчай, пераўтваральнай і творчай дзейнасці з максімальнай самастойнасцю вучняў павінна стаць асноўным у адукацыйным працэсе.

Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні патрабуе змянення метадаў навучання. Павялічваецца аб'ём самастойнай працы вучняў, большая ўвага надаецца рабоце з гістарычнымі крыніцамі, арганізуецца даследчая і праектная дзейнасць. Гэта дазваляе вырашыць праблему найбольш поўнага ўліку індывідуальных магчымасцей і патрэбнасцей вучняў. З мэтай выпрацоўкі асобасных адносін вучняў да вывучаемых падзей і працэсаў важна звязваць вывучаемы матэрыял з сучасным жыццём.

Асаблівае значэнне ў працэсе вывучэння гісторыі на павышаным узроўні маюць *практыка-арыентаваныя формы вучэбных заняткаў*, у ходзе якіх вучні ўдасканальваюць навыкі індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці з разнастайнымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі, рашаюць пазнавальныя задачы, выконваюць праблемныя заданні, ажыццяўляюць інфармацыйна-пазнавальную, вучэбна-даследчую і праектную дзейнасць. Для правядзення такіх заняткаў у праграме адведзены дадатковы вучэбны час. Тэмы ўрокаў-практыкумаў вызначае настаўнік, зыходзячы са складанасці вучэбнага матэрыялу, неабходнасці больш якаснага яго засваення, інтарэсаў вучняў, а таксама забяспечанасці неабходнымі сродкамі навучання.

Пашырыць праблематыку зместу гістарычнага курса, стварыць умовы для арганізацыі засваення адпаведных спосабаў дзейнасці, адпрацаваць навыкі даследчай працы з гістарычнымі крыніцамі, удасканальваць уменне фармуляваць і аргументаваць уласны пункт гледжання магчыма на аснове вывучэння шырокага спектра гістарычных крыніц. Асноўнае месца пры рабоце з дакументамі мэтазгодна адвесці іх крытычнаму аналізу і інтэрпрэтацыі. Разам з традыцыйнымі відамі гістарычных крыніц (заканадаўчыя акты, мемуары, гістарычныя даследаванні і інш.) могуць выкарыстоўвацца крыніцы інфармацыі, не зусім звычайныя для сярэдняй школы, але, безумоўна, здольныя павысіць пазнавальны інтарэс, такія як эпісталярная спадчына (прыватная перапіска), вусная гісторыя, творы публіцыстычнага, карыкатурнага жанраў, інфармацыя СМІ, музейныя экспанаты, краязнаўчы матэрыял і г.д.

Праграма прадугледжвае правядзенне *абагульняючых урокаў*, якія садзейнічаюць сістэматызацыі ведаў вучняў, устанаўленню сувязей паміж рознымі раздзеламі, вывядзенню заканамернасцей і тэндэнцый, удасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Рэзервовы час прызначаны для правядзення *ўрокаў кантролю* засваення ведавага і дзейнаснага кампанентаў зместу гістарычнай адукацыі, а таксама для арганізацыі *праектнай дзейнасці* вучняў.

Павышэнню якасці навучання таксама будзе садзейнічаць выкарыстанне ў адукацыйным працэсе міжпрадметных сувязей і інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

У адпаведнасці з вучэбным планам на 2015/16 навучальны год на вывучэнне сусветнай гісторыі Навейшага часу (1918–1945 гг.) адводзіцца 2 вучэбныя гадзіны на тыдзень у I паўгоддзі і 3 вучэбныя гадзіны ў II паўгоддзі, усяго 87 вучэбных гадзін.

Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і ўлічваючы асаблівасці навучання ў канкрэтных умовах, можа змяніць рэкамендуемую праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм, не выходзячы за агульную колькасць вучэбнага часу па раздзелах.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
87 гадзін, у тым ліку 12 гадзін – рэзервовы час

Уводзіны (1 гадзіна)

Пачатак крызісу індустрыяльнага грамадства. Паняцце «Навейшая гісторыя». Прадмет, асноўны змест і перыядызацыя гісторыі Навейшага часу. Асноўныя тэндэнцыі развіцця асобных краін і рэгіёнаў свету ў Навейшы час. Уплыў Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на ход сусветнай гісторыі.

Р а з д з е л I
Краіны Еўропы і ЗША ў 1918–1939 гг. (32 гадзіны)

Усталяванне асноў пасляваеннага свету. Парыжская мірная канферэнцыя. Д.Лойд Джордж, Ж.Клемансо, В.Вільсан. Версальскі мірны дагавор. Мірныя дагаворы з саюзнікамі Германіі: Аўстрыяй, Венгрыяй, Балгарыяй, Турцыяй. Тэрытарыяльныя

змяненні ў Еўропе. Стварэнне Лігі Нацый. Вашынгтонская канферэнцыя. Супярэчнасці Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.

Рэвалюцыя 1918–1919 гг. у Германіі. Набліжэнне агульнанацыянальнага крызісу ў Германіі. Пачатак рэвалюцыі, яе задачы, рухаючыя сілы. Палітыка Савета народных упаўнаважаных. Ф.Эберт, Р.Люксембург, К.Лібкнехт. Утварэнне Камуністычнай партыі Германіі (КПГ). Палітычная стачка і паўстанне ў Берліне ў студзені 1919 г. Выбары ў Нацыянальны сход. Баварская савецкая рэспубліка. Вынікі і характар рэвалюцыі. Станаўленне Веймарскай рэспублікі ў Германіі.

Рэвалюцыі ў Аўстрыі і Венгрыі. Уздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Аўстра-Венгрыі. Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. і абвяшчэнне рэспублікі ў Аўстрыі, пасляваенныя праблемы краіны. Рэвалюцыйны крызіс у Венгрыі. Абвяшчэнне Венгерскай Савецкай рэспублікі, паражэнне рэспублікі. Устанаўленне ваеннай дыктатуры ў Венгрыі.

Італія ў 1918–1923 гг. Вынікі Першай сусветнай вайны для Італіі. Крызіс буржуазна-парламенцкай дзяржавы. Уздым рабочага і сялянскага рухаў. Утварэнне камуністычнай партыі. Узнікненне фашысцкага руху. Б.Мусаліні. Прыход фашыстаў да ўлады. Падаўленне рабочага руху, разгром кампартыі і апазіцыі. Фашызацыя палітычнага рэжыму.

Германія ў 1920–1923 гг. Путч Капа – Лютвіца. Сакавіцкія падзеі 1921 г. Пытанне аб рэпарацыях. Акупацыя Рура. Палітыка КПГ. Фашысцкі рух у Германіі. Узнікненне фашысцкай партыі ў Германіі. А.Гітлер. «Піўны путч».

Вялікабрытанія, Францыя і ЗША ў 1918–1923 гг. Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША пасля Першай сусветнай вайны. Унутраная палітыка. Актывізацыя рабочага і дэмакратычнага руху. Асаблівасці знешняй палітыкі.

Заходняя Еўропа і ЗША ў 1924–1929 гг. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця. Унутрыпалітычнае развіццё ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі. Палітычная барацьба ў Германіі. План Даўэса. Асаблівасці фашысцкага руху ў Германіі. Палітычны крызіс 1924 г. у Італіі. Умацаванне фашысцкага рэжыму ў Італіі.

Міжнародны рабочы рух у 1918–1929 гг. Забастовачны рух пралетарыяту ў 1918–1920 гг. Раскол у міжнародным сацыялістычным руху. Утварэнне камуністычных партый і Камуністычнага Інтэрнацыянала. Стварэнне Рабочага Сацыялістычнага Інтэрнацыянала. К.Каўцкі. Міжнародны рабочы рух у 1924–1929 гг.

Міжнародныя адносіны ў 1924–1929 гг. Стабілізацыя Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. «Эра пацыфізму». Расстаноўка сіл на міжнароднай арэне. Германскае пытанне. Праблемы еўрапейскай бяспекі і раззбраення. Канферэнцыя ў Лакарна. Пакт Брыяна – Келага. Адносіны паміж СССР і краінамі Захаду. Узмацненне знешнепалітычных пазіцый Германіі.

Сусветны эканамічны крызіс ў 1929–1933 гг. Прычыны сусветнага эканамічнага крызісу. Асаблівасці яго праяўлення ў розных краінах. Шляхі выхаду з крызісу: буржуазна-ліберальны, сацыял-рэфармісцкі, таталітарны. Этатызм. Рост фашысцкіх тэндэнцый у краінах Захаду ў гады сусветнага эканамічнага крызісу. Фашызм і рабочы рух.

ЗША ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу. «Вялікая дэпрэсія» і абвастрэнне сацыяльных праблем. Палітыка адміністрацыі Г.Гувера. Сацыяльны рух. Перамога дэмакратаў на прэзідэнцкіх выбарах 1932 г. Мэты і задачы «новага курсу». Ф.Рузвельт. Антыкрызісныя мерапрыемствы ў галіне фінансаў, прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Сацыяльная палітыка. Уздым рабочага і дэмакратычнага руху ў сярэдзіне 1930-х гг. Сацыяльнае заканадаўства.

Германія ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу. Эканамічны крызіс, яго праяўленні і сацыяльна-палітычныя вынікі. Распад «вялікай кааліцыі» і палітыка кабінета Брунінга. Рост уплыву НСДАП. Прыход нацыстаў да ўлады ў Германіі. Унутраная палітыка. Выбары ў сакавіку 1933 г. Лейпцыгскі працэс. Устанаўленне таталітарнай дыктатуры. Мілітарызацыя краіны.

Фашысцкая Італія ў 1930-я гг. Эканамічныя і сацыяльныя вынікі сусветнага эканамічнага крызісу для Італіі. Карпаратыўная сістэма. Палітыка аўтаркіі. Мілітарызацыя эканомікі. Фашысцкая прапаганда ў Італіі. Апазіцыя фашысцкаму рэжыму.

Вялікабрытанія, Францыя ў 1930-я гг. Асаблівасці і вынікі сусветнага эканамічнага крызісу. Узмацненне ўнутранай рэакцыі. Пагроза фашызму. Брытанскі саюз фашыстаў. Правал фашысцкага мяцяжу ў Францыі і стварэнне Народнага фронту. Знешняя палітыка Вялікабрытаніі і Францыі ў 1930-я гг.

Народны фронт і грамадзянская вайна ў Іспаніі. Пачатак буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Мерапрыемствы рэспубліканскага ўрада. Контрнаступленне рэакцыі. Актывізацыя фашызму. Іспанская фаланга. Кастрычніцкае паўстанне 1934 г. Перамога Народнага фронту на выбарах 1936 г. Палітыка рэспубліканскага ўрада. Грамадзянская вайна. Палітыка «неўмяшання». Паражэнне рэспублікі і ўстанаўленне дыктатуры генерала Ф.Франка.

Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў 1920–1930-я гг. Утварэнне незалежных дзяржаў. Т.Масарык. Устанаўленне аўтарытарных рэжымаў. М.Хорці. Ю.Пілсудскі. Нарастанне знешнепалітычнай пагрозы ў 1930-х гг. Акупацыя Чэхаславакіі. Польшча перад пагрозай германскай агрэсіі.

Міжнародныя адносіны ў 1930-я гг. Крызіс і крах Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Агрэсіўная палітыка фашысцкіх дзяржаў у 1936–1939 гг. Фарміраванне блока агрэсіўных дзяржаў. Мюнхенская канферэнцыя. Праблема стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Англа-франка-савецкія перагаворы 1939 г. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні.

Навука і культура Заходняй Еўропы і ЗША ў міжваенны перыяд (1919–1939 гг.). Прыродазнаўчыя навукі і навукова-тэхнічны прагрэс. А.Эйнштэйн. Грамадскія навукі. О.Шпэнглер. Працяг традыцый рэалізму ў літаратуры. Э.Хемінгуэй, Э.М.Рэмарк. Пошукі новых форм у выяўленчым мастацтве. Кіно. Ч.Чаплін. Архітэктура.

Змяненні ў ладзе жыцця людзей. Паляпшэнне ўмоў працы, рост дабрабыту людзей. Новыя сродкі перамяшчэння, камфорт жылля. Электрычнасць, радыё, тэлефон у быце, выкарыстанне новай бытавой тэхнікі. «Індустрыя вольнага часу». Новы рытм жыцця. Дэмакратызацыя моды. Супярэчнасці новага ладу жыцця.

Урок-практыкум (4 гадзіны)

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *Веймарская рэспубліка, ІІІ (Камуністычны) Інтэрнацыянал, рэпарацыі, Версальскі мірны дагавор, дэмілітарызацыя, Ліга Нацый, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, пакт Брыяна – Келага, пацыфізм, дэмакратызацыя палітычнай сістэмы, Рурскі крызіс, Рэйнскі гарантыйны пакт, Рэйнская дэмілітарызаваная зона, сусветны эканамічны крызіс, «новы курс» Рузвельта, фашызм, нацызм, расізм, таталітарны палітычны рэжым, генацыд, гета, Народны фронт, палітыка «супакойвання» агрэсара, «Антыкамінтэрнаўскі пакт», аншлюс, Мюнхенскі дагавор, сістэма калектыўнай бяспекі, «Стальны пакт», аўтарытарны палітычны рэжым, масавая культура, мадэрнізм*, *канструктывізм*, *«Баўхаўз».*

Р а з д з е л ІІ
Савецкая дзяржава ў міжваенны перыяд (20 гадзін)

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады. Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне. Перамога паўстання ў Петраградзе і Маскве. ІІ Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Утварэнне Савета Народных Камісараў (СНК). У.І.Ленін, Я.М.Свердлаў. Устанаўленне Савецкай улады ў рэгіёнах Расіі. Брэсцкі мір.

Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя. Асноўныя прычыны і этапы Грамадзянскай вайны ў Расіі. Асноўныя сілы і ўдзельнікі Грамадзянскай вайны. Белы рух. А.В.Калчак. Чырвоны рух. Л.Д.Троцкі, М.В.Фрунзэ. Ваенныя дзеянні на франтах Грамадзянскай вайны. Палітыка «ваеннага камунізму». Разгром армій А.І.Дзянікіна,

М.М.Юдзеніча і П.М.Урангеля. Завяршальны этап Грамадзянскай вайны. Вынікі Грамадзянскай вайны.

Новая эканамічная палітыка. Сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс у канцы 1920 – пачатку 1921 г. Сялянскія выступленні. Кранштацкі мяцеж. X з'езд РКП(б) і ўвядзенне новай эканамічнай палітыкі (нэп). Нэп і дыскусіі ў партыі бальшавікоў. М.І.Бухарын. Сутнасць і асноўныя кірункі нэпа. Палітычная сістэма, грамадства і культура ў гады нэпа. Супярэчнасці, крызіс і вынікі нэпа.

Утварэнне СССР і развіццё нацыянальных адносін. Перадумовы ўтварэння СССР. Палітыка бальшавікоў у галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Праекты і этапы ўтварэння савецкай многанацыянальнай краіны. Дагавор і Дэкларацыя аб утварэнні СССР. Вышэйшыя органы ўлады. Першая Канстытуцыя СССР. Утварэнне новых саюзных рэспублік. Значэнне ўтварэння СССР.

Курс на пабудову сацыялізму ў СССР. Дыскусіі 1920-х гг. аб шляхах пабудовы сацыялізму. Індустрыялізацыя: кірункі, задачы, крыніцы назапашвання, асаблівасці. Першыя пяцігодкі. Сацыялістычнае спаборніцтва. А.Р.Стаханаў і стаханаўскі рух. Ударніцтва.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі: мэты, метады. Ход калектывізацыі, яе супярэчнасці і вынікі. Сацыяльная палітыка. Згортванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай.

Унутраная палітыка СССР. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай барацьбы ў РКП(б) пасля смерці У.І.Леніна. Паражэнне Л.Д.Троцкага і перамога І.В.Сталіна. Палітычныя працэсы і «чысткі» 1930-х гг. Культ асобы І.В.Сталіна. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Канстытуцыя 1936 г.

Знешняя палітыка СССР. Асноўныя кірункі і прынцыпы знешняй палітыкі СССР у 1920-я гг. Генуэзская канферэнцыя. Рапальскі дагавор. Дыпламатычнае прызнанне СССР. Адносіны з краінамі Усходу. Дзейнасць Камінтэрна. Барацьба СССР за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні 1939 г. Пашырэнне тэрыторыі СССР.

Культурныя пераўтварэнні ў СССР. Задачы культурнага будаўніцтва ў паслярэвалюцыйны перыяд. Культурная рэвалюцыя. Супярэчнасці культурнай палітыкі. Развіццё сістэмы адукацыі. А.В.Луначарскі. Поспехі савецкай навукі. Асаблівасці развіцця літаратуры і мастацтва. Сацыялістычны рэалізм. Сацыялістычная дзяржава і царква.

Урок-практыкум (3 гадзіны)

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *Кастрычніцкая рэвалюцыя, сепаратны мір, бальшавізм, рэвалюцыйная дыктатура, Савет Народных Камісараў (СНК), Грамадзянская вайна, палітыка «ваеннага камунізму», культ асобы, новая эканамічная палітыка (нэп), Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР), аўтаномія, федэрацыя, індустрыялізацыя, пяцігодка, стаханаўскі рух, ударніцтва, калектывізацыя, метад сацыялістычнага рэалізму.*

Р а з д з е л III
Краіны Усходу і Лацінскай Амерыкі ў 1918–1939 гг. (18 гадзін)

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё краін Усходу і Лацінскай Амерыкі. Тэрытарыяльны перадзел свету. Сацыяльныя працэсы на Усходзе. Нацыянальна-вызваленчы рух за незалежнасць і мадэрнізацыю. Лацінская Амерыка.

Кітай. Кітайская рэспубліка ў пачатку XX стагоддзя. Пад'ём нацыянальнага руху ў 1919–1924 гг. «Рух 4 мая». Чан Кайшы. Нацыянальная рэвалюцыя 1925–1927 гг. Грамадзянская вайна 1927–1937 гг. Агрэсія Японіі ў Кітаі. Развіццё культуры. Новыя з'явы ў ладзе жыцця.

Індыя. Становішча Індыі пасля Першай сусветнай вайны. Рост нацыянальна-вызваленчага руху. Гандзі і ператварэнне ІНК у масавую партыю. Агульнаіндыйская

кампанія грамадзянскай непакорнасці (сацьяграха). Закон аб кіраванні Індыяй (1935 г.). Дзейнасць ІНК і Мусульманскай лігі ў 1930-я гг. Развіццё культуры. Лад жыцця.

Японія. Японія пасля Першай сусветнай вайны. Паскораная мадэрнізацыя. «Рысавыя бунты». Рост дэмакратычнага руху. Унутрыпартыйная барацьба. Агрэсіўная палітыка кабінета Танака. Уплыў сусветнага эканамічнага крызісу на Японію. Мілітарызацыя краіны. Стварэнне Маньчжоу-го і агрэсія ў Паўднёва-Усходняй Азіі. Збліжэнне з фашысцкімі Германіяй і Італіяй. Культура Японіі.

Турцыя. Вынікі Першай сусветнай вайны для краіны. Нацыянальная рэвалюцыя 1918–1923 гг. М.Кемаль (Атацюрк). Рэформа дзяржаўнага ладу, заканадаўства, культуры і быту. Праграма «6 стрэл». Сацыяльна-эканамічная палітыка М.Кемаля. Кемалізм. Знешняя палітыка Турцыі.

Іран. Дзяржаўны пераварот 21 лютага 1921 г. Звяржэнне дынастыі Каджараў. Рэжым Рэза-шаха. Мадэрнізацыя краіны. Эканамічная палітыка Рэза-шаха. Знешняя палітыка.

Афганістан. Прыход да ўлады Аманулы-хана. Савецка-афганскі дагавор (1921 г.). Рэформы младаафганцаў. Грамадзянская вайна (1929 г.). Прыход да ўлады Надзір-хана. Станаўленне рэжыму караля Мухамеда Захір-шаха.

Арабскія краіны. Агульная характарыстыка краін арабскага рэгіёна. Асаблівасці арабскага нацыянальна-вызваленчага руху. Англічане ў Егіпце. Ліван і Сірыя пад французскім мандатам. Ірак і Трансіярданія. Палесціна пад мандатам Вялікабрытаніі. Арабскія краіны Афрыкі.

Афрыка ў 1918–1939 гг. Афрыка пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Падзел германскіх калоній у Афрыцы. Зараджэнне нацыянальна-вызваленчага руху ў Трапічнай і Паўднёвай Афрыцы. Ідэалогія панафрыканізму. Паўднёва-Афрыканскі Саюз: палітыка правячых колаў.

Краіны Лацінскай Амерыкі. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Палітыка ЗША ў адносінах да краін Лацінскай Амерыкі. На шляху да аўтарытарызму (Аргенціна, Бразілія, Мексіка). Культура Лацінскай Амерыкі.

Урок-практыкум (2 гадзіны)

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *нацыянальна-вызваленчы рух, мандатная сістэма, японізм (ніпанізм), «рысавыя бунты», гандзізм, «саляны паход», кемалізм, фундаменталізм і рэфармізм у ісламе, шарыят, сацьяграха, палітыка «добрага суседа», ваенная дыктатура.*

Р а з д з е л IV

Другая сусветная вайна. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (15 гадзін)

Пачатак Другой сусветнай вайны. Прычыны, характар і асноўныя этапы вайны. Напад фашысцкай Германіі на Польшчу. Супраціўленне польскага народа. «Дзіўная вайна». Савецка-фінляндская вайна. Наступленне гітлераўскіх войск на Захадзе. Капітуляцыя Францыі. Ш. дэ Голь. «Бітва за Англію». У.Чэрчыль. Палітыка СССР напярэдадні вайны з Германіяй. Фашысцкая агрэсія на Балканах.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Напад Германіі на СССР. Правал стратэгіі «маланкавай вайны». Бітва пад Масквой і яе гістарычнае значэнне. Г.К.Жукаў, І.С.Конеў. Маскоўская канферэнцыя. Уступленне ЗША ў вайну. Стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Баі на савецка-германскім фронце летам 1942 г.

Карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Рашаючыя перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе, іх міжнароднае значэнне. А.М.Васілеўскі. Ваенныя дзеянні армій ЗША і Англіі ў канцы 1942–1943 г. Б.Мантгомеры. Капітуляцыя Італіі. Вайна на Ціхім і Атлантычным акіянах. Пашырэнне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

Барацьба з захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі. Фашысцкі акупацыйны рэжым. Антыфашысцкае падполле і партызанскі рух на акупіраванай тэрыторыі СССР. Л.М.Даватар. Рух Супраціўлення ў еўрапейскіх краінах. І.Б.Ціта. Праблема адзінства

дзеянняў антыфашысцкіх сіл. Узнікненне нацыянальных франтоў. Вызваленчыя паўстанні ў Еўропе.

Савецкі тыл у гады вайны. Перавод эканомікі на ваенны лад. Развіццё савецкай ваеннай тэхнікі. Г.С.Шпагін. Працоўны гераізм савецкага народа. Штодзённае жыццё людзей у гады вайны. Блакадны Ленінград. Умацаванне савецкага патрыятызму. Праваслаўная царква ў гады вайны. Савецкая навука і культура ў гады вайны. В.Ф.Бергольц.

Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў гады Другой сусветнай вайны. Японская палітыка ў краінах ПУА ў перыяд Другой сусветнай вайны. Барацьба кітайскага народа супраць японскай агрэсіі (1937–1945 гг.). Удзел Індыі ў Другой сусветнай вайне. Турцыя, Іран і Афганістан у гады Другой сусветнай вайны. Краіны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў гады Другой сусветнай вайны.

Заключны этап Другой сусветнай вайны. Вызваленне тэрыторыі СССР. А.І.Пакрышкін. Высадка саюзнікаў у Францыі. Аперацыя «Баграціён». Вызваленне еўрапейскіх краін. Адкрыццё другога фронту. Д.Эйзенхаўэр. Крымская (Ялцінская) канферэнцыя і яе рашэнне. Разгром гітлераўскай Германіі. К.К.Ракасоўскі. Заснаванне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Вызначэнне новай сістэмы сусветнага парадку. Патсдамская канферэнцыя. Паражэнне і капітуляцыя Японіі.

Вынікі і ўрокі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Роля СССР у разгроме фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Кошт і значэнне перамогі. Змяненні на палітычнай карце свету. Судовыя працэсы над ваеннымі злачынцамі.

Урок-практыкум (2 гадзіны)

Урок падагульнення

Асноўныя паняцці: *Другая сусветная вайна, «дзіўная вайна», Траісты пакт, Вялікая Айчынная вайна, антыгітлераўская кааліцыя, ленд-ліз, карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, «новы парадак», Халакост, партызанскі і падпольны рух, рух Супраціўлення, другі фронт, безагаворачная капітуляцыя, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН), Нюрнбергскі трыбунал.*

Выніковае абагульненне (1 гадзіна)

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку засваення вучэбнай праграмы на павышаным узроўні вучні X класа будуць:

ведаць:

асноўныя падзеі сусветнай гісторыі Навейшага часу з 1918 па 1945 г., іх даты, удзельнікаў і вынікі;

значэнне асноўных паняццяў і іх азначэнні;

асноўныя факты з жыцця і дзейнасці найбольш значных гістарычных асоб і дзеячаў культуры;

прыведзеныя ў вучэбнай літаратуры ацэнкі найважнейшых падзей, гістарычных асоб, дасягненняў і вынікаў развіцця навукі і тэхнікі;

асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця пададзеных у праграме краін свету ў вывучаемы перыяд;

умець:

лакалізоўваць падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі 1918–1945 гг. у часе і прасторы;

рабіць апісанне: а) ключавых падзей першага перыяду Навейшай гісторыі; б) умоў і ладу жыцця людзей рознага сацыяльнага становішча ў розных краінах у 1918–1945 гг.; в) помнікаў культуры першага перыяду Навейшай гісторыі;

тлумачыць значэнне асноўных паняццяў і правільна іх выкарыстоўваць пры характарыстыцы гістарычнай і сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці;

суадносіць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы айчыннай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

характарызаваць асноўныя перыяды Навейшай гісторыі, важныя гістарычныя падзеі; геапалітычнае становішча краін і рэгіёнаў у 1918–1945 гг.; палітычныя рэжымы, якія існавалі ў першай палове XX стагоддзя: дэмакратычныя, аўтарытарныя, таталітарныя; сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча краін у 1918–1945 гг.; нацыянальна-вызваленчы рух; дзейнасць палітычных і дзяржаўных асоб і дзеячаў культуры; самыя значныя з'явы культуры ў 1918–1945 гг.;

тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі найбольш значных падзей і з'яў першага перыяду Навейшай гісторыі, раскрываць узаемаабумоўленасць змяненняў у асноўных галінах грамадскага жыцця;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на падставе гэтага аргументаваныя вывады;

параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;

праводзіць аналіз зместу гістарычных дакументаў;

пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

тлумачыць розныя пункты погляду на адны і тыя ж гістарычныя факты;

канкрэтызаваць вывады, гістарычныя паняцці;

выражаць і аргументаваць свае адносіны да гістарычных падзей і асоб, выказваць сваю аргументаваную думку пры абмеркаванні гістарычных праблем;

даваць ацэнку гістарычным падзеям, дзейнасці ўрадаў, палітычных і дзяржаўных дзеячаў; ацэньваць уклад дзеячаў культуры і навукі ў гістарычнае развіццё чалавечага грамадства;

праводзіць пошук гістарычнай інфармацыі ў крыніцах рознага тыпу;

праводзіць вучэбнае гістарычнае даследаванне: фармуляваць праблемы; ажыццяўляць збор, сістэматызацыю і абагульненне інфармацыі; праводзіць якасны/колькасны аналіз; апісваць атрыманыя вынікі; праводзіць прэзентацыю і абарону вынікаў даследавання;

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:

для вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з'яў і асоб, а таксама да падзей сучаснага жыцця;

аналізу пры рабоце з гістарычнымі крыніцамі і сучаснай сацыяльнай інфармацыяй;

усвядомленых паводзін як прадстаўніка гістарычна складзенага грамадзянскага, этнакультурнага, канфесійнага згуртавання, грамадзяніна Беларусі;

беражлівых адносін да помнікаў гісторыі і культуры.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

У працэсе навучання могуць быць выкарыстаны наступныя кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу:

Космач, Г.А. Сусветная гісторыя Навейшага часу: 1918–1945 гг.: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання / Г.А. Космач, В.С. Кошалеў, М.А. Краснова; пад рэд. Г.А. Космача. – Мінск: Народная асвета, 2012. – 214 с.

Всемирная история Новейшего времени, 1918–1945 гг.: 10-й кл.: хрестоматия: пособие для учащихся общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / авт.-сост. Г.А. Космач, В.С. Кошелев, М.А. Краснова; под ред. Г.А. Космач. – Минск: Пачатковая школа, 2009. – 320 с.

Космач, Г.А. Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918–1945 гг. Атлас: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. мовай навучання / Г.А. Космач, В.М. Цемушоў. – Мінск: Белкартаграфія, 2009. – 24 с.

Краснова, М.А. История. 10 класс: рабочая тетрадь: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования / М.А. Краснова [і інш.]. – Минск: Аверсэв, 2012. – 158 с.

Краснова, М.А. Всемирная история Новейшего времени: тестовые и разноуровневые задания: 10–11 кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / М.А. Краснова. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 192 с.

Космач, Г.А. Всемирная история Новейшего времени, 1918–1945 гг.: проблемы войны и мира: 10-й кл.: пособие для учителей общеобразоват. учреждений / Г.А. Космач, В.С. Кошелев, М.А. Краснова. – Минск: Асар, 2010. – 168 с.

Космач, Г.А. Всемирная история Новейшего времени, 1918–1945 гг.: проблемы войны и мира: 10-й кл.: пособие для учащихся общеобразоват. учреждений / Г.А. Космач, В.С. Кошелев, М.А. Краснова. – Минск: Асар, 2010. – 252 с.

Краснова, М.А. История Новейшего времени в 10 классе: учеб.-метод. пособие / М.А. Краснова, Г.А. Космач, В.С. Кошелев. – Минск: ИЦ БГУ, 2014.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / А.А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А.А. Кавалені, М.С. Сташкевіча. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2004, 2009. – 232 с.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): рабочая тетрадь для 11-го класса / под ред. проф. А.А. Ковалени. – Минск: Аверсэв, 2005. – 96 с.

Коваленя, А.А. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): материалы для учителя / А.А. Коваленя, М.А. Краснова, Г.Н. Ганущенко. – Минск: Аверсэв, 2007. – 240 с.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): справочник / авт.-сост.: А.А. Коваленя, М.А. Краснова, В.И. Лемешонок; под ред. А.А. Ковалени. – Минск: ИЦ БГУ, 2007. – 235 с.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): хрестоматия: пособие для учащихся 11-го класса / сост. А.А. Коваленя [и др.]; науч. ред. А.А. Коваленя. – Минск, Белорус. наука, 2008. – 350 с.

Каваленя, А.А. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны). Атлас: вучеб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі / А.А. Каваленя, М.Г. Жылінскі. – Мінск: Белкартаграфія, 2015.

Примерное календарно-тематическое планирование изучения учебного предмета «Всемирная история Новейшего времени: 1918–1945 гг.». X класс. Повышенный уровень изучения учебного предмета. – Минск, 2015.

Для фарміравання картаграфічных уменняў навучэнцаў у адукацыйным працэсе неабходна выкарыстанне вучэбных насценных карт:

Россия в 1917 г. Февральская и Октябрьская революция.

Гражданская война и иностранная интервенция в Советской России (1917–1922 гг.).

СССР в 20–30-е годы XX в.

Страны Азии в 1918–1939 гг.

Страны Африки в Новейшее время.

Западная Европа в межвоенный период (1918–1939 гг.).

Вторая мировая война.

Вторая мировая война. Военные действия с 1.IX 1939 г. по 22.VI 1941 г.

Вторая мировая война. Военные действия в Европе с 22.VI 1941 г. по 19.XI 1942 г.

Вторая мировая война. Военные действия в Европе и Северной Африке с 19.XI 1942 г. по 9.V 1945 г.

Інтэнсіфікацыі працэсу навучання і павышэнню яго эфектыўнасці будзе садзейнічаць выкарыстанне камп'ютарнай і мультымедыйнай тэхнікі, інтэрактыўных дошак і электронных сродкаў навучання.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Обществоведение» для X класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания (повышенный уровень)

ОБЩЕСТВОВЕДЕНИЕ

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Общая характеристика учебного предмета, **его специфика в системе общего среднего образования.** В системе общего среднего образования «Обществоведение» представляет собой интегрированный учебный предмет, ядро которого составляет совокупность научных знаний об обществе и о человеке. Источниками конструирования содержания учебного предмета являются социальные и гуманитарные науки: антропология, культурология, правоведение, политология, психология, религиоведение, социология, этика, эстетика, философия, экономическая теория и др.

В ходе изучения обществоведения учащиеся усваивают систему социально-гуманитарных знаний о человеке, обществе и государстве в многообразии их взаимосвязей и взаимоотношений, опыт творческой деятельности и эмоционально-ценностных отношений, необходимых для успешной жизнедеятельности человека в обществе.

Обществоведческое образование в учреждениях общего среднего образования является важным средством *социализации личности*. На уроках обществоведения учащиеся получают представления и основы научных знаний об устройстве современного общества, механизмах социальной регуляции, способах взаимодействия личности и общества, типичных социальных ролях человека в современном обществе. Изучение обществоведения играет существенную роль в развитии *социальной компетентности молодежи*, включающей, наряду со знаниями и ценностными ориентирами, комплекс умений: умение ориентироваться в постоянно нарастающем потоке информации, получать из него необходимую информацию; умение применять полученные знания для решения не только учебных задач, но и реальных проблем собственного бытия в социуме, для осуществления в дальнейшем разноплановой деятельности в разных сферах общественной жизни.

Существенный вклад вносит учебный предмет «Обществоведение» в *гражданское становление личности*, в развитие ее социально значимых черт. Он приобщает учащихся к важным компонентам гражданской культуры: научным представлениям об отношениях между гражданином и государством; правам и обязанностям гражданина; моделям гражданского поведения, одобряемым обществом; гражданским ценностным ориентирам. Все это позволяет развивать гражданскую компетентность учащихся.

Учебный предмет «Обществоведение» содержит значительный потенциал для *нравственного воспитания подрастающего поколения*. Основные понятия морали, нравственные ценности, нравственные нормы, мотивы нравственного поведения являются в данном учебном предмете непосредственным объектом изучения.

Место учебного предмета в учебном плане. На изучение учебного предмета «Обществоведение» на повышенном уровне отводится 70 часов (т.е. 2 часа в неделю).

Содержание образования по учебному предмету на повышенном уровне расширено за счет включения новых (в сравнении с базовым уровнем изучения учебного предмета) тем, которые позволят обеспечить системность знаний по данному предмету. Новые элементы содержания образования направлены на углубление вопросов, изучаемых на

базовом уровне; раскрытие актуальных вопросов, соответствующих современному уровню социально-гуманитарных наук, которые являются источниками конструирования содержания учебного предмета «Обществоведение»; расширение личностно значимого для учащихся учебного материала (в том числе профориентационной направленности).

При этом на повышенном уровне предусмотрен резерв свободного учебного времени в объеме 14 часов для использования разнообразных форм организации образовательного процесса, внедрения современных методов обучения, педагогических технологий.

При планировании образовательного процесса учитель может сам определять оптимальную для конкретной педагогической ситуации последовательность изучения отдельных тем внутри раздела.

Цель и задачи изучения учебного предмета.

Целью учебного предмета «Обществоведение» является содействие становлению творческой личности, обладающей развитым сознанием, критическим мышлением, способной на основе осмысления культурно-исторического опыта, базовых ценностей отечественной и мировой культуры, проблем развития современной цивилизации и понимания основных тенденций развития общества определить пути конструктивной самореализации, активно включиться в продуктивную созидательную деятельность.

Задачи учебного предмета «Обществоведение» состоят в том, чтобы содействовать:

освоению учащимися знаний об основных сферах человеческой деятельности, основных тенденциях общественного развития, формах регулирования общественных отношений, которые необходимы для взаимодействия с социальной средой и выполнения типичных социальных ролей человека и гражданина;

овладению учащимися умениями получать из разнообразных источников и критически осмысливать социальную информацию, систематизировать, анализировать полученные данные; освоению ими способов познавательной, коммуникативной, практической деятельности, необходимых для участия в жизни гражданского общества и правового государства, позволяющих эффективно действовать в различных ситуациях личной, общественной, профессиональной жизни;

освоению учащимися опыта применения полученных знаний, умений и навыков для определения собственной позиции в общественной жизни; для решения типичных задач в области социальных отношений; для осуществления гражданской и общественной деятельности, развития межличностных отношений, включая отношения между людьми различных национальностей и вероисповеданий, а также в семейно-бытовой сфере; для соотнесения собственного поведения и поступков других людей с нравственными ценностями и нормами поведения, установленными законом; для содействия правовыми способами и средствами защите правопорядка в обществе;

развитию нравственной, политической, правовой, экономической культуры личности в единстве знаниевого, поведенческого и эмоционально-ценностного компонентов; воспитанию гражданственности, социальной ответственности, правового самосознания, толерантности, приверженности ценностям, закрепленным в Конституции Республики Беларусь.

Личностные, **метапредметные и предметные результаты освоения содержания учебного предмета «Обществоведение».**

Личностными результатами учащихся X класса учреждений общего среднего образования при освоении учебного предмета «Обществоведение» являются:

ценностные ориентиры, основанные на идеях патриотизма, любви и уважения к Отечеству; понимании необходимости поддержания гражданского мира и согласия; отношении к человеку, его правам и свободам как высшей ценности; стремлении к сохранению суверенитета и территориальной целостности белорусского государства; признании ценности семьи и семейных традиций; осознании своей ответственности за судьбу страны перед нынешним и грядущим поколениями;

готовность и способность к образованию, в том числе к самообразованию, на протяжении всей жизни, сознательное отношение к непрерывному образованию как условию успешной профессиональной и общественной деятельности;

осознанный выбор будущей профессии и возможностей реализации собственных жизненных планов, отношение к профессиональной деятельности как возможности участия в решении личных, общественных, государственных, общенациональных проблем;

мотивированность и направленность на активное и созидательное участие в будущем в общественной и государственной жизни;

толерантное сознание и поведение в поликультурном обществе, готовность вести диалог с другими людьми, достигать взаимопонимания и находить общие цели, сотрудничать для их достижения;

эстетическое отношение к миру, включая эстетику быта, творчества, общественных отношений;

ответственное отношение к созданию семьи на основе осознанного принятия ценностей семейной жизни.

Метапредметные результаты изучения обществоведения учащимися X класса учреждений общего среднего образования проявляются:

в умении сознательно организовывать свою познавательную деятельность (от постановки цели до получения и оценки результата);

умении продуктивно общаться и взаимодействовать со сверстниками и взрослыми в образовательной, общественно полезной, учебно-исследовательской, проектной деятельности;

готовности и способности к самостоятельной информационно-познавательной деятельности, включая умение ориентироваться в различных источниках информации, критически оценивать и интерпретировать информацию, получаемую из различных источников, умение различать факты, аргументы, оценочные суждения, отделять основную информацию от второстепенной, передавать содержание информации адекватно поставленной цели (сжато, полно, выборочно); умение переводить информацию из одной знаковой системы в другую (из текста в таблицу, из текста в схему и др.);

умении использовать средства информационных и коммуникационных технологий в решении когнитивных, коммуникативных и организационных задач с соблюдением правовых и этических норм, норм информационной безопасности;

овладении различными видами публичных выступлений (высказывания, монолог, дискуссия) и следовании этическим нормам и правилам ведения диалога;

овладении навыками познавательной рефлексии как осознания совершаемых учебных действий и мыслительных процессов, их результатов, границ своего знания и незнания, новых познавательных задач и средств их достижения.

Предметные результаты освоения учащимися X класса учреждений общего среднего образования содержания учебного предмета «Обществоведение» устанавливаются на базовом и повышенном уровнях.

Предметные результаты освоения учащимися X класса содержания учебного предмета «Обществоведение» на базовом уровне ориентированы на обеспечение преимущественно общеобразовательной и общекультурной подготовки.

Предметными результатами учащихся X класса учреждений общего среднего образования, формируемыми при освоении содержания учебного предмета «Обществоведение» *на базовом уровне*, являются:

представления об обществе как целостной развивающейся системе в единстве и взаимодействии его основных сфер и институтов;

представления об основных тенденциях и возможных перспективах развития современного общества;

владение основными понятиями наук, являющихся источниками формирования содержания образования по учебному предмету;

умение объяснять изученные социальные явления, их причины, взаимосвязь;

умение ориентироваться в ключевых проблемах современности (экологических, экономических, национальных и др.);

способность и готовность применять усвоенные знания и умения для решения познавательных и практических задач.

Предметные результаты освоения учащимися X класса содержания учебного предмета «Обществоведение» *на повышенном уровне* ориентированы на подготовку к последующему профессиональному образованию, обеспечение возможности дальнейшего успешного профессионального обучения, развитие индивидуальных способностей учащихся путем более глубокого освоения систематических знаний и способов действий, присущих учебному предмету.

Предметные результаты учащихся, формируемые при освоении содержания учебного предмета «Обществоведение» *на повышенном уровне*, включают требования к результатам освоения содержания учебного предмета на базовом уровне и дополнительно:

представления об основных этапах развития наук, являющихся источниками конструирования содержания образования по учебному предмету;

понимание основ современных научных теорий общественного развития;

системные знания о тенденциях развития экономической, политической, социальной и духовной сфер общества;

умение выявлять причинно-следственные, функциональные и иерархические связи социальных объектов и процессов;

умение самостоятельно анализировать, интерпретировать данные для решения теоретических и прикладных задач;

опыт применения усвоенных знаний, умений и навыков для оценки различных социальных явлений и процессов, аргументации собственной точки зрения по различным вопросам общественного развития, для решения проблемных ситуаций в области социальных, экономических, политических и духовных отношений.

Планируемые результаты освоения учащимися содержания образования по учебному предмету являются критериальной основой для оценки результатов учебно-познавательной деятельности учащихся.

Следует иметь в виду, что личностные результаты освоения содержания учебной программы, связанные с личностными чертами и мировоззренческими установками учащихся, определены как прогнозируемые и не подлежат промежуточной и итоговой проверке.

Душина, И.В. Методика и технология обучения географии в школе / И.В. Душина, Е.А. Таможняя, В.Б. Пятунин. – М., 2002.

Дьяконов, К.Н. Современные методы географических исследований / К.Н. Дьяконов [и др.]. – М., 1996.

Жекулин, В.С. Введение в географию / В.С. Жекулин. – М., 1989.

Завьялова, Е.Б. Экономическая география в схемах и таблицах: учеб. пособие / Е.Б. Завьялова, Н.В. Радищев. – М., 2005.

Зыль, Е.А. География материков и стран. 8-й класс: пособие для учителей / Е.А. Зыль, Г.Я. Рылюк. – Мінск: Народная асвета, 2002.

Зыль, Е.А. География материков и стран в 8 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / Е.А. Зыль [и др.]. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Исаченко, А.Г. Введение в экологическую географию / А.Г. Исаченко. – СПб.: Изд-во СПбГУ, 2003.

Исаченко, А.Г. Теория и методология географической науки / А.Г. Исаченко. – М.: ACADEMA, 2004.

Кириенко, Е.Г. Социально-экономическая география Республики Беларусь / Е.Г. Кириенко. – Минск: Аверсэв, 2003.

Козьева, И.А. Экономическая география и регионалистика / И.А. Козьева, Э.Н. Кузьбожев. – М., 2005.

Коринская, В.А. География материков и океанов, 7 класс: метод. пособие / В.А. Коринская, И.В. Душина, В.А. Щенев. – М.: ДРОФА, 2002.

Кузнецов, А.П. География населения и хозяйство мира, 10 / А.П. Кузнецов. – М., 1997.

Лопух, П.С. Гідраграфія Беларусі: вучэб. дапам. для студ. / П.С. Лопух. – Мінск: БДУ, 2004.

Максаковский, В.П. Географическая картина мира: в 2 кн. / В.П. Максаковский. – М., 2004.

Максаковский, В.П. Географическая культура / В.П. Максаковский. – М., 1998.

Машбиц, Я.Г. Комплексное страноведение / Я.Г. Машбиц. – Смоленск, 1998.

Мешечко, Е.Н. Основы экологии / Е.Н. Мешечко [и др.]. – Минск, 2002.

Мяшэчка, Я.М. Вучэбныя экскурсіі і палявыя практыкумы па геаграфіі / Я.М. Мяшэчка. – Мінск: Народная асвета, 1997.

Никитина, Н.А. Поурочные разработки по географии (материки, океаны, народы и страны), 7 класс / Н.А. Никитина. – М.: ВАКО, 2005.

Пикулик, В.В. Начальный курс географии в 6 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / В.В. Пикулик. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Пирожник, И.И. География Мирового океана: учеб. пособие для студентов вузов / И.И. Пирожник, Г.Я. Рылюк, Я.К. Еловичева. – Минск: ТетраСистемс, 2006.

Основы геологии Беларуси / под ред. А.С. Махнача [и др.]. – Минск, 2004.

Прогноз изменения окружающей природной среды Беларуси на 2010–2020 гг. / под ред. В.Ф. Логинова. – Минск, 2004.

Рылюк, Г.Я. Вслед за героями книг по материкам и странам / Г.Я. Рылюк, С.А. Глушакова. – Минск, 2003.

Сідор, С.І. Геаграфія Беларусі ў пытаннях і адказах: вучэб. дапам. для вучняў 9-га класа / С.І. Сідор, П.С. Лопух, Г.С. Смалякоў. – Мінск: Народная асвета, 1998.

Сиротин, В.И. Самостоятельные и практические работы по географии (VI–X кл.) / В.И. Сиротин. – М., 1997.

Смоліч, А. Геаграфія Беларусі / А. Смоліч. – 4-е выд. – Мінск, 1993.

Состояние природной среды Беларуси / под общ. ред. В.Ф. Логинова. – Минск, 2005.

Стреха, Н.Л. Географии материков и стран в 9 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общего среднего образования / Н.Л. Стреха, Н.В. Науменко. – Минск, 2012.

Харитонова, Т.Н. Пособие по общей географии / Т.Н. Харитонова. – Минск: Экоперспектива, 2003.

Хрестоматия по физической географии Белоруссии / под ред. О.Ф. Якушко. – Минск, 1990.

Хрестоматия по экономической географии Белоруссии / под ред. О.Ф. Якушко. – Минск, 1991.

Чырвоная кніга Беларусі. – 3-е выд. – Мінск, 2004, 2005.

Шарухо, И.Н. География Беларуси в 10 классе: учеб.-метод. пособие для учителей общеобразовательных учреждений / И.Н. Шарухо, Т.Н. Илькевич. – Минск: Народная асвета, 2008.

Экономическая и социальная география мира: книга для учителя, 10 кл. / сост. А.П. Кузнецов. – М., 2000.

Элькин, Г.Н. Экономическая и социальная география мира, 10 кл.: метод. пособие / Г.Н. Элькин. – СПб., 2003.

Якубович, Ж.М. Уроки географии в 7 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Ж.М. Якубович; под ред. И.П. Галая. – Минск, 2012.

Для учащихся

Аганбегян, А.Г. Что? Где? Почему? // Школьникам об экономике / А.Г. Аганбегян, Д.Д. Москвин. – М.: Просвещение, 1981.

Ананьев, Е.И. Социально-экономическая география / Е.И. Ананьев. – Ростов н/Д: Феникс, 2006.

Большой иллюстрированный справочник: Страны и континенты. – М.: Махаон, 2005.

Брансден, Д. Неспокойный ландшафт / Д. Брансден, Дж. Дорнкемп. – М.: Мир. – 1981.

Величайшие чудеса света: энциклопедический словарь. – М.: Вече, 2007.

Вершинский, Н.В. Загадки океана / Н.В. Вершинский. – М.: Педагогика, 1989.

Владимиров, А.В. Рассказы об атмосфере / А.В. Владимиров. – М.: Просвещение, 1981.

Географические открытия. – М.: Махаон, 2008.

Гладкий, Ю.Н. Дайте планете шанс! / Ю.Н. Гладкий, С.Б. Лавров. – М.: Просвещение, 1995.

Горохов, В.А. По национальным паркам мира / В.А. Горохов, С.С. Вишневская. – М.: Просвещение, 1993.

Грицкевич, В.П. Путешествие наших земляков / В.П. Грицкевич. – Минск, 1968.

Забелин, И.М. Мудрость географии / И.М. Забелин. – М.: Просвещение, 1986.

Залогин, Б.С. Океаны / Б.С. Залогин. – М.: Просвещение, 1996.

Израэль, Ю.А. Берегите биосферу / Ю.А. Израэль, Ф.Я. Ровинский. – М.: Педагогика, 1987.

Константинова, С.С. Этнология / С.С. Константинова. – Ростов н/Д, 2005.

Краткий геологический словарь для школьников. – М.: Недра, 1989.

Куприн, А.М. Занимательная картография / А.М. Куприн. – М: Просвещение, 1989.

Куприн, А.М. Слово о карте / А.М. Куприн. – М.: Недра, 1987.

Кусков, А.С. Экономическая география в вопросах и ответах: учеб. пособие / А.С. Кусков. – М., 2005.

Лазаревич, К.С. Тематический словарь-справочник по географии / К.С. Лазаревич, Ю.Н. Лазаревич. – М.: Моск. лицей, 1995.

Лесненко, В.К. Мир озер / В.К. Лесненко. – М.: Просвещение, 1989.

Мир географии. – М.: Мысль, 1984.

Михеев, А.В. Охрана природы / А.В. Михеев [и др.]. – М.: Просвещение, 1990.

Муранов, А.П. Волшебный и грозный мир природы / А.П. Муранов. – М.: Просвещение, 1994.

Народы мира. Историко-географический справочник. – М.: Советская энциклопедия, 1988.

Пармузин, Ю.П. Живая география / Ю.П. Пармузин. – М.: Просвещение, 1993.

Пармузин, Ю.П. Словарь по физической географии / Ю.П. Пармузин, Г.В. Карпов. – М.: Просвещение, 1994.

Пивоварова, Г.П. За страницами учебника географии: кн. для чтения по физической географии. 6 кл. / Г.П. Пивоварова – М.: Просвещение, 1997.

Пивоварова, Г.П. Занимательная география / Г.П. Пивоварова. – М.: Просвещение, 1997.

Популярная экономическая энциклопедия. – М.: Большая российская энциклопедия, 2001.

Поспелов, Е.М. Школьный топонимический словарь / Е.М. Поспелов. – М.: Просвещение, 1988.

Розанов, Б.Г. Живой покров Земли / Б.Г. Розанов. – М.: Педагогика, 1984.

Сенкевич, Ю.А. Их позвал горизонт / Ю.А. Сенкевич. – М.: Мысль, 1987.

Сергеева, К.П. За страницами учебника географии: кн. для чтения учащихся 8–9 кл. / К.П. Сергеева. – М.: Просвещение, 1997.

Уильямс, Л. Науки о Земле / Л. Уильямс; пер. с англ. – М.: ЭКСМО, 2009.

Улицкий, Ю.А. Океан надежд / Ю.А. Улицкий. – М.: Просвещение, 1983.

Флинт, Е.В. Редкие и исчезающие растения / Е.В. Флинт, М.В. Черкасова. – М., 1985.

Хрестоматия по географии материков и океанов. – М.: Просвещение, 1987.

Юдасин, Л.С. Путешествие вглубь Земли / Л.С. Юдасин. – М.: Просвещение, 1987.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Геаграфія» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

ГЕАГРАФІЯ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні.

Пры вывучэнні геаграфіі Беларусі ў вучняў фарміруецца геаграфічны вобраз сваёй краіны ва ўсёй яе разнастайнасці і цэласнасці. Змест напоўнены звесткамі пра геаграфічныя даследаванні краіны. Вывучаюцца прыродныя ўмовы і рэсурсы, асаблівасці структуры гаспадаркі, дынамікі і ўмовы жыцця насельніцтва, экалагічныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы, прыродна-гаспадарчы патэнцыял і эканамічныя сувязі розных рэгіёнаў рэспублікі і краіны ў цэлым.

Галоўная **мэта** – фарміраванне ў вучняў сістэмных ведаў аб месцы Беларусі ў сусветным згуртаванні, прыродных асаблівасцях, прыродна-рэсурсным, сацыяльна-

дэмаграфічным і вытворчым патэнцыяле краіны, асновах яе далейшага ўстойлівага развіцця.

Асноўныя **задачы** – фарміраванне ў вучняў праз геаграфічныя веды:

геаграфічнага разумення асаблівасцей геаграфічнага і геапалітычнага становішча тэрыторыі Беларусі;

разумення ролі Беларусі як суб'екта сусветнай геаграфічнай прасторы; уяўлення аб тэрытарыяльнай арганізацыі Беларусі;

разумення геаграфічных аспектаў сучасных сацыяльна-эканамічных праблем Рэспублікі Беларусь;

уяўленняў аб асаблівасцях практыкі прыродакарыстання, працэсу нарастання экалагічных праблем у межах асобнай дзяржавы;

практычных ведаў і навыкаў самастойнай работы, якія садзейнічаюць адаптацыі і сацыяльна-адказным паводзінам у грамадстве;

грамадзянскасці і патрыятызму, павагі да культуры і гісторыі сваёй краіны і народаў, якія насяляюць яе.

Вучэбнай праграмай прадугледжваецца правядзенне практычных работ. Асобныя практычныя работы праводзяцца на вучэбных занятках падагульняльнага паўтарэння. Выніковыя практычныя работы пазначаны зорачкай. У праграме прадугледжаны рэзерв часу. Вылучаны патрабаванні да вынікаў навучання з улікам іх зместу і ўзроставых фізіялагічных асаблівасцей вучняў. Геаграфічная наменклатура пералічваецца ў патрабаваннях пры вывучэнні новага матэрыялу.

Павышаны ўзровень вывучэння геаграфіі накіраваны на развіццё пазнавальных інтарэсаў, інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў, фарміраванне цэласнай сістэмы геаграфічных ведаў, яе сістэмнай арганізацыі, асваенне ведаў і спосабаў дзейнасці, якія складаюць аснову для асобаснага самаразвіцця.

Вучэбная праграма павышанага ўзроўню поўнасцю ўключае ўсе раздзелы і тэмы, вывучаемыя на базавым ўзроўні. Узроўні адрозніваюцца паміж сабой глыбінёй вывучаемага матэрыялу і зместам, што дасягаецца дыферэнцаваннем практычнай часткі, а таксама дадатковым увядзеннем у вучэбную праграму павышанага ўзроўню вучэбнага матэрыялу.

У праграме пазначаны асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў. Асноўная частка вучэбнай праграмы складаецца з трох кампанентаў: ведавага (уяўленні і веды), практычнага (уменні) і аператыўнага (вопыт дзейнасці).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(105 гадзін)

Уводзіны (1 гадзіна)

Месца геаграфіі Беларусі ў развіцці геаграфічных ведаў аб Зямлі. Цэнтральнае становішча Беларусі ў Еўропе.

Т э м а 1
Геаграфічнае становішча і даследаванні Беларусі (9 гадзін)

Велічыня, канфігурацыя тэрыторыі. Ацэнка фізіка-, эканоміка- і палітыка-геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя межы, ацэнка іх транспартнага значэння.

Фарміраванне тэрыторыі Беларусі. Гісторыя адміністрацыйнага падзелу. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.

Асноўныя этапы развіцця геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічныя даследаванні на дарэвалюцыйным этапе (да 1918 г.). Картаграфічнае адлюстраванне тэрыторыі. Пачатак сістэматычных назіранняў. Экспедыцыйнае вывучэнне Беларусі. Апісанне асобных рэгіёнаў у працах А.Кіркора і інш.

Развіццё геаграфічных даследаванняў на даваенным этапе (1919–1941 гг.). Працы А.Смоліча і іх значэнне для развіцця геаграфіі. Асаблівасці геолага-геамарфалагічных, гідралагічных, кліматычных, глебавых даследаванняў; эканоміка-геаграфічныя даследаванні.

Найважнейшыя кірункі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе. Уклад у сучасныя геаграфічныя даследаванні В.А.Дзяменцьева, С.А.Польскага, В.П.Якушка і іншых даследчыкаў. Картаграфаванне тэрыторыі Беларусі на сучасным этапе. Роля геаграфіі ў вырашэнні сучасных гаспадарчых задач.

Уклад выхадцаў з Беларусі ў даследаванні блізкага і далёкага замежжа. Значэнне для геаграфіі даследаванняў Н.-К.Радзівіла (Сіроткі), С.Русецкай, А.Сапегі, І.Ходзькі, М.Врончанкі, І.Гашкевіча, Ю.Нямцэвіча, І. Дамейкі, К.Ельскага, Н.Судзілоўскага і інш. Уклад у даследаванне Расійскай Імперыі і СССР Я.Чэрскага, Д.Паўлуцкага, І.Казырэўскага, Ю.Копаця, Т.Зана, А.Янушкевіча, Б.Дыбоўскага, Т.Аўгусціновіча, А.Бялыніцкага-Бірулі, К.Валасовіча, А. і Б.Вількіцкіх, О.Шмідта і інш.

Геаграфічныя назвы Беларусі. Тапонімы. Групоўка назваў рэк і азёр, населеных пунктаў і іншых геаграфічных аб’ектаў. Фактары паходжання тапонімаў. Айконімы, гідронімы, аронімы сваёй мясцовасці.

Практычныя работы

1. Ацэнка геаграфічнага становішча Рэспублікі Беларусь.
2. Ацэнка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі.

Асноўныя паняцці: *фізіка-геаграфічнае, палітыка-геаграфічнае, эканоміка-геаграфічнае становішча, глыбіня тэрыторыі, геаграфічны цэнтр, тапонім, айконім, гідронім, аронім.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: асаблівасці геаграфічнага становішча Беларусі; плошчу, працягласць тэрыторыі Беларусі з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход; асноўныя этапы развіцця геаграфіі ў Беларусі, найважнейшыя кірункі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе, імёны вучоных – даследчыкаў краіны і выхадцаў з Беларусі, якія ўнеслі ўклад у геаграфічнае даследаванне блізкага і далёкага замежжа;

умець:

паказваць краіны, з якімі мяжуе Беларусь; вобласці і адміністрацыйныя раёны Беларусі; раёны экспедыцыйных даследаванняў;

характарызаваць асаблівасці дзяржаўных межаў з суседнімі краінамі; уклад у геаграфічныя даследаванні вядучых вучоных Беларусі;

валодаць уменнем:

тлумачыць і *ацэньваць* значэнне і магчымасці выкарыстання геаграфічнага становішча Беларусі для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Т э м а 2
Прыродныя ўмовы і рэсурсы Беларусі (26 гадзін)

Геалагічная будова. Размяшчэнне тэрыторыі Беларусі на Усходне-Еўрапейскай платформе.

Геахраналагічная шкала. Асаблівасці геалагічнага развіцця тэрыторыі ў розныя геалагічныя перыяды. Фарміраванне і будова крышталічнага падмурка. Буйнейшыя тэктанічныя структуры і іх характарыстыка. Тэктанічныя разломы падмурка і платформавага чахла.

Асаблівасці фарміравання платформавага чахла. Геалагічныя працэсы і іх уплыў на асаблівасці ападканакаплення на розных этапах утварэння чахла. Адклады верхняга пратэразою, палеазою, мезазою, кайназою і асобных геалагічных перыядаў.

Фарміраванне тэрыторыі ў чацвярцічным перыядзе. Мацерыковыя абледзяненні і міжледавікоўі. Межы і асаблівасці фарміравання гарызонтаў.

Карысныя выкапні. Класіфікацыя карысных выкапняў.

Агульная ацэнка мінеральных рэсурсаў. Гаручыя карысныя выкапні. Асаблівасці фарміравання і залягання. Нафтагазаносныя вобласці, буравугальныя і сланцавыя басейны. Радовішчы торфу.

Металічныя карысныя выкапні. Жалезныя руды. Руды каляровых і рэдкіх металаў. Неметалічныя карысныя выкапні. Горна-хімічная сыравіна і сыравіна для будаўнічых матэрыялаў. Калійныя і каменныя солі. Даламіты, фасфарыты, мел і мергель, гіпс, трэпел і іншыя віды горна-хімічнай сыравіны. Гліны, шкляныя і фармовачныя пяскі, будаўнічыя пяскі, пясчана-гравійныя сумесі, будаўнічы камень і іншыя віды будаўнічых матэрыялаў. Вадкія карысныя выкапні. Прэсныя падземныя і мінеральныя воды. Асаблівасці іх залягання.

Рэльеф. Будова паверхні. Фактары фарміравання рэльефу. Генетычныя тыпы рэльефу.

Асноўныя ўзвышшы, раўніны і нізіны, іх размяшчэнне, умовы ўтварэння, характарыстыка. Морфаметрычныя паказчыкі. Уплыў дзейнасці чалавека на змяненне рэльефу. Гаспадарчае значэнне рэльефу.

Клімат і кліматычныя рэсурсы. Агульныя рысы клімату Беларусі. Характарыстыка асноўных кліматычных элементаў. Сонечная радыяцыя і радыяцыйны баланс. Паветраныя масы і атмасферная цыркуляцыя. Цеплавы рэжым. Вільготнасць паветра, воблачнасць і ападкі. Туманы і іншыя метэаралагічныя з’явы. Снежнае покрыва і асаблівасці яго залягання.

Поры года і іх асаблівасці. Асноўныя феналагічныя з’явы. Кліматычныя рэсурсы. Сучасныя змены клімату. Адмоўныя і станоўчыя вынікі змянення клімату для гаспадарчага комплексу Беларусі. Уплыў змянення клімату на гаспадарчую дзейнасць.

Паверхневыя і падземныя воды. Рачная сетка. Басейны галоўных рэк. Сцёк, гідралагічны рэжым рэк, тып жыўлення. Гідралагічная характарыстыка буйнейшых рэк, іх гаспадарчае значэнне. Каналы.

Азёры і вадасховішчы, іх размяшчэнне. Азёрныя групы і азёрнасць. Тыпы азёрных катлавін па паходжанні. Ледавіковыя, карставыя, рэшткавыя і старычныя азёрныя катлавіны. Асаблівасці распаўсюджвання. Балоты і іх тыпы. Верхавыя, нізінныя і пераходныя балоты. Ацэнка водных рэсурсаў. Рэгіянальныя асаблівасці водазабеспячэння.

Глебы. Фактары глебаўтварэння: глебаўтваральныя пароды, рэльеф, клімат, расліннасць, дзейнасць мікра- і макраарганізмаў, гаспадарчая дзейнасць чалавека. Працэсы глебаўтварэння: дзярновы, падзолісты, балотны, буразёмны, карбанатна-саланчаковы. Асноўныя тыпы глеб, іх уласцівасці і распаўсюджванне. Антрапагенныя глебы.

Зямельныя рэсурсы, іх структура і выкарыстанне. Ацэнка зямельных рэсурсаў. Праблемы выкарыстання зямельных рэсурсаў. Меліярацыя глеб: станоўчыя і адмоўныя вынікі.

Расліннасць. Фарміраванне расліннага покрыва. Сучасны склад флоры. Асноўныя тыпы расліннасці. Занальная і азанальная расліннасць. Лясная расліннасць. Характарыстыка тыпаў лесу. Размяшчэнне і відавы склад лясоў. Лясістасць тэрыторыі і яе змяненне.

Лугавая расліннасць. Поймавыя і пазапоймавыя лугі, іх размяшчэнне і гаспадарчае значэнне. Балотная расліннасць. Хмызняковая расліннасць. Расліннасць вадаёмаў. Гаспадарчае выкарыстанне і ахова расліннага свету.

Жывёльны свет. Фарміраванне і сучасны склад фаўны. Асноўныя фаўністычныя комплексы. Жывёльны свет лясоў, палёў, лугоў, балот, вадаёмаў і іх узбярэжжаў, паселішчаў чалавека. Гаспадарчае выкарыстанне жывёльнага свету.

Практычныя работы

3. Аналіз геалагічнага разрэзу па лініі А-Б карты атласа «Геаграфія Беларусі» і асаблівасцей залягання гарызонтаў платформавага чахла, звязаных з рознымі этапамі яго фарміравання.

4. Устанаўленне ўзаемасувязі паміж геалагічнай будовай, карыснымі выкапнямі і рэльефам.

5. Пабудова гіпсаметрычнага профілю.

6*. Пабудова кліматычных дыяграм, графікаў, ружы вятроў для бліжэйшай да вашага населенага пункта метэаралагічнай станцыі і іх аналіз.

7. Дынаміка асноўных кліматычных паказчыкаў.

8. Выяўленне асаблівасцей гідраграфіі Беларусі.

9. Выяўленне асаблівасцей распаўсюджвання розных тыпаў расліннасці.

Асноўныя паняцці: *антэкліза*, *сінекліза*, *прагін*, *упадзіна*, *выступ*, *седлавіна*, *тэктанічны разлом*, *геахраналагічная шкала*, *геалагічная эра*, *геалагічны перыяд*, *марская трансгрэсія*, *абледзяненне*, *астраблема*, *міжледавікоўе; генетычны тып чацвярцічных адкладаў*, *генетычны тып рэльефу*, *марэнныя адклады*, *водна-ледавіковыя адклады*, *азёрна-ледавіковыя адклады*, *азёрна-алювіяльныя адклады*, *лёсападобныя адклады*, *эолавыя адклады*, *камавы масіў*, *озы; прамая*, *рассеяная і сумарная сонечная радыяцыя*, *радыяцыйны баланс*, *вегетацыйны перыяд*, *безмарозны перыяд*, *агракліматычныя рэсурсы*, *парніковы эфект; гушчыня рачной сеткі*, *рачны сцёк*, *гідралагічны рэжым*, *ледавіковыя*, *карставыя*, *суфазійныя*, *рэшткавыя*, *старычныя азёрныя катлавіны*, *сажалка; фактар глебаўтварэння*, *працэс глебаўтварэння*, *мацярынская парода*, *аўтаморфныя*, *паўгідраморфныя*, *гідраморфныя глебы*, *працэсы эрозіі*, *дэфляцыя*, *сельскагаспадарчыя ўгоддзі*, *меліярацыйная неўладкаванасць; тып расліннасці*, *інтрадуцыраваныя расліны*, *лясістасць*, *поймавыя і пазапоймавыя лугі*, *сухадольныя лугі*, *верхавыя*, *нізінныя і пераходныя балоты*, *раслінныя згуртаванні; фаўністычны комплекс.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: асаблівасці тэктанічнай і геалагічнай будовы Беларусі; генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў і рэльефу; агульныя рысы клімату; тыпы жыўлення рэк; тыпы азёрных катлавін і азёр; асноўныя фактары і працэсы глебаўтварэння, тыпы глеб; асноўныя тыпы расліннасці і асаблівасці іх размяшчэння па тэрыторыі Беларусі;

умець:

паказваць тэктанічныя структуры: Руская пліта, Валына-Азоўская пліта, Украінскі шчыт, Беларуская антэкліза, Варонежская антэкліза, Аршанская ўпадзіна, Брэсцкая ўпадзіна, Прыпяцкі прагін, Латвійская седлавіна, Жлобінская седлавіна, Брагінска-Лоеўская седлавіна, Палеская седлавіна, Мікашэвіцка-Жыткавіцкі выступ; *радовішчы карысных выкапняў*: нафты – Рэчыцкае, Асташкавіцкае; бурага вугалю – Жыткавіцкае, Брынёўскае, Танежскае, Лельчыцкае; гаручых сланцаў – Тураўскае, Любанскае; жалезных руд – Акалоўскае, Навасёлкаўскае; калійных солей – Старобінскае, Петрыкаўскае, Кастрычніцкае; каменнай солі – Мазырскае, Давыдаўскае, Старобінскае; даламітаў – Руба; мелу і мергелю – Камунарскае, Каменка, Калядзічы, Пясчаная Гара; глін – Гайдукоўка, Фаніпальскае, Лукомль-1, Заполле; будаўнічага каменю – Мікашэвіцкае, Глушкавіцкае; гіпсу – Брынёўскае; трэпелу – Стальное; фасфарытаў – Мсціслаўскае, Лабковіцкае; шкляных і фармовачных пяскоў – Ленінскае, Гараднянскае, Чацверня; кааліну – Дзедаўскае; *элементы рэльефу*: Беларуская, Браслаўскія, Мазырская, Свянцянскія, Капыльская грады; Аршанскае, Ашмянскае, Ваўкавыскае, Віцебскае, Гарадоцкае, Гродзенскае, Мінскае, Навагрудскае ўзвышшы; Аршанска-Магілёўская, Лідская, Прыбугская, Цэнтральнабярэзінская, Нарачана-Вілейская раўніны, Загароддзе; Нёманская, Палеская, Полацкая, Прыдняпроўская нізіны; рэкі: Дняпро, Бярэзіна, Заходняя Дзвіна, Заходні Буг, Нёман, Прыпяць, Сож, Вілія, Пціч, Шчара, Гарынь, Убарць, Ясельда, Ловаць, Мухавец, Лясная, Свіслач, Друць, Дзісна; *азёры*: Нарач, Асвейскае, Чырвонае,

Лукомльскае, Дрывяты, Доўгае, Рычы, Гінькава, Воласа Паўднёвае, Свіцязь; *вадасховішчы*: Вілейскае, Заслаўскае, Любанскае, Асіповіцкае, Чыгірынскае, Салігорскае, Чырвонаслабодскае, Лактышы; *каналы*: Дняпроўска-Бугскі, Агінскі, Аўгустоўскі; Вілейска-Мінская водная сістэма, Бярэзінская водная сістэма;

характарызаваць асаблівасці фарміравання крышталічнага падмурка і платформавага чахла; генетычныя тыпы рэльефу; размеркаванне кліматычных паказчыкаў і асаблівасці сезонаў года; асаблівасці размеркавання і выкарыстання паверхневых і падземных вод; уласцівасці асноўных тыпаў глеб, структуру зямельных рэсурсаў; сучасны склад флоры і фаўны, размяшчэнне і гаспадарчае значэнне асноўных тыпаў расліннасці;

валодаць уменнем:

тлумачыць залежнасць фарміравання платформавага чахла ад тэктанічнай будовы; сувязь карысных выкапняў з геалагічнай і тэктанічнай будовай; змяненні асноўных кліматычных элементаў у залежнасці ад геаграфічных фактараў; залежнасць гідралагічных паказчыкаў ад клімату і рэльефу;

вызначаць забяспечанасць тэрыторыі прыроднымі рэсурсамі: мінеральнымі, агракліматычнымі, воднымі, зямельнымі, біялагічнымі;

разлічваць каэфіцыент увільгатнення, гадавую амплітуду тэмператур, ухіл ракі, адносныя перавышэнні;

будаваць графікі ходу асноўных кліматычных паказчыкаў, ружу вятроў.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Т э м а 3
Геаграфічныя ландшафты. Экалагічныя праблемы (8 гадзін)

Геаграфічныя ландшафты. Узаемасувязі прыродных кампанентаў і фарміраванне прыродных комплексаў. Распаўсюджанне асноўных прыродных ландшафтаў. Асноўныя роды ландшафтаў Беларусі і іх характарыстыка. Дамінантныя, тыповыя і рэдкія прыродныя ландшафты.

Антрапагенныя ландшафты: сельскагаспадарчыя, лесагаспадарчыя, воднагаспадарчыя, горнапрамысловыя, рэкрэацыйныя. Ступень змянення прыродных ландшафтаў.

Асваенне тэрыторыі і яго віды: прамысловае, сельскагаспадарчае, транспартнае, рэкрэацыйнае. Ёмістасць тэрыторыі. Прыродна-рэсурсны патэнцыял.

Ахова прыроды. Экалагічныя праблемы выкарыстання прыродных рэсурсаў. Сетка асноўных прыродаахоўных тэрыторый. Запаведнікі, прыродныя нацыянальныя паркі, заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння. Чырвоная кніга Беларусі. Перспектывы стварэння адзінай экалагічнай сеткі.

Рэкрэацыйныя рэсурсы і іх ацэнка. Зоны адпачынку і курорты. Турысцкія комплексы і маршруты. Перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.

Антрапагеннае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Асноўныя экалагічныя праблемы Беларусі. Забруджанне тэрыторыі радыенуклідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Праблемы Палесся, Салігорскага горнапрамысловага раёна.

Лакальныя праблемы забруджання атмасфернага паветра, паверхневых і падземных вод, глеб у выніку гаспадарчай дзейнасці. Дэградацыя глеб. Накапленне адходаў.

Практычныя работы

10. Экспертыза прыродна-рэсурснага патэнцыялу.

11*. Параўнальная характарыстыка асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Беларусі (на прыкладзе 2–3).

***Асноўныя паняцці**: клас, тып, падтып, від ландшафта, прыродны ландшафт, антрапагенны ландшафт, эканамічна актыўная тэрыторыя, ёмістасць тэрыторыі,*

рэкрэацыйныя рэсурсы, зона адпачынку, курортная мясцовасць, турыстычны комплекс, турысцка-экскурсійны маршрут, экалагічная сетка, помнік прыроды, Чырвоная кніга.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: тыпы прыродаахоўных тэрыторый і аб'ектаў; асноўныя геаэкалагічныя праблемы; тыпы і роды ландшафтаў, віды асваення тэрыторыі; рэкрэацыйныя аб'екты тэрыторыі;

умець:

паказваць запаведнікі: Бярэзінскі біясферны, Палескі радыяцыйна-экалагічны; *нацыянальныя паркі:* Белавежская пушча, Браслаўскія азёры, Нарачанскі, Прыпяцкі; *заказнікі:* Асвейскі, Ельня, Казьянскі, Налібоцкі, Выганашчанскае, Свіцязянскі;

характарызаваць асноўныя экалагічныя праблемы; асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі;

валодаць уменнем:

тлумачыць сутнасць геаэкалагічных праблем і перспектывы пашырэння сеткі прыродаахоўных аб'ектаў; узаемасувязі прыродных кампанентаў.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Т э м а 4
Прыроднае раяніраванне Беларусі (6 гадзін)

Сутнасць прыроднага раяніравання і яго віды: геамарфалагічнае, агракліматычнае, гідралагічнае, геабатанічнае, глебава-геаграфічнае. Фізіка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі. Правінцыі, акругі, фізіка-геаграфічныя раёны.

Беларуская Паазерская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Уплыў апошняга ледавіка на фарміраванне прыродных комплексаў правінцыі. Азёрнасць тэрыторыі. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Заходне-Беларуская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Шырокае распаўсюджанне ўзвышшаў. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Усходне-Беларуская правінцыя. Геаграфічнае становішча. Распаўсюджанне платападобных раўнін з лёсамі і іх уплыў на прыродныя комплексы. Асаблівасці клімату, глеб і расліннасці.

Перадпалеская правінцыя. Геаграфічнае становішча. Пераходны характар ландшафтаў правінцыі ад узгорыстых да нізінных. Асаблівасці прыроды правінцыі. Прыродаахоўныя тэрыторыі.

Палеская правінцыя. Геаграфічнае становішча і асаблівасці прыроды. Раўнінны характар паверхні, шырокае распаўсюджанне балот, асаблівасці расліннасці. Прыродаахоўныя тэрыторыі. Экалагічныя праблемы.

Практычная работа

12*. Фізіка-геаграфічная характарыстыка прыроды сваёй мясцовасці на падставе краязнаўчых матэрыялаў і іншых крыніц (выконваецца на ўроку вывучэння сваёй правінцыі).

Асноўныя паняцці: *прыроднае раяніраванне, фізіка-геаграфічнае раяніраванне, правінцыя, акруга, фізіка-геаграфічны раён*.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: віды прыроднага раяніравання і асноўныя адзінкі фізіка-геаграфічнага раяніравання;

умець:

паказваць правінцыі: Беларускую Паазерскую, Заходне-Беларускую, Усходне-Беларускую, Перадпалескую правінцыю, Палескую правінцыю;

характарызаваць асаблівасці прыроды фізіка-геаграфічных правінцый і акруг па плане, карыстаючыся картаграфічным матэрыялам і тэкстам вучэбнага дапаможніка, дадатковым матэрыялам;

валодаць уменнем:

тлумачыць сутнасць прыроднага раяніравання;

вызначаць крытэрыі, пакладзеныя ў аснову выдзялення фізіка-геаграфічных адзінак рознага рангу.

Т э м а 5
Насельніцтва (6 гадзін)

Дынаміка колькасці насельніцтва і яго ўзростава-палавая структура. Натуральны рух насельніцтва. Міграцыі.

Асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва. Гісторыка-этнакультурныя рэгіёны Беларусі і іх характарыстыка: Паазер'е, Падняпроўе, Панёманне, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе, Цэнтральная Беларусь.

Працоўныя рэсурсы і іх ацэнка. Рынак працы. Працарэсурсны баланс. Занятасць насельніцтва. Праблемы занятасці працоўных рэсурсаў.

Размяшчэнне насельніцтва на тэрыторыі краіны. Шчыльнасць насельніцтва. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на рассяленне насельніцтва. Тыпы паселішчаў: гарадскія і сельскія. Урбанізацыя і роля гарадоў у сістэме рассялення. Геаграфічныя асаблівасці гарадскога рассялення краіны. Функцыянальныя тыпы гарадскіх паселішчаў. Гарады-спадарожнікі.

Сельскае рассяленне. Сучасныя катэгорыі сельскіх паселішчаў і іх трансфармацыя. Аграгарадкі.

Практычная работа

13. Пабудова дыяграм узростава-палавой структуры насельніцтва Беларусі і яе аналіз.

Асноўныя паняцці: *рынак працы*, *эканамічна актыўнае насельніцтва*, *узровень беспрацоўя*, *сістэма рассялення*, *аграгарадок.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

ведаць: асноўныя элементы матэрыяльнай і духоўнай культуры;

умець:

паказваць Брэст, Баранавічы, Пінск, Кобрын, Віцебск, Наваполацк, Полацк, Оршу, Гомель, Мазыр, Жлобін, Рэчыцу, Светлагорск, Гродна, Ліду, Слонім, Магілёў, Бабруйск, Мінск, Барысаў, Салігорск, Жодзіна, Маладзечна, Слуцк;

характарызаваць асаблівасці размяшчэння насельніцтва, яго натуральнага і механічнага руху, узростава-палавую структуру, тыпы рассялення;

валодаць уменнем:

разлічваць па статыстычных даных сяроднюю шчыльнасць насельніцтва;

вызначаць праблемы малых і сярэдніх гарадоў, перспектывы развіцця буйных гарадоў;

прагназаваць асноўныя кірункі дэмаграфічнага развіцця краіны.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Т э м а 6
Агульная характарыстыка гаспадаркі (4 гадзіны)

Умовы і фактары размяшчэння вытворчасці (тэрыторыя, прыродна-рэсурсны патэнцыял, эканоміка-геаграфічнае становішча, насельніцтва і працоўныя рэсурсы, транспартная дзейнасць, складзіраванне, інфармацыя і сувязь, навуковая і тэхнічная дзейнасць, экалагічныя ўмовы, дзяржаўная палітыка).

Спецыялізацыя гаспадаркі Беларусі. Формы арганізацыі вытворчасці: кааперaванне і камбінаванне. Эканамічныя паказчыкі эфектыўнасці вытворчасці (сабекошт, рэнтабельнасць, прыбытак).

Сучасная структура гаспадаркі краіны. Від эканамічнай дзейнасці. Структура гаспадаркі па відах эканамічнай дзейнасці. Сфера вытворчасці. Структура прамысловасці. Здабываючая і апрацоўчая прамысловасць. Структура апрацоўчай прамысловасці. Сфера паслуг. Інфраструктура.

Тэрытарыяльная структура гаспадаркі. Важнейшыя эканамічныя цэнтры, вузлы і раёны Беларусі. Адміністрацыйныя вобласці і г. Мінск як буйнейшыя тэрытарыяльныя часткі гаспадаркі Беларусі. Праблемныя рэгіёны Беларусі.

Асноўныя паняцці: *структура гаспадаркі*, *від эканамічнай дзейнасці*, *рыначная эканоміка*, *спецыялізацыя*, *сабекошт*, *рэнтабельнасць*, *прыбытак*, *інфраструктура.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць:

асноўныя фактары і ўмовы размяшчэння вытворчасці, разнастайныя формы ўласнасці;

умець:

характарызаваць асноўныя праблемы і кірункі развіцця гаспадаркі;

валодаць уменнем:

будаваць дыяграму структуры гаспадаркі і аналізаваць яе;

разлічваць асноўныя эканамічныя паказчыкі;

тлумачыць узровень сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Т э м а 7
Геаграфія сферы вытворчасці (18 гадзін)

Прамысловасць. Горназдабываючая прамысловасць, яе склад, роля ў структуры гаспадаркі. Здабыча нафты і спадарожнага газу, торфу. Геаграфія здабычы карысных выкапняў для хімічнай вытворчасці і вытворчасці мінеральных угнаенняў. Праблема развіцця Салігорскага горнапрамысловага рэгіёна. Здабыча і вытворчасць солі. Здабыча карысных выкапняў для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і будаўніцтва.

Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі. Фактары размяшчэння, умовы развіцця і геаграфія вытворчасці і размеркавання электраэнергіі. Цеплавыя і гідраўлічныя электрастанцыі. Лініі электраперадачы. Нетрадыцыйныя і альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі і праблемы іх выкарыстання ў беларускай энергетыцы. Развіццё атамнай электраэнергетыкі.

Размеркаванне газападобнага паліва. Буйнейшыя газаправоды Беларусі.

Апрацоўчая прамысловасць, яе склад, асаблівасці развіцця і размяшчэння. Фактары размяшчэння і сыравінная база металургічнай вытворчасці і вытворчасці гатовых металічных вырабаў. Геаграфія прадпрыемстваў металургічнай вытворчасці і вытворчасці металічных вырабаў.

Фактары і ўмовы размяшчэння, геаграфія прадпрыемстваў па вытворчасці аўтамабіляў і аўтамабільнай тэхнікі, суднаў, чыгуначнага рухомага саставу, авіяцыйнай тэхнікі, веласіпедаў і матацыклаў.

Фактары і ўмовы размяшчэння, геаграфія вытворчасці трактароў, машын і абсталявання для сельскай і лясной гаспадаркі.

Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці электраабсталявання, электроннага і аптычнага абсталявання.

Фактары размяшчэння і ўмовы развіцця вытворчасці нафтапрадуктаў. Цэнтры нафтаперапрацоўкі. Хімічная вытворчасць, яе састаў, сыравінная база, фактары размяшчэння. Характарыстыка развіцця і размяшчэння вытворчасці мінеральных угнаенняў, штучных і сінтэтычных валокнаў, пластмас, сінтэтычнага каўчуку, фарбаў і лакаў, мыла і сродкаў для мыцця, чысткі і паліроўкі, парфюмерных і касметычных сродкаў.

Геаграфія вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі. Фактары і ўмовы размяшчэння, геаграфія вытворчасці гумавых і пластмасавых вырабаў.

Апрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з дрэва. Буйнейшыя цэнтры дрэваапрацоўкі і вытворчасці фанеры, пліт, драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных вырабаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мэблі. Фактары размяшчэння і асноўныя цэнтры цэлюлозна-папяровай вытворчасці і выдавецкай дзейнасці.

Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў, цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону.

Будаўніцтва. Геаграфія прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва. Буйнейшыя новабудоўлі Беларусі.

Тэкстыльная і швейная вытворчасць. Структура, сыравінная база. Геаграфія вытворчасці тканін, адзення, трыкатажных і панчошна-шкарпэткавых вырабаў. Сыравінная база і фактары размяшчэння вытворчасці скур, вырабаў са скуры і абутку. Буйнейшыя цэнтры гарбарнай і абутковай вытворчасці.

Вытворчасць харчовых прадуктаў. Фактары размяшчэння і геаграфія вытворчасці мяса і мясапрадуктаў, малочных прадуктаў, рыбы і рыбных прадуктаў, алеяў, прадуктаў мукамольна-крупяной прамысловасці, цукру.

Сельская гаспадарка, паляванне і лясная гаспадарка. Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны. Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў. Геаграфія раслінаводства (збожжавай гаспадаркі, бульбаводства, агародніцтва, садаводства, вырошчвання тэхнічных культур).

Геаграфія жывёлагадоўлі (гадоўлі буйной рагатай жывёлы, свінагадоўлі, авечкагадоўлі, конегадоўлі, птушкагадоўлі, зверагадоўлі, пчалярства).

Структура і роля лясной гаспадаркі ў эканоміцы краіны (лесаводства і лесанарыхтоўкі, збор дзікарослых грыбоў, ягад і лекавых траў). Геаграфія лесанарыхтовак. Паляванне і развядзенне дзічыны. Геаграфія самых буйных паляўнічых угоддзяў краіны.

Рыбалоўства і рыбаводства. Буйнейшыя рыбныя гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі.

Практычныя работы

14. Пабудова картасхемы «Фактары размяшчэння і геаграфія прамысловай вытворчасці» і яе аналіз (на выбар па адным з відаў эканамічнай дзейнасці).

15. Нанясенне на контурную карту раёнаў вырошчвання лёну і цукровых буракоў і аналіз размяшчэння вытворчасці льновалакна і цукру.

16. Пабудова схемы «Міжвытворчыя сувязі аднаго з відаў эканамічнай дзейнасці» (на выбар).

Асноўныя паняцці: *горназдабываючая прамысловасць*, *апрацоўчая прамысловасць*, *паліўна-энергетычны баланс*, *малатанажная хімія*, *структура зямельных угоддзяў.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: фактары размяшчэння відаў эканамічнай дзейнасці вытворчай сферы;

умець:

паказваць на карце буйнейшыя прамысловыя цэнтры;

характарызаваць размяшчэнне вытворчасці на тэрыторыі краіны;

валодаць уменнем:

тлумачыць прычыны ўзнікнення праблем развіцця і размяшчэння прадпрыемстваў вытворчай сферы;

прагназаваць змяненні ў размяшчэнні прадпрыемстваў вытворчай сферы.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Т э м а 8
Геаграфія сферы паслуг (6 гадзін)

Структура сферы паслуг, яе роля ў эканоміцы. Узровень развіцця сферы паслуг як індыкатар эканамічнага развіцця краіны. Асаблівасці развіцця і размяшчэння асобных відаў эканамічнай дзейнасці, якія ўтвараюць сферу паслуг.

Фактары і ўмовы развіцця транспарту і сувязі. Транспартна-камунікацыйны каркас краіны. Транспартна-лагістычная сістэма Беларусі.

Фактары развіцця і геаграфія сферы фінансавай дзейнасці. Буйнейшыя банкі і банкаўскія сістэмы Беларусі. Геаграфія гандлю Беларусі. Буйнейшыя гандлёвыя сеткі краіны.

Перадумовы і фактары развіцця турызму ў Беларусі. Турысцкія дэстынацыі і турысцка-рэкрэацыйнае раяніраванне Беларусі. Буйнейшыя турысцкія цэнтры краіны.

Геаграфія і асаблівасці развіцця сістэм адукацыі і аховы здароўя.

Навука і інавацыйная дзейнасць.

Асноўныя паняцці*: транспартная сетка, транспартны вузел, прадуктаправод, сувязь, фінансавая дзейнасць, гандаль, адукацыя, ахова здароўя.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

умець:

паказваць на карце гарады, якія з’яўляюцца буйнейшымі транспартнымі вузламі, фінансавымі цэнтрамі, а таксама гарады, у якіх знаходзяцца ўстановы вышэйшай адукацыі (універсітэты, акадэміі, інстытуты);

характарызаваць работу асобных відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг.

валодаць уменнем:

вызначаць паказчыкі і асаблівасці развіцця і размяшчэння важнейшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг;

тлумачыць прычыны тэрытарыяльных адрозненняў ва ўзроўні развіцця сферы паслуг.

Т э м а 9
Беларусь у сусветнай супольнасці (4 гадзіны)

Беларусь на палітычнай і эканамічнай картах свету. Удзел Беларусі ў міжнародных палітычных і эканамічных арганізацыях і інтэграцыйных аб’яднаннях.

Месца краіны ў міжнародным падзеле працы. Геаграфія знешняга гандлю.

Замежныя інвестыцыі і іх роля ў развіцці краіны. Свабодныя эканамічныя зоны, сумесныя і замежныя прадпрыемствы на тэрыторыі Беларусі.

Практычная работа

17. Нанясенне на контурную карту: а) свабодных эканамічных зон; б) транс’еўрапейскіх транспартных камунікацый (чыгунак, шасэ, нафта- і газаправодаў, ліній электраперадачы).

Асноўныя паняцці: *мытны саюз, інвестыцыя, міжнародны падзел працы, свабодная эканамічная зона, сумеснае прадпрыемства.*

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:

ведаць: важнейшыя міжнародныя арганізацыі, у рабоце якіх удзельнічае Беларусь;

умець:

паказваць свабодныя эканамічныя зоны Беларусі: «Мінск», «Гомель-Ратон», «Віцебск», «Магілёў», «Гродна-Інвест», «Брэст»; краіны СНД;

валодаць уменнем:

вызначаць галоўныя напрамкі знешняга гандлю.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Т э м а 10
Вобласці і горад Мінск (7 гадзін)

Брэсцкая вобласць. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і яго нацыянальны склад. Асвоенасць тэрыторыі. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі і асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Брэст, Баранавічы, Пінск, Кобрын, Лунінец.

Віцебская вобласць. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і яго рассяленне. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі і асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Рэкрэацыйны патэнцыял вобласці. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Віцебск, Орша, Наваполацк, Полацк, Глыбокае, Паставы.

Гомельская вобласць. Размяшчэнне тэрыторыі ў межах Палескай нізіны і асаблівасці прыроды. Мінеральныя і лясныя рэсурсы вобласці. Насельніцтва і асаблівасці рассялення. Экалагічныя праблемы ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС, меліярацыяй зямель, здабычай карысных выкапняў. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі і асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Гомель, Мазыр, Жлобін, Рэчыца, Светлагорск, Калінкавічы, Рагачоў.

Гродзенская вобласць. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і яго нацыянальны склад. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Развіццё атамнай энергетыкі. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Гродна, Ліда, Слонім, Смаргонь, Навагрудак, Ваўкавыск.

Магілёўская вобласць. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Асаблівасці прыродных умоў. Насельніцтва. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Магілёў, Бабруйск, Асіповічы, Крычаў, Быхаў, Горкі.

Мінская вобласць. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і асаблівасці яго рассялення. Структура прамысловасці і сельскай гаспадаркі, асаблівасці іх размяшчэння. Спецыялізацыя гаспадаркі. Буйнейшыя прамысловыя і культурныя цэнтры вобласці: Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Слуцк, Вілейка.

Мінск – сталіца Беларусі. Геаграфічнае становішча. Спецыялізацыя гаспадаркі. Буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы. Фарміраванне і праблемы развіцця Мінскай агламерацыі.

Характарыстыка свайго раёна, **горада.** Асаблівасці геаграфічнага становішча. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Насельніцтва і асвоенасць тэрыторыі. Гаспадарка раёна (горада). Славутасці населеных пунктаў або мясцовасцей.

Практычная работа

18*. Характарыстыка свайго адміністрацыйнага раёна (населенага пункта).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням н е а б х о д н а:
ведаць: адметныя асаблівасці кожнай вобласці;
умець:
паказваць галоўныя геаграфічныя аб'екты вобласці;
характарызаваць вобласці па асноўнай схеме, свой раён (горад) згодна з планам;
валодаць уменнем:
вызначаць спецыялізацыю гаспадаркі;
рабіць апісанне адметных і ўнікальных аб'ектаў;
прагназаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці.

Падагульняльнае паўтарэнне (1 гадзіна)

Рэзерв часу (3 гадзіны)

ЛІТАРАТУРА

Для настаўніка

Адзінцоў, С. Займальная геаграфія Беларусі / С. Адзінцоў, С. Сідор. – Мінск: Народная асвета, 1995.

Аношко, В.С. Олимпиады по географии / В.С. Аношко, М.Н. Брилевский, Н.Н. Ганущенко. – Минск, 2004.

Аношко, В.С. Самостоятельные и практические работы по общей географии / В.С. Аношко, Я.Н. Яцкевич. – Минск, 2004.

Баранский, Н.Н. Методика преподавания экономической географии / Н.Н. Баранский. – М., 1990.

Белая, В.Л. Общая география в 11 классе: учеб.-метод. пособие для учителей общеобразоват. учреждений / В.Л. Белая [и др.]. – Минск: Издательский центр БГУ, 2010.

Берлянт, А.М. Картография / А.М. Берлянт. – М.: Аспект пресс, 2001.

Блакітны скарб Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2007.

Галай, И.П. Пособие по географии для поступающих в вузы / И.П. Галай, Е.Н. Мешечко, С.И. Сидор. – Минск: Вышэйшая школа, 1988.

Геаграфічныя паняцці і тэрміны: Энцыклапед. слоўнік. – Мінск, 1999.

Геаграфія глебаў з асновамі глебазнаўства: падручнік для студ. геагр. спец. ВНУ / В.С. Аношка [і інш.]; пад рэд. В.С. Аношкі. – Мінск, 2000.

Географический энциклопедический словарь. – М.: Большая Российская энциклопедия, 2003.

География в диаграммах. Оксфордские учебные пособия. – М.: Астрель, 2004.

География международного туризма: страны СНГ и Балтии / авт.-сост. Л.М. Гайдукевич [и др.]. – Минск, 2004.

География: большой справочник для школьников и поступающих в вузы / И.И. Баринова [и др.]; 3-е изд., стереотип. – М.: Дрофа, 2000.

География: пособие для поступающих в вузы / В.П. Максаковский [и др.]. – М.: Дрофа, 2003.

Геология Беларуси / А.С. Махнач [и др.]. – Минск, 2001.

Гладкий, Ю.Н. Глобальная география, 11 / Ю.Н. Гладкий, С.Б. Лавров. – М., 2002.

Голубчиков, Ю.Н. География человека / Ю.Н. Голубчиков. – М., 2003.

Душина, И.В. Методика и технология обучения географии в школе /И.В. Душина, Е.А. Таможняя, В.Б. Пятунин. – М., 2002.

Дьяконов, К.Н. Современные методы географических исследований /К.Н. Дьяконов [и др.]. – М., 1996.

Жекулин, В.С. Введение в географию / В.С. Жекулин. – М., 1989.

Завьялова, Е.Б. Экономическая география в схемах и таблицах: учеб. пособие / Е.Б. Завьялова, Н.В. Радищев. – М., 2005.

Зыль, Е.А. География материков и стран. 8-й класс: пособие для учителей / Е.А. Зыль, Г.Я. Рылюк. – Мінск: Народная асвета, 2002.

Зыль, Е.А. География материков и стран в 8 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / Е.А. Зыль [и др.]. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Исаченко, А.Г. Введение в экологическую географию / А.Г. Исаченко. – СПб.: Изд-во СПбГУ, 2003.

Исаченко, А.Г. Теория и методология географической науки / А.Г. Исаченко. – М.: ACADEMA, 2004.

Кириенко, Е.Г. Социально-экономическая география Республики Беларусь / Е.Г. Кириенко. – Минск: Аверсэв, 2003.

Козьева, И.А. Экономическая география и регионалистика / И.А. Козьева, Э.Н. Кузьбожев. – М., 2005.

Коринская, В.А. География материков и океанов, 7 класс: метод. пособие / В.А. Коринская, И.В. Душина, В.А. Щенев. – М.: ДРОФА, 2002.

Кузнецов, А.П. География населения и хозяйство мира, 10 / А.П. Кузнецов. – М., 1997.

Лопух, П.С. Гідраграфія Беларусі: вучэб. дапам. для студ. / П.С. Лопух. – Мінск: БДУ, 2004.

Максаковский, В.П. Географическая картина мира: в 2 кн. / В.П. Максаковский. – М., 2004.

Максаковский, В.П. Географическая культура / В.П. Максаковский. – М., 1998.

Машбиц, Я.Г. Комплексное страноведение / Я.Г. Машбиц. – Смоленск, 1998.

Мешечко, Е.Н. Основы экологии / Е.Н. Мешечко [и др.]. – Минск, 2002.

Мяшэчка, Я.М. Вучэбныя экскурсіі і палявыя практыкумы па геаграфіі / Я.М. Мяшэчка. – Мінск: Народная асвета, 1997.

Никитина, Н.А. Поурочные разработки по географии (материки, океаны, народы и страны), 7 класс / Н.А. Никитина. – М.: ВАКО, 2005.

Пикулик, В.В. Начальный курс географии в 6 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / В.В. Пикулик. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2011.

Пирожник, И.И. География Мирового океана: учеб. пособие для студентов вузов / И.И. Пирожник, Г.Я. Рылюк, Я.К. Еловичева. – Минск: ТетраСистемс, 2006.

Основы геологии Беларуси / под ред. А.С. Махнача [и др.]. – Минск, 2004.

Прогноз изменения окружающей природной среды Беларуси на 2010–2020 гг. / под ред. В.Ф. Логинова. – Минск, 2004.

Рылюк, Г.Я. Вслед за героями книг по материкам и странам / Г.Я. Рылюк, С.А. Глушакова. – Минск, 2003.

Сідор, С.І. Геаграфія Беларусі ў пытаннях і адказах: вучэб. дапам. для вучняў 9-га класа / С.І. Сідор, П.С. Лопух, Г.С. Смалякоў. – Мінск: Народная асвета, 1998.

Сиротин, В.И. Самостоятельные и практические работы по географии (VI–X кл.) / В.И. Сиротин. – М., 1997.

Смоліч, А. Геаграфія Беларусі / А. Смоліч. – 4-е выд. – Мінск, 1993.

Состояние природной среды Беларуси / под общ. ред. В.Ф. Логинова. – Минск, 2005.

Стреха, Н.Л. Географии материков и стран в 9 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общего среднего образования / Н.Л. Стреха, Н.В. Науменко. – Минск, 2012.

Харитонова, Т.Н. Пособие по общей географии / Т.Н. Харитонова. – Минск: Экоперспектива, 2003.

Хрестоматия по физической географии Белоруссии / под ред. О.Ф. Якушко. – Минск, 1990.

Хрестоматия по экономической географии Белоруссии / под ред. О.Ф. Якушко. – Минск, 1991.

Чырвоная кніга Беларусі. – 3-е выд. – Мінск, 2004, 2005.

Шарухо, И.Н. География Беларуси в 10 классе: учеб.-метод. пособие для учителей общеобразоват. учреждений / И.Н. Шарухо, Т.Н. Илькевич. – Минск: Народная асвета, 2008.

Экономическая и социальная география мира: книга для учителя, 10 кл. / сост. А.П. Кузнецов. – М., 2000.

Элькин, Г.Н. Экономическая и социальная география мира, 10 кл.: метод. пособие / Г.Н. Элькин. – СПб., 2003.

Якубович, Ж.М. Уроки географии в 7 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Ж.М. Якубович; под ред. И.П. Галая. – Минск, 2012.

Для вучняў

Аганбегян, А.Г. Что? Где? Почему? // Школьникам об экономике / А.Г. Аганбегян, Д.Д. Москвин. – М.: Просвещение, 1981.

Ананьев, Е.И. Социально-экономическая география / Е.И. Ананьев. – Ростов н/Д: Феникс, 2006.

Большой иллюстрированный справочник: Страны и континенты. – М.: Махаон, 2005.

Брансден, Д. Неспокойный ландшафт / Д. Брансден, Дж. Дорнкемп. – М.: Мир. – 1981.

Величайшие чудеса света: энциклопедический словарь. – М.: Вече, 2007.

Вершинский, Н.В. Загадки океана / Н.В. Вершинский. – М.: Педагогика, 1989.

решать качественные, графические, расчетные задачи на определение индукции магнитного поля, индукции магнитного поля простейших систем токов (прямолинейный бесконечно длинный проводник с током, круговой виток с током, соленоид), силы Ампера, силы Лоренца и характеристик движения заряженной частицы в однородных электрическом и магнитном полях, магнитного потока, ЭДС индукции и самоиндукции, ЭДС индукции, возникающей в прямолинейном проводнике, равномерно движущемся в однородном магнитном поле, индуктивности катушки, энергии магнитного поля с использованием: закона электромагнитной индукции; принципа суперпозиции магнитных полей; формул для определения индукции магнитного поля, силы Ампера, силы Лоренца, магнитного потока, ЭДС самоиндукции, энергии магнитного поля.

6. Электрический ток в различных средах (15 ч)

Электрический ток в металлах. Зависимость сопротивления металлов от температуры. Сверхпроводимость.

Электрический ток в электролитах. Законы электролиза Фарадея.

Электрический ток в газах. Самостоятельный и несамостоятельный разряды. Плазма.

Электрический ток в полупроводниках. Собственная и примесная проводимость полупроводников. Электронно-дырочный переход. Полупроводниковый диод. Транзистор.

Демонстрации, опыты, компьютерные модели

Зависимость сопротивления металлов от температуры.

Электрический ток в электролитах. Электролиз.

Электрический разряд в газах.

Электрические свойства полупроводников.

Односторонняя электронная проводимость полупроводникового диода.

Полупроводниковые приборы.

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Учащийся д о л ж е н:

иметь представление:

о физических явлениях: сверхпроводимость;

плазме;

видах самостоятельного газового разряда и их применении;

устройстве и практическом применении транзисторов;

практическом использовании электролиза, тока в газах, проводимости металлов и полупроводников;

знать/понимать:

природу электрического тока в металлах, электролитах, газах и полупроводниках;

смысл физических понятий: температурный коэффициент сопротивления, электрохимический эквивалент вещества, собственная и примесная проводимость полупроводников;

смысл физических законов: электролиза;

электронно-дырочный переход;

принцип действия полупроводникового диода;

уметь:

описывать, объяснять физические явления: электролиз, самостоятельный и несамостоятельный газовые разряды, электронно-дырочный переход;

владеть:

практическими умениями: решать качественные задачи на проводимость различных сред, расчетные задачи с использованием зависимости сопротивления металлического проводника от температуры, законов электролиза Фарадея.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Фізіка» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

ФІЗІКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета. Каштоўнасныя арыенціры зместу вучэбнага прадмета

Значэнне вучэбнага прадмета «Фізіка» вызначаецца той роляй, якую адыгрывае фізічная навука ў жыцці сучаснага грамадства, яе ўплывам на тэмпы развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, развіццё культуры чалавека, фарміраванне сацыяльна значных арыентацый, якія забяспечваюць гарманізацыю адносін чалавека з навакольным светам.

Фізіка як навука аб найбольш агульных законах прыроды і як вучэбны прадмет уносіць істотны ўклад у сістэму ведаў пра навакольны свет. Яна раскрывае ролю навукі ў эканамічным і культурным развіцці грамадства, садзейнічае фарміраванню сучаснага навуковага светапогляду.

Для вырашэння задач фарміравання асноў навуковага светапогляду, развіцця інтэлектуальных здольнасцей і пазнавальных інтарэсаў вучняў у працэсе вывучэння фізікі асноўную ўвагу неабходна надаваць не перадачы сумы гатовых ведаў, а знаёмству з метадамі навуковага пазнання навакольнага свету, пастаноўцы праблем, якія патрабуюць ад вучняў самастойнай дзейнасці па іх вырашэнні.

Гуманітарнае значэнне фізікі як састаўной часткі агульнай сярэдняй адукацыі заключаецца ў тым, што яна садзейнічае авалоданню вучнямі навуковым метадам пазнання, які дазваляе атрымліваць аб'ектыўныя веды пра навакольны свет.

Веданне фізічных законаў неабходна для вывучэння хіміі, біялогіі, астраноміі і іншых навук.

Абавязковае вывучэнне фізікі пры асваенні вучнямі зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі абумоўлена тым фактам, што авалоданне асноўнымі фізічнымі паняццямі і законамі стала неабходным практычна кожнаму чалавеку ў сучасным жыцці.

Змест вучэбнага прадмета «Фізіка» ў X класе, канцэнтруючыся па змястоўных лініях (фізічныя метады даследавання з'яў прыроды; фізічныя аб'екты і заканамернасці ўзаемадзеяння паміж імі; фізічныя аспекты жыццядзейнасці чалавека), на аснове фізічных тэорый мае наступную структуру: малекулярная фізіка, класічная электрадынаміка.

Месца вучэбнага прадмета ў Тыпавым вучэбным плане агульнай сярэдняй адукацыі

Тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі ўстанаўлівае для X класа на вывучэнне фізікі на павышаным узроўні 4 вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Час, адведзены на вывучэнне асобных тэм у змесце вучэбнага прадмета, з'яўляецца прыкладным. Гэта залежыць ад таго, якія метады навучання і педагагічныя тэхналогіі, формы вучэбных заняткаў выкарыстоўвае настаўнік, ад вучэбных дасягненняў вучняў.

Мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні

Вывучэнне фізікі на павышаным узроўні ў X класе накіравана на дасягненне наступных мэт і задач:

засваенне ведаў аб метадах навуковага пазнання прыроды, сучаснай фізічнай карціне свету: уласцівасцях рэчыва і поля, прасторава-часавых заканамернасцях, дынамічных і

статыстычных законах прыроды; знаёмства з асновамі фундаментальных фізічных тэорый: малекулярна-кінетычнай тэорыі, тэрмадынамікі, класічнай электрадынамікі;

авалоданне ўменнямі праводзіць назіранні, планаваць і выконваць эксперыменты, апрацоўваць рэзультаты вымярэнняў, выстаўляць гіпотэзы і будаваць мадэлі, устанаўліваць межы іх прымянімасці;

прымяненне ведаў для тлумачэння з'яў прыроды, уласцівасцей рэчыва, прынцыпу работы тэхнічных устройстваў, рашэння фізічных задач, самастойнага набыцця і ацэнкі дакладнасці новай інфармацыі фізічнага зместу, выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій для пошуку, перапрацоўкі і прад'яўлення вучэбнай і навукова-папулярнай інфармацыі па фізіцы;

развіццё пазнавальных інтарэсаў, інтэлектуальных і творчых здольнасцей у працэсе рашэння фізічных задач і самастойнага набыцця новых ведаў пры выкананні праектаў, эксперыментальных даследаванняў, падрыхтоўцы дакладаў, рэфератаў і іншых творчых работ;

выхаванне здольнасці да супрацоўніцтва ў працэсе сумеснага выканання задач, уважлівых адносін да меркавання апанента, абгрунтавання выказваемай пазіцыі, гатоўнасці да маральна-этычнай ацэнкі выкарыстання навуковых дасягненняў, гордасці за вучоных-фізікаў, якія сыгралі вядучую ролю ў стварэнні сучаснага свету навукі і тэхнікі;

выкарыстанне набытых ведаў і ўменняў для вырашэння практычных, жыццёвых задач, рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці чалавека і грамадства.

У працэсе асваення зместу вучэбнага прадмета «Фізіка» прадугледжваецца фарміраванне ў вучняў метапрадметных (агульнавучэбных) уменняў і навыкаў, універсальных спосабаў дзейнасці.

Прыярытэтнымі для вывучэння зместу фізікі на павышаным узроўні з'яўляюцца: вучэбна-пазнавальная, інфармацыйна-камунікатыўная і рэфлексіўная дзейнасць.

Вучэбна-пазнавальная дзейнасць:

выкарыстанне для пазнання навакольнага свету розных прыродазнаўчанавуковых метадаў: назірання, вымярэння, эксперыменту, мадэліравання;

фарміраванне ўменняў адрозніваць факты, гіпотэзы, прычыны, вынікі, доказы, законы, тэорыі;

авалоданне адэкватнымі спосабамі рашэння тэарэтычных і эксперыментальных задач;

набыццё вопыту выстаўлення гіпотэз для тлумачэння фактаў і для эксперыментальнай праверкі выстаўленых гіпотэз.

Інфармацыйна-камунікатыўная дзейнасць:

валоданне маналагічным і дыялагічным маўленнем, здольнасць разумець думку субяседніка і прызнаваць права на іншае меркаванне;

выкарыстанне для рашэння пазнавальных і камунікатыўных задач розных крыніц інфармацыі.

Рэфлексіўная дзейнасць:

валоданне навыкамі кантролю і ацэнкі сваёй дзейнасці, уменне прадбачыць магчымыя вынікі сваіх дзеянняў;

арганізацыя вучэбнай дзейнасці: пастаноўка мэты, планаванне, вызначэнне аптымальных суадносін мэты і сродкаў.

Пры вывучэнні фізікі асноўная ўвага павінна надавацца фарміраванню ў вучняў фізічных паняццяў на аснове назіранняў фізічных з'яў, выкананню вучнямі самастойных доследаў і эксперыментаў з наступным аналізам іх вынікаў, развіццю ўменняў прымяняць на практыцы тэарэтычныя веды, атрыманыя на ўроках фізікі. Асноўныя паняцці і законы фізікі павінны быць пададзены вучням не як канчатковыя і нязменныя ісціны, а ў іх гістарычным развіцці з высвятленнем межаў прымянімасці вывучаных законаў з прыкладамі існавання розных сістэм навуковых паняццяў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў накіраваны на рэалізацыю дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў; асваенне вучнямі інтэлектуальнай і практычнай дзейнасці; авалоданне неабходнымі ў паўсядзённым жыцці ведамі і ўменнямі, якія дазваляюць арыентавацца ў навакольным свеце і з'яўляюцца важнымі для захавання навакольнага асяроддзя і здароўя.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

МАЛЕКУЛЯРНАЯ ФІЗІКА

1. Асновы малекулярна-кінетычнай тэорыі (29 гадзін)

Асноўныя палажэнні малекулярна-кінетычнай тэорыі (МКТ) і іх доследнае абгрунтаванне.

Макра- і мікрапараметры. Ідэальны газ. Асноўнае ўраўненне малекулярна-кінетычнай тэорыі ідэальнага газу.

Цеплавая раўнавага. Абсалютная тэмпература. Тэмпература – мера сярэдняй кінетычнай энергіі цеплавога руху часціц рэчыва. Ураўненне стану ідэальнага газу. Закон Дальтона. Ізатэрмічны, ізабарны і ізахорны працэсы змянення стану ідэальнага газу.

Будова і ўласцівасці цвёрдых цел.

Будова і ўласцівасці вадкасцей. Паверхневае нацяжэнне.

Выпарэнне і кандэнсацыя. Насычаная пара. Вільготнасць паветра.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Механічная мадэль броўнаўскага руху.

Змяненне аб'ёму газу са змяненнем ціску пры пастаяннай тэмпературы.

Змяненне аб'ёму газу са змяненнем тэмпературы пры пастаянным ціску.

Змяненне ціску газу са змяненнем тэмпературы пры пастаянным аб'ёме.

Мадэлі крышталічных рашотак.

Паверхневае нацяжэнне.

З'явы змочвання і нязмочвання.

Капілярнае падняцце вадкасці.

Уласцівасці насычанай пары.

Прыборы для вымярэння вільготнасці паветра.

Франтальныя лабараторныя работы

1. Вывучэнне ізатэрмічнага працэсу.
2. Вывучэнне ізабарнага працэсу.
3. Вымярэнне паверхневага нацяжэння.
4. Вымярэнне адноснай і абсалютнай вільготнасці паветра.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб фізічных з'явах: броўнаўскі рух;

будове цвёрдых цел;

ведаць/разумець:

сэнс фізічных мадэлей: ідэальны газ;

сэнс фізічных паняццяў: адносная атамная і малекулярная маса, малярная маса, колькасць рэчыва, ціск газу, парцыяльны ціск газу, сярэдняя кінетычная энергія паступальнага руху малекул газу, сярэдняя квадратычная скорасць, цеплавая раўнавага, абсалютная тэмпература, ізатэрмічны, ізабарны і ізахорны працэсы, паверхневае

нацяжэнне, капілярныя з'явы, насычаная і ненасычаная пара, абсалютная і адносная вільготнасць паветра, кропка расы;

сэнс асноўных палажэнняў малекулярна-кінетычнай тэорыі, фізічных законаў (ураўненняў) і межаў іх прымянімасці: асноўнае ўраўненне малекулярна-кінетычнай тэорыі ідэальнага газу, ураўненне стану ідэальнага газу, законы Дальтона, Бойля–Марыёта, Гей-Люсака, Шарля;

умець:

тлумачыць фізічныя з'явы, зыходзячы з асноўных палажэнняў МКТ;

апісваць уласцівасці вадкасцей;

валодаць:

эксперыментальнымі ўменнямі: выконваць вымярэнне макрапараметраў газу, паверхневага нацяжэння, адноснай і абсалютнай вільготнасці паветра;

практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя і разліковыя задачы на вызначэнне масы і памераў малекул, колькасці рэчыва, канцэнтрацыі малекул, шчыльнасці, аб'ёму, ціску, тэмпературы, сярэдняй квадратычнай скорасці і сярэдняй кінетычнай энергіі паступальнага руху малекул, паверхневага нацяжэння, сілы паверхневага нацяжэння, паверхневай энергіі, вышыні пад'ёму вадкасці ў капіляры, абсалютнай і адноснай вільготнасці паветра з выкарыстаннем: асноўнага ўраўнення малекулярна-кінетычнай тэорыі ідэальнага газу, ураўнення стану ідэальнага газу, законаў Дальтона, Бойля–Марыёта, Гей-Люсака, Шарля; формул для вызначэння масы малекулы, колькасці рэчыва, канцэнтрацыі, сярэдняй квадратычнай скорасці і сярэдняй кінетычнай энергіі паступальнага руху малекул, паверхневага нацяжэння, вышыні пад'ёму вадкасці ў капіляры, адноснай вільготнасці паветра.

2. Асновы тэрмадынамікі (22 гадзіны)

Тэрмадынамічная сістэма.

Унутраная энергія. Унутраная энергія ідэальнага аднаатамнага газу. Работа ў тэрмадынаміцы. Колькасць цеплыні.

Першы закон тэрмадынамікі.

Прымяненне першага закону тэрмадынамікі да ізапрацэсаў змянення стану ідэальнага газу. Адыябатны працэс.

Неабарачальнасць тэрмадынамічных працэсаў у прыродзе.

Цеплавыя рухавікі. Прынцып дзеяння цеплавых рухавікоў. Цыкл Карно. Каэфіцыент карыснага дзеяння (ККД) цеплавых рухавікоў. Экалагічныя праблемы выкарыстання цеплавых рухавікоў.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Узаемасувязь змянення ўнутранай энергіі і выкананай работы.

Мадэлі цеплавых рухавікоў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб неабарачальнасці тэрмадынамічных працэсаў у прыродзе;

цеплавых рухавіках, іх значэнні і экалагічных праблемах выкарыстання;

ведаць/разумець:

сэнс фізічных паняццяў: тэрмадынамічная сістэма, унутраная энергія, работа ў тэрмадынаміцы, колькасць цеплыні, адыябатны працэс, ККД цеплавога рухавіка;

сэнс фізічных законаў: першы закон тэрмадынамікі;

умець:

прымяняць першы закон тэрмадынамікі да ізапрацэсаў змянення стану ідэальнага газу;

апісваць цыкл Карно;

валодаць:

практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя і разліковыя задачы на вызначэнне работы, колькасці цеплыні і змянення ўнутранай энергіі, ККД цеплавых рухавікоў, ККД цыкла Карно з выкарыстаннем: першага закону тэрмадынамікі, ураўнення цеплавога балансу; формул для вызначэння ўнутранай энергіі ідэальнага аднаатамнага газу, колькасці цеплыні ў розных цеплавых працэсах, ККД цеплавых рухавікоў, ККД цыкла Карно.

ЭЛЕКТРАДЫНАМІКА

3. Электрастатыка (33 гадзіны)

Электрычны зарад. Закон захавання электрычнага зараду.

Узаемадзеянне пунктавых зарадаў. Закон Кулона.

Электрастатычнае поле. Напружанасць электрастатычнага поля. Напружанасць поля, якое стварае пунктавы зарад. Лініі напружанасці электрастатычнага поля. Прынцып суперпазіцыі электрастатычных палёў.

Работа сіл электрастатычнага поля. Патэнцыяльнасць электрастатычнага поля. Патэнцыял электрастатычнага поля пунктавага зараду. Патэнцыял электрастатычнага поля сістэмы пунктавых зарадаў. Рознасць патэнцыялаў электрастатычнага поля. Напружанне. Сувязь паміж рознасцю патэнцыялаў і напружанасцю аднароднага электрастатычнага поля.

Праваднікі ў электрастатычным полі. Электрастатычная індукцыя.

Дыэлектрыкі ў электрастатычным полі. Палярызацыя дыэлектрыка.

Электраёмістасць. Кандэнсатары. Электраёмістасць плоскага кандэнсатара. Паслядоўнае і паралельнае злучэнне кандэнсатараў.

Энергія электрастатычнага поля кандэнсатара.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Электраметр.

Узаемадзеянне зарадаў.

Электрастатычнае поле пунктавага зараду.

Электрастатычная індукцыя.

Праваднікі і дыэлектрыкі ў электрастатычным полі.

Кандэнсатары.

Залежнасць электраёмістасці плоскага кандэнсатара ад яго геаметрычных памераў і дыэлектрычнай пранікальнасці дыэлектрыка.

Энергія электрастатычнага поля кандэнсатара.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб фізічных мадэлях: пунктавы зарад, аднароднае электрастатычнае поле, праваднік, дыэлектрык;

эквіпатэнцыяльных паверхнях;

электрастатычнай ахове;

будове і практычным прымяненні кандэнсатараў;

ведаць/разумець:

сэнс фізічных паняццяў: электрычны зарад, электрастатычнае поле, напружанасць, лініі напружанасці электрастатычнага поля, патэнцыял, рознасць патэнцыялаў, напружанне, электраёмістасць, дыэлектрычная пранікальнасць, энергія электрастатычнага поля кандэнсатара;

сэнс фізічных законаў (прынцыпаў) і межы іх прымянімасці: захавання электрычнага зараду, Кулона; прынцып суперпазіцыі электрастатычных палёў;

умець:

апісваць і тлумачыць фізічныя з'явы: узаемадзеянне зараджаных цел, электрастатычная індукцыя, палярызацыя дыэлектрыка;

валодаць:

практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя і разліковыя задачы на вызначэнне сіл электрастатычнага ўзаемадзеяння зарадаў, напружанасці і патэнцыялу электрастатычнага поля, работы сіл электрастатычнага поля, на рух і раўнавагу зараджаных часціц у электрастатычным полі, на вызначэнне электраёмістасці адасобленага правадніка, плоскага кандэнсатара і батарэі кандэнсатараў, энергіі электрастатычнага поля з выкарыстаннем законаў: захавання зараду, Кулона; прынцыпу суперпазіцыі электрастатычных палёў, створаных сістэмай пунктавых зарадаў; формул для вызначэння напружанасці і патэнцыялу электрастатычнага поля, напружанасці электрастатычнага поля, створанага пунктавым зарадам, раўнамерна зараджанай сферай, раўнамерна зараджанай бясконцай плоскасцю, патэнцыялу электрастатычнага поля, створанага пунктавым зарадам, раўнамерна зараджанай сферай, работы сіл электрастатычнага поля, электраёмістасці, энергіі электрастатычнага поля кандэнсатара; заканамернасцей паслядоўнага і паралельнага злучэння кандэнсатараў.

4. Пастаянны электрычны ток (13 гадзін)

Умовы існавання пастаяннага электрычнага току.

Пабочныя сілы. Электрарухаючая сіла (ЭРС) крыніцы току. Закон Ома для поўнага электрычнага ланцуга. ККД крыніцы току.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Залежнасць сілы току ад ЭРС крыніцы і поўнага супраціўлення ланцуга.

Крыніцы пастаяннага току.

Франтальныя лабараторныя работы

5. Вымярэнне ЭРС і ўнутранага супраціўлення крыніцы току.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб умовах існавання пастаяннага электрычнага току;

крыніцах пастаяннага электрычнага току;

пабочных сілах;

ведаць/разумець:

сэнс фізічных паняццяў: электрарухаючая сіла, сіла току кароткага замыкання, работа і магутнасць крыніцы току, ККД крыніцы току;

сэнс фізічных законаў: Ома для поўнага ланцуга;

валодаць:

эксперыментальнымі ўменнямі: вымяраць ЭРС і ўнутранае супраціўленне крыніцы току;

практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя і разліковыя задачы на вызначэнне характарыстык поўнага электрычнага ланцуга і яго асобных участкаў з выкарыстаннем: законаў Ома для ўчастка ланцуга і поўнага ланцуга, Джоўля–Ленца; заканамернасцей паслядоўнага і паралельнага злучэння праваднікоў; формул для вызначэння работы і магутнасці электрычнага току, ККД крыніцы току.

5. Магнітнае поле. Электрамагнітная індукцыя (28 гадзін)

Уздзеянне магнітнага поля на правадник з токам. Узаемадзеянне праваднікоў з токам. Індукцыя магнітнага поля. Лініі індукцыі магнітнага поля. Закон Ампера. Прынцып суперпазіцыі магнітных палёў. Індукцыя магнітнага поля самых простых сістэм токаў.

Сіла Лорэнца. Рух зараджаных часціц у магнітным полі.

Магнітны паток. З'ява электрамагнітнай індукцыі. Правіла Ленца. Закон электрамагнітнай індукцыі. Віхравое электрычнае поле. ЭРС індукцыі ў правадніку, які рухаецца.

З'ява самаіндукцыі. Індуктыўнасць.

Энергія магнітнага поля шпулі з токам.

Электравымяральныя прыборы. Электрарухавік.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Дослед Эрстэда.

Дзеянне магнітнага поля на правадник з токам. Дослед Ампера.

Узаемадзеянне праваднікоў з токам.

Адхіленне электроннага пучка магнітным полем.

Магнітнае поле прамалінейнага правадніка і кругавога вітка з токам.

Магнітнае поле шпулі з токам.

Электравымяральныя прыборы.

Мадэль электрарухавіка.

З'ява электрамагнітнай індукцыі.

Правіла Ленца.

Залежнасць ЭРС індукцыі ад скорасці змянення магнітнага патоку.

Самаіндукцыя пры замыканні і размыканні ланцуга.

Залежнасць ЭРС самаіндукцыі ад скорасці змянення сілы току ў правадніку і ад індуктыўнасці правадніка.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб фізічных паняццях: віхравое электрычнае поле;

электравымяральных прыборах, электрарухавіку;

ведаць/разумець:

сэнс фізічных паняццяў: магнітнае поле, індукцыя магнітнага поля, лініі індукцыі магнітнага поля, магнітны паток, электрамагнітная індукцыя, ЭРС індукцыі, індукцыйны ток, ЭРС самаіндукцыі, індуктыўнасць, энергія магнітнага поля;

сэнс фізічных законаў (прынцыпаў, правіл): Ампера, электрамагнітнай індукцыі, прынцыпу суперпазіцыі магнітных палёў, правіла Ленца;

умець:

апісваць, тлумачыць фізічныя з'явы: узнікненне магнітнага поля і яго дзеянне на зараджаныя часціцы, якія рухаюцца (электрычны ток), электрамагнітная індукцыя, самаіндукцыя;

валодаць:

практычнымі ўменнямі: графічна паказваць магнітныя палі; вызначаць напрамкі індукцыі магнітнага поля, сіл Ампера і Лорэнца, індукцыйнага току;

рашаць якасныя, графічныя, разліковыя задачы на вызначэнне індукцыі магнітнага поля, індукцыі магнітнага поля самых простых сістэм токаў (прамалінейны бясконца доўгі правадник з токам, кругавы віток з токам, саленоід), сілы Ампера, сілы Лорэнца і характарыстык руху зараджанай часціцы ў аднародных электрычным і магнітным палях, магнітнага патоку, ЭРС індукцыі і самаіндукцыі, ЭРС індукцыі, якая ўзнікае ў прамалінейным правадніку, што раўнамерна рухаецца ў аднародным магнітным полі,

індуктыўнасці шпулі, энергіі магнітнага поля з выкарыстаннем: закону электрамагнітнай індукцыі, прынцыпу суперпазіцыі магнітных палёў; формул для вызначэння індукцыі магнітнага поля, сілы Ампера, сілы Лорэнца, магнітнага патоку, ЭРС самаіндукцыі, энергіі магнітнага поля.

6. Электрычны ток у розных асяроддзях (15 гадзін)

Электрычны ток у металах. Залежнасць супраціўлення металаў ад тэмпературы. Звышправаднасць.

Электрычны ток у электралітах. Законы электролізу Фарадэя.

Электрычны ток у газах. Самастойны і несамастойны разрады. Плазма.

Электрычны ток у паўправадніках. Уласная і прымесная праводнасць паўправаднікоў. Электронна-дзіркавы пераход. Паўправадніковы дыёд. Транзістар.

Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі

Залежнасць супраціўлення металаў ад тэмпературы.

Электрычны ток у электралітах. Электроліз.

Электрычны разрад у газах.

Электрычныя ўласцівасці паўправаднікоў.

Аднабаковая электронная праводнасць паўправадніковага дыёда.

Паўправадніковыя прыборы.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань п а в і н е н:

мець уяўленне:

аб фізічных з'явах: звышправаднасці;

плазме;

відах самастойнага газавага разраду і іх прымяненні;

будове і практычным прымяненні транзістараў;

практычным выкарыстанні электролізу, току ў газах, праводнасці металаў і паўправаднікоў;

ведаць/разумець:

прыроду электрычнага току ў металах, электралітах, газах і паўправадніках;

сэнс фізічных паняццяў: тэмпературны каэфіцыент супраціўлення, электрахімічны эквівалент рэчыва, уласная і прымесная праводнасць паўправаднікоў;

сэнс фізічных законаў: электролізу;

электронна-дзіркавы пераход;

прынцып дзеяння паўправадніковага дыёда;

умець:

апісваць, тлумачыць фізічныя з'явы: электроліз, самастойны і несамастойны газавыя разрады, электронна-дзіркавы пераход;

валодаць:

практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя задачы на праводнасць розных асяроддзяў, разліковыя задачы з выкарыстаннем залежнасці супраціўлення металічнага правадніка ад тэмпературы, законаў электролізу Фарадэя.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
15.07.2015 № 83

Учебная программа по учебному предмету «Химия» для X класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания (повышенный уровень)

ХИМИЯ

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Содержание образования учебного предмета «Химия» ориентировано на освоение учащимися компетенций, необходимых для рациональной деятельности в мире веществ и химических превращений, на основе знаний о свойствах важнейших веществ, окружающих человека в повседневной жизни, природе, промышленности, и понимание сути химических превращений. Содержание образования также ориентировано на формирование у учащихся понимания роли химии в решении наиболее актуальных проблем, стоящих перед человечеством в XXI веке. От грамотного решения этих проблем зависит здоровье людей, уровень их жизни и состояние окружающей среды.

Цель изучения химии на III ступени общего среднего образования – формирование системы химических знаний и опыта их применения, обеспечивающей понимание естественнонаучной картины мира, активную адаптацию в социуме и безопасное поведение, готовность к продолжению образования на последующих уровнях и ступенях профессионального образования.

Задачи изучения химии на III ступени общего среднего образования:

формирование системных химических знаний, создающих основу для непрерывного образования и самообразования на всех этапах обучения и предстоящей профессиональной деятельности;

формирование и развитие ключевых, общепредметных и предметно-специальных компетенций – знаний, умений, способов и опыта деятельности с учетом специфики химии как фундаментальной естественной науки;

формирование и развитие социально значимых ценностных ориентаций, включающих общекультурное и личностное развитие учащихся, осознание ценности получаемого химического образования, чувства ответственности и патриотизма, социальную мобильность и способность адаптироваться в разных жизненных ситуациях;

формирование расширенных системных химических знаний, создающих основу для непрерывного естественнонаучного образования и предстоящей профессиональной деятельности, связанной с химией.

Настоящая учебная программа по учебному предмету «Химия» предназначена для изучения химии в X классе учреждений общего среднего образования на повышенном уровне в условиях профильного обучения.

Учебная программа составлена в соответствии с учебным планом, который предусматривает для изучения химии на повышенном уровне 4 часа в неделю (всего 140 часов).

Повышенный уровень изучения химии включает в себя базовый уровень. На повышенном уровне осуществляется более глубокая подготовка учащихся за счет расширения теоретической интерпретации химических явлений, перечня экспериментальных и расчетных задач, введения усложненных задач.

Структура учебной программы предполагает изучение органической химии в X классе. Изучение учебного материала начинается с темы «Введение в органическую химию», рассчитанной на формирование необходимых компетенций, направленных на понимание основ теории строения вещества. Дальнейшее рассмотрение учебного материала базируется на сведениях об электронном строении атомов и электронной

природе химической связи в молекулах органических соединений. Рассматриваются строение и свойства органических веществ основных классов. Предлагаемая последовательность учебных тем в программе позволяет раскрыть принцип усложнения строения и генетического развития от углеводородов к более сложным органическим соединениям. При изучении курса учащиеся будут знакомиться с зависимостью свойств органических веществ от строения молекул, применением органических соединений в различных сферах жизнедеятельности человека.

В учебной программе представлены учебные темы и примерное время на их изучение.

Для каждой темы в программе определены вопросы, подлежащие изучению, типы расчетных задач, указаны перечни демонстраций, лабораторных опытов, темы практических работ. Учителю дается право замены демонстрационных и лабораторных опытов на другие (равноценные), более доступные в условиях данной школы. По своему усмотрению учитель может увеличить число демонстрационных опытов. Предусмотрено время для проведения контрольных работ.

Указанное в программе количество часов, отведенных на изучение учебных тем, является примерным. Оно может быть перераспределено между темами в разумных пределах (2–4 часа). Резервное время учитель использует по своему усмотрению. Кроме того, возможно изменение последовательности изучения вопросов в рамках отдельной учебной темы при соответствующем обосновании таких изменений.

В программе имеется раздел «Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся». На основе этих требований осуществляется контроль и оценка результатов учебной деятельности учащихся, качества усвоения знаний и уровня сформированности компетенций.

СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА
(4 ч в неделю; всего 140 ч, из них 4 ч – резервное время)

Т е м а 1. Введение в органическую химию (10 ч)

Строение атома. Состояние электрона в атоме. Атомная орбиталь. Энергетический уровень и энергетический подуровень. *s*-, *p*-Орбитали в атоме. Электронные конфигурации атомов. Строение электронных оболочек атомов элементов первых трех периодов (распределение электронов по орбиталям). Особенности строения атома углерода.

Природа и типы химической связи. Ковалентная связь. Полярная и неполярная ковалентная связь. Одинарные и кратные связи (σ- и π-связи). Характеристики ковалентных связей: длина, энергия, валентный угол, полярность. Понятие о смещении электронной плотности.

Межмолекулярное взаимодействие и водородная связь.

Предмет органической химии. Краткие сведения об истории становления и развития органической химии.

Основные положения теории химического строения органических веществ.

Классификация органических веществ.

Демонстрации

1. Качественное определение углерода, водорода и галогенов в органических соединениях.

Т е м а 2. Углеводороды (32 ч)

Алканы. Определение класса, гомологический ряд и общая формула алканов. Гомологи, гомологическая разность.

Метан – простейший представитель насыщенных углеводородов – алканов. Электронное и пространственное строение алканов, sp^3-гибридизация атомных орбиталей углерода в молекулах алканов. Длина связи С–С и валентные углы в молекулах алканов.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алканов. Структурная изомерия алканов – изомерия углеродного скелета. Физические свойства.

Относительная плотность газов. Объемная доля газа в смеси.

Химические свойства алканов: реакции замещения – галогенирование (свободнорадикальный механизм, понятие о радикале, цепных реакциях) и нитрование; реакции окисления, изомеризации; термические превращения (крекинг). Получение (декарбоксилирование солей карбоновых кислот, гидрирование соединений с кратными связями, реакция Вюрца) и применение алканов.

Понятие о циклоалканах. Определение класса и общая формула. Химические свойства циклогексана: реакции галогенирования и ароматизации. Получение циклогексана гидрированием бензола. Применение циклоалканов.

Алкены. Определение класса и общая формула алкенов. Этилен – простейший представитель ненасыщенных углеводородов – алкенов. Электронное и пространственное строение алкенов, sp^2-гибридизация атомных орбиталей углерода в молекулах алкенов. Длина связи С=С, валентные углы в молекуле этилена.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алкенов. Изомерия: структурная (углеродного скелета и положения двойной связи), межклассовая (с циклоалканами), пространственная (*цис*-, *транс*-). Физические свойства алкенов.

Химические свойства алкенов: окисление; присоединение водорода, галогенов, воды, галогеноводородов. Правило Марковникова. Качественные реакции на двойную связь с растворами брома и перманганата калия. Полимеризация алкенов. Понятия: полимер, мономер, структурное звено, степень полимеризации. Полиэтилен, полипропилен, поливинилхлорид, политетрафторэтилен. Получение алкенов (дегидрирование алканов, дегидрогалогенирование галогеналканов, дегалогенирование дигалогенпроизводных, дегидратация спиртов, гидрирование алкинов). Применение алкенов.

Диены. Классификация: алкадиены с кумулированными, сопряженными и изолированными двойными связями. Особенности строения бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3 (изопрена), молекулярные и структурные формулы, пространственное строение. Физические свойства бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3.

Химические свойства бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3: присоединение водорода, галогенов, галогеноводородов, реакция полимеризации.

Получение бутадиена-1,3 и 2-метилбутадиена-1,3: дегидрированием алканов, дегидрогалогенированием дигалогенпроизводных. Применение диеновых углеводородов. Природный и синтетические каучуки.

Алкины. Определение класса и общая формула алкинов. Ацетилен – простейший представитель ненасыщенных углеводородов – алкинов. Электронное и пространственное строение молекул алкинов, *sp*-гибридизация атомных орбиталей углерода в молекулах алкинов. Длина связи С≡С, валентный угол в молекуле ацетилена.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия алкинов. Изомерия: структурная (углеродного скелета и положения тройной связи), межклассовая (с диенами). Физические свойства алкинов.

Химические свойства алкинов: полное окисление, присоединение водорода, галогенов, галогеноводородов, воды. Качественные реакции на тройную связь с растворами брома и перманганата калия. Получение алкинов дегидрогалогенированием дигалогеналканов. Получение ацетилена из метана и карбида кальция. Применение алкинов.

Арены. Определение класса и общая формула аренов ряда бензола. Бензол – простейший представитель ароматических углеводородов. Номенклатура и изомерия аренов ряда бензола. Электронное и пространственное строение молекулы бензола,

sp^2-гибридизация атомных орбиталей углерода в бензольном кольце. Длина связи углерод–углерод и валентные углы в молекуле бензола. Физические свойства аренов.

Химические свойства аренов: реакции замещения в ароматическом ядре (галогенирование, нитрование), каталитическое гидрирование. Реакции гомологов бензола по боковой цепи: галогенирование и окисление.

Получение бензола тримеризацией ацетилена. Физические свойства бензола. Получение ароматических углеводородов дегидрированием алканов и циклоалканов. Применение ароматических соединений.

Взаимосвязь между насыщенными и ненасыщенными углеводородами.

Углеводороды в природе. Нефть и природный газ как источники углеводородов. Нефть. Состав и физические свойства. Способы переработки нефти: перегонка, термический и каталитический крекинг. Продукты переработки нефти. Охрана окружающей среды от загрязнений при переработке углеводородного сырья и использовании продуктов переработки нефти. Предприятия нефтехимического комплекса Республики Беларусь.

Расчетные задачи

1. Вывод формул органических веществ по общей формуле, отражающей их состав.
2. Установление молекулярных формул органических веществ на основании продуктов их сгорания.
3. Вычисление относительной плотности и молярной массы газов.
4. Расчет объемной доли газа в смеси.

Демонстрации

1. Модели молекул насыщенных и ненасыщенных углеводородов.
2. Образцы пластмасс.
3. Образцы натурального и синтетических каучуков, резины.
4. Получение ацетилена карбидным способом.
5. Отношение ацетилена к раствору брома.
6. Коллекция «Продукты переработки нефти».

Лабораторные опыты

1. Изготовление шаростержневых моделей молекул углеводородов.

Практические работы

1. Получение этилена и изучение его свойств (1 ч).

Т е м а 3. Спирты и фенолы (22 ч)

Спирты. Функциональная группа спиртов, ее электронное строение. Классификация спиртов: одноатомные и многоатомные; насыщенные, ненасыщенные, алициклические и ароматические; первичные, вторичные, третичные.

Насыщенные одноатомные спирты. Определение класса, общая формула, состав, строение, молекулярные, структурные и электронные формулы насыщенных одноатомных спиртов. Метанол и этанол как представители насыщенных одноатомных спиртов.

Изомерия насыщенных одноатомных спиртов: структурная (углеродного скелета и положения функциональной группы), межклассовая (с простыми эфирами). Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия спиртов.

Физические свойства. Водородная связь и ее влияние на температуры кипения и растворимость спиртов.

Химические свойства: взаимодействие со щелочными металлами, органическими и минеральными кислотами, галогеноводородами, дегидратация (внутримолекулярная и межмолекулярная); окисление: полное и частичное.

Получение спиртов гидролизом галогеналканов, гидратацией алкенов. Получение метанола и этанола в промышленности. Применение спиртов. Токсичность спиртов, их действие на организм человека.

Многоатомные спирты. Этиленгликоль (этандиол-1,2) и глицерин (пропантриол-1,2,3) как представители многоатомных спиртов, их состав, строение и структурные формулы.

Химические свойства: взаимодействие со щелочными металлами, органическими и минеральными кислотами, галогеноводородами, гидроксидом меди(II) (качественная реакция на многоатомные спирты). Применение этиленгликоля и глицерина.

Взаимосвязь между насыщенными, ненасыщенными углеводородами и спиртами.

Фенолы. Понятие о фенолах, определение класса. Состав и строение фенола: молекулярная и структурная формулы. Физические свойства фенола.

Химические свойства: взаимодействие со щелочными металлами, растворами щелочей, бромирование и нитрование по ароматическому ядру. Качественные реакции на фенол с бромной водой и растворами солей железа(III). Взаимное влияние групп атомов в молекуле фенола.

Получение фенола из продуктов коксования каменного угля и хлорбензола. Кумольный способ. Применение фенола.

Расчетные задачи

5. Расчеты по химическим уравнениям, если одно из реагирующих веществ взято в избытке.

Демонстрации

1. Модели молекул метанола, этанола, этиленгликоля, глицерина.
2. Сравнение растворимости в воде насыщенных одноатомных спиртов.
3. Взаимодействие этанола с натрием.
4. Горение этанола.

Лабораторные опыты

2. Окисление этанола оксидом меди(II).
3. Взаимодействие глицерина с гидроксидом меди(II).

Т е м а 4. Альдегиды (8 ч)

Альдегиды. Функциональная карбонильная группа, ее электронное и пространственное строение. Понятие о кетонах как разновидности карбонильных соединений. Функциональная альдегидная группа, ее электронное и пространственное строение.

Определение класса альдегидов. Метаналь и этаналь как представители альдегидов, их состав, строение, молекулярные, структурные и электронные формулы.

Насыщенные альдегиды: общая формула; структурная изомерия углеродного скелета и межклассовая изомерия с кетонами.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия альдегидов. Физические свойства альдегидов.

Химические свойства: восстановление до спиртов, окисление до карбоновых кислот, присоединение метанола. Качественные реакции на альдегидную группу: «серебряного зеркала» и с гидроксидом меди(II).

Получение альдегидов окислением первичных спиртов. Получение этаналя каталитическим окислением этилена и гидратацией ацетилена. Применение метаналя и этаналя.

Демонстрации

1. Модели молекул альдегидов.
2. Окисление альдегида (реакция «серебряного зеркала»).

Лабораторные опыты

4. Окисление альдегида гидроксидом меди(II).

Т е м а 5. Карбоновые кислоты (14 ч)

Карбоновые кислоты. Функциональная карбоксильная группа, ее электронное и пространственное строение. Определение класса карбоновых кислот. Классификация карбоновых кислот: насыщенные, ненасыщенные, ароматические; одноосновные, двухосновные.

Насыщенные одноосновные карбоновые кислоты: состав, строение; общая, молекулярные, структурные и электронные формулы. Изомерия: структурная (углеродного скелета) и межклассовая (со сложными эфирами).

Муравьиная и уксусная кислоты как представители насыщенных одноосновных карбоновых кислот. Пальмитиновая и стеариновая кислоты как представители высших насыщенных карбоновых кислот.

Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия карбоновых кислот. Физические свойства карбоновых кислот. Влияние водородной связи на физические свойства кислот.

Химические свойства: изменение окраски индикаторов; взаимодействие с металлами; с основными, амфотерными оксидами и гидроксидами; солями более слабых кислот. Реакции замещения гидроксильной группы: со спиртами с образованием сложных эфиров (этерификации); аммиаком и аминами с образованием амидов; замещения атома водорода у α-углеродного атома на атом галогена. Понятие об ангидридах карбоновых кислот. Особенности окисления муравьиной кислоты. Получение карбоновых кислот окислением алканов, первичных спиртов и альдегидов. Получение муравьиной кислоты из оксида углерода(II).

Ненасыщенные одноосновные карбоновые кислоты. Акриловая и олеиновая кислоты: состав, строение. Химические свойства: присоединение водорода и галогенов по двойной связи углеводородной группы.

Применение карбоновых кислот.

Взаимосвязь между углеводородами, спиртами, альдегидами, карбоновыми кислотами.

Расчетные задачи

6. Вычисления по уравнениям реакций, протекающих в растворах.

Демонстрации

1. Модели молекул карбоновых кислот.
2. Растворимость карбоновых кислот в воде, действие на индикаторы.
3. Отношение олеиновой кислоты к растворам перманганата калия и брома; взаимодействие со щелочью.

Практические работы

2. Получение уксусной кислоты и изучение ее свойств (1 ч).

Т е м а 6. Сложные эфиры. Жиры (10 ч)

Сложные эфиры. Определение класса. Общая формула, состав, строение, молекулярные и структурные формулы. Этиловый эфир уксусной кислоты как представитель сложных эфиров.

Изомерия: структурная и межклассовая (с карбоновыми кислотами). Номенклатура ИЮПАК и тривиальные названия сложных эфиров. Физические свойства. Получение сложных эфиров: реакция этерификации, ее обратимость.

Химические свойства: гидролиз (кислотный и щелочной).

Сложные эфиры в природе. Применение. Полиэфирные волокна (лавсан).

Жиры. Состав и строение триглицеридов. Физические свойства. Химические свойства: гидролиз, гидрирование, окисление. Биологическая роль жиров.

Мыла. Синтетические моющие средства (СМС).

Выход продукта реакции.

Расчетные задачи

7. Определение выхода продукта реакции.

Демонстрации

1. Получение сложного эфира уксусной кислоты.
2. Образцы сложных эфиров, полиэфирных волокон и полимеров.

Лабораторные опыты

5. Исследование свойств жиров (растворимость, доказательство ненасыщенного характера остатков карбоновых кислот).
6. Сравнение свойств мыла и синтетических моющих средств.

Т е м а 7. Углеводы (18 ч)

Углеводы. Определение класса. Общая формула, состав, строение, классификация углеводов.

Моносахариды. Глюкоза: состав, строение, функциональные группы, строение молекулы. Линейная и циклические α- и β-формы молекулы глюкозы. Фруктоза – изомер глюкозы. Физические свойства глюкозы и фруктозы.

Представители пентоз – рибоза и дезоксирибоза. Строение и биологическое значение.

Химические свойства глюкозы: окисление до глюконовой кислоты, восстановление до шестиатомного спирта сорбита; брожение (спиртовое, молочнокислое, маслянокислое). Качественные реакции на глюкозу: «серебряного зеркала» и с гидроксидом меди(II). Нахождение в природе, получение и применение глюкозы.

Дисахариды. Сахароза как представитель дисахаридов, ее состав. Молекулярная формула. Физические свойства. Химические свойства: гидролиз. Получение и применение сахарозы.

Предприятия по производству сахара в Республике Беларусь.

Полисахариды. Крахмал – природный полисахарид. Состав и строение макромолекул крахмала (остатки α-глюкозы). Физические свойства.

Химические свойства крахмала: гидролиз (ферментативный, кислотный); реакция с иодом (качественная реакция на крахмал).

Значение углеводов как питательных веществ.

Целлюлоза – природный полисахарид. Состав и строение макромолекул целлюлозы (остатки β-глюкозы). Физические свойства.

Химические свойства целлюлозы: горение, гидролиз, взаимодействие с неорганическими и органическими кислотами с образованием сложных эфиров. Натуральные и искусственные волокна. Применение целлюлозы и ее производных.

Предприятия по производству химических волокон в Республике Беларусь.

Демонстрации

1. Окисление глюкозы (реакция «серебряного зеркала»).
2. Гидролиз сахарозы.
3. Образцы искусственных волокон и тканей.

Лабораторные опыты

7. Взаимодействие глюкозы с гидроксидом меди(II).
8. Изучение физических свойств крахмала. Взаимодействие крахмала с иодом.

Практические работы

3. Гидролиз крахмала и целлюлозы (1 ч).
4. Решение экспериментальных задач (1 ч).

Т е м а 8. Азотсодержащие органические соединения (16 ч)

Амины. Определение класса. Классификация аминов. Структурная изомерия и номенклатура аминов.

Первичные насыщенные амины, общая формула. Функциональная группа первичных аминов, ее электронное строение. Молекулярные, структурные и электронные формулы. Физические свойства первичных насыщенных аминов. Химические свойства: осно́вные свойства аминов (реакции с водой и неорганическими кислотами), полное окисление.

Анилин как представитель ароматических аминов, его состав и строение. Молекулярная, структурная и электронная формулы. Физические свойства. Взаимное влияние атомов в молекуле анилина. Химические свойства: реакции анилина по аминогруппе (с неорганическими кислотами) и ароматическому ядру (с бромной водой).

Получение насыщенных аминов из галогеналканов и спиртов, анилина из нитробензола. Применение анилина и его производных.

Сравнительная характеристика строения и свойств аминов и аммиака.

Аминокислоты. Определение класса. Функциональные группы аминокислот. Классификация. Изомерия и номенклатура: тривиальная и ИЮПАК.

α-Аминокислоты. Аминоуксусная кислота как представитель аминокислот, ее состав, строение молекулы.

Физические свойства α-аминокислот. Химические свойства α-аминокислот: взаимодействие с основаниями и кислотами (амфотерные свойства); взаимодействие с аминокислотами (образование пептидов). Пептидная связь. Получение α-аминокислот из α-галогензамещенных карбоновых кислот.

Применение и биологическая роль аминокислот. Аминокислоты заменимые и незаменимые.

Синтетические полиамидные волокна: капрон.

Белки. Белки – природные высокомолекулярные соединения. Состав и строение белковых макромолекул. Первичная, вторичная, третичная и четвертичная структуры белков.

Химические свойства белков: гидролиз, денатурация, цветные реакции.

Применение и биологическая роль белков.

Демонстрации

1. Модели молекул метиламина и этиламина.
2. Денатурация белков.

Лабораторные опыты

9. Свойства белков: денатурация, цветные реакции.

Практические работы

5. Решение экспериментальных задач (1 ч).

Т е м а 9. Обобщение и систематизация знаний по органической химии (6 ч)

Многообразие органических соединений.

Взаимосвязь между органическими соединениями различных классов.

Классификация химических реакций, закономерности их протекания.

Зависимость свойств веществ от строения их молекул. Особенности строения и свойств высокомолекулярных соединений.

Органические соединения вокруг нас. Влияние синтетических органических веществ на окружающую среду.

Практические работы

6. Распознавание и изучение свойств пластмасс и волокон (1 ч).

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Учащиеся д о л ж н ы:

давать определения понятиям: атом, молекула, атомная орбиталь, энергетический уровень и энергетический подуровень, *s*-, *p*-, *d*-орбитали, электронная конфигурация атома; ковалентная связь: полярная и неполярная, одинарная и кратная (двойная, тройная), σ-связь, π-связь, сопряженная, пептидная, водородная; длина связи, валентный угол; химическая формула (общая класса, молекулярная, структурная, эмпирическая); изомер, изомерия (пространственная, структурная); органическая химия, органические соединения (азотсодержащие: амины, аминокислоты, белки; высокомолекулярные: натуральные, искусственные, синтетические; кислородсодержащие: альдегиды, жиры, кетоны, карбоновые кислоты, сложные эфиры, спирты, углеводы, фенолы; углеводороды: насыщенные, ненасыщенные, циклические, ароматические); гомология (гомолог, гомологическая разность); группа: альдегидная, алкильная, аминогруппа, гидроксильная, кетогруппа, карбоксильная, нитрогруппа, пептидная, углеводородная; молекула: состав, строение (химическое, электронное и пространственное); номенклатура ИЮПАК, тривиальные названия органических соединений; пептид; полимер, мономер, степень полимеризации, структурное звено; химические реакции органических соединений (брожения, галогенирования, гидрогалогенирования, гидратации, гидрирования, гидролиза, дегидратации, дегидрирования, дегидрогалогенирования, замещения, изомеризации, каталитические, качественные, нитрования, окисления, отщепления, полимеризации, поликонденсации, присоединения, радикальные, фотохимические, этерификации).

Учащиеся должны у м е т ь:

называть:

основные положения теории химического строения органических веществ, виды гибридизации атомных орбиталей; правило Марковникова; алкильные группы; качественные реакции на изученные органические вещества; общие формулы соединений различных классов; определения классов органических соединений; органические соединения по номенклатуре ИЮПАК и тривиальными названиями; области практического использования органических веществ и изделий из них; признаки классификации химических реакций; состав и строение органических соединений различных классов, способы получения органических веществ различных классов, волокон, пластмасс, каучуков; вид изомерии; тип химической реакции; условия протекания реакций; физические свойства органических веществ; функциональные группы; характер изменения физических свойств веществ в гомологическом ряду и причину их изменения; химические свойства индивидуального вещества определенного класса;

определять:

принадлежность органического соединения к определенному классу по структурной формуле; пространственное строение молекул с позиции гибридизации атомных орбиталей; типы химических реакций органических соединений по уравнениям; органические соединения (экспериментально по качественным реакциям);

различать:

гомологи; изомеры; молекулярные, структурные, скелетные и электронные формулы органических соединений; типы химических реакций органических соединений по уравнениям и схемам.

Учащиеся д о л ж н ы осуществлять следующие способы деятельности:

составлять:

формулы электронных конфигураций и схемы заполнения электронами атомных орбиталей атомов элементов первых трех периодов; формулу органического соединения (молекулярную, структурную, скелетную, сокращенную структурную, электронную); модели молекул; структурные формулы органических соединений по их названиям;

схемы, отражающие взаимосвязь между органическими веществами различных классов; уравнения реакций, отражающие химические свойства изученных веществ и способы их получения;

характеризовать:

особенности электронного строения атома углерода; способы получения органических веществ; строение веществ; тип химической связи; физические свойства органических соединений определенного класса; химические свойства органических соединений определенного класса; образование одинарной, двойной, тройной химической связи;

объяснять:

взаимосвязь между составом, строением и свойствами органических веществ; взаимосвязь органических соединений различных классов; причины многообразия органических веществ; причины взаимного влияния атомов в молекулах органических соединений; причины проявления органическими соединениями амфотерных свойств; причины сходства химических свойств органических соединений одного класса; пространственное строение молекул органических соединений; химические свойства органических соединений с позиции теории химического строения;

анализировать:

результаты лабораторных опытов, практических работ; учебную информацию;

применять:

изученные понятия и законы при характеристике состава и свойств веществ, химических реакций, способов получения веществ; правила безопасного поведения при обращении с веществами, химической посудой, лабораторным оборудованием и приборами;

обращаться:

с органическими веществами, химической посудой, лабораторным оборудованием, приборами;

проводить:

математические вычисления при решении расчетных задач; химический эксперимент; моделирование молекул органических соединений;

пользоваться:

учебником; инструкцией по правилам безопасного поведения в химическом кабинете; инструкцией при выполнении химического эксперимента.

УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС ПО ХИМИИ:

Основные компоненты УМК

Химия: учебник для 10-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / И.Е. Шиманович [и др.]; под ред. И.Е. Шимановича. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Ельницкий, А.П. Химия: учебник для 11-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / А.П. Ельницкий, Е.И. Шарапа. – 3-е изд., пересмотр. и доп. – Минск: Народная асвета, 2013.

Хвалюк, В.Н. Сборник задач по химии: учеб. пособие для 10-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / В.Н. Хвалюк, В.И. Резяпкин; под ред. В.Н. Хвалюка. – 2-е изд., перераб. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Шарапа, Е.И. Сборник задач по химии: учеб. пособие для 11-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – 2-е изд., испр. – Минск: Народная асвета, 2010.

Дополнительные компоненты УМК

Борушко, И.И. Химический эксперимент: тетр. для практ. работ и лаборатор. опытов: 11-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / И.И. Борушко. – 6-е изд. – Сэр-Вит, 2015.

Колевич, Т.А. Удивительный мир неорганической химии: 10-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Т.А. Колевич, В.Э. Матулис, В.Э. Матулис. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Колевич, Т.А. Удивительный мир неорганической химии: 10-й кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Т.А. Колевич, В.Э. Матулис, В.Э. Матулис. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Лахвич, Ф.Ф. Химия в таблицах и схемах: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2013.

Лахвич, Ф.Ф. Удивительный мир органической химии: 11-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Лахвич, Ф.Ф. Удивительный мир органической химии: 11-й кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Мякинник, Т.Н. Химия. 10 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 3-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Мякинник, Т.Н. Химия. 11 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 2-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Уроки химии в 7–11 классах: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского, Т.А. Колевич. – Минск: Аверсэв, 2014.

Химия. 10–11 классы. Химический практикум / Ф.Ф. Лахвич [и др.]. – Минск: «ИНИС-СОФТ», 2010.

Химия: Контрольные и проверочные работы. Тестовые задания: 7–11 классы: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2015.

Химия в 10 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / И.Е. Шиманович [и др.]; под ред. И.Е. Шимановича. – Минск: Народная асвета, 2014.

Шарапа, Е.И. Химия. 11 класс: рабочая тетрадь / Е.И. Шарапа. – 2-е изд., испр. – Минск: Народная асвета, 2010.

Шарапа, Е.И. Тетрадь для лабораторных опытов и практических работ по химии для 10 класса: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – Минск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, Е.И. Тетрадь для лабораторных опытов и практических работ по химии для 11 класса: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий. – 6-е изд., доп. – Минск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, Е.И. Химия в 11 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий, Т.Н. Мякинник. – Минск: Народная асвета, 2014.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.07.2015 № 83

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Хімія» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (павышаны ўзровень)

ХІМІЯ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Змест адукацыі вучэбнага прадмета «Хімія» арыентаваны на асваенне вучнямі кампетэнцый, неабходных для рацыянальнай дзейнасці ў свеце рэчываў і хімічных ператварэнняў на аснове ведаў аб уласцівасцях найважнейшых рэчываў, якія акружаюць чалавека ў паўсядзённым жыцці, прыродзе, прамысловасці, і разуменне сутнасці хімічных ператварэнняў. Змест адукацыі таксама арыентаваны і на фарміраванне ў вучняў разумення ролі хіміі ў вырашэнні найбольш актуальных праблем, што стаяць перад чалавецтвам у XXI стагоддзі. Ад правільнага вырашэння гэтых праблем залежыць здароўе людзей, узровень іх жыцця і стан навакольнага асяроддзя.

Мэта вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне сістэмы хімічных ведаў і вопыту іх прымянення, якая забяспечвае разуменне прыродазнаўчанавуковай карціны свету, актыўную адаптацыю ў соцыуме і бяспечныя паводзіны, гатоўнасць працягваць адукацыю на наступных узроўнях і ступенях прафесійнай адукацыі.

Задачы вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

фарміраванне сістэмных хімічных ведаў, якія ствараюць аснову для бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі на ўсіх этапах навучання і будучай прафесійнай дзейнасці;

фарміраванне і развіццё ключавых, агульнапрадметных і прадметна-спецыяльных кампетэнцый – ведаў, уменняў, спосабаў і вопыту дзейнасці з улікам спецыфікі хіміі як фундаментальнай прыродазнаўчай навукі;

фарміраванне і развіццё сацыяльна значных каштоўнасных арыентацый, што ўключаюць агульнакультурнае і асобаснае развіццё вучняў, усведамленне каштоўнасці хімічнай адукацыі, якую атрымліваюць, пачуцці адказнасці і патрыятызму, сацыяльную мабільнасць і здольнасць адаптавацца ў розных жыццёвых сітуацыях;

фарміраванне пашыраных сістэмных хімічных ведаў, якія ствараюць аснову для бесперапыннай прыродазнаўчанавуковай адукацыі і будучай прафесійнай дзейнасці, звязанай з хіміяй.

Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Хімія» прызначана для вывучэння хіміі ў X класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні ва ўмовах профільнага навучання.

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з вучэбным планам, які прадугледжвае для вывучэння хіміі на павышаным узроўні 4 гадзіны на тыдзень (усяго 140 гадзін).

Павышаны ўзровень вывучэння хіміі ўключае ў сябе базавы ўзровень. На павышаным узроўні ажыццяўляецца больш глыбокая падрыхтоўка вучняў за кошт пашырэння тэарэтычнай інтэрпрэтацыі хімічных з'яў, пераліку эксперыментальных і разліковых задач, увядзення ўскладненых задач.

Структура вучэбнай праграмы прадугледжвае вывучэнне арганічнай хіміі ў X класе. Вывучэнне вучэбнага матэрыялу пачынаецца з тэмы «Увядзенне ў арганічную хімію», разлічанай на фарміраванне неабходных кампетэнцый, накіраваных на разуменне асноў тэорыі будовы рэчыва. Далейшы разгляд вучэбнага матэрыялу грунтуецца на звестках аб электроннай будове атамаў і электроннай прыродзе хімічнай сувязі ў малекулах

арганічных злучэнняў. Разглядаюцца будова і ўласцівасці арганічных рэчываў асноўных класаў.

Паслядоўнасць вучэбных тэм, якая прапануецца ў праграме, дазваляе раскрыць прынцып ускладнення будовы і генетычнага развіцця ад вуглевадародаў да больш складаных арганічных злучэнняў. Пры вывучэнні курса вучні будуць знаёміцца з залежнасцю ўласцівасцей арганічных рэчываў ад будовы малекул, з прымяненнем арганічных злучэнняў у розных сферах жыццядзейнасці чалавека.

У вучэбнай праграме названы вучэбныя тэмы і пазначаны прыкладны час на іх вывучэнне.

Для кожнай тэмы ў праграме вызначаны пытанні, якія належыць вывучыць, тыпы разліковых задач, пазначаны пералікі дэманстрацый, лабараторных доследаў, тэмы практычных работ. Настаўніку даецца права замены дэманстрацыйных і лабараторных доследаў на іншыя (раўназначныя), больш даступныя ва ўмовах пэўнай школы. Па сваім меркаванні настаўнік можа павялічыць лік дэманстрацыйных доследаў. Прадугледжаны час на правядзенне кантрольных работ.

Пазначаная ў праграме колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне вучэбных тэм, з'яўляецца прыкладнай. Яна можа быць пераразмеркавана паміж тэмамі ў разумных межах (2–4 гадзіны). Рэзервовы час настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні. Акрамя таго, магчыма змяненне паслядоўнасці вывучэння пытанняў у межах асобнай тэмы пры адпаведным абгрунтаванні такіх змяненняў.

У праграме ёсць раздзел «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». На аснове гэтых патрабаванняў ажыццяўляецца кантроль і ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якасці засваення і ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцый.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(4 гадзіны на тыдзень; усяго 140 гадзін, з іх 4 гадзіны – рэзервовы час)

Т э м а 1. Уводзіны ў арганічную хімію (10 гадзін)

Будова атама. Стан электрона ў атаме. Атамная арбіталь. Энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень. *s*-, *p*-Арбіталі ў атаме. Электронныя канфігурацыі атамаў. Будова электронных абалонак атамаў элементаў першых трох перыядаў (размеркаванне электронаў па арбіталях). Асаблівасці будовы атама вугляроду.

Прырода і тыпы хімічнай сувязі. Кавалентная сувязь. Палярная і непалярная кавалентная сувязь. Адзінарныя і кратныя сувязі (σ- і π-сувязі). Характарыстыка кавалентых сувязей: даўжыня, энергія, валентны вугал, палярнасць. Паняцце аб зрушэнні электроннай шчыльнасці.

Міжмалекулярнае ўзаемадзеянне і вадародная сувязь.

Прадмет арганічнай хіміі. Кароткія звесткі аб гісторыі станаўлення і развіцця арганічнай хіміі.

Асноўныя палажэнні тэорыі хімічнай будовы арганічных рэчываў.

Класіфікацыя арганічных рэчываў.

Дэманстрацыі

1. Якаснае вызначэнне вугляроду, вадароду і галагенаў у арганічных злучэннях.

Т э м а 2. Вуглевадароды (32 гадзіны)

Алканы. Азначэнне класа, гамалагічны рад і агульная формула алканаў. Гамалогі, гамалагічная рознасць.

Метан – найпрасцейшы прадстаўнік насычаных вуглевадародаў – алканаў. Электронная і прасторавая будова алканаў, sp^3-гібрыдызацыя атамных арбіталей вугляроду ў малекулах алканаў. Даўжыня сувязі C–C і валентныя вуглы ў малекулах алканаў.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алканаў. Структурная ізамерыя алканаў – ізамерыя вугляроднага шкілета. Фізічныя ўласцівасці.

Адносная шчыльнасць газаў. Аб'ёмная доля газу ў сумесі.

Хімічныя ўласцівасці алканаў: рэакцыя замяшчэння – галагенаванне (свабоднарадыкальны механізм, паняцце аб радыкале, ланцуговых рэакцыях) і нітраванне; рэакцыі акіслення, ізамерызацыі; тэрмічныя ператварэнні (крэкінг). Атрыманне (дэкарбаксіліраванне солей карбонавых кіслот, гідрыраванне злучэнняў з кратнымі сувязямі, рэакцыя Вюрца) і прымяненне алканаў.

Паняцце аб цыклаалканах. Азначэнне класа і агульная формула. Хімічныя ўласцівасці цыклагексану: рэакцыя галагенавання і араматызацыі. Атрыманне цыклагексану гідрыраваннем бензолу. Прымяненне цыклаалканаў.

Алкены. Азначэнне класа і агульная формула алкенаў. Этылен – найпрасцейшы прадстаўнік ненасычаных вуглевадародаў – алкенаў. Электронная і прасторавая будова алкенаў, sp^2-гібрыдызацыя атамных арбіталей вугляроду ў малекулах алкенаў. Даўжыня сувязі C=C, валентныя вуглы ў малекуле этылену.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алкенаў. Ізамерыя: структурная (вугляроднага шкілета і становішча двайной сувязі), міжкласавая (з цыклаалканамі), прасторавая *(цыс-*, *транс-)*. Фізічныя ўласцівасці алкенаў.

Хімічныя ўласцівасці алкенаў: акісленне; далучэнне вадароду, галагенаў, вады, галагенавадародаў. Правіла Маркоўнікава. Якасныя рэакцыі на двайную сувязь з растворамі брому і перманганату калію. Полімерызацыя алкенаў. Паняцці: палімер, манамер, структурнае звяно, ступень полімерызацыі. Поліэтылен, поліпрапілен, полівінілхларыд, політэтрафторэтылен. Атрыманне алкенаў (дэгідрыраванне алканаў, дэгідрагалагенаванне галагеналканаў, дэгалагенаванне дыгалагенвытворных, дэгідратацыя спіртоў, гідрыраванне алкінаў). Прымяненне алкенаў.

Дыены. Класіфікацыя: алкадыены з кумуліраванымі, спалучанымі і ізаляванымі двайнымі сувязямі. Асаблівасці будовы бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3 (ізапрэну), малекулярныя і структурныя формулы, прасторавая будова. Фізічныя ўласцівасці бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3.

Хімічныя ўласцівасці бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3: далучэнне вадароду, галагенаў, галагенавадародаў, рэакцыя полімерызацыі.

Атрыманне бутадыену-1,3 і 2-метылбутадыену-1,3: дэгідрыраваннем алканаў, дэгідрагалагенаваннем дыгалагенвытворных. Прымяненне дыенавых вуглевадародаў. Прыродны і сінтэтычны каўчукі.

Алкіны. Азначэнне класа і агульная формула алкінаў. Ацэтылен – найпрасцейшы прадстаўнік ненасычаных вуглевадародаў – алкінаў. Электронная і прасторавая будова малекул алкінаў, *sp*-гібрыдызацыя атамных арбіталей вугляроду ў малекулах алкінаў. Даўжыня сувязі C≡C, валентны вугал у малекуле ацэтылену.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы алкінаў. Ізамерыя: структурная (вугляроднага шкілета і становішча трайной сувязі), міжкласавая (з дыенамі). Фізічныя ўласцівасці алкінаў.

Хімічныя ўласцівасці алкінаў: поўнае акісленне, далучэнне вадароду, галагенаў, галагенавадародаў, вады. Якасныя рэакцыі на трайную сувязь з растворамі брому і перманганату калію. Атрыманне алкінаў дэгідрагалагенаваннем дыгалагеналканаў. Атрыманне ацэтылену з метану і карбіду кальцыю. Прымяненне алкінаў.

Арэны. Азначэнне класа і агульная формула арэнаў раду бензолу. Бензол – найпрасцейшы прадстаўнік араматычных вуглевадародаў. Наменклатура і ізамерыя арэнаў раду бензолу. Электронная і прасторавая будова малекулы бензолу, sp^2-гібрыдызацыя атамных арбіталей вугляроду ў бензольным кольцы. Даўжыня сувязі вугляро–вугляро і валентныя вуглы ў малекуле бензолу. Фізічныя ўласцівасці арэнаў.

Хімічныя ўласцівасці арэнаў: рэакцыі замяшчэння ў араматычным ядры (галагенаванне, нітраванне), каталітычнае гідрыраванне. Рэакцыя гамолагаў бензолу па бакавым ланцугу: галагенаванне і акісленне.

Атрыманне бензолу трымерызацыяй ацэтылену. Фізічныя ўласцівасці бензолу. Атрыманне араматычных вуглевадародаў дэгідрыраваннем алканаў і цыклаалканаў. Прымяненне араматычных злучэнняў.

Узаемасувязь паміж насычанымі і ненасычанымі вуглевадародамі.

Вуглевадароды ў прыродзе. Нафта і прыродны газ як крыніцы вуглевадародаў. Нафта. Састаў і фізічныя ўласцівасці. Спосабы перапрацоўкі нафты: перагонка, тэрмічны і каталітычны крэкінг. Прадукты перапрацоўкі нафты. Ахова навакольнага асяроддзя ад забруджванняў пры перапрацоўцы вуглевадароднай сыравіны і выкарыстанні прадуктаў перапрацоўкі нафты. Прадпрыемствы нафтахімічнага комплексу Рэспублікі Беларусь.

Разліковыя задачы

1. Вывад формул арганічных рэчываў па агульнай формуле, якая адлюстроўвае іх састаў.
2. Вызначэнне малекулярных формул арганічных рэчываў на аснове прадуктаў іх згарання.
3. Вылічэнне адноснай шчыльнасці і малярнай масы газаў.
4. Разлік аб’ёмнай долі газу ў сумесі.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул насычаных і ненасычаных вуглевадародаў.
2. Узоры пластмас.
3. Узоры натуральнага і сінтэтычных каўчукоў, рызіны.
4. Атрыманне ацэтылену карбідным спосабам.
5. Адносіны ацэтылену да раствору брому.
6. Калекцыя «Прадукты перапрацоўкі нафты».

Лабараторныя доследы

1. Выраб шарастрыжнёвых мадэлей малекул вуглевадародаў.

Практычныя работы

1. Атрыманне этылену і вывучэнне яго ўласцівасцей (1 гадзіна).

Т э м а 3. Спірты і фенолы (22 гадзіны)

Спірты. Функцыянальная група спіртоў, яе электронная будова. Класіфікацыя спіртоў: аднаатамныя і мнагаатамныя; насычаныя, ненасычаныя, аліцыклічныя і араматычныя; першасныя, другасныя, трацічныя.

Насычаныя аднаатамныя спірты. Азначэнне класа, агульная формула, састаў, будова, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы насычаных аднаатамных спіртоў. Метанол і этанол як прадстаўнікі насычаных аднаатамных спіртоў.

Ізамерыя насычаных аднаатамных спіртоў: структурная (вугляроднага шкілета і становішча функцыянальнай групы), міжкласавая (з простымі эфірамі). Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы спіртоў.

Фізічныя ўласцівасці. Вадародная сувязь і яе ўплыў на тэмпературы кіпення і растваральнасць спіртоў.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, арганічнымі і мінеральнымі кіслотамі, галагенавадародамі, дэгідратацыя (унутрымалекулярная і міжмалекулярная); акісленне: поўнае і частковае.

Атрыманне спіртоў гідролізам галагеналканаў, гідратацыяй алкенаў. Атрыманне метанолу і этанолу ў прамысловасці. Прымяненне спіртоў. Таксічнасць спіртоў, іх уздзеянне на арганізм чалавека.

Мнагаатамныя спірты. Этыленгліколь (этандыёл-1,2) і гліцэрына (прапантрыёл-1,2,3) як прадстаўнікі мнагаатамных спіртоў, іх састаў, будова і структурныя формулы.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, арганічнымі і мінеральнымі кіслотамі, галагенавадародамі, гідраксідам медзі(II) (якасная рэакцыя на мнагаатамныя спірты). Прымяненне этыленгліколю і гліцэрыны.

Узаемасувязь паміж насычанымі, ненасычанымі вуглевадародамі і спіртамі.

Фенолы. Паняцце аб фенолах, азначэнне класа. Састаў і будова фенолу: малекулярная і структурная формулы. Фізічныя ўласцівасці фенолу.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачнымі металамі, растворамі шчолачаў, браміраванне і нітраванне па араматычным ядры. Якасныя рэакцыі на фенол з бромнай вадой і растворамі солей жалеза(III). Узаемны ўплыў груп атамаў у малекуле фенолу.

Атрыманне фенолу з прадуктаў каксавання каменнага вугалю і хлорбензолу. Кумольны спосаб. Прымяненне фенолу.

Разліковыя задачы

5. Разлікі па хімічных ураўненнях, калі адно з рэагуючых рэчываў узята з лішкам.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метанолу, этанолу, этыленгліколю, гліцэрыны.
2. Параўнанне растваральнасці ў вадзе насычаных аднаатамных спіртоў.
3. Узаемадзеянне этанолу з натрыем.
4. Гарэнне этанолу.

Лабараторныя доследы

2. Акісленне этанолу аксідам медзі(II).
3. Узаемадзеянне гліцэрыны з гідраксідам медзі(II).

Т э м а 4. Альдэгіды (8 гадзін)

Альдэгіды. Функцыянальная карбанільная група, яе электронная і прасторавая будова. Паняцце аб кетонах як разнавіднасці карбанільных злучэнняў. Функцыянальная альдэгідная група, яе электронная і прасторавая будова.

Азначэнне класа альдэгідаў. Метаналь і этаналь як прадстаўнікі альдэгідаў, іх састаў, будова, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы.

Насычаныя альдэгіды: агульная формула; структурная ізамерыя вугляроднага шкілета і міжкласавая ізамерыя з кетонамі.

Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы альдэгідаў. Фізічныя ўласцівасці альдэгідаў.

Хімічныя ўласцівасці: аднаўленне да спіртоў, акісленне да карбонавых кіслот, далучэнне метанолу. Якасныя рэакцыі на альдэгідную групу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі(II).

Атрыманне альдэгідаў акісленнем першасных спіртоў. Атрыманне этаналю каталітычным акісленнем этылену і гідратацыяй ацэтылену. Прымяненне метаналю і этаналю.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул альдэгідаў.
2. Акісленне альдэгіду (рэакцыя «сярэбранага люстэрка»).

Лабараторныя доследы

4. Акісленне альдэгіду гідраксідам медзі(II).

Т э м а 5. Карбонавыя кіслоты (14 гадзін)

Карбонавыя кіслоты. Функцыянальная карбаксільная група, яе электронная і прасторавая будова. Азначэнне класа карбонавых кіслот. Класіфікацыя карбонавых кіслот: насычаныя, ненасычаныя, араматычныя; аднаасноўныя, двухасноўныя.

Насычаныя аднаасноўныя карбонавыя кіслоты: састаў, будова; агульная, малекулярныя, структурныя і электронныя формулы. Ізамерыя: структурная (вугляроднага шкілета) і міжкласавая (са складанымі эфірамі).

Мурашыная і воцатная кіслоты як прадстаўнікі насычаных аднаасноўных карбонавых кіслот. Пальміцінавая і стэарынавая кіслоты як прадстаўнікі вышэйшых насычаных карбонавых кіслот.

Намеклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы карбонавых кіслот. Фізічныя ўласцівасці карбонавых кіслот. Уплыў вадароднай сувязі на фізічныя ўласцівасці кіслот.

Хімічныя ўласцівасці: змяненне афарбоўкі індыкатараў; узаемадзеянне з металамі; з асноўнымі, амфатэрнымі аксідамі і гідраксідамі; солямі больш слабых кіслот. Рэакцыя замяшчэння гідраксільнай групы: са спіртамі з утварэннем складаных эфіраў (этэрыфікацыі); аміяком і амінамі з утварэннем амідаў; замяшчэнне атама вадароду ў α-вугляроднага атама на атам галагену. Паняцце аб ангідрыдах карбонавых кіслот. Асаблівасці акіслення мурашынай кіслаты. Атрыманне карбонавых кіслот акісленнем алканаў, першасных спіртоў і альдэгідаў. Атрыманне мурашынай кіслаты з аксіду вугляроду(II).

Ненасычаныя аднаасноўныя карбонавыя кіслоты. Акрылавая і алеінавая кіслоты: састаў, будова. Хімічныя ўласцівасці: далучэнне вадароду, галагенаў па двайной сувязі вуглевадароднай групы.

Прымяненне карбонавых кіслот.

Узаемасувязь паміж вуглевадародамі, спіртамі, альдэгідамі, карбонавымі кіслотамі.

Разліковыя задачы

6. Вылічэнні па ўраўненнях рэакцый, якія адбываюцца ў растворах.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул карбонавых кіслот.
2. Растваральнасць карбонавых кіслот у вадзе, уздзеянне на індыкатары.
3. Адносіны алеінавай кіслаты да раствору перманганату калію і брому; узаемадзеянне са шчолаччу.

Практычныя работы

2. Атрыманне воцатнай кіслаты і даследаванне яе ўласцівасцей (1 гадзіна).

Т э м а 6. Складаныя эфіры. Тлушчы (10 гадзін)

Складаныя эфіры. Азначэнне класа. Агульная формула, састаў, будова, малекулярныя і структурныя формулы. Этылавы эфір воцатнай кіслаты як прадстаўнік складаных эфіраў.

Ізамерыя: структурная і міжкласавая (з карбонавымі кіслотамі). Наменклатура ІЮПАК і трывіяльныя назвы складаных эфіраў. Фізічныя ўласцівасці. Атрыманне складаных эфіраў: рэакцыя этэрыфікацыі, яе абарачальнасць.

Хімічныя ўласцівасці: гідроліз (кіслотны і шчолачны).

Складаныя эфіры ў прыродзе. Прымяненне. Поліэфірныя валокны (лаўсан).

Тлушчы. Састаў і будова трыгліцэрыдаў. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз, гідрыраванне, акісленне. Біялагічная роля тлушчаў.

Мылы. Сінтэтычныя мыйныя сродкі (СМС).

Выхад прадукту рэакцыі.

Разліковыя задачы

7. Вызначэнне выхаду прадукту рэакцыі.

Дэманстрацыі

1. Атрыманне складанага эфіру воцатнай кіслаты.
2. Узоры складаных эфіраў, поліэфірных валокнаў і палімераў.

Лабараторныя доследы

5. Даследаванне ўласцівасцей тлушчаў (растваральнасць, доказ ненасычанага характару рэшткаў карбонавых кіслот).

6. Параўнанне ўласцівасцей мыла і сінтэтычных мыйных сродкаў.

Т э м а 7. Вугляводы (18 гадзін)

Вугляводы. Азначэнне класа. Агульная формула, састаў, будова, класіфікацыя вугляводаў.

Монацукрыды. Глюкоза: састаў, будова, функцыянальныя групы, будова малекулы. Лінейная і цыклічныя α- і β-формы малекулы глюкозы. Фруктоза – ізамер глюкозы. Фізічныя ўласцівасці глюкозы і фруктозы.

Прадстаўнікі пентоз – рыбоза і дэзоксірыбоза. Будова і біялагічнае значэнне.

Хімічныя ўласцівасці глюкозы: акісленне да глюконавай кіслаты, аднаўленне да шасціатамнага спірту сарбіту; браджэнне (спіртавое, малочнакіслае, маслянакіслае). Якасныя рэакцыі на глюкозу: «сярэбранага люстэрка» і з гідраксідам медзі(II). Знаходжанне ў прыродзе, атрыманне і прымяненне глюкозы.

Дыцукрыды. Цукроза як прадстаўнік дыцукрыдаў, яе састаў. Малекулярная формула. Фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: гідроліз. Атрыманне і прымяненне цукрозы.

Прадпрыемствы па вытворчасці цукру ў Рэспубліцы Беларусь.

Поліцукрыды. Крухмал – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул крухмалу (астаткі α-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці крухмалу: гідроліз (ферментатыўны, кіслотны); рэакцыя з ёдам (якасная рэакцыя на крухмал).

Значэнне вугляводаў як пажыўных рэчываў.

Цэлюлоза – прыродны поліцукрыд. Састаў і будова макрамалекул цэлюлозы (астаткі β-глюкозы). Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці цэлюлозы: гарэнне, гідроліз, узаемадзеянне з неарганічнымі і арганічнымі кіслотамі з утварэннем складаных эфіраў. Натуральныя і штучныя валокны. Прымяненне цэлюлозы і яе вытворных.

Прадпрыемствы па вытворчасці хімічных валокнаў у Рэспубліцы Беларусь.

Дэманстрацыі

1. Акісленне глюкозы (рэакцыя «сярэбранага люстэрка»).
2. Гідроліз цукрозы.
3. Узоры штучных валокнаў і тканін.

Лабараторныя доследы

7. Узаемадзеянне глюкозы з гідраксідам медзі(II).
8. Вывучэнне фізічных уласцівасцей крухмалу. Узаемадзеянне крухмалу з ёдам.

Практычныя работы

3. Гідроліз крухмалу і цэлюлозы (1 гадзіна).
4. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Т э м а 8. Азотзмяшчальныя арганічныя злучэнні (16 гадзін)

Аміны. Азначэнне класа. Класіфікацыя амінаў. Структурная ізамерыя і наменклатура амінаў.

Першасныя насычаныя аміны, агульная формула. Функцыянальная група першасных амінаў, яе электронная будова. Малекулярныя, структурныя і электронныя формулы. Фізічныя ўласцівасці першасных насычаных амінаў. Хімічныя ўласцівасці:

асноўныя ўласцівасці амінаў (рэакцыі з вадой і неарганічнымі кіслотамі), поўнае акісленне.

Анілін як прадстаўнік араматычных амінаў, яго састаў і будова. Малекулярная, структурная і электронная формулы. Фізічныя ўласцівасці. Узаемны ўплыў атамаў у малекуле аніліну. Хімічныя ўласцівасці: рэакцыі аніліну па амінагрупе (з неарганічнымі кіслотамі) і араматычным ядры (з бромнай вадой).

Атрыманне насычаных амінаў з галагеналканаў і спіртоў, аніліну з нітрабензолу. Прымяненне аніліну і яго вытворных.

Параўнальная характарыстыка будовы і ўласцівасцей амінаў і аміяку.

Амінакіслоты. Азначэнне класа. Функцыянальныя групы амінакіслот. Класіфікацыя. Ізамерыя і наменклатура: трывіяльная і ІЮПАК.

α-Амінакіслоты. Амінавоцатная кіслата як прадстаўнік амінакіслот, яе састаў, будова малекулы.

Фізічныя ўласцівасці α-амінакіслот. Хімічныя ўласцівасці α-амінакіслот: узаемадзеянне з асновамі і кіслотамі (амфатэрныя ўласцівасці); узаемадзеянне з амінакіслотамі (утварэнне пептыдаў). Пептыдная сувязь. Атрыманне α-амінакіслот з α-галагензамешчаных карбонавых кіслот.

Прымяненне і біялагічная роля амінакіслот. Амінакіслоты заменныя і незаменныя.

Сінтэтычныя поліамідныя валокны: капрон.

Бялкі. Бялкі – прыродныя высокамалекулярныя злучэнні. Састаў і будова бялковых макрамалекул. Першасная, другасная, трацічная і чацвярцічная структуры бялкоў.

Хімічныя ўласцівасці бялкоў: гідроліз, дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Прымяненне і біялагічная роля бялкоў.

Дэманстрацыі

1. Мадэлі малекул метыламіну і этыламіну.
2. Дэнатурацыя бялкоў.

Лабараторныя доследы

9. Уласцівасці бялкоў: дэнатурацыя, каляровыя рэакцыі.

Практычныя работы

5. Рашэнне эксперыментальных задач (1 гадзіна).

Т э м а 9. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў па арганічнай хіміі (6 гадзін)

Разнастайнасць арганічных злучэнняў.

Узаемасувязь паміж арганічнымі злучэннямі розных класаў.

Класіфікацыя хімічных рэакцый, заканамернасці іх працякання.

Залежнасць уласцівасцей рэчываў ад будовы іх малекул. Асаблівасці будовы і ўласцівасцей высокамалекулярных злучэнняў.

Арганічныя злучэнні вакол нас. Уплыў сінтэтычных арганічных рэчываў на навакольнае асяроддзе.

Практычныя работы

6. Распазнаванне і вывучэнне ўласцівасцей пластмас і валокнаў (1 гадзіна).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні п а в і н н ы:

даваць азначэнні паняццям: атам, малекула, атамная арбіталь, энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень, *s*-, *p*-, *d*-арбіталі, электронная канфігурацыя атама; кавалентная сувязь: палярная і непалярная, адзінарная і кратная (двайная, трайная), σ-сувязь, π-сувязь, спалучаная, пептыдная, вадародная; даўжыня сувязі, валентны вугал;

хімічная формула (агульная класа, малекулярная, структурная, эмпірычная); ізамер, ізамерыя (прасторавая, структурная); арганічная хімія, арганічныя злучэнні (азотзмяшчальныя: аміны, амінакіслоты, бялкі; высокамалекулярныя: натуральныя, штучныя, сінтэтычныя; кіслародзмяшчальныя: альдэгіды, тлушчы, кетоны, карбонавыя кіслоты, складаныя эфіры, спірты, вугляводы, фенолы; вуглевадароды: насычаныя, ненасычаныя, цыклічныя, араматычныя); гамалогія (гамолаг, гамалагічная рознасць); група: альдэгідная, алкільная, амінагрупа, гідраксільная, кетагрупа, карбаксільная, нітрагрупа, пептыдная, вуглевадародная; малекула: састаў, будова (хімічная, электронная і прасторавая); наменклатура ІЮПАК, трывіяльныя назвы арганічных злучэнняў; пептыд; палімер, манамер, ступень полімерызацыі, структурнае звяно; хімічныя рэакцыі арганічных злучэнняў (браджэння, галагенавання, гідрагалагенавання, гідратацыі, гідрыравання, гідролізу, дэгідратацыі, дэгідрыравання, дэгідрагалагенавання, замяшчэння, ізамерызацыі, каталітычныя, якасныя, нітравання, акіслення, адшчаплення, полімерызацыі, полікандэнсацыі, далучэння, радыкальныя, фотахімічныя, этэрыфікацыі).

Вучні павінны ў м е ц ь:

называць:

асноўныя палажэнні тэорыі хімічнай будовы арганічных рэчываў, віды гібрыдызацыі атамных арбіталей; правіла Маркоўнікава; алкільныя групы; якасныя рэакцыі на вывучаныя арганічныя рэчывы; агульныя формулы злучэнняў розных класаў; азначэнні класаў арганічных злучэнняў; арганічныя злучэнні па наменклатуры ІЮПАК і трывіяльных назвах; вобласці практычнага выкарыстання арганічных рэчываў і вырабаў з іх; прыметы класіфікацыі хімічных рэакцый; састаў і будову арганічных злучэнняў розных класаў, спосабы атрымання арганічных рэчываў розных класаў, валокнаў, пластмас, каўчукоў; від ізамерыі; тып хімічнай рэакцыі; умовы працякання рэакцый; фізічныя ўласцівасці арганічных рэчываў; функцыянальныя групы; характар змянення фізічных уласцівасцей рэчываў у гамалагічным радзе і прычыну іх змянення; хімічныя ўласцівасці індывідуальнага рэчыва пэўнага класа;

вызначаць:

прыналежнасць арганічнага злучэння да пэўнага класа па структурнай формуле; прасторавую будову малекул з пазіцыі гібрыдызацыі атамных арбіталей; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях; арганічныя злучэнні (эксперыментальна па якасных рэакцыях);

адрозніваць:

гамолагі; ізамеры; малекулярныя, структурныя, шкілетныя і электронныя формулы арганічных злучэнняў; тыпы хімічных рэакцый арганічных злучэнняў па ўраўненнях і схемах.

Вучні п а в і н н ы ажыццяўляць наступныя спосабы дзейнасці:

састаўляць:

формулы электронных канфігурацый і схемы запаўнення электронамі атамных арбіталей атамаў элементаў першых трох перыядаў; формулу арганічнага злучэння (малекулярную, структурную, шкілетную, скарочаную структурную, электронную); мадэлі малекул; структурныя формулы арганічных злучэнняў па іх назвах; схемы, якія адлюстроўваюць узаемасувязь паміж арганічнымі рэчывамі розных класаў; ураўненні рэакцый, якія адлюстроўваюць хімічныя ўласцівасці вывучаных рэчываў і спосабы іх атрымання;

характарызаваць:

асаблівасці электроннай будовы атама вугляроду; спосабы атрымання арганічных рэчываў; будову рэчываў; тып хімічнай сувязі; фізічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў пэўнага класа; утварэнне адзінарнай, двайной, трайной хімічнай сувязі;

тлумачыць:

узаемасувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі арганічных рэчываў; узаемасувязь арганічных злучэнняў розных класаў; прычыны разнастайнасці арганічных

рэчываў; прычыны ўзаемнага ўплыву атамаў у малекулах арганічных злучэнняў; прычыны праяўлення арганічнымі злучэннямі амфатэрных уласцівасцей; прычыны падабенства хімічных уласцівасцей арганічных злучэнняў аднаго класа; прасторавую будову малекул арганічных злучэнняў; хімічныя ўласцівасці арганічных злучэнняў з пазіцыі тэорыі хімічнай будовы;

аналізаваць:

вынікі лабараторных доследаў, практычных работ; вучэбную інфармацыю;

прымяняць:

вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей рэчываў, хімічных рэакцый, спосабаў атрымання рэчываў; правілы бяспечных паводзін пры абыходжанні з рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем і прыборамі;

абыходзіцца:

з арганічнымі рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем, прыборамі;

праводзіць:

матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент; мадэліраванне малекул арганічных злучэнняў;

карыстацца:

падручнікам; інструкцыяй па правілах бяспечных паводзін у хімічным кабінеце; інструкцыяй пры выкананні хімічнага эксперымента.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ХІМІІ

Асноўныя кампаненты ВМК

Хімія: падручнік для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І.Я. Шымановіч [і інш.]; пад рэд. І.Я. Шымановіча; пер. з рус. мовы А.Ф. Конышавай. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Хімія: падручнік для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.П. Ельніцкі, А.І. Шарапа; пер. з рус. мовы Н.Г. Ляўчук. – 3-е выд., перагледж. і дап. – Мінск: Народная асвета, 2013.

Хвалюк, В.М. Зборнік задач па хіміі: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.М. Хвалюк, В.І. Рэзяпкін; пад рэд. В.М. Хвалюка. – 2-е выд. перапрац. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2013.

Шарапа, А.І. Зборнік задач па хіміі: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / А.І. Шарапа, А.П. Ельніцкі. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Народная асвета, 2010.

Дадатковыя кампаненты ВМК

Борушко, И.И. Химический эксперимент: тетр. для практ. работ и лаборатор. опытов: 11-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / И.И. Борушко. – 6-е изд. – Сэр-Вит, 2015.

Колевич, Т.А. Удивительный мир неорганической химии: 10-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Т.А. Колевич, В.Э. Матулис, В.Э. Матулис. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Колевич, Т.А. Удивительный мир неорганической химии: 10-й кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Т.А. Колевич, В.Э. Матулис, В.Э. Матулис. 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Лахвич, Ф.Ф. Химия в таблицах и схемах: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2013.

Лахвич, Ф.Ф. Удивительный мир органической химии: 11-й кл.: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Лахвич, Ф.Ф. Удивительный мир органической химии: 11-й кл.: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Ф.Ф. Лахвич, О.М. Травникова. – 2-е изд. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2014.

Мякинник, Т.Н. Химия. 10 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 3-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Мякинник, Т.Н. Химия. 11 класс: сборник самостоятельных работ: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т.Н. Мякинник, И.И. Борушко. – 2-е изд. – Минск: Сэр-Вит, 2015.

Уроки химии в 7–11 классах: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского, Т.А. Колевич. –Минск: Аверсэв, 2014.

Химия. 10–11 классы. Химический практикум / Ф.Ф. Лахвич [и др.]. – Минск: «ИНИС-СОФТ», 2010.

Химия: Контрольные и проверочные работы. Тестовые задания: 7–11 классы: пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.Я. Аршанский [и др.]; под ред. Е.Я. Аршанского. – 3-е изд. – Минск: Аверсэв, 2015.

Химия в 10 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / И.Е. Шиманович [и др.]; под ред. И.Е. Шимановича. – Минск: Народная асвета, 2014.

Шарапа, Е.И. Химия. 11 класс: рабочая тетрадь / Е.И. Шарапа. – 2-е изд., испр. – Минск: Народная асвета, 2010.

Шарапа, А.І. Сшытак для лабараторных доследаў і практычных работ па хіміі для 10 класа: дапам. для вучняў 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.І. Шарапа, А.П. Ельніцкі. – 6-е выд., дап. – Мінск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, А.І. Сшытак для лабараторных доследаў і практычных работ па хіміі для 11 класа: дапам. для вучняў 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.І. Шарапа, А.П. Ельніцкі. – Мінск: Аверсэв, 2015.

Шарапа, Е.И. Химия в 11 классе: учеб.-метод. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / Е.И. Шарапа, А.П. Ельницкий, Т.Н. Мякинник. – Минск: Народная асвета, 2014.